А.М. ЯНУШКЕВІЧ

# Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг.

Манаграфія

Мінск
«Медисонт»
2007

УДК 355.48(476)«1558/1570»
ББК 63.3(4Беи)4
Я65

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук *Георгій Галенчанка*,
кандыдат гістарычных навук *Генадзь Сагановіч*,
*Андрэй Радаман*

*Аўтар выказвае падзяку за падтрымку ў выданні гэтай кнігі Амерыканскаму савету навуковых таварыстваў (ACLS)*

На вокладцы: малюнак з выявай аблогі Полацка ў 1563 г., змешчаны ў «лятучым лістку» (Flugschrifte) «Warrhafftige und erschreckliche Zeitung von dem grausamen Feind dem Moskowiter» (Аўгсбург, 1563).

**Янушкевіч, А. М.**
Я65 Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. : манаграфія / А. М. Янушкевіч. — Мінск : Медисонт, 2007. — 356 с.

ISBN 978-985-6530-49-7.

Манаграфія прысвечана ўдзелу Вялікага Княства Літоўскага ў Інфлянцкай вайне 1558–1570 гг. У працы разглядаюцца ход ваенных дзеянняў і дыпламатычных зносін, праблемы арганізацыі ўзброеных сіл ВКЛ і іх фінансава-матэрыяльнага забеспячэння, фактары ўплыву ваеннага становішча на развіццё ўнутрыпалітычных і сацыядэмаграфічных працэсаў у ВКЛ.

**УДК 355.48(476)«1558/1570»**
**ББК 63.3(4Беи)4**

Кантактны e-mail аўтара: janaskevic@telegraf.by

**ISBN 978-985-6530-49-7**
© Янушкевіч А. М., 2007
© Афармленне. СТАА «Медисонт», 2007

# ЗМЕСТ

**УВОДЗІНЫ . . . . . . . . . . 4**

**РАЗДЗЕЛ I. Ваенныя дзеянні і дыпламатычныя зносіны паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай . . . . . . . . . . 21**

§ 1. Пачатак барацьбы за Інфлянты (1558–1561 гг.) . . . . . . . . . . 21

§ 2. Пачатак шырокамаштабнай вайны. Полацкая катастрофа 1563 г. . . . . . 53

§ 3. Нечаканая перамога: Ульская бітва 1564 г. . . . . . . . . . . 74

§ 4. Перманентная вайна на знясіленне: падзеі 1564–1570 гг.. . . . . . . . . . . 90

**РАЗДЗЕЛ II. Арганізацыя ўзброеных сіл ВКЛ . . . . . . . . . . 118**

§ 1. Крызіс магчымасцей: паспалітае рушэнне ВКЛ падчас Інфлянцкай вайны. . . . . . . . . . . 118

§ 2. Няспраўджаныя спадзяванні: найманае войска ў структуры ўзброеных сіл ВКЛ. . . . . . . . . . 158

§ 3. Польскі найманы кантынгент: ілюзія дапамогі ці нявыкарыстаныя магчымасці?. . . . . . . . . . 194

**РАЗДЗЕЛ III. Фінансава-матэрыяльнае забеспячэнне ўдзелу ВКЛ у Інфлянцкай вайне . . . . . . . . . . 211**

§ 1. Мабілізацыя сродкаў на вядзенне вайны: традыцыйныя метады і пошукі новых крыніц . . . . . . . . . . 211

§ 2. Галаўны боль для ўладаў: праблемы ўтрымання найманых жаўнераў . . . . . . . . . . 244

**РАЗДЗЕЛ IV. Уплыў ваеннага становішча на развіццё ўнутрыпалітычных працэсаў у ВКЛ . . . . . . . . . . 271**

§ 1. Стаўленне эліт да Інфлянцкай вайны канфлікты поглядаў і інтарэсаў . . . . . . . . . . 271

§ 2. Укараненне «шляхецкай дэмакратыі» і працэс заключэння уніі з Польшчай у варунках Інфлянцкай вайны . . . . . . . . . . 287

§ 3. Насельніцтва памежных тэрыторый ВКЛ у ваенны час: стаўленне да вайны, узаемадзеянне з уладамі, дэмаграфічная сітуацыя . . . . . . . . . . 316

**ЗАКЛЮЧЭННЕ. . . . . . . . . . 333**

**СКАРАЧЭННІ . . . . . . . . . . 338**

**КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА . . . . . . . . . . 339**

**SUMMARY “Grand Duchy of Lithuania and the Livonian War 1558–1570” . . . . . . 353**

# УВОДЗІНЫ

*Вайна была шалямі ісціны, пробай сіл для дзяржаў, якім яна дапамагала вызначыцца, і знакам вар'яцтва, якое ніколі не сціхала. Яна была індыкатарам усяго, што цякло і змешвалася ў адзіным руху чалавечай гісторыі.*

Фернан Брадэль

Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг. займае асаблівае месца ў ваенна-палітычнай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і яго няпростых стасунках з усходнім суседам — Маскоўскай дзяржавай (Вялікім Княствам Маскоўскім). Спецыфічнасць гэтай вайны заключаецца ў тым, што яе непасрэднай прычынай быў канфлікт інтарэсаў у дачыненні да тэрыторыі суседняй дзяржавы — Інфлянтаў. Такога даўно не было ў гісторыі супрацьстаяння дзвюх дзяржаў-канкурэнтак. Экспансіяніссцкія планы ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы прывялі да іх прамога сутыкнення і ўзнаўлення ваеннага супрацьборства за дамінаванне на абшары «рускіх» зямель.

Інфлянты ўяўлялі сабою кангламерат з пяці духоўных дзяржаўных утварэнняў — Інфлянцкага Ордэна, Рыжскага арцыбіскупства і трох біскупстваў: Дэрпцкага, Эзель-Вікскага і Курляндскага. Самастойнае кіраванне мелі таксама найбуйнейшыя гарады — Рыга, Рэвель і Нарва. У сярэдзіне XVI ст. інфлянцкія дзяржавы апынуліся ў сур'ёзным унутрыпалітычным крызісе. Крызісныя з'явы выявіліся ў першую чаргу ў раздрабленні палітычнай улады і падзенні яе аўтарытэта. Немалую ролю ў гэтым адыгралі сацыяльныя і этнічныя антаганізмы. Пабудаваныя на

сярэднявечных прынцыпах кіравання, структуры ўлады Інфлянцкай дзяржавы паказвалі сваю недзеяздольнасць у варунках ранняга Новага часу.

Для ВКЛ Інфлянцкая вайна стала апошнім выпрабаваннем у барацьбе за палітычную самастойнасць. Больш за тое, яна паслужыла галоўнай передумовай паскарэння інтэграцыйных працэсаў з Польскай Каронай. Праўда, сталы разгляд у гістарычнай літаратуры Інфлянцкай вайны ў якасці важнейшай передумовы заключэння Люблінскай уніі 1569 г. не прыводзіў да дэталёвага аналізу той ролі, якую гэтая падзея адыграла ў крызісе палітычнай і эканамічнай сістэмы ВКЛ.

Існаванне дзяржавы, якая знаходзіцца ў стане вайны, заўсёды набывае экстрэмальныя рысы. Вайна з’яўляецца своеасаблівым індыкатарам яе жыццяздольнасці, паказчыкам адпаведнасці тэндэнцыям развіцця сваёй эпохі. Ваеннае становішча выразна падкрэслівае ўзаемазвязанасць і ўзаемазалежнасць знешнепалітычных і ўнутрыпалітычных працэсаў. Вывучэнне ходу Інфлянцкай вайны і яе ўплыву на развіццё ўнутрыпалітычнага і гаспадарчага жыцця так ці інакш дапаможа больш дакладна ахарактарызаваць сутнасць сацыяльна-палітычных працэсаў, якія адбываліся ў ВКЛ у сярэдзіне XVI ст., напярэдадні пераломнай для яго гісторыі падзеі — Люблінскай уніі 1569 г.

Напачатку хацелася б звярнуць пільную ўвагу на праблемы храналогіі і тэрміналогіі. У савецкай і сучаснай расійскай гістарыяграфіі (дый не толькі) замацавалася храналогія Інфлянцкай вайны ад 1558 да 1582 г. Гэта цалкам слушны падыход пры разглядзе гэтай падзеі ў кантэксце гісторыі Расіі, для якой вайна была пэўным завершаным этапам у змаганні за прыбалтыйскія тэрыторыі і выхад да Балтыйскага мора.

Аднак пры пастаноўцы у цэнтр вывучэння гісторыі ВКЛ падобны падыход выклікае сур’ёзныя пярэчанні. Палітыка гэтай дзяржавы ў дачыненні да прыбалтыйскіх зямель мела зусім іншы сутнасны характар. Для Княства «інфлянцкае пытанне» ў 1582 г. яшчэ не было вырашана канчаткова. Скончыўся толькі пэўны этап у барацьбе за прыбалтыйскія тэрыторыі. На пачатку XVII ст. Рэч Паспалітая ўдзельнічала яшчэ ў дзвюх войнах за Інфлянты, у якіх асноўным праціўнікам выступала Швецыя.

Калі паглядзець на сутнасць падзей, выразна відаць, што барацьба за Інфлянты ў часы Жыгімонта Аўгуста і Стэфана Баторыя якасна адрозніваецца як па характары, так і па сваіх мэтах. У 60-я гг. XVI ст. ВКЛ удзельнічала ў зацяжной вайне і прытрымлівалася абарончай тактыкі,

а пры Стэфане Баторыі Рэч Паспалітая перайшла да актыўных наступальных дзеянняў, якія перакінуліся на тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы. Ваенныя гісторыкі, дарэчы, лічаць эпоху яго панавання якасна новым этапам у гісторыі ваеннага мастацтва Рэчы Паспалітай[1].

Не варта змяншаць значэнне перамір'я 1570 г., заключэнне якога *de jure* скончыла ваенныя дзеянні і паставіла лагічную кропку ў пэўным этапе ваеннага супрацьборства паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай. Пераломм 1560–1570-х гг. засведчыў не толькі перамены ва ўнутрыпалітычным жыцці ВКЛ (заключэнне уніі з Польшчай, згасанне дынастыі Гедымінавічаў, бескаралеўі), але таксама і кардынальную трансфармацыю знешнепалітычнага становішча Княства. Урэшце, вылучэнне асобнай Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг. добра стасуецца з агульнай перыядызацыяй палітычнай гісторыі Рэчы Паспалітай.

У польскай гістарыяграфіі добра ўсведамляўся такі стан рэчаў. Найлепшыя знаўцы эпохі выразна падзялялі ваенную барацьбу за Інфлянты на два перыяды[2]. Нават адзінае савецкае даследаванне, прысвечанае ўдзелу ВКЛ у Інфлянцкай вайне, вызначае 1570 г. як мяжу паміж яе якасна рознымі этапамі[3]. Такім чынам, ёсць дастаткова падстаў вылучаць Інфлянцкую вайну 1558–1570 гг. як асобную падзею.

Важнай з'яўляецца таксама праблема тэрміналогіі. Беларуская гістарыяграфія ў савецкія часы безагаворачна пераймала запазычаны з рускай мовы тэрмін «Лівонская вайна». Такое вызначэнне можна сустрэць і цяпер[4]. Аднак яно не адпавядае тэрміналогіі крыніц і дакументаў на старабеларускай мове, якія павінны быць асновай для выпрацоўкі сучаснай навуковай тэрміналогіі па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Імкнучыся захаваць гістарычную аўтэнтычнасць тэрмінаў, якія характа-

1 Korzon T. Dzieje wojen i wojskowości w Polsce. T. 1. Lwów etc., 1923; Kotarski H. Wojsko polsko-litewskie podczas wojny inflanckiej 1576–1582 // Studia i Materiały do Historii Wojskowości, 1970–1972. T. 16–18.

2 Historia polityczna Polski. Cz. 2. Warszawa etc., 1923; Natanson-Leski J. Dzieje granicy wschodniej Rzeczypospolitej. Lwów; Warszawa, 1922; Natanson-Leski J. Epoka Stefana Batorego w dziejach granicy wschodniej Rzeczypospolitej. Lwów; Warszawa, 1924; Kotarski H. Wojsko polsko-litewskie...; Błaszczyk G. Litwa na przełomie średniowiecza i nowożytności 1492–1569. Poznań, 2002.

3 Дербов Л. Борьба Русского государства за Прибалтику и Белоруссию в 60-х годах XVI в. // Ученые записки Саратовского гос. ун-та, 1956. Т. 47. С. 149–181.

4 Гл. для прыкладу: Дзярновіч А. «...in nostra Livonia»: Дакументальныя крыніцы па гісторыі палітычных адносінаў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Лівоніяй у канцы XV – першай палове XVI стст.: сістэматызацыя і актавы аналіз. Т. 1. Мн., 2003.

рызуюць падзеі і з'явы XVI ст., мы свядома прытрымліваемся назвы «Інфлянцкая вайна», якая найбольш адпавядае прынцыпу гістарызму. Да таго ж гэтая назва выкарыстоўваецца ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» і энцыклапедыі «Вялікае Княства Літоўскае», найбольш аўтарытэтных на сучасны момант выданнях, якія павінны зацвярджаць навуковую тэрміналогію ў Беларусі[5].

Тэрміналагічныя характарыстыкі дзяржаў і іх насельніцтва таксама патрабуюць свайго ўдакладнення. Нельга пераносіць сучасныя катэгорыі мыслення і ідэалагічныя ўстаноўкі на гістарычныя рэаліі XVI ст., калі нацыятворчыя працэсы не былі яшчэ скончаны, а самаідэнтыфікацыя ў палітычнай сферы адбывалася не па нацыянальна-этнічных прыкметах, а на падставе дзяржаўнай і станавай прыналежнасці. З гэтых прычын мы лічым некарэктным ужываць вызначэнні кшталту «Руская дзяржава», «Беларуска-Літоўская дзяржава», «Расія», «Беларусь», «рускія», «беларусы», «літоўцы» і інш. пры даследаванні ваенна-палітычнай гісторыі XVI ст. Мяркуем, што падобныя «мадэрнісцкія» тэрміны ў дачыненні да гэтага часу могуць ужывацца толькі пры характарыстыцы этнакультурных працэсаў і акрэсленні геаграфічна-тэрытарыяльных паняццяў. Заўважым пры гэтым, што тэрмін «Літва» («літоўскі») выкарыстоўваецца намі як сінонім тэрміна «Вялікае Княства Літоўскае» і не мае ніякага дачынення да літоўскай нацыі і яе сучаснай дзяржавы. Прынцып гістарычнай аўтэнтычнасці тэрмінаў, на наш погляд, дазваляе пазбегнуць мноства памылак і супярэчнасцей, народжаных канфрантацыяй сучасных ідэалагем і гістарычных фактаў.

Удзел ВКЛ у Інфлянцкай вайне і ўплыў ваеннага становішча на развіццё ўнутраных працэсаў у краіне не разглядаліся ў навуковай літаратуры як цэласная даследчыцкая праблема. Рабіліся альбо агляды ў абагульняльных выданнях, альбо вузкія даследаванні лакальных праблем. Калі знешняя палітыка дзяржаў і ваенныя дзеянні атрымалі дастаткова вялікае месца ў гістарычных даследаваннях, то другая, асабліва цікавая для нас праблема — уздзеянне вайны на ўнутраную палітыку — заставалася па-за полем навуковых інтарэсаў. Зразумела, сувязь паміж знешне-

[5] Сагановіч Г. Інфлянцкая вайна // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3. Мн., 1996. С. 499–501; Янушкевіч А. Інфлянцкая вайна 1558–1582 // Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя. Т. 1. Мн., 2005. С. 670–673.

і ўнутрыпалітычнымі працэсамі падкрэслівалася, але яны не звязваліся ў канкрэтныя даследчыцкія пытанні і сюжэтную цэласнасць.

Найбольш значны ўнёсак у вывучэнне Інфлянцкай вайны і ўдзелу ў ёй ВКЛ у апошнія паўтара стагоддзя зрабіла польская гістарыяграфія. Пачатак быў пакладзены працай Я. Н. Раманоўскага аб «пазвольскай выправе» 1557 г.[6] У 1873 г. у свет выйшла кніга С. Карвоўскага, спецыяльна прысвечаная праблеме далучэння Інфлянтаў да ВКЛ і Польскай Кароны[7]. Пры ўсім сваім наратывізме гэтая праца польскага даследчыка мае важнае навуковае значэнне, бо заклала фундамент пад асноўныя канцэптуальныя падыходы польскай гістарыяграфіі. Гэтай тэме было прысвечана і кароткае даследаванне Г. Мантойфеля[8].

У канцы XIX ст. з'явіўся на свет адзін з першых нарысаў ваенных дзеянняў паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, напісаны вядомым знаўцам вайсковай гісторыі К. Гурскім[9]. Эстафету ў яго пэўным чынам пераняў у 1922 г. Я. Натансон-Лескі, які выдаў манаграфію, прысвечаную фарміраванню ўсходняй граніцы ВКЛ[10]. Значнае месца ў ёй даследчык адвёў аналізу ваенных дзеянняў перыяду Інфлянцкай вайны. На яго погляд, прычына ваенных няўдач ВКЛ заключалася не столькі ў састарэласці вайсковай арганізацыі, колькі ў адсутнасці ў літвінаў волі да перамогі, бо для Княства гэтая вайна была тыпова абарончай.

Аглядны экскурс у развіццё ваенных дзеянняў зрабіў К. Піварскі ў працы, прысвечанай збору паспалітага рушэння ВКЛ у 1567 г.[11] На асобныя падзеі Інфлянцкай вайны звярнуў увагу ў шэрагу сваіх артыкулаў Р. Мяніцкі[12].

Упершыню ў Польшчы разгляд «інфлянцкага пытання» на фоне барацьбы за дамінаванне на Балтыцы быў зроблены А. Шэлянгоўскім у па-

---

6 R o m a n o w s k i J. N. Wojna Zygmunta Augusta z Zakonem Inflanckim roku 1557 // Rocznik Towarzystwa Przyjaciół Nauk Poznańskiego. T. 1. Poznań, 1860. S. 329–400.

7 K a r w o w s k i S. Wcielenie Inflant do Litwy i Polski 1558–1561. Poznań, 1873.

8 M a n t e u f f e l G. Upadek państwa inflanckiego. Lwów, 1894.

9 G ó r s k i K. Wojny Litwy z Wielkim Księstwem Moskiewskim za Zygmuntów // Niwa. 1891. R. 20. S. 237–240, 255–258, 273–276.

10 N a t a n s o n - L e s k i J. Dzieje granicy wschodniej Rzeczypospolitej...

11 P i w a r s k i K. Niedoszła wyprawa t. zw. Radoszkowicka Zygmunta Augusta na Moskwę (rok 1567–1568) // Ateneum Wileńskie. 1927–1928. R. 4–5. S. 252–286, 85–119.

12 M i e n i c k i R. Stanisław Dowojno, wojewoda połocki // Ateneum Wileńskie. 1937. R. 12. S. 404–481; M i e n i c k i R. Egzulanci Połłoccy (1563–1580) // Ateneum Wileńskie. 1933–1934. R. 9. S. 31–128.

чатку XX ст.[13] Аднак найбольш інтэнсіўнае развіццё даследаванне балтыйскай палітыкі Жыгімонта Аўгуста атрымала пасля Другой сусветнай вайны. Гэтай тэме прысвяцілі свае працы С. Бодняк, В. Канапчыньскі, К. Лепшы, В. Чаплінькі[14]. Аднак Інфлянцкая вайна трактавалася імі на ўзбоччы абранай тэматыкі.

Найбольш грунтоўнае даследаванне інфлянцкай палітыкі ВКЛ з'явілася ў 1939 г. Ю. Ясноўскі ў гісторыка-біяграфічнай працы, прысвечанай Мікалаю Радзівілу Чорнаму, на аснове шырокай дакументальнай базы даў дэталёвы аналіз палітыкі Жыгімонта Аўгуста па падпарадкаванні Інфлянтаў[15]. Даследчык пазітыўна ацаніў умяшанне ВКЛ у інфлянцкі канфлікт і адзначыў, што яно з'яўлялася своечасовым адказам на дзеянні Маскоўскай дзяржавы ў Прыбалтыцы.

У другой палове XX ст. цікавасць да падзей Інфлянцкай вайны ў польскай гістарыяграфіі пачала падаць. Як выключэнне, у канцы 70-х гг. XX ст. праблемы генезісу інфлянцкага канфлікту разглядаў Е. Алеўнік. Вынікам яго працы стала абарона доктарскай дысертацыі. Не так даўно гэтую ж праблематыку закрануў у сваіх даследаваннях па дыпламатычнай дзейнасці прускага пасла А. фон Брандта Я. Віячка[16].

Важнае значэнне для вывучэння абранай тэмы маюць працы Г. Гралі. У іх даследчык звяртаецца да праблем стаўлення грамадскіх структур да ваенных канфліктаў паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай[17]. У манаграфіі, прысвечанай жыццеапісанню маскоўскага дзяржаўнага

---

13 Szelągowski A. Walka o Bałtyk (1544–1621). Lwów, 1904.

14 Bodniak S. Polska a Bałtyk za ostatniego Jagiełłona. Kórnik, 1946; Konopczyński W. Kwestia bałtycka do XX wieku. Gdańsk, 1946; Lepszy K. Dzieje floty polskiej. Gdańsk, 1947; Czapliński W. Stanowisko państw skandynawskich wobec sprawy inflanckiej w latach 1558–1561 // Zapiski Historyczne. 1963. T. 28. Z. 3. S. 379–405.

15 Jasnowski J. Mikołaj Czarny Radziwiłł (1515–1565): kanclerz i marszałek ziemski Wielkiego Księstwa Litewskiego, wojewoda wileński. Warszawa, 1939.

16 Olewnik J. Polsko-pruski plan inkorporacji Inflant do monarchii jagiellońskiej z lat 1552–1555 i jego pierwsze stadium realizacji // Kommunikaty Mazursko-Warmińskie. 1979. N 4. S. 393–408; Wijaczka J. Prusy Książęce a Polska, Litwa i Inflanty w połowie XVI wieku: działalność dypłomatyczna Asverusa von Brandta w latach 1544–1558. Kielce, 1992; Wijaczka J. Asverus von Brandt 1509–1559: życie i działalność dyplomatyczna w służbie księcia Albrechta pruskiego. Kielce, 1996.

17 Grala H. Rutheni vs Moschii: Elita ruska Wielkiego Księstwa Litewskiego wobec wojen moskiewskich w XVI w. // Наш радавод. Кн. 8. Гродна, 1999. С. 34–51; Grala H. "Herren Rada" und Dumabojaren zwischen Kampf und Frieden: Anschauungen der litaunischen und Moskauer Elite von den Gründen des Krieges im 16. Jahrhunderts // Der Krieg im Mittelalter und in der Frühen Neuzeit: Gründe, Begründungen, Bilder, Bräuche, Recht / Red. H. Brunner. Wiesbaden, 1999. S. 349–371.

дзеяча Івана Віскаватага, польскі гісторык даў абгрунтаваную характарыстыку дыпламатычных стасункаў паміж дзвюмя краінамі ў гады Інфлянцкай вайны[18].

Неабходна адзначыць, што польскіх вучоных стала цікавіла і такая важная праблема як арганізацыя ўзброеных сіл падчас Інфлянцкай вайны. Галоўным чынам яны выяўлялі цікавасць да польскага найманага кантынгенту, які ўдзельнічаў у абароне ВКЛ і Інфлянтаў. Першымі гэтую праблематыку ў сваіх абагульняльных працах закранулі К. Гурскі і Т. Корзан[19]. У міжваеннае дзесяцігоддзе ёю зацікавіліся У. Семковіч і Ю. Ясноўскі[20]. У другой палове XX ст. характарыстыкай дзейнасці польскага войска ў ВКЛ і Інфлянтах займаліся Я. Вімер, М. Пляўчыньскі і Г. Блашчык[21].

Крызіс Інфлянцкай дзяржавы і ўдзел суседніх краін у падзеле яе тэрыторыі заўсёды выклікалі жывую цікавасць у заходнееўрапейскіх вучоных. Гэтая тэматыка актыўна вывучалася ў XIX – пачатку XX ст. нямецка-прыбалтыйскімі гісторыкамі. Тэматыка Інфлянцкай вайны так ці інакш уводзілася ў працах заходніх даследчыкаў у кантэкст гісторыі балтыйскага рэгіёна. Гэты падыход, у прыватнасці, выразна прасочваецца ў якасці канцэптуальнай асновы ў кнізе Т. Шымана, які адным з першых прысвяціў асобнае даследаванне аналізу ўзаемадачыненняў паміж Інфлянтамі, Літвой і Масковіяй[22].

Новы ўздым цікавасці да інфлянцкага канфлікту назіраўся ў Нямеччыне і скандынаўскіх краінах у пасляваенны час. Да аналізу інфлянцкай

[18] Граля И. Иван Михайлов Висковатый: Карьера государственного деятеля в России XVI в. М., 1994.

[19] Górski K. Historia piechoty polskiej. Kraków, 1893; Górski K. Historia jazdy polskiej. Kraków, 1895; Korzon T. Organizacja wojskowa Litwy w okresie Jagiellońskim // Rocznik Towarzystwa przyjaciół nauk w Wilnie. T. 2. Wilno, 1908. S. 312–358.

[20] Semkowicz W. Popis wojska polskiego z lat 1561–1564 i wyobrażone na nim piętna końskie // Wiadomości Numizmatyczno-Archeologiczne. 1930. T. 12. S. 104–113; Jasnowski J. Materiały do działalności wojskowej F. Zebrzydowskiego // Przegląd Historyczno-Wojskowy. 1937. T. 9. S. 267–304.

[21] Wimmer J. Siły zbrojne Korony za Zygmunta Augusta // Zeszyty Naukowe Wojskowej Akademii Politycznej. Seria historyczna. 1967. N 15/48. S. 47–55; Plewczyński M. Żołnierz jazdy obrony potocznej za czasów Zygmunta Augusta: Studia nad zawodem wojskowym w XVI wieku. Warszawa, 1985; Plewczyński M. Liczebność wojska polskiego za ostatnich Jagiellonów (1506–1572) // Studia i Materiały do Historii Wojskowości. 1989. T. 31. S. 27–60; Błaszczyk G. Ustawy i artykuły wojskowe Polski i Litwy do 1569 roku // Studia i Materiały do Historii Wojskowości. 1998. T. 39. S. 29–75.

[22] Schiemann T. Russland, Polen und Livland bis in 17. Jahrhundertes. Bd. 1–2. Berlin, 1887.

палітыкі ВКЛ звярталіся К. Штэмлер, В. Кірхнер, В. Кютлер, В. Ленц, Э. Донэрт і інш.[23] Пры гэтым адзначым, што ў даследаваннях В. Кірхнера і марксісцкага гісторыка з ГДР Э. Донэрта маюцца спецыяльныя раздзелы, прысвечаныя аналізу інфлянцкай палітыкі ВКЛ і Польшчы[24].

Найбольш значным дасягненнем заходнееўрапейскай гістарычнай навукі ў вывучэнні распаду Інфлянцкай дзяржавы, безумоўна, з'яўляецца кніга дацкага гісторыка К. Расмусэна[25]. У ёй аўтар крытыкаваў некаторыя гістарыяграфічныя стэрэатыпы, якія паспелі замацавацца пры аналізе праблемы, і адлюстраваў складанасць і супярэчлівасць тых чыннікаў, якія абумоўлівалі дзеянні ўдзельнікаў барацьбы за Інфлянты.

Важнай працай для вывучэння ўдзелу ВКЛ у Інфлянцкай вайне з'яўляецца манаграфія шведскага даследчыка Э. Тыберга, прысвечаная літоўска-маскоўскім стасункам напярэдадні і ў пачатку вайны[26]. Заўважым, што гэта рэдкі ў сучаснай гістарыяграфіі выпадак, калі ўзаемадачыненням дзвюх краін у сярэдзіне XVI ст. прысвячаецца спецыяльнае манаграфічнае даследаванне. Нягледзячы на пэўныя яго хібы, выкліканыя передусім непаўнатой крыніцазнаўчай базы, з галоўнай высновай даследчыка цяжка не пагадзіцца. Э. Тыберг трапна заўважыў, што палітыка ВКЛ была абумоўлена рацыянальнымі стратэгічнымі і гаспадарчымі інтарэсамі, і толькі слабасць рэсурсаў не дазволіла Княству падпарадкаваць Інфлянты цалкам.

У передваенны час інфлянцкай палітыкай ВКЛ зацікавіліся прыбалтыйскія вучоныя. У прыватнасці, да аналізу передумоў Інфлянцкай вайны звярнуўся літоўскі даследчык С. Сюжэдэліс[27]. У савецкі час тэматыка літоўска-інфлянцкіх ўзаемадачыненняў знаходзілася ў полі зроку такіх даследчыкаў як Б. Дундуліс і Р. Варакаўскас[28]. Прававое і палітычнае

---

23 Staemmler K. Preußen und Livland in ihrem Verhältnis zur Krone Polen 1561–1586. Marburg; Lahn, 1953; Küttler W. Das Verhaltnis der Stadt Riga zu Polen-Litauen in der Zeit des Livländischen Krieges (1558–1583) // Jahrbücher für Geschichte der UdSSR. 1967. Bd. 10. S. 273–295; Lenz W. Riga zwischen dem Römischen Reich und Polen-Litauen in den Jahren 1558–1582. Marburg; Lahn, 1968.

24 Kirchner W. The Rise of the Baltic Question. Newark, 1954; Donnert E. Der livländische Ordensritterstaat und Russland. Berlin, 1963.

25 Rasmussen K. Die livländische Krise 1554–1561. Kobenhavn, 1973.

26 Tiberg E. Zur Vorgeschichte des Livländischen Krieges. Die Beziehungen zwischen Moskau und Litauen 1549–1562. Uppsala, 1984.

27 Sužiedėlis S. Lietuvos ir Livonijos konfliktas 1556–1557 m. Kaunas, 1938; Sužiedėlis S. Mykolo Radvilo pastangos prijungti Lietuvai Rygą. Kaunas, 1934.

28 Dundulis B. Lietuvos užsenio politika XVI a. Vilnius, 1971; Varakauskas R. Lietuvos ir Livonijos santykiai XIII–XVI a. Vilnius, 1982.

становішча Інфлянтаў пад уладай ВКЛ і Рэчы Паспалітай вывучаў эстонскі вучоны Э. Тарвел[29].

Інфлянцкая вайна займае ўсё больш месца ў напрацоўках сучаснай літоўскай гістарыяграфіі. У прыватнасці, шэраг арыгінальных гістарыяграфічных аспектаў разгледзеў В. Станцэліс[30]. Р. Рагаўскене прысвяціла асобнае даследаванне аналізу крыніц па Ульскай бітве 1564 г.[31] Нарэшце, зусім нядаўна Г. Лесмайціс абараніў доктарскую працу па арганізацыі найманага войска ВКЛ, у якой вялікае месца адведзена перыяду, які нас цікавіць[32].

Нельга сказаць, каб у расійскай гістарыяграфіі выяўлялася асаблівая цікавасць да Інфлянцкай вайны. У XIX ст. пры асвятленні гэтай тэмы дамінаваў дзяржаўніцкі падыход. Згодна з ім, вайна мела характар непазбежнай заканамернасці і ацэньвалася як станоўчая падзея ў гісторыі Расійскай дзяржавы. «Балтыйскае пытанне», якое наспела ў сярэдзіне XVI ст., патрабавала свайго вырашэння ваенным шляхам з прычыны варожай пазіцыі Інфлянтаў у дачыненні да імкнення Маскоўскай дзяржавы наладзіць непасрэдныя і цесныя кантакты з Захадам, неабходныя ёй для пераадолення адсталасці ў ваенна-тэхнічнай і культурна-адукацыйнай сферах. Найбольш выразна дзяржаўніцкая трактоўка выявілася ў разнастайных сінтэтычных працах па гісторыі Расіі[33].

Спроба М. Кастамарава аспрэчыць гэтую паноўную канцэпцыю праз тлумачэнне прычын вайны ва ўсёпаглынальным імкненні Маскоўскай дзяржавы да пашырэння сваёй тэрыторыі не знайшла шырокага водгуку ў гістарыяграфіі[34]. Праблема ж удзелу ВКЛ у Інфлянцкай вайне 1558–1570 гг. расійскімі гісторыкамі ў спецыяльных даследаваннях увогуле не закраналася.

[29] Tarvel E. Stosunek prawnopaństwowy Inflant do Rzeczypospolitej oraz ich ustroj administracyjny w l. 1561–1621 // Zapiski Historyczne. 1969. T. 34. Z. 1. S. 49–77.

[30] Stancelis V. The annexation of Livonia to the Grand Duchy of Lithuania: Historiographical controversies // Lithuanian Historical Studies. 2000. N 5. P. 21–44.

[31] Ragauskienė R. 1564 m. Ulos kautynės: įvykio tikimybės // Istorijos akiračiai: straipsnių rinkinys. Vilnius, 2004. P. 155–176.

[32] Lesmaitis G. The hired army of the Grand Duchy of Lithuania in the end of 15th c. – 1570: Summary of Doctoral Dissertation Humanities. Kaunas, 2005.

[33] Карамзин Н. История государства Российского. Кн. 2–3 (т. 5–12). М., 1989 (рэпрынт); Соловьев С. Сочинения. Кн. 3: История России с древнейших времен. Т. 5–6. М., 1989; Бестужев-Рюмин К. Ливонская война // Журнал Министерства народного просвещения. 1880. Т. 211 (сентябрь-октябрь). С. 167–185; Иловайский Д. История России. Т. 3: Московско-царский период. М., 1890.

[34] Костомаров Н. Ливонская война // Костомаров Н. Исторические монографии и исследования. Т. 3. СПб., 1867. С. 45–172.

Асобнае месца сярод прац расійскіх навукоўцаў займаюць наватарскія даследаванні Г. Форстэна. У іх на шырокай дакументальнай базе падзеі Інфлянцкай вайны былі прааналізаваны на фоне міжнароднай барацьбы за *dominium maris baltici*[35].

Савецкая гістарыяграфія Інфлянцкай вайны ў 40–50-я гг. XX ст. пераняла асноўныя рысы дзяржаўніцкай канцэпцыі[36]. Нягледзячы на тое, што вайна стала тэмай некалькіх асобных даследаванняў, іх мэтай з'яўляўся не столькі аб'ектыўны аналіз сутнасці знешнепалітычнай дзейнасці, колькі абгрунтаванне справядлівасці патрабаванняў і дзеянняў маскоўскіх уладаў. Характэрнымі асаблівасцямі савецкай гістарыяграфіі з'яўляліся сумяшчэнне класавага падыходу з «вялікадзяржаўнай» трактоўкай пры аналізе ваенных падзей, прыярытэт сацыяльна-эканамічнага дэтэрмінізму пры тлумачэнні прычын Інфлянцкай вайны, а таксама аптымістычная ацэнка яе значэння для Маскоўскай дзяржавы. Знакавай для савецкай гістарыяграфіі стала кніга В. Каралюка «Ливонская война», якая выйшла з друку ў 1954 г.[37]

Праблемы, звязаныя з удзелам уласна ВКЛ у Інфлянцкай вайне, у пэўнай ступені былі закрануты толькі Л. Дзербавым[38]. Аднак мэтай яго працы было хутчэй стварэнне зручнай для камуністычнай ідэалогіі схемы, а не аб'ектыўны аналіз знешнепалітычных стасункаў паміж Масквой і Вільняй.

Пасля распаду Савецкага Саюза ў расійскай гістарыяграфіі назіраецца кардынальны паварот у трактоўцы Інфлянцкай вайны. Дзякуючы працам Г. Харашкевіч, Б. Флоры, А. Філюшкіна, А. Вінаградава і іншых вучоных адбываецца пераасэнсаванне знешняй палітыкі Маскоўскай дзяржавы гэтага перыяду[39]. Даследчыкі, у прыватнасці, пачынаюць па-новаму глядзець на генезіс і сутнасць інфлянцкага канфлікту.

---

35 Нашай тэмы перадусім датычыць: Форстен Г. Балтийский вопрос в XVI и XVII столетиях. Т. 1: Борьба из-за Ливонии. СПб., 1893.

36 Аналізу савецкай гістарыяграфіі Інфлянцкай вайны прысвечаны наш артыкул: Янушкевіч А. Інфлянцкая вайна 1558–1582 гг. у савецкай гістарыяграфіі // Беларускі гістарычны агляд. 1999. Т. 6. Сш. 1–2 (10–11). С. 222–243.

37 Королюк В. Ливонская война: Из истории внешней политики Русского централизованного государства во второй половине XVI в. М., 1954.

38 Дербов Л. Борьба Русского государства...

39 История внешней политики России. Конец XV–XVII век (От свержения ордынского ига до Северной войны). М., 1999; Филюшкин А. Дискурсы Ливонской войны // Ab Imperio: Теория и история национальностей и национализма в постсоветском пространстве. 2001. N 4. С. 43–80; Флоря Б. Иван Грозный. М., 2002; Хорошкевич А. Россия в системе международных отношений середины XVI века. М., 2002.

Неабходна адзначыць, што асобная ўвага была звернута на такую ключавую падзею Інфлянцкай вайны як узяцце маскоўскім войскам Полацка ў 1563 г. Аўтарам даследавання, прысвечанага гэтай падзеі, стаў Дз. Валадзіхін[40]. Не адмаўляючы заслуг гэтага даследчыка, варта падкрэсліць, што праведзены ім крыніцазнаўчы аналіз выклікае сур'ёзныя пярэчанні. Ажыццяўляючы адсейванне інфармацыі наратыўных крыніц па не зусім зразумелых крытэрыях, расійскі даследчык відавочна спрабуе паказаць дзеянні маскоўскага кіраўніцтва ў светлых фарбах. Пры гэтым пытанні выклікае не столькі апісанне ходу выправы маскоўскага войска і аблогі ім Полацка (тут усё амаль бездакорна), колькі трактоўка дзеянняў маскоўцаў у захопленым горадзе.

Беларуская гістарыяграфія, на жаль, не можа пахваліцца працяглай традыцыяй вывучэння знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ. Да тэматыкі Інфлянцкай вайны яна звярнулася толькі пасля распаду Савецкага Саюза. Доўгі час працы беларускіх гісторыкаў мелі папулярызатарскі характар. Варта адзначыць імкненне ўбачыць у вайне уласны нацыянальны інтарэс, што сімптаматычна выявілася, напрыклад, у выкарыстанні назвы «Полацкая вайна»[41]. Вынікі навуковых даследаванняў па асобных праблемах, звязаных з Інфлянцкай вайной, пачалі публікавацца ў Беларусі каля дзесяці гадоў таму. Аўтарамі артыкулаў на гэтую тэматыку з'яўляюцца Г. Сагановіч, В. Бобышаў, А. Яноўскі, А. Янушкевіч[42].

Праблемы ўплыву ваеннага становішча на ўнутранае развіццё ВКЛ у параўнанні з ходам Інфлянцкай вайны, як ужо адзначалася вышэй, распрацоўваліся ў гістарыяграфіі нашмат слабей. Найбольшы ўнёсак у гэтую справу зрабілі расійскія дарэвалюцыйныя гісторыкі М. Любаўскі і М. Доўнар-Запольскі[43].

40 Александров Д., Володихин Д. Борьба за Полоцк между Литвой и Русью в XII–XVI вв. М., 1994.

41 Сагановіч Г. Полацкая вайна: 1563–1579 гг. // Адраджэнне. Вып. 1. Мн., 1995. С. 61–82.

42 Аналіз сучаснай беларускай гістарыяграфіі знешняй палітыкі ВКЛ зроблены намі ў: Янушкевіч А. Беларуская гістарыяграфія гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага: асноўныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця (у друку). Гл. таксама цікавую, але неадназначную ў сваіх высновах працу: Хорошкевич А. Постсоветская белорусская историография (1991–2004) о развитии страны в XVI столетии. Рэжым доступу: src-h.slav.hokudai. ac.jp/pdf_seminar/050920belarus.pdf

43 Любавский М. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства. М., 1900; Довнар-Запольский М. Государственное хозяйство Великого Княжества Литовского при Ягеллонах. Киев, 1901.

Першы з іх у сваёй фундаментальнай працы «Литовско-русский сейм» даў грунтоўную характарыстыку амаль усяго комплексу праблем унутранай і знешняй палітыкі ВКЛ. Даследчык выдатна паказаў, што Інфлянцкая вайна была невыносным цяжарам для дзяржаўных і грамадскіх структур Княства і паслужыла каталізатарам унійных працэсаў з Польскай Каронай. М. Любаўскі значнае месца адвёў аналізу арганізацыі абарончых мерапрыемстваў і стану фінансавых рэсурсаў ВКЛ. Імкнучыся стварыць усёабдымную карціну палітычнага развіцця Княства, ён досыць дэталёва спыніўся на аглядзе ваенных падзей і дыпламатычных зносін.

М. Доўнар-Запольскі у сваёй манаграфіі «Государственное хозяйство Великого Княжества Литовского при Ягеллонах» разглядаў стан і развіццё дзяржаўнай гаспадаркі ў ВКЛ. Аналіз дадзенай тэмы не мог не закрануць праблему ўздзеяння ваеннага становішча на гаспадарча-фінансавую дзейнасць Жыгімонта Аўгуста. М. Доўнар-Запольскі падкрэсліваў, што Інфлянцкая вайна стала прычынай узмацнення падаткового ціску і кардынальных зменаў у эканамічнай палітыцы дзяржавы. Ён найбольш глыбока і дэталёва разгледзеў узаемасувязь паміж удзелам у вайне і крызісам фінансава-матэрыяльных рэсурсаў.

Польскіх даследчыкаў гісторыі ВКЛ цікавіла найперш пытанне уніі з Каронай і развіццё «шляхецкай дэмакратыі». У працах О. Галецкага, Л. Калянкоўскага, Ю. Бардаха, Г. Віснера, Г. Люлевіча і інш. Інфлянцкая вайна разглядалася як чыннік, які прыспешыў заключэнне уніі ў варунках крызіснага становішча Княства[44]. Аднак далей канстатацыі гэтага факту даследчыкі, па вялікім рахунку, не пайшлі. Нярэдка унія малявалася як адзіны шлях выратавання ВКЛ ад пагрозы паглынання Масковіяй. Гэтак жа салідарна польскія навукоўцы акцэнтавалі ўвагу на дадатным значэнні польскай вайсковай і фінансавай дапамогі Княству.

Сярод даследаванняў нашых заходніх суседзяў трэба асабліва адзначыць арыгінальную працу Р. Мяніцкага, у якой ён закрануў праблему маскоўскай каланізацыі на Полаччыне і звярнуў увагу на дэмаграфіч-

[44] H a l e c k i O. Dzieje unii jagiellońskiej. T. 2. Kraków, 1920; K o l a n k o w s k i L. Polska Jagiellonów: Dzieje polityczne. Olsztyn, 1991; B a r d a c h J. Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVII w. Warszawa, 1970; W i s n e r H. Najjaśniejsza Rzeczpospolita. Szkice z dziejów Polski szlacheckiej XVI–XVIII wieku. Warszawa, 2002; L u l e w i c z H. Gniewów o unię ciąg dalszy: Stosunki polsko-litewskie w latach 1569–1586. Warszawa, 2002.

ныя змены ў раёне ваенных дзеянняў[45]. Варта згадаць таксама даследаванне Г. Лаўмяньскага, дзе дадзены аналіз дэмаграфічнага развіцця ВКЛ у XVI ст.[46] Застаецца дадаць, што ні беларуская, ні расійска-савецкая, ні літоўская гістарыяграфіі не надавалі ўвагі комплекснаму аналізу ўплыву ваеннага становішча на сацыяльна-палітычнае і гаспадарчае развіццё Княства.

На гэтым пералік асноўных прац па праблеме можна завяршыць. Як бачым, стан яе вывучэння з'яўляецца яўна нездавальняльным. Ужо толькі гэта вызначае актуальнасць даследавання, якое прапануецца ўвазе чытача. Яно грунтуецца ў асноўным на матэрыялах Метрыкі ВКЛ[47]. Некаторыя з яе кніг амаль цалкам прысвечаны пытанням, звязаным з арганізацыяй войска і абарончых мерапрыемстваў у гады Інфлянцкай вайны, з мабілізацыяй і размеркаваннем сродкаў, якія ішлі на ваенна-абарончыя мэты.

Важнай крыніцай для характарыстыкі развіцця прававых і палітычных зносін у ВКЛ з'яўляюцца помнікі заканадаўчай дзейнасці. У іх шэрагу ў першую чаргу трэба назваць Статуты ВКЛ 1529 і 1566 гг., у якіх вызначаюцца, у прыватнасці, характар і нормы выканання земскіх павіннасцей, месца і роля асобных сацыяльных слаёў у палітычнай структуры і жыцці дзяржавы[48]. Сярод іншых найважнейшых помнікаў заканадаўчага характару трэба згадаць соймавыя ўхвалы і рэцэсы, а таксама рознага кшталту гаспадарскія прывілеі[49].

Для характарыстыкі дыпламатычных кантактаў паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай першаснай крыніцай з'яўляюцца пасольскія кнігі, у якіх змяшчаюцца каштоўныя апісанні і справаздачы пасольстваў[50]. Маскоўскія пасольскія кнігі вызначаюцца асаблівай інфарматыўнасцю. У іх можна прасачыць імкненне апісаць кожную, нават нязначную, дэ-

45 Mienicki R. Egzulanci Połłoccy…

46 Łowmiański H. Zaludnienie państwa litewskiego w wieku XVI: Zaludnienie w roku 1528. Poznań, 1998.

47 Многія выкарыстаныя кнігі Метрыкі ВКЛ выдадзены ў Літве, Беларусі і дарэвалюцыйнай Расіі. Гл. спіс крыніц і літаратуры.

48 Первый Литовский Статут (1529 г.) / Под ред. С. Лазутки, И. Валиконите и Э. Гудавичюса. Вильнюс, 2004; Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. Мн., 2003.

49 Матэрыялы соймаў ВКЛ надрукаваны ў: АЛРГ / Изд. М. Довнар-Запольский. Т. 2. М., 1897; РИБ. Т. 30: Литовская Метрика. Книги публичных дел. Юрьев, 1914.

50 РИО. Т. 59, 71: Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским. М., 1887–1892.

таль перамоў. Пасольскія кнігі ВКЛ, у адрозненне ад маскоўскіх, больш лаканічныя і змяшчаюць толькі дакументы дыпламатычнай перапіскі[51].

Для характарыстыкі арганізацыі войска ВКЛ асноўнай крыніцай служаць попісы паспалітага рушэння ВКЛ 1565 і 1567 гг.[52] Дзякуючы статыстычным падлікам можна вызначыць характар вайсковай мабілізацыі шляхты, хуткасць збораў, ступень прадстаўніцтва ад асобных паветаў і ваяводстваў. Аднак інфармацыя гэтых крыніц не з'яўляецца абсалютна дакладнай з прычыны спецыфікі і непаўнаты дадзеных.

Нельга абысці ўвагай і іншыя дакументальныя матэрыялы статыстычнага характару. Каштоўныя звесткі для характарыстыкі сацыядэмаграфічнай сітуацыі на Полаччыне на пераломе 60–70-х гг. XVI ст. змяшчаюць маскоўскія пісцовыя кнігі, якія апынуліся ў комплексе дакументаў Метрыкі ВКЛ[53]. У іх дадзена дэталёвае апісанне фарміравання мяжы паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай паводле перамірных грамат 1570 г., зафіксаваны памеры і колькасць зямельных надзелаў, раздадзеных маскоўскім памешчыкам, ахарактарызаваны стан населеных пунктаў Полацкай зямлі. Дзякуючы гэтай інфармацыі стала магчымым зрабіць характарыстыку маскоўскай каланізацыйнай палітыкі і дэмаграфічнай сітуацыі на Полаччыне.

У асобную групу трэба вылучыць наратыўныя крыніцы разнастайнага паходжання, характару і зместу. Грунтоўнае апісанне ваенных і палітычных падзей падаюць польска-літоўскія хронікі. Асаблівае значэнне маюць хронікі М. Стрыйкоўскага і А. Гваньіні, аўтары якіх былі непасрэднымі ўдзельнікамі Інфлянцкай вайны[54]. У іх падрабязна выкладзены ход асноўных ваенных падзей. Імкнучыся абгрунтаваць справядлівасць вайны з польска-літоўскага боку, аўтары хронік нярэдка выкарыстоўвалі прыёмы гіпербалізацыі дадзеных (асабліва пры апісанні ваенных выправаў і бітваў) і суб'ектыўнай інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў.

Важнае месца сярод крыніц займаюць летапісныя помнікі. Значэнне летапісаў, створаных у Маскоўскай дзяржаве, заключаецца перш за ўсё ў адлюстраванні афіцыйнага пункта гледжання маскоўскага

---

51 Книга посольская Метрики Великого княжества Литовского / Ред. М. Оболенский, И. Данилович. Т. 1. М., 1843.

52 РИБ. Т. 33: Литовская Метрика. Переписи Литовского войска. Петроград, 1915.

53 ПКМГ / Под ред. Н. Калачова. Ч. 1. Отд. 2. СПб., 1877.

54 Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Żmódzka i wszystkiej Rusi. T. 2. Warszawa, 1846; Gwagnini A. Kronika Sarmacyey Europeyskiey // Zbior dzieiepisow polskich. T. 4. Warszawa, 1768.

кіраўніцтва на палітычныя падзеі і працэсы ва Усходняй Еўропе ў вывучаемы перыяд[55]. Асобнае месца сярод гэтых крыніц займаюць пскоўскія летапісы, якія вызначаюцца вялікай ступенню бесстароннасці ў параўнанні з маскоўскімі летапіснымі зводамі[56].

У сваю чаргу, літоўска-беларускія летапісы ў дачыненні да вывучаемага часу з'яўляюцца малаінфарматыўнымі крыніцамі. У іх толькі канстатуюцца найбольш важныя факты палітычнага жыцця ВКЛ, не праводзіцца падрабязны разгляд падзей і, як правіла, не даецца іх ацэнка[57].

Для характарыстыкі грамадскіх настрояў шмат цікавай і важнай інфармацыі падаюць мемуарныя і эпісталярныя крыніцы. Сярод мемуарных помнікаў трэба адзначыць успаміны Фёдара Еўлашоўскага — удзельніка ваенных дзеянняў[58]. У іх ён даў уласную ацэнку Інфлянцкай вайны, адлюстроўваючы стаўленне звычайнага жыхара ВКЛ да гэтай падзеі.

Эпісталярныя крыніцы ў асноўным прадстаўлены перапіскай дзяржаўных дзеячаў ВКЛ і Польшчы. У іх адлюстроўваліся палітычныя погляды гэтых людзей, іх стаўленне да вайны і яе перспектыў, унійнай палітыкі гаспадара і інш. Асабліва змястоўным з'яўляецца комплекс лістоў Жыгімонта Аўгуста да Радзівілаў[59]. Нельга не адзначыць і ліставанне паміж гетманамі Рыгорам Хадкевічам і Раманам Сангушкам, якое дае шмат інфармацыі для характарыстыкі сітуацыі ў зоне баявых дзеянняў у другой палове 60-х гг. XVI ст.[60] Заўважым, што не раз перапіска паміж магнатамі выкарыстоўвалася ў якасці асновы для зместу «лятучых лісткоў» — першых правобразаў масавых перыядычных выданняў, якія распаўсюджваліся на тэрыторыі Еўропы.

Своеасаблівым «поглядам збоку» на Інфлянцкую вайну і ўнутрыпалітычныя працэсы ў ВКЛ з'яўляюцца рэляцыі замежных дыпламатаў і падарожнікаў. Сярод іх трэба адзначыць справаздачы і лісты папскіх нунцыяў Я. Камэндоні і Ф. Руджэры[61].

---

55 Падобны пункт гледжання прадстаўляюць Ніканаўскі, Лебедзеўскі, Аляксандра-Неўскі летапісы: ПСРЛ. Т. 13, 29. М., 1965.
56 ПЛ / Под ред. А. Насонова. Вып. 2. М., 1955.
57 ПСРЛ. Т. 32, 34. М., 1975–1978.
58 «Гістарычныя запіскі» Ф. Еўлашоўскага / Уклад. У. Свяжынскі. Мн., 1990.
59 Listy króla Zygmunta Augusta do Radziwiłłów / Oprac. I. Kaniewska. Kraków, 1999.
60 AS / Wyd. B. Gorczak i Z. Luba-Radzimiński. T. 7. Lwów, 1910.
61 Commendoni J. Pamiętniki o dawnej Polsce z czasów Zygmunta Augusta / Wyd. J. Albertrandi, M. Malinowski. T. 1. Wilno, 1847; Relacje nuncjuszów apostolskich i innych osób o Polsce od r. 1548 do 1690. T. 1. Berlin; Poznań, 1864.

Важную ролю пры характарыстыцы сацыяльна-палітычных працэсаў у ВКЛ у сярэдзіне XVI ст. выконваюць разнастайныя публіцыстычныя і палемічныя творы. Яны служылі своеасаблівай ідэалагічнай зброяй у палітычнай барацьбе. Асабліва важнае месца сярод іх займае «Размова Паляка з Літвінам», дзе адстойваецца палітычная самастойнасць Княства ў змаганні з польскімі ўплывамі[62].

Было б няшчыра сцвярджаць, што ў нашым даследаванні былі выкарыстаны ўсе вядомыя крыніцы. Шмат якія архівы і бібліятэкі аказаліся недасягальнымі з шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын. Не найлепшым чынам удалося скарыстаць напрацоўкі калег з прыбалтыйскіх краін. Засталося некранутым шырокае кола пытанняў, якія можна было б паставіць як даследчыцкія праблемы. Цалкам верагодна, што многія пытанні, разгледжаныя ў нашай працы, будуць у будучыні ўдакладнены і, магчыма, перагледжаны.

У пэўны момант, аднак, паўстала неабходнасць паставіць кропку. Прызнаемся, што немалую ролю ў гэтым адыграла амбіцыйнае жаданне прадставіць вынікі працяглай працы шырокай навуковай грамадскасці. Аднак больш істотнай была ўпэўненасць, што ўдалося збудаваць пэўную канцэптуальную канструкцыю, якую патэнцыяльныя ўдакладненні і дапаўненні не павінны змяніць істотна. Таксама немалаважнай матывацыяй для з'яўлення на свет гэтай кнігі было імкненне зрабіць свой унёсак у фонд беларускай гістарыяграфіі ваенна-палітычнай гісторыі ВКЛ, якая, на жаль, развіваецца пакуль што не самымі імклівымі тэмпамі.

Спадзяюся, што мне ўдалося намаляваць рэчаісную карціну ўдзелу Вялікага Княства Літоўскага ў Інфлянцкай вайне 1558–1570 гг. і яе ўплыву на ўнутранае жыццё дзяржавы і грамадства. Яна чакае сваёй канструктыўнай крытыкі, якая выклікае ўдзячную рэакцыю аўтара.

Гэтая кніга не была б створана без падтрымкі і дапамогі сяброў і калег. З цёплымі словамі падзякі звяртаюся да Генадзя і Альбіны Семянчукоў, якія са студэнцкіх гадоў натхнялі мяне на даследчыцкую працу. Хацелася б выказаць словы ўдзячнасці навуковаму кіраўніку Георгію Штыхаву, а таксама Георгію Галенчанку, Генадзю Сагановічу, Юрыю Бохану, Андрэю Радаману і Аляксею Шаландзе за каштоўныя парады падчас работы над кнігай. Асаблівую падзяку я складаю Віктару Цемушаву за стварэнне карты «Тэрыторыя паўночна-усходняй Беларусі падчас Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг.». Дзякуючы дапамозе і апецы польскіх

[62] Rozmowa Polaka z Litwinem / Wyd. J. Korzeniowski. Kraków, 1890.

калег Кшыштафа Петкевіча, Анджэя Закшэўскага, Марэка Фэрэнца, Марэка Яніцкага і інш. мне было значна прасцей працаваць у бібліятэках і архівах Варшавы, Познані і Кракава. А ўтульная сямейная атмасфера, якую стварылі мая жонка Алёна і дачка Катарына, дазволіла мне нарэшце завяршыць рукапіс.

Даследчая праца за мяжой і выхад кнігі з друку не былі б магчымымі без матэрыяльнай падтрымкі з боку Беларускага інстытута правазнаўства, Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў, Амерыканскага савета навуковых таварыстваў (ACLS), Польскага камітэта па справах ЮНЕСКА, Фундацыі падтрымкі навукі «Каса ім. Ю. Мяноўскага» (Варшава), Фундацыі каралевы Ядвігі Ягелонскага універсітэта (Кракаў), Нямецкага гістарычнага інстытута ў Варшаве. Супрацоўнікам гэтых арганізацый я таксама выказваю шчырую падзяку за дапамогу і супрацоўніцтва.

# РАЗДЗЕЛ I

# ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ І ДЫПЛАМАТЫЧНЫЯ ЗНОСІНЫ ПАМІЖ ВКЛ І МАСКОЎСКАЙ ДЗЯРЖАВАЙ

## § 1. Пачатак барацьбы за Інфлянты (1558–1561 гг.)

Перадгісторыя і пачатковы перыяд Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг. уяўляюць асаблівую цікавасць для даследчыка, бо менавіта ў гэты час завязаўся той клубок супярэчнасцей, які вызначаў спецыфічную сутнасць ваеннага супрацьборства паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай.

Гэтыя наймацнейшыя дзяржавы-суседкі не прамарудзілі скарыстацца крызісным становішчам Інфлянтаў у сваіх інтарэсах. Яны амаль сінхронна распачалі дзеянні па пашырэнні свайго ўплыву ў гэтай прыбалтыйскай краіне.

Вялікі князь літоўскі Жыгімонт Аўгуст пачаў праяўляць пільную зацікаўленасць справамі ў Інфлянтах з 1552 г. У хуткім часе па ініцыятыве прускага князя Альбрэхта на вялікакняжацкім двары пачалі будавацца канкрэтныя планы па ўзмацненні ўплыву ў Інфлянцкай дзяржаве. У агульных рысах яны былі распрацаваны ў 1554–1555 гг.[1] З другой паловы

[1] J a s n o w s k i J. Mikołaj Czarny Radziwiłł. S. 197; O l e w n i k J. Polsko-pruski plan... S. 406–408; W i j a c z k a J. Prusy Książęce a Polska... S. 70–75.

50-х гг. XVI ст. інфлянцкі напрамак паступова становіцца прыярытэтным у знешняй палітыцы ВКЛ.

Зацікаўленасць ВКЛ у падпарадкаванні Інфлянтаў вынікала перадусім са стратэгічна-абарончых меркаванняў і гандлёва-эканамічных інтарэсаў краіны. Геапалітычнае становішча Інфлянтаў дазваляла кантраляваць паўночныя раёны Маскоўскай дзяржавы, стварыць супраць яе шырокі наступальна-абарончы плацдарм. Значныя стратэгічныя выгады ад падпарадкавання Інфлянтаў давалі выдатную магчымасць палепшыць знешнепалітычнае становішча ВКЛ. Гэта было асабліва актуальным пры бесперапынным супрацьстаянні з усходнім суседам і пагрозе ўзнаўлення з ім ваенных дзеянняў.

Адначасова кантроль над інфлянцкай тэрыторыяй даваў магчымасць сачыць за развіццём падзей у Балтыйскім моры і, улічваючы наяўнасць выдатнай партовай інфраструктуры, — будаваць уласную балтыйскую палітыку. Як паказалі польскія даследчыкі, памкненні да ўсталявання свайго кантролю над басейнам Балтыйскага мора з'яўляліся адной з галоўных знешнепалітычных задач для Жыгімонта Аўгуста[2]. Інфлянцкая палітыка гаспадара была адным з асноўных элементаў яго шырокамаштабных намераў авалодаць ключавымі пазіцыямі ў балтыйскім рэгіёне.

Кантраляванне Інфлянтаў было важным з пункту гледжання гандлёва-эканамічных інтарэсаў ВКЛ. Рака Дзвіна цесна звязвала паўночна-ўсходнія раёны ВКЛ з Інфлянтамі. Цесна злучанай з прыбалтыйскай краінай з прычыны свайго геаграфічнага месцазнаходжання была таксама Жамойцкая зямля. Дзвінскі гандлёвы шлях быў адным з найважнейшых выхадаў у Балтыйскае мора і звязваў ВКЛ з Заходняй Еўропай[3]. Спрыяльная кан'юнктура ў гандлі збожжам і іншымі таварамі дыктавала неабходнасць авалодання ключавымі камунікацыйнымі артэрыямі дзеля павелічэння аб'ёмаў гандлёвага абмену. Кантроль над партовымі гарадамі ў Інфлянтах даваў магчымасць больш хутка і беспасрэдна кантактаваць з гандлярамі з Захаду.

Зацікаўленасць вышэйшых кіроўных колаў ВКЛ, безумоўна, выклікалі і багатыя землі Інфлянтаў. Магчымасць пашырыць землеўладанні за кошт добра апрацаваных інфлянцкіх зямель вабіла магнацтва

2 Bodniak S. Polska a Bałtyk… S. 280–282; Lepszy K. Dzieje floty polskiej. S. 237–239.
3 Павулан А. Хозяйственное и политическое значение даугавского торгового пути в XIII–XVII вв. // Экономические связи Прибалтики с Россией. Рига, 1968. С. 87–89.

і шляхту ВКЛ. Гэты каланізацыйны фактар асабліва выразна выяўляўся ў настроях грамадства ў першыя гады Інфлянцкай вайны[4]. Аднак кіраўніцтва ВКЛ было вымушана стрымліваць падобныя памкненні, жадаючы заручыцца падтрымкай мясцовых эліт у Інфлянтах.

Сутнасць планаў Жыгімонта Аўгуста і Альбрэхта па падпарадкаванні Інфлянтаў заключалася ў авалоданні праз сваіх стаўленікаў ключавымі адміністрацыйнымі пасадамі і ў далейшай секулярызацыі духоўных дзяржаўных утварэнняў у Інфлянтах. За ўзор трансфармацыі палітычнага ладу і дзяржаўных структур была выбраная пруская мадэль. Правадніком гэтых планаў у Інфлянтах павінен быў стаць рыжскі арцыбіскуп Вільгельм[5].

Аднак рэалізацыя гэтых планаў наткнулася на жорсткае супрацьдзеянне з боку Інфлянцкага Ордэна. Ордэнскі магістр Вільгельм Фюрстэнберг справядліва бачыў у іх пагрозу для існавання Інфлянцкай дзяржавы. Арышт рыжскага арцыбіскупа ордэнскімі ўладамі ў 1556 г. рэзка пагоршыў узаемадачыненні Інфлянцкага Ордэна з Польшчай і ВКЛ. Засяродзіць увагу на інфлянцкіх справах кіраўніцтву ВКЛ дазволіла заключанае ў гэтым жа годзе шасцігадовае перамір'е з Маскоўскай дзяржавай, а таксама адносна добрыя стасункі з Крымскім ханствам. У 1557 г. Жыгімонт Аўгуст аб'явіў вайну Інфлянцкаму Ордэну. Польска-літоўска-прускае войска рушыла ў напрамку Інфлянтаў. У выніку праведзеных на мяжы ВКЛ з Інфлянтамі перамоў Ордэн быў вымушаны пагадзіцца на ўмовы гаспадара Польшчы і ВКЛ. Дзякуючы заключанай 14 верасня 1557 г. Пазвольскай дамове ва ўнутрыпалітычным канфлікце ў Інфлянтах верх узяла пралітоўская партыя. У хуткім часе гэтае змяненне сітуацыі ў Інфлянтах прывяло да выбару на пасаду магістра Інфлянцкага Ордэна Г. Кетлера — кіраўніка гэтай партыі[6].

Разам з актывізацыяй інфлянцкай палітыкі ВКЛ чакала абвастрэнне сітуацыі на паўднёвай мяжы. У канцы 1557 г. крымскія татары нечакана здзейснілі нападзенне на землі Валыні і Падолля. Гэтая акцыя мела спусташальныя наступствы для мясцовага насельніцтва. Паводле інфар-

---

4 РИБ. Т. 30. С. 270–271.

5 Karwowski S. Wcielenie Inflant... S. 21–23; Jasnowski J. Mikołaj Czarny Radziwiłł. S. 145–158; Wijaczka J. Prusy Książęce a Polska... S. 71–75.

6 Jasnowski J. Mikołaj Czarny Radziwiłł. S. 180–187; Гл. найноўшае даследаванне: Stancelis V. 1557 m. Pasvalio sutartys — permainų Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės santykiuose su Hohencolernų dinastija rezultatas // Lietuvos valstybė XII–XVII a. Vilnius, 1997. P. 285–298.

мацыі маскоўскага летапісу, татары захапілі ў палон больш за 40 тысяч чалавек[7].

Паход крымскіх татар на Валынь не быў выпадковым. У студзені 1558 г. Маскву наведаў крымскі пасол Янбулдуй Мелдэш, які перадаў прапановы свайго гаспадара. Крымскі хан хацеў заключыць двухбаковае пагадненне з Масковіяй: *«Царь правду учинил, что быти в дружбе и в братстве»*. Яно мела б выразную антылітоўскую скіраванасць — невыпадкова крымскі пасол, пацвярджаючы сур'ёзнасць намераў Крыма, спасылаўся на нядаўні паход татар на Валынь[8].

Для крымскіх уладаў была характэрна палітыка балансавання паміж двума паўночнымі суседзямі, мэтай якой было забеспячэнне сваёй дзяржавы ад удараў з іх боку і атрыманне павялічаных «памінак». Маскоўская дзяржава ўсю другую палову 50-х гг. XVI ст. вяла наступленне на землі Крымскага ханства. Быў праведзены шэраг паспяховых ваенных выпраў. У Бахчысараі жадалі пазбавіцца гэтай праблемы, і, у сітуацыі ўнутраных ускладненняў, стаўка была зроблена на прымірэнне з Масквой.

У Крамлі ідэю міру з Крымскім ханствам катэгарычна адкінулі, называючы прычынай крывадушныя паводзіны татар у стасунках з суседзямі[9]. Маскоўцы не проста адхілілі іх прапановы, арыштаваўшы і абрабаваўшы паслоў, але і актывізавалі ваенныя дзеянні на крымскім памежжы, карыстаючыся паслугамі Дз. Вішнявецкага, які перайшоў у лістападзе 1557 г. на іх бок. Адначасова з прыёмам пасольства Янбулдуя Мелдэша ў студзені 1558 г. Іван IV адправіў яго ў паход супраць Крымскага ханства[10].

Верагодна, адмова ад міру з Бахчысараем была звязана як з агульнай антымусульманскай знешнепалітычнай стратэгіяй Масквы, якой яна прытрымлівалася ў 50-я гг. XVI ст., так і з тым, што ў Крамлі выРашылі аб'яднаць свае сілы з Літвой для барацьбы з крымскімі татарамі. З іншага боку, заключэннем антыкрымскага пагаднення з ВКЛ маскоўскае кіраўніцтва хацела звязаць літвінам рукі на інфлянцкім напрамку. Мяр-

---

7 ПСРЛ. Т. 13. С. 289; РИО. Т. 59. С. 550.

8 *«А сказывал Федор* (Фёдар Загражскі, маскоўскі пасол у Крымскім ханстве, які вярнуўся з Янбулдуем Мелдэшам), *што царь правду учинил, что быти в дружбе и в братстве, и царевичя сына своего на короля Литовского отпустил...»* (ПСРЛ. Т. 13. С. 288). Гл. таксама: РИО. Т. 59. С. 541.

9 *«...Поминки емлет и правду дает, а вселды изменяет»* (ПСРЛ. Т. 13. С. 288).

10 Тамсама. С. 286–288.

куючы па ўсім, у Маскве былі цалкам упэўнены, што ў Вільні не адмовяцца ад гэтай прапановы, памятаючы пра вынікі спусташальнага набегу крымскіх татар у канцы 1557 г.

Атрымаўшы адмоўны адказ, крымскі хан Дэўлет-Гірэй быў вымушаны вярнуцца да хаўрусніцкай палітыкі з ВКЛ. Напэўна, гэтае рашэнне далося яму не без цяжкасцей, бо крымскае пасольства наведала Літву толькі ў пачатку 1559 г., праз год пасля нападзення татар на землі ВКЛ.

У студзені 1558 г. выправай маскоўскага войска ўглыб Інфлянтаў пачалася Інфлянцкая вайна. Непасрэднай прычынай пачатку ваенных дзеянняў стала невыкананне Інфлянтамі абавязкаў па дамове з Маскоўскай дзяржавай, заключанай у 1554 г. У гістарыяграфіі выказвалася думка, што гэтая дамова з'яўлялася своеасаблівай дыпламатычнай падрыхтоўкай да вайны[11]. Аднак логіка падзей сведчыць на карысць меркавання, што Масква бачыла і мірныя альтэрнатывы падпарадкавання прыбалтыйскай дзяржавы. Пераканаўчую аргументацыю на гэты конт прывёў І. Шаскольскі[12]. Ультыматыўны тон некаторых артыкулаў дамовы, на наш погляд, павінен быў лішні раз падкрэсліць рашучасць Масковіі ў дасягненні пастаўленых мэтаў. Урад Івана IV цярпліва чакаў сканчэння трохгадовага тэрміну перамір'я і не займаўся пошукам новых зачэпак да вайны, якіх пры жаданні можна было знайсці больш чым дастаткова. Магчымасць вайны, зразумела, не выключалася, аднак да 1558 г. маскоўскае кіраўніцтва абмяжоўвалася дыпламатычнымі сродкамі для змянення характару стасункаў з Інфлянтамі.

У тэксце дамовы 1554 г. меўся таксама пункт аб забароне Інфлянтам уступаць у ваенныя хаўрусы з Польшчай, Літвой і Швецыяй. Аднак пры заключэнні Пазвольскай дамовы паміж ВКЛ і Інфлянтамі ў 1557 г. было падпісана патаемнае пагадненне аб ваеннай узаемадапамозе. Яно пачынала дзейнічаць толькі пасля завяршэння ў 1562 г. перамір'я паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай. Калі б да гэтага часу Інфлянцкая дзяржава зве-

11 Королюк В. Ливонская война. С. 27–28; Коротков И. Иван Грозный: Военная деятельность. М., 1952. С. 44–45.

12 Шаскольский И. Русско-ливонские переговоры 1554 г. и вопрос о ливонской дани // Международные связи России до XVII в. М., 1961. С. 376–399. С. Шмідт пераканаўча паказаў, што прыхільнікам дыпламатычнага вырашэння інфлянцкай праблемы з'яўляўся кіраўнік «Выбранай рады» Аляксей Адашаў: Шмидт С. А. Ф. Адашев и Ливонская война // Спорные вопросы отечественной истории XI–XVIII веков. Ч. 2. М., 1990. С. 303–306. Гэтае меркаванне падтрымаў і канструктыўна развіў А. Вінаградаў: История внешней политики России. С. 158–161.

дала нападзенне, ВКЛ не было абавязана дапамагаць сваёй паўночнай суседцы[13].

На дадзены факт мала хто з савецкіх і расійскіх даследчыкаў звяртаў увагу. У той жа час парушэнне артыкула дамовы 1554 г. лічылася ў гістарыяграфіі непасрэднай падставай для распачынання Інфлянцкай вайны. І. Шаскольскі паказаў, што артыкул пра забарону заключаць ваенныя пагадненні з ВКЛ пераходзіў з пачатку XVI ст. з дамовы ў дамову і меў толькі фармальнае значэнне. Нідзе ў дакументальных крыніцах, якія з'явіліся на свет напярэдадні ці на пачатку Інфлянцкай вайны, няма згадак аб парушэнні гэтага артыкула як аб падставе для разгортвання ваенных дзеянняў. Афіцыйныя маскоўскія крыніцы — летапісы і пасольскія кнігі — не разглядаюць ваенную выправу ў студзені 1558 г. як рэакцыю на ўмяшанне ВКЛ у інфлянцкія справы[14]. Верагодна, сувязь паміж пазвольскімі падзеямі і пачаткам Інфлянцкай вайны пастулявалася толькі на падставе храналагічнай блізкасці падзей.

На нашу думку, на мяжы 1557–1558 гг. у Маскве ўвогуле не ведалі ні пра восеньскі паход войска ВКЛ у Інфлянты, ні пра заключанае ў Пазволі пагадненне. Гэта пацвярджае пазнейшая дыпламатычная палеміка. У грамаце ад 6 верасня 1560 г., адпраўленай разам з маскоўскім пасланнікам М. Сушчавым, літоўскі гаспадар здзіўляўся, чаму Іван IV аніяк не адрэагаваў на пазвольскія падзеі[15]. Больш за тое, ён насміхаўся з цара за яго няведанне аб развіцці літоўска-інфлянцкіх дачыненняў у 1557 г.[16]

І сапраўды, у лістападзе 1557 г. вялікае маскоўскае войска стаяла на мяжы з Інфлянтамі[17]. Паўстае пытанне, чаму яно адразу не выступіла ў паход, ведаючы пра падзеі пад Пазволем? Гэта яшчэ адзін доказ, што ў Маскве пра іх папросту не ведалі.

---

13 Karwowski S. Wcielenie Inflant... S. 42; Jasnowski J. Mikołaj Czarny Radziwiłł. S. 184–185.

14 Першая інфармацыя пра «пазвольскую выправу» прасочваецца толькі ў справаздачы пасольства Р. Алфер'ева, якое вярнулася ў Маскву ў траўні 1558 г.: РИО. Т. 59. С. 549.

15 *«И коли твои* [Інфлянты] *были, чому еси в тот час на оборону им сил и справедливости своее не оказал, альбо им в подданьство нам поддаватисе не забронил?»* (Книга посольская... Т. 1. С. 193–194).

16 *«А годно ль не ведати великому Господару, кгды на землю его* (маюцца на ўвазе Інфлянты. — *А. Я.*) *противъные войска тягнуть?»* (Тамсама. С. 194).

17 *«Того же месяца* (лістапад 1557 г.) *царь и великий князь отпустил ратию на маистра Ливонского и на всю землю Ливоньскую за то, что целовали крест государю дань привести по гривне с человека с Юрьевские области и в ыных земьских делех да не исправили по перемирным грамотам ни в чом и дани не привезли и, на чом целовали, в том в всем солгали»* (ПСРЛ. Т. 13. С. 286–287).

Цалкам верагодна, што першапачаткова збор маскоўскіх узброеных сіл задумваўся толькі як дэманстрацыя сілы перад інфлянцкімі пасламі. Інфлянцкае пасольства, якое прыбыло ў Маскву ў снежні 1557 г., не прывезла з сабой доўгачаканай «юр'еўскай даніны». У Маскве вырашылі, што інфлянцы банальна зацягваюць час[18].

Неабходна ўлічваць і тое, што на сабранае ў лістападзе 1557 г. маскоўскае войска са скарбу выдаткоўваліся вялікія грошы. У 1556–1557 гг. у Масковіі здарыліся вялікія неўраджаі, якія выклікалі істотнае пагаршэнне фінансава-гаспадарчай сітуацыі ў краіне[19]. Маскоўскія дыпламаты паведамлялі інфлянцкім паслам аб значным росце коштаў зброі[20]. Цалкам магчыма, што «юр'еўская даніна» павінна была кампенсаваць расходы на ўтрыманне арміі.

Пасол германскага імператара Геранім Гофман, які наведаў Маскоўскую дзяржаву ў 1560 г. з мэтай спыніць эскалацыю ваеннага канфлікту, пісаў, што, даведаўшыся пра адсутнасць у інфлянцкіх паслоў грошай для выплаты «юр'еўскай даніны» і адпаведных паўнамоцтваў для вядзення перамоў, *«великий князь разгневался на них и в великой ярости стал рвать на себе одежду и сказал обоим посольствам* (гаворка ідзе пра пасольствы ордэнскага магістра і дэрпцкага біскупа)*, не считают ли они его за дурака, (...) и велел опустошать дерптское епископство и всю Ливонию огнем»*[21]. Магчыма, менавіта гэты выбух царскага гневу і прывёў да пачатку ваенных дзеянняў у Інфлянтах.

Б. Флора справядліва піша, што ў пачатку 1558 г. ваенная акцыя супраць Інфлянтаў не разглядалася ў Маскве як разгортванне шырокамаштабнай вайны[22]. Па сваім характары гэтая выправа нагадвала набегі крымскіх татар на «рускія» землі, у якіх мэтай не з'яўляўся захоп тэрыторыі[23]. Пасля гэтага «папярэджання» ў Маскве зноў разлічвалі на прыезд інфлянцкіх паслоў, якія нарэшце павінны былі выканаць варункі дамо-

[18] Ход перамоў адлюстраваны ў дзённіку пасла Т. Хёрнера: Дневник ливонского посольства к царю Ивану Васильевичу, веденный Томасом Хернером // Чтения в обществе истории и древностей российских при Московском университете. 1886. Кн. 4. Отд. 4. С. 5–17.

[19] Скрынников Р. Начало опричнины. Ленинград, 1966. С. 127–128.

[20] Дневник ливонского посольства... С. 15–16.

[21] Посольство И. Гофмана в Ливонию и Русское государство в 1559–1560 гг. // Исторический архив. 1957. N 6. С. 137.

[22] Флоря Б. Иван Грозный. С. 128.

[23] Цікава, што асноўную масу войска склалі татары: ПСРЛ. Т. 13. С. 287; Разрядная книга 1475–1598 гг. / Подгот. В. Буганов. М., 1966. С. 170–171.

вы 1554 г. Паводле планаў маскоўцаў, канфлікт на гэтым быў бы вычарпаны, а іх уплыў у Інфлянтах — канчаткова ўмацаваны.

На пачатку 1558 г. гэты сцэнарый, здавалася, цалкам рэалізоўваўся. У сакавіку 1558 г. магістр Інфлянцкага Ордэна даслаў у Маскву ганца з просьбай спыніць ваенныя дзеянні і прыняць пасольства. У Крамлі далі згоду, чакаючы дакладнага выканання сваіх патрабаванняў[24].

У лютым 1558 г. з прапановамі заключэння саюза супраць Крымскага ханства ў ВКЛ з Масквы быў адпраўлены пасол Раман Алфер'еў. У Вільню ён прыехаў 24 сакавіка 1558 г.[25] У пасольскай кнізе матывы яго накіравання ў Літву былі ахарактарызаваны наступным чынам: *«А царь крымской был с королем в дружбе, а ныне королю досаду учинил великую: ино б в то время короля о дружбе задрати, доколе меж себя не помирились, чтоб в то время от крымского его отвести»*[26]. Такім чынам, у Маскве хацелі папярэдзіць магчымыя намеры літвінаў аднавіць сяброўскія стасункі з Крымскім ханствам, прапанаваўшы ім, са свайго боку, антыкрымскі хаўрус.

У «наказной памяти» Р. Алфер'ева выразна відаць планы Масковіі ў дачыненні да Крымскага ханства: *«А и над перекопским ныне промышляти хочет, сколко ему государю нашему Бог помочи подаст, а на христьянство с ним заодин стояти не хочет, а хочет того, чтоб как ему христьянству избаву учинити от насилованья татарского»*[27]. Не жадаючы займацца залішнім цытаваннем, дадамо, што па тэксце крыніцы яўна адчуваецца, што Іван IV лічыў сябе носьбітам высокай місіі вызваліцеля хрысціянства ад татара-мусульманскай пагрозы.

Як заўсёды, у задачы маскоўскага пасольства ўваходзілі разведачна-інфармацыйныя мэты. Яно павінна было высветліць намеры літвінаў у дачыненні да Інфлянтаў у сувязі з апошнімі падзеямі. Асабліва маскоўцаў цікавіла пытанне, ці будзе Вільня аказваць інфлянцам ваенную дапамогу[28].

Адзначым, што ў Маскве паведамленне аб нападзе крымскіх татар на ўкраінскія землі атрымалі толькі ў лютым 1558 г., г. зн. ужо пасля ўдару па Інфлянтах[29]. Гэта ўказвае на тое, што маскоўцаў не вельмі цікавіла рэ-

24 ПСРЛ. Т. 13. С. 290.
25 Книга посольская... Т. 1. С. 140–141.
26 РИО. Т. 59. С. 539.
27 Тамсама. С. 542.
28 Тамсама. С. 544.
29 Тамсама. С. 538–539.

акцыя Вільні на пачатак ваенных дзеянняў супраць Інфлянцкай дзяржавы. Верагодна, у Крамлі былі ўпэўнены, што Літва не ўмяшаецца ў інфлянцкі канфлікт пасля інертнай палітыкі падчас маскоўска-шведскай вайны 1554–1557 гг.

ВКЛ у пачатку 1558 г. апынулася перад складанай праблемай вызначэння прыярытэтаў сваёй знешняй палітыкі. Крымская выправа блытала ўсе карты, прымушаючы звяртаць пільную ўвагу на стан рэчаў на паўднёвай мяжы. Амаль адначасова прыйшла ашаламляльная вестка аб маскоўскім паходзе на Інфлянты. У сувязі з гэтым становіцца зразумела, чаму ў Вільні з такой увагай паставіліся да маскоўскіх прапаноў, прывезеных пасольствам Р. Алфер'ева.

Аднак, запэўніваючы маскоўскае пасольства ў сваёй зацікаўленасці ў гэтым саюзе, кіраўніцтва ВКЛ вырашыла праверыць, ці меў Бахчысарай санкцыю Стамбула на правядзенне антылітоўскай ваеннай акцыі. Нагадаем, што Крымскае ханства знаходзілася ў васальнай залежнасці ад Асманскай імперыі. Адначасова з адпраўленнем пасланніка ў асманскую сталіцу для высвятлення прычын нападзення татар на ўкраінскія землі былі адноўлены і сувязі з Бахчысараем.

Жыгімонт Аўгуст імкнуўся захаваць мірныя стасункі з Крымскім ханствам. Забягаючы наперад, адзначым, што да канца 1558 г. гаспадар ВКЛ здолеў дамагчыся ад Стамбула гарантый бяспекі з боку Крымскага ханства[30]. Крымскае пасольства, якое прыбыло ў Вільню ў сакавіку 1559 г., пацвердзіла нармалізацыю стасункаў. Іх канчатковае ўрэгуляванне адбылося ўлетку 1559 г.[31] Як толькі крымскі хан Дэўлет-Гірэй даслаў грамату з пацвярджэннем міру, у ВКЛ адразу звярнуліся да інфлянцкіх праблем.

Літоўскім палітыкам даводзілася доўгі час крывадушнічаць, запэўніваючы маскоўцаў у сваёй зацікаўленасці ў хаўрусе супраць татар. Нядзіўна, што пасольству Р. Алфер'ева ў Вільні быў аказаны добры прыём. Ужо толькі гэта павінна было даваць надзею маскоўскім дыпламатам на ўдалую рэалізацыю іх планаў. Паводле пасольскай справаздачы выразна прасочваюцца станоўчыя водгукі літвінаў на маскоўскія прапано-

---

30 Флоря Б. Проект антитурецкой коалиции в середине XVI в. // Россия, Польша и Причерноморье в XV–XVIII вв. М., 1979. С. 80–81.

31 Книга посольская... Т. 1. С. 161–163.

вы[32]. Супраць іх выступаў толькі адзін неназваны чалавек[33]. Магчыма, ім з'яўляўся канцлер ВКЛ і віленскі ваявода М. Радзівіл Чорны, вядомы сваім скептычным стаўленнем да перспектыў антыкрымскай барацьбы.

Р. Алфер'еў паведамляў аб канфрантацыі гэтага палітыка з найвышэйшым гетманам ВКЛ Мікалаем Радзівілам Рудым і троцкім ваяводам Геранімам Хадкевічам. Па словах маскоўскага пасла, М. Радзівіл Чорны не карыстаўся падтрымкай грамадскай думкі. Па Літве хадзілі чуткі, што пазвольская выправа 1557 г. не мела сэнсу і была карыснай толькі для яго.

Дацкі гісторык К. Расмусэн лічыць, што літоўскія палітыкі наўмысна паказвалі сваё добразычлівае стаўленне да маскоўскіх прапаноў, каб тым самым выйграць час для ўрэгулявання стасункаў з Бахчысараем[34]. З гэтым меркаваннем нельга не пагадзіцца. Цяжка ўявіць, каб у Вільні адразу адмовіліся ад планаў адносна Інфлянтаў і ўзяліся за ліквідацыю крымскай пагрозы. Аднак да высвятлення стасункаў з Крымскім ханствам распачынаць нейкія актыўныя дзеянні на інфлянцкім накірунку было небяспечна, улічваючы патэнцыяльную магчымасць вядзення вайны на два фронты.

Вынікі пасольства Р. Алфер'ева дазвалялі маскоўскаму кіраўніцтву з упэўненасцю меркаваць, што Літва пойдзе на падпісанне антыкрымскай дамовы, а значыць, не будзе ўмешвацца ў маскоўска-інфлянцкія дачыненні. Інфлянцкая праблема аніяк не была закранута нават у канфідэнцыяльных размовах. Здавалася, у Вільні маўкліва пагадзіліся з тым, што крызіс стасункаў Інфлянтаў з Масковіяй з'яўляецца іх унутранай двухбаковай справай.

Р. Алфер'еў вярнуўся ў Маскву 3 траўня 1558 г.[35] А ўжо 11 траўня 1558 г. адбыўся захоп маскоўскім войскам на чале з Аляксеем Басманавым важнага гандлёвага горада-порта Нарвы[36]. Узнікае пытанне, ці не

---

[32] У маскоўскай пасольскай кнізе захавалася просьба літвінаў: *«Бейте челом о том государя своего ближним людем, чтобы государя на то приводили и о том у него молили, чтобы меж государей был мир вековой христьянский; а мы о том безпрестанно молим и просим у государя своего, чтобы со государем с вашим был мир вековой; да государь наш того хочет, и толко бы ваш государь хотел»* (РИО. Т. 59. С. 549).

[33] У прыватнасці, гаспадарскі маршалак Міхайла Казінскі так казаў Р. Алфер'еву: *«...И государю и паном всем та говоря полюбилася, и хотят того все, чтобы меж государей был мир вековой; один у нас не хотел, ино того Бог на добро приводит; а не захочет, ино и его самого не будет»* (Тамсама).

[34] Rasmussen K. Die livländische Krise. S. 103–105.

[35] РИО. Т. 59. С. 545.

[36] ПСРЛ. Т. 13. С. 295–296.

былі гэтыя падзеі ўзаемазвязаны? Цалкам магчыма, што так, бо літвіны ніяк не адрэагавалі на дзеянні маскоўскіх жаўнераў у Інфлянтах узімку 1558 г. Масковія нібы атрымала санкцыю на працяг дзеянняў, накіраваных на падпарадкаванне гэтай прыбалтыйскай дзяржавы.

У той жа час відавочна, што рэзкай перамены маскоўскай палітыкі ў дачыненні да Інфлянтаў у сувязі з падзеямі ў Нарве ў красавіку-траўні 1558 г. не адбылося. Пераход да захопу замкаў на тэрыторыі Інфлянтаў меў дастаткова празрыстыя матывы. З поля даследчыцкай увагі звычайна знікае адзін істотны факт. У красавіку 1558 г. пасля двухбаковых абстрэлаў паміж Івангорадам і Нарвай пасланцы з гэтага інфлянцкага горада *«били челом государю о том, чтобы их взял в свое имя»*[37]. Гэта азначае, што маскоўскія ўлады атрымалі абяцанне пераходу Нарвы пад сваю юрысдыкцыю. Аднак жыхары горада вялі двайную гульню і адначасова распачалі перамовы з магістрам Ордэна аб дапамозе. Хутка нарвенцы адмовіліся ад сваіх абяцанняў, што ў Маскве было расцэнена як здрада. Маскоўскае кіраўніцтва, такім чынам, атрымала магчымасць абгрунтаваць свае прымусовыя дзеянні па ўсталяванні кантролю над Нарвай. Дадзеная акалічнасць паказвае, што ў Крамлі не імкнуліся да безаглядната захопу інфлянцкай тэрыторыі, стараючыся не выходзіць за рамкі прававога поля, прынамсі, у сваім разуменні. І толькі калі гэтыя меры не спрацоўвалі, справа даходзіла да ваеннага ціску.

Тым часам у Маскву прыбылі пасланнікі з ВКЛ Ян Валковіч (Волчак) і Лукаш Гарабурда. Яны пацвердзілі намеры свайго кіраўніцтва заключыць антыкрымскае пагадненне і папрасілі даць «опасные грамоты» для вялікіх паслоў з ВКЛ[38].

У сярэдзіне 1558 г. у Вільні працягвалі сур'ёзна непакоіцца за сітуацыю на паўднёвай мяжы. М. Радзівіл Руды папярэджваў аб небяспецы, якая пагражала ўкраінскім землям, заклікаючы звярнуць на яе першачарговую ўвагу. Прыходзілі паведамленні, паводле якіх турэцкая армія выступіла ў Малдавію і чакала аб'яднання з крымскім ханам. Не спынялася нанясенне «шкодаў» мірным жыхарам памежжа[39].

Цэнтральныя ўлады ВКЛ рабілі неабходныя захады для забеспячэння абароназдольнасці дзяржавы. У канцылярыі Жыгімонта Аўгуста

---

[37] Тамсама. С. 293.
[38] РИО. Т. 59. С. 551–561.
[39] Listy. S. 334–335.

ўлетку 1558 г. былі створаны «ваенныя лісты», якія, відаць, датычылі склікання паспалітага рушэння супраць крымскіх татар. На жаль, іх змест невядомы. У памежныя крэпасці на Украіне было паслана харчаванне і выдзелены сродкі для вярбоўкі найманых жаўнераў (у прыватнасці, на *«почт немалый»* для кіеўскага ваяводы)[40]. Такім чынам, у Літве ўсур'ёз былі занепакоены сітуацыяй на паўднёвай мяжы. Ігнараванне маскоўскіх прапаноў аб хаўрусе ў дадзены момант было б недаравальнай палітычнай памылкай.

Не будзем сцвярджаць катэгарычна, аднак цалкам магчыма, што прыезд літоўскіх пасланнікаў паслужыў сігналам для адпраўкі вялікага маскоўскага войска ў Інфлянты[41]. У выніку гэтай ваеннай аперацыі 18 ліпеня 1558 г. быў захоплены адзін з найбуйнейшых інфлянцкіх гарадоў Дэрпт.

Захоп маскоўцамі Дэрпта ўстрывожыў кіраўніцтва ВКЛ. Акупацыя інфлянцкай тэрыторыі азначала набліжэнне пагрозы для цэнтральных зямель Княства, асабліва для яго сталіцы Вільні. Не ў меншай ступені выклікаў трывогу стан дзяржаўнага скарбу. Для абмеркавання гэтых праблем на 28 кастрычніка 1558 г. была прызначана спецыяльная нарада вялікага князя і радных паноў ВКЛ[42].

Верагодна, па яе выніках 28 лістапада 1558 г. гаспадарская канцылярыя выдала лісты аб ўзнаўленні збору серабшчыны за 1556–1557 гг., якая не збіралася па прычыне заключэння перамір'я з Маскоўскай дзяржавай[43]. Адначасова ў Віцебск, Полацк і Браслаў былі высланы спецыяльныя лісты да мясцовых ваяводаў і старастаў. Ім прадпісвалася заставацца ў замках і ў выпадку неабходнасці быць гатовымі склікаць мясцовае рушэнне шляхты[44].

Такім чынам, кіраўніцтва ВКЛ ужо ў канцы 1558 г. не выключала абвастрэння зносін з Масковіяй і вырашыла загадзя рыхтавацца да магчымай вайны. Пры гэтым, як бачна, да ваеннай небяспекі ставіліся з усёй сур'ёзнасцю. Наўрад ці гэта было звычайнай перастрахоўкай.

---

40 НГАБ, ф. КМФ–18. Воп. 1. Спр. 37. Арк. 264–265.

41 У Ніканаўскім летапісе паведамленне аб прыездзе літоўскіх пасланнікаў стаіць адразу перад паведамленнем пра выправу маскоўскага войска ў Інфлянты: ПСРЛ. Т. 13. С. 300.

42 Listy. S. 337–339.

43 LM. Kn. 564 (1553–1567) / Parengė A. Baliulis. Vilnius, 1996. P. 27–31.

44 Вядома, што маскоўскія атрады падчас інфлянцкіх выправаў 1558–1560 гг. заходзілі на тэрыторыю ВКЛ: Ibidem.

Без сумневу, вынікі кастрычніцкай нарады паўплывалі на змест пасольскай граматы і выказванняў Васіля Тышкевіча, адпраўленага ў Маскву 20 снежня 1558 г.[45] Такі позні візіт літоўскага (нагадаем, што «опасные грамоты» на яго прыезд былі ўручаны яшчэ летам) можна патлумачыць тым, што ў Вільні чакалі вынікаў дыпламатычных місій у Бахчысараі і Стамбуле.

Пасольства В. Тышкевіча, М. Шымковіча і Я. Гайкі прывезла прапанову вечнага міру паміж дзяржавамі як неабходную ўмову для заключэння антыкрымскага хаўрусу[46]. Масковія павінна была вярнуць захоплены ў пачатку XVI ст. Смаленск і іншыя памежныя землі, а таксама адмовіцца ад прэтэнзій на Кіеў і ўсходнія землі ВКЛ. Коратка кажучы, з дапамогай антымусульманскага хаўрусу Вільня хацела дамагчыся ад Масквы адмовы ад знешнепалітычнай праграмы «збірання рускіх зямель». У запале палемікі В. Тышкевіч шчыра заявіў аб перспектывах супольнай барацьбы з Крымскім ханствам, што *«и толко крымсково избыв, и вам не на ком пасти, пасти вам на нас»*[47]. Тым самым пасол паказаў зацікаўленасць ВКЛ у існаванні татарскай дзяржавы як стрымлівальнага фактару экспансіяніསцкіх памкненняў Масковіі.

У Крамлі яўна не чакалі такога развіцця падзей. Рэакцыя на літоўскія прапановы была дастаткова рэзкай. Іх катэгарычна адкінулі, назваўшы *«безлепицей»*. Літвіны, у сваю чаргу, заявілі, што без вяртання захопленых зямель заключэнне хаўрусу ў выглядзе «вечнага міру» не мае сэнсу. Зразумела, пад падобнай фармулёўкай хавалася жаданне адмовіцца ад маскоўскай прапановы аб супольнай барацьбе з Крымскім ханствам.

11 сакавіка 1559 г. літвіны ўпершыню ў перамовах закранулі «інфлянцкае пытанне». Звернем увагу на два моманты. Нагодай для згадвання інфлянцкай праблемы паслужылі акты гвалту, учыненыя маскоўскімі жаўнерамі ва ўладаннях далёкага сваяка Жыгімонта Аўгуста, рыжскага арцыбіскупа Вільгельма. Літоўскі гаспадар прасіў спыніць ваенныя дзеянні, турбуючыся за бяспеку сваяка і мір сярод хрысціян[48]. Гэта сведчыла пра неабыякавасць да падзей у Прыбалтыцы. Аднак Жыгімонт Аўгуст не выступіў у абарону Інфлянцкай дзяржавы, а абмежаваўся

[45] Гэтай датай пазначаны гаспадарскі ліст для В. Тышкевіча: Книга посольская... Т. 1. С. 147–150.
[46] Як непаразуменне выглядае сцвярджэнне А. Вінаградава аб тым, што маскоўцы, а не літвіны прапанавалі ідэю «вечнага міру»: История внешней политики России. С. 156.
[47] РИО. Т. 59. С. 577.
[48] Тамсама. С. 577–578.

праяўленнем клопату аб бяспецы сваяка. Відавочна, у Літве не хацелі пакуль што выносіць інфлянцкае пытанне на афіцыйны ўзровень.

Літоўскія пaслы атрымалі адказ, у якім у катэгарычнай форме сцвярджалася, што, па-першае, інфлянцы з даўніх часоў падпарадкоўваліся Маскоўскай дзяржаве, па-другое, ваенныя дзеянні пачаліся з прычыны парушэння інфлянцамі двухбаковых дамоўленасцяў, і, па-трэцяе, маскоўска-інфлянцкія дачыненні больш нікога не датычацца. Не жадаючы, аднак, рэзка абвастраць зносіны з ВКЛ і ўступаць з ім у ваенны канфлікт, Іван IV пацвердзіў абавязак захоўваць перамір'е да 1562 г.[49]

Уважлівае прачытанне афіцыйнага летапісу не пакідае сумневу, што на фарміраванне знешняй палітыкі Маскоўскай дзяржавы ў 1559 г. вялікі ўплыў рабілі ірацыянальныя матывы і чыннікі ідэалагічнага кшталту, а не толькі прагматычнае камбінаванне ў рамках рэалій міжнародных узаемадачыненняў. Іван IV адчуваў сябе адказным за выкананне місіі вызвалення хрысціян ад татарскага прыгнёту. У гэтым цара яшчэ больш упэўнівалі «знакі з нябёсаў». Так, «видение» святога Мікалая-цудатворцы ў студзені 1559 г. і адступленне крымскага войска з маскоўскай тэрыторыі, якое адбылося следам за гэтым (неўзабаве пасля атрымання звестак аб прысутнасці Івана Грознага ў Маскве, а не ў Інфлянтах), звязваліся ў адзін лагічны ланцужок[50]. У Маскве, відаць, не чакалі выступлення крымскіх татар у дадзены момант, таму ў раптоўным адыходзе непрыяцеля бачылася заступніцтва нябесных сіл. Відавочна, гэтая падзея разглядалася ў Маскве як своеасаблівы сімвал, які пацвярджаў слушнасць актыўнай антыкрымскай палітыкі.

Пагоня за татарамі хоць і не прынесла вынікаў, аднак выявіла слабасць праціўніка, які адступаў у вялікай спешцы. Палонныя паведамілі, што Крымскае ханства не валодае дастатковымі сіламі для абароны. У Маскве палічылі, што наспеў час для вырашальнага ўдару. На Крымскі паўвостраў былі адпраўлены войскі Дз. Вішнявецкага і Д. Адашава. Маскоўскае кіраўніцтва нават не дачакалася прыезду літоўскіх паслоў, каб высветліць мэту іх пасольства. Верагодна,

---

49 ПСРЛ. Т. 13. С. 317.

50 *«Ни царя нашего близ собя слышавше, ни полков царскых видевше, но токмо имя его слышав, иже пребывает на своем престоле во царьствующем граде Москве, и спасение имеюще ото окрестных враг, и врази смешися и победишася и въспять возвратишася и на бегство устремишася, никимже гоними, гневом Божиим и именем царя нашего благоверного...»* (Тамсама. С. 315).

у Крамлі па-ранейшаму былі ўпэўнены, што Вільня не адмовіцца ад ідэі знішчэння «крымскага гнязда».

Аднак у сакавіку 1559 г., падчас перамоў з літоўскімі і дацкімі пасламі, аказалася, што расклад, зроблены маскоўцамі, не спрацаваў. Літвіны не толькі прапанавалі невыканальныя ўмовы для заключэння антытатарскага хаўрусу, але і ўзнялі «інфлянцкае пытанне». Дацкія паслы, якія прыбылі ў Маскву ў сакавіку 1559 г., таксама хадайнічалі за Інфлянты[51].

У Маскве павінны былі зразумець, што інфлянцкая праблема хвалюе не толькі яе, але і бліжэйшых суседзяў. Апынуўшыся ў новым для сябе становішчы, маскоўцы пагадзіліся прыняць прапанову датчан, якая заключалася ў наступным: цар спыняе на кароткі тэрмін вайну, а ў гэты час у Маскву прыязджае магістр Інфлянцкага Ордэна альбо яго давераныя асобы з неабходнымі паўнамоцтвамі для прызнання сваёй «віны». Пры гэтым Данія выступала гарантам прыезду інфлянцаў. Заўважым, што ніякага афіцыйнага перамір'я з Ордэнам не заключалася, як аб гэтым часта паўтараецца ў савецкіх і найноўшых расійскіх навуковых працах. Неабходна адзначыць, што згода на спыненне ваенных дзеянняў была дадзена ўжо пасля ад'езду пасольства ВКЛ. Атрымліваецца, што ў Маскве не ўлічвалі магчымасць юрыдычнага падпарадкавання Інфлянтаў Літве.

Гэтае «перамір'е» не ўвязваецца з меркаваннем, што яно было заключана ў сувязі са зваротам маскоўцаў да радыкальнага вырашэння крымскай праблемы. Выправа маскоўскага войска супраць Крымскага ханства адбылася ў лютым 1559 г., калі пасольства ВКЛ яшчэ не ад'ехала, а дацкія паслы не прыбылі ў Маскву. Заўважым, што аб прыездзе датчан у Маскве ведалі ўжо 29 студзеня 1559 г.[52] Чаму ж было вырашана выступіць супраць крымскіх татар, не выслухаўшы прапаноў дацкіх паслоў? На думку прыходзіць толькі адзін адказ — у Крамлі не ўсведамлялі, што інфлянцкі канфлікт паступова перарастае ў шырокамаштабную вайну з умяшаннем трэціх бакоў. З ранейшай упартасцю маскоўскія палітыкі імкнуліся вырашыць крымскую праблему і бачылі ў развіцці спраў у Інфлянтах усяго толькі невялікую замінку.

Адзначым, што на пачатку 1560 г. маскоўцы зноў адмовіліся ад прапановы крымскага хана аб прымірэнні, заявіўшы: *«Толко царь* (маецца на ўвазе крымскі хан) *оставит безлепицу, и будет чему верити* (sic!),

[51] РИБ. Т. 16: Русские акты Копенгагенского государственного архива. СПб., 1897. С. 41–52.
[52] Тамсама. С. 39–40.

*и царь и велики князь с ним помирится»*[53]. Неўзабаве супраць Крымскага ханства былі адноўлены ваенныя дзеянні. Гэта адбылося падчас непасрэднага ўмяшання Літвы ў інфлянцкі канфлікт. Толькі 16 снежня 1561 г. маскоўскае кіраўніцтва выказала намер пайсці на прымірэнне з паўднёвым суседам, выслаўшы адпаведную царскую грамату[54].

У расійскай гістарыяграфіі прынята лічыць, што ў рашэнні спыніць ваенныя дзеянні ў Інфлянтах выявілася барацьба розных палітычных груповак і знешнепалітычных канцэпцый[55]. Магчыма, гэта сапраўды так, аднак у любым выпадку маскоўскае кіраўніцтва было недальнабачным у сваім рашэнні. Гэта яшчэ раз паказала, наколькі нерэальна ў Маскве ацэньвалі міжнародную сітуацыю вакол Інфлянтаў. Імкнучыся да іх падпарадкавання, маскоўскія палітыкі разглядалі ваенныя дзеянні ў першыя гады Інфлянцкай вайны як сродак своеасаблівага дыпламатычнага ціску з мэтай прымусіць інфлянцкае кіраўніцтва прызнаць маскоўскія правілы двухбаковых зносін.

Пасля прыезду пасольства В. Тышкевіча ў Маскве прадпрымаліся меры для высвятлення сапраўдных намераў заходняга суседа адносна Інфлянтаў. Улетку 1559 г. у ВКЛ было адпраўлена пасольства на чале з Раманам Півавым. Яно мела, мяркуючы па «наказной памяти», яўныя разведачныя мэты. Маскоўскага цара цікавіла ўнутрыпалітычная сітуацыя ў суседняй краіне, і ў асаблівасці — намеры ВКЛ у дачыненні да прыбалтыйскай дзяржавы. Добра відаць, што ў Крамлі былі занепакоены адмовай Літвы ад антыкрымскага хаўрусу і патрабаваннем спыніць вайну ў Інфлянтах.

Кіраўніцтва ВКЛ аказала Р. Піваву надзвычай халодны прыём. Маскоўскаму пасольству не давалі харчавання, гаспадар не паклікаў пасла на ўрачысты абед, прывезеныя падарункі былі вернуты. За тры тыдні, праведзеныя ў Вільні, маскоўцаў не выпускалі за сцены пасольскага двара. 31 ліпеня 1559 г. Жыгімонт Аўгуст уручыў маскоўскаму паслу грамату, даючы тым самым зразумець, што яго місія скончана. Зразумела, што пастаўленых задач па зборы інфармацыі пасольства Р. Півава не выканала[56].

---

53 ПСРЛ. Т. 13. С. 324.
54 Тамсама. С. 339.
55 Лурье Я. Вопросы внешней и внутренней политики в посланиях Ивана IV // Послания Ивана Грозного / Под ред. В. Адриановой-Перетц. М.; Ленинград, 1951. С. 485–488; Королюк В. Ливонская война. С. 27–28; Хорошкевич А. Россия в системе... С. 230–231.
56 РИО. Т. 59. С. 580–591.

Для маскоўскага кіраўніцтва такі вынік быў у пэўнай ступені нечаканым. Стала відавочным, што пазіцыя літвінаў з'яўляецца цвёрдай і проста так яны ад Інфлянтаў не адступяцца.

Халоднае абыходжанне з маскоўскімі дыпламатамі мела месца незадоўга да пачатку вальнага сойма ВКЛ. На наш погляд, менавіта ўлетку 1559 г. у Вільні было прынята канчатковае рашэнне актывізаваць інфлянцкую палітыку. Няветлівы прыём пасольства Р. Півава стаў першым актам у гэтай справе.

Спыненне ў сакавіку 1559 г. ваенных дзеянняў дало інфлянцам неабходны час для пошуку знешняй падтрымкі. Ведаючы аб урэгуляванні сваіх стасункаў з Крымскім ханствам, у Вільні вырашылі змяніць сваё стаўленне да адчайных просьбаў інфлянцкага кіраўніцтва аб дапамозе.

Аднак у Княства былі сур'ёзныя ўнутраныя праблемы. Умяшанне ў інфлянцкі канфлікт пагражала вайной з Масковіяй і патрабавала значных ваенных і фінансава-матэрыяльных сродкаў. Таксама важна было ведаць пазіцыю шляхты ў дачыненні да перспектыў удзелу ВКЛ у барацьбе за прыбалтыйскія землі.

Для прыняцця рашэння ў красавіку 1559 г. Жыгімонт Аўгуст вырашыў зноў правесці кансультацыі з раднымі панамі. Ён паведамляў ім, што магістр Ордэна пагадзіўся перадаць пад уладу ВКЛ чатыры замкі на маскоўскай мяжы. Гаспадар прасіў узважыць усе «за» і «супраць», таму што ўмяшанне ў інфлянцкія справы можа справакаваць вайну з Масковіяй[57]. Турбуючыся за стан скарбу, Жыгімонт Аўгуст зыходзіў з таго, што калі цяпер Княства будзе абыякава назіраць за падзеямі ў Інфлянтах, то пасля сканчэння перамір'я ў 1562 г. Маскоўская дзяржава зможа ўдарыць з паўночнага боку, скарыстаўшыся зручным інфлянцкім плацдармам[58]. Гаспадар патрабаваў абмеркаваць, як лепей забяспечыць абарону Полацка і Віцебска — найважнейшых стратэгічных пунктаў на паўночным усходзе ВКЛ, і паскорыць выплату надзвычайных падаткаў, якія належным чынам яшчэ не былі сабраны.

---

[57] Віцебскі ваявода С. Збаражскі перадаваў інфармацыю разведкі пра тое, што маскоўскае войска, якое знаходзілася на інфлянцкай мяжы, гатова ўдарыць па Віцебску пры аказанні дапамогі інфлянцам: Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 95–97 прил.

[58] *«А естли не тепер, тогды вборзде, того Боже не дай, з болшою небеспечностью на тое ж прыйдет по выйстью перемерья, звлаща, где бы землю Ифлянтскую опановал»* (Тамсама. С. 96 прил.).

У гэтых абставінах становучае рашэнне аб умяшанні ў інфлянцкі канфлікт было прадвызначана. Канчаткова справа ўдзелу ВКЛ у Інфлянцкай вайне зрушылася з месца ў жніўні 1559 г., калі была атрымана згода вальнага сойма ВКЛ, які цалкам падтрымаў знешнепалітычную ініцыятыву ўрада, пагадзіўшыся выслаць войска для абароны Інфлянтаў і збіраць новыя земскія падаткі. Энтузіязм шляхты быў выкліканы перадусім магчымасцямі атрымання новых землеўладанняў у Інфлянтах[59].

Улетку 1559 г. Вільню наведаў новы магістр Інфлянцкага Ордэна Г. Кетлер. Вынікам гэтага візіту стала заключэнне 31 жніўня 1559 г. дамовы, паводле якой тэрыторыя Ордэна пераходзіла пад пратэктарат Жыгімонта Аўгуста. Літвіны абавязваліся абараняць Інфлянты ад нападзення маскоўскага непрыяцеля і адабраць захопленыя ім інфлянцкія землі на паўночным усходзе краіны. За гэта яны атрымалі пад заклад паўднёва-ўсходнюю частку Інфлянтаў з замкамі Баўска, Розітэн, Люцэн, Дынабург і Зэльбург. Пасля завяршэння вайны Ордэн меў права выкупіць гэтыя землі за вялікую грашовую суму. Да заканчэння тэрміну маскоўска-інфлянцкага «перамір'я» ў кастрычніку 1559 г. літвіны абавязваліся выслаць у Маскву пасольства з паведамленнем пра пераход Інфлянтаў пад пратэктарат ВКЛ і патрабаваннем спыніць ваенныя дзеянні. У гэты ж час у перададзеных замках павінны былі размясціцца літоўскія гарнізоны. Вызначэнне межаў паміж ВКЛ і Інфлянтамі адкладвалася на канец вайны. На такіх жа ўмовах праз два тыдні да Віленскай дамовы далучыўся і рыжскі арцыбіскуп Вільгельм, які аддаў пад заклад замкі Марыенгаўзен і Леневард, а таксама двары Лобань і Бірзен[60].

Калі ў лістападзе 1559 г. у Маскву прыехаў ганец з ВКЛ Андрэй Харытановіч[61], у Крамлі ўжо ведалі пра падпісаную паміж ВКЛ і Інфлянтамі дамову. Цікава, што, нягледзячы на нявєтлівае абыходжанне з пасольствам Р. Півава, літоўскі ганец быў сустрэты згодна з дыпламатычным

[59] Пра гэта сведчыць «просьба» ўдзельнікаў вальнага сойма аб надзяленні зямельнымі ўладаннямі і прызначэнні на кіроўныя пасады ў Інфлянтах выключна выхадцаў з ВКЛ, а таксама іх уласная ініцыятыва па ўхваленні збору серабшчыны для абароны Інфлянтаў: РИБ. Т. 30. С. 270–271, 273–274.

[60] Dogiel M. Codex diplomaticus regni Poloniae et magni ducatus Lithuaniae. T. 5. Vilnae, 1765. S. 232–237; Jasnowski J. Milołaj Radziwiłł Czarny. S. 250–251.

[61] У маскоўскай пасольскай кнізе яго прозвішча памылкова даецца як «Хоружичъ». Відавочна, адбылася блытаніна прозвішча з урадам харужага. У пасольскай кнізе Метрыкі ВКЛ згадваецца «Андрей Иванович»: Книга посольская... Т. 1. С. 165–167. Гэта быў сын наваградскага харужага Івана Харытановіча. Складаю шчырую падзяку за кансультацыю Андрэю Радаману.

цырыманіялам: яго падарункі былі прынятыя, цар паклікаў яго да стала і г. д. Верагодна, у Маскве не хацелі псаваць свае ўзаемадачыненні з ВКЛ, не высветліўшы да канца яго намераў.

У афіцыйнай гаспадарскай грамаце згадваліся толькі *«порубежные обиды»*. Пералічваючы парушэнні мяжы, здзейсненыя маскоўцамі, Жыгімонт Аўгуст прапаноўваў 1 лютага 1560 г. сустрэцца на мяжы суддзям і камісарам з абодвух бакоў для высвятлення гэтых скаргаў[62].

Інфлянцкае пытанне падымалася толькі на паўафіцыйным узроўні. 7 снежня 1559 г. А. Харытановіч сустрэўся з кіраўнікамі маскоўскай знешняй палітыкі І. Віскаватым і А. Адашавым. Літоўскі ганец перадаў словы віленскага ваяводы і канцлера ВКЛ М. Радзівіла Чорнага з просьбай да баяр, каб *«государей сводили на добрую склонность к любви, доколе лихо не начнетца»*[63]. Пры гэтым Радзівіл падкрэсліваў міралюбныя намеры Жыгімонта Аўгуста.

У Маскве з недаверам паставіліся да слоў пасланніка[64]. А. Адашаў, перадаючы пазіцыю Івана IV, выказаўся наступным чынам: *«Король ныне вступился государя нашего в данную землю Ливонскую; и толко король того дела не оставит, и за то без кровопролитья быти не может»*[65]. Такім чынам, літоўскаму боку прапаноўвалася адмовіцца ад удзелу ў рашэнні інфлянцкай праблемы дзеля захавання нармальных зносін з Маскоўскай дзяржавай.

Кіраўніцтва ВКЛ праз місію А. Харытановіча жадала высветліць пазіцыю маскоўцаў у сувязі са змяненнем сітуацыі ў Інфлянтах. Магчыма, яно хацела выйграць час для размяшчэння там сваіх гарнізонаў.

Не дачакаўшыся вяртання свайго ганца, кіраўніцтва ВКЛ паслала ў Маскву Марціна Валадковіча[66]. У грамаце Жыгімонта Аўгуста была кан-

[62] РИО. Т. 59. С. 595–597. Г. Харашкевіч памылкова лічыць, што ў грамаце, прывезенай А. Харытановічам, змяшчаўся пратэст супраць парушэння інфлянцкіх межаў: Хорошкевич А. Россия в системе… С. 236.

[63] РИО. Т. 59. С. 594.

[64] *«Писма к нам от панов рады королевские ни от одного нет, и нам тому верити нечему»* (ПСРЛ. Т. 13. С. 322).

[65] РИО. Т. 59. С. 594.

[66] Грамата М. Валадковіча датавана 12 снежня 1559 г.: Книга посольская… Т. 1. С. 176–178 (8 снежня 1559 г. — РИО. Т. 59. С. 605). А. Харытановіч з’ехаў з Масквы толькі 17 снежня 1559 г. (Тамсама. С. 595). Значыць, на змест граматы М. Валадковіча ніяк не паўплываў ход місіі А. Харытановіча. Такім чынам, гэтыя дзве дыпламатычныя акцыі паміж сабой не звязаны. Хутчэй за ўсё, на рашэнне так хутка паслаць у Маскву М. Валадковіча паўплывала размяшчэнне літоўскіх жаўнераў у інфлянцкіх замках.

крэтна вызначана пазіцыя ВКЛ па інфлянцкім пытанні. Яе коратка характарызуе наступная фраза, звернутая да Івана Грознага: *«Што колвек против Ифлянтом почнеш, то нам, брату своему и панству нашому чинити будешь, кгды в той земли на певных замъкох гетъманы, старосты и люди наши розсказують, и ты бы брат наш правячи нам по доконъчанью, войск своих в тое панство нашо не всылал»*[67]. Літоўскія ўлады рабілі акцэнт на тым, што інфлянцы добраахвотна і па ўласнай ініцыятыве перайшлі пад апеку ВКЛ. Адначасова адзначалася, што пра «данніцтва» Інфлянтаў раней нічога не было вядома, што развязванне ваенных дзеянняў з'яўляецца несправядлівай акцыяй, якая не мае ні маральнага апраўдання, ні юрыдычна-дакументальнага абгрунтавання.

Літвіны спасылаліся на падзеі 1557 г.: калі Жыгімонт Аўгуст выступіў супраць Інфлянцкага Ордэна і заключыў з ім пагадненне ў Пазволі, Крэмль ніяк не прарэагаваў на гэта. Гэты факт, на думку літоўскага боку, сведчыў пра дзяржаўную самастойнасць Інфлянтаў. Увогуле, падзеі 1557 г. пад Пазволем прадстаўляліся як акт падданства інфлянцаў Літве. Жыгімонт Аўгуст у сваёй грамаце прапанаваў Івану IV вывесці войскі і не ваяваць больш супраць Інфлянтаў, не парушаючы тым самым перамір'е з ВКЛ. Ён запэўніваў, што дадзенае перамір'е, як і было дамоўлена, будзе захоўвацца да 1562 г. Больш за тое, кіраўніцтва ВКЛ не адмаўлялася ад ідэі супольнай барацьбы з «няверными» татарамі[68].

Афіцыйныя пазіцыі бакоў адрозніваліся катэгарычнасцю і неcаступлівасцю. Аднак у неафіцыйнай частцы перамоў праводзіўся пошук кампрамісных рашэнняў. Гэты пошук быў, верагодней за ўсё, ініцыятывай Рады ВКЛ. На наступны дзень пасля прыёму ў цара М. Валадковіч заявіў А. Адашаву і І. Віскаватаму, што мае да іх вуснае пасланне ад гаспадарскага маршала Астафія Валовіча, і папрасіў іх аб канфідэнцыяльнай сустрэчы. Умяшанне ВКЛ у інфлянцкія падзеі ўплывовы літоўскі палітык вытлумачваў ціскам палякаў (!), што паслужыла прычынай вострага канфлікту М. Радзівіла Чорнага з палітычнай элітай Польшчы. Пазіцыя палякаў, паводле слоў літоўскага пасланніка, была надзвычай ваяўнічай. Яны нават не бачылі патрэбы высылаць пасольства ў Маскву для вядзен-

67 Книга посольская… Т. 1. С. 180. Гл. таксама: РИО. Т. 59. С. 607.
68 Книга посольская… Т. 1. С. 180.

ня перамоў. У адрозненне ад іх, Радзівіл прапаноўваў маскоўцам знайсці кампраміс, а менавіта *«зговор учинити»*[69].

Звернем увагу на дадзенае выказванне. Магчыма, у ім хавалася прапанова падзяліць інфлянцкую тэрыторыю на ўзаемавыгадных варунках. Напэўна, калі б маскоўцы пагадзіліся разгледзець гэтую прапанову, то літвіны азнаёмілі б іх са сваім канкрэтным планам. Аднак пазіцыя маскоўскага двара была бескампраміснай[70].

Кіраўніцтва ВКЛ ажыццявіла хітры дыпламатычны манеўр, прыкрываючы ціскам польскага боку актывізацыю ўласнай палітыкі ў Інфлянтах. Вядома, што першапачаткова ў Польскай Кароне досыць абыякава паставіліся да інфлянцкага канфлікту. Там лічылі, што Жыгімонт Аўгуст павінен засяродзіцца на ўнутрыпалітычных праблемах Польшчы, а не займацца ўмяшаннем у інфлянцкія справы.

Аднак акцыя літвінаў наўрад ці была паспяховай. Як справядліва лічыць Г. Граля, падобныя выказванні маглі стаць падставай для ўзнікнення ў Маскве меркаванняў аб нерашучасці літоўскага боку. А значыць, удзел ВКЛ у інфлянцкім канфлікце магла спыніць пагроза шырокамаштабнай вайны з Маскоўскай дзяржавай[71].

Тым часам кіраўніцтва ВКЛ пачало займацца ўладкаваннем сваёй прысутнасці ў Інфлянтах. У сярэдзіне лістапада 1559 г. туды быў адпраўлены найманы кантынгент (гл. падрабязней р. II, § 2). На пачатковым этапе місія літоўскіх жаўнераў была не зусім удалай. Інфлянцы былі расчараваны яе вынікамі: маскоўцамі быў захоплены замак Марыенбург, а самі літвіны не праяўлялі спадзяванай актыўнасці ў справе абароны краю.

---

69 У «Выпісцы з пасольскіх кніг» сустракаем іншы варыянт: *«О Ливонской земле договор учинить»* (ПИВЕ. Т. 2: «Выписки из посольских книг» о сношениях Российского государства с Польско-Литовским 1488–1572 гг. М.; Варшава, 1997. С. 213). Намер падзелу інфлянцкай тэрыторыі сустракаецца ў пасланні, адпраўленым у чэрвені 1560 г. з А. Люлям: *«И што перед перемирьем у Ифлянтьской земли посел еси, о том бы брат наш, обьсылаючисе с нами, намовлял и становил, ижьбы за такими незгодами кровопролитье большое не сталося»* (Книга посольская… Т. 1. С. 185).

70 Цалкам магчыма, што ў Маскве ўспрынялі прамову М. Валадковіча ўсяго толькі як яго асабістае меркаванне. На гэта ўскосна ўказваеНіканаўскі летапіс: *«И Мартин говорил Олексею* [Адашаву] *от собя, а не от панов»* (ПСРЛ. Т. 13. С. 323). Дарэчы, апісанне місіі М. Валадковіча ў маскоўскай пасольскай кнізе абрываецца якраз на вуснай прамове пасланніка. Гл.: РИО. Т. 59. С. 607.

71 Граля И. Иван Михайлов Висковатый. С. 228–229.

У 1560 г. дыпламатычныя зносіны паміж Літвой і Масковіяй не перапыняліся. Грамата для новага маскоўскага ганца Мікіты Сушчава была падрыхтавана ў красавіку, але ў дарогу ён выправіўся толькі ў чэрвені 1560 г. Чаму? Напэўна, гэта можна патлумачыць адпраўленнем у гэты ж час вялікага войска ў Інфлянты.

Паказальнай з'яўляецца і прысылка з М. Сушчавым граматы для вялікіх паслоў ВКЛ. Цар зноў нагадаў пра антыкрымскі саюз, адначасова адстойваючы свае правы на Інфлянты і абяцаючы прадставіць літоўскім паслам адпаведныя доказы[72]. У Маскве такім чынам імкнуліся адарваць увагу кіраўніцтва ВКЛ ад інфлянцкіх спраў. Дыпламатычны манеўр маскоўскага двара, як будзе відаць далей, быў у пэўнай ступені паспяховым.

М. Сушчаў размінуўся з літоўскім ганцом Андрэем (Станіслававічам?) Люлям, які вёз у Маскву гаспадарскі ліст з патрабаваннем спыніць вайну ў Інфлянтах[73]. Калі ў ліпені 1560 г. ён прыбыў у Маскву, то стала зразумела, што сэнсу ў вядзенні далейшых перамоў няма. Маскоўскае кіраўніцтва ўжо паспела адправіць у Прыбалтыку войска і вяртаць яго назад не збіралася.

Ужо праз чатыры дні пасля прыёму М. Сушчава з Вільні ў Маскву быў адпраўлены Міхайла Гарабурда. Жыгімонт Аўгуст такім чынам спрабаваў выратаваць мір, ужо ведаючы пра паход маскоўскага войска на Інфлянты. У Вільні схапіліся за грамату для вялікіх паслоў, прывезеную М. Сушчавым, як за аргумент аб гатоўнасці маскоўцаў далей шукаць кампраміс. Гаспадар заклікаў Івана Грознага спыніць ваенныя дзеянні ў Інфлянтах да 1 красавіка 1561 г. Пасля гэтага можна было прыступаць да перамоў аб прымірэнні. М. Гарабурда павінен быў перадаць цару, што ў сувязі з прыбыццём М. Сушчава Жыгімонт Аўгуст загадаў паспалітаму рушэнню ВКЛ адысці назад, паказваючы тым самым намер не распачынаць ваенныя дзеянні[74]. Аднак гаспадарская грамата была дастаўлена маскоўскаму цару толькі 17 верасня 1560 г., калі баявыя дзеянні ў Інфлянтах ужо скончыліся, а ў Вільню адправілася пасольства Фёдара Сукіна.

Убачыўшы беспаспяховасць сваёй дыпламатычнай акцыі, Жыгімонт Аўгуст у дасланай разам з М. Сушчавым грамаце яшчэ раз запатрабаваў ад маскоўцаў спыніць вайну супраць Інфлянтаў. Ён нагадаў, што

---

72 *«Похочешь и ныне о добре хрестьянском промышляти с нами заодин, и ты б брат наш прислал к нам своих великих послов...»* (РИО. Т. 59. С. 611).
73 Тамсама. С. 620–624.
74 Книга посольская... Т. 1. С. 189–191.

мясцовыя жыхары цяпер з'яўляюцца яго падданымі. Двухбаковы вывад войскаў з Інфлянтаў з'яўляўся, на яго думку, першачарговай умовай для працягу перамоўнага працэсу[75].

Для гаспадарскай улады галоўнай задачай інфлянцкай палітыкі ў 1560 г. было далейшае пашырэнне зоны ўплыву ў Інфлянтах. Кіраўніцтва ВКЛ не спяшалася ўступаць у супрацьборства з маскоўцамі, пад рознымі прэтэкстамі ўхіляючыся ад актыўнага ўдзелу ў ваенных дзеяннях. На перамовах з інфлянцкімі пасламі недвухсэнсоўна намякалася, што больш значная дапамога будзе аказана толькі пасля размяшчэння ў мясцовых замках новых літоўскіх гарнізонаў.

Як ужо гаварылася, летам 1560 г. у Інфлянты ў чарговы раз было адпраўлена вялікае маскоўскае войска. Яно складалася з пяці палкоў, што сведчыла пра маштабнасць аперацыі. У ідэалагічнае абгрунтаванне гэтай выправы дадаліся новыя матывы: «*За их за многие неправды и за порушение крестианскые веры и за позжение образов Божих и святых всех и за всех их неисправленье пред государем и за то, что королю городки многые позакладывал и поздавал и сам х королю ездил и со всею землею прикладывался и против государевы рати помочь емлет и из заморья наймует*»[76]. Варта звярнуць увагу, што на першым месцы знаходзяцца матывацыі рэлігійнага характару.

У жніўні 1560 г. маскоўцы аблажылі Вайсенштайн і Фелін — магутныя крэпасці ў цэнтральнай Эстоніі. Калі першая з іх здолела вытрымаць аблогу, то фелінскі гарнізон 19 жніўня 1560 г. здаўся ворагу. У палон быў узяты былы магістр Інфлянцкага Ордэна В. Фюрстэнберг. У цэлым летняя ваенная кампанія 1560 г. для маскоўцаў была ўдалай.

Паспалітае рушэнне ВКЛ падчас аблогі маскоўцамі інфлянцкіх замкаў бяздзейнічала. На заклікі Г. Кетлера як мага хутчэй аб'яднацца з рыцарамі Ордэна і нанесці сумесны ўдар па непрыяцелю літвіны не адказалі неабходнымі актыўнымі дзеяннямі[77]. 2 жніўня 1560 г. ордэнскае войска пацярпела сакрушальны разгром пад Эрмесам[78]. Літвіны занялі традыцыйную для сябе чакальную пазіцыю. У гэты час Г. Хадкевіч знаходзіўся са сваёй групоўкай у Пебальзе, гэта значыць, прасунуўся на поўнач ад Зельбурга ўсяго толькі на 50 кіламетраў[79].

75 Тамсама. С. 192–195. Гл. таксама: РИО. Т. 59. С. 619.
76 ПСРЛ. Т. 13. С. 327.
77 Tiberg E. Zur Vorgeschichte des Livländischen Krieges. S. 183–184.
78 История Латвийской ССР / Под ред. К. Страздиня. Т. 1. Рига, 1952. С. 163.
79 Tiberg E. Zur Vorgeschichte des Livländischen Krieges. S. 185–186.

Нягледзячы на пасіўную пазіцыю, у жніўні 1560 г. адбыліся першыя баявыя сутыкненні паміж маскоўцамі і літвінамі. У грамаце Жыгімонта Аўгуста, дасланай з М. Сушчавым, ёсць згадка, што *«некоторие офочие люди и под войско твое приходили, поторжки с тобою мели»*[80]. Паводле хронікі М. Стрыйкоўскага, перадавы атрад войска ВКЛ пад камандаваннем Аляксандра Палубенскага колькасцю 400 чалавек двойчы сустрэўся пад Вендэнам (і пад Марыенбургам (?)[81]) з маскоўскім авангардам. У баявых сутычках перамогу атрымалі літвіны. У палон быў узяты ваявода — нейкі Іван. Само ж войска на чале з Андрэем Курбскім, якое налічвала 50 тысяч чалавек, як толькі пачула пра набліжэнне літвінаў, адышло на маскоўскую тэрыторыю[82]. Зразумела, лічба ў 50 тысяч ваяроў значна перабольшана, неканкрэтнымі з'яўляюцца сведчанні пра палоннага ваяводу і месца сутыкненняў. Таму да інфармацыі храніста трэба ставіцца з асцярожнасцю.

Сам А. Курбскі пазней у сваёй «Гісторыі» апісваў уласныя поспехі ў змаганні з літвінамі ў 1560 г.[83] Яго інфармацыі таксама давяраць нельга, бо ён, безумоўна, з'яўляўся зацікаўленай асобай. Канстатацыя перамогі маскоўскага войска яшчэ ёсць толькі ў Пскоўскім летапісе[84].

Ніканаўскі летапіс не паведамляе пра сутыкненні маскоўцаў з літоўскімі жаўнерамі ў 1560 г. Гэта ўскосна можа сведчыць пра тое, што маскоўцы не атрымалі ў іх перамогі, бо ў адваротным выпадку наўрад ці летапісец праігнараваў бы такі факт. Іван Грозны падкрэсліваў боязь маскоўскіх военачальнікаў уступаць у бой з літвінамі: *«Потом послахом вас с начальником вашим Олексеем* [Адашавым] *со многими зело людьми; вы же едва един Вильян* (Фелін) *взясте, и туто много наряду нашего погубисте. Како уже убо тогда от литовское рати детскими страшилы устрашистеся!»*[85] Як бачым, маскоўскі цар у сваім меркаванні быў салідарны з М. Стрыйкоўскім. Ускосным пацвярджэннем няўдалых дзеянняў маскоўцаў з'яўляецца сведчанне пасольскай кнігі, дзе канстатуец-

---

80 Книга посольская… Т. 1. С. 194.

81 Справа ў тым, што Марыенбург знаходзіцца на значнай адлегласці ад Вендэна.

82 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 411.

83 Курбский А. История о великом князе Московском. М., 2001. С. 94–96.

84 *«Князь Андреи* [Курбскі] *Литву побил под Кесью* (Вендэнам), *што король присылал изгоном Полубенского на князя Андрея Курбского»* (ПЛ. Вып. 2. С. 240).

85 Переписка Ивана Грозного с Андреем Курбским / Под ред. Д. Лихачева. М., 1993. С. 89.

ца факт нападзення літвінаў на маскоўскіх жаўнераў пад Вендэнам[86]. Усё гэта, на наш погляд, сведчыць пра большую верагоднасць літоўскай перамогі.

Такім чынам, пошукі ВКЛ кампрамісу не завяршыліся поспехам. Маскоўская дзяржава з дапамогай ваеннай сілы імкнулася падпарадкаваць Інфлянты. Аднак пасля першых сутыкненняў з літвінамі маскоўскія вайскоўцы больш не рашаліся заходзіць у зону, якая кантралявалася войскам ВКЛ.

На дыпламатычным полі ў гэты час з'явілася новая магчымасць прымірэння. У жніўні 1560 г. Іван IV выслаў у ВКЛ чарговае пасольства на чале з Фёдарам Сукіным. Яно мела незвычайную місію. Пасол павінен быў праінфармаваць літоўскае кіраўніцтва аб жаданні цара ажаніцца з адной з сясцёр Жыгімонта Аўгуста. Гэтае сватанне мела патаемны характар. Галоўным наступствам заключэння шлюбу павінна было стаць поўнае ўрэгуляванне ваенна-палітычнага канфлікту. Заманлівая, здавалася, ідэя мела ў той жа час мноства пярэчанняў з боку кіроўных колаў Княства. Асноўным з іх была небяспека распаўсюджвання маскоўскай улады на ВКЛ у бліжэйшай перспектыве[87].

Жыгімонт Аўгуст не адмаўляўся ад перамоў аб заключэнні шлюбу, аднак, мяркуючы па ўсім, разлічваў з іх дапамогай толькі пацягнуць час. Гэта магло гарантаваць часовы мір у Інфлянтах, а значыць, задача арганізацыі абароны ў складаны зімовы перыяд пераставала быць такой актуальнай. З іншага боку, атрыманы час мог быць выкарыстаны літоўскімі палітыкамі для ўмацавання сваіх пазіцый у Інфлянтах.

Зрэшты, «наказная память» для пасольства Ф. Сукіна выразна паказвае, што ў Маскве не мелі асаблівых надзей на станоўчае вырашэнне царскай прапановы, памятаючы аб крывадушнай дыпламатыі ВКЛ у 1558–1559 гг.[88]

Ганец Ян Шымковіч, які прыбыў у Маскву ў пачатку 1561 г., не прывез з сабой ніякіх канкрэтных прапаноў. Перамовы, праведзеныя ім, з усёй відавочнасцю паказалі, што маскоўска-літоўскія ста-

86 «*И под Кесью в кою пору наши люди наших изменников* (г. зн. інфлянцаў) *казнили, ино брата нашего люди (...) на наши люди пришли*» (РИО. Т. 71. С. 222–223).

87 Дэталёвы аналіз сватання Івана Грознага зроблены ў: Sucheni-Grabowska A. Starania Iwana Groźnego o rękę Katarzyny Jagiellonki a konflikt z Rosją o Inflanty (1560–1561) // Homines et societas. Czasy Piastów i Jagiellonów. Poznań, 1997. S. 213–223.

88 РИО. Т. 71. С. 4–23.

сункі зайшлі ў тупік. Літвіны выставілі невыканальныя палітычныя ўмовы для заключэння шлюбу цара з сястрой Жыгімонта Аўгуста Катарынай. Навіной для маскоўцаў стала прапанова сабраць памежны з'езд літоўскіх радных паноў і маскоўскіх баяр, на якім мог быць заключаны «вечны мір» і пацверджаны канчатковыя ўмовы шлюбу. У Маскве дадзеную ініцыятыву палічылі праявай нежадання прыняць маскоўскія прапановы.

Нагодай для вострых спрэчак зноў стала інфлянцкае пытанне. Маскоўцы пагаджаліся працягнуць перамір'е, калі яно не будзе датычыцца Інфлянтаў. Аднак такое рашэнне не задавальняла літвінаў, якіх больш за ўсё хвалявала аднаўленне міру на прыбалтыйскіх землях. Маскоўскае кіраўніцтва, у сваю чаргу, не збіралася абыякава глядзець на пераход інфлянцкіх замкаў пад кантроль ВКЛ[89]. Літоўскаму пасланніку было наўпрост заяўлена: *«А похочет за Ливонскую землю стояти, и он* (Іван IV) *за нее стоит, как хочет»*[90]. Так і не дамовіўшыся, Я. Шымковіч выправіўся ў зваротную дарогу. Перамоўны працэс да канца 1561 г. быў фактычна замарожаны.

Тым часам кіраўніцтва ВКЛ паслядоўна пашырала сферу ўплыву ў Інфлянтах. Восенню 1560 г. яно дамаглося перадачы пад сваю ўладу такіх стратэгічна важных замкаў як Кокенгаўзен, Ронебург, Вендэн, Трыкатэн, Гельмет, Эрмес і Каркус. Княства, такім чынам, атрымала кантроль над тэрыторыяй прыблізна да лініі мяжы паміж сучаснымі Латвіяй і Эстоніяй.

Нягледзячы на прыхільнае стаўленне да ВКЛ, у Інфлянтах выказвалі сур'ёзную занепакоенасць характарам дзеянняў літвінаў. Увесь час робячы дэкларацыі аб дапамозе, кіраўніцтва ВКЛ не прымала адэкватных мер для адваявання захопленых ворагам зямель. Імкнучыся не страціць давер інфлянцкага грамадства, яно вырашыла актывізаваць сваю дзейнасць па арганізацыі абароны прыбалтыйскай краіны. Прыняццю гэтага рашэння садзейнічала канчатковае разуменне таго, што ўрэгуляванне зносін з Маскоўскай дзяржавай наўрад ці адбудзецца.

Пагрозы Івана IV, перададзеныя праз Я. Шымковіча, у Вільні ўспрынялі з усёй сур'ёзнасцю. 11 сакавіка 1561 г. татарскім харугвам быў аддадзены загад збірацца праз два тыдні ў Вільні, адкуль яны павінны былі

89 *«А промышляти бы ныне безпрестанно над теми ливонскими городы, в которых городех литовские люди»* (РИО. Т. 71. С. 41).

90 Тамсама. С. 44.

рушыць да Ронебурга пад камандаванне А. Палубенскага[91]. Пазней тэрмін прыбыцця быў перанесены на 29 красавіка 1561 г.[92] 21 сакавіка 1561 г. да ўсіх старастаў памежных замкаў на ўсходзе ВКЛ былі накіраваны лісты, *«абы до замкох своих ехали и у осторожности мешкали»*[93]. Быў абвешчаны і збор паспалітага рушэння (гл. р. II, § 1).

Паводле М. Стрыйкоўскага, 108-тысячнае маскоўскае войска (!) адступіла з Інфлянтаў, як толькі даведалася пра выступленне паспалітага рушэння ВКЛ. Перадавы атрад на чале з Юрыем Тышкевічам і Рыгорам Трызнам колькасцю 5 тысяч чалавек спустошыў маскоўскія воласці да самага Дэрпта[94]. Іншыя крыніцы не пацвярджаюць інфармацыю пра адступленне маскоўцаў. Заўважым, што інфармацыя М. Стрыйкоўскага зноў не заслугоўвае дастатковага даверу з прычыны гіпербалізацыі фактаў.

Апагеем ваеннага супрацьстаяння ў 1561 г. сталі аблога і захоп літвінамі замка Тарваст (Таўрус). Гэтай аперацыяй літоўскае войска пачало рэальныя дзеянні па адваяванні інфлянцкай тэрыторыі ў маскоўцаў. Прычыны такой актывізацыі ляжаць на паверхні. Літвінам было неабходна добразычлівае стаўленне да сябе з боку інфлянцаў. На парадку дня стаяла задача далучэння Інфлянтаў да ВКЛ. Кіраўніцтва ВКЛ хацела, каб гэта адбылося на добраахвотнай аснове. Да таго ж пераход Рэвеля пад кантроль Швецыі паказаў, што літвіны могуць згубіць ініцыятыву ў гэтай справе і павінны прыняць адпаведныя меры.

Паводле хронікі М. Стрыйкоўскага, пасіўная аблога Тарваста групоўкай наймітаў пад кіраўніцтвам Ю. Тышкевіча і Р. Трызны працягвалася тры тыдні. У канцы жніўня 1561 г., пасля падыходу асноўных сіл на чале з найвышэйшым гетманам М. Радзівілам Рудым, быў здзейснены падрыў замкавых умацаванняў. 31 жніўня 1561 г. у сцяне замка быў зроблены пралом, і Тарваст быў захоплены літвінамі[95]. Падчас штурму загінуў адзін ротмістр — Я. Мадрэўскі. Храніст падкрэслівае, што перамога была дасягнута дзякуючы таму, што шляхціцы злезлі з коняў і прынялі

[91] LM. Kn. 564. P. 41.
[92] Ibid. P. 48.
[93] Ibid. P. 41.
[94] Ён жа першым узяўся за аблогу Тарваста: Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 411–412.
[95] Паводле Пскоўскага летапісу, гэтая падзея адбылася 1 верасня 1561 г.: ПЛ. Вып. 2. С. 241.

непасрэдны ўдзел у штурме[96]. Такія паводзіны былі неўласцівыя для паспалітага рушэння.

Маскоўскія крыніцы, у сваю чаргу, паведамляюць, што, нягледзячы на падрыў абарончых умацаванняў, штурм крэпасці быў няўдалым: *«И как взорвало и литовские люди взошли на город, и царя и великого князя люди их с стены збили»*. Маскоўцы пагадзіліся здацца, атрымаўшы абяцанне быць адпушчанымі на волю. Аднак літоўскія вайскоўцы, не стрымаўшы да канца свайго слова, абрабавалі палонных[97].

Ёсць сведчанні, паводле якіх маскоўскія ваяводы здалі горад пасля ўгавораў М. Радзівіла Рудога перайсці на службу да літвінаў. Як вядома, маскоўцы не зрабілі гэтага, што, аднак, не выратавала іх ад падазрэнняў у здрадзе з боку Івана Грознага і зняволення на адзін год[98].

Для войска ВКЛ аблога Тарваста праходзіла няпроста. 22 жніўня 1561 г. Радзівіл пісаў гаспадару, што войска не зможа знаходзіцца ў Інфлянтах больш за два тыдні з прычыны недахопу харчавання[99]. Праз тыдзень гетман паведамляў, што радныя паны і шляхта, якія былі ў паспалітым рушэнні, катэгарычна выказваюцца за роспуск войска пасля ўзяцця Тарваста. Жыгімонт Аўгуст настойліва патрабаваў, каб літоўскае войска засталося ў Інфлянтах да прыходу польскага найманага кантынгенту, які быў сфарміраваны і адправіўся на тэрыторыю ВКЛ у пачатку жніўня 1561 г.[100]

Неўзабаве пасля захопу Тарваста літвіны сышлі адтуль, вырашыўшы не пакідаць там гарнізон. А. Гваньіні, які непасрэдна ўдзельнічаў у штурме замка, даваў негатыўную ацэнку іх дзеянням. Па словах храніста, літвіны паводзілі сябе як татары, спустошыўшы горад і не зрабіўшы нічога для аднаўлення абарончых умацаванняў[101].

---

96 S t r y j k o w s k i M. Kronika. T. 2. S. 412. Гл. таксама: G w a g n i n i A. Kronika. S. 412.

97 ПСРЛ. Т. 13. С. 339. На перамовах у канцы 1563 г. маскоўскія дыпламаты распавялі аб гэтым больш падрабязна, з новымі дэталямі: *«Вели их* (маскоўцаў) *с собою до Володимерца* (Вольмара) *за сторожи, как всяких полоняников, и двожды их в избы запирали и ограбив, нагих и босых и пеших к нам отпустили, а иных переимав, да нашим изменником вифлянским немцом подавали; ино тые у них в тюрмах сидячи померли, а иные и ныне у них сидят по тюрмам, мучатца всякими розными муками»* (РИО. Т. 71. С. 258).

98 Гл.: РИО. Т. 71. С. 235–236, 263–264.

99 Listy. S. 345–346.

100 Ibid. S. 346–348. Дата гэтага ліста (30 жніўня 1561 г.) паказвае, што палякі не паспелі падысці да Тарваста да моманту яго здачы маскоўцамі, а значыць, не ўдзельнічалі ў яго захопе.

101 G w a g n i n i A. Kronika. S. 412.

У хуткім часе ў Тарваст вярнуліся маскоўцы і цалкам спалілі замак. Ім неўзабаве пашчасціла адпомсціць за гэтую страту: восенню 1561 г. яны перахапілі атрад літвінаў, які рухаўся ў Пернаву, разбілі яго і ўзялі жаўнераў у палон[102].

Страта Рэвеля ўлетку 1561 г. і яго пераход пад юрысдыкцыю Швецыі, якая ўступіла ў Інфлянцкую вайну апошняй, прымусіла кіраўніцтва ВКЛ паскорыць рэалізацыю плана па больш шчыльнаму падпарадкаванню кантраляванай тэрыторыі Інфлянцкай дзяржавы[103]. Ролю яго непасрэднага выканаўцы ўзяў на сябе М. Радзівіл Чорны. У жніўні 1561 г. адбыўся яго візіт у Рыгу. Радзівіл выклаў прапановы свайго гаспадара, якія ўключалі, паміж іншым, пераход Рыгі і правабярэжных Інфлянтаў пад непасрэдны пратэктарат Жыгімонта Аўгуста.

З інфлянцкага боку быў пададзены спіс умоў, на якіх інфлянцкія кіроўныя колы пагаджаліся перайсці пад уладу ВКЛ. Інфлянцы прасілі захаваць свабоду пратэстанцкага веравызнання, пацвердзіць ільготы і прывілеі даўнейшых часоў, абараніць іх перад магчымымі абвінавачваннямі германскага імператара ў здрадзе сваім васальным абавязкам, гарантаваць займанне кіроўных пасад для мясцовага нямецкага насельніцтва, весці вайну за вызваленне акупаванай маскоўцамі інфлянцкай тэрыторыі. Магістр Ордэна Г. Кетлер і рыжскі арцыбіскуп Вільгельм жадалі захаваць уладу ў якасці васалаў Жыгімонта Аўгуста[104].

Перамовы працягнуліся ў Вільні. Інфлянцы імкнуліся перайсці пад пратэктарат не толькі ВКЛ, але і Польшчы. Іх не задавальнялі аб'ёмы і эфектыўнасць вайсковай дапамогі з боку літвінаў. Рада ВКЛ на чале з М. Радзівілам Чорным не жадала дзяліцца з палякамі выгодамі ад падпарадкавання Інфлянтаў. Польскі сойм, у сваю чаргу, заняў індыферэнтную пазіцыю ў дачыненні да інфлянцкіх спраў, заклікаючы Жыгімонта Аўгуста звярнуцца да ўнутрыпалітычных праблем. На некаторы час справа перамоў у Вільні павісла ў паветры. У рэшце рэшт, улічваючы пагрозу нанясення маскоўцамі новых удараў па тэрыторыі Інфлянтаў, кампраміс быў знойдзены. У заключанай 28 лістапада 1561 г. дамове (у гісторыю ўвайшла пад назвай Pacta Subiectionis) Інфлянты фармальна пераходзілі пад персанальную юрысдыкцыю (пратэктарат) Жыгі-

102 ПЛ. Вып. 2. С. 241.
103 Czapliński W. Stanowisko państw skandynawskich wobec sprawy inflanckiej w latach 1558–1561 // Zapiski Historyczne. 1963. T. 28. Z. 3. S. 404–405.
104 Jasnowski J. Mikołaj Radziwiłł Czarny. S. 280–288.

монта Аўгуста як гаспадара Польшчы і ВКЛ[105]. Неабходна заўважыць, што рыжскія паслы адмовіліся ставіць свае подпісы, матывуючы гэта перавышэннем уласных паўнамоцтваў і патрэбай узгаднення пазіцый з вышэйшым кіраўніцтвам горада[106].

Дамова паміж ВКЛ і Інфлянтамі ад 28 лістапада 1561 г. прадугледжвала ліквідацыю Інфлянцкай дзяржавы ў яе старым выглядзе і стварэнне на яе тэрыторыі новых дзяржаўных структур, падначаленых польска-літоўскаму гаспадару. На левабярэжнай частцы Інфлянтаў было створана Курляндскае герцагства на чале з новаспечаным герцагам Г. Кетлерам. Праваруч ад цячэння Дзвіны ўтваралася Задзвінскае герцагства, якое фармальна належала Жыгімонту Аўгусту як вярхоўнаму ўладару. Кіроўныя паўнамоцтвы тут таксама атрымаў Г. Кетлер[107]. Артыкулы дамовы ўключалі ў сябе асноўныя просьбы інфлянцаў. Да іх былі дададзены: дазвол біць уласную манету, намінал якой не адрозніваўся ад літоўскага гроша, наданне аўтаномнага статуса судовым органам, вызваленне ад падаткаў на неакрэслены тэрмін з прычыны ваенных спусташэнняў, забарона гандлю для асоб габрэйскага паходжання.

Такім чынам, інфлянцы захавалі поўную самастойнасць ва ўнутрыпалітычных справах. Інфлянты фактычна займелі статус «дзяржавы ў дзяржаве». З іншага боку, дзякуючы вайсковым гарнізонам кіраўніцтва ВКЛ мела магчымасць кантраляваць сітуацыю ў Інфлянтах. Жыгімонт Аўгуст не мог пайсці на рэальнае далучэнне (інкарпарацыю) інфлянцкай тэрыторыі да ВКЛ з прычыны нежадання псаваць стасункі са Святой Рымскай імперыяй германскай нацыі, чыім васалам намінальна з'яўляліся Інфлянты. Важным было таксама пазітыўнае стаўленне да інфлянцкай палітыкі ВКЛ з боку еўрапейскай грамадскай думкі. У кампрамісным характары вырашэння інфлянцкай праблемы выразна адчуваецца выкарыстанне метадаў, уласцівых для палітычнай дзейнасці Жыгімонта Аўгуста. Варта пры гэтым адзначыць, што неўзабаве — у 1566 г. — Інфлянты ўсё ж такі былі далучаны да ВКЛ і перасталі карыстацца шырокай унутрыпалітычнай аўтаноміяй[108].

Заключэнне дамовы 1561 г. было відавочным поспехам палітыкі ВКЛ, але ён не быў поўным з прычыны ўхілення рыжан ад яе падпісан-

105 Арыгінал дамовы надрукаваны ў: Dogiel M. Codex diplomaticus... T. 5. S. 238–243.
106 Jasnowski J. Mikołaj Radziwiłł Czarny. S. 289–291.
107 История Латвийской ССР. Т. 1. С. 175–177.
108 Dogiel M. Codex diplomaticus... T. 5. S. 269–278.

ня[109]. Рыга звязвала сабою дзвінскі шлях з Балтыйскім морам. Гэта абумоўлівала важнае стратэгічнае значэнне горада. Развітая партовая інфраструктура Рыгі давала выдатныя магчымасці для гандлю з Еўропай. Авалоданне кантролем над гэтым горадам было адной з галоўных задач кіраўніцтва як ВКЛ, так і Маскоўскай дзяржавы. У далейшым у адказ на міралюбныя прапановы літвінаў маскоўцы патрабавалі перадачы ім менавіта Рыгі, на што літвіны пайсці катэгарычна адмаўляліся.

Выказваючы ў 1561 г. лаяльнасць гаспадару ВКЛ, Рыга пагаджалася толькі на ваеннае супрацоўніцтва. Аднак літоўскі гарнізон там так і не быў размешчаны. Горад застаўся незалежным да 1581 г. Праўда, у знешніх зносінах яго самастойнасць была намінальнай. Літвінам удалося усталяваць праз выкуп Дзюнамунда, які знаходзіўся ў самым вусці Дзвіны, кантроль за выхадам рыжскіх караблёў у Балтыйскае мора[110].

Захаванне самастойнасці Рыгі і шырокая ўнутрыпалітычная аўтаномія, нададзеная Інфлянтам, выклікалі ў М. Радзівіла Чорнага расчараванне і незадаволенасць вынікамі інфлянцкай палітыкі ВКЛ. «Малацьба сена» — гэтак ён ахарактарызаваў сваю дзейнасць ў Інфлянтах у канцы 1562 г.[111]

Сапраўды, з аднаго боку Княства дасягнула значных поспехаў, распаўсюдзіўшы свой уплыў на большую частку тэрыторыі былой Інфлянцкай дзяржавы. Аднак палітычная эліта ВКЛ не атрымала магчымасці займаць у Інфлянтах кіроўныя пасады і набываць зямельныя ўладанні. Замест гэтага на Княства была ўскладзена задача абараняць іх ад udараў Маскоўскай дзяржавы. ВКЛ было вымушана максімальна напружваць уласныя фінансава-матэрыяльныя рэсурсы для падтрымання сваёй прысутнасці на прыбалтыйскай тэрыторыі. Ужо ў пачатку 60-х гг. XVI ст. выявіўся недахоп сродкаў для арганізацыі эфектыўнай абароны Інфлянтаў. Да таго ж з'явілася рэальная пагроза разгортвання шырокамаштабнай вайны з Масковіяй.

Палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў разгледжаны перыяд выклікала ў даследчыкаў справядлівае пытанне, якія мэты пераследавала яго кіраўніцтва, згаджаючыся на вайсковую дапамогу Інфлянтам. Сярод большасці гісторыкаў пераважаюць меркаванні, што ВКЛ рэалізоўвала

109 Jasnowski J. Mikołaj Radziwiłł Czarny. S. 293.
110 Ibid. S. 302–305.
111 Listy. S. 415–417.

ўласныя геапалітычныя інтарэсы, карыстаючыся спрыяльным збегам акалічнасцей. Дапамога інфлянцам распасціралася да той мяжы, пакуль гэтага патрабавалі інтарэсы літвінаў. Інфлянцкая палітыка ВКЛ мела выразнае прагматычнае адценне[112].

Уяўленне аб шчырым і высакародным памкненні ВКЛ дапамагчы знясіленым ад нападаў маскоўцаў Інфлянтам, узяўшы іх пад сваю апеку, з'яўляецца, на нашу думку, звычайнай гістарыяграфічнай праекцыяй таго ідэалагічнага абгрунтавання ўступлення ВКЛ у вайну, якое рабілася кіраўніцтвам дзяржавы і захавалася ў актавых матэрыялах і наратыўных крыніцах. Выстаўляць падобную ідэалагічную аргументацыю ў якасці матывацый палітычнага дзеяння нельга.

Інфлянцкая палітыка ВКЛ была накіравана перадусім на абарону ўласных дзяржаўных інтарэсаў. Аб'ектыўныя абставіны існавання дзяржаўнага арганізму не маглі дазволіць кіраўніцтву краіны пакласці ў падмурак стратэгічнай ініцыятывы актыўную наступальную палітыку. Дзеля засяроджання ўвагі на інфлянцкім напрамку неабходна было забяспечыць стабільныя мірныя ўзаемадачыненні з іншымі суседзямі, у першую чаргу з Крымскім ханствам. Нягледзячы на вялікія абяцанні, зробленыя інфлянцам у заключаных з імі дамовах, ВКЛ не магло даць больш, чым гэта было магчыма. І гэтая сітуацыя кіраўніцтвам ВКЛ добра ўсведамлялася. Менавіта адсюль вынікала схільнасць ўрада ВКЛ да абарончых дзеянняў у Інфлянтах, сталая ўвага да захавання перамір'я і акцэнтаванне ўласнай міралюбнасці на дыпламатычных перамовах з маскоўцамі.

Апошняя спроба захаваць мір была асуджана на няўдачу. Дыпламатычная місія Баркулаба Корсака, якая знаходзілася ў Маскве ў пачатку 1562 г., нічога, па сутнасці, змяніць ужо не магла. Па задуме кіраўніцтва ВКЛ, яна павінна было адцягнуць пачатак ваенных дзеянняў. Але, мяркуючы па ўсім, у Маскве разгадалі намеры літвінаў і наўмысна затрымалі пасланніка, каб выкарыстаць фактар нечаканасці пры нападзе на ўсходнія землі ВКЛ. Масла ў агонь падліў перахоп літоўскіх паслоў, якія везлі ў Крымскае ханства гаспадарскую грамату з просьбай напасці на Масковію ў выпадку, калі яна пачне вайну супраць ВКЛ. У адказ Іван Грозны даслаў Жыгімонту Аўгусту грамату, у якой абгрунтоўваў пачатак

112 Найбольш упарта і аргументавана гэты пункт гледжання абараняе Э. Тыберг. Гл.: Tiberg E. Zur Vorgeschichte des Livländischen Krieges.

вайны з ВКЛ, не забываючы адзначыць факт падвойнай гульні літоўскіх палітыкаў[113].

Такім чынам, маскоўскі бок не бачыў падстаў для працягу перамір'я. Затое зачэпак для развязвання вайны было больш чым дастаткова. Гэта і адмова выдаць замуж за Івана IV сястру Жыгімонта Аўгуста Катарыну, і захоп Тарваста, і заключэнне Pacta Subjectionis з Інфлянтамі. Літвінам удалося перахапіць ініцыятыву ў інфлянцкім канфлікце, і Іван Грозны прагнуў узяць рэванш за гэтае знешнепалітычнае паражэнне. У пачатку 1562 г. яго нішто не стрымлівала ад новай шырокамаштабнай вайны з Вялікім Княствам Літоўскім.

## § 2. Пачатак шырокамаштабнай вайны. Полацкая катастрофа 1563 г.

Нягледзячы на папярэджанні, нападзенне маскоўцаў на памежныя землі ВКЛ адразу пасля заканчэння перамір'я 25 сакавіка 1562 г. з'явілася для кіраўніцтва дзяржавы непрыемнай нечаканасцю. Паведамленні пра збор маскоўскага войска ў Смаленску, высланыя са сталіцы ВКЛ у памежныя замкі 22 сакавіка 1562 г., аказаліся запозненымі[114]. Спадзяванні на захаванне мірнага становішча да вяртання Б. Корсака былі марнымі. Яго затрымка ў Маскве не паўплывала на планы маскоўцаў пачаць вайну супраць ВКЛ. Напэўна, маскоўцамі прынцыпы дыпламатычнай этыкі пасля перахопу літоўскіх ганцоў у Крымскае ханства болей не ўлічваліся[115].

У канцы сакавіка 1562 г. *«люди, вторгнувъши московские под Полоцко на рубежы, села выпалили и немало людей в полон побрали»*[116]. 25 сакавіка 1562 г. групоўка пад кіраўніцтвам татарскага царэвіча Ібака і Івана Шарамецева ўчыніла набегі на ваколіцы Оршы, Дуброўны і Мсціслава, спустошыўшы іх і забраўшы шмат палонных. У Дуброўне быў спалены пасад. Адначасова пуціўльскі намеснік Грыгорый Мяш-

[113] РИО. Т. 71. С. 46–67.
[114] LM. Kn. 564. P. 94–95.
[115] ПСРЛ. Т. 29. С. 297–298. Цалкам верагодна, што адказам на перахоп гэтых дакументаў стала ўварванне маскоўцаў у канцы 1561 – пачатку 1562 г. у ваколіцы Мсціслава, дзе яны нанеслі немалыя шкоды. Аб гэтым здарэнні згадвалася ў гаспадарскай грамаце, прывезенай Б. Корсакам: РИО. Т. 71. С. 51.
[116] LM. Kn. 564. P. 92–93.

чэрскі, выступіўшы са Старадуба, ваяваў *«могилевские и чичерские и пропойские места»*[117].

20 траўня 1562 г. вялікае маскоўскае войска на чале з А. Курбскім падышло да Віцебска. Трохдзённая стаянне ля горада скончылася спальваннем пасадаў і спусташэннем ваколіц. Маскоўскія крыніцы паведамляюць, што ў выніку аблогі быў узяты «астрог», але гэта наўрад ці адпавядае рэчаіснасці. Неўзабаве маскоўцы вярнуліся ў Вялікія Лукі, спаліўшы па дарозе пасады Суража[118].

У мэты маскоўцаў не ўваходзіла ўзяцце добра ўмацаваных гарадоў, бо на гэта былі патрэбны адпаведныя сродкі. Мэтавы характар маскоўскіх акцый заключаўся ў спусташэнні памежных раёнаў ВКЛ і вынішчэнні мясцовага насельніцтва.

У адказ Жыгімонт Аўгуст загадаў *«замъкам, местам, волостям и селам того неприятеля нашого московъского к тамошънему краю прилегълым и где досягънути можеш, таке ж плен, пустошенье и шкоду мечом и огънем и въсяким способом и обычаем неприятельским чинити»*[119]. Праграма дзеянняў кіраўніцтва ВКЛ, як відаць, запазычвала тактыку маскоўцаў.

Адначасова, як вядома, у Вільні шукалі ваеннай падтрымкі звонку, у першую чаргу з боку Крымскага ханства. У пачатку ліпеня 1562 г. крымскае войска падышло да Мцэнска. На гэтую вестку Іван IV загадаў спыніць падрыхтоўку вялікай выправы супраць ВКЛ, накіраваўшы ўсе сілы на адпор татар[120]. Крымскае войска, даведаўшыся аб падыходзе маскоўцаў, спешна адступіла[121]. Так ці інакш, татары адцягнулі ўвагу асноўных маскоўскіх сіл ад ваенных дзеянняў супраць ВКЛ.

---

117 ПСРЛ. Т. 13. С. 340–341.

118 *«...И острог взяли и пожгли и посады у города у Витебска все пожгли и наряд в остроге поимали и людей в остроге многих побили, и села и деревни около Витебска пожгли и повоевали места многие. А назад идучи от Витебска, у города у Сурожа посады пожгли и людей многих побили и многие литовские места воевали, и пришли, дал Бог, на Луки здорово»* (ПСРЛ. Т. 29. С. 298–299). Пра падзеі пад Віцебскам Жыгімонту Аўгусту паведамляў найвышэйшы гетман М. Радзівіл Руды: Listy. S. 381–382.

119 LM. Kn. 564. P. 93–94.

120 Ужо 21 траўня 1562 г. Іван Грозны *«пошел на свое дело литовское»*, але быў вымушаны павярнуць войска супраць крымскіх татар: ПСРЛ. Т. 13. С. 341. Гл. таксама: Османская империя и страны Центральной, Восточной и Юго-Восточной Европы в XV–XVI вв.: Главные тенденции политических взаимоотношений / Под ред. И. Грекова. М., 1984. С. 262.

121 ПСРЛ. Т. 13. С. 342.

20 красавіка 1562 г. Жыгімонт Аўгуст пастанавіў збіраць паспалітае рушэнне на 16 траўня 1562 г. на Друцкіх палях[122]. На чале з гетманам М. Радзівілам Рудым рушэнне здзейсніла шэраг нападаў на маскоўскія воласці, у прыватнасці, спаліла ваколіцы Смаленска і беспаспяхова атакавала веліжскія ўмацаванні[123]. Другая вайсковая групоўка спустошыла ў сярэдзіне траўня 1562 г. раёны Себежа і Апочкі, што на Пскоўшчыне: *«Литва воевали по волостям, и сем волостеи вывоевали, и Себежщину вывоевали, и монастыри пожгли»*[124]. Верагодна, гэта былі найманыя жаўнеры з польскага кантынгенту[125].

У сваю чаргу, маскоўскі атрад на чале з Пётрам Сярэбраным у ліпені 1562 г. накіраваўся з Дарагабужа на Мсціслаў[126]. Маскоўцы разбілі тых літвінаў, што выйшлі за сцены горада для адпору[127]. У жніўні 1562 г. іншы маскоўскі атрад на чале з Васілём Сярэбраным здзейсніў выправу ў раён Дрысы, дайшоўшы аж да Дзвіны[128].

Найбольш значная падзея ў шэрагу гэтых двухбаковых удараў адбылася 19 жніўня 1562 г. паблізу Невеля. Групоўка найманых жаўнераў на чале з польскім ротмістрам Станіславам Лесьнявольскім сутыкнулася з маскоўскім войскам, якім камандаваў А. Курбскі. Паводле ацэнкі Івана Грознага, 15 тысячам маскоўскіх жаўнераў супрацьстаялі 4 тысячы жаўнераў з боку ВКЛ[129]. У лісце Ф. Зэбжыдоўскага да М. Радзівіла Рудога, адпраўленым праз два дні пасля бітвы, сустракаецца лічба ў 45 тысяч маскоўскіх жаўнераў[130]. Яе ж паўтараюць хронікі М. Бельскага, М. Стрыйкоўскага і Л. Гурніцкага[131]. Асноўнае ядро войска ВКЛ складалі дзевяць польскіх конных рот (гл. р. II, § 3). Гэта прыкладна паўтары тысячы чала-

122 LM. Kn. 564. P. 98–100.
123 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 412.
124 ПЛ. Вып. 2. С. 242.
125 Аб дзеяннях палякаў на Пскоўшчыне прыкладна ў гэты час паведамляе Ф. Зэбжыдоўскі: Jasnowski J. Materiały do działalności… S. 281.
126 Дадзеныя пра Смаленск як месца адпраўлення гэтага войска з'яўляюцца няслушнымі (ПЛ. Вып. 2. С. 242–243), бо стаўкай П. Сярэбранага быў вызначаны менавіта Дарагабуж. Гл.: ПСРЛ. Т. 29. С. 298.
127 ПСРЛ. Т. 13. С. 343. Падчас гэтай акцыі быў спалены пасад горада.
128 ПЛ. Вып. 2. С. 242–243. Гэтая інфармацыя пацвярджаецца ў Ф. Зэбжыдоўскага: Jasnowski J. Materiały do działalności… S. 288.
129 Переписка Ивана Грозного с Андреем Курбским. С. 42–43.
130 Jasnowski J. Materiały do działalności… S. 291.
131 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 413; Bielski M. Kronika. T. 2. S. 1151–1152; Górnicki Ł. Dzieje w Koronie Polskiej w r. 1538 do r. 1572 / Wyd. K. Turowski. Sanok, 1855. S. 128–129.

век, што супадае з лічбай, пададзенай А. Гваньіні і М. Бельскім[132]. У хроніцы М. Стрыйкоўскага гэтае войска выглядае такім чынам: палякаў у ім была адна тысяча, літвінаў — 200, астатнюю частку складалі казакі і людзі, якія ўваходзілі ў двор полацкага ваяводы Станіслава Давойны[133].

Польскія жаўнеры ўдала размясціліся ў цесным балоцістым месцы, якое з двух бакоў абкружала вада. Заняўшы зручную абарончую пазіцыю, яны на працягу дня стрымлівалі націск пераважвальных сіл непрыяцеля і рабілі паспяховыя вылазкі невялікіх груп коннікаў. У рэшце рэшт, выкарыстаўшы спрыяльны момант, найманыя роты з годнасцю адступілі[134].

Страты жывой сілы выразна паказалі, на чыім баку засталася перамога. Польскае войска страціла ўсяго толькі 16 чалавек, у той час як маскоўцы, паводле розных дадзеных, пакінулі на полі бою ад 1500 (найбольш рэальная лічба) да 7–8 тысяч чалавек[135]. Паражэнне маскоўскага войска стала адной з галоўных прычын пагаршэння ўзаемадачыненняў паміж Іванам Грозным і Андрэем Курбскім.

Баявыя дзеянні на гэтым не спыніліся. Восенню 1562 г. большай актыўнасцю вызначаўся літоўскі бок. Маскоўцы ў гэты час былі заняты падрыхтоўкай выправы пад Полацк. У верасні 1562 г. літвіны зноў учынілі напад на пскоўскія воласці, на гэты раз на Муравеіна, Аўсішча, Карові Бор, пры гэтым *«полону много взяша, скота, людей посекоша, и церкви пожгоша, и дворы боярския и земледельцев»*[136]. Асцёрскі дзяржаўца Філон Кміта і гомельскі стараста Каленіцкі Тышкевіч здзейснілі выправу пад Старадуб, дзе мелі *«поторжки з людьми московскими»*, з якіх яны выйшлі пераможцамі. Працягваючы паход, літоўскія ваяры сутыкнуліся з вялікім атрадам маскоўцаў. У выніку бою літвіны *«на голову поразили»* непрыяцеля, пры гэтым у палон было ўзята больш за тысячу чалавек, у тым ліку дзвесце «дзяцей баярскіх». У палоне апынуўся і мас-

132 Gwagnini A. Kronika. S. 116–117; Bielski M. Kronika. T. 2. S. 1151–1152.

133 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 413. Іншыя крыніцы ўдзел літвінаў у бітве не пацвярджаюць.

134 Bielski M. Kronika. T. 2. S. 1152.

135 Аб 16 забітых з польска-літоўскага боку і 1500 — з маскоўскага піша Ф. Зэбжыдоўскі: Jasnowski J. Materiały do działalności... S. 291. Палякі згубілі аднаго ротмістра — М. Аляськіцкага: Górnicki Ł. Dzieje w Koronie... S. 129; Bielski M. Kronika. T. 2. S. 1152.

136 ПЛ. Вып. 2. С. 243.

коўскі ваявода — князь Васіль Цёмкін. За здзейснены паспяховы рэйд углыб маскоўскай тэрыторыі Ф. Кміта атрымаў падзяку ад гаспадара[137].

Двухбаковыя ўдары 1562 г. не мелі на мэце дасягнення якіх-небудзь значных вынікаў, зразумела, калі не лічыць такімі спусташэнне безабаронных паселішчаў і рабаванне мясцовага насельніцтва. У задачы абодвух бакоў не ўваходзіла доўгачасовая аблога ўмацаваных пунктаў і планамерная заваёва тэрыторыі праціўніка. У цэлым гэтыя дзеянні павінны былі паказаць наяўныя сілы і рэсурсы, якія меліся ў кожнага з бакоў. Яны выявілі прыкладна аднолькавы, раўнаважны стан абедзвюх армій пры лакальных формах барацьбы.

З верасня 1562 г. маскоўскае кіраўніцтва пачало рыхтавацца да маштабнай выправы на ВКЛ. Сам час яе падрыхтоўкі і правядзення паказваў, што маскоўскія ўлады імкнуліся ў максімальнай ступені выкарыстаць фактар нечаканасці. У восеньскі перыяд баявыя дзеянні, як правіла, згортваліся з прычыны неспрыяльных умоў надвор'я і немагчымасці забяспечыць армію правіянтам без вялікіх выдаткаў. У зімовы ж час на фронце панавала амаль поўнае зацішша.

На выбар зімы, безумоўна, паўплывала і меншая небяспека нападзення крымскіх татар на землі Маскоўскай дзяржавы. Да таго ж Іван Грозны зрабіў неабходныя захады для наладжвання дыпламатычных кантактаў з Крымскім ханствам, што ў пэўнай ступені дазваляла маскоўцам спадзявацца на спакойнае становішча на крымскай мяжы ўзімку[138].

У гэтых абставінах маскоўскі ўрад вырашыў ажыццявіць, без перабольшання, дзёрзкую ваенную аперацыю. Мала хто мог меркаваць, што для ўдару будзе абраны Полацк. Гэты горад быў адной з найлепей умацаваных крэпасцяў на тэрыторыі ўсходняй Беларусі. Напярэдадні Інфлянцкай вайны ў Полацку правялі рамонт абарончых умацаванняў[139]. Гэта не магло зрабіць аблогу лёгкай. Горад быў адрэзаны ад астатняга свету непраходнымі лясамі і балотамі, асабліва з паўночнага боку. Гэтая натуральная заслона, а таксама дастаткова вялікая аддаленасць ад мяжы з Маскоўскай дзяржавай дазваляла спадзявацца, што на Полацк не нападзе непрыяцель. Найбольш лагічна з геаграфічнага і ваенна-стратэгічнага гледзішча выглядала, калі б маскоўцы ўдарылі па Віцебску[140].

---

[137] АСД. Т. 4. Вильна, 1870. С. 7–8.
[138] История внешней политики. С. 174.
[139] M i e n i c k i R. Stanisław Dowojno. S. 449–450.
[140] Нагадаем, што менавіта гэты горад перажыў нападзенне і кароткачасовую аблогу ў траўні 1562 г.: ПСРЛ. Т. 29. С. 298–299.

Выбар Полацка дыктаваўся, на нашу думку, перш за ўсё яго размяшчэннем на рацэ Дзвіна. Захоп горада адразаў бы ад дзвінскага шляху Віцебск, а разам з ім усё паўночна-ўсходняе памежжа ВКЛ ад цэнтральнай часткі краіны. Аднак важней было тое, што Полацк перакрываў камунікацыю па Дзвіне з Інфлянтамі. Адсюль досыць зручна было пагражаць інфлянцкай тэрыторыі, у тым ліку і далёкай Рызе — канчатковай мэце змагання Івана IV. Цалкам верагодна, што ў перспектыве маскоўскі цар меў намер выкарыстаць дзвінскі шлях для атакі на рыжскім напрамку. Недарма пасля захопу Полацка ў Вільні захваляваліся менавіта за становішча Рыгі[141], а самі рыжане ў перамозе маскоўцаў пад Полацкам бачылі далёкасяжны крок да авалодвання іх горадам[142].

У сваім абгрунтаванні полацкай выправы маскоўскае кіраўніцтва спасылалася на чатыры прычыны. Першая з іх мела яўны ідэалагічны кантэкст. Нападзенне на ВКЛ тлумачылася дыскрымінацыяй праваслаўнай канфесіі з боку пратэстантаў-лютэран[143]. Вядома, што ўлетку 1562 г. у Полацку і Віцебску назіраліся сур'ёзныя канфлікты паміж лютэранамі і праваслаўнымі іерархамі[144]. Цалкам магчыма, што інфармацыя аб іх непасрэдна паўплывала на рашэнне маскоўскага кіраўніцтва здзейсніць аблогу Полацка.

Асаблівы рэлігійны каларыт полацкай выправе надавала ўзяцце маскоўскім царом з сабою крыжа Ефрасінні Полацкай, які да гэтага часу захоўваўся ў Смаленску[145]. Тым самым абгрунтоўвалася справядлівасць ваеннай кампаніі, якая прымала характар вяртання святыні на сваё месца[146].

---

141 Listy. S. 437.

142 Ibid. S. 444–445.

143 *«...Наипаче же горя сердцем о святых иконах и о святых храмех священых, иже безбожная Литва поклонение святых икон отвергъше, святыя иконы пощепали и многая поругания святым иконам учинили и церкви розорили и пожгли и крестьянскую веру и закон оставльше и поправше и Люторство восприяша»* (ПСРЛ. Т. 29. С. 302).

144 *«...Wyrozumieliśmy co się wczyna około luterskiej sekty przez samego władykę połockiego, tam w Połocku i Witebsku. A jako szkodliwo jest to zwłaszcza pod dzisiejszym czasem walki skąd burzki zamieszania. A zatym i niebezpieczeństwa między poddanymi tamtejszymi naszymi i od nich obawiać i postrzegać potrzeba...»* (Listy. S. 389–390). Відавочна, што гэтыя словы датычылі праблемы лаяльнасці полацкіх мяшчан да літоўскай улады, якая магла быць парушана ў выніку дзейнасці лютэран. З іншага боку, наўрад ці Полацк можна было ў гэты час назваць месцам інтэнсіўнай экспансіі пратэстантызму.

145 ПСРЛ. Т. 29. С. 303.

146 Гл.: B o g a t y r e v S. Battle for divine wisdom. The rhetoric of Ivan IV's campaign against Polotsk // The Military and Society in Russia, 1450–1917. Leiden; Boston; Köln, 2002. P. 325–363.

А вось наступныя абгрунтаванні выправы на Полацк цалкам упісваюцца ў кантэкст тагачасных канфліктных маскоўска-літоўскіх зносін. Гэта, па-першае, ігнараванне літоўскім бокам царскага тытулу Івана Грознага; па-другое, сутыкненне інтарэсаў у Інфлянтах; па-трэцяе, нацкоўванне крымскіх татар на Масковію[147]. Увага пры гэтым акцэнтавалася перадусім на інфлянцкіх справах, дзе ў супрацьстаянні з ВКЛ Маскоўская дзяржава прайграла першы этап барацьбы.

Рашэнне аб падрыхтоўцы Іванам Грозным вялікай выправы ў ВКЛ было прынята ў верасні 1562 г.[148] Збор войска на месцах прызначылі на дзень Св. Мікалая (6 снежня 1562 г.). Падрыхтоўка да выправы павінна была праводзіцца ў строгай сакрэтнасці. Яе афіцыйным пачаткам трэба лічыць 30 лістапада 1562 г., калі з Масквы ў Мажайск выступіў цар Іван Грозны. Зрабіўшы там роспіс палкоў, ён прызначыў канчатковы збор войска на 5 студзеня 1563 г. у Вялікіх Луках[149]. Працэс падрыхтоўкі і ход выправы маскоўскага войска на Полацк дэталёва апісаны Дз. Валадзіхіным, што вызваляе нас ад неабходнасці паўтараць падрабязнасці гэтага мерапрыемства[150].

Складаным і адкрытым для дыскусіі застаецца пытанне пра колькасць маскоўскага войска, якое было задзейнічана пры захопе Полацка. Усе крыніцы паўтараюць, што маскоўскае войска было надзвычай вялізным. Пра гэта за некалькі дзён да аблогі паведамляў у прыватным лісце полацкі ваявода С. Давойна, падкрэсліваючы, што ў маскоўскім войску знаходзіцца больш прасталюдзінаў, чым дваран[151]. Аднак канкрэтныя дадзеныя ў розных крыніцах вельмі разыходзяцца паміж сабой. Польскія і літоўскія хронікі, а таксама заходнія крыніцы называюць лічбу ад 150 да 300 тысяч чалавек[152].

Польскія даследчыкі некрытычна ставіліся да інфармацыі гэтых крыніц, цалкам прымаючы іх на веру[153]. З расійскіх гісторыкаў толькі

---

147 ПСРЛ. Т. 29. С. 302.

148 Книга полоцкого похода 1563 г.: Исследование и текст / Подгот. текста К. Петрова. СПб., 2004. С. 31. З незразумелай прычыны ў Лебедзеўскім летапісе гаворыцца пра лістапад 1562 г. як дату прыняцця гэтага рашэння: ПСРЛ. Т. 29. С. 302.

149 Книга полоцкого похода... С. 31–54; ПСРЛ. Т. 29. С. 303–304.

150 Александров Д., Володихин Д. Борьба за Полоцк... С. 91–94.

151 Mienicki R. Stanisław Dowojno. S. 459–460. Варта таксама адзначыць словы Жыгімонта Аўгуста пра *«великие а снать перед тымъ мало слыханые силы»* маскоўскага непрыяцеля: Listy. S. 429.

152 280 тыс. — Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 413; 300 тыс. — Gwagnini A. Kronika. S. 108–109; ВС / Сост. и изд. А. Сапунов. Т. 4. Витебск, 1885. С. 119–120.

153 Mienicki R. Stanisław Dowojno. S. 461; Natanson-Leski J. Dzieje granicy wschodniej Rzeczypospolitej. S. 163.

Р. Скрыннікаў зрабіў спробу дэталёва падлічыць колькасць маскоўскіх вайскоўцаў. У выніку ён абгрунтаваў колькасць войска ў 50–60 тысяч чалавек, пры гэтым колькасць дваранскага апалчэння складала 31 546 чалавек[154]. У гэтую лічбу Р. Скрыннікаў не залічыў дапаможныя сілы, якіх было не менш за 80 тысяч чалавек. Пункт гледжання расійскага вучонага прыняў беларускі даследчык Г. Сагановіч[155]. Дз. Валадзіхін прытрымліваецца думкі, што мінімальная лічба войка складала 130 тысяч чалавек, не адмаўляючы пры гэтым магчымасці прысутнасці ў войску 200–300 тысяч чалавек. Пры гэтым уласна дваранскае войска па яго версіі складала 50–55 тысяч чалавек[156]. Г. Харашкевіч у сваім найноўшым даследаванні толькі фіксуе дадзеныя розных крыніц, не засяроджваючы ўвагі на вырашэнні гэтай праблемы[157].

Пасля супастаўлення розных дадзеных і меркаванняў варта вылучыць два істотныя моманты. Па-першае, гэта наяўнасць у маскоўскім войску вялікай колькасці дапаможных сіл — г. зв. *«посохи»*. Па-другое, актыўная частка войска складала не больш за 60 тысяч чалавек, што супадае з падлікамі Р. Скрыннікава. Трэба адзначыць таксама, што ў маскоўцаў было 150–200 гармат рознага калібру[158].

Што такому вялізнаму войску маглі супрацьпаставіць літвіны? Колькасць узброеных людзей, якія трапілі пасля захопу полацкага замка ў маскоўскі палон, склала ўсяго толькі 2 тысячы чалавек[159]. Вядома, што ў Полацку размяшчаліся тры-чатыры найманыя роты польскіх драбаў агульнай колькасцю 500 чалавек. У замку знаходзілася толькі 20 ці 40 гармат[160]. Баланс сіл, як бачым, складваўся яўна не на карысць палачан.

---

154 Скрынников Р. Царство террора. СПб., 1992. С. 155. Аналагічнай лічбы (30 299 чалавек) прытрымліваецца пецярбургскі даследчык Аляксандр Філюшкін. Гл.: Филюшкин А. Причины «Полоцкого взятия» 1563 г. глазами современников и потомков // Вестник Санкт-Петербургского университета. Серия 2: История. 2005. Вып. 3. С. 28–29.

155 Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. Мн., 2001. С. 191–192; Сагановіч Г. Полацкая вайна. С. 63.

156 Александров Д., Володихин Д. Борьба за Полоцк… С. 91, прим. 27.

157 Хорошкевич А. Россия в системе… С. 326–327.

158 Сагановіч Г. Захоп Полацка Іванам IV паводле нямецкіх «лятучых лісткоў» 1563 г. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. Полацк, 1998. С. 267; Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 413.

159 ВС. Т. 4. С. 121. Хутчэй за ўсё, у снежні 1562 г. палачане не павінны былі выходзіць у паспалітае рушэнне. Падобнае вызваленне ад земскай павіннасці яны атрымалі ў 1561 г. Гл.: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 551 адв. — 552.

160 ВС. Т. 4. С. 122; Сагановіч Г. Захоп Полацка… С. 267.

У памежных замках ВКЛ пра збор маскоўскага войска ў Вялікіх Луках даведаліся ўжо на пачатку 1563 г.[161] У сярэдзіне студзеня інфармацыя пра выправу маскоўцаў дайшла да гаспадара, які знаходзіўся ў Польшчы[162]. Прыкладна ў гэты ж час маскоўскае камандаванне зразумела, што выправа перастала быць таямніцай для літвінаў.

Аднак ліхаманкавыя спробы гаспадарскай Рады ВКЛ арганізаваць дапамогу Полацку скончыліся поўным фіяска. 6 студзеня 1563 г. Рада ВКЛ выдала «ваенныя лісты» да павятовых харужых і шляхты з просьбай неадкладна накіравацца ў Менск у паспалітае рушэнне[163]. У сярэдзіне студзеня 1563 г. была атрымана інфармацыя, што маскоўскае войска рухаецца ў напрамку Полацка[164]. У пасланнях радных паноў да насельніцтва ВКЛ ад 23 студзеня 1563 г. да ўдзелу ў змаганні супраць ворага заклікаліся ўжо ўсе жыхары краіны: «*...Хто не винен служити воины, ино для примноженья учтивости будучи до того охвоч*»[165]. Пры гэтым, заклікаючы шляхту выступіць у войска, радныя паны не пагражалі пакараннем, а толькі згадвалі пра шляхецкі абавязак абароны краіны. У якасці заахвочвання да выступлення акцэнтавалася ўвага на хуткім прыбыцці Жыгімонта Аўгуста з Польшчы, а разам з ім — польскага войска. Менавіта з гэтым звязвалася апошняя надзея на выратаванне Полацка[166].

Праз два тыдні — 6 лютага 1563 г. — радныя паны ў мэтах хутчэйшага збору рушэння паабяцалі шляхце заплаціць за выхад у войска (гл. р. II, § 1). Аднак часу для рэалізацыі гэтай ініцыятывы ўжо не было.

Варта заўважыць, што збор паспалітага рушэння быў прызначаны яшчэ на 6 снежня 1562 г. (адзначым: на той жа дзень, што і першапачатковы збор маскоўскіх жаўнераў). Аднак шляхціцы не спяшаліся ісці ў войска. Нават праз месяц, у першай палове студзеня 1563 г., у Менску пры найвышэйшым гетмане М. Радзівіле Рудым знаходзілася ўсяго

161 Grala H. Źródła do dziejów stosunków polsko-moskiewskich w XVI wieku (Nowe znaleziska w Archiwum Warszawskim Radziwiłłów) // Miscellanea Historico-Archivistica. 1997. T. 7. S. 148.

162 Listy. S. 428–430. Дз. Валадзіхін не мае рацыі, пішучы, што Жыгімонт Аўгуст даведаўся пра полацкія падзеі толькі пасля захопу горада: Александров Д., Володихин Д. Борьба за Полоцк... С. 94. У прынцыпе, далей па тэксце аўтар сам сабе пярэчыць, апісваючы змест лістоў Жыгімонта Аўгуста да М. Радзівіла Рудога, у якіх закраналася тэма полацкай выправы: Тамсама. С. 98.

163 LM. Kn. 564. P. 135–136.

164 Listy. S. 428–430.

165 LM. Kn. 564. P. 138–139.

166 Mienicki R. Stanisław Dowojno. S. 460-461; BKórn., rkps. 1536, k.141–144.

толькі каля 100 коннікаў (!)[167]. У далейшым сітуацыя ў лепшы бок не змянілася. Падчас аблогі Полацка пад камандай гетмана было толькі 2 тысячы жаўнераў з ВКЛ і 1400 польскіх наймітаў[168]. Змагацца супраць маскоўскай армады з такім мізэрным войскам было немагчыма. Літоўскае войска прастаяла ў бяздзейнасці на рацэ Чарніца ўвесь час аблогі і было вымушана адступіць перад небяспекай удару перавышаючых сіл непрыяцеля[169].

Маскоўскае войска падышло да Полацка 31 студзеня 1563 г. і за кароткі час абкружыла горад з усіх бакоў. Агляд полацкіх умацаванняў упэўніў маскоўцаў, што аблога не будзе лёгкай і кароткачасовай. 4 лютага 1563 г. Іван Грозны распарадзіўся даслаць у Вялікія Лукі людзей для назапашвання правіянту на ўсю зіму і вясну[170]. Гэта, безумоўна, сведчыць пра падрыхтоўку маскоўцаў да доўгага «сядзення» пад сценамі Полацка.

Жыхары Полацка ўвесь час аблогі знаходзіліся сам-насам з ворагам. Лебедзеўскі летапіс адзначыў высакамерную пазіцыю палачан напярэдадні і ў пачатку аблогавай аперацыі. Яны зачыніліся ў горадзе і першапачаткова адмовіліся ісці на перамовы аб здачы горада, яўна спадзеючыся на надзейнасць сваіх умацаванняў і знешнюю падтрымку з боку войска ВКЛ. Дасланага маскоўскага ганца, які прывёз прапанову аб капітуляцыі, полацкія ўлады загадалі пакараць смерцю[171].

Абаронцы горада адразу пачалі чыніць перашкоды маскоўскаму войску, абстрэльваючы яго пазіцыі і робячы баявыя вылазкі ў стан ворага[172]. Ужо на другі дзень аблогі — 1 лютага 1563 г. — палачане панеслі значную страту. Ад гарматнага стрэлу загінуў ротмістр Рыгор Галубіцкі[173], які, мяркуючы па кантэксце інфармацыі М. Стрыйкоўскага, фактычна з'яўляўся кіраўніком абароны горада[174]. Пасля яго смерці кіроўныя функцыі ўзяў на сябе полацкі ваявода С. Давойна.

У пачатку аперацыі маскоўцы ўзяліся за будаўніцтва адмысловых прыстасаванняў для аблогі («туры») і паспрабавалі ўвайсці ў астрог (па-

---

167 Listy. S. 425–426.
168 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 413.
169 Книга полоцкого похода… С. 65–66; Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 413.
170 Книга полоцкого похода… С. 63.
171 ПСРЛ. Т. 29. С. 305.
172 ПСРЛ. Т. 29. С. 308 і інш.
173 Гэтай інфармацыі пярэчыць «Кніга полацкага паходу», у якой паведамляецца, што 12 лютага 1563 г. Г. Галубіцкі кіраваў вылазкай палачан на лагер маскоўцаў: Книга полоцкого похода… С. 64–65.
174 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 413.

садскую частку горада). Палачане адбілі атаку маскоўскіх стральцоў, выгнаўшы іх з захопленай вежы[175]. Гэта было, напэўна, найбольш значнае непасрэднае сутыкненне варожых бакоў падчас аблогі Полацка.

Аднак ход падзей развіваўся яўна не на карысць палачан. Дапамога звонку не падыходзіла, а маскоўцы паляпшалі свае пазіцыі. 5 лютага 1563 г. полацкія ўлады вырашылі пайсці на перамовы з маскоўцамі[176]. Яны прасілі спынення агню да 9 лютага 1563 г., каб высветліць, ці згодны палачане на здачу горада. Полацкі пасол Васіль Грыбун паведамляў маскоўцам аб настроях у Полацку, што *«люди многие мысльми своими шатаются: иные люди бить челом хотят* (маскоўскаму цару)*, а иные не хотят»*[177]. Гэта была відавочная дыпламатычная хітрасць абаронцаў, здзейсненая з мэтай выйграць час.

Аднак маскоўскае камандаванне разгадала намеры полацкіх уладаў і выкарыстоўвала перамовы для далейшага паляпшэння сваіх пазіцый вакол горада. Маскоўцы мэтанакіравана набліжалі свае гарматы да сцен полацкага пасада. Нарэшце вечарам 7 лютага 1563 г. да Полацка падышла цяжкая артылерыя, якая адыграла ў далейшым галоўную ролю ў бамбардаванні крэпасці[178].

9 лютага 1563 г. С. Давойна, зразумеўшы безвыніковасць перамоў і ўбачыўшы, што маскоўская артылерыя размясцілася пад сценамі пасада, прыняў фатальнае рашэнне, якое, па сутнасці, прадвызначыла лёс Полацка. Ваявода распарадзіўся запаліць і пакінуць добра ўмацаваны гарадскі пасад. Лебедзеўскі летапіс адзначае, што пры гэтым жаўнеры з Полацка *«посадских людеи из острогу учали забивати* (заганяць. — *А. Я.*) *в город»*[179]. Маскоўскія жаўнеры не засталіся ў баку ад гэтых падзей. Яны ўварваліся ў пасадскую частку і завязалі бой з палачанамі. Простыя жыхары, убачыўшы такі паварот падзей, вырашылі ісці не ў Верхні замак, а падацца ў маскоўскі лагер. Гэтую версію падтрымлівае нямецкі «лятучы лісток», у якім пішацца, што мяшчане, уражаныя абстрэлам, самі вырашылі пакінуць горад[180]. М. Стрыйкоўскі малюе іншую карціну па-

[175] ПСРЛ. Т. 29. С. 309.
[176] Дз. Валадзіхін лічыць, што пайсці на перамовы полацкія ўлады вымусіў абстрэл горада з гармат: Александров Д., Володихин Д. Борьба за Полоцк... С. 99–100. Аднак крыніцы не паведамляюць пра задзейнічанасць артылерыі ажно да 8 лютага 1563 г., не лічачы лакальнага абстрэлу з выспы на Дзвіне 31 студзеня 1563 г.: ПСРЛ. Т. 29. С. 308.
[177] ПСРЛ. Т. 29. С. 310.
[178] Тамсама.
[179] Тамсама.
[180] У нямецкіх «лятучых лістках» сцвярджаецца, што горад падпалілі полацкія мяшчане: Сагановіч Г. Захоп Полацка... С. 255; ВС. Т. 4. С. 120.

дзей. Ён паведамляе пра свядомае выгнанне сялян з горада, называючы гэтае рашэнне чарговай памылкай С. Давойны[181]. Верагодней за ўсё, сяляне і мяшчане сталі ахвярай няўдалага бою літвінаў з маскоўцамі, у выніку якога ў іх не было магчымасці адысці ў замак. Па розных дадзеных, у маскоўскім лагеры апынулася ад 11 да 20 тысяч палачан[182].

Афіцыйная маскоўская інтэрпрэтацыя гэтых падзей змешчана ў справаздачы аб знаходжанні ў Маскве пасольства ВКЛ у снежні 1563 – студзені 1564 г.: *«А что за неделю до взятья городцкого нам били челом всею землею и хотели нам нашу отчину сдати без кровопролитья, да в том нам изменили, зажегши, острог покинули, а сами в город побежали, и которой народ в остроге остался и из острога вышел, ино тот народ рать взела»*[183]. Гэтая цытата пацвярджае нечаканую для маскоўцаў ініцыятыву палачан пакінуць пасад (астрог). Відавочна, што полацкія жыхары апынуліся сам-насам з бядою. У іх не было іншага выбару, як выйсці ў маскоўскі лагер і здацца ў палон. Гэтае рашэнне, хутчэй за ўсё, было добраахвотна-вымушаным.

Дзеянні С. Давойны выклікалі пярэчанні з боку мясцовай шляхты і польскіх ротмістраў[184]. Так, супраць падпальвання пасаду і адыходу з яго выступіў Ян Глебовіч, які, верагодна, узначальваў апазіцыю ваяводзе[185]. Відавочна, што ў Полацку не было адзінства меркаванняў адносна вядзення абароны. Яшчэ 8 лютага 1563 г., калі перамовы паміж маскоўцамі і палачанамі былі ў самым разгары, па маскоўскім прадстаўніку М. Безніну зусім нечакана пачалі страляць з полацкіх гармат[186]. Гэта маглі зрабіць толькі праціўнікі перамоў з непрыяцелем[187]. Раздор у лагеры абаронцаў не спрыяў наладжванню дзейснага супрацiўлення і, без сумневу, паслужыў адной з прычын няўдалай абароны горада.

[181] Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 413.

[182] Маскоўская разрадная кніга адназначна характарызуе палачан, якія выйшлі з горада, як «палон». Іх налічвалася 11060 чалавек: Книга полоцкого похода... С. 63–64; Лічба 20 тысяч чалавек даецца ў: Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 413.

[183] РИО. Т. 71. С. 258–259.

[184] Л. Гурніцкі называе нязгоду паміж ваяводам і ротмістрамі галоўнай прычынай падзення Полацка: Górnicki Ł. Dzieje w Koronie... S. 125–126.

[185] Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 413.

[186] ПСРЛ. Т. 29. С. 310.

[187] Дз. Валадзіхін бачыць у гэтым здарэнні праяву барацьбы антымаскоўскай і прамаскоўскай партый. Аднак цяжка ўбачыць у полацкім ваяводзе па-прамаскоўску настроенага палітыка, а менавіта гэта павінна лагічна выцякаць з аўтарскага пастулата: Александров Д., Володихин Д. Борьба за Полоцк... С. 101.

Пажар дазволіў маскоўцам падцягнуць яшчэ бліжэй да замкавых сцен сваю артылерыю. Л. Гурніцкі адзначае, што гэта ўдалося здзейсніць дзякуючы няправільнаму вядзенню перамоў С. Давойнам, які не паставіў перад маскоўцамі ўмовы, каб тыя не перасоўвалі свае гарматы наперад[188]. Аднак, на нашу думку, у тых складаных абставінах, у якіх апынуўся абложаны горад, наўрад ці ваявода мог дыктаваць падобныя ўмовы.

Цалкам магчыма, што яшчэ адным істотным пралікам полацкага камандавання была ўпэўненасць у адсутнасці ў непрыяцеля цяжкіх гармат. Гэтая акалічнасць дазваляла спадзявацца, што ў добра ўмацаваным замку пашчасціць адседзецца працяглы час.

Аднак падыход цяжкай артылерыі пад сцены Полацка стаў вырашальным чыннікам супрацьстаяння. Паўторым, што, на нашу думку, гэта было поўнай нечаканасцю для абаронцаў горада. Адчайная спроба адкінуць маскоўцаў далей ад замка ў ноч з 12 на 13 лютага 1563 г. не ўдалася[189].

Да 13 лютага 1563 г. гарматы былі расстаўлены па ўсім перыметры замкавых умацаванняў. Ад маскоўскіх ядраў цяпер папросту не было магчымасці схавацца. Суцэльны абстрэл замка на працягу 13–14 лютага 1563 г., а таксама падпальванне замкавых сцен канчаткова вырашылі справу на карысць маскоўцаў. У крэпасці разгарэўся пажар, які не было магчымасці затушыць. Палачане актыўна не супраціўляліся, яўна ўражаныя нечакана моцным і інтэнсіўным артылерыйскім бамбардаваннем. Маскоўскі летапісец адзначыў у сувязі з гэтым: «*Нападе бо на них страх и ужас и ничим же противитися могуще*»[190]. Безнадзейны стан рэчаў вымусіў палачан пайсці на перамовы і здацца на міласць ворагу. 15 лютага 1563 г. маскоўцы ўвайшлі ў горад.

Ці можна казаць пра здраду палачан? Наўрад ці. Ужо само прасоўванне маскоўскіх «тураў» і гармат бліжэй да полацкіх умацаванняў, здзейсненае перад 9 лютым 1563 г., павінна было моцна ўзрушыць тых, хто зачыніўся ў Верхнім замку. Відавочна, з пачаткам масіраванага бамбардавання ў Полацку пачалі нарастаць адчайныя настроі. Сітуацыя для абаронцаў горада яўна складвалася неспрыяльна. Падпальванне замкавых сцен толькі давяршыла справу.

188 Górnicki Ł. Dzieje w Koronie... S. 125–126.
189 Падчас гэтай вылазкі быў паранены баярын Іван Шарамецеў, які ўваходзіў у камандуючы склад маскоўскага войска: Книга полоцкого похода... С. 64–65.
190 ПСРЛ. Т. 29. С. 311.

У падобных складаных умовах заўсёды ўзнікае пытанне: бараніць горад да канца, без усялякай надзеі на поспех, альбо здацца на годных умовах, каб выратаваць яго ад разбурэння і разрабавання? Мяркуем, што менавіта такая дылема паўстала перад палачанамі, калі яны прымалі рашэнне аб капітуляцыі. Да таго ж маскоўскае камандаванне абяцала захаваць жыццё і нават «даць волю». Верагодна, сярод абаронцаў горада зноў успыхнулі рознагалоссі. Аб разыходжаннях у поглядах яскрава сведчыць той факт, што ўжо пасля рашэння полацкага ваяводы аб капітуляцыі польскія роты і полацкая шляхта працягвалі біцца з маскоўцамі ў праробленай імі ў замкавай сцяне дзіры[191].

Наўрад ці ў самім Полацку была нейкая ўплывовая «прамаскоўская партыя». Маскоўскае кіраўніцтва на перамовах з літвінамі ў канцы 1563 г. катэгарычна заяўляла, што аніякага спрыяння пры ўзяцці горада з боку палачан не было. Полацк быў узяты дзякуючы ваеннай сіле маскоўцаў — *«огнем и мечом»*[192]. Крыніцы сведчаць, што адзінай групай полацкага насельніцтва, якая вітала прыход маскоўцаў, сталі праваслаўныя святары. Паводле «лятучага лістка», менавіта полацкі архіепіскап выйшаў да маскоўцаў з просьбай аб спыненні абстрэлаў і прапановай прыняць капітуляцыю горада[193]. Падчас царкоўнай службы ў Сафійскім саборы 18 лютага 1563 г. святары падзякавалі Івану Грознаму за вызваленне *«от Люторского насилования»*[194]. У далейшым да праваслаўных папоў з боку маскоўскіх уладаў было асабліва даверлівае стаўленне[195]. Са свайго боку, тыя актыўна супрацоўнічалі з акупантамі. Так, праваслаўны пратапоп інфармаваў маскоўцаў аб межах Полацкага ваяводства[196].

У ВКЛ, дарэчы, пытанне аб здрадзе палачан не было абыдзена ўвагай з боку цэнтральных уладаў. Цікава, што яшчэ перад аблогай С. Давойна непакоіўся, ці няма ў асяроддзі полацкіх мяшчан здрадніцкіх настрояў. Мяшчанская эліта Полацка цвёрда заверыла ваяводу ў патрыятызме гараджан, іх гатоўнасці стаяць да канца ў змаганні з ворагам[197].

---

191 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 413–414.
192 РИО. Т. 71. С. 265.
193 Сагановіч Г. Захоп Полацка... С. 256.
194 ПСРЛ. Т. 29. С. 313.
195 Гэта добра відаць па «наказной памяти» для П. Шуйскага: Книга полоцкого похода... С. 70–76.
196 ПКМГ. Ч. 1. Отд. 2. С. 436.
197 Mienicki R. Stanisław Dowojno. S. 459–460. Цалкам магчыма, што апасенні С. Давойны былі звязаны з буйнамаштабным канфліктам уладаў з полацкімі мяшчанамі, які меў месца ў 1558 г. Гл.: Варонін В. Палітычны лад Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст. // Беларускі гістарычны агляд. 1998. Т. 5. Сш. 1 (8). С. 57.

Пасля страты Полацка падазрэнні ў здрадзе не пацвердзіліся. Прынамсі, нам не сустракаліся дакументы, у якіх палачане абвінавачваліся б у гэтым. Афіцыйная Вільня лічыла прычынай хуткай здачы Полацка перш за ўсё тактычныя пралікі С. Давойны, хоць крайнім яго ніхто не рабіў[198]. У той жа час добра ўсведамляўся бездапаможны стан Полацка, які без падтрымкі з боку цэнтра не мог выстаяць у змаганні з моцным непрыяцелем.

На маскоўска-літоўскіх перамовах у канцы 1563 г. узнікла дыскусія, ці не парушыў Іван Грозны дадзенае полацкаму ваяводзе слова адпусціць шляхту на волю ў выпадку спынення абароны замка. Літвіны акцэнтавалі ўвагу на добраахвотнасці гэтага рашэння, якое было прынята ўзамен на гарантыі свабоды. Маскоўцы ж падкрэслівалі бязвыхаднасць становішча палачан, якія былі вымушаны пагадзіцца на здачу горада. Па іх словах, ніякіх абяцанняў адпусціць на свабоду маскоўскі цар не даваў, бо сама пастаноўка такога пытання з боку палачан была б нонсэнсам. Маскоўскія палітыкі наступным чынам трактавалі сітуацыю: «*...И их огонь отовселева обшел, и им было от наших сабли померети. И как уже они узнали над собою наш гнев, и они почали бити челом, живота просити, чтобы их мы побити не велели*»[199].

Аднак Лебедзеўскі летапіс сведчыць, што такое «слова» маскоўцамі ўсё ж такі было дадзена: «[Іван IV] *велел свое жалованное слово всем людем сказывати, чтобы из города все вон вышли, а государь им милость показал, побити их не велел и дал им волю, кто куды похочет*»[200]. Атрымліваецца, што маскоўцы падманулі, прынамсі, полацкую эліту,ператварыўшы яе прадстаўнікоў са шляхты ў звычайных палонных. Пры сустрэчы з імі ў Маскве літоўскія паслы пачулі, што ніякага «слова» адпусціць на волю не давалася. Цалкам магчыма, што палонныя не адважыліся сказаць праўду пад страхам пакарання. Так, Ян Глебовіч ухіліўся ад простага адказу за загадкавай фразай: «*А о слове ведает Бог да он, как пожалует, попамятует*»[201].

У Маскве тлумачылі, што полацкія шляхціцы сталі палоннымі з прычыны свайго «*нестоятелства*» — ваганняў ад прынясення прысягі на вернасць цару да паспешлівай адмовы ад яе і просьбаў адпусціць на волю. Падобная просьба, маўляў, з'явілася, калі палачане ўбачылі, што

[198] Listy. S. 443–444.
[199] РИО. Т. 71. С. 258–259. Гл. таксама: Тамсама. С. 368–369.
[200] ПСРЛ. Т. 29. С. 312.
[201] РИО. Т. 71. С. 287.

польскія найміты, выставіўшы патрабаванне захавання поўнай свабоды, былі адпушчаны назад у Літву. Аднак Іван Грозны ў адказ загадаў дэпартаваць шляхціцаў у Масковію.

З мяшчанствам гэтак не цырымоніліся. Яно адразу разглядалася маскоўскімі ўладамі як несвабоднае саслоўе: *«А которые бурмистры и мещане и лавники нам били челом на наше имя, ино мы ведь в своих людех волны, где тех хотим, тут держим»*[202].

Цікава, што ў нямецкіх «лятучых лістках» гаворыцца не пра ваганні палачан, а пра зменлівасць палітыкі маскоўцаў. Маскоўскае кіраўніцтва спачатку трымала полацкіх жыхароў пад вартай: «[Іван IV] *загадаў паставіць іх на гары, моцна ахоўваць і пяць дзён не даваць ім ніякай ежы, каб падумалі, што хоча памарыць голадам»*[203]. Затым, яшчэ праз тры дні, ім было прапанавана перайсці на маскоўскую службу. Цалкам верагодна, што ў гэты момант у свядомасці палачан альтэрнатывай гэтаму вымалёўвалася толькі галодная смерць у зняволенні. Цар абяцаў адпусціць на волю тых, хто не захоча служыць, але праз некаторы час некаторыя полацкія пушкары былі ўзяты на маскоўскую службу сілай. Падаецца, што версія «лятучых ліcткоў» выглядае больш праўдападобнай.

Усталяванне новых парадкаў не абышлося без праліцця крыві і праяўлення жорсткасці. Татарскія ваяры, якія служылі ў маскоўскім войску, пасеклі па невядомых прычынах манахаў-бернардзінцаў[204]. Маскоўскі цар загадаў патапіць усіх габрэяў, якія адмовіліся прыняць хрышчэнне. Аб гэтым паведамляе большасць крыніц, пры гэтым не толькі выразна антымаскоўскіх, але і створаных у самой Маскоўскай дзяржаве. Маецца на ўвазе ў першую чаргу Пскоўскі летапіс, які ў бесстароннім форме паведамляе пра гэтую акцыю[205].

У той жа час звесткі пра масавыя забойствы полацкіх мяшчан і шляхты, гэтак характэрныя для пазнейшых заходніх памфлетаў і хронік, хутчэй за ўсё, з’яўляюцца несапраўднымі[206]. Маючы выразную

[202] РИО. Т. 71. С. 258–259.
[203] Сагановіч Г. Захоп Полацка... С. 266.
[204] Даследчыкі бернардзінскага Ордэна называюць 5 забітых манахаў: Klasztory bernardyńskie w Polsce w jej granicach historycznych. Kalwaria Zebrzydowska, 1985. S. 265. Цыт. па: Сагановіч Г. Дзве гісторыі Полацка // Беларускі гістарычны агляд. 1997. Т. 4. Сш. 1–2 (6–7). С. 213.
[205] *«...А которыа были в городе жили люди жидове, и князь велики велел их и с семьями в воду в речноую въметати, и оутопили их»* (ПЛ. Вып. 2. С. 244).
[206] Historiae Ruthenicae Scriptores extere XVI saeculi. Vol. 1. Berlin; Petropoli, 1841. S. 16, 116.

антымаскоўскую скіраванасць, яны хацелі павялічыць эфект ад апісанняў жахаў праўлення Івана Грознага. Дз. Валадзіхін, падкрэсліваючы гэты момант, паспрабаваў зыходзіць ад адваротнага і рэабілітаваць маскоўскага цара. Маўляў, ніякіх арганізаваных Іванам Грозным масавых забойстваў не было, дадзеныя крыніц супярэчаць адна адной, а значыць, веры ім даваць нельга. Калі і былі адзінкавыя забойствы, то яны былі натуральным наступствам ваеннага становішча[207].

З такой ацэнкай катэгарычна нельга пагадзіцца. У сваім жаданні абяліць Івана Грознага Дз. Валадзіхін прыводзіць досыць хісткую аргументацыю, якая часта супярэчыць відавочнай логіцы. «Абвяржэнне» літоўскіх, польскіх, заходнееўрапейскіх аўтараў на самой справе ператварылася ў яго ў звычайнае адкідванне прэч нязручных крыніц, пры гэтым зроблена яно не вельмі пераканаўча.

Палітыку Івана IV у дачыненні да палачан аніяк нельга назваць мяккай і добразычлівай. Дадзенае ім слова адпусціць на волю было парушана. Вялікая частка насельніцтва Полацка перажыла прымусовую дэпартацыю ўглыб Маскоўскай дзяржавы. Паводле іншаземных крыніц, у Масковію было выведзена да 50–60 тысяч чалавек[208]. Нямецкія «лятучыя лісткі» падаюць адну цікавую акалічнасць: дэпартацыя закранула толькі «літвінаў», а «русіны» засталіся на месцы пад вартай[209]. Аднак ніяк не назавеш «літоўцамі» полацкіх шляхціцаў П. Корсака, Л. Гарабурду, прадстаўнікоў роду Есманаў і інш., якія трапілі ў палон. Дз. Валадзіхін мяркуе, што ў дадзеным выпадку падобны нацыянальны падзел раўняўся падзелу сацыяльнаму, а гэта значыць, што ў Масковію былі адпраўлены асобы менавіта шляхецкага паходжання[210]. Гэта не зусім так. Дакладна вядома, што дэпартаваліся мяшчане, якія ў сваёй большасці былі праваслаўнымі «русінамі»[211].

Больш пашанцавала польскім найманым жаўнерам. Іх маскоўскі цар сапраўды адпусціў на свабоду, адарыўшы пры гэтым рознага кшталту падарункамі. Гэтым крокам маскоўскае кіраўніцтва хацела паказаць, што не збіраецца ваяваць з Польшчай. Маскоўскі бок не быў зацікаўле-

207 Александров Д., Володихин Д. Борьба за Полоцк… С. 106.
208 Gwagnini A. Kronika. S. 108–109; Kappeler A. Ivan Groznyj im Spiegel des ausländischen Druckschriften seiner Zeit. Frankfurt am Mein, 1972. S. 116.
209 ВС. Т. 4. С. 121–122; Сагановіч Г. Захоп Полацка… С. 266.
210 Александров Д., Володихин Д. Борьба за Полоцк… С. 107.
211 РИО. Т. 71. С. 258–259.

ны ў непасрэдным умяшанні Кароны ў Інфлянцкую вайну. Падобнае абыходжанне з польскімі вайскоўцамі выклікала абвінавачванні ў іх адрас у супрацоўніцтве з захопнікамі[212].

Узяцце Полацка маскоўскім войскам, бясспрэчна, было найбольш буйной падзеяй Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг. Авалоданне Полацкам дало маскоўцам выгаднае стратэгічнае становішча. На іх баку аказалася значная ваенная перавага. Поспех маскоўцаў меў вялікі міжнародны рэзананс[213].

Становішча ВКЛ у сувязі са стратай Полацка істотна пагоршылася. Полацкія падзеі яскрава паказалі, што без знешняй дапамогі Княства няздольна супрацьстаяць непрыяцелю. Яны паслужылі дадатковым аргументам для прыхільнікаў больш цеснай уніі ВКЛ з Польшчай.

У чым кіраўніцтва ВКЛ бачыла прычыны полацкай катастрофы? Пазіцыі гаспадара і М. Радзівіла Чорнага пры адказе на гэтае пытанне разышліся. Па гарачых слядах магнат абвінаваціў Жыгімонта Аўгуста ў абыякавасці да літоўскіх праблем, пераключэнні ўсёй сваёй увагі на польскія справы. Такія закіды прасочваюцца ўжо ў канцы лютага — пачатку сакавіка 1563 г.[214] Гаспадар са свайго боку заяўляў, што прычыны страты Полацка маюць больш складаны і глыбокі характар, які караніцца ў самой істоце грамадска-палітычных зносін у Княстве: «*A tak zginienia Połocka nie iną własthą przyczynę rozumiemy, jedno tę która wszystkich państw na świecie upad i zniszczenie przynosić zwykła: unętrzna ziemską niestworność i niezgodę, a stąd spłoszeństwo i niedbałość ludzką w powinnościach ziemskich, bo gdzieby się na ratunek Połockowi wszystcy społem śpiesznie z powinności swej zebrali, pewnie by był nieprzyjaciel nic temu tak zacnemu klejnotowi onego państwa nie uczynił, ale jeszcze z lekkością abo i szkodą swoją więtszą stamtąd odeść musiał*»[215].

Афіцыйная сцІслая версія полацкіх падзей была выкладзена ў «ваенных лістах» 1565 г.: «*Неприятель наш великий княз московский, убезъпечивши кглейтом на послы и под тым часом кгды есмо до Коруны Польское отъехали, замок наш Полоцко взял и посел, и воеводу полоцкого з многими поддаными нашими народу шляхетъского, такъ же и поспо-*

---

212 G ó r n i c k i Ł. Dzieje w Koronie... S. 160.
213 P i r o ż y ń s k i J. Z dziejów obiegu informacji w Europie XVI wieku: Nowiny z Polski w kolekcji Jana Jakuba Wicka w Zurychu z lat 1560–1587. Kraków, 1995. S. 250.
214 Гл.: Listy. S. 441.
215 Ibid. S. 481.

*литых людей убезпечивши их обетъницою и словом своим выпустити добровольне, того не вчинил, але полоном звел народ хрестьянский, вольностями от продъков наших и от нас г[о]с[по]д[а]ра объдароных за верные и цнотливые их служъбы зневолили, только драбов польского народу на том же замъку взятых выпустил»*[216]. Як бачым, пры характарыстыцы падзей націск рабіўся на вераломнасць маскоўцаў.

Апынуўшыся ў складаным становішчы і не маючы магчымасцей для імклівага рэваншу, кіраўніцтва ВКЛ вырашыла як мага хутчэй заключыць перамір'е. Маскоўскі двор пагадзіўся трымаць мір да 1 верасня 1563 г.[217] У чэрвені 1563 г. маскоўскае кіраўніцтва прапанавала падоўжыць перамір'е да 1 лістапада 1563 г.[218] У сваю чаргу, літоўскі бок заявіў аб жаданні захоўваць мір аж да 25 сакавіка 1564 г.[219] Аднак у Маскве пагадзіліся працягнуць перамір'е толькі да 6 снежня 1563 г.[220] Дыпламатычныя зносіны павінны былі скончыцца прыездам у Маскву вялікага пасольства з ВКЛ.

Заключэнне перамірнага пагаднення адразу ж пасля захопу Полацка было ахарактарызавана Г. Харашкевіч як прыкрае паражэнне царскай ваенна-палітычнай лініі. Іван IV быў вымушаны саступіць ціску баяр, якія не жадалі далей ваяваць з «братамі» — літоўскімі раднымі панамі. Пры гэтым спыненне войска ў межах Полацка, на думку расійскай даследчыцы, з'яўлялася найгрубейшай стратэгічнай памылкай[221].

З падобнымі высновамі цяжка пагадзіцца. На наш погляд, маскоўскае кіраўніцтва проста прымірылася з аб'ектыўнымі рэаліямі вайны. Полацкая выправа была грандыёзнай акцыяй, якая патрабавала надзвычайных высілкаў. Г. Харашкевіч не задаецца пытаннем, ці мела вялізнае маскоўскае войска ў неспрыяльных зімовых варунках рэсурсы працягваць выправу. Да таго ж цяжка аспрэчваць той факт, што пасля захопу Полацка ініцыятыва ў вайне цвёрда перайшла ў рукі Масквы. Кароткачасовае перамір'е для ўзнаўлення сіл было ёй толькі выгадным.

Той факт, што маскоўскае войска спынілася ў гарадскіх межах, цалкам вытлумачальны. Як сведчыць змест дыпламатычных перамоў, мас-

216 НГАБ, ф. КМФ-18, воп. 1, спр. 45, арк. 76 адв. — 78.
217 РИО. Т. 71. С. 121–131; Книга посольская... Т. 1. С. 227–228.
218 РИО. Т. 71. С. 145–146.
219 Книга посольская... Т. 1. С. 230–231; РИО. Т. 71. С. 167.
220 Книга посольская... Т. 1. С. 242–243; РИО. Т. 71. С. 170–173.
221 Хорошкевич А. Россия в системе... С. 337–340.

коўскае кіраўніцтва зыходзіла з таго, што пасля захопу галоўнага адміністрацыйнага цэнтра тэрыторыя ўсяго «павета» пераходзіць пад новую ўладу. Дый што яшчэ можна было захапіць у Полацкай зямлі, акрамя неўмацаваных паселішчаў? Паходы маскоўскіх атрадаў углыб Полаччыны дзеля прыняцця ў мясцовага насельніцтва прысягі на вернасць цару часта заканчваліся збройнымі выступленнямі супраць акупантаў (гл. р. IV, § 3). Кантраляваць сітуацыю ў падобных умовах можна было толькі з добра ўмацаваных замкаў.

Зусім непераканаўча даследчыца тлумачыць факт наведвання Іванам Грозным па дарозе з Полацка ў Маскву сядзібы лідэра «баярскай апазіцыі» Уладзіміра Андрэевіча Старыцкага, які прыходзіўся цару стрыечным братам[222]. На нашу думку, гэтая падзея толькі лішні раз паказвае, што аніякага канфлікту з прычыны рашэння заключыць перамір'е з літвінамі паміж царом і баярамі не было.

Нягледзячы на дасягнутае перамірнае пагадненне, на мяжы ўсё адно было неспакойна. Па ўласнай ініцыятыве Міхайла Вішнявецкі ў чэрвені 1563 г. здзейсніў набег з Чаркасаў на Севершчыну. Гэта была тыповая казацкая акцыя. Выпаліўшы вёскі і забраўшы вялікі палон, яго атрад быў вымушаны адбівацца ад маскоўскіх вайскоўцаў, якія атакавалі літвінаў па дарозе назад. Палон быў адбіты, літоўскія жаўнеры, згубіўшы частку сваіх людзей, мусілі паспешліва адысці на сваю тэрыторыю[223].

Існаванне перамірнай дамоўленасці не перашкодзіла маскоўцам заняцца далучэннем зямель на левым беразе Дзвіны. Яны зыходзілі з відавочнага для сябе палажэння, што цяпер усё Полацкае ваяводства па праву мацнейшага належыць ім. Вынікам маскоўскіх рэйдаў углыб Полаччыны, якія адбыліся ўлетку 1563 г., было прывядзенне мясцовага насельніцтва да прысягі на вернасць маскоўскаму цару, а разам з тым — звыклае спусташэнне теріторый. Быў спалены Лукомль, «шкоды немалые» былі нанесены ў Лепелі, Чарэі (самы далёкі пункт, якога маскоўцы дасягнулі на поўдні), Глыбокім, Беразвечы, Галамыслі і інш. Мноства «людей тамошних» было забрана з усёй маёмасцю ў палон[224]. У жніўні 1563 г. чакаўся ўдар маскоўцаў па Дрысе. Ротмістр М. Сяняўскі заклікаў на дапамогу бліжэйшыя польскія роты і прасіў падмогі ў цэнтральных

---

[222] Хорошкевич А. Россия в системе... С. 341–342.
[223] Книга посольская... Т. 1. С. 232–234; ПСРЛ. Т. 29. С. 322.
[224] Книга посольская... Т. 1. С. 234–236; ПСРЛ. Т. 29. С. 325; НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 570–570 адв.

улад краіны[225]. Маскоўцы сапраўды прайшліся па дрыскіх ваколіцах, спустошыўшы іх[226].

Такім чынам, напады маскоўскага войска летам 1563 г. зазнала амаль уся левабярэжная Полаччына. Гэта была самая разгорнутая кампанія маскоўскага войска на тэрыторыі Полацкай зямлі за ўвесь час Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг.

Дзеянні непрыяцеля выклікалі нараканні з боку кіраўніцтва ВКЛ[227]. Яно заявіла, што маскоўцы не маюць права, зважаючы на перамір'е, пераходзіць Дзвіну і ўсталёўваць у левабярэжнай Полаччыне свае парадкі. На гэтыя скаргі маскоўскі двор адказваў, што ўся Полацкая зямля пасля авалодання Полацкам з'яўляецца вотчынай маскоўскага цара: *«Что ни есть в Полотцком повете чье ни буди, то все наше»*[228].

Нягледзячы на намеры праводзіць перамовы, у ВКЛ зусім не спадзяваліся заключыць мір з Маскоўскай дзяржавай. У Вільні былі ўпэўнены ў няўдачы перамоў і ў падрыхтоўцы маскоўцаў пад іх прыкрыццём да новага ўдару па Княстве. У лісце да крымскага хана Жыгімонт Аўгуст паведамляў, што ў Маскву паслы адпраўлены толькі дзеля вызвалення палонных. Сапраўды, у ВКЛ, нягледзячы на адпраўленне пасольства ў Маскву, быў абвешчаны збор паспалітага рушэння на 21 лістапада 1563 г.[229] У Вільні спадзяваліся на дапамогу крымскіх татар, якіх прасілі выступіць пры неабходнасці ў напрамку Смаленска, дзе магло б адбыцца злучэнне ўзброеных сіл ВКЛ і Крымскага ханства.

Аднак сапраўдны рэванш у ВКЛ планавалі ажыццявіць улетку 1564 г. Менавіта таму паслы, адпраўленыя ў Маскву, павінны былі пагаджацца на заключэнне перамір'я толькі да 1 ліпеня 1564 г. Жыгімонт Аўгуст зноў вялікія надзеі ўскладаў на падтрымку з боку Крымскага ханства, просячы аб сумесным удары па маскоўскіх землях[230].

Пасольства ВКЛ у складзе крайчага Юрыя Хадкевіча, маршалка дворскага, дзяржаўцы ляхавіцкага Рыгора Валовіча і пісара Міхайлы Гарабурды прыбыло ў Маскву 5 снежня 1563 г.[231] Перамовы распачаліся з вылучэння маскоўцамі максімальных тэрытарыяльных прэтэнзій. Гэ-

225 Listy. S. 450–451.
226 РИО. Т. 71. С. 181–182.
227 Книга посольская... Т. 1. С. 234–237.
228 РИО. Т. 71. С. 186.
229 РИБ. Т. 30. С. 721–722, 757–758.
230 Книга посольская... Т. 1. С. 244–246.
231 РИО. Т. 71. С. 196.

тым крокам яны імкнуліся засведчыць сваю перавагу і магчымасць дыктаваць свае ўмовы. Удзельнікі перамоў з маскоўскага боку асабліва настойвалі на прызнанні за Іванам Грозным царскага тытулу. Літвіны, зразумела, адкінулі маскоўскія патрабаванні, вылучыўшы свае. Яны патрабавалі вяртання Полацка і Смаленска ў якасці безагаворачнай умовы «вечнага міру». Пасля гэтых дыскусій перамоўныя бакі перайшлі да абмеркавання канкрэтных спраў.

Маскоўскія баяры наўпрост выказваліся за ўключэнне ў склад акупацыйнай тэрыторыі ўсёй Полацкай зямлі, разам з Лукомлем і Дрысай. Натуральна, літоўскія паслы не пагаджаліся з такой пазіцыяй. Яны лічылі, што часовай пералмірнай мяжой паміж ВКЛ і зонай маскоўскага панавання ў Полацкай зямлі павінна быць лінія ракі Дзвіна. Гэты варыянт цалкам не задавальняў маскоўцаў, якія пасля захопу Полацка мелі лепшае стратэгічнае становішча. Літвіны пайшлі на маленькую саступку, даючы згоду на прызнанне за маскоўскім бокам тэрыторыі, што знаходзілася на левым беразе Дзвіны роўна на адну мілю ад Полацка (прыкладна 8–9 км). У Інфлянтах літвіны прапанавалі прызнаць стан уладання кожнага з бакоў. Аднак маскоўцаў не задаволіў такі падзел іх «вотчыны», і таму перамовы скончыліся беспаспяхова[232]. Цікава таксама адзначыць, што маскоўскі бок настойваў на заключэнні доўгачасовага перамір'я на 10–15 гадоў, у той час як літвіны пагаджаліся захоўваць мір толькі да 1 ліпеня 1564 г. Маскоўцы цалкам слушна ўказвалі, што дзякуючы гэтаму ў Вільні хочуць перачакаць зімовы час і заручыцца падтрымкай сваіх саюзнікаў[233].

Безвыніковасць перамоўнага працэсу, натуральна, азначала ўзнаўленне ваенных дзеянняў. Пасольства ВКЛ было паспешліва адпраўлена на радзіму. Следам за ім у бок Княства рушыла маскоўскае войска...

## § 3. Нечаканая перамога: Ульская бітва 1564 г.

Цалкам верагодна, што ваенная выправа на Літву зімой 1564 г. планавалася ў Крамлі ўжо перад пачаткам перамоў з пасольствам Ю. Тышкевіча. Нагадаем, што маскоўцы не захацелі працягваць перамір'е да вяс-

[232] РИО. Т. 71. С. 277–280.
[233] Ход перамоў дэталёва апісаны ў маскоўскіх пасольскіх кнігах: Тамсама. С. 187–302.

ны 1564 г., спыніўшыся на даце 6 снежня 1563 г. Сімвалічна, што за год да гэтага менавіта на гэты дзень быў прызначаны першапачатковы збор маскоўскага войска для выправы на Полацк.

Бачачы безвыніковасць перамоўнага працэсу, 18 снежня 1563 г. маскоўскія баяры пагрозліва заявілі: *«И государь наш, з Божиею волею вотчину Полотцко взял, так и вперед своего искати хочет, и делом своим длити не хочет, рать государя нашего готова на конех сидит»*[234]. Сам факт, што ў Полацку і бліжэйшых маскоўскіх замках была раскватаравана вялікая колькасць жаўнераў, сведчыць аб гатоўнасці ў любы момант аднавіць ваенныя дзеянні. Варта ўзяць пад увагу і распачынанне руху маскоўскіх вайсковых груповак адразу пасля заканчэння місіі літоўскага пасольства ў Маскве. Такім чынам, верагодна, маскоўскае кіраўніцтва меркавала паўтарыць мінулагодні поспех, здзейсніўшы маланкавы напад у маласпрыяльны зімовы час.

Адначасова з Полацка і Смаленска выступілі дзве вялікія вайсковыя групоўкі[235]. Па словах М. Радзівіла Рудога, полацкае войска распачало паход 23 студзеня 1564 г.[236] Абедзве групоўкі павінны былі рухацца ў напрамку Оршы і сустрэцца недалёка ад гэтага горада — *«в селе на Боране»*. Для іх аб'яднання былі вызначаны дакладныя месца і час. Пасля злучэння маскоўскае войска павінна было рушыць у бок Менска і Навагрудка (!): *«...А от Орши итти к Меньску и к Новугородку к Литовскому воевати...»*[237]. Гэтая цытата паказвае, што ў намеры маскоўцаў не ўваходзіла аблога ўмацаваных пунктаў і акупацыя тэрыторыі ВКЛ. Іх асноўнай мэтай з'яўлялася спусташэнне зямельных уладанняў, рабаванне маёмасці, захоп у палон і вынішчэнне мясцовага насельніцтва. У «лісце аб навінах» паведамляецца, што маскоўскае войска, якое выступіла з Полацка, *«мело ити до Друцких поль через панство его королевской милости, чинечи плен и шкоду...»*[238]. У гэтым прагладаецца тактыка татарскіх маланкавых

[234] Тамсама. С. 284.

[235] ВС. Т. 4. С. 84; Копия с письма, присланного литовским гетманом в Варшаву на имя пана Радивила // Чтения в обществе истории и древностей Российских при Московском университете. 1847. Кн. 3. Отд. 3. С. 1 (далей — Письмо Радивила). Арыгінал ліста захоўваецца ў: РНБ, ф. 971, оп. 2, авт. 234, док. 1, л. 3–5. У Ніканаўскім і Аляксандра-Неўскім летапісах гаворыцца, што другое маскоўскае войска выступіла з Вязьмы: ПСРЛ. Т. 13. С. 377; Тамсама. Т. 29. С. 329.

[236] Письмо Радивила. С. 1.

[237] ПСРЛ. Т. 13. С. 377; ПСРЛ. Т. 29. С. 329. Паводле М. Стрыйкоўскага, маскоўскае войска павінна было рушыць у бок Вільні: S t r y j k o w s k i M. Kronika. T. 2. S. 415.

[238] ВС. Т. 4. С. 84.

набегаў углыб тэрыторыі праціўніка. Бліжэйшую аналогію выправы па сваім характары (але не па маштабнасці!) можна знайсці ў ваенных дзеяннях 1562 г.

Маскоўскія разрадныя кнігі падаюць роспіс палкоў маскоўскага войска, якія ўдзельнічалі ў зімовай выправе 1564 г. Як полацкая, так і смаленская групоўкі складаліся з трох палкоў — перадавога, вялікага і вартаўнічага. Камандуючым полацкай групоўкі з'яўляўся Пётр Шуйскі, а смаленскай — Васіль Сярэбраны. Пасля аб'яднання маскоўскае войска перагрупавалася ў пяць палкоў — з дадаткам палкоў левай і правай рукі. Павінна была адбыцца і змена камандавання (гл. табл. 1.3.1).

Неабходна адзначыць, што ў Ніканаўскім і Аляксандра-Неўскім летапісах у якасці другога ваяводы згадваецца Сямён Якаўлеў[239]. Пра выкананне ім ваяводскіх функцый паведамляе таксама «ліст аб навінах»[240]. Вядома, што ён пасля бітвы быў прызначаны на пасаду аднаго з полацкіх ваяводаў[241]. Таму цалкам магчыма, што ён сапраўды браў удзел у Ульскай бітве. У якасці палкавога ваяводы згадваецца таксама Якаў Болцін[242]. Аднак гэтае імя больш нідзе не сустракаецца.

Можна з упэўненасцю сказаць, што зімовая выправа 1564 г. па сваіх маштабах была значнай падзеяй: войскам кіравалі сябры Баярскай думы і татарскія царэвічы, якія ўваходзілі ў найвышэйшую дзяржаўную эліту, а збор пяці палкоў указвае на вялікую колькасць жаўнераў у маскоўскім войску.

На гэтым акцэнтуюць увагу літоўскія і замежныя крыніцы. Аднак чарговы раз падкрэслім іх схільнасць да гіпербалізацыі дадзеных. Чым больш часу праходзіла з моманту бітвы, тым большыя лічбы прыводзіліся ў хроніках і летапісах. Найменшую і, напэўна, найбольш верагодную колькасць жаўнераў згадвае М. Радзівіл Руды — 17–18 тысяч чалавек, — адзначаючы пры гэтым, што абгрунтоўвае яе багатым досведам падобных падлікаў[243]. Трэба ўлічваць таксама, што Радзівіл быў непасрэдным відавочцам падзей і яго ліст быў напісаны на наступны дзень пасля бітвы, што надае яму дадатковую вартасць.

239 ПСРЛ. Т. 13. С. 377; Тамсама. Т. 29. С. 329.
240 ВС. Т. 4. С. 85.
241 Разрядная книга 1475–1598 гг. С. 205; Разрядная книга 1550–1636 гг. Вып. 1 / Сост. Л. Кузьмина. М., 1975. С. 128.
242 ВС. Т. 4. С. 85.
243 Письмо Радивила. С. 2.

Табліца 1.3.1.

*Камандуючы склад маскоўскага войска ў зімовай выправе 1564 г. (паводле Разраднай кнігі 1550–1636 гг.)*

| Назва палка | Полацкая групоўка | Смаленская групоўка | Аб'яднанае войска[2] |
|---|---|---|---|
| Вялікі полк | кн. П. И. Шуйской*<br>кн. Ф. И. Татев<br>кн. И. Залупа Охлябинин[1]<br>И. И. Очин (-Плещеев)[2] | царевич Кайбула[3]<br>кн. В. С. Серебреной* | Ибак<br>кн. П. И. Шуйской*<br>З. И. Очин (-Плещеев) |
| Перадавы полк | З. И. Очин (-Плещеев) | Ибак[4]<br>кн.<br>П. С. Серебреной* | кн. П. С. Серебреной*<br>кн. Ф. И. Татев |
| Вартаўнічы полк | И. В. Шереметев-Меньшой*<br>кн. Д. Гундоров[2] | кн. П. Д. Щепин | кн. П. Д. Щепин<br>кн. И. (Залупа) Охлябинин |
| Полк левай рукі | | | И. В. Шереметев-Меньшой*<br>кн. Д. Гундоров |
| Полк правай рукі | | | царевич Кайбула<br>кн. В. С. Серебреной*<br>И. И. Очин (-Плещеев) |

**Заўвагі:**
Прозвішчы пададзены ў рускай транскрыпцыі.
Зорачкай (*) пазначаны сябры Баярскай Думы.
[1] У Разраднай кнізе 1559–1605 гг. знаходзіцца ў перадавым палку.
[2] Адсутнічае ў Разраднай кнізе 1559–1605 гг.
[3] У Разрадных кнігах 1475–1605 і 1475–1598 гг. знаходзіцца ў перадавым палку.
[4] У Разрадных кнігах 1475–1605 і 1475–1598 гг. знаходзіцца ў вялікім палку.

Другая грунтоўная крыніца — «ліст аб навінах» — паведамляе пра 24 тысячы маскоўцаў, якія супрацьстаялі літвінам[244]. Б. Папроцкі ў сваім «Гербоўніку» піша пра 25 тысяч маскоўскіх жаўнераў[245], а хронікі М. Стрыйкоўскага і М. Бельскага падаюць лічбу 30 тысяч чалавек. Смаленская групоўка, паводле іх дадзеных, налічвала 50 тысяч маскоўцаў[246].

Звесткі аб колькасці войска ВКЛ з'яўляюцца не менш супярэчлівымі. Найбольш важкія крыніцы — ліст Радзівіла і «ліст аб навінах» — нічога не паведамляюць на гэты конт. Папскі нунцый Я. Камэндоні згад-

[244] ВС. Т. 4. С. 85.
[245] Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego / Wyd. K. Turowski. Kraków, 1858. S. 854.
[246] Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 414; Bielski M. Kronika. T. 2. S. 1153.

вае, што маскоўскаму войску супрацьстаяла 6 тысяч літвінаў[247]. М. Стрыйкоўскі піша, што гетманы ВКЛ мелі войска *«nie więcej do boju godnego o cztery tysiące»*[248]. Гэтую лічбу называе Б. Папроцкі[249]. Я. Уханьскі паведамляе, што ў літоўскім войску было 5 тысяч коннікаў[250]. У сваю чаргу, М. Бельскі згадвае, што ў Ульскай бітве ўдзельнічала 10 тысяч літвінаў[251].

На чале войска ВКЛ знаходзіліся найвышэйшы гетман М. Радзівіл Руды і польны гетман Рыгор Хадкевіч. Таксама сярод камандуючага складу былі земскі стольнік Ян Хадкевіч[252], рагачоўскі стараста Багдан Саламярэцкі[253], жытомірскі стараста Раман Сангушка, луцкі стараста Богуш Карэцкі, браслаўскі стараста Юры Осцік, асцёрскі дзяржаўца Філон Кміта. У бітве ўдзельнічаў малодшы сын найвышэйшага гетмана Крыштаф[254].

Ведаючы па іншых крыніцах колькасць найманых рот, можна вывесці лічбу наймітаў, якія прынялі ўдзел у бітве. Іх было не больш за тысячу коннікаў. Верагодна, у бітве ўдзельнічала не ўсё войска ВКЛ, а толькі яго лепшая частка. А. Гваньіні піша, што літвіны атакавалі маскоўцаў *«z małym wojskiem, na które tak prędko zdobyć mogli...»*[255]. Вядома, што камандаванне войска ВКЛ мусіла хутка рэагаваць на звесткі пра марш маскоўскага войска з Полацка. Па інфармацыі Я. Камэндоні, з прычыны хут-

[247] Commendoni J. Pamiętniki... T. 1. S. 45–46. Цікава адзначыць, што за два дні да бітвы Я. Камэндоні паведамляў у Рым, што пры М. Радзівіле Рудым знаходзіцца 35 тысяч літоўскіх коннікаў і 20 тысяч драбаў: Ibid. S. 40. Наўрад ці гэтыя лічбы адпавядалі сапраўднаму стану рэчаў.

[248] Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 414.

[249] Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego. S. 854.

[250] Uchansciana, czyli zbiór dokumentów, wyjaśniających życie i działalność Jakuba Uchańskiego, arcybiskupa gnieznieńskiego / Wyd. T. Wierzbowski. T. 3. Warszawa, 1890. S. 47.

[251] Гэты дысананс з іншымі паведамленнямі выкліканы, на нашу думку, жаданнем зменшыць эфект ад перамогі літоўскага войска: Bielski M. Kronika. T. 2. S. 1153.

[252] Відавочна, вайсковыя артыкулы Я. Хадкевіча, дадзеныя ім «пад Улай», трэба датаваць не 1564 г., як гэта робіць С. Кутшэба (Polskie ustawy i artykuły wojskowe od XV do XVIII w. / Wyd. S. Kutrzeba. Kraków, 1937. S. 120–124), а лютым 1568 г., калі Я. Хадкевіч кіраваў няўдалай аперацыяй па захопе Ульскага замку. Ніводная крыніца не канстатуе яго кіроўнай ролі ў войску ВКЛ падчас Ульскай бітвы. А гэта значыць, што няма падстаў меркаваць, што Я. Хадкевіч мог быць у 1564 г. аўтарам вайсковых артыкулаў. Гэтую памылку паўтарыў не так даўно Гжэгаж Блашчык: Błaszczyk G. Ustawy i artykuły wojskowe... S. 29–75.

[253] Магчыма, у М. Стрыйкоўскага Багдан Саламярэцкі пераблытаны з Іванам, старастам мсціслаўскім. Вядома, што Іван Саламярэцкі камандаваў коннай ротай у 1567 г.: AS. T. 7. S. 112–113.

[254] Письмо Радивила. С. 4.

[255] Gwagnini A. Kronika. S. 109.

кага руху конніцы да месца бітвы не змаглі дайсці пешыя роты[256]. Радзівіл пісаў, што з гэтай жа прычыны не здолела прыняць удзел у бітве артылерыя[257].

Цяжка меркаваць пра ролю, якую адыграла ў Ульскай бітве паспалітае рушэнне. Пра яго харугвы ў крыніцах нічога не гаворыцца. Напэўна, яно не ўдзельнічала ў першай атацы і было задзейнічана толькі пры асноўным удары і пагоні. Гэта стасуецца з інфармацыяй «ліста аб навінах», які паведамляе, што найвышэйшы гетман падышоў з усім войскам (у тым ліку з гарматамі і драбамі) неўзабаве пасля першага сутыкнення[258].

Найбольш істотныя звесткі пра ход бітвы падае «ліст аб навінах». Іншыя крыніцы дадаюць дэталі, якія датычаць хутчэй характару бітвы. Прыкладам, аператыўны ліст відавочцы падзей — М. Радзівіла Рудога — зусім не апісвае ход бою, што было выклікана пэўнымі прычынамі, якія будуць абгавораны ніжэй.

Перад бітвай асноўныя сілы войска ВКЛ знаходзіліся ў Лукомлі. Добра папрацавала літоўская разведка, дзякуючы якой да вайсковага камандавання *«певная и частая ведомость о тых людех неприятельских доходила»*[259]. Атрымаўшы звесткі аб руху маскоўскага войска, 26 студзеня 1564 г. літвіны выступілі насустрач яму ў напрамку ракі Ула. Калі войска ВКЛ дайшло да Чашнікаў, гетманы даведаліся аб сутыкненні «старожы» з непрыяцельскімі дазорамі. Наперад былі высланы роты Б. Корсака і Р. Бакі. Неўзабаве адбылося першае сутыкненне гэтых рот з маскоўскім авангардам. Відаць па ўсім, атака была паспяховай, хоць ротмістры і прасілі аб падмацаванні. На дапамогу былі адпраўлены роты кн. Саламярэцкага і М. Сапегі. Праз нейкі час на вялікае поле пад вёскай Іванск падцягнулася асноўная групоўка жаўнераў. Літоўскае войска старанна падрыхтавалася да ўдару: *«Там обачивши Московские гуфы застановилися, и сождавшися, вси сполечне гуфы росправили»*[260].

Надзвычай супярэчлівымі з'яўляюцца звесткі крыніц аб стане гатоўнасці да бою маскоўскага войска. Ці было яно падрыхтавана да ўдзелу

[256] Commendoni J. Pamiętniki... T. 1. S. 46–47.
[257] Письмо Радивила. С. 3.
[258] ВС. Т. 4. С. 84.
[259] Тамсама.
[260] Тамсама.

ў бітве, ці быў для яго напад войска ВКЛ нечаканым? Адказ на гэтыя пытанні з'яўляецца найважнейшым для разумення ходу і характару бітвы.

М. Радзівіл Руды паведамляе, што войска П. Шуйскага чакала літвінаў на полі бітвы ў поўнай гатоўнасці[261]. Падобныя звесткі падае і Я. Камэндоні. Абодва пішуць, што маскоўскі военачальнік нават даў літвінам час для разгортвання баявых шыхтаў. Я. Камэндоні тлумачыць гэты факт «варварскай ганарлівасцю» маскоўцаў і тым, што яны ведалі пра малалікасць літоўскага войска. Пра разгортванне баявога парадку літвінаў папскі нунцый паведамляе цікавыя звесткі: літоўскія жаўнеры выходзілі рэдкімі і змешанымі шэрагамі з хмызняку[262]. Гэта можа сведчыць пра тое, што літвіны стараліся быць незаўважанымі праціўнікам.

«Ліст аб навінах» таксама нічога не паведамляе аб падрыхтоўчых мерапрыемствах маскоўскага войска. Апісанне характару бітвы ў гэтай крыніцы дазваляе заключыць, што літвіны выкарыстаглі пры ўдары фактар нечаканасці, які ў немалой ступені абумовіў поспех. Літоўскія гуфы *«в справе будучи на местцу стояли, и, зготовившися, з росказанья пана гетмана навышшого, пан гетман дворный подступил к ним з людом и росказал учинити потканье...»*[263]. Са зместу вынікае, што войска ВКЛ стаяла далёка ад непрыяцеля.

Абмінаецца тэма падрыхтоўчых мерапрыемстваў і ў хроніках М. Стрыйкоўскага і А. Гваньіні. Аднак яны паведамляюць важную інфармацыю пра тое, што войска П. Шуйскага разбіла лагер на Чашніцкіх палях пад Іванскам[264]. Гэта можа сведчыць аб тым, што літоўскае войска атакавала маскоўцаў не падчас маршу, а менавіта тады, калі яно знаходзілася ў лагеры. Гэта пацвярджаецца тым, што бітва пачалася позним вечарам альбо нават уначы[265]. Лагічна дапусціць, што наўрад ці ў такі час войска было на маршы.

Маскоўскія летапісы, апісваючы падзею, паведамляюць, што ўдар літоўскага войска быў нечаканым. Маскоўскія жаўнеры не мелі пры сабе зброі і не стаялі ў баявых шыхтах: *«Царевы же и великого князя воеводы*

---

261 Письмо Радивила. С. 1–2. У яго апісанні няма звестак пра сутыкненне літоўскіх рот з маскоўскім перадавым атрадам. А гэта — немалаважная дэталь.

262 Commendoni J. Pamiętniki... T. 1. S. 47.

263 ВС. Т. 4. С. 84–85.

264 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 414; Gwagnini A. Kronika. S. 109.

265 Commendoni J. Pamiętniki... T. 1. S. 48. Пскоўскі летапіс коратка паведамляе, што падчас бітвы *«прилучилося к ночи»*: ПЛ. Вып. 2. С. 245.

*не токмо доспехи [не] успели на себя положити, но и полки стати не успели, занеже пришли места тесные и лесные»*[266]. Летапіс абвінавачвае вайскоўцаў у нядобрасумленным выкананні сваіх абавязкаў: *«Шли не по государьскому наказу, оплошася, не бережно и не полки, и доспехи свои и всякой служебной наряд везли в санех»*[267]. Як бачым, у Маскве віну за паражэнне ўскладалі на маскоўскіх ваяводаў, якія не здолелі падрыхтаваць сваё войска да сустрэчы з праціўнікам.

Добра відаць, што паміж маскоўскім і літоўскім апісаннямі пачатку бітвы існуе выразная канфрантацыя. Але не ўсе крыніцы літоўскага паходжання сведчаць пра адкрыты характар бітвы. Сярод іх дысанансам гучаць сведчанні «Хронікі еўрапейскай Сарматыі» А. Гваньіні. Паводле яе, літоўскія жаўнеры *«na Moskwę uderzyli, która nieostrożna, iż nie mogła tak prędko do sprawy przyjść, a nasi im wytchnienia nie dając, bez odpoczynku siekli, kłoli kogo jedno dopaść mogli»*. Маскоўцам у такой сітуацыі нічога не заставалася, як кінуцца наўцёкі: *«Moskwa widząc, iż już trudno wskurać, rozpuścili konie po górach, po polach i po liesiech, gdzie kto mogł uchodził...»*[268].

А. Гваньіні піша, што ўдар літвінаў аказаўся для маскоўцаў поўнай нечаканасцю; маскоўцы не здолелі апамятавацца і аказаць супраціўленне. Гэтая інфармацыя сугучна з паведамленнем Ніканаўскага летапісу. Дададмо, што ў адной з маскоўскіх разрадных кніг ёсць згадка, што літвіны здзейснілі напад на групоўку П. Шуйскага *«без вести»*[269].

Як жа адбывалася нанясенне галоўнага ўдару па маскоўцах? «Ліст аб навінах», на наш погляд, дае зноў найбольш дэталёвую інфармацыю. Паводле апісання яго невядомага аўтара, літвіны нанеслі ўдар з двух бакоў — франтальнага, а затым тыльнага: *«Яко ся з ними* (маскоўцамі) *поткали, заразом их сперли, аж потом почали тыл додавати, и так теж гонячи за ними били их»*[270]. Гэтая атака адразу прынесла поспех, бо пагоня распачалася праз даволі кароткі час пасля яе. Як сведчыць «Ліст аб навінах», літвіны *«за ласкою божьею тое войско на голову поразили...»*[271].

Сугучнае з гэтай крыніцай апісанне ходу бітвы дае Я. Камэндоні. Аднак паміж гэтымі апісаннямі назіраецца істотная розніца. Згодна з паве-

---

266 ПСРЛ. Т. 13. С. 377; Тамсама. Т. 29. С. 329.
267 Тамсама.
268 Gwagnini A. Kronika. S. 109.
269 Разрядная книга 1559–1605 гг. / Сост. Л. Кузьмина. М., 1974. С. 19.
270 ВС. Т. 4. С. 85.
271 Тамсама.

дамленнем Я. Камэндоні, роты «Бургграва з Полацка» (Б. Корсака?) і Р. Бакі першымі ўступілі ў адкрыты бой з асноўнай часткай маскоўскага войска. Затым да іх далучыліся жаўнеры з рот Ю. Зяновіча і кн. Саламярэцкага. Бой меў роўны характар, і толькі пасля падыходу новых атрадаў коннікаў у месцы, дзе націск літвінаў слабеў, перамога схілілася на літоўскі бок. Бітва працягвалася прыкладна дзве гадзіны. Пераломным момантам сталі ўцёкі з поля бою параненага П. Шуйскага, пасля якіх у маскоўскім войску пачалася ўсеагульная паніка[272].

Факт панічных уцёкаў маскоўцаў і пагоні за імі літоўскага войска пацвярджае большасць крыніц. Літоўскія жаўнеры гналіся за маскоўцамі пяць міль. Я. Камэндоні дадае, што пагоня адбывалася ў кірунку ракі Крывіца, дзе літвіны спыніліся. Ён, а таксама А. Гваньіні, паведамляюць, што пры гэтым шмат маскоўцаў патанула ў рэках і загінула ад рук сялян з бліжэйшых вёсак[273]. Апісанне ў крыніцах заключнай часткі бітвы не пакідае сумневаў, што менавіта падчас пагоні палегла асноўная колькасць маскоўцаў.

Такім чынам, перад намі паўстаюць два варыянты развіцця бітвы: у адным з іх бітва мае характар адкрытага бою, у другім спачатку былі разбіты перадавыя атрады маскоўцаў, і толькі потым адбылася генеральная атака, якая была, хутчэй за ўсё, нечаканай для праціўніка. На нашу думку, другі сцэнарый бліжэй да рэчаіснасці: гэта была хутчэй сеча, чым адкрытая бітва ў класічным выглядзе.

Польскае найманае войска не ўдзельнічала ў Ульскай бітве 1564 г. Падчас бою яно знаходзілася паблізу Барысава. Даведаўшыся пра бітву, яно рушыла ў бок тэатра ваенных дзеянняў, аднак неўзабаве было затрымана загадам найвышэйшага гетмана М. Радзівіла Рудога, які пасля разгрому маскоўцаў не бачыў у гэтым патрэбы. Варта заўважыць, што ў лісце, накіраваным у Варшаву, Радзівіл яшчэ спадзяецца на хуткі падыход польскага войска, каб аб’яднанымі сіламі ўдарыць па непрыяцелю, які знаходзіўся на той час пад Оршай[274]. Я. Камэндоні, паведамляючы 10 лютага 1564 г. кардыналу Барамею ў Рым аб стане спраў у ВКЛ, выказваў меркаванне, што пасля злучэння літоўскага і польскага войска яно рушыць на Полацк. Нічога падобнага, як вядома, не адбылося. Польскія

[272] Commendoni J. Pamiętniki... T. 1. S. 47–49.
[273] Ibid. S. 49; Gwagnini A. Kronika. S. 109.
[274] Письмо Радивила. С. 3.

жаўнеры пазней наракалі, што іх наўмысна затрымалі ўдалечыні ад месца баявых дзеянняў, каб не дзяліцца з імі вынікамі перамогі[275].

Пры аналізе бітвы паўстае яшчэ адна важная праблема: роля найвышэйшага гетмана М. Радзівіла Рудога ў дасягненні перамогі. Польскі даследчык М. Пляўчыньскі досыць скептычна ставіцца да яго здольнасцей военачальніка[276]. Крыніцы ўскосна сведчаць, што, нягледзячы на вышэйшую вайсковую пасаду і прысутнасць у войску, Радзівіл не адыграў галоўнай ролі ў Ульскай бітве. Аб гэтым можна меркаваць па словах самога Радзівіла, які пісаў, што перамога адбылася дзякуючы садзейнічанню Хадкевіча (відаць, маецца на ўвазе Рыгор), пры гэтым сам Радзівіл зрабіў усё магчымае[277]. Верагодна, найвышэйшы гетман не ўдзельнічаў непасрэдна ў атацы, назіраючы за ходам бою з бяспечнай адлегласці. На гэта можа ўказваць і адсутнасць у радзівілаўскім лісце апісання ходу бою.

Пытанне аб тым, колькі маскоўцаў загінула падчас Ульскай бітвы, на наш погляд, застаецца адкрытым. Надзвычай вялікай з'яўляецца розніца ў лічбах, прадстаўленых маскоўскімі і літоўскімі крыніцамі. Яна сама па сабе дае падставы для сумневаў наконт іх праўдзівасці. Паводле сведчанняў Радзівіла, загінула прынамсі 9 тысяч чалавек[278]. Гэтую інфармацыю паўтарае і Я. Камэндоні[279]. Цікава, што ў дэталёвым апісанні бітвы ў «Лісце аб навінах» падобныя звесткі зусім адсутнічаюць. Прыведзеная Радзівілам і Камэндоні лічба палеглых была з цягам часу значна завышана (у «Рэестры Ульскай бітвы», які захаваўся ў зборах Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу, яна складала ўжо 16 тысяч[280], у Л. Гурніцкага — 18 тысяч[281], у М. Стрыйкоўскага — 25 тысяч[282], у А. Гваньіні — 30 тысяч[283], у «Хронікі літоўскай і жмойцкай» — ажно 45 тысяч чалавек[284]). Калі ўлічваць характар бітвы, то нічога звышасаб-

---

275 Bielski M. Kronika. T. 2. S. 1153.

276 Plewczyński M. Wkład Radziwiłłów w rozwój staropolskiej sztuki wojennej XVI wieku // Miscellanea Historico-Archivistica. 1997. T. 7. S. 31–33.

277 Письмо Радивила. С. 3.

278 Тамсама. С. 2.

279 Commendoni J. Pamiętniki... T. 1. S. 45–46. У іншым месцы ён піша, што загінула 10 тысяч маскоўцаў: Ibid. S. 49.

280 РНБ, ф. 971, оп. 2, авт. 152, л. 41–42.

281 Górnicki Ł. Dzieje w Koronie... S. 129.

282 Варта звярнуць увагу на словы храніста, які, праязджаючы ў 1573 г. праз месца бітвы, бачыў там вялікі стог касцей маскоўцаў, забітых падчас Ульскай бітвы: Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 415.

283 Gwagnini A. Kronika. S. 109.

284 ПСРЛ. Т. 32: Белорусско-литовские летописи. М., 1975. С. 110.

лівага ў вялікіх стратах маскоўцаў няма. Прыкладам, у 1567 г. у бітве пад Сушай, паводле афіцыйнага рэестра, які захоўваецца ў Метрыцы ВКЛ, маскоўцы згубілі забітымі 5400 чалавек[285].

З іншага боку, у маскоўскіх летапісах адзначаецца, што *«на том деле детей боярских побили и в полон взяли и которые безвестны — до полутораста человек»*[286]. Аб невялікай колькасці забітых паведамляе і Пскоўскі летапіс. Аднак уважлівае прачытанне яго дазваляе прыйсці да высновы, што літвіны забілі альбо ўзялі ў палон ў першую чаргу людзей, якія ўваходзілі ў вайсковую эліту: *«Князя Петра оубили и иных воевод и дворян, а иных воевод живых поимали, (...) а детеи боярских побили не много, а иные все розбеглися...»*[287].

Гэтыя дадзеныя робяцца новым немалаважным аргументам у дыскусіі аб характары і выніках бітвы. Магчыма, што лічба ў 150 палеглых знаходзіцца не так далёка ад рэальнасці і з'яўляецца больш праўдзівай, чым звесткі найвышэйшага гетмана ВКЛ і папскага нунцыя. Можна заключыць, што знішчэнне камандуючага складу войска мела большую вартасць для ацэнкі значнасці падзеі, чым проста колькасныя паказчыкі. Гібель галоўнакамандуючага войскам і ўзяцце ў палон іншых военачальнікаў — што магло быць лепшым доказам бліскучай перамогі над непрыяцелем? З іншага боку, Радзівіл мог перабольшыць колькасць палеглых на полі бою і тым самым стварыць вобраз не проста перамогі, а поўнага разгрому непрыяцельскага войска.

Самы падрабязны пералік палеглых на полі бітвы і ўзятых у палон падае хроніка М. Стрыйкоўскага[288]. Аднак у яе закралася шмат непраўдзівых дадзеных. Змястоўны спіс забітых і ўзятых у палон маскоўцаў падае «Рэестр Ульскай бітвы»[289]. Інфармацыя аб палонных маскоўцах ёсць у «Лісце аб навінах»[290]. Аднак усе гэтыя дадзеныя патрабуюць сваёй верыфікацыі.

Усе крыніцы пацвярджаюць гібель П. Шуйскага, галоўнага военачальніка полацкай групоўкі і адначасова першага полацкага ваяводы. А. Гваньіні паведамляе, што паранены П. Шуйскі быў забіты падчас

285 НГАБ, ф. КМФ-18, воп. 1, спр. 529, арк. 181–183.
286 ПСРЛ. Т. 13. С. 377; ПСРЛ. Т. 29. С. 329.
287 ПЛ. Вып. 2. С. 245.
288 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 415.
289 РНБ, ф. 971, оп. 2, авт. 152, л. 41–42.
290 ВС. Т. 4. С. 85.

адыходу вайскоўцаў селянінам з бліжэйшай вёскі з дапамогай сякеры[291]. Брэдэнбах дадае, што труп П. Шуйскага знайшлі праз некалькі дзён у калодзежы[292]. Маскоўскія крыніцы раскрываюць новыя акалічнасці: *«Князя Петра Шуйского збили с коня, и он з дела пеш утек, и пришел в литовскую деревню, и тут мужики, его ограбя, и в воду посадили»*[293]. Ёсць таксама звесткі, што маскоўскага военачальніка забіў шляхціц Каспар Швейкоўскі[294].

Для праверкі інфармацыі наконт іншых палеглых асоб былі задзейнічаны ў першую чаргу маскоўскія разрадныя кнігі. З вялікага спісу імён, прыведзеных М. Стрыйкоўскім, пацвярджаюцца толькі звесткі аб гібелі Восіпа Быкава, які камандаваў артылерыяй, князёў Сямёна і Фёдара Палецкіх[295], а таксама, магчыма, Данілы Калычова[296]. Пасля 1564 г. іх імёны не згадваюцца ў разрадных кнігах. У той жа час гэтыя крыніцы не пацвярджаюць факту гібелі альбо ўзяцця ў палон падчас Ульскай бітвы С. Якаўлева[297], І. Шарамецева-Меншага[298], А. Празароўскага[299], М. Адаеўскага[300].

З дастатковай верагоднасцю можна казаць, што ў палон былі ўзяты Захар'я Пляшчэеў[301], Іван Ахлябінін[302], князь Васіль Калычоў-

291 Gwagnini A. Kronika. S. 109.
292 Цыт. па: Письмо Радивила. С. 5.
293 ПСРЛ. Т. 34. М., 1978. С. 190.
294 Ragauskienė R. 1564 m. Ulos Kautynės… S. 174.
295 Письмо Радивила. С. 2; Commendoni J. Pamiętniki… T. 1. S. 48.
296 Гэтае прозвішча сустракаецца ў «Рэестры Ульскай бітвы»: РНБ, ф. 971, оп. 2, авт. 152, л. 41–42.
297 Удзельнічаў у выправе на Лукомль у 1564 г. у якасці ваяводы вялікага палка. У лютым-сакавіку гэтага года быў прызначаны на адну з ваяводскіх пасад у Полацку: Разрядная книга 1550–1636 гг. С. 128; Разрядная книга 1559–1605 гг. С. 23.
298 Пасля красавіка 1564 г. сустракаецца ў Вязьме ў якасці ваяводы палка правай рукі: Разрядная книга 1550–1636 гг. С. 132; Разрядная книга 1475–1598 гг. С. 208.
299 Удзельнічаў у выправе на Лукомль у 1564 г. у якасці ваяводы перадавога палка: Разрядная книга 1550–1636 гг. С. 128; Разрядная книга 1559–1605 гг. С. 23; Разрядная книга 1475–1605 гг. Т. 2. Ч. 1 / Сост. Н. Савич. М., 1981. С. 150.
300 Згадваецца ў верасні 1565 г. у Дзедзілаве: Разрядная книга 1550–1636 гг. С. 153; Разрядная книга 1559–1605 гг. С. 40; Разрядная книга 1475–1605 гг. С. 198.
301 Вядома імя чалавека, які непасрэдна правёў гэтую акцыю. Гэта жаўнер найманага войска ВКЛ Андрэй Голуб. 24 сакавіка 1565 г. ён быў узнагароджаны за свой учынак 15 зямельнымі «службамі» ў Рэчыцкім старастве: НГАБ, ф. КМФ-18, воп. 1, спр. 38, арк. 539–540.
302 ПСРЛ. Т. 13. С. 377; ПСРЛ. Т. 29. С. 329; ВС. Т. 4. С. 85; РНБ, ф. 971, оп. 2, авт. 152, л. 41–42. З іншага боку, імя І. П. Ахлябініна сустракаецца ў Калузе пасля чэрвеня 1565 г. у якасці ваяводы палка левай рукі: Разрядная книга 1475–1605 гг. С. 191.

Цёмкін[303], сын баярскі з Вялікага Ноўгарада Іван Нараваты[304], дваране вялікага князя Воін Ржэўскі і Афанасій Чыхачоў[305], стралецкі тысячнік Сямейка Хахолін[306].

З літоўскага боку загінула 20–22 чалавекі і прыкладна 600–700 жаўнераў было паранена[307]. Найбольшыя страты панеслі роты кн. Саламярэцкага і Ю. Зяновіча. Я. Камэндоні адзначае, што ў хаосе бітвы літвіны пасеклі 50 апранутых «у рускую вопратку» маскоўцаў, якія перайшлі на іх бок[308].

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што кантраст паміж стратамі абодвух бакоў быў значным. Маскоўцы пацярпелі ўнушальнае паражэнне.

У выніку перамогі літвінамі быў захоплены вялікі абоз («кош»). Колькасць падвод складала ад трох да пяці тысяч[309]. У абозе знаходзілася мноства разнастайных рэчаў: ад зброі і даспехаў да харчавання і вопраткі. Радзівіл і Камэндоні выказвалі меркаванне, што гэтыя рэчы везліся спецыяльна для войска В. Сярэбранага, якое ішло без належнага ўзбраення і запасаў. Папскі нунцый адзначае, што літоўскія жаўнеры, якія ўдзельнічалі ў бітве, пасля захопу абозу значна ўзбагаціліся[310].

Камандаванне войска ВКЛ добра ведала аб прысутнасці ў межах краіны другога непрыяцельскага войска. На момант бітвы пад Улай яно знаходзілася ў раёне Дуброўны, зрабіўшы там, па сведчаннях Я. Уханьскага, умацаваны лагер[311]. Гэта не дазваляла лічыць, што ваенная пагроза цалкам знішчана. Таму пасля пачатковай эйфарыі надышло разуменне, што неабходна распраўіцца і са смаленскай групоўкай праціўніка, якая яшчэ нічога не ведала пра разгром войска П. Шуйскага. «Ліст аб навінах» паведамляе, што *«скоро по той битве их милость панове гетманове зо всим войском рушилися ближей к Орши и мели положити кош в Соколине»*[312].

303 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 415. Гэты факт пацвярджаецца ў лісце Ф. Кміты да Р. Сангушкі ад 26 ліпеня 1567 г. Разам з І. Цевекелевічам і М. Самбулавым ён падлягаў абмену на полацкага ваяводу С. Давойну: AS. T. 7. S. 164–165.

304 Гэта пацвярджаюць амаль усе разгляданыя крыніцы. Вядома, што ён, паводле дасягнутай 13 ліпеня 1566 г. дамоўленасці на маскоўска-літоўскіх перамовах у Маскве, падлягаў абмену на Марціна Астравіцкага, ротмістра і азярышчанскага дзяржаўцу, узятага ў палон пры аблозе Азярышчаў восенню 1564 г.: РИО. Т. 71. С. 409.

305 РНБ, ф. 971, оп. 2, авт. 152, л. 41–42; ВС. Т. 4. С. 85.

306 Тамсама.

307 Письмо Радивила. С. 3; Commendoni J. Pamiętniki… T. 1. S. 49–50.

308 Commendoni J. Pamiętniki… T. 1. S. 50.

309 ВС. Т. 4. С. 85; Письмо Радивила. С. 2; Commendoni J. Pamiętniki… T. 1. S. 48–49.

310 Commendoni J. Pamiętniki… T. 1. S. 49.

311 Uchansciana. S. 47.

312 ВС. Т. 4. С. 85.

Вызначальную ролю ў контракцыі супраць смаленскай групоўкі адыграў асцёрскі дзяржаўца і ротмістр Ф. Кміта. Ён, а таксама браслаўскі стараста Ю. Осцік са сваёй ротай, оўруцкі дзяржаўца Андрэй Капуста і гаспадарскі маршалак Каленік (Каляніцкі) Тышкевіч, выступілі насустрач ёй. Усяго пад камандаваннем Ф. Кміты знаходзілася ад 500 да не больш за 2 000 коннікаў[313].

Хутчэй за ўсё, гэтая ваенная акцыя адбылася на пачатку лютага 1564 г. Я. Уханьскі паведамляе аб даце 15 лютага 1564 г.[314], але, на наш погляд, гэта памылкова. Яму супярэчаць іншыя крыніцы. Я. Камэндоні пісаў з Варшавы ў Рым аб адступленні маскоўцаў да Смаленска 10 лютага 1564 г. У «Лісце аб навінах», датаваным 11 лютага 1564 г., ужо паведамлялася аб тым, што войска В. Сярэбранага спешна адышло на маскоўскую тэрыторыю.

Даведаўшыся аб дакладным размяшчэнні маскоўскага войска, Ф. Кміта вырашыў справакаваць у непрыяцельскім лагеры паніку. Ротмістр выслаў у бок маскоўскага войска трох дубраўлянцаў на чале з нейкім Жданам. Яны нібыта везлі да камандуючага дубровенскім гарнізонам ліст, у якім паведамлялася, што неўзабаве да гэтага замка падыдзе вялікае войска літвінаў. Высланыя Ф. Кмітам людзі мелі пры сабе таксама спецыяльна складзены рэестр забітых і палонных маскоўцаў у Ульскай бітве. Маршрут быў выпрацаваны так, што яны не маглі не трапіць у рукі маскоўскай «старожы». Як і чакалася, пасля азнаямлення з адабранымі паперамі ў маскоўскім войску распачалася паніка. Маскоўскія ваяводы не жадалі сустракацца з літоўскім войскам, думаючы толькі аб адыходзе ў бяспечнае месца[315].

Так выглядае справа ў «Гербоўніку» Б. Папроцкага, у якім падаецца найбольш падрабязнасцей. Цікава, што, паведамляючы аб высылцы атрада Ф. Кміты наперадзе асноўнага войска, аўтар «Ліста аб навінах» не згадвае пра яго хітрыкі: *«Там же вжо за Оршою, под Дубровною, сторожу московскую, Москву и Тотар громили, и двух мурз а десят москвитинов поймали: бо войско московское великое кошом положилося за Дуб-*

---

313 Пра 500 коннікаў, высланых пад камандаваннем Ф. Кміты ў напрамку Оршы, паведамляецца ў: Uchansciana. S. 47. Лічбу 2 000 коннікаў падаюць: P a p r o c k i B. Herby rycerstwa polskiego. S. 854; S t r y j k o w s k i M. Kronika. T. 2. S. 415.

314 Uchansciana. S. 47.

315 P a p r o c k i B. Herby rycerstwa polskiego. S. 854.

*ровною у мили»*[316]. Ва ўніверсале Жыгімонта Аўгуста да рыцарства ВКЛ ад 7 красавіка 1564 г. дадзена наступная фармулёўка падзей: *«...А другое* [войска маскоўцаў], *што было с Серебреным и Бойбулою* (Кайбулой. — *А. Я.*), *царевичом, устрашившися панов гетманов и войск наших, утекло, кош весь покинувши»*[317]. Усё гэта можа наводзіць на пэўны сумнеў адносна праўдзівасці сведчанняў Б. Папроцкага. Заўважым, аднак, што Жыгімонт Аўгуст падкрэсліваў асаблівыя заслугі Ф. Кміты ў Ульскай бітве і нават у якасці выключэння распарадзіўся павысіць яго роце на 25% заробак за службу[318].

Літоўскія крыніцы сведчаць, што вяртанне смаленскай групоўкі на маскоўскую тэрыторыю нагадвала паспешлівыя ўцёкі, а не адыход: *«...Послышавши о нашом войску до себе тягнучи, повтекали, возы и сани порубали, и тегиню покинувши и сами на вьюки складшися в скок побегли до своее земли; (...) и яко за три дня у Смоленска стали»*[319]. Атрад Ф. Кміты, згодна з інфармацыяй Б. Папроцкага, здзейсніў пагоню, у выніку якой было забіта шмат маскоўцаў і захоплена ў палон 100 знатных асоб[320]. Вельмі супярэчлівыя сведчанні Я. Уханьскага: спачатку ён піша, што ў выніку гэтай акцыі загінула 9 000 чалавек, у прыватнасці тры военачальнікі, а потым — што маскоўскае войска ўцякло, як толькі даведалася ад злоўленага слугі *(puer)* аб паражэнні пад Улай[321].

Мяркуючы па звестках «Ліста аб навінах», вынікі акцыі аршанскага старасты былі куды больш сціплымі. Як і ў бітве пад Улай, тут быў захоплены вялікі абоз: *«Оршанцы поведають, иж такое великое добычи и при великой битве Оршаньской* (маецца на ўвазе, верагодней за ўсё, бітва 1514 г.) *не взято»*[322]. Гэта ж пацвярджаецца ў лісце Я. Уханьскага. М. Стрыйкоўскі піша, што ў абозе знаходзілася 25 тысяч (!) вазоў, на якіх змяшчалася ўзбраенне, амуніцыя і правіянт на 6 тысяч чалавек[323].

---

316 ВС. Т. 4. С. 85.
317 AS. T. 7. S. 81.
318 АСД. Т. 4. С. 208–210. Гэта, аднак, наўрад ці было зроблена.
319 ВС. Т. 4. С. 86. Паводле ліста М. Радзівіла Чорнага да свайго сына Мікалая Крыштафа, маскоўскае войска *«hanyebnye z wielkiey szkodą swą (...) uciekło z zyemi pana naszego»* (BRacz. Rkps. 78. K. 34–37).
320 Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego. S. 854.
321 Uchansciana. S. 47–48.
322 ВС. Т. 4. С. 87.
323 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 415.

У супрацьлегласць гэтаму, маскоўскія летапісы паведамляюць, што па дарозе назад войска В. Сярэбранага без асаблівай спешкі спустошыла бліжэйшыя раёны: «*...Они в Литовской земле войну роспустили и Литовские места воевали Дубровинские, Оршанские, Друцкие, Березынские, Копосские, Шкловские, Могылевские, Радомльские, Мстиславские, Кричевские и королевские села и деревни жгли и в посылках во многых заставы Литовских людей побивали и языки имали и в полон многых людей и з животы поимали*»[324]. Яно спакойна вярнулася ў межы Маскоўскай дзяржавы 9 лютага 1564 г., не страціўшы ніводнага чалавека.

У гэтай канфрантацыі сведчанняў крыніц цяжка знайсці адназначную праўду. На жаль, супастаўленне з іншымі звесткамі не прыводзіць да станоўчых вынікаў, таму пытанне аб характары адступлення маскоўцаў застаецца адкрытым. З дакладнасцю можна сцвярджаць толькі тое, што маскоўскае войска, атрымаўшы звесткі аб паражэнні групоўкі П. Шуйскага, адышло на сваю тэрыторыю, не выканаўшы пастаўленых перад ім задач.

Пры характарыстыцы наступстваў бітвы неабходна абавязкова адзначыць, што кіраўніцтва ВКЛ імкнулася выкарыстаць перамогу ў Ульскай бітве ў прапагандысцкіх мэтах. Літоўская прапаганда выдатна спрацавала, акцэнтуючы ўвагу на тым, што літвіны справіліся з маскоўцамі ўласнымі сіламі, без дапамогі палякаў. Каралеўскі двор у Польшчы, а следам за ім і шырокія грамадскія колы даведаліся пра бітву перш за ўсё з ліста Радзівіла. Радзівіл стварыў вобраз адкрытага, сумленнага бою, жадаючы дамагчыся максімальнага эфекту пры ўздзеянні на чытача. Для прыкладу, на малюнку ў нямецкім «лятучым лістку» была паказана сустрэча военачальнікаў перад пачаткам бітвы, а за імі знаходзіліся падрыхтаваныя да бітвы войскі. Пры гэтым, нагадаем яшчэ раз, найвышэйшы гетман ВКЛ «забыўся» апісаць сам ход бою.

Радзівілаўскі ліст стаў асновай для іншых рэляцый у Еўропу. Неўзабаве ён намаганнямі М. К. Радзівіла Сіроткі быў надрукаваны ў Нямеччыне. Розгалас пра Ульскую бітву разнёсся па ўсёй Еўропе[325].

Перамога пад Улай моцна паўплывала на развіццё ўнутрыпалітычных працэсаў ВКЛ. У гэты час у Варшаве на каронным сойме адбываліся перамовы аб заключэнні уніі паміж Каронай і Княствам. Адной з пры-

[324] ПСРЛ. Т. 13. С. 377; Тамсама. Т. 29. С. 329–330.

[325] У Еўропе нават распаўсюджваліся газеты з паведамленнем аб узяцці Полацка войскам ВКЛ неўзабаве пасля Ульскай бітвы: Pirożyński J. Z dziejów obiegu informacji... S. 254 (katalog 1, N 12).

чын іх пачатку было пагаршэнне ваенна-стратэгічнага становішча ВКЛ у выніку страты Полацка.

Разгром маскоўцаў у Ульскай бітве даваў моцныя аргументы для адваротных сцвярджэнняў. Трэба прызнаць, што прапагандысцкая акцыя Радзівілаў мела станоўчы вынік. Мяркуючы па лістах Я. Камэндоні, на каронным сойме ўсе былі ўражаны літоўскай перамогай. Карыстаючыся гэтай акалічнасцю, М. Радзівіл Чорны згарнуў перамовы, спаслаўшыся на важныя справы ў ВКЛ.

Галоўны ваенны вынік Ульскай бітвы 1564 г. для літвінаў заключаўся ў знішчэнні значнай колькасці жывой сілы праціўніка, у першую чаргу камандуючага складу войска. Бітва мела і пэўнае псіхалагічнае значэнне. Пасля зімовых падзей 1564 г. маскоўцы не рашаліся болей ісці ўглыб тэрыторыі ВКЛ і ўступаць у адкрыты бой вялікімі сіламі аж да сярэдзіны XVII ст.[326]

Аднак адсутнасць тэрытарыяльных змен пасля бітвы змяншае яе канчатковы ваенна-стратэгічны эфект. Войска ВКЛ не прыняло мер па адабранні ў праціўніка захопленых зямель. Маскоўцы засталіся ўладарыць на ўсім абшары правабярэжнай Полаччыны і яе частцы на левым беразе Дзвіны.

## § 4. Перманентная вайна на знясіленне: падзеі 1564–1570 гг.

Пасля поспеху ў Ульскай бітве кіраўніцтва ВКЛ імкнулася перахапіць ініцыятыву і ажыццявіць шырокамаштабную ваенную аперацыю супраць Маскоўскай дзяржавы, каб канчаткова ўзяць рэванш за паражэнне пад Полацкам. Гэтыя намеры выразна прасочваюцца ў ліставанні Жыгімонта Аўгуста з М. Радзівілам Чорным. Канцлер ВКЛ заклікаў гаспадара не займацца соймамі ў спрыяльны для баявых дзеянняў веснавы і летні час, а ўсімі сіламі ўдарыць па ворагу. Жыгімонт Аўгуст адказваў, што арганізаваць наступленне без належнай падрыхтоўкі нерэальна. Патрабавалася ўхваленне збору паспалітага рушэння і новых надзвычайных падаткаў[327].

[326] Красамоўную выснову на гэты конт зрабіў аўтар «Хронікі літоўскай і жмойцкай»: «*А так москаль сидел тихо от того часу*» (ПСРЛ. Т. 32. С. 111).

[327] Listy. S. 455–456.

У траўні-чэрвені 1564 г. у Бельску на Падляшшы адбываўся вальны сойм ВКЛ. Ён забіраў усю ўвагу палітычных эліт, таму думаць аб ажыццяўленні буйной ваеннай выправы ў гэты час сапраўды не даводзілася.

Улетку 1564 г. ваенныя дзеянні зноў, як і ў 1562 г., прынялі форму нечаканых нападаў невялікіх вайсковых атрадаў на памежныя тэрыторыі праціўніка. Бесперапынна адбываліся выправы літоўскіх жаўнераў з Інфлянтаў на Пскоўшчыну і дэрпцкую акругу[328]. У жніўні 1564 г. літоўскія вайскоўцы разграмілі непрыяцеля пад Мсціславам, узяўшы пры гэтым у палон камандзіра варожага атрада. У гэты ж час літоўскія і польскія найміты здзейснілі паспяховую вылазку пад Полацк, падчас якой яны забілі некалькі «маскоўскіх ротмістраў», а шаснаццаць «зацных» людзей забралі ў палон[329].

Маскоўцы таксама не спынялі ваенных дзеянняў. 22 чэрвеня 1564 г.[330] Юры Такмакоў з шасцітысячным войскам накіраваўся з Невеля да Азярышчаў — найбольш аддаленай крэпасці на паўночна-ўсходняй мяжы ВКЛ[331]. Чатыры дні працягвалася яе аблога, пакуль на дапамогу не прыйшоў двухтысячны атрад літвінаў, высланы з Віцебска Станіславам Пацам[332]. У яго складзе знаходзілася віцебская шляхта, двор ваяводы, дзве найманыя роты жаўнераў і інш. Паводле інфармацыі літоўскіх крыніц, літвіны ўшчэнт разграмілі маскоўцаў, забраўшы ў іх артылерыю, збройны рыштунак і правіянт. Калі верыць М. Стрыйкоўскаму, загінула 5 тысяч маскоўскіх жаўнераў[333]. Сам Ю. Такмакоў быў паранены і ледзьве ўцёк з поля бою[334]. Невядома, наколькі праўдзівыя гэтыя звесткі, бо маскоўскі летапіс паведамляе аб шчаслівым адыходзе маскоўцаў ад

328 *«Литовскиа люди приходили многажды псковскиа волости воевали (...) и юрьевские волости»* (ПЛ. Вып. 2. С. 245).

329 BRacz. Rkps. 78. K. 42–42v.

330 А. Гваньіні недакладна піша пра дзень Св. Маргарыты (16 лістапада 1564 г.): Gwagnini A. Kronika. S. 109.

331 ПСРЛ. Т. 29. С. 335. Лічбу 6 тысяч чалавек падае М. Радзівіл у лісце да свайго сына М. К. Радзівіла Сіроткі: Piwarski K. Niedoszła wyprawa... S. 263. М. Стрыйкоўскі і А. Гваньіні паведамляюць пра 13 тысяч маскоўцаў: Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 415–416; Gwagnini A. Kronika. S. 109.

332 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 415–416. Паводле інфармацыі А. Гваньіні, на чале віцебскай шляхты стаялі віцебскі харужы Ісідор і абозны Ян Снепарод: Gwagnini A. Kronika. S. 109. Маскоўскі летапіс паведамляе пра 12 тысяч літвінаў: ПСРЛ. Т. 29. С. 335.

333 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 415–416. У А. Гваньіні — 8 тысяч: Gwagnini A. Kronika. S. 109–110. Адзначым, што ў А. Гваньіні змешчана больш падрабязнае апісанне гэтых падзей.

334 BRacz. Rkps. 78. K. 42–42v.

Азярышчаў. Больш за тое, паводле яго інфармацыі, ім удалося сустрэць літоўскі авангард і разбіць яго, узяўшы ў палон 50 вояроў[335].

Адным з асноўных цэнтраў, адкуль адбываліся напады на тэрыторыю ВКЛ, па-ранейшаму заставаўся Смаленск. Ніканаўскі летапіс засведчыў, што ў канцы ліпеня 1564 г. смаленскі ваявода Васіль Бутурлін зваяваў мсціслаўскія, крычаўскія і магілёўскія воласці, у выніку чаго ў палон былі ўзяты 4 787 чалавек[336]. У жніўні 1564 г. Васілю Вешнякову пашчасціла разграміць атрад літвінаў каля Краснага Гарадка, што на Пскоўшчыне[337].

Да ідэі ажыццяўлення шырокамаштабнай аперацыі супраць Маскоўскай дзяржавы ў ВКЛ вярнуліся восенню 1564 г. Цяпер стаўка была зроблена на найманыя сілы. Паводле маскоўскіх дадзеных, войска ВКЛ складалася з 50 тысяч літвінаў і 12 тысяч палякаў[338]. Гэтыя лічбы, канешне, значна перабольшаны. Больш адпавядае рэчаіснасці інфармацыя кароткага попісу польскіх рот, якія былі задзейнічаны ў гэтай выправе. У войску знаходзілася 4 900 коннікаў і 3 700 драбаў, не лічачы рот з ВКЛ, у якіх, як падае складальнік попісу, былі *«niemal wszystko polacy»*[339].

Мэтай ваеннага паходу быў абраны Полацк. Згодна з маскоўскім летапісам, літоўска-польскае войска падышло да горада 16 верасня 1564 г. Вайсковы лагер размясціўся ў дзвюх вёрстах ад яго — паміж Дзвіной і Палатой[340].

Войска ВКЛ не было падрыхтавана да вядзення аблогі, яно не мела дастатковай колькасці гармат. Літоўскае камандаванне спадзявалася на выхад маскоўцаў з замка і адкрытую бітву[341]. Аднак маскоўцы схаваліся за гарадскімі сценамі, выбраўшы звыклую для сябе тактыку працяглага адседжвання. Неўзабаве на дапамогу Полацку выступіла буйная вайсковая групоўка з Вялікіх Лук, але яе прысутнасць не спатрэбілася. 4 кастрычніка 1564 г. літвіны адступілі, так і не пачаўшы актыўных дзеянняў па аблозе замка[342].

---

335 ПСРЛ. Т. 29. С. 335.

336 ПСРЛ. Т. 29. С. 335–336. Верагодна, менавіта пра гэтую падзею М. Радзівіл Руды паведамляў свайму сыну: J a s n o w s k i J. Mikołaj Czarny Radziwiłł. S. 329.

337 ПЛ. Вып. 2. С. 246.

338 Тамсама. С. 340.

339 BN. Rkps. III.6609. Nr. 11. K. 26v-28. Пра дакладную колькасць літоўскіх жаўнераў дадзеных не захавалася.

340 ПСРЛ. Т. 29. С. 340.

341 S t r y j k o w s k i M. Kronika. T. 2. S. 414.

342 ПСРЛ. Т. 29. С. 340.

Такім чынам, у ВКЛ у 1564 г. не змаглі як след арганізаваць рэванш супраць маскоўцаў. Войска ВКЛ было няздатнае весці аблогавыя аперацыі, а гэта было ў тагачасных умовах вайны неабходным для вяртання захопленай тэрыторыі.

Варта адзначыць, што кіраўніцтва ВКЛ мела выдатную магчымасць выкарыстоўваць г. зв. «крымскі фактар». «Крымскі аўкцыён», паводле вобразнага выказвання расійскага гісторыка А. Вінаградава, у якім платай за мірнае стаўленне татар былі абяцанні большых памінак, выйграў літоўскі бок. Сітуацыя змянілася ў пачатку жніўня 1563 г., калі ў Крым прыбыў ганец Жыгімонта Аўгуста з запэўніваннем у хуткай прысылцы «скарбу» ў падвойным памеры[343]. У Бахчысараі канчаткова вырашылі не разрываць саюзніцкіх зносін з ВКЛ.

Восенню 1564 г. літвіны дзейнічалі ўзгоднена з крымскім войскам. Калі літвіны з палякамі падышлі да Полацка, крымскія татары выступілі ў паход супраць Маскоўскай дзяржавы. Гэта стала поўнай нечаканасцю для Крамля, які разлічваў пасля наладжвання дыпламатычных кантактаў з Бахчысараем на захаванне спакойнага становішча на крымскай мяжы. Са свайго боку, крымскія татары спадзяваліся на адыход Івана IV з войскам *«на литовское дело»*. У гэтым выпадку яны збіраліся атакаваць Маскву. Прынамсі, пра такія намеры паведамляе Аляксандра-Неўскі летапіс[344].

У пачатку кастрычніка 1564 г. крымскія татары падышлі да Разані. Аднак, даведаўшыся, што маскоўскі цар знаходзіцца недалёка ад сталіцы, яны не рашыліся працягваць наступленне. Чатырохдзённае стаянне пад Разанню скончылася спаленнем пасадаў і спусташэннем ваколіц. Неўзабаве татарскае войска адышло на сваю тэрыторыю.

Няўдачу восеньскай ваеннай выправы ў далейшым Жыгімонт Аўгуст ставіў у віну радным панам. Гаспадар лічыў, што, не маючы магчымасцей як належыць падрыхтавацца да аблогі Полацка, лепей было звярнуць увагу на менш буйныя крэпасці, прыводзячы ў прыклад Невель. М. Радзівіл Чорны, у сваю чаргу, абвінавачваў у няўдачы гэтай ваеннай кампаніі самога Жыгімонта Аўгуста, які змарнаваў спрыяльны час і не прыняў чыннага ўдзелу ў яе правядзенні[345].

---

343 История внешней политики. С. 183–184.

344 *«Королю Полскому притти со всеми людми к Полотцску и Полоцска доставати, а Девлет-Кирею царю притти, перелесчи Ока река и воевати Коломенские места и к Москве идти»* (ПСРЛ. Т. 29. С. 338).

345 Listy. S. 492–504.

Пасіўныя дзеянні пад Полацкам хутка абярнуліся для літвінаў адчувальным паражэннем. Выступіўшы з Вялікіх Лук, маскоўскае войска пад камандаваннем казанскага цара Сімяона, Івана Пронскага і Васіля Сярэбранага 6 лістапада 1564 г. захапіла Азярышча. Мястэчка і яго жыхары моцна пацярпелі: *«Многих дворян и Ляхов и дрябеи и всяких земских людеи побили наголову, а которые запирались в стрелнях и в баштах и в хоромех, и те погорели, а город и до основания выгорел, (...) и никаков человек из города не утек»*[346]. Пры абароне горада загінулі ротмістры Дзяржынскі і Прагалінскі[347]. Азярышчанскі дзяржаўца і ротмістр Марцін Астравіцкі трапіў у палон да маскоўцаў[348].

Гэтая страта прыгнятальна падзейнічала на кіраўніцтва ВКЛ. Радныя паны дайшлі нават да таго, што параілі гаспадару спаліць Дрысу, Дуброўну, Сураж і Радомль, мяркуючы, што надзей на іх утрыманне ўжо не існуе[349]. М. Радзівіл Чорны галоўную прычыну азярышчанскай катастрофы бачыў у адсутнасці ў Княстве вялікага князя, без якога дзяржаўны механізм папросту не працаваў у нармальным рэжыме[350]. Не бачачы магчымасцей выпраўлення сітуацыі ў адсутнасць Жыгімонта Аўгуста, ён разам з усёй Радай фактычна прапанаваў заключыць перамір'е з Масковіяй[351].

Аднак Жыгімонт Аўгуст катэгарычна выказаўся супраць гэтага. Любы мір у такіх абставінах, на яго думку, быў бы для яго абразай і значна панізіў бы рэйтынг ВКЛ на міжнароднай арэне. Гаспадар не сумняваўся, што Масква прапануе перамір'е на крайне нявыгадных умовах для Княства. Цвяроза ацэньваючы сітуацыю, гаспадар прыходзіў да высновы, што пакуль будзе мець месца *«niedbałość i tak wielkie spłoszeństwo ludzkie»* у выкананні земскіх абавязкаў, арганізаваць эфектыўнае супрацьдзеянне ворагу не ўяўляецца магчымым. Звяртаючыся да канкрэтных пры-

346 ПСРЛ. Т. 29. С. 341. Верагодна, замак у Азярышчах пасля гэтага пажару не аднаўляўся.

347 У М. Стрыйкоўскага згадваецца Jan Dzierząziński: Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 415–416. Дакладную ідэнтыфікацыю гэтых ротмістраў зрабіць не ўдалося. Напэўна, гэта той жа Ян Дзеражынскі, які згадваецца ў якасці ганца з гаспадарскімі лістамі ў Полацк, Віцебск і Азярышча ў красавіку 1562 г. (LM. Kn. 564. P. 93–94). М. Любаўскі, спасылаючыся на М. Стрыйкоўскага, згадвае «Яна Деружинского»: Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 681.

348 Гл. ліст А. Валовіча да Р. Сангушкі: AS. T. 7. S. 172–173. У 1566 г. ён вярнуўся з маскоўскага палону. Гл.: РИО. Т. 71. С. 409.

349 Listy. S. 487–490.

350 Ibid. S. 479–485. Адначасова Радзівіл абвінавачваў у няўдалым вядзенні вайны польскіх вайскоўцаў: «...*Leżąc inych trapią, a nic nie czynią*» (Ibid. S. 495–496).

351 Прыхільнасць М. Радзівіла Чорнага да перамір'я выразна прасочваецца ў яго лістах да роднага брата М. Радзівіла Рудога: AGAD, AR. Dz. IV. T. 35. Sygn. 502. K. 43–49. Гл. таксама: Listy. S. 475–479.

чын падзення Азярышчаў, ён акцэнтаваў увагу на нечаканасці прыходу маскоўцаў і правале ў працы літоўскай разведкі[352]. Гэта прывяло да таго, што Азярышча засталося сам-насам з непрыяцельскім войскам. Жыгімонт Аўгуст прапаноўваў выправіць пралікі абароны і належна падрыхтавацца да вырашальнага наступу на ворага летам 1565 г.[353]

Захоп Азярышчаў быў асабліва прыкрым на фоне бліскучай перамогі пад Улай на пачатку года. Гэтая падзея засведчыла здранцвелы стан абарончай сістэмы Княства, яе няздольнасць аператыўна рэагаваць на раптоўныя дзеянні праціўніка. Выразна выявілася і яшчэ адна заганная рыса: адасобленасць замкаў на ўсходняй мяжы ВКЛ і адсутнасць узаемадапамогі паміж імі. Безумоўна, меў рацыю гаспадар, калі казаў пра кепскую працу літоўскай разведкі. Усе гэтыя праблемы трэба было неадкладна вырашаць, выпрацоўваючы новую мадэль абарончых дзеянняў у зменлівых варунках вайны.

Адной з найбольш прыкметных ваенных падзей 1565 г. стаў рэйд польскай коннай групоўкі па тэрыторыі Пскоўскай зямлі. Ён быў здзейснены ў пачатку сакавіка 1565 г. і працягваўся паўтары тыдні. Пасля кароткачасовай аблогі Краснага Гарадка польскія вайскоўцы сустрэліся з атрадам І. Шуйскага, які падышоў з Вялікіх Лук[354]. Поспех, відавочна, быў за польскімі коннікамі. Пасля гэтай сутычкі яны хадзілі за маскоўскім непрыяцелем у пагоню, але, не дагнаўшы яго, спустошылі ўсю паўднёва-заходнюю частку Пскоўшчыны: «...*Воевали много земли псковскои, (...) полону много вывели, и помесщиковы и христианьские дворы жгли, церквеи не жгли*»[355]. Адзначым, што пскоўскія, а таксама дэрпцкія воласці з'яўляліся і надалей аб'ектам бесперапынных нападаў з боку літоўскіх Інфлянтаў.

Сітуацыя на ўсходнім памежжы ВКЛ таксама была неспакойнай. Расхватараваныя тут польскія найміты на чале з С. Цікоўскім здзейснілі паход у раён Смаленска. Яны спалілі прадмесці горада і разбілі атрад непрыяцеля, які паспрабаваў мерацца з імі сіламі ў адкрытым сутыкненні.

---

352 На думку Жыгімонта Аўгуста, маскоўскі непрыяцель «*więcej fortelmi i zdradą postępować zwykł zawsze aniż kiedy mocą*» (Listy. S. 481).

353 Гаспадарскую рашучасць добра адлюстроўвае фраза з яго ліста да М. Радзівіла Чорнага: «*Gdzieby się tego roku wojna potężna opuściła, wie to Pan Bóg, jeśliby potem kiedy ku powetowaniu krzywdy naszej przyść mogło*» (Ibid. S. 506–510). Гл. таксама на гэты конт: Ibid. S. 475–479.

354 «..*Литовские люди, сведав наших и наряд отпустив, да шли наших людеи искати (...) и потравилися наши с ними немного*» (ПЛ. Вып. 2. С. 255).

355 Тамсама. С. 255. Аб гэтай выправе польскага войска гл. ліст Я. Хадкевіча да Г. Кетлера ад 12 сакавіка 1565 г.: BCzart. Teki Naruszewicza. Sygn. 74. IV. Nr. 132.

Затым групоўка польскіх коннікаў павярнула ў бок Северскай зямлі, дзе спустошыла шмат воласцей[356].

Удалай выправай на Почап вызначыўся Ф. Кміта. Спаліўшы горад і забраўшы значную здабычу, яго атрад накіраваўся да Старадуба, дзе спаліў навакольныя воласці[357]. Аднак здзейсненая ім разам з кіеўскім ваяводам К. Астрожскім вясною 1565 г. выправа на Чарнігаў скончылася безвынікова[358]. У гэты ж час паспяховую баявую акцыю ў глыбіні тэрыторыі праціўніка правялі кн. Б. Карэцкі і А. Курбскі. Актыўна дзейнічалі ў непрыяцельскіх землях таксама віцебская шляхта і найміты на чале з мясцовым ваяводам С. Пацам[359].

Раз-пораз маскоўцам удавалася супрацьдзейнічаць нападам літвінаў. Так, 8 чэрвеня 1565 г. смаленскі ваявода П. Марозаў разбіў атрад казакаў пад камандаваннем С. Бірулі, якія ваявалі смаленскую акругу. У палоне апынуліся 62 чалавекі, у тым ліку кн. Сяргей Лукомскі. Праз два дні быў разбіты і мсціслаўскі атрад, які налічваў 1200 чалавек. Маскоўцы ўзялі ў палон 23 «языкі». Няўдалым для літвінаў аказаўся і паход на раслаўскія воласці — пры вяртанні на атрад пад камандаваннем І. Лычка напалі, у выніку чаго ў палон быў узяты сам камандзір[360].

Баявыя дзеянні 1565 г. не былі інтэнсіўнымі і значнымі па сваіх выніках, а ўяўлялі сабой тыповыя набегі з рабаўнічымі і спусташальнымі мэтамі. Актыўным ваенным дзеянням у 1565–1566 гг. моцна перашкодзіла эпідэмія чумы, якая ахапіла ў гэты час Наўгародчыну, Полаччыну і Смаленшчыну[361]. Раёны, адкуль прыходзілі звесткі пра чуму, станавіліся забароненай зонай. Эпідэмія сцішылася толькі ў другой палове 1566 г.

У жніўні 1565 г. былі адноўлены дыпламатычныя зносіны ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай. Па ініцыятыве радных паноў В. Пратасевіча, Р. і Я. Хадкевіча ў Маскву быў адпраўлены ганец Ленарт Узлоўскі. Маскоўскія ўлады пагадзіліся аднавіць перамовы і даслаць у Вільню свайго

---

[356] Górnicki Ł. Dzieje w Koronie… S. 129; Gwagnini A. Kronika. S. 117; Bielski M. Kronika. T. 2. S. 1155. Цікава, што М. Стрыйкоўскі не згадвае пра гэтую акцыю.

[357] Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 415; Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego. S. 855; Gwagnini A. Kronika. S. 117. Хутчэй за ўсё, менавіта гэтую акцыю меў на ўвазе Л. Гурніцкі: Górnicki Ł. Dzieje w Koronie… S. 129.

[358] АСД. Т. 4. С. 210–211.

[359] Listy. S. 506–508.

[360] ПСРЛ. Т. 29. С. 346.

[361] ПЛ. Вып. 2. С. 248–249.

пасланніка з «опасными грамотами» для вялікіх паслоў ВКЛ[362]. У лістападзе 1565 г. у сталіцу ВКЛ з граматамі прыбыў маскоўскі ганец Уладзімір Жэлнінскі[363]. Такім чынам, быў падрыхтаваны грунт для новай спробы прымірэння паміж варожымі бакамі.

У чэрвені-ліпені 1566 г. у Маскве прайшлі чарговыя перамовы з вялікім пасольствам ВКЛ. Княства прадстаўлялі троцкі кашталян Юры Хадкевіч, берасцейскі ваявода Юры Тышкевіч і пісар Міхайла Гарабурда. Паслы мелі паўнамоцтвы на заключэнне перамір'я альбо «вечнага міру», у залежнасці ад пазіцыі маскоўскіх уладаў. На гэтыя перамовы ў Вільні ўскладалі вялікія надзеі і жадалі атрымаць перадышку ў вайне для ўзнаўлення сіл і завяршэння ўнутраных рэформ. Трэба пагадзіцца з меркаваннем Г. Харашкевіч, што для літвінаў мір з Масковіяй быў надзвычай важнай задачай[364].

З гэтай прычыны праграма літоўскага пасольства мела кампрамісны характар, у ёй было даволі шмат саступак на карысць маскоўцаў. Так, прапаноўваючы «вечны мір», літвіны ўпершыню адмаўляліся ад Смаленска, патрабуючы толькі вяртання Полацка і Азярышчаў. У Інфлянтах павінна было захавацца становішча status quo — кожны з бакоў кантраляваў сваю частку іх тэрыторыі. Супраць шведаў прапаноўвалася вядзенне супольнай барацьбы. Маскоўцы, аднак, не пагадзіліся на такі досыць прымальны для іх варыянт і перайшлі да перамоў аб заключэнні перамір'я[365].

Літоўскія паслы былі гатовы да такога ходу падзей і прапанавалі праект кароткачасовага перамір'я на тэрмін ад пяці да сямі гадоў. Літвіны прызнавалі за маскоўцамі правы на Полацк, аднак не жадалі аддаваць левабярэжную частку Полацкага ваяводства. Перамірная мяжа павінна была прайсці ў пяці вёрстах на поўдзень ад Полацка і 15 вёрстах — на поўнач і на ўсход да ракі Аболь[366]. Маскоўцы, як і раней, настойвалі на прызнанні за імі ўсёй тэрыторыі Полаччыны, пры гэтым на захадзе і поўдні мяжа павінна была праходзіць у 25–30 вёрстах ад

362 РИО. Т. 71. С. 302–315.
363 Тамсама. С. 315–327.
364 Хорошкевич А. Россия в системе... С. 439–440.
365 Г. Харашкевіч лічыць, што адказнасць за гэтае рашэнне цалкам ляжыць на Баярскай думе: Тамсама. С. 440. На наш погляд, такое важнае рашэнне не магло быць прынята без узгаднення з царом, хоць аб гэтым і няма непасрэдных сведчанняў.
366 РИО. Т. 71. С. 381.

Полацка[367]. Тэрмін перамір'я, на іх думку, павінен быў складаць не меней за дзесяць гадоў.

Найбольш упартыя спрэчкі выклікала праблема размежавання зон уплыву ў Інфлянтах. Маскоўцы патрабавалі перадачы ўсёй тэрыторыі Задзвінскага герцагства, робячы націск на прыналежнасці Рыгі. Літвіны, зразумела, не маглі пагадзіцца на такія ўмовы. Наколькі важным для маскоўскага кіраўніцтва было пытанне прыналежнасці Інфлянтаў, паказвае той факт, што Іван Грозны збіраўся нават вярнуць літвінам Полацк у абмен на прыбалтыйскія землі. Праўда, гэтая ідэя не была агучана пры паслах[368]. Яе невыканальнасць была занадта відавочнай.

Не было абыдзена ўвагай і пытанне вызвалення полацкіх палонных. Маскоўцы патрабавалі раўназначнага абмену: яны, напрыклад, не пагаджаліся абмяняць полацкага ваяводу С. Давойну на князя В. Цёмкіна, які быў, па іх словах, усяго толькі «сельскім князем»[369]. Спачатку маскоўцы патрабавалі дадаткова заплаціць 25 тысяч *«золотых угорских»* выкупу. У дачыненні да іншых асоб абменныя спісы з літоўскага і маскоўскага бакоў таксама разыходзіліся. Маскоўскія ўлады, заўважыўшы ўпартасць літоўскіх паслоў, закавалі палонных у кайданы і кінулі за краты. Падставай для гэтага, па словах баяр, стала падобнае стаўленне літвінаў да маскоўскіх палонных.

Пасля зацятага гандлю было вырашана, што за С. Давойну будзе выплачаны дадатковы выкуп памерам 10 тысяч[370]. Аднак вызваленне полацкага ваяводы адбылося толькі ў ліпені 1567 г.[371] Падчас знаходжання пасольства ў Маскве быў абменены толькі Дзмітры Корсак на Кібіра Казлоўскага і Івана Ліжыносава[372].

Падчас знаходжання ў Маскве паслоў ВКЛ збіраўся Земскі сабор. Яго ўдзельнікі адзінадушна выказаліся за працяг вайны, указваючы, што пагадзіцца на ўмовы літвінаў нельга. Полацк без левабярэжнай Полаччыны будзе знаходзіцца ў ізаляцыі, а адмова ад Рыгі і астатніх Інфлянтаў можа прывесці да рэальнай ваеннай пагрозы для Пскова і Ноўгарада. Такім было меркаванне маскоўскіх баяр. Адзін з вядучых маскоўскіх

367 РИО. Т. 71. С. 391.
368 Тамсама. С. 394.
369 Тамсама. С. 414.
370 Тамсама. С. 421–422.
371 M i e n i c k i R. Stanisław Dowojno. S. 473–474.
372 РИО. Т. 71. С. 423.

дыпламатаў І. Віскаваты выказаўся за змену тактыкі вядзення перамоў з Вільняй. Ён прапанаваў не дабівацца ад літвінаў перадачы Рыгі, а толькі заручыцца іх нейтралітэтам і неўмяшаннем у рыжскія справы[373].

У выніку была дасягнута дамоўленасць аб працягу перамоў у Вільні і захаванні перамірнага стану да студзеня 1567 г. Такім чынам, прэтэнзіі маскоўцаў на тэрыторыю правабярэжных Інфлянтаў, як і ў 1563 г., сталі галоўнай прычынай безвыніковага заканчэння перамоў. Па вялікім рахунку, у Маскве не збіраліся ісці на кампраміс на ўмовах, прапанаваных літвінамі. Доказам гэтага стала новая тактыка дзеянняў маскоўцаў у кантраляванай імі частцы Полацкай зямлі.

У Літве шчыра спадзяваліся, што вядзенне дыпламатычных перамоў дазволіць не хвалявацца за стан спраў на ваенным фронце. Але ў жніўні 1566 г. кіраўніцтва ВКЛ са здзіўленнем даведалася, што пад прыкрыццем перамоўнага працэсу маскоўцы распачалі будаўніцтва ў Полацкай зямлі невялікіх замкаў, у якіх маглі зручна размясціцца вайсковыя гарнізоны.

Першай сярод новазбудаваных крэпасцей стаў Усвят (Усвяты). Ён паўстаў побач з аднайменным мястэчкам ў Віцебскім павеце ў ліпені 1566 г.[374] Гэты замак стаў апошнім звяном у ланцугу крэпасцей (Невель — Усвят — Азярышча), якія прыкрывалі маскоўскія землі на старой мяжы з ВКЛ.

Неўзабаве, у кастрычніку гэтага ж года, на вусці ракі Ула з'явіўся аднайменны замак[375]. Ён меў важнае стратэгічнае значэнне. Гэты замак прыкрываў Полацк з боку Віцебска, перакрываючы шлях па Дзвіне паміж гэтымі двума гарадамі. Ульскі замак кантраляваў шлях па аднайменнай рацэ, дзякуючы чаму маскоўцы маглі ажыццяўляць ахоўныя функцыі на значным абшары. Для літвінаў будаўніцтва гэтай крэпасці было асабліва прыкрым, бо яны таксама збіраліся ўмацавацца ў гэтым выгодным месцы.

У снежні 1566 г. на месцы ўпадзення ракі Нішча ў Дрысу быў пабудаваны замак, які атрымаў назву Сокал[376]. Ён прыкрываў маскоўскую акупацыйную зону на захадзе — з боку Дзісны і Дрысы.

---

373 Безумоўна, мае рацыю польскі даследчык Г. Граля, калі гаворыць, што ў гэтым «асаблівым» меркаванні дыпламата не было прынцыповых разыходжанняў з пазіцыяй маскоўскага цара: Граля И. Иван Михайлов Висковатый. С. 297–298.

374 ПСРЛ. Т. 29. С. 351.

375 Тамсама. С. 352–353.

376 Тамсама. С. 353.

Паводле інфармацыі разведкі ВКЛ, вясной 1567 г. маскоўцы планавалі перанос работ па будаўніцтве ўмацаваных пунктаў на тэрыторыю левабярэжнай Полаччыны. Новыя замкі павінны былі з'явіцца ў Чашніках, на рацэ Сара і два — паблізу Дрысы (у вусці Сволны і на адлегласці мілі ад Дрысы)[377]. Такім чынам, у намерах Крамля было ахапіць ланцугом замкаў усё Полацкае ваяводства[378].

У ВКЛ разумелі, што маскоўцы могуць значна пашырыць зону свайго кантролю на Полаччыне. Гэта не магло не выклікаць з літоўскага боку адпаведнай рэакцыі. Аднак скаргі па дыпламатычных каналах нічога не маглі змяніць. У адказ на грамату, прывезеную ў Маскву ганцом В. Загароўскім, літвіны пачулі стандартныя выказванні пра прыналежнасць усяго Полацкага ваяводства да Маскоўскай дзяржавы, а значыцца *«мы в своей вотчине городы где хотим, тут ставим»*[379].

Найвышэйшы гетман Р. Хадкевіч прапаноўваў прыняць контрмеры і таксама пачаць будаўніцтва апорных пунктаў у прыфрантавой зоне. Найбольш перспектыўнымі пляцоўкамі для гэтага лічыліся Вараноцкае гарадзішча і вусце ракі Ула[380]. У Вараночы яшчэ ў 1564 г. з'явіліся першыя ўмацаванні. Цяпер тут размешчаны гарнізон пад камандаваннем Анікея Корсака. Вядома, што 28 кастрычніка 1566 г. маскоўцы напалі на гэты недабудаваны замак[381].

У другой палове 1566 г. у мэтах супрацьдзеяння маскоўскай палітыцы быў значна павялічаны найманы кантынгент. Шырокія паўнамоцтвы (у тым ліку ваеннага характару) былі нададзены мясцовым шляхецкім лідэрам — Б. Корсаку і Ю. Зяновічу. Аднак справы сапраўды пасунуліся з месца толькі вясной 1567 г., калі ў паўночна-ўсходнія землі ВКЛ прыбыў брацлаўскі ваявода Раман Сангушка для выканання абавязкаў польнага гетмана.

---

377 AS. T. 7. S. 126.

378 Трэба дадаць, што, паводле ўскосных дадзеных, у 1568 г. маскоўцамі былі пабудаваны наступныя крэпасці на Полаччыне: Сітна на аднайменным возеры, Красны на возеры Плюсна (найверагодней, сёння гэта возера Астравіта, на беразе якога знаходзіцца сяло Краснае; сустракаецца таксама назва замка Плюсна), Туроўля на месцы ўпадзення аднайменнай ракі ў Дзвіну. Усе гэтыя замкі згадваюцца ў перамірнай грамаце 1570 г.: Книга посольская... Т. 1. С. 295. Яны не маглі быць пабудаваны пазней за восень 1568 г., бо ў лістападзе гэтага года паміж Вільняй і Масквой была дасягнута дамоўленасць, паводле якой будаўніцтва новых замкаў спынялася: РИО. Т. 71. С. 581.

379 РИО. Т. 71. С. 442.

380 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 73 адв. – 74 адв.

381 Книга посольская... Т. 1. С. 258.

Ужо адна з першых яго ваенных акцый на новай пасадзе стала паспяховай. У ліпені 1567 г. маскоўцы занялі востраў на возеры Суша, каб пабудаваць там свой чарговы фарпост[382]. Літвінам было неабходна перашкодзіць непрыяцелю заняць зручную пазіцыю ў глыбіні левабярэжнай Полаччыны.

20 ліпеня 1567 г. у ваколіцах возера адбылася бітва, падчас якой было разгромлена вялікае маскоўскае войска. Па словах Жыгімонта Аўгуста, яно налічвала 17 тысяч чалавек[383]. Адзін з пяці маскоўскіх ваяводаў — ужо вядомы нам Ю. Такмакоў — паспеў зачыніцца на ўмацаваным востраве і ў самой бітве не ўдзельнічаў. У распараджэнні Р. Сангушкі знаходзілася групоўка найманых жаўнераў колькасцю да 2 000 чалавек, сярод якіх было 1 350 коннікаў, больш за 400 драбаў і 150 казакаў[384].

Развіццё падзей у гэтым сутыкненні нагадвае Ульскую бітву 1564 г. Каб належна выкарыстаць фактар нечаканасці, было прынята рашэнне напасці на маскоўскі лагер за некалькі гадзін да світанку. Драбам удалося без шуму ачысціць шлях ад загародаў, зробленых непрыяцелем. Нанесены ўдар заспеў знянацку маскоўскае войска, якое нават не паспела агледзецца, як ужо было разбіта[385]. Як згадвае М. Стрыйкоўскі, ад яго мала што засталося. Былі забіты татарскі военачальнік Амурат (Мурат?) і князь Васіль Палецкі. Другому ваяводзе маскоўскага войска Пятру Сярэбранаму пашчасціла ўцячы ў Полацк[386].

Канкрэтныя звесткі пра страты маскоўцаў у гэтым сутыкненні дае Метрыка ВКЛ. Паводле яе дадзеных, у бітве было забіта 3 тысячы «сыноў баярскіх», 500 татар (*«мордвы и черемисы»*), 400 драбаў і 1 500 *«посохи»*.

---

382 ПСРЛ. Т. 29. С. 355. Новы замак атрымаў назву Коп'е (Суша).

383 AS. T. 7. S. 174–176. Б. Папроцкі і М. Стрыйкоўскі падаюць лічбу ў 8 тысяч чалавек: Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego. S. 830; Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 416.

384 AS. T. 7. S. 174–176.

385 Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego. S. 830. У лісце Жыгімонта Аўгуста са словамі падзякі за перамогу вынікі бітвы характарызуюцца наступным чынам: «[Р. Сангушка] *всих на кошу на голову поразил; где и тые гетманы помененые до смерти сут побиты, и увес обоз неприятелский з наметы, кони, зброи, золото, серебро и зо всею их маетностью есте взяли и вязней живых немало детей боярских зацных с того побоища в себе маеш...*» (AS. T. 7. S. 174).

386 «*И которыя люди московскиа присланы на блюдение делавцов* (будаўнікоў)*, князь Петр Серебряных да князь Василеи Дмитреевич Палецкого, и литовьскиа люди пригнав изгоном, на зори, да многих прибили, и князя Василья Палицких убили, а князь Петр Серебряных убегл в Полоцко*» (ПЛ. Вып. 2. С. 249). Гл. таксама: Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 416.

Здабычай войска ВКЛ стала 1 300 вазоў з рыштункам[387]. У літвінаў загінула толькі 12 чалавек, а было паранена 30 чалавек[388].

Нягледзячы на гэтую перамогу, Р. Сангушку не ўдалося захапіць плацдарм на Сушы, які маскоўцы паспелі падрыхтаваць да абароны. Ю. Такмакоў меў у сваім распараджэнні 17 гармат, не лічачы гакаўніц і ручніц[389]. Толькі ў першай дэкадзе жніўня 1567 г. польны гетман распачаў блакаду крэпасці. Раней гэта не дазваляла зрабіць адсутнасць артылерыі. Аднак праз некалькі тыдняў літвіны былі вымушаны адмовіцца ад аблогі Сушы з прычыны недахопу боепрыпасаў і харчавання[390].

23 жніўня 1567 г. адбылася яшчэ адна значная сутычка літоўскага войска з маскоўцамі, на гэты раз з атрадам пад камандаваннем І. Шчарбатага і Ю. Баратынскага, які накіроўваўся з Улы ў Сушу. Ён налічваў прыкладна 2 000 чалавек[391]. З літоўскага боку яму супрацьстаяла 2 129 коннікаў і чатыры пешыя казацкія роты. Нечаканы ўдар Р. Сангушкі прывёў маскоўскіх ваяроў у замяшанне. У палон трапілі галоўныя ваяводы, а таксама яшчэ 80 *«ludzi zacnych»*. Страты літвінаў склаліся з трох забітых і трыццаці параненых чалавек[392].

У адпаведнасці з дамоўленасцямі, у лютым 1567 г. у ВКЛ адправілася маскоўскае пасольства на чале з баярынам Фёдарам Умным-Калычовым, дварэцкім Грыгорыем Нагім і дзякам Васілём Якаўлевым. Аднак да літоўскага гаспадара ў Гародню яно прыбыло толькі ў ліпені 1567 г. з прычыны доўгіх затрымак па дарозе, якія былі выкліканы, на думку Г. Харашкевіч, чаканнем звестак пра вынікі місіі І. Казлова[393] (гл. ніжэй).

Маскоўскае пасольства мела толькі разведачныя мэты[394]. Сам змест граматы Івана Грознага, адрасаванай Жыгімонту Аўгусту, выразна адлюстраваў, што ў Маскве не збіраліся ісці на прымірэнне з ВКЛ. Мас-

[387] НГАБ, ф. КМФ-18, воп. 1, спр. 529, арк. 182 адв.
[388] Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego. S. 830; Gwagnini A. Kronika. S. 118.
[389] AS. T. 7. S. 174–176.
[390] Ibid. S. 181–182.
[391] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 183. Паводле інфармацыі польскіх храністаў, маскоўскае войска мела 6–9 тысяч чалавек. Гл.: Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 416–417.
[392] Ibid. S. 416–417; Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego. S. 830. А. Ратундус у прыватным лісце паведамляў пра 900 жаўнераў і 7 тысяч сялян (?!), забітых з маскоўскага боку: Bodniak S. Z wyprawy radoszkowickiej na Moskwę w roku 1567–1568 // Ateneum Wileńskie. 1930. R. 7. Z. 3–4. S. 806.
[393] Хорошкевич А. Россия в системе… С. 476.
[394] Гэта выразна паказваюць «памяти», выдадзеныя маскоўскім паслам: РИО. Т. 71. С. 465–475.

коўцы вылучылі папросту неверагодныя патрабаванні накшталт выдачы А. Курбскага[395]. У пасольскіх дакументах не былі дакладна акрэслены паўнамоцтвы паслоў. Да шырокага абмеркавання праблемы граніц і ўмоў перамір'я маскоўцы не былі ўпаўнаважаны. Справа заключалася ў тым, што маскоўскія паслы везлі з сабой грамату ад імя гаспадара ВКЛ, якую той пры згодзе на сямігадовае перамір'е павінен быў падпісаць.

Для літвінаў неканструктыўная пазіцыя маскоўскага пасольства хутка стала відавочнай. Радныя паны заявілі пасля першага раўнду перамоў, што *«нам се видит, что вы пришли не за делом»*[396]. Было зразумела, што абодва бакі не знойдуць кампрамісу па прынцыповых пытаннях наконт прыналежнасці тэрыторыі і ўжывання царскага тытулу. Напрыканцы сваёй місіі — 16 жніўня 1567 г. — паслы нават не ўзялі ліста Жыгімонта Аўгуста да цара, таму што яго тытул не быў напісаны ў адпаведнасці з іх пажаданнямі, а Я. Хадкевіч называўся адміністратарам і гетманам Інфлянтаў[397].

Як відаць, маскоўцы прыехалі ў Гародню дыктаваць свае ўмовы, а не шукаць кампрамісу. Падстаў для прымірэння не існавала. Няўдача перамоў вяла да эскалацыі канфлікту, што праявілася ў буйнамаштабнай падрыхтоўцы абодвух бакоў да ўзнаўлення ваенных дзеянняў.

Адразу пасля выезду пасольства Ф. Умнога-Калычова да маскоўскага цара быў накіраваны літоўскі ганец Юры Быкоўскі. У гаспадарскай грамаце, якую ён вез з сабою, фактычна дэкларавалася абвяшчэнне вайны[398]. З дыпламатам абышліся жорстка — яго ўзялі пад варту і трымалі ў палоне ажно да чэрвеня 1568 г.[399]

Адзначым, што ў 1567 г. у ВКЛ для барацьбы з непрыяцелем вырашылі выкарыстаць унутраную апазіцыю ў Маскоўскай дзяржаве. Там шалеў апрычны тэрор, які закранаў усе слаі грамадства, у тым ліку вярхі паноўнага саслоўя. Паводле данясенняў літоўскіх шпегаў, сярод маскоўскай палітычнай эліты ўсё мацней нарасталі антыцарскія настроі.

[395] Книга посольская… Т. 1. С. 261. Без выканання гэтага патрабавання заключэнне перамір'я не магло адбыцца: РИО. Т. 71. С. 467.

[396] РИО. Т. 71. С. 532.

[397] Тамсама. С. 552–553.

[398] Книга посольская… Т. 1. С. 261–266.

[399] Маскоўцы тлумачылі, што затрымка ганца з'яўлялася адказам на знікненне маскоўскага падданага Васіля Анучы падчас знаходжання ў ВКЛ пасольства Ф. Умнога-Калычова. Вызваленнем Ю. Быкоўскага Іван IV запрашаў літвінаў да аднаўлення перамоў аб міры: РИО. Т. 71. С. 568–569.

Жыгімонт Аўгуст і радныя паны ВКЛ паспрабавалі выкарыстаць гэтыя спрыяльныя для сябе акалічнасці для пераломy сітуацыі. У Маскву з сакрэтнай місіяй быў накіраваны нехта Іван Казлоў са спецыяльнымі лістамі ад радных паноў. Ён павінен быў схіліць шэраг маскоўскіх баяр перайсці на бок гаспадара ВКЛ.

З гэтай задумы, аднак, нічога не выйшла. У Княстве кепска пралічылі магчымасці выступлення «апазіцыі» і, безумоўна, занадта моцна спадзяваліся на ўнутраныя ўзрушэнні. Верагодна, самі баяры данеслі Івану Грознаму інфармацыю пра літоўскія прапановы. У выніку да радных паноў былі адпраўлены ў адказ лісты, аўтарства якіх большасць даследчыкаў аднадушна прыпісвае маскоўскаму цару[400]. Дзякуючы ім мы ведаем, каго ў Літве хацелі схіліць да выступлення супраць царскага рэжыму. Гэта — баяры І. Дз. Бельскі, І. Ф. Мсціслаўскі, М. І. Варатынскі і І. П. Фёдараў. Неабходна адзначыць, што чаканне вынікаў місіі І. Казлова прывяло да затрымкі выезду Жыгімонта Аўгуста ў войска і, як наступства, — да змарнавання спрыяльнага часу для ваенных дзеянняў.

1567 г. стаў пікам напружання ваенных рэсурсаў ВКЛ. У лагеры паспалітага рушэння пад Маладзечнам і Радашковічамі восенню гэтага года з'ехалася амаль 30 000 баяздольных шляхцічаў. Аднак ніякімі актыўнымі дзеяннямі гэтае вялізнае войска не вызначылася. Змарнаваўшы час у бессэнсоўным чаканні, на пачатку 1568 г. шляхта пачала раз'язджацца па хатах (гл. р. II, § 1).

Адзіны пазітыўны момант для развіцця сітуацыі на тэатры ваенных дзеянняў заключаўся ў тым, што паспалітае рушэнне чарговы раз стала фактарам застрашвання праціўніка. Іван Грозны ўстрымаўся ад нападзення на Інфлянты, даведаўшыся аб зборы значных узброеных сіл у ВКЛ.

У лютым 1568 г. па ініцыятыве інфлянцкага гетмана Я. Хадкевіча літвіны вырашылі здзейсніць наступальную акцыю супраць маскоўцаў. Пад яго камандаванне былі накіраваны почты радных паноў і шляхціцаў, якія засталіся ад паспалітага рушэння[401]. Аб'ектам для ўдару быў выбраны замак Ула[402].

---

400 Гл.: Послания Ивана Грозного. С. 241–277. Падрабязны аналіз лістоў зроблены ў: Хорошкевич А. Россия в системе... С. 466–476.

401 Паводле інфармацыі з ліста Жыгімонта Аўгуста ад 17 студзеня 1568 г., найвышэйшы гетман Р. Хадкевіч дазволіў накіраваць для Я. Хадкевіча 2 тысячы коннікаў і 6 тысяч драбаў: BCzart. Teki Naruszewicza. Sygn. 76. IV. Nr. 88. K. 413–414.

402 Ёсць звесткі, што спачатку літвіны планавалі ўдарыць па Сушы. У студзені 1568 г. для забеспячэння абароны гэтай крэпасці маскоўцы даслалі ў Полацк 40 тысяч (!) жаўнераў: РНБ, ф. 971, авт. 234, док. 26.

Яго аблога працягвалася з 12 лютага да 4 сакавіка 1568 г. Намеры Я. Хадкевіча не падтрымаў польны гетман Р. Сангушка, як можна меркаваць, з той прычыны, што бачыў у іх непатрэбную авантуру. Ён крытыкаваў абраную Я. Хадкевічам тактыку: *«Свои люди звел и ротмистров иниих на розно розделил, што ся подобати не может»*[403].

Рацыя Р. Сангушкі пацвердзілася. Аблога Улы скончылася поўным фіяска. У сваёй справаздачы Я. Хадкевіч наракаў на нежаданне пешага войска прадпрымаць актыўныя і выніковыя дзеянні: *«Ротмистрове шли хотя досыть неспешне, ведь же однак волоклися, колько могучи, але драбы их вси по лесе, по ровах и по подречью похоронилися; так же за великим воланьем, напоминаньем, пригоняньем (же ми аж иж до того пришло, ижем руки мои окровавил, припужаючи их до штурму), вшакож жеданого поступку по собе и справы рыцерской оказать не хотели, але чим их больш до того гнано, тым ся болш крыли и утекали»*[404].

Разладжанасць дзеянняў літоўскіх вайскоўцаў ледзь не прывяла да захопу маскоўцамі падчас адчайнай вылазкі літоўскіх гармат. Неўзабаве абаронцы крэпасці атрымалі падмацаванне з Полацка, звёўшы тым самым шанцы літвінаў на поспех да мізэру. Пасля трохтыднёвага знаходжання пад сценамі замка войска Я. Хадкевіча мусіла адысці, *«боючися теж того, абы про тот голод люди (...) до конца не повтекали»*[405]. Паводле сведчанняў з маскоўскага боку, Я. Хадкевіч страціў пад Улай 5 000 чалавек[406].

Храністы называюць розныя прычыны адыходу літвінаў ад Ульскага замка. М. Стрыйкоўскі сцвярджае, што на прыняцце гэтага рашэння паўплывала гібель ротмістра Яна Курніцкага[407]. Л. Гурніцкі лічыць, што няўдача ульскай аперацыі была выклікана немагчымасцю наладзіць дзейсную аблогу замка ў зімовых умовах[408]. А. Гваньіні ж мяркуе, што сітуацыю пераламаў якраз-такі прыход падмогі ў замак з Полацка[409].

Больш удала дзейнічаў аршанскі староста Ф. Кміта, які амаль адначасова з акцыяй Я. Хадкевіча пад Улай ажыццявіў выправу ў напрамку Смаленска. Групоўка пад яго камандаваннем налічвала чатыры тысячы чалавек. Напэўна, у большасці гэта былі таксама шляхцічы з паспалітага

403 AS. T. 7. S. 235–236.
404 АЗР. Т. 3. СПб., 1848. С. 142.
405 Тамсама. С. 143.
406 ВС. Т. 4. С. 97.
407 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 417.
408 Górnicki Ł. Dzieje w Koronie... S. 132.
409 Gwagnini A. Kronika. S. 118–119.

рушэння, якія вырашылі не вяртацца дадому без сустрэчы з непрыяцелем. Дакладна вядома, што тут знаходзіліся шляхцічы са Шклова і Дуброўны. Атрад маскоўцаў, які выйшаў са Смаленска для адпору, быў разгромлены. Пагарцаваўшы па ваколіцах, літоўскія вайскоўцы вярнуліся назад[410].

Цэнтрам актыўнай дзейнасці літоўскіх вайскоўцаў увесь час заставаўся Віцебск, дзе ваяводам з 1566 г. з'яўляўся Станіслаў Пац. У 1566–1569 гг. віцябляне нанеслі некалькі смелых удараў па непрыяцелю. Аб'ектамі нападзення звычайна былі два замкі — Усвяты і Веліж. Здараліся сутыкненні з ворагам і на шляху да іх.

Так, 12 снежня 1567 г. віцебскія казакі на чале з С. Бірулям разбілі значны маскоўскі атрад пад Веліжам[411]. Маскоўскія жаўнеры мусілі ўцякаць з поля бітвы, шмат іх патанула пры гэтым у Дзвіне. У гэтым жа годзе Біруля разграміў на возеры Сітна атрад маскоўцаў у 300 чалавек, захапіўшы пры гэтым значную колькасць узбраення[412].

5 студзеня 1568 г. зноў пацярпеў Веліж: горад быў спалены, а 300 маскоўцаў, якія выйшлі з замка для адпору, былі разбіты. Ужо 17 студзеня 1568 г. жаўнеры з Віцебска падышлі да Усвят, дзе *«в острог ся вломили и людей многих побили, на маетности боярской собе не шкодовали и стрелбу побрали»*[413]. А. Гваньіні піша, што ўдалося б узяць і сам замак, але маскоўцам прыйшла дапамога звонку[414]. 28 студзеня 1568 г. віцябляне вярнуліся да Веліжа і змаглі ці то спаліць пасады, ці то запаліць замкавыя сцены, а таксама захапіць у палон у выніку разгрому атрада маскоўцаў набліжанага да цара Пятра (Івана?) Галавіна[415]. Літвіны вярнуліся ў Віцебск са значнай здабычай.

Актыўныя дзеянні віцяблян не спыняліся і ў далейшым. А. Гваньіні занатаваў, што 29 жніўня 1568 г. літвіны зноў напалі на Усвяты, запаліўшы будынкі пад замкам[416].

Адзначым, што напады наймітаў на маскоўскія замкі і вайсковыя атрады часцей за ўсё былі выкліканы жаданнем захапіць матэрыяльную

---

410 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 417; Bielski M. Kronika. T. 2. S. 1165. У А. Гваньіні няма інфармацыі пра гэтую падзею.

411 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 416. У А. Гваньіні гаворыцца пра «віцебскую пяхоту»: Gwagnini A. Kronika. S. 118.

412 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 416; Gwagnini A. Kronika. S. 117.

413 AS. T. 7. S. 233–234.

414 Gwagnini A. Kronika. S. 119.

415 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 418. А. Гваньіні кажа яшчэ пра Міхаіла, падчашага Івана Грознага: Gwagnini A. Kronika. S. 120.

416 Gwagnini A. Kronika. S. 120. У А. Гваньіні відавочна пераблытана храналогія. Ён піша, што гэтыя падзеі адбываліся ў 1569 г.

здабычу. Аб гэтым адкрыта піша ў сваёй «Хроніцы» А. Гваньіні, які сам неаднаразова быў удзельнікам падобных акцый[417].

20 жніўня 1568 г.[418] адбылася адна з найбольш значных падзей Інфлянцкай вайны. Найманае войска ВКЛ захапіла добра ўмацаваны замак Ула, пабудаваны маскоўцамі ў 1566 г. Найбольш падрабязныя звесткі пра падзеі, звязаныя з узяццем Улы, пакінуў Б. Папроцкі[419]. Невядома, хто быў яго інфарматарам, аднак яго апісанне надзіва дакладна стасуецца з рэляцыямі М. Стрыйкоўскага і А. Гваньіні, якія служылі на той час у Віцебску[420]. Са слоў італьянскага храніста вядома, што ён з'яўляўся пасіўным удзельнікам штурму Ульскага замка. Гэта значна павышае каштоўнасць яго інфармацыі.

Камандуючым аперацыяй па захопу маскоўскай крэпасці быў Р. Сангушка. Штуршком для пачатку дзеянняў паслужыла інфармацыя ад шпегаў, згодна з якой большая частка маскоўскага гарнізона пакінула замак. Разведка, аднак, зрабіла прыкрую памылку, не заўважыўшы таго, што ў Улу прыйшоў новы атрад маскоўцаў. З аказіі прыбыцця папаўнення ў замак маскоўскія жаўнеры прыкладзіся да моцных напояў, з прычыны чаго іх пільнасць, натуральна, значна панізілася.

Літвінам удалося без шуму падступіць да сцен замка. Штурм распачалі з полацкага боку роты К. Тарноўскага і Ю. Рачкоўскага. З іншага боку казакі з рот Бірулі, Аскеркі і Мінкі, праклаўшы праз лес дарогу для коннікаў, падпалілі замак і пачалі секчы браму. Нягледзячы на нечаканасць аблогі, маскоўцы аказвалі ўпартае супраціўленне.

Пералом у змаганні адбыўся пасля пераходу роты М. Салагуба праз раку Ула. Гэта было поўнай нечаканасцю для маскоўцаў. Знаходка броду дазволіла, мяркуючы па ўсім, абкружыць крэпасць. Неўзабаве гвалтоўны

---

417 *«Takich wycieczek bez liczby nasza piechota witebska, ustawicznie z wielką szkodą nieprzyjaciół, we dnie i w nocy czyniła, a to dla swego pożytku. Abowiem niemałą zawsze zdobycze odnosili»* (Ibid. S. 120).

418 Трэба пагадзіцца з меркаваннем С. Александровіча, што ўзяцце Улы не магло адбыцца ў канцы верасня 1568 г., як гэта пададзена ў М. Стрыйкоўскага і Б. Папроцкага. Ужо 5 верасня 1568 г. Р. Сангушка атрымаў падзяку ад Жыгімонта Аўгуста за пасляхова праведзеную аперацыю: AGAD, AR. Dz. II. Sygn. 56. А ў сярэдзіне верасня 1568 г. кіраўніцтвам ВКЛ здзяйсняліся меры па адбудове Ульскага замка і яго забеспячэнні неабходным вайсковым рыштункам і харчовымі прадуктамі. Гл.: Alexandrowicz S. Rozwój kartografii Wielkiego Księstwa Litewskiego od XV do połowy XVIII wieku. Poznań, 1989. S. 184.

419 Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego. S. 830–831.

420 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 418–419; Gwagnini A. Kronika. S. 119.

націск, учынены падышоўшымі коннымі ротамі Р. Войны, Ю. Тышкевіча і Б. Лукомскага, канчаткова вырашыў ход справы на карысць літвінаў. У палон было ўзята 300 чалавек знатнага паходжання, сярод якіх апынуліся і ваяводы замка браты Вельямінавы. Крэпасць амаль поўнасцю згарэла. Ад агню амаль не ўдалося выратаваць ні амуніцыі, ні зброі, ні харчовых запасаў.

Цікава, як маскоўцы вытлумачылі прычыны захопу Ульскага замка. На перамовах 1570 г. яны заявілі, што літоўскія вайскоўцы занялі пусты горад, у якім насельніцтва павымірала ад чумы[421]. Без сумневу, тут мы знаходзім не самую ўдалую спробу апраўдаць прыкрую страту важнага стратэгічнага пункта.

Наколькі добра, у адрозненне ад літвінаў, маскоўцы забяспечвалі ўласныя гарнізоны на Полаччыне, сведчыць той факт, што ў Уле знаходзілася 27 гармат і 300 гакаўніц. Гарнізон складаўся з 800 стральцоў з ручніцамі, не лічачы іншых службовых у вялікай колькасці[422]. Што да лічбы літоўскіх жаўнераў, задзейнічаных у штурме Ульскага замка, то наўрад ці яна перавышала паўтары тысячы чалавек.

Адабранне Улы было значнай ваеннай падзеяй. Важнае стратэгічнае значэнне замка патрабавала як мага хутчэйшага аднаўлення абарончых умацаванняў. Жыгімонт Аўгуст загадаў вышэйшым чынам гаспадарскай Рады зрабіць для гэтага ўсё магчымае. На нейкі час гэтая справа стала галоўнай для цэнтральных уладаў ВКЛ. Найвышэйшы гетман Р. Хадкевіч згадваў, што ён рабіў для адбудовы Улы *«уставичне без перестаня в ден и в ночи не всипаючи пильность и старане працовитое»*[423].

І сапраўды, дзейнасць літоўскай адміністрацыі прыкметна актывізавалася. Земскі падскарбі М. Нарушэвіч збіраўся адправіць у Улу ўсіх людзей, накіраваных на будаўніцтва замкаў на Полаччыне, а таксама набраць новых працаўнікоў. Найвышэйшы гетман меў намер сам адправіцца на абарону Улы разам з усімі найманымі жаўнерамі, якія знаходзіліся ў Полацкім краі[424].

Нягледзячы на праяўленую актыўнасць, справы ў Уле прасоўваліся марудна. Даліся ў знакі старыя заганы арганізацыі абарончых мерапры-

421 РИО. Т. 71. С. 688.
422 Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego. S. 830–831.
423 AS. T. 7. S. 288–289.
424 Ibid. S. 289–290.

емстваў. А. Валовіч выказваў справядлівы скепсіс да магчымасці хуткага аднаўлення замка: *«Иж речи лениво идуть, трудно за так короткий час, яко ся осень вжо близко примкнула, может тот замок стати»*[425].

Маскоўцы, зразумела, не маглі змірыцца са стратай такой важнай у стратэгічным плане крэпасці. Дзеля адабрання Улы восенню 1568 г. рыхтавалася буйнамаштабная выправа. Перашкодай для яе здзяйснення стала вестка аб *«моровом поветрии»* ў ваколіцах Полацка і Улы. Паход на паўдарозе быў спынены[426]. Літвіны атрымалі неабходны час для трывалага замацавання ў гэтым замку[427].

Замест паходу на Улу шасцітысячнае маскоўскае войска 29 верасня 1568 г. падышло да Віцебска. Запаліўшы пасады, яно прастаяла пад горадам два дні, не ажыццявіўшы больш ніякіх актыўных дзеянняў. Абаронцы горада здзяйснялі частыя вылазкі з замка, дзякуючы чаму на трэцюю ноч маскоўцы былі вымушаны адступіць. Віцябляне не пакінулі і тут іх у спакоі, працягваючы атакаваць войска непрыяцеля, якое адыходзіла[428]. Аднак, верагодней за ўсё, дзеянні віцебскіх абаронцаў не былі вырашальным фактарам адыходу маскоўцаў[429].

У далейшым кіраўніцтва ВКЛ працягвала непакоіцца за Віцебск. На пачатку лістапада 1568 г. Р. Хадкевіч, спасылаючыся на ліст Ф. Кміты, паведамляў радным панам пра ўзмацненне небяспекі маскоўскага нападзення на горад. Відавочна, што найвышэйшы гетман баяўся паўтарэння падзей 1563 г., калі ў зімовы час быў страчаны Полацк[430]. Гаспадар рэагаваў больш спакойна: ён параіў узмацніць работу разведкі і хутчэй заняцца соймавымі справамі, пасля чаго звярнуць усю ўвагу на праблемы абароны памежжа[431]. Жыгімонт Аўгуст пагадзіўся з ідэяй засекчы дарогі з Полацка ў Сушу і Тураўлю, тым самым заблакаваць гэтыя новазбудаваныя замкі і з цягам часу авалодаць імі. Цікава, што М. Радзівіл Руды выка-

---

425 AS. T. 7. S. 287–288.
426 Ibid. S. 295–296. Гл. таксама: BKórn. Rkps. 1536. K. 229–232.
427 Літвіны не пераставалі баяцца помсты з боку маскоўцаў за захоп Улы. 24 студзеня 1569 г. дрысенскі стараста Я. Лапот паведамляў Р. Сангушку аб небяспецы маскоўскага ўдару па Дрысе: AS. T. 7. S. 314–315.
428 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 418.
429 Так, А. Гваньіні паведамляе толькі пра адступленне маскоўцаў: Gwagnini A. Kronika. S. 120.
430 BKórn. Rkps. 1536. K. 229–232. Пра ліст Ф. Кміты гл. ліст М. Савіцкага да М. Радзівіла Рудога ад 2 снежня 1568 г.: AGAD, AR. Dz. V. Sygn. 13980. K. 20.
431 Listy. S. 557–560.

заўся супраць гэтых намераў, баючыся парушэння крохкага міру. Усведамляючы адсутнасць дастатковых сіл для актыўных дзеянняў у прыфрантавой зоне, гаспадар прапанаваў хаця б забяспечыць абарону сталіцы Княства, выслаўшы дадатковых жаўнераў у Браслаў і Друю[432].

У канцы 1568 г. былі адноўлены дыпламатычныя кантакты паміж Масквой і Вільняй. У кастрычніку 1568 г. па ініцыятыве радных паноў ВКЛ у Маскву быў адпраўлены ганец Улан Букраба. Гэтая місія была сакрэтнай — апрача гаспадара, аб ёй ведалі толькі М. Радзівіл Руды, Р. Хадкевіч, Я. Хадкевіч і А. Валовіч. Іх асабліва непакоіла, каб місія засталася таямніцай для палякаў[433]. Мэтай выправы У. Букрабы было атрыманне згоды маскоўскага кіраўніцтва на новы раўнд перамоў аб замірэнні. Яна была паспяхова дасягнута: літоўскі ганец прывёз з Масквы «опасные грамоты» і пацвярджэнне захавання міру да заканчэння будучай пасольскай місіі[434].

Пачатак 1569 г. ледзь не прывёў да зрыву перамірнага працэсу. 11 студзеня 1569 г. літоўскі атрад колькасцю 800 чалавек на чале з братамі Палубенскімі здзейсніў напад на замак Ізборск, які знаходзіўся на мяжы Пскоўскай зямлі з Інфлянтамі. Замкавы гарнізон ад нечаканасці не аказаў актыўнага супраціўлення. Літвіны ўтрымлівалі горад 14 дзён. Маскоўскае кіраўніцтва паспешліва выправіла пад крэпасць вялікае войска на чале з М. Марозавым і І. Шарамецевым-Меншым. Пасля кароткачасовай аблогі літвіны здалі Ізборск. У маскоўскім палоне апынулася прыкладна сто чалавек[435].

Здавалася, пасля гэтых падзей рух да прымірэння будзе зноў спынены. З прычыны ізборскіх падзей ранейшыя дамоўленасці, а значыць, і выдадзеныя граматы паслам страцілі сваю сілу[436]. Аднак Крэмль цяпер ужо сам праявіў ініцыятыву і адправіў у ВКЛ ганца Фёдара Мясаедава

[432] Listy. S. 554–557.
[433] РИО. Т. 71. С. 573.
[434] Тамсама. С. 580–582. Гл. таксама: АЗР. Т. 3. С. 147–148.
[435] РИО. Т. 71. С. 584–585; Ш т а д е н Г. Записки немца-опричника. М., 2002. С. 52–53. Прычынай здачы Ізборска маскоўскія ўлады называлі здраду («измену»): РИО. Т. 71. С. 593; Разрядная книга 1475–1605 гг. Т. 2. Ч. 2. С. 228. Цалкам магчыма, што такое трактаванне з'явілася з прычыны жадання апраўдаць недарэчную страту горада. На гэта ўказвае адказ, які павінен быў даваццa літоўскім дыпламатам на магчымыя пытанні пра прычыны захопу Ізборска: *«Государя вашего люди не умеют имати силою, и они емлют изменою да украдом»* (РИО. Т. 71. С. 593).
[436] Тамсама. С. 585–586. Напад на Ізборск кіраўніцтва ВКЛ тлумачыла тым, што ў снежні 1568 – студзені 1569 гг. маскоўскія жаўнеры рабілі спусташэнні ў ваколіцах інфлянцкіх замкаў Эрмес, Гельмет, Смільтэн і інш.: Книга посольская... Т. 1. С. 282–283.

з новымі граматамі[437]. Гэта азначала, што ў Маскве мелі сур'ёзную зацікаўленасць у перамір'і, якая была выклікана цэлым шэрагам як унутраных, так і знешніх абставін.

Пасля захопу Ізборска ў ваенных дзеяннях наступіла зацішша. Віцебскі ваявода С. Пац у кастрычніку 1569 г. паведамляў, што *«новин на тот час з загранича от неприятеля нияких нет. З ласки Божей от неприятеля в покою мешкаем»*[438].

Аднак «ціхая» барацьба за тэрыторыю працягвалася. Літоўскія вайскоўцы напрыканцы 1569 г. захапілі плацдарм для будаўніцтва крэпасці на возеры Цетча (хутчэй за ўсё, сёння гэтае возера носіць назву Паульскае)[439]. Верагодна, гэты гарадок атрымаў назву Лебедзь (Лебядок)[440]. Маскоўцам пры дакладна невядомых абставінах удалося паставіць на возеры Аталова (Атулова) замак Крэчат. Цікава, што спачатку плацдарм для будаўніцтва захапіў літвін Франц Жук[441].

У сярэдзіне 1570 г. нехта Іван Глазуноў *«с товарыщи»* выйшаў з Лебедзя і зрабіў спробу заняць месца для будаўніцтва ўмацаванняў на возеры Гомне (найверагодней, сучасная назва Гомель). Аднак пакінутым літвінамі месцам авалодаў атрад маскоўцаў. Паводле загаду цара, які імкнуўся дакладна выконваць умовы перамір'я, наспех збудаваныя ўмацаванні былі разбураны[442].

Абмен ганцамі паміж дзвюма краінамі тым часам не спыняўся. У сакавіку 1569 г. у Маскву прыехаў ганец ВКЛ Фёдар Скумін-Тышкевіч з гаспадарскім лістом, у якім паведамлялася, што літоўскае пасольства з'явіцца перад Вялікднем[443]. Маскоўцы, зважаючы на хуткае набліжэнне гэтага свята, прапанавалі іншы тэрмін — дзень Св. Пятра і Паўла (29 чэрвеня 1569 г.)[444]. Адпраўцы пасольства, аднак, перашкодзілі ўнутрыпалі-

---

437 Адначасова Іван IV патрабаваў абмену палонных, у прыватнасці, вяртання ізборскага намесніка Афанасія Нашчокіна: РИО. Т. 71. С. 587–589.

438 AS. T. 7. S. 335–336.

439 Ibid. S. 355–358; НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 335–335 адв. Падчас перамоў у Маскве ў траўні 1570 г. ужо згадваўся горад Цетча. Гл.: РИО. Т. 71. С. 664, 667–668.

440 Такая назва некалькі разоў згадваецца на перамовах у 1570 г.: РИО. Т. 71. С. 747.

441 Тамсама. С. 695. Месцазнаходжанне замка Крэчат у крыніцы пазначана гэтак: *«По копейской дорозе* (г. зн. у напрамку Сушы) *на озере Тубловине Кугоне»*. Мяркуем, што гаворка ідзе пра сучасную вёску Кугоні ва Ушацкім раёне Віцебскай вобласці. Гл. таксама: M i e n i c k i R. Egzulanci połłoccy. S. 71–72.

442 РИО. Т. 71. С. 747.

443 Книга посольская… Т. 1. С. 276–277.

444 РИО. Т. 71. С. 601.

тычныя калізіі ў ВКЛ і Польшчы, а менавіта — Люблінскі сойм, на якім вырашаўся далейшы лёс уніі паміж гэтымі дзяржавамі.

Люблінская унія змяніла расклад сіл на міжнароднай арэне. Гэта непасрэдным чынам адбілася на характары маскоўска-літоўскіх дачыненняў. У верасні 1569 г. у Маскву са спецыяльным паведамленнем пра заключэнне дзяржаўнага саюзу ВКЛ і Польшчы прыбыў ганец Андрэй Галецкі. Ён ад імя гаспадара ВКЛ папрасіў у Івана Грознага новыя «глейты» для супольнага польска-літоўскага пасольства. Цікава, што ў гаспадарскіх лістах маскоўскі ўладар тытулаваўся ўсяго толькі «вялікім князем маскоўскім»[445]. Без сумневу, гэтым Жыгімонт Аўгуст хацеў паказаць, што цяпер сіла знаходзіцца на яго баку.

Сапраўды, становішча ВКЛ у канцы 60-х гг. XVI ст. істотна палепшылася. Пра гэта сведчыла не толькі стварэнне Рэчы Паспалітай. Швецыя з непрымірымага ворага ў выніку змены ўлады ў 1568 г. стала саюзнікам Княства. У гэты ж час было заключана трывалае перамір'е з Асманскай імперыяй[446].

Пазіцыі ж Маскоўскай дзяржавы, наадварот, значна пагоршыліся. Яна засталася без саюзнікаў. Калі ВКЛ і Швецыя не праяўлялі ў гэты час значнай актыўнасці на ваеннай арэне, то Асманская імперыя разам са сваім васалам Крымскім ханствам распачала вясною 1569 г. маштабную агрэсію супраць Масковіі[447]. Для гэтай дзяржавы паўстала пагроза вайны на два фронты. Апрача гэтага, узмацніўся ўнутрыпалітычны крызіс, выкліканы апрычнінай і эканамічнымі ўскладненнямі[448]. Іван IV быў вымушаны шукаць часовага прымірэння з ВКЛ.

У пачатку 1570 г. у Маскву адправілася вялікае пасольства Рэчы Паспалітай у складзе інаўрацлаўскага ваяводы Яна Кратоўскага, менскага кашталяна Мікалая Тальвоша, старасты радзеёўскага Рафала Ляшчыньскага і наваградскага падкаморага Андрэя Харытановіча. Паслы мелі пры сабе сакрэтную інструкцыю ад гаспадара, у якой былі прапісаны ўмовы «вечнага міру» альбо перамір'я, на якія яны мелі права пагадзіцца[449]. Як паказвае аналіз ходу перамоў, паслы дакладна выка-

---

445 На гэты зняважлівы для Івана IV факт звярнула ўвагу Г. Харашкевіч: Х о р о ш к е в и ч А. Россия в системе... С. 505.
446 Книга посольская... Т. 1. С. 268–271.
447 Гл.: Б у р д е й Г. Русско-турецкая война 1569 года. Саратов, 1962.
448 С к р ы н н и к о в Р. Царство террора. С. 325–340.
449 РНБ, ф. 971, авт. 152, л. 33–38.

налі патрабаванні гаспадара, не адыходзячы ад іх ні на ёту. Праект перамір'я з польска-літоўскага боку мала адрозніваўся ад праекта 1566 г. Як і раней, ВКЛ было гатова прызнаць status quo у Інфлянтах і правесці размежаванне Полацкай зямлі без перадачы маскоўцам яе левабярэжнай часткі.

Паслоў надоўга затрымалі ў чаканні вяртання цара з Ноўгарада, дзе ён учыніў масавае вырэзванне насельніцтва. Улады ВКЛ гэтая затрымка прымушала скептычна ставіцца да перспектыў замірэння з маскоўцамі. Да таго ж у Вільні неўзабаве стала вядома аб дзеяннях дацкага прынца Магнуса, які пайшоў на пагадненне з Іванам Грозным дзеля стварэння для сябе «Інфлянцкага каралеўства» пад пратэктаратам Масковіі[450].

Перамовы распачаліся толькі ў траўні 1570 г. Згодна з традыцыяй, першапачаткова была разгледжана магчымасць заключэння «вечнага міру». Палякаў і літвінаў задавальняла прызнанне стану status quo ў Інфлянтах, пры гэтым яны, як і ў 1566 г., прапанавалі абмяняць бліжэйшы да маскоўскай мяжы замак Марыенгаўзен на Адзель. Што датычыць усходняга памежжа, то літвіны адмаўляліся ад правоў на Смаленск да смерці абодвух гаспадароў, патрабуючы вярнуць Полацк разам з навазбудаванымі замкамі на тэрыторыі ВКЛ. Маскоўцы без абмеркавання адкінулі гэтыя прапановы, спаслаўшыся на тое, што і Інфлянты, і Полаччына з'яўляюцца адвечнай вотчынай маскоўскага цара[451].

Пры перамовах пасольства імкнулася паказаць наяўнасць падстаў для фарміравання шырокай антымаскоўскай кааліцыі. Па-першае, асаблівы націск рабіўся на рэпрэзентацыі ад імя новай супольнай дзяржавы. Гэта азначала, што ВКЛ цяпер магло абапірацца на ваенны патэнцыял Польшчы[452]. Па-другое, паслы падкрэслівалі саюзніцкія стасункі Рэчы Паспалітай з Швецыяй, дзе каралём у 1568 г. стаў зяць Жыгімонта Аўгуста Юхан. Яны прапанавалі падключыць шведаў да перамоўнага працэсу з мэтай прымірэння Масквы і Стакгольма[453]. Маскоўскія ўлады ганарліва адмовіліся, заявіўшы, што зносіны са Швецыяй традыцыйна належаць да паўнамоцтваў наўгародскага намесніка[454]. І, па-трэцяе,

450 Listy. S. 576–579.
451 РИО. Т. 71. С. 649–650.
452 Тамсама. С. 641–642, 644–645. Маскоўцы зрабілі выгляд, што нічога звышардынарнага на Люблінскім сойме не адбылося: маўляў, адзінства ВКЛ і Польскай Кароны было спраўджаным фактам на працягу апошніх паўтара стагоддзя: AGAD, AR. Dz. II. Sygn. 66a. K. 2.
453 РИО. Т. 71. С. 642.
454 Тамсама. С. 646.

пасланнікі з Рэчы Паспалітай не забыліся нагадаць пра Асманскую імперыю, з якой было заключана трывалае мірнае пагадненне.

Гэтыя фактары ціску не прынеслі жаданага эфекту. Працягваючы перамовы аб перамір'і, маскоўцы спачатку ўпарта трымаліся сваіх бескампрамісных прынцыпаў. Паслы Рэчы Паспалітай, яўна губляючы цярплівасць, заяўлялі аб магчымасці аднаўлення вайны і змагання за страчаныя тэрыторыі. Маскоўцы не правакавалі сітуацыю, адгаворваючыся спасылкамі на філасофска-рэлігійныя прытчы[455]. Сіла на гэты раз была не на іх баку. Увогуле, ход перамоў выразна адлюстраваў, што маскоўскае кіраўніцтва не адпусціць пасольства без заключэння пагаднення.

У рэшце рэшт маскоўскі бок адмовіўся ад прэтэнзій на крэпасці, якія знаходзіліся пад кантролем літвінаў, у тым ліку і ад збудаванай імі Улы. Працяглыя спрэчкі выклікала размежаванне ў Полацкай і Віцебскай землях. Удзельнікі перамоў так і не прыйшлі да кансэнсусу, застаючыся па асобных пытаннях на ўласных пазіцыях. У выніку былі створаны розныя для абодвух бакоў спісы граніц[456]. Прааналізаваўшы іх, Р. Мяніцкі зрабіў выснову, што маскоўскі варыянт мяжы быў больш рэалістычным і дакладным і больш адпавядаў фактычнаму стану рэчаў[457].

У дачыненні да Інфлянтаў маскоўскае кіраўніцтва пагаджалася прызнаць за Рэччу Паспалітай усе землі па левым беразе Дзвіны. Гэта, зразумела, разыходзілася з пасольскімі прапановамі, якія грунтаваліся на прызнанні тэрытарыяльнага status quo ў Інфлянтах. Бадай, упершыню прадстаўнікамі ВКЛ і Польшчы была зроблена заява пра тое, што Інфлянты з'яўляюцца «вотчынай» Жыгімонта Аўгуста. Гэты статус аргументаваўся тым, што Інфлянцкая дзяржава *«дана в оборону от цысаря христьянского* (г. зн. ад імператара Святой Рымскай імперыі германскай нацыі) *и ото всех околных немецких государей и от арцыбискупов и бискупов и маистров»*[458]. З боку маскоўцаў прагучаў адказ, што пакуль Іван IV не распачаў ваенныя дзеянні, інфлянцы не збіраліся пераходзіць у падданства да Жыгімонта Аўгуста. Нельга не адзначыць, што гэта, у прынцыпе, адпавядала праўдзе.

455 РИО. Т. 71. С. 659–660.
456 Тамсама. С. 734–742.
457 Mienicki R. Egzulanci połłoccy. S. 77.
458 РИО. Т. 71. С. 710.

Спрэчка аб правах на інфлянцкую «вотчыну» скончылася тым, што Іван Грозны пагадзіўся на прапановы паслоў ВКЛ, пры ўмове, што дакладныя граніцы ў Інфлянтах не будуць зафіксаваны ў перамірных граматах. Пасля нядоўгіх дыскусій аб тэрміне перамір'я было вырашана, што яно заключаецца на тры гады, пачынаючы з 18 чэрвеня 1570 г.[459] На падставе дасягнутых рашэнняў былі складзены перамірныя граматы з рознымі спісамі для абодвух бакоў[460].

Такім чынам, у 1570 г. пасля больш чым дзесяцігадовай вайны паміж Вялікім Княствам Літоўскім (з 1569 г. — Рэччу Паспалітай) і Вялікім Княствам Маскоўскім было падпісана мірнае пагадненне на падставе uti possidetis. Сам ход перамоў адлюстраваў, што гэты кампраміс стаў вымушаным для абодвух бакоў. І Літве, і Масковіі была патрэбна перадышка ў ваенных дзеяннях з дзвюх прычын: вычарпанасці рэсурсаў і неабходнасці засяродзіцца на вырашэнні неадкладных унутраных праблем. Асабліва характэрнай тут выглядае пазіцыя літвінаў. Нягледзячы на істотнае паляпшэнне знешнепалітычнага становішча ВКЛ у канцы 60-х гг. XVI ст., яно працягвала шукаць замірэння з маскоўцамі.

Апошнім часам у гістарыяграфіі разгарнулася дыскусія вакол значэння перамір'я 1570 г. Г. Граля сцвярджае, што перамір'е не адпавядала жаданням ні Масквы, ні Вільні. Крэмль не дасягнуў сваёй асноўнай мэты — авалодання ўсімі Інфлянтамі і шырокім выхадам да Балтыйскага мора. Своеасаблівай кампенсацыяй за гэта былі тэрытарыяльныя набыткі ў Полацкай зямлі. На думку даследчыка, перамірны кампраміс адлюстраваў сабою раўнавагу сіл у зацяжной вайне[461]. З такімі высновамі не пагадзілася Г. Харашкевіч, якая палічыла перамір'е поўным правалам палітыкі маскоўскага двара. Кіраўніцтва Маскоўскай дзяржавы не дасягнула нічога істотнага, апрача нявызначаных дакладна межаў і кароткачасовага спынення вайны[462].

Цяжка ўбачыць рацыю ў словах расійскай даследчыцы. Перамір'е замацоўвала фактычны стан рэчаў, і, прынамсі, маскоўцы нічога не страцілі пры яго заключэнні. Значная частка Інфлянтаў разам з Нарвай

---

459 РИО. Т. 71. С. 711–713. Маскоўцы, як і раней, імкнуліся заключыць доўгачасовае перамір'е — мінімум на 5 гадоў. Палякі і літвіны прапаноўвалі тэрмін аднаго-двух гадоў.
460 Книга посольская... Т. 1. С. 293–301; РИО. Т. 71. С. 734–742.
461 Граля И. Иван Михайлов Висковатый. С. 316–317.
462 Хорошкевич А. Россия в системе... С. 553–554.

(а значыцца, і выхадам да мора) і Дэрптам, а таксама вялікая тэрыторыя Полаччыны знаходзіліся ў іх руках. Такім чынам, з пункту гледжання тэрытарыяльных набыткаў і страт у выйгрышы, безумоўна, апынулася Маскоўская дзяржава. Дасягненнем жа літвінаў можна назваць толькі тое, што пасля бясплодных перамоў 1563 і 1566 гг. ім урэшце ўдалося дабіцца ад Крамля перамір'я. На той момант гэта быў рэальны кампраміс, прымальны і для літоўскага, і для маскоўскага бакоў[463].

Іншая справа, як бы выкарыстоўвалася атрыманая перадышка ў будучыні. Для гэтага ў ВКЛ, аб'яднанага ў адну дзяржаву з Польскай Каронай, былі лепшыя ўмовы як з гледзішча матэрыяльнага патэнцыялу, так і зыходзячы са спрыяльнай для яго міжнароднай сітуацыі. Справа стаяла за ажыццяўленнем рэваншу за ваенныя паражэнні.

На нашу думку, пераможцу ў Інфлянцкай вайне 1558–1570 гг. нельга вызначыць. Было відавочна, што перамір'е носіць кароткачасовы характар і барацьба на гэтым не скончыцца. Усё залежала ад таго, ці змогуць варожыя бакі мабілізаваць сілы і выкарыстаць у сваіх інтарэсах спрыяльныя знешнія і ўнутраныя фактары.

Ваенныя дзеянні падчас Інфлянцкай вайны паказалі бясспрэчную перавагу войска ВКЛ у адкрытым змаганні. З адваротнага боку, літвіны саступалі маскоўцам у правядзенні аблогавых аперацый. Такі стан рэчаў спрычыніўся да значных тэрытарыяльных страт ВКЛ на Полаччыне. Пасля ажыццяўлення маскоўскім бокам шырокамаштабных аперацый у 1563–1564 гг. ваенныя дзеянні набылі лакальны характар. У 1566 г. маскоўцы пачалі замацоўвацца на захопленай тэрыторыі Полаччыны, у выніку чаго там паўстаў шэраг новых абарончых пунктаў. Змагаючыся супраць намераў праціўніка, літвінам у другой палове 60-х гг. XVI ст. пакрысе ўдавалася схіліць перавагу ў ваенным супрацьстаянні на свой бок. Найважнейшай ваеннай перамогай было адабранне Улы ў 1568 г.

ВКЛ, у адрозненне ад Маскоўскай дзяржавы, дзе імкліва набіралі моц цэнтралізатарскія тэндэнцыі, не змагло рэалізаваць буйнамаштабных ваенных акцый. Напрыканцы 60-х гг. XVI ст. Княства мела пільную патрэбу ў перамірнай перадышцы для ўзнаўлення сваіх рэсурсаў і выра-

463 Такая ацэнка, у прыватнасці, дадзена ў адной з лепшых прац савецкай гістарыяграфіі, прысвечанай эпосе Івана Грознага: З и м и н А. Опричнина Ивана Грозного. М., 1964. С. 434.

шэння важных унутрыпалітычных пытанняў. Не менш зацікаўленай у міры была і Масковія, якая спазнала апрычны тэрор і маштабныя ўдары з боку Асманскай імперыі і яе васалаў. Вынікам кампрамісу з'явілася заключэнне трохгадовага перамір'я 1570 г.

# РАЗДЗЕЛ II

# АРГАНІЗАЦЫЯ ЎЗБРОЕНЫХ СІЛ ВКЛ

## § 1. Крызіс магчымасцей: паспалітае рушэнне ВКЛ падчас Інфлянцкай вайны

Паспалітае рушэнне з'яўлялася асноўным складовым элементам вайскова-абарончай сістэмы Вялікага Княства Літоўскага. Яно ўяўляла сабой усеагульнае шляхецкае апалчэнне і сфарміравалася яшчэ ў перыяд станаўлення ВКЛ. З даўніх часоў удзел шляхты ў абароне сваёй краіны быў яе найважнейшым ганаровым абавязкам. Выкананне гэтай «земскай павіннасці», па сутнасці, санкцыянавала шляхту як прывілеяваны стан у сярэднявечным грамадстве. З гэтай прычыны паспалітае рушэнне ВКЛ выконвала, акрамя ваенна-абарончай, важную сацыяльную функцыю. Яно было заклікана не толькі забяспечваць абарону краіны ад знешніх ворагаў, але і з'яўлялася своеасаблівым ахоўнікам сацыяльна-палітычнага ладу ВКЛ.

Парадак службы ў паспалітым рушэнні быў канкрэтна вызначаны ў пачатку XVI ст. У 1528 г. адбыўся першы вядомы нам перапіс шляхецкіх землеўладанняў з мэтай вызначэння колькаснага складу земскага войска[1]. А ў Першым Статуце ВКЛ парадак яго фарміравання і дзейнасці набыў прававое афармленне[2].

---

1 Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года / Падрыхт. А. Груша, М. Спірыдонаў, М. Вайтовіч. Мн., 2003.

2 Первый Литовский Статут (1529 г.). С. 151–158.

Спецыфікай паспалітага рушэння ВКЛ была наяўнасць у яго складзе толькі конных жаўнераў. Для прадстаўніка шляхецкага стану лічылася знявагай служыць у пяхоце. Кіраваў паспалітым рушэннем найвышэйшы гетман. Гэтая пасада становіцца ў XVI ст. адной з важнейшых у іерархіі дзяржаўных урадаў. Гетман уваходзіў у гаспадарскую Раду і з'яўляўся адной з набліжаных да гаспадара асоб.

Паводле вызначанага на пачатку XVI ст. парадку земскай службы шляхціцы са сваімі «почтамі» па закліку гаспадара павінны былі збірацца пад каманду харужага ў сваіх паветах. Велічыня «почтаў» залежала ад памераў землеўладанняў. У 1502 г. было вырашана, што адзін коннік павінен выстаўляцца з кожных 10 зямельных «службаў». У 1529 г. гэтая норма была зменшана да 8 «службаў». З 1554 г. канчаткова вярнуліся да ўсталяванай на пачатку стагоддзя нормы ў 10 «службаў» (альбо валок)[3].

Сфарміраваная павятовая харугва павінна была прыбыць у вызначаны «ваеннымі лістамі» тэрмін і на месца збору паспалітага рушэння. Апрача гэтага, асобныя атрады жаўнераў павінны былі выстаўляць радныя паны, паны, князі, удовы магнатаў і шэраг іншых найвышэйшыхураднікаў.

Гэты парадак дзейнічаў на момант пачатку Інфлянцкай вайны. Да ўмяшання ВКЛ у інфлянцкія справы паспалітае рушэнне вельмі доўгі час не збіралася. Апошняя спроба яго збору рабілася ў 1545 г.[4]

Упершыню паспалітае рушэнне з мэтай абароны Інфлянтаў было сабрана ўлетку 1560 г. Яно складалася са шляхты жамойцкіх і завілейскіх зямель ВКЛ. Войска павінна было збірацца ў двух пунктах. Каля інфлянцкага мястэчка Баўска пад камандаванне жамойцкага старасты Гераніма Хадкевіча быў прызначаны збор апалчэння з жамойцкіх паветаў (у гаспадарскіх лістах згаданы Коўна, Вількеі, Скерстамоны і Расеяны). Другой часткай войска павінен быў кіраваць найвышэйшы гетман М. Радзівіл Руды[5]. Аднак камандуючым стаў князь А. Палубенскі, які размясціў жаўнераў пад Люцэнам. Паводле сведчанняў Радзівіла, войска ВКЛ налічвала неверагодна вялікую колькасць — ажно 29 тысяч чалавек[6].

---

3 Łowmiański H. Zaludnienie państwa litewskiego... S. 97–99.

4 Гл.: AGAD, AR. Dz. II. Nr. 21. K. 61–63. Гэты дакумент змяшчае рэестр павятовых рот ВКЛ (sic!). Безумоўна, на ўвазе маюцца павятовыя харугвы.

5 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 443 адв. — 445.

6 Jasnowski J. Mikołaj Czarny Radziwiłł. S. 264–265. Гэтая лічба наўрад ці адпавядае рэчаіснасці.

З дапамогай гэтых сіл у Вільні жадалі паказаць інфлянцам сур'ёзнасць намераў Літвы абараняць іх краіну. Для маскоўскага непрыяцеля яны павінны былі стаць своеасаблівым фактарам застрашэння і стрымлівання баявых акцый. Жыгімонт Аўгуст пісаў у сваім лісце да Г. Хадкевіча, што прыходам літоўскага войска *«тым людем земъли Инфлянтское серца додаси, а непрыятель теж будеть ведати о людех прибылых»*[7].Ісці на эскалацыю канфлікту і ўмешвацца ў ваенныя дзеянні без вызначэння пазіцыі маскоўскага боку па інфлянцкім пытанні кіраўніцтва ВКЛ, безумоўна, не хацела.

Сапраўды, войска ВКЛ, адпраўленае ў Інфлянты, не распачало наступальных акцый. Толькі авангард на чале з А. Палубенскім уступіў у лакальны бой з маскоўскім атрадам, які ўзначальваў А. Курбскі (гл. р. I, § 1). 10 кастрычніка 1560 г. паспалітае рушэнне было распушчана[8].

Пастаўленыя кіраўніцтвам краіны перад ім задачы былі выкананы. Маскоўцы, убачыўшы новы чыннік супраціўлення, не рашыліся прасоўвацца далёка на поўдзень Інфлянтаў, як гэта было ў папярэднія гады. Боязь маскоўскіх военачальнікаў нарвацца на адпор літвінаў у далейшым пацвярджаў сам Іван Грозны[9].

У 1561 г. усё больш відавочным рабіўся распад Інфлянцкай дзяржавы і яе падзел паміж суседзямі. У гэтых варунках (асабліва пасля пераходу Рэвеля пад кантроль шведаў) кіраўніцтву ВКЛ патрэбна было праяўляць большую актыўнасць у справе абароны Інфлянтаў. Найміты, размешчаныя ў інфлянцкіх замках, маглі служыць толькі пасіўнай сілай. Для ажыццяўлення аперацый наступальнага характару неабходна было прыцягваць дадатковыя вайсковыя рэсурсы, якія магло даць толькі паспалітае рушэнне.

Імкнучыся чарговы раз паказаць інфлянцам, што ў ВКЛ сур'ёзна ставяцца да абароны іх дзяржавы, Жыгімонт Аўгуст у красавіку 1561 г. распарадзіўся сабраць паспалітае рушэнне з усіх заходніх рэгіёнаў ВКЛ. Яго збор павінен быў адбыцца ў інфлянцкім горадзе Зельбургу 24 траўня 1561 г. Аднак у сярэдзіне траўня 1561 г. з прычыны недахопу харчавання для коней ён быў перанесены на 15 чэрвеня 1561 г. Неабходна адзначыць, што ў войска збіраўся прыехаць і сам Жыгімонт Аўгуст[10].

[7] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 453–453 адв.
[8] Тамсама. Спр. 254, арк. 176 адв. — 177.
[9] Переписка Ивана Грозного с Андреем Курбским. С. 89 (гл. р. I, § 1).
[10] LM. Kn. 564. P. 49–51.

Паспалітае рушэнне фактычна пачало дзейнічаць толькі ў жніўні 1561 г. На гэты раз перад ім была пастаўлена новая задача — не проста не дапусціць ворага ў межы кантраляванай тэрыторыі, але і адабраць па меры магчымасці захопленыя маскоўцамі ў 1558–1560 гг. інфлянцкія землі. У выніку земскае апалчэнне было задзейнічана пры аблозе Тарваста.

Тут адбыўся той рэдкі выпадак, калі шляхціцы спешыліся, каб браць штурмам замкавыя ўмацаванні[11]. У гэтага энтузіязму ёсць тлумачэнне — шляхта ВКЛ спадзявалася на шчодрае ўзнагароджванне пасля далучэння Інфлянтаў. Сваю ролю, безумоўна, адыграў і той факт, што вялікая колькасць шляхты ўпершыню пасля доўгага перапынку апынулася ў паспалітым рушэнні. Шляхціцы яшчэ не былі абцяжараны сталай і працяглай ваеннай службай.

Аднак сітуацыя змянілася ўжо ў другой палове года. Для літвінаў аблога Тарваста праходзіла няпроста. 22 жніўня 1561 г. гетман М. Радзівіл Руды пісаў да гаспадара, што войска не зможа знаходзіцца ў Інфлянтах больш за два тыдні з прычыны недахопу правіянту[12]. Праз тыдзень ён паведамляў, што радныя паны і шляхта, якія знаходзіліся ў паспалітым рушэнні, катэгарычна выказаліся за роспуск войска пасля ўзяцця замка. Жыгімонт Аўгуст настойліва патрабаваў, каб літоўскія жаўнеры засталіся ў Інфлянтах хаця б да прыходу польскага найманага кантынгента[13]. Верагодна, неўзабаве пасля захопу Тарваста земскае апалчэнне было распушчана.

Ужо ў 1561 г. у паспалітым рушэнні пачалі праяўляцца тыя вострыя праблемы, якія спадарожнічалі шляхецкаму войску ўвесь час Інфлянцкай вайны. Шляхта імкнулася рознымі спосабамі ўхіліцца ад службы, што выяўлялася ў першую чаргу ў наўмысным памяншэнні сваіх «почтаў». Таму ў гаспадарскіх «ваенных лістах» асаблівым чынам агаворвалася, каб шляхціцы прыбывалі ў войска ў дакладна вызначаны тэрмін і згодна з вызначанымі Статутам нормамі *«подлуг можности имений»*[14].

---

11 Гэты момант падкрэсліваў М. Стрыйкоўскі: S t r y j k o w s k i M. Kronika. T. 2. S. 412.
12 Listy. S. 345–346.
13 Ibid. S. 346–348.
14 LM. Kn. 564. P. 49–51.

Другой істотнай праблемай была марудлівасць пры зборах. 21 чэрвеня 1561 г. М. Радзівіл Чорны пісаў свайму брату М. Радзівілу Рудому, што ўся шляхта і паны яшчэ сядзяць па хатах, і спадзявацца, што праз тры тыдні яны прыбудуць у вайсковы лагер, папросту няма сэнсу[15]. У пачатку ліпеня 1561 г. гаспадар канстатаваў, што да найвышэйшага гетмана *«еще нихто не поспешил ся, яко ж маем ведомост, же многие за сплошеньством и недбалостью своею и до сего часу з домов своих не выехали»*[16].

Каб неяк выправіць становішча, улады прынялі наступную надзвычайную меру: абвясцілі пра збор паспалітага рушэння на рынках і ў храмах гарадоў і мястэчак. Мяркуючы па тым, што войска ўсё ж такі сабралася, гэтая акцыя мела станоўчы вынік. З іншага боку, яе правядзенне можа сведчыць пра кепскае распаўсюджванне інфармацыі і элементарнае няведанне павятовай шляхтай зместу «ваенных лістоў».

Значнай праблемай з'яўляліся паводзіны ўзброеных шляхціцаў па дарозе ў войска. Да прыходу на месца прызначэння яны павінны былі купляць харчаванне па рынкавых коштах. Аднак пры гэтым вельмі часта не абыходзілася без злоўжыванняў. Пад пагрозай зброі ў мірнага насельніцтва адбіраліся харчовыя прадукты, дзе-нідзе даходзіла і да гвалтоўных дзеянняў[17]. Праход вайсковых атрадаў праз маёнткі ўжо ў 1560 г. нанёс іх уласнікам вялікія шкоды[18].

Баючыся абвастрэння зносін з Маскоўскай дзяржавай пасля заключэння Pacta Subiectionis, гаспадарская канцылярыя на пачатку снежня 1561 г. выдала новыя абвесткі аб зборы паспалітага рушэння на Каляды. Другі збор за год, тым больш у зімовы час! Такая частая мабілізацыя была надзвычайнай падзеяй.

Аднак кіраўніцтва ВКЛ на самой справе не планавала збор войска. Яно імкнулася выцягнуць са шляхты грашовыя сродкі для найму новых рэгулярных найманых рот. З гэтай мэтай у тых жа самых лістах шляхце было прапанавана адкупіцца ад земскай павіннасці. Звальненне ад службы ў паспалітым рушэнні каштавала дзве копы грошаў за кожнага

15 AGAD, AR. Dz. IV. T. 35. Sygn. 502. K. 20–28.

16 LM. Kn. 564. P. 53–54.

17 *«Ведомость того маем, же прошлых часов многие почты не супольные ставили, не подлуг можности именеи служили, такъже и в тягъненьи великии утиск у браньи живъности чинили и до возов спижовали...»* (Ibid. P. 43–45).

18 Вядома, што моцна пацярпелі ўладанні кн. І. Крошынскага ва Упіцкай дзяржаве: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 45, арк. 58–58 адв.

конніка, які павінен быў выстаўляцца згодна з дзейным заканадаўствам[19].

Малаверагодна, каб шляхта адгукнулася на гэтую ініцыятыву з патрэбнай энергіяй. Напэўна, усведамляючы яе крах, у канцы студзеня 1562 г. Жыгімонт Аўгуст пагадзіўся, што ў варунках снежнай і халоднай зімы пагроза маскоўскіх udaraў з'яўляецца невялікай і збіраць войска немэтазгодна[20].

Падобныя дзеянні ўладаў на самым пачатку вайны яскрава паказвалі, што паспалітае рушэнне не разглядалася імі як надзейная ваенная сіла. Аднак адмовіцца ад яго выкарыстання было немагчыма. Скарб не мог сабе дазволіць утрымліваць на сталай аснове вялікае найманае войска.

Як вядома, у 1562 г. інфлянцкі канфлікт перарос у шырокамаштабную вайну ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай. Цяпер патрэбу ў абароне мелі не толькі Інфлянты, але і ўсё ўсходняе памежжа ВКЛ. У варунках нанясення непрыяцелем раптоўных ударaў з мэтамі спусташэння тэрыторыі паспалітае рушэнне павінна было выконваць дзве важныя задачы: папярэджанне патэнцыяльных нападаў маскоўскага войска і ажыццяўленне контрнаступальных дзеянняў на непрыяцельскія землі.

Чарговы збор земскага войска быў прызначаны каля Друцка на 16 траўня 1562 г. «Ваенныя лісты» высылаліся ў паветы ажно тры разы — 20 красавіка, 1 і 6 траўня[21]. Як і ў папярэдні год, інфармацыю аб скліканні паспалітага рушэння з самага пачатку прадпісвалася агучваць у найбольш ажыўленых публічных месцах — у касцёлах, цэрквах, на мястэчковых рынках[22].

У апошнім з гэтых «ваенных лістоў» былі ўдакладнены ўмовы службы. Асаблівая ўвага звярталася на тое, каб шляхта сама ішла ў войска, а не дасылала замест сябе сваіх падданых. Так званая *«братья дельная»* павінна была ў поўным складзе выехаць у войска. Раней яна магла высылаць ад сябе аднаго прадстаўніка. Земскім ураднікам прадпісвалася выязджаць на ваенную службу самім, пакідаючы на сваіх урадах *«шляхтичов недостаточных»*, г. зн. бяднейшых, якія выстаўлялі ў паспалітае рушэнне не больш за аднаго конніка. Згодна са Статутам,

19 LM. Kn. 564. P. 81–83.
20 Listy. S. 364–365.
21 LM. Kn. 564. P. 98–102, 105–106.
22 Ibid. P. 105–106.

гаспадарская ўлада пагражала за ўхіленне ад земскай службы канфіскацыяй маёнткаў[23].

Такім чынам, кіраўніцтва дзяржавы не цуралася ісці супраць усталяваных правіл вайсковай мабілізацыі. Пасля папярэдніх пралікаў пры зборах войска былі зроблены пэўныя высновы. Зразумела, што ўлады пайшлі на гэтыя надзвычайныя меры ў першую чаргу з мэтай забяспечыць прыбыццё належнай колькасці жаўнераў.

Шляхту чакаў яшчэ адзін сюрпрыз, які разыходзіўся са «старыной». Дзеля павелічэння мабільнасці і ўзмацнення эфектыўнасці паспалітае рушэнне было падзелена на некалькі асобных частак. Шляхта ўкраінскіх зямель павінна была 12 траўня 1562 г. асобна сабрацца пад Рэчыцай[24]. Кіраўніком украінскіх харугваў быў прызначаны стараста луцкі, веніцкі і брацлаўскі Богуш Карэцкі. Ён павінен быў каардынаваць дзеянні з найвышэйшым гетманам, у прыватнасці, паводле яго загаду правесці перадыслакацыю ў прызначанае ім месца. Украінская шляхта павінна была прыкрываць ад маскоўскіх удараў тэрыторыю паўднёва-ўсходняй Беларусі і паўночна-ўсходняй Украіны.

10 чэрвеня 1562 г. жамойцкай шляхце было выдадзена прадпісанне змяніць маршрут і рушыць пад каманду польнага (дворнага) гетмана Р. Хадкевіча ў Інфлянты. Месцам прызначэння было выбрана «Новае места» (?) пана (Юрыя?) Осціка[25]. Раптоўнае перакідванне жамойцкіх харугваў было выклікана пагрозай аблогі Пернавы[26].

Гэтае рашэнне было прынята без папярэдняга ўзгаднення з найвышэйшым гетманам, што гаспадар тлумачыў неадкладнымі патрэбамі. М. Радзівіл Руды быў супраць падзелу войска і хацеў бачыць жамойцкую шляхту і польнага гетмана побач з сабой у вайсковым лагеры ва ўсходняй Беларусі[27].

Такім чынам, паспалітае рушэнне было фактычна падзелена на тры часткі. Гэта адпавядала стратэгічнай рацыянальнасці і дазваляла аператыўна рэагаваць на патэнцыяльныя ўдары непрыяцеля, якія маглі быць нанесены ў самых нечаканых месцах шырокай памежнай лініі.

23 LM. Kn. 564. P. 105–106.
24 У выданні Метрыкі ВКЛ няслушна замест траўня пададзены чэрвень: Ibid. P. 96–98.
25 Мяркуем, што гэтае мястэчка знаходзілася недзе каля мяжы з Інфлянтамі. Гл.: Ibid. P. 107–108.
26 Listy. S. 385–387.
27 Ibidem.

Аднак такі падыход пярэчыў традыцыі непадзельнасці паспалітага рушэння, што выклікала нараканні з боку шляхты. Да таго ж жамойцкая шляхта ўжо паспела адправіцца ў дарогу на першапачатковае месца збору на Друцкіх палях. На Віленскім сойме 1563 г. яна скардзілася, што змена маршруту абярнулася вялікімі «накладамі»[28]. Жамойтам удалося атрымаць ад гаспадара абяцанне, што больш падобныя дзеянні паўтарацца не будуць. Аднак пазней улады свайго слова не стрымалі[29].

Нягледзячы на катэгарычныя патрабаванні выхаду ў войска і пагрозы пакарання за ігнараванне земскай службы, шляхта зноў засталася сядзець па хатах. У ліпені 1562 г. у Вільні былі вымушаны прызнаць, што значная колькасць шляхціцаў не выйшла на ваенную службу: *«Многие з васъ будучи повинъни служъбе земскои, и будучи тежъ дельными з братьею и въчастники своими, дома зостали и тепер мешъкаете, не едучи ку тои послузе нашои и потребе земъскои»*[30]. Жамойцкая шляхта, у прыватнасці, прыкрывалася хваробамі, і такая з'ява ў гэтым рэгіёне набыла масавы характар[31]. На Валыні і Падоллі таксама легкадумна паставіліся да збору паспалітага рушэння. 14 траўня 1562 г. у адрас валынскай і падляшскай шляхты быў выдадзены паўторны ліст з катэгарычным патрабаваннем выйсці на земскую службу[32].

Улады ўбачылі, што ў паспалітае рушэнне адмаўляліся ісці не бяднейшыя шляхціцы, а тыя, хто мог без вялікіх праблем для свайго фінансавага становішча служыць у войску. Многія харужыя хавалі інфармацыю аб такіх асобах[33]. У ліставанні з М. Радзівілам Рудым Жыгімонт Аўгуст прапанаваў сабраць звесткі пра тых, хто ігнараваў выклікі ў

28 АЛРГ. Т. 2. С. 152.

29 Вясной 1565 г. жамойцкая шляхта зноў была накіравана не ў лагер паспалітага рушэння, а на абарону Інфлянтаў: АСД. Т. 7. Вильна, 1870. С. 29–32. У інструкцыі для Я. Хадкевіча пры яго прызначэнні на пасаду адміністратара і гетмана Інфлянтаў гаспадар заявіў, што рушэнне Жамойцкай зямлі і шэрагу іншых паветаў (Ковенскі, Упіцкі, Вількамірскі) у выпадку патрэбы будзе адпраўляцца ў Інфлянты: LM. Kn. 530. P. 38–40. Пад пытаннем стаіць таксама знаходжанне жамойцкай шляхты ў лагеры паспалітага рушэння пад Маладзечнам восенню 1567 г.

30 LM. Kn. 564. P. 110–111. Паводле слоў Жыгімонта Аўгуста, у войску не было амаль паловы ваеннаабавязаных шляхціцаў: Listy. S. 392–393.

31 LM. Kn. 564. P. 111–112.

32 Ibid. P. 106.

33 *«Wiele ich, co pod chorągwiami nie są, a więtsze imiona mając i mogąc lepiej służyć niż uboga szlachta, doma zostali, a niektorzy tylko lada jako wyprawili a snać o nich i chorążowie nie śmieją powiadać. A tego też mamy dostateczną sprawę, że chorążowie barzo ich wiele ślachty odpuszczali i zakrywają...»* (Listy. S. 392–393).

паспалітае рушэнне, заклікаючы нават да выкарыстання даносаў ад іх суседзяў. У якасці заахвочвання даносчыкам меркавалася перадаваць маёнткі пакараных[34].

Аднак гэтыя намеры, верагодней за ўсё, засталіся толькі на паперы. Гаспадар закрыў вочы на правіннасці шляхты і вырашыў не ажыццяўляць канфіскацый. Быў выдадзены новы загад аб выхадзе на земскую службу. За яго ігнараванне вызначалася больш строгае пакаранне — не толькі канфіскацыя нерухомай маёмасці, але і пагроза зняволення і смяротнага выраку: «*...Не одно под страченьем именей, але и под горлы вашыми (...) абы есте жадной надеи в пофолькгованью не мели*»[35]. Нягледзячы на гэта, амаль палова шляхціцаў праігнаравала збор паспалітага рушэння ў 1562 г.[36]

Здзейсненыя ўлетку 1562 г. баявыя акцыі не мелі гучных вынікаў, якія маглі б палегчыць цяжкія варункі службы. У рэшце рэшт невыноснасць такога становішча прывяла да выстаўлення шляхтай, якая спасылалася на пагрозу голаду і агульную стомленасць, патрабаванняў распусціць войска. Больш таго, у вайсковым лагеры пад Віцебскам дайшло да афармлення «просьбаў» чыста палітычнага характару (гл. р. IV, § 2).

Рэакцыя гаспадара на падобныя паводзіны шляхецкага войска была адначасова рэзкай і кампраміснай. Ён разумеў абгрунтаванасць просьбаў шляхты і яшчэ на пачатку жніўня 1562 г. пісаў, што «*ziemstwo jeśliby przez zimę zostali nie będą mogli być sposobni na przyszłe lato do służby i ku podatkowi*»[37]. У дасланым у паспалітае рушэнне лісце ўказвалася, што значная частка шляхціцаў не выканала як след распараджэнняў аб вайсковым зборы: не ўзяла, як было загадана, прадуктаў на працяглы тэрмін, спазнілася з выхадам на месца прызначэння. Ідучы насустрач шляхецкім просьбам, Жыгімонт Аўгуст дазволіў войску разысціся. Тым, хто не прысутнічаў альбо спазніўся ў вайсковы лагер, было загадана быць гатовым і да аператыўных збораў восенню і зімой. Вызначэнне тых, каго датычылася гэтае рашэнне, было даручана «*справъцам местца гетманьского*» — ваяводзе падляшскаму Васілю Тышкевічу і падчашаму Мікалаю Кішку[38].

---

34 Listy. S. 392–393).
35 LM. Kn. 564. P. 110–111.
36 Listy. S. 392–393.
37 Ibid. S. 393–394.
38 LM. Kn. 564. P. 121–122.

На гэтым ваенная кампанія 1562 г. скончылася. Перад уладамі ВКЛ стаяла задача наладзіць абарону на ўсходнім памежжы ў восеньскі і зімовы час. Нягледзячы на натуральнае памяншэнне ваеннай актыўнасці, звязанае са зменай надвор'я, пагроза нечаканых удараў не знікла. Трэба было рыхтавацца да горшага развіцця падзей.

У Вільні ведалі аб падрыхтоўчых мерапрыемствах Маскоўскай дзяржавы да ваеннай выправы. Пра гэта сведчыць гаспадарскі ліст, датаваны 3 лістапада 1562 г., у якім абвяшчаўся чарговы збор шляхты ў паспалітае рушэнне. У ім, у прыватнасці, гаварылася, што *«неприятель нашъ княз[ь] великии московъскии злымъ умысломъ наполнивши ся на панъство н[а]шо воиско свое збираеть»*[39]. Мерай у адказ стала абвяшчэнне збору шляхты на 6 снежня 1562 г. у Менску. На гэты раз гаворка ішла аб сапраўднай вайсковай мабілізацыі ў зімовы час.

Аднак у сталіцы не спадзяваліся на тое, што шляхціцы з імпэтам накіруюцца на службу. У пачатку снежня 1562 г. былі выдадзены новыя лісты, у якіх да выхаду ў войска заклікаліся толькі тыя, хто праігнараваў паспалітае рушэнне летам 1562 г. Яны павінны былі збірацца ў Лукомлі пад камандаваннем польнага гетмана Р. Хадкевіча. Цікава, што на гэтых лістах стаіць дата 3 лістапада 1562 г.[40] На наш погляд, яны былі напісаны загадзя і прыхаваны да патрэбнага моманту. Верагодна, кіраўніцтва ВКЛ спадзявалася, што шляхціцы, якія не абцяжарылі сябе службай у сярэдзіне 1562 г., хутчэй прыбудуць у войска.

Да пачатку 1563 г. у Вільні не ведалі дакладна планаў маскоўцаў. 6 студзеня 1563 г. радныя паны ўжо мелі інфармацыю пра марш маскоўскага войска, аднак у якасці яго канчатковай мэты разглядаліся альбо Полацк, альбо Віцебск. З прычыны значнасці небяспекі ў спецыяльным звароце да шляхты яе заклікалі спешна прыбыць у паспалітае рушэнне пад Менск, дзе знаходзіўся з неверагодна малымі сіламі М. Радзівіл Руды[41]. У першай палове студзеня 1563 г. у яго было толькі 100 коннікаў![42]

23 студзеня 1563 г. ад перабеглага на бок літвінаў маскоўскага жаўнера Сямёна Буйко кіраўніцтва ВКЛ даведалася аб планах маскоўцаў захапіць Полацк. Гаспадарская Рада ў палымяным закліку звярнулася да ўсіх, хто жадаў прыняць удзел у абароне краю, не робячы пры гэтым ні

39 Ibid. P. 125–126.
40 Ibid. P. 131–132.
41 Ibid. P. 135–136.
42 Listy. S. 425–426.

станавых, ні этнаканфесійных адрозненняў, што само па сабе з'яўлялася знамянальным: «...*Яко на кгвалтъ вси однастаине хто яко способити ся может, бороначи паньства г(о)с(по)д(а)ръского и вольностеи, свободъ нашихъ спольныхъ, такъ хрестияне, яко и ормяне, турцы и татарове*»[43].

Аднак гэтыя меры не аказалі неабходнага ўздзеяння на прывілеяваны стан. 6 лютага 1563 г. Рада выдала новыя лісты, у якіх паабяцала шляхціцам, якія адправяцца ў паспалітае рушэнне, заплаціць паводле вызначаных ставак — конніку з поўным рыштункам і драбу з уласнай зброяй — па 5 польскіх злотых, конніку з казацкім рыштункам і драбу без зброі — па 4 злотых. Агаворваўся і тэрмін прыбыцця ў войска — 8–15 дзён, у залежнасці ад аддаленасці месца жыхарства[44].

Фактычна гэтыя меры азначалі спробу ператварэння паспалітага рушэння ў найманае войска, якое ўтрымлівалася за плату. Небяспека прымушала шукаць нетрадыцыйныя спосабы прыцягнення шляхты да ваеннай службы.

Аднак і гэтая арыгінальная па сваёй адчайнасці спроба сабраць войска не прывяла да поспеху. 15 лютага 1563 г. Полацк быў здадзены ворагу. Вядома, што М. Радзівіл Руды падчас аблогі меў у распараджэнні толькі дзве тысячы коннікаў-літвінаў. Верагодна, не ўсе яны належалі да паспалітага рушэння. Сярод іх маглі быць і жаўнеры з найманых рот.

Полацкае паражэнне агаліла ўвесь комплекс праблем арганізацыі абароны ВКЛ. Штогадовыя працяглыя вайсковыя зборы вымотвалі сілы шляхты. Яна не здолела вытрываць шалёнага тэмпу напружання ўласных рэсурсаў. Не трэба забываць, што асноўнай базай для рэкрутавання вайскоўцаў з'яўляліся заходнія рэгіёны ВКЛ. Для мясцовай шляхты пераход на далёкую адлегласць у бедныя і спустошаныя раёны на ўсходзе ВКЛ аказваўся асабліва цяжкім. Для шмат каго ўдзел у паспалітым рушэнні ствараў рэальную перспектыву банкруцтва і ў фінансава-матэрыяльным плане з'яўляўся ні больш ні менш як самазабойчым крокам. Адсутнасць гаспадара ў ВКЛ прымушала шляхту лічыць, што ён абыякава ставіўся да вайны, з прычыны чаго ў яе калектыўнай свядомасці вайсковыя зборы паўставалі другараднай справай. Цалкам магчыма, сваю ролю адыграў і той факт, што зборы паспалітага рушэння 1561 і 1562 гг. не

43 LM. Kn. 564. P. 138–139.
44 Ibid. P. 139–140.

былі санкцыянаваны соймавымі ўхваламі. Усё гэта прыводзіла да таго, што шляхціцы масава ігнаравалі выхады ў паспалітае рушэнне.

Для абмеркавання праблем абароны ў траўні-чэрвені 1563 г. у Вільні быў скліканы вальны сойм. На ім былі прыняты важныя рашэнні, якія ў далейшым вызначылі сутнасць ваенна-абарончай палітыкі ВКЛ.

Захоп маскоўцамі Полацка балюча закрануў гонар шляхты. Як магнатам, так і шараговай шляхце было цудоўна зразумела, што рэалізаваць ідэю рэваншу немагчыма без значных мабілізацыйных і арганізацыйных высілкаў. Усведамленне такога стану рэчаў знайшло сваё яскравае адлюстраванне ў соймавай ухвале.

Ход Віленскага сойма 1563 г. выразна паказаў, што дзяржаўныя структуры ўлады мэтанакіравана шукалі паразумення са шляхтай. Падобныя адчувальныя перамены ў іх узаемадачыненнях былі выкліканы не столькі пазіцыяй шляхты, якая ўзмацнілася ў выніку паступовай палітычнай эмансіпацыі (гэта найчасцей можна прасачыць у гістарыяграфіі), колькі бязвыхадным становішчам дзяржавы ў справе арганізацыі абароны. Масавае ігнараванне шляхтай земскай службы стала галоўнай прычынай адсутнасці сіл для адпору ворагу пад Полацкам. Дзяржава ж не магла адмовіцца ад выкарыстання паспалітага рушэння, бо з прычыны недахопу сродкаў у скарбе стварыць яму прыстойную замену ў выглядзе найманага войска не было магчымасцей. Прыцягнуць знешнія інвестыцыі таксама было нерэальна — потым давялося б плаціць па рахунках. Таму пошук кампрамісу са шляхтай, якая была асноўным рэсурсам узброеных сіл, быў адзіным сапраўдным выйсцем з крызіснай сітуацыі.

Нягледзячы на канструктыўнае стаўленне ўсіх зацікаўленых бакоў, падчас працы сойма досыць востра выявілася барацьба паміж кіроўнай элітай і шараговымі соймавымі станамі, якія былі прадстаўлены перш за ўсё харужымі. Яны праявілі на соймавых пасяджэннях высокую актыўнасць і прапанавалі шэраг канкрэтных эфектыўных мер па павышэнні абароназдольнасці краіны. Пры гэтым некаторыя прапановы выходзілі за рамкі традыцыйнай палітычнай практыкі, і іх Жыгімонт Аўгуст не адважыўся ўхваліць.

У прыватнасці, можна не сумнявацца ў тым, што менавіта з ініцыятывы «меншага стану» было прапанавана далучыць да земскай службы дзяржаўныхураднікаў, якія *«врады доживотным правом мають, а до скарбу господаръского платов не дають»*[45]. Такія ж вытокі мела просьба

[45] У соймавай «просьбе» канкрэтна ўказвалася на М. Радзівіла Чорнага і А. Валовіча, а таксама на старастаў і пісараў канцыляры: РИБ. Т. 30. С. 327–328.

аб удзеле ў арганізацыі збору павятовых харугваў не толькі харужых, але таксама дзяржаўцаў і старастаў[46]. Гэтая ідэя была цалкам слушнай і рацыянальнай, бо дазваляла больш эфектыўна пабудаваць працу на месцах.

Вальным соймам было адназначна вырашана, што ваеннай павіннасці мусяць падлягаць усе без выключэння землі, якія знаходзіліся на «земскім праве»: застаўныя, удовіныя, што знаходзяцца пад апекай і ва ўласнасці іншаземцаў (у выпадку іх жаніцьбы на літвінках), і інш.[47] Тыя шляхціцы, якія *«ся поддали паном з ыменьями своими для обороны»* (sic!), павінны былі вярнуцца пад кампетэнцыю павятовых харужых[48]. Дадзеныя раней лісты, якія вызвалялі ад ваеннай службы, пераставалі дзейнічаць, за выключэннем выпадкаў з інвалідамі, удовамі, сіротамі і бежанцамі з Полаччыны[49]. Увогуле ж, па матэрыялах крыніц выразна відаць, што да вайсковай мабілізацыі ў той ці іншай форме прапаноўвалася далучыць амаль усе катэгорыі насельніцтва. Гэта рэзка кантраставала са звычайнымі ўяўленнямі аб земскай службе[50].

Для павышэння баяздольнасці войска соймавыя станы выступілі з ініцыятывай, каб кошт каня і ўзбраення быў не меншы за 6 коп грошаў, прытым за парушэнне гэтага артыкула павінна была пагражаць канфіскацыя паловы рухомай і нерухомай маёмасці[51]. Гаспадар пагадзіўся з такім падыходам, дадаючы, што за выстаўленне няпоўных почтаў шляхецкі маёнтак можа быць увогуле канфіскаваны. У гэтым выпадку дзве трэці яго адыходзілі гаспадару, а адна перадавалася таму, хто дасць інфармацыю пра парушальніка[52].

У соймавай пастанове 1563 г. пацвярджаліся даўнія нормы выстаўлення аднаго конніка з 10 «службаў»[53]. Дакладна вызначаўся парадак выхаду і знаходжання ў паспалітым рушэнні. Строга забараняліся спекуляцыі з харчаваннем (за іх вызначалася пакаранне *«злодейскою ви-*

46 РИБ. Т. 30. С. 318–319.
47 Тамсама. С. 321–325, 329.
48 *«Таковых всих шляхтичов з их именьями до поветов, где они и первей были, казати привернути»* (Тамсама. С. 321).
49 Тамсама. С. 327–329.
50 У адказ на «просьбы» соймавых станаў гаспадар адмовіўся накласці ваенную павіннасць на мяшчан, габрэяў і духавенства. Гл.: Тамсама. С. 326–327, 329–333.
51 Узорны воін павінен быў выглядаць наступным чынам: *«Шляхтич кождый ку службе военной мел конь (...) и зброю, тарч, древо»* (Тамсама. С. 320).
52 Тамсама. С. 325–326.
53 Тамсама. С. 316–318.

*ною»*[54]), запазычванне чужых коней і зброі пры попісе. Асаблівае пакаранне чакала тых, хто б вырашыў выправіць замест сябе слуг (наймітаў) ці самавольна з'ехаць з вайсковага лагера. Ім пагражала *«каранье горлом»*, г. зн. смяротны вырак[55].

У парушэнне палажэнняў Статуту 1529 г., усе *«браты недельные»* (г. зн. тыя, хто сумесна валодае адным маёнткам) так ці іначай павінны былі ўдзельнічаць у выкананні ваеннага абавязку. У паспалітае рушэнне накіроўваўся адзін *«годнейший»* брат. Астатнія павінны былі ісці на найманую службу ў роты альбо почты паноў за адпаведнае ўзнагароджанне. Толькі ў выпадку старасці бацькі адзін сын *«для пригледанья дому»* мог застацца ў хаце. Пакараннем за невыкананне гэтых прадпісанняў вызначалася зняволенне на 12 тыдняў, што было для шляхціца вялікай ганьбай[56].

Насуперак Статуту гаспадар дазволіў шляхце, якая знаходзілася на службе ў паноў, застацца ў іх почтах, замяніўшы сябе ў павятовых харугвах *«так добрым шляхтичом, яко сам»*[57]. У гэтым бачна яўная саступка магнатэрыі, якая, безумоўна, жадала мець побач з сабой найбліжэйшых і найвярнейшых паплечнікаў.

Асаблівая ўвага звярталася на своечасовы збор войска. У гаспадарскіх лістах указвалася, што шляхта павінна *«не одно днемъ, але и годиною того року не омешкиваючи»* прыбыць у войска. Улады абяцалі, што любое парушэнне парадку *«отъ сего часу жадному пропушчоно не будеть»*[58].

Кіраўніцтва дзяржавы разумела, што здзяйсненне аблогавых аперацый з дапамогай толькі коннага войска асуджана на няўдачу. Патрабаваліся драбы, прытым у вялікай колькасці. Для фарміравання пешага войска вальны сойм пайшоў на новы неардынарны крок. Па ініцыятыве гаспадара было ўхвалена выстаўленне падчас бліжэйшага збору паспалітага рушэння аднаго драба з кожных 20 валок. Ён павінен

[54] Тамсама. С. 319.
[55] Тамсама. С. 324.
[56] Тамсама. С. 658–662.
[57] Тамсама. С. 317–318. М. Любаўскі лічыць, што прычынай такога рашэння з'яўлялася жаданне гаспадара заахвоціць паноў выстаўляць большыя па колькасці почты: Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 641. На наш погляд, улады хацелі такім спосабам спыніць пераход шляхціцаў, якія належалі да павятовых харугваў, у магнацкія почты.
[58] Тамсама. С. 662.

быў быць узброены ручніцай альбо рагацінай, а таксама мець пры сабе сякеру. Воласць вызвалялася ад выплаты падаткаў за рэкрута. Яго зямельны надзел павінны былі апрацоўваць астатнія жыхары воласці да яго вяртання з войска[59].

Збор чарговага паспалітага рушэння першапачаткова быў прызначаны на 1 жніўня 1563 г. у Крэве[60]. Аднак ужо 26 ліпеня 1563 г. былі разасланы новыя лісты, у якіх у сувязі з прапановай маскоўцаў працягнуць перамір'е да 1 лістапада 1563 г. збор войска адкладаўся на 29 верасня 1563 г. Гэта было зроблена, нягледзячы на заканчэнне спрыяльнай для ваенных дзеянняў летняй пары. Рашэнне тлумачылася дзвюма прычынамі — жаданнем правесці перамовы аб вызваленні полацкіх вязняў і немагчымасцю хуткага збору ў войска шляхціцаў з аддаленых зямель[61].

Аднак на гэтым пераносы вайсковых збораў не скончыліся. 31 жніўня 1563 г. збор паспалітага рушэння быў перанесены на 18 кастрычніка 1563 г.[62], а ў пачатку кастрычніка — на 21 лістапада 1563 г.[63] Прычынай пераносаў стаў працяг перамір'я да 6 снежня 1563 г.

Нягледзячы на прынятце на Віленскім сойме 1563 г. канкрэтных і дэталёвых рашэнняў, кіраўніцтва дзяржавы не спадзявалася на іх ідэальнае выкананне. Неўзабаве пасля заканчэння сойма на збор у войска на 8 жніўня 1563 г. былі дадаткова запрошаны путныя баяры[64]. Восенню 1563 г., калі збор паспалітага рушэння адкладваўся, улады перайшлі да спроб непасрэднага набору ў войска сялян. 26 верасня 1563 г. гаспадар прадпісаў памежным старастам і дзяржаўцам арганізаваць адпраўленне ў войска з кожных дзесяці «службаў» аднаго *«чоловека»*, узброенага рагацінай і сякерай і з запасам харчавання на паўгода. Акрамя таго, гэты воін павінен быў суправаджаць падводу з харчаваннем, сабраным з гэтых «службаў»[65].

Да падобных надзвычайных мер, якія цалкам разыходзіліся з уяўленнямі аб рыцарскай службе, кіраўніцтва ВКЛ прымусілі аб'ектыўныя цяжкасці, звязаныя са зборам шляхецкага апалчэння. Пра гэта

59 АЗР. Т. 3. С. 131–133.
60 РИБ. Т. 30. С. 658–662.
61 Тамсама. С. 699–700.
62 Тамсама. С. 721–722.
63 Тамсама. С. 757–758.
64 Тамсама. С. 679–685.
65 Тамсама. С. 740–743. 20 кастрычніка 1563 г. гэтае прадпісанне было паўторана: Тамсама. С. 748–752.

сведчаць каштоўныя фрагменты попісу паспалітага рушэння 1563 г.[66] На жаль, мы не ведаем дакладна, калі ён быў праведзены. Найверагодней, перапіс жаўнераў адбыўся альбо ў снежні 1563 г., альбо ў пачатку 1564 г. На гэта ўскосна ўказвае згадка аб тым, што жамойцкія почты *«зъехалися на послугу военную року 1563 на рок [15]64»*[67].

Згодна з гэтым попісам, у 1563 г. з 27 жамойцкіх воласцей (цівунстваў) у войска прыбылі 2 062 конніка (па падліках складальніка попісу — 2 060), 67 пешых шляхціцаў (68) і 147 драбаў (140). Сярод гэтых жаўнераў толькі 519 (503) мелі зброю[68]. Гэта складала толькі 23% ад агульнай колькасці! Як бачна, для шараговага шляхціца выпраўленне на земскую службу з неабходнай зброяй і рыштункам было складанай задачай.

Значная частка шляхты зноў ухілілася ад службы. Так, паводле праведзенага харужымі попісу ў Гёраненскай харугве адсутнічала 54% шляхціцаў, у Берасцейскай — 60%. У Берасцейскім павеце 18 чалавек выслалі замест сябе слуг, з іх 8 патлумачылі гэта ўласнай старасцю і хваробамі, 7 — урадніцкімі абавязкамі, а трое нават не растлумачылі прычыны нявыезду[69] (гл. табл. 2.1.1).

Табліца 2.1.1.

*Дадзеныя пра асобныя харугвы паспалітага рушэння 1563 г. (паводле фрагментаў попісу)*

| | **Геранёнская харугва** | **Берасцейская харугва** |
|---|---|---|
| Прысутныя на службе | 73 к. і 1 др. | 50 к. |
| з іх выслалі слуг | няма дадзеных | 18 к. |
| Прысутнічалі на службе, але не прайшлі попіс | 3 к. | няма дадзеных |
| Прайшлі попіс, але адсутнічалі на службе | 5 к. | няма дадзеных |

*Табліца складзена паводле:* AGAD, AR. Dz. II. Nr. 21.

66 AGAD, AR. Dz. II. Nr. 21.
67 Ibid. K. 67.
68 Ibid. K. 67–71.
69 Ibid. K. 106–109.

Параўнанне з попісамі 1565 і 1567 гг. яскрава паказвае, што ў 1563 г. так і не ўдалося дамагчыся максімальнага збору шляхты ў войска. Жамойцкая зямля ў 1567 г. была прадстаўлена 2 887 коннікамі, што на 40% вышэй за 1563 г. З Берасцейскага павета ў 1565 г. на земскую службу выйшла 136 чалавек, а ў 1567 г. — ажно 421. Нагадаем, што ў 1563 г. з гэтага павета ў паспалітым рушэнні знаходзілася толькі 50 чалавек.

З іншага боку, з Керноўскай воласці ў 1563 г. сабралася 52 жаўнеры, а ў 1565 г. — толькі 24. Змяншэнне колькасці шляхціцаў назіралася і ў Гераньёнскай харугве — з 74 да 59 чалавек. Гэтыя лічбы, аднак, не могуць быць надзейным сведчаннем паспяховасці збораў у 1563 г., бо паспалітае рушэнне 1565 г. было, напэўна, самым няўдалым мерапрыемствам па мабілізацыі ўзброеных сіл ВКЛ падчас Інфлянцкай вайны і, безумоўна, не адлюстроўвала іх рэальны патэнцыял.

Чаму ж, нягледзячы на зробленыя на вальным сойме 1563 г. захады, збор належнага па колькасці шляхецкага войска зноў не быў рэалізаваны? У зімовы час шляхта непрыхільна глядзела на ваенную службу, бо ўтрыманне сябе і коней каштавала значна болей, чым улетку. Не спрыяла выхаду на службу і шматразовае адкладанне тэрміну збору на пазнейшы час. Тым самым улады не выказвалі вялікага жадання ваяваць, аддаючы перавагу дыпламатычным сродкам вырашэння канфлікту. Гэтымі дзеяннямі ідэя ваеннага рэваншу была, па сутнасці, скампраметавана і пахавана. Для шляхецкага грамадства ваенныя прыгатаванні пакрысе гублялі свой сэнс.

Перамога ў Ульскай бітве, у якой некалькі тысяч чалавек паспалітага рушэння, па ўсёй верагоднасці, прынялі непасрэдны ўдзел, паказала, што ў яго яшчэ ёсць моцны ваенны патэнцыял (гл. р. І, § 3).

У мэтах ажыццяўлення рэваншу ўлетку 1564 г. у ВКЛ зноў збіралася земскае апалчэнне. На жаль, «ваенных лістоў» аб яго скліканні не захавалася. Затое вядома, што ў вайсковы лагер планаваў прыехаць сам Жыгімонт Аўгуст. Аднак на пачатку жніўня 1564 г., атрымаўшы звесткі аб татарскай пагрозе для Валыні і Падолля, ён адмовіўся ад выезду ў ВКЛ[70]. Войска, якое ўжо паспела сабрацца, верагодна, было выкарыстана пры няўдалай аблозе Полацка ў верасні 1564 г.[71]

---

[70] Listy. S. 464–465.

[71] Вядома, што войска было распушчана па хатах 6 лістапада 1564 г.: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 261, арк. 96 адв. — 98.

Восенню 1564 г., калі маскоўцамі ажыццяўлялася аблога Азярышчаў, кіраўніцтва ВКЛ не знайшло іншага выйсця, як выдаць «ваенныя лісты» аб чарговым абвяшчэнні збору паспалітага рушэння на 25 лістапада 1564 г. у Менску. Гаспадар зноў звярнуўся да павятовыхураднікаў і шляхты з просьбай выставіць у войска драбаў паводле ўхвалы Віленскага сойма 1563 г. Ён тлумачыў, што ў новых варунках вайны пешае войска выконвае ўсё больш важную ролю, што менавіта дзякуючы драбам маскоўцы дасягаюць сваіх поспехаў. Безумоўна, на гэтае рашэнне паўплываў няўдалы вынік выправы пад Полацк. Шляхце гарантавалася, што гэта *«въ жадную пошлину вамъ не пойдеть и шкодити николи не будеть»*[72].

Склікаючы гэтае паспалітае рушэнне, гаспадар ставіў перад ім не толькі ваенныя мэты, але і палітычныя. Кіраўніцтва ВКЛ меркавала, паводле фармулёўкі крыніцы,ператварыць вайсковы лагер у *«зъездъ военъный»*. Прычынай такога рашэння была патрэба абмеркавання Бельскага прывілею і вызначэнне парадку яго ажыццяўлення (падрабязней гл. р. IV, § 2).

Форма «ваеннага з'езда» дазваляла забяспечыць патрэбы абароны і служыла своеасаблівай альтэрнатывай вальнага сойма — галоўнага прадстаўнічага інстытута ўлады ў ВКЛ. Пры скліканні паспалітага рушэння можна было спадзявацца на значную прадстаўнічасць шляхты. З іншага боку, наданне Бельскага прывілею 1564 г. і прапанова яго абмеркаваць магла паспрыяць больш актыўнаму прыбыццю шляхты ў войска.

Дэталёвых звестак пра ход гэтага мерапрыемства і яго рашэнні не захавалася[73]. Вядома, што яно сапраўды адбылося[74]. Аднак вельмі цяжка штосьці сказаць пра рэпрэзентатыўнасць шляхты на гэтым ваенным з'ездзе. Цалкам магчыма, што яна была нізкай.

Што датычыцца вайсковай мабілізацыі, то ў пазначаны тэрмін паспалітае рушэнне не сабралася. У сярэдзіне студзеня 1565 г. гаспадар з яўным песімізмам выказваў спадзяванне, што земскае войска ўсё ж такі

[72] РИБ. Т. 30. С. 776–781.

[73] Аб гэтым ускосна сведчыць ліст Жыгімонта Аўгуста ад 12 снежня 1564 г.: Listy. S. 475–479.

[74] 19 траўня 1565 г. Жыгімонт Аўгуст, звяртаючыся да радных паноў, згадваў «сойм» у Менску: РИБ. Т. 30. С. 805. У лісце Жыгімонта Аўгуста да Радзівілаў ад 17 студзеня 1565 г. гаворыцца аб тым, што з'езд у Менску яшчэ не сабраўся: Listy. S. 492–504. Гэта азначае, што дадзены з'езд адбываўся ў пачатку 1565 г., а не ў лістападзе 1564 г.

збярэцца. У якасці асноўнай абарончай сілы, якая будзе здольнай у выпадку небяспекі стрымаць націск ворага, разглядаўся ў гэты час польскі найманы кантынгент[75].

Аб парадку збору паспалітага рушэння ў 1565 г. мы ведаем няшмат. У недатаваных «ваенных лістах» гаспадар заклікаў да добраахвотнага і ўсеагульнага выхаду ў паспалітае рушэнне ўсіх слаёў грамадства, паведамляючы аб сваім жаданні выехаць у вайсковы лагер пасля заканчэння польскага сойма ў Пётркаве[76].

Вядома цікавае распараджэнне Жыгімонта Аўгуста, датаванае летам 1565 г., аб запрашэнні на ваенную службу рамеснікаў, путных баяр і сялян. Два селяніна павінны былі выстаўляцца з 20 валок, мець *«воз з двема клячами добрыми»*, рагаціну і сякеру, а таксама як дапаможныя сродкі — два сярпы і касу. Узбраенне путных баяр павінна было складацца з ручніцы, а таксама шаблі альбо мяча. Гаспадар загадаў мяшчанам выправіць на службу півавараў, пекараў, дойлідаў і кавалёў. Усе, хто выпраўляўся на ваенную службу, павінны былі быць забяспечаны неабходным правіянтам на паўгадавы тэрмін. Важна адзначыць, што прызыў у войска прадстаўнікоў непрывілеяваных станаў непасрэдна звязваўся з прыбыццём Жыгімонта Аўгуста[77].

Рашэнне гаспадара ўзначаліць войска і характар падрыхтоўчых мерапрыемстваў выразна адлюстроўваў, што ў 1565 г. Жыгімонт Аўгуст хацеў прыняць рашучыя меры ў змаганні з Маскоўскай дзяржавай. Гэты год павінен быў стаць пераломным у ходзе Інфлянцкай вайны[78].

Аднак рэалізацыі задум перашкодзілі эпідэмія чумы і старыя праблемы, звязаныя з камплектацыяй паспалітага рушэння, збор якога на гэты раз быў прызначаны пад Ракавам[79]. Сам Жыгімонт Аўгуст так і не выканаў абяцання ўзначаліць земскае войска[80]. Чым больш праходзіла

75 Listy. S. 485–487.
76 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 45, арк. 76 адв. — 78.
77 Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 147–149 прил.
78 Менавіта такім быў лейтматыў ліста Жыгімонта Аўгуста да М. Радзівіла Чорнага ад 1 траўня 1565 г.: Listy. S. 508–510.
79 Варта адзначыць, што збор у паспалітае рушэнне ў 1565 г. абвяшчаўся яшчэ адзін раз. Ён датычыўся тых шляхціцаў, якія не прыбылі ў вайсковы лагер у летні час. Для такіх збор быў прызначаны на 23 верасня 1565 г. у Трабах. На жаль, гэтую інфармацыю мы маем толькі з прыватнага ліста гаспадара да М. Радзівіла Рудога: Ibid. S. 518–519.
80 Намер гаспадара прыехаць у войска прасочваецца яшчэ ў сярэдзіне верасня 1565 г.: Ibid. S. 518–520.

часу, тым больш спадала энергія як у палітычнай эліты, так і ў шараговай шляхты.

Гэтую з'яву выдатна адлюстроўвае ход збору паспалітага рушэння ў 1565 г. Дзякуючы захаванаму попісу мы ведаем пра яго больш, чым пра папярэднія. Перапіс жаўнераў, якія прыбылі ў войска, працягваўся з 9 ліпеня да 15 кастрычніка 1565 г.[81]

Попіс 1565 г. дае цудоўную магчымасць прасачыць дынаміку збору шляхты (гл. графік). Паводле нашых падлікаў, найбольшая колькасць жаўнераў сабралася ў першыя дні абвешчанага тэрміну — 2 191 чалавек. Потым гэтая колькасць за акрэслены перыяд часу (у гэтай якасці была ўзята палова аднаго месяца) няўхільна змяншалася. Асноўная маса шляхты прыбыла ў першы месяц збору (прыкладна з 9 ліпеня па 15 жніўня) — 4 514 (68%) чалавек. Гэта было звязана з тым, што яшчэ захоўвалася магчымасць прыезду ў войска гаспадара. На графіку выразна адлюстравана, што ў другой палове верасня і ў кастрычніку 1565 г. прыбыццё шляхціцаў у войска скарацілася да зусім невялікай лічбы — 357 (5%) чалавек. На тэрмін прыбыцця, відавочна, уплывала таксама аддаленасць таго ці іншага павета ад прызначанага месца збору паспалітага рушэння. Так, шляхта з Падляшша ў сваёй большасці пачала прыбываць толькі ў жніўні 1565 г.

Шмат каштоўнай інфармацыі для роздумаў дае аналіз колькасці прыбылых жаўнераў з асобных паветаў. Лічба вайскоўцаў у павятовых харугвах складала 4 140 чалавек (51% ад усяго войска). Астатнюю частку склалі ўласныя почты буйных землеўладальнікаў, князёў і рознага кшталту ўраднікаў, а таксама харугвы татар. Як бачна, буйныя феадалы выстаўлялі амаль што палову войска, што сведчыць аб важным значэнні іх атрадаў у паспалітым рушэнні.

Што датычыцца асобных павятовых харугваў, то найбольшая колькасць жаўнераў прыбыла з паветаў Троцкага ваяводства — 2 382 чалавекі (57,5% ад колькасці жаўнераў усіх павятовых харугваў). З незразумелых прычын у іх лік уключана падляшская шляхта, якая склала ў войску 1 002 чалавекі (24,2%) — дастаткова вялікую лічбу ў параўнанні з іншымі харугвамі. Шляхта з Падляшша нават перавысіла па колькасці шляхту Віленскага ваяводства (яе прыбыло толькі 929 чалавек (22,4%)). Валынская зямля, Наваградскі і Кіеўскі паветы выставілі малую лічбу жаўне-

81 РИБ. Т. 33. С. 237–430.

раў — адпаведна 567 (13,7%), 226 (5,5%) і 36 (0,9%) чалавек. Усходнія землі ВКЛ і Жамойць увогуле не былі прадстаўлены ў попісе 1565 г. Верагодней за ўсё, харугвы з Жамойці меркавалася перакінуць у выпадку небяспекі ў Інфлянты, таму іх не запрасілі на збор пад Ракаў.

Попіс паспалітага рушэння ў 1565 г. занатаваў надзвычай нізкія зборы шляхты ў войска. Асноўнай прычынай такога стану рэчаў па-ранейшаму заставаўся брак неабходных сродкаў для выхаду на земскую службу. Безумоўна, фінансава-гаспадарчы крызіс, які ахапіў ВКЛ у 1564–1565 гг., непасрэдным чынам уплываў на ажыццяўленне ваенна-абарончых мерапрыемстваў. Немалое ўздзеянне на збор шляхты павінны былі таксама зрабіць звесткі пра эпідэмію чумы, якая распаўсюдзілася ў паўночна-ўсходніх раёнах ВКЛ у гэты час. Ужо гаварылася пра тое, што немалаважным чыннікам ігнаравання шляхтай сваіх земскіх абавязкаў з'яўлялася адсутнасць у войску гаспадара.

Табліца 2.1.2.

*Збор паспалітага рушэння ВКЛ у 1565 г.*
*(расклад па вайскова-тэрытарыяльных адзінках і перыядах прыбыцця)*

| Вайскова-тэрыт. адзінкі | Перыяды прыбыцця ў войска | | | | | | | УСЯГО |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 9–19.07 | 20–30.07 | 1–15.08 | 16–31.08 | 1–15.09 | 16–30.09 | 1–15.10 | |
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | |
| **Віленскае ваяводства** | | | | | | | | |
| **Харугвы:** | | | | | | | | |
| Ашмянская | 253 | 18 | 19 | 7 | 5 | 2 | | 304 |
| Крэўская | 56 | 8 | 2 | | | | | 66 |
| Медніцкая | 46 | 6 | 11 | | | | | 63 |
| Рудамінская | 40 | 31 | 7 | 11 | 12 | 5 | | 106 |
| Немежская | 4 | 16 | 18 | 5 | | | | 43 |
| Лідская | | | 6 | 52 | 3 | | 3 | 64 |
| Геранёнская | 43 | 3 | 8 | 3 | 2 | | | 59 |
| (Валожынская) | 1 | | 8 | | | | | 9 |
| Гедройцкая | 2 | 3 | 63 | 12 | | 1 | | 81 |

| **Вайскова-тэрыт. адзінкі** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **УСЯГО** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Няменчынская | | | 2 | | | | | 2 |
| Мейшагольская | | | 5 | 5 | | | | 10 |
| Вількамірская | 5 | 2 | 13 | | 5 | | | 25 |
| Кернаўская | 3 | | 8 | 2 | 2 | | 9 | 24 |
| Анікштаўская | 23 | | 4 | | | | 4 | 31 |
| Пунянская | 1 | | | 2 | 3 | 1 | | 7 |
| Карклеўская | 10 | 18 | 2 | 2 | | 3 | | 35 |
| **СУМА** | **487** | **105** | **176** | **101** | **32** | **9** | **16** | **929** |
| **Троцкае ваяводства** | | | | | | | | |
| **Харугвы:** | | | | | | | | |
| Берасцейская | 18 | 69 | 39 | 10 | | | | 136 |
| Кобрынская | 37 | 101 | 15 | 1 | | | | 154 |
| Пінская | 40 | 45 | 15 | 7 | 7 | | | 114 |
| Слонімская | 25 | 1 | 57 | 13 | 21 | | 6 | 123 |
| Ваўкавыская | 28 | 10 | 61 | 45 | 8 | | 14 | 166 |
| Васілішкаўская | 8 | 19 | 40 | 10 | 3 | 10 | 6 | 96 |
| Астрынская | 7 | | 5 | 17 | 3 | 2 | 1 | 35 |
| Конеўская | | | | | 12 | | | 12 |
| Радуньская | | | | 58 | | | | 58 |
| Эйшышкаўская | | 2 | 16 | 9 | 5 | 5 | | 37 |
| Троцкая | | | | | 1 | | | 1 |
| Сумілішкаўская | | 1 | | 1 | | 8 | | 10 |
| Ляпунская | | | | | 21 | | | 21 |
| Даўгоўская і Пералайская | | 1 | 6 | | | 37 | | 44 |
| Жыжморская | 2 | 1 | | | 5 | | | 8 |
| Высокадворская | | 2 | 9 | | | | 36 | 47 |
| Стоклішкаўская | 5 | | 1 | | | | | 6 |
| Аліцкая | | | 1 | 4 | | 2 | 25 | 32 |
| Дарсунішкаўская | | | | 1 | | | 3 | 4 |

| Вайскова-тэрыт. адзінкі | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | УСЯГО |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бірштанская | 2 | | | 1 | | | | 3 |
| Пераломскія баяры | | | 1 | | | | | 1 |
| Гарадзенская | 6 | 73 | 90 | 60 | 8 | | 16 | 253 |
| Уліцкая | | 1 | | 6 | 11 | 1 | | 19 |
| **Сума** | **178** | **326** | **356** | **243** | **105** | **65** | **107** | **1380** |
| **Падляшскае ваяводства** | **44** | **39** | **511** | **336** | **72** | | | **1002** |
| **Наваградскае ваяводства** | **44** | **7** | **7** | **19** | **117** | **9** | **23** | **226** |
| **Валынская зямля** | **402** | | | | **101** | **58** | **6** | **567** |
| **Кіеўскае ваяводства** | **36** | | | | | | | **36** |
| **Почты паноў-рад** | **12** | | | | **50** | | | **62** |
| **Почты маршалкаў, старастаў,ураднікаў** | **82** | **286** | | **71** | **42** | | | **481** |
| **Почты ўдоў паноў** | **412** | **60** | | | **106** | | | **578** |
| **Почты князёў** | **31** | | **94** | | **19** | | **34** | **178** |
| **Почты «панячых»** | **291** | **119** | **86** | **56** | **195** | **15** | | **762** |
| **Дворная харугва** | **116** | **20** | **43** | **28** | **16** | | **12** | **235** |
| **АГУЛЬНАЯ СУМА** | **2191** | **1024** | **1299** | **868** | **855** | **159** | **198** | **6594** |

**Заўвагі:**
1. Падлічваліся толькі коннікі.
2. Несупадзенне канчатковай лічбы нашых падлікаў з пазначанай у попісе выніковай сумай (РИБ. Т. 33. С. 430) можа вынікаць са шматразова ўказанага ў крыніцы факта, што шмат хто з магнатаў не прадставіў звестак аб колькасці сваіх почтаў.

*Табліца складзена паводле:* РИБ. Т. 33. С. 237–430.

Крыніцы пакінулі аб гэтым непасрэдныя сведчанні. Так, валынскія шляхціцы скардзіліся на вальным сойме 1565/1566 гг., што з іх маёнткаў да буйных землеўладальнікаў перабегла мноства сялян, з прычыны чаго яны не маюць магчымасці выконваць земскую службу і плаціць падаткі ў неабходных памерах. Шляхта скардзілася таксама, што князі і паны

скупілі на Валыні вялікую колькасць землеўладанняў і не выконвалі з іх ваенную павіннасць. Памеры змяншэння службы былі вельмі вялікімі: калі раней Валынская зямля выстаўляла чатыры харугвы, то цяпер не набіралася і адной![82]

Паводзіны гаспадарскай улады ў гэтай справе яскрава выявілі адсутнасць рычагоў уздзеяння на парушальнікаў права. Жыгімонт Аўгуст парэкамендаваў валынянам скласці рэестр парушэнняў і перадаць яго гетману. Такія меры, зразумела, не маглі прымусіць буйных землеўладальнікаў выстаўляць у войска належныя почты. Па сутнасці, гэта азначала адмаўленне ад вырашэння праблемы.

**Дынаміка прыбыцця жаўнераў на месца збору паспалітага рушэння ВКЛ у 1565 г.**




Маючы няўдалыя вынікі мабілізацыі ўзброеных сіл, улады ўжо не спрабавалі ўхваліць збор паспалітага рушэння на сабраным у Вільні ў канцы 1565 г. вальным сойме. Галоўная ўвага на ім была сканцэнтравана

[82] АЛРГ. Т. 2. С. 177.

на пошуку новых сродкаў для вядзення вайны і іншых аспектах арганізацыі абароны.

Аднак некаторыя моманты ў працы сойма непасрэдна закранулі праблемы, звязаныя з арганізацыяй земскага войска. Соймавыя станы прасілі пра абавязковае і неадкладнае пакаранне тых, хто ігнараваў ваенную службу: *«Абы за некарностью у большую недбалость и сплошенство не приходили»*[83]. Уносілася канкрэтная прапанова ўвесці пасаду «інстыгатара» для выяўлення тых, хто ўхіляўся ад службы. Адначасова шляхта прасіла змякчыць пакаранне — замест канфіскацыі маёмасці даць шанец адкупіцца ад кожнага прапушчанага збору паспалітага рушэння (узяўшы за пункт адліку 1563 г.) пяццю копамі літоўскіх грошаў[84].

Увогуле, уражвае абгрунтаванасць просьбаў шляхты, яе жаданне рацыяналізаваць вайсковую службу. Сімптаматычнай з'явай была «просьба» аб правядзенні рэвізіі ўсіх без выключэння землеўладанняў (у тым ліку і духоўных) «на земскім праве» дзеля вызначэння дакладных памераў службы. Усім было зразумела, што дадзеныя далёкага 1528 г. з'яўляліся састарэлымі. Аднак гаспадар не пагадзіўся з гэтай прапановай, перанёсшы яе выкананне на пасляваенны час.

Гэтае рашэнне, безумоўна, улічвала інтарэсы буйных землеўладальнікаў, якім надзвычай нявыгадна было перапісваць свае маёнткі. Гэта становіцца відавочным, калі ўлічыць, што ў соймавай «просьбе» змяшчалася прапанова канфіскацыі схаваных маёнткаў[85].

У красавіку 1566 г. чуткі аб падрыхтоўцы маскоўцаў да ваеннай выправы прымусілі Жыгімонта Аўгуста прызначыць чарговы збор паспалітага рушэння на 9 чэрвеня 1566 г. у Друцку. Гэтым рашэннем гаспадар часткова абышоў артыкул новага Статута, паводле якога збор войска павінен быць ухвалены вальным соймам. Жыгімонт Аўгуст спаслаўся на ўхвалу сойма 1563 г., на факт незавершанасці вайны і ў рэшце рэшт патлумачыў, што ад аператыўнага вырашэння праблем абароны залежыць лёс саміх шляхціцаў, іх сямей і маёмасці[86].

83 РИБ. Т. 30. С. 352.

84 Тамсама. С. 351–353. Гэтая мера, аднак, не спрацавала. Шляхта ў сваёй большасці ўхілілася ад выплаты такой кампенсацыі. На Гарадзенскім сойме 1566/1567 гг. улады канстатавалі, што *«тая уфала и выполненье свое до сихъ местъ не пришла»* (Тамсама. С. 423–424).

85 Тамсама. С. 353–355.

86 Тамсама. С. 853–855.

Правядзенне шырокамаштабных унутраных рэформ не змяніла стаўлення шляхты да збораў земскага апалчэння. Напрыканцы чэрвеня 1566 г. у Вільні адзначалі, што шляхціцы *«лениво ся на войну выправують»*[87]. Сітуацыя не змянілася і праз месяц. Як паведамляў найвышэйшы гетман Р. Хадкевіч, *«обыватели того Великого Князьства Литовского неборздо до мене у воиско зъеждчаються»*[88].

З іншага боку, відавочна, што збору войска не надавалася належнай ўвагі. Скліканне паспалітага рушэння было ўсяго толькі пасіўна-абарончай рэакцыяй на чуткі аб падрыхтоўцы непрыяцеля да нападзення. У гэты час у Маскву было адпраўлена пасольства, што дазваляла спадзявацца на захаванне міру.

Пад прыкрыццём мірных перамоў маскоўцы ўзяліся замацоўваць свае пазіцыі на акупаванай тэрыторыі паўночна-ўсходняй Беларусі. Яны будавалі ўздоўж лініі супрацьстаяння з літвінамі невялікія замкі, якія павінны былі стаць умацаванымі пунктамі апоры маскоўскай улады на прылеглых да Полацка і Віцебска землях.

Актывізацыя маскоўцаў прывяла да роспуску ў жніўні 1566 г. Берасцейскага сойма. Напрыканцы сваёй працы сойм акрэсліў надзвычайныя варункі ваеннай службы. Да выхаду ў паспалітае рушэнне заклікаліся ўсе ахвотныя жыхары ВКЛ, без увагі на станавую прыналежнасць. Ім, а таксама шляхціцам, якія выставяць дадатковых жаўнераў у свае почты, абяцалася асаблівае стаўленне гаспадара і заплата па стаўцы 5 коп грошаў за конніка[89].

Не чакаючы бурлівага водгуку на свае заклікі, улады ВКЛ прадпісвалі выйсці на ваенную службу ўсімураднікам (старастам) і ляснічым, прытым выставіць почты не толькі са сваіх земскіх маёнткаў, але і з зямель, якія знаходзіліся ў службовым распараджэнні. Земскай павіннасці без усялякіх абмежаванняў падлягалі таксама землеўладальнікі-іншаземцы і гаспадарскія дваране. Пакараннем за нявыход на

87 АЮЗР. Т. 1. С. 157–159.
88 BKórn. Rkps. 1536. K. 205–208.
89 Гэтае рашэнне беларускі даследчык Юры Бохан палічыў доказам паступовага пашырэння найманых прынцыпаў службы ў паспалітым рушэнні: Б о х а н Ю. Наёмнае войска ў Вялікім княстве Літоўскім у XV–XVI стст. Мн., 2004. С. 23–24. На нашу думку, ніякіх пэўных падстаў для такой трактоўкі няма. Заможная шляхта папросту заклікалася за адпаведную плату да выстаўлення дадатковых жаўнераў, што павялічыла б агульную колькасць войска. Нельга блытаць падобныя элементы вярбунку з прафесійнай найманай службай.

службу вызначалася канфіскацыя маёнткаў, нават калі імі валодалі жонкі ці ўдовы[90].

Шляхта і на гэты раз не змяніла сваіх паводзін, масава праігнараваўшы заклікі ўлады. 18 жніўня 1566 г. пасля атрымання інфармацыі аб гэтым ад найвышэйшага гетмана ВКЛ Жыгімонт Аўгуст з жалем канстатаваў, што *«до сих часов никого з станов рыцерских ку Вашей Милости у войско ся не зъехало, и не было с ким часу потребы неприятелю оттору чинити»*[91]. Як толькі да кіраўніцтва дайшлі весткі аб выездзе ў ВКЛ маскоўскіх паслоў, у канцы жніўня 1566 г. па рашэнні Р. Хадкевіча нешматлікае войска было распушчана па хатах[92].

Маскоўцы пасля пабудовы замка Усвят не толькі не спыніліся, а наадварот, яшчэ шырэй разгарнулі будаўніцтва замкаў на акупаванай тэрыторыі. Такі ход падзей стаў поўнай нечаканасцю для кіраўніцтва ВКЛ. У жніўні — кастрычніку 1566 г. яно прыняло шэраг контрмер з прыцягненнем мясцовых сіл. Бачачы іх малую эфектыўнасць, у Вільні вырашылі склікаць у снежні 1566 г. чарговы вальны сойм *«для обмышлеванья обороны скутечное и валки потужное»*[93].

Ход і вынікі працы гэтага сойма засведчылі імкненне мабілізаваць мілітарны патэнцыял Княства ў максімальнай ступені. Падставай для гэтага стала заява Жыгімонта Аўгуста пра сваё рашэнне ўзначаліць войска ВКЛ. Яна была зроблена ў адказ на просьбы *«всих станов, сойму належачих»*[94].

Гаспадарскае рашэнне зрабіла прамое ўздзеянне на характар соймавых пастаноў, прысвечаных падрыхтоўцы ваенных мерапрыемстваў. Можна не сумнявацца, што катэгарычнасць іх палажэнняў вынікала з упэўненасці ў паспяховасці ваеннай кампаніі, узначаленай гаспадаром.

Важна адзначыць, што ўдзельнікі сойма выставілі два абавязковыя патрабаванні для выканання соймавых рашэнняў: у войску павінен знаходзіцца гаспадар і павінны весціся толькі актыўныя ваенныя дзеянні на тэрыторыі непрыяцеля[95]. Неабходна звярнуць таксама ўвагу на

---

90 РИБ. Т. 30. С. 401–402.
91 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 32–33 адв.
92 Тамсама. Арк. 73 адв. — 74 адв.
93 РИБ. Т. 30. С. 406–408. Гл. таксама: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 112 адв. — 113, 120 адв. — 121 адв.
94 РИБ. Т. 30. С. 409–410.
95 Тамсама.

словы гаспадара, у якіх ён засведчыў сваё абяцанне на працягу двух бліжэйшых гадоў прысвяціць усю ўвагу ваенным справам: *«А мы, господаръ, в тыхъ двухъ годехъ не маемъ ихъ* (г. зн. соймавыя станы) *ни до чого иного вести, ани взывати, одной войне потужной з неприятелемъ досыть чинити»*[96].

Што ж змяшчалі ў сабе рашэнні Гарадзенскага сойма 1566/1567 гг.? Як і ў 1563 г., быў ухвалены збор не толькі конных жаўнераў, але і драбаў. Яны збіраліся выключна *«до битвы и ку штурму и до потреб шанцовых»*, г. зн. для правядзення аблогавых дзеянняў. Адзін драб павінен быў выпраўляцца з кожных 20 валок альбо 40 дымоў. З іх кожныя два павінны былі быць узброены ручніцамі, а кожны трэці — рагацінай і сякерай. «Убогая» шляхта ад выстаўлення драбаў вызвалялася[97].

Адзін коннік павінен быў выстаўляцца з кожных 10 валок альбо 20 «дымоў». Узорны воін павінен быў выглядаць наступным чынам: *«Пахолокъ добрый, збройный, шляхтичъ цветный, а конь за копъ десеть, а з живностью возъ одинъ, двема конми особливыми, кромъ почтового коня, прикрытый сукномъ черленымъ, также и возница; а при возе маеть мети рыдль железны, мотыку, сокиру, рогатину»*[98]. Звернем увагу на надзвычай высокі кошт каня. У параўнанні з 1563 г. ён вырас ажно на чатыры копы грошаў.

У дачыненні да службы дробных шляхціцаў сойм істотна парушыў стары парадак. Звычайна «ўбогая» шляхта практыкавала выпраўленне ў войска аднаго прадстаўніка з 10 «службаў» («дымоў» і г. д.). На сойме 1566/1567 гг. у якасці аднаразовай меры ўсім дробным шляхціцам прадпісвалася *«не смотрети чергъ своихъ звыклыхъ»* і прыбыць на месца збору паспалітага рушэння асабіста з рыштункам, які дазвалялі ім фінансавыя магчымасці[99]. У асобным артыкуле такія ж варункі вызначаліся для падляшскай шляхты, дзе колькасць «убогіх» прадстаўнікоў прывілеяванага стану была асабліва вялікай.

Гэтыя прынцыпы земскай службы (нагадаем, што яны разыходзіліся са статутнымі нормамі) павінны былі дзейнічаць на працягу двух бліжэйшых гадоў.

---

96 Тамсама. С. 415–416.
97 Тамсама.
98 Тамсама. С. 412.
99 Тамсама. С. 411–412.

Пакаранне за нявыхад шляхціцаў у войска вызначалася згодна са Статутам, г. зн. парушальнікаў закону чакала канфіскацыя маёнткаў[100]. Акрамя таго, упершыню прывілеяваны стан папярэджваўся пра магчымасць пазбаўлення права карыстацца шляхецкімі «вольнасцямі»[101].

Гаспадар таксама паведаміў пра сваё распараджэнне прыцягваць да судовай адказнасці тых, хто не заплаціў па 5 коп грошаў за мінулыя нявыхады на службу[102]. Такім чынам, улады зноў дэкларавалі зварот да тых пагрозлівых мер, якія ўпісваліся ў соймавыя пастановы з 1563 г.

Упершыню ў фарміраванні земскага войска павінна было прыняць удзел насельніцтва прыватнаўласніцкіх гарадоў. З кожных 10 «дымоў» прадпісвалася выставіць аднаго пешага жаўнера з ручніцай і мячом. На трох такіх драбаў мяшчанам трэба было сабраць і адправіць у войска адзін воз з правіянтам, дадатковым узбраеннем (рагаціна, сякера) і інструментам, неабходным для аблогавых аперацый. З гарадоў, якія *«на волях седять»*, земская служба павінна была ажыццяўляцца ў адпаведнасці з агульнымі правіламі[103].

Царкоўныя ўладанні ў вайсковай мабілізацыі не ўдзельнічалі. Як і раней, ваенная служба павінна была несціся толькі з прыватных маёнткаў духоўных асоб. Гаспадар рэкамендаваў іерархам разгледзець магчымасць выпраўлення ў войска жаўнерскіх почтаў *«заровно со всими станы светскими водлуг теперешнее уфалы соймовое»*[104].

У вайсковы лагер абавязаны былі прыбыць усе галоўныя ўраднікі з рэгіёнаў, гаспадарскія дваране, якія не задзейнічаны на дворскай службе, ляснічыя і рэвізоры з гаспадарскіх уладанняў, а таксама дарослыя цыгане. У паветах заставаліся толькі тры «возныя», прытым гэта маглі быць выключна шляхціцы, якія выстаўлялі ў войска па адным конніку. Асабліва падкрэслівалася, што земскай службе падлягаюць усе маёнткі, якія належаць жонкам, удовам і іншаземцам. У войска чарговы раз запрашаліся ўсе ахвотныя *«якого колвекъ стану»*[105]. У прынцыпе, гэтыя

---

100 Адзначым, што ў 1568 г. улады зноў пайшлі на саступку шляхце, замяніўшы пакаранне па Статуту грашовай кампенсацыяй. Гл.: АВАК. Т. 2: Акты Брестского земского суда. Вильна, 1867. С. 133–135.

101 РИО. Т. 30. С. 412, 428.

102 Тамсама. С. 423–424.

103 Тамсама. С. 414.

104 Тамсама. С. 424–425.

105 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 152 адв. — 155 адв.; РИО. Т. 30. С. 414.

прадпісанні паўтаралі ўхвалы папярэдніх соймаў, у якіх таксама прымаліся надзвычайныя захады для павелічэння войска.

Дата і месца вайсковай мабілізацыі на самім сойме не вызначаліся. Агаворвалася, што ў выпадку надзвычайнай патрэбы шляхта павінна быць гатова ў любы момант выступіць у паспалітае рушэнне[106]. Варта, на нашу думку, дадаць, што планы па зборы войска існавалі ўжо ў запрашэннях на вальны сойм ад 5 лістапада 1566 г. У іх было сказана, што ў выпадку пільнай патрэбы павятовая шляхта павінна выехаць у войска адразу пасля сканчэння соймавых пасяджэнняў[107].

Такім чынам, Гарадзенскі сойм 1566/1567 гг. ухваліў надзвычайныя меры па арганізацыі паспалітага рушэння. Яго рашэнні засведчылі гатоўнасць шляхты весці наступальную пераможную вайну і ахвяраваць дзеля гэтага патрэбныя сродкі. Варта адзначыць, што гэта было першае пасля 1563 г. ухваленне вальным соймам збору шляхецкага апалчэння.

У красавіку 1567 г. было прынята канчатковае рашэнне аб зборы паспалітага рушэння 17 траўня 1567 г. у раёне Маладзечна. У разасланых па паветах «ваенных лістах» яно абгрунтоўвалася ў першую чаргу працягам будаўніцтва маскоўскіх замкаў на Полаччыне, а таксама адсутнасцю пасольства з Масковіі[108].

Маскоўскія паслы, аднак, неўзабаве прыехалі. Распачатыя перамовы перапынілі на некаторы час мабілізацыю ўзброеных сіл. Кіраўніцтва ВКЛ хутка зразумела, што маскоўцы проста зацягваюць час, і аднавіла падрыхтоўчыя мерапрыемствы да ваеннай кампаніі.

Збор войска з самага пачатку меў павольны характар. Гэта было звязана ў першую чаргу з адсутнасцю гаспадара. Найвышэйшы гетман Р. Хадкевіч, указваючы на гэтую прычыну, пісаў, што *«не был на пописе нихто, одно толко з горсть калекъ приехало, и тые ся зась по от[ъ]еханью моемъ здеся до короля Его Милости проч роз[ъ]ехали»*[109]. У сярэдзіне ліпеня 1567 г. улады былі вымушаны прызнаць, што ў вайсковы лагер *«людей велми мало прыбыло, а з иных поветов нихто не*

106 РИО. Т. 30. С. 435–436.
107 Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 182–184 прил.
108 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 161–164.
109 AS. T. 7. S. 179.

*приехал»*[110]. З дзяржаўнай канцылярыі выдаваліся паўторныя лісты з заклікам збірацца ў войска, *«днем и ночъю яко на кгвалт поспешаючися»*[111].

Як выконвалася гэтае распараджэнне, можна ўбачыць па падліках прыбыцця жаўнераў (гл. табл. 2.1.3 і адпаведны графік). За лета 1567 г. пад Маладзечна прыбылі нешматлікія жаўнеры толькі з бліжэйшых паветаў — Віленскага, Менскага і Ашмянскага, а таксама татарскія харугвы, якія заўсёды вызначаліся найбольшай аператыўнасцю пры вайсковых зборах. З найвышэйшых ураднікаў свае почты ў канцы чэрвеня 1567 г. выставілі толькі найвышэйшы гетман Р. Хадкевіч і берасцейскі ваявода Ю. Тышкевіч.

Магнаты да канца чакалі выезду ў войска гаспадара, маючы пры гэтым права спаслацца на соймавую пастанову аб абавязковасці яго ўдзелу ў ваеннай выправе[112]. І сапраўды, інтэнсіўнае прыбыццё почтаў радных паноў пачалося толькі з 18 верасня 1567 г., калі гаспадар рушыў у вайсковы лагер. Ён прыбыў пад Маладзечна ў кастрычніку 1567 г.[113] Асноўная маса шляхціцаў таксама з'ехалася ў войска толькі ў другой палове верасня — кастрычніку 1567 г. Магчыма, немалаважнай падставай для масавага прыезду было заканчэнне цыклу сельскагаспадарчых работ, пасля якіх шляхта магла спакойна пакінуць маёнткі і заплаціць падаткі са сродкаў, атрыманых ад збыту прадукцыі.

Найбольшая колькасць жаўнераў прыбыла з паветаў Падляшскага ваяводства — 7 320 коннікаў. Вялікая група была выстаўлена ад Жамойцкай зямлі — 2 887 чалавек. Іх перапіс, дарэчы, праводзіў не польны пісар, а служэбнік Я. Хадкевіча Р. Барэйша, што сведчыць аб асаблівым становішчы жамойцкіх почтаў у паспалітым рушэнні. Цалкам верагодна, што гэтыя почты засталіся на месцы для выкарыстання ў выпадку нападу маскоўцаў на Інфлянты. Астатнія паветы выставілі жаўнераў у колькасці 400–800 коннікаў. Слаба была прадстаўлена Валынь — усяго толькі 697 коннікаў. Паводле падлікаў Г. Лаўмяньскага, з Валыні не прыехала не

110 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 166 адв. — 167.

111 Тамсама. Аб малой колькасці вайскоўцаў у паспалітым рушэнні ў гэты ж час Жыгімонт Аўгуст пісаў М. Радзівілу Рудому: Listy. S. 533–534.

112 Добрым прыкладам могуць служыць паводзіны М. Радзівіла Рудога, які толькі пасля ўпэўнівання гаспадара ў сваім прыездзе ў войска пачаў адпраўляць жаўнерскія почты: Listy. S. 533–535.

113 Piwarski K. Niedoszła wyprawa... R. 5. Z. 14. S. 98–99.

менш за 37% шляхціцаў[114]. Адсутнічалі жаўнеры з Полацкага і Мсціслаўскага ваяводстваў і Віцебскага павета. Гэта было абумоўлена памежным становішчам гэтых рэгіёнаў і вялікімі стратамі, панесенымі іх насельніцтвам за час вайны. Акрамя таго, памежжа патрабавала баяздольных людзей для абароны. З Аршанскага павета, напрыклад, у паспалітае рушэнне прыбыло толькі 7 чалавек, а астатняя шляхта, як сказана ў тэксце попісу, засталася служыць пры аршанскім замку[115].

Доля почтаў магнатаў і цэнтральныхураднікаў (у іх лік уключаліся радныя паны, гаспадарскія ўраднікі, канцылярскія супрацоўнікі, князі, паны і дваране) у складзе войска была досыць вялікай — 9 320 коннікаў (34% ад колькасці ўсяго паспалітага рушэння). У параўнанні з перапісам 1528 г. доля магнацкіх почтаў у працэнтных адносінах зменшылася, нягледзячы на рост у абсалютных лічбах[116]. Магчыма, прычынай гэтага было ўкрыванне магнатамі сапраўдных памераў сваіх зямельных уладанняў. Найбольш заможныя магнаты ўвогуле не падалі польнаму пісару іх рэестра. Замест гэтага яны давалі вусную інфармацыю пра памеры земскай службы са сваіх маёнткаў. Так зрабілі М. Радзівіл Руды, Я. Хадкевіч, М. Кішка і некаторыя менш заўважныя асобы.

Шмат хто з буйных і сярэдніх землеўладальнікаў выставіў па ўласнай ініцыятыве *«на ласку господарскую»* дадатковых жаўнераў. Гаспадар абяцаў у будучыні заплаціць за іх адпаведны кошт. Усяго такіх вайскоўцаў налічвалася 1 455 коннікаў, што складала прыблізна 15% ад агульнай колькасці. Яны хутка вярнуліся дамоў — іх прозвішчы рэдка сустракаюцца ў складзеным на пачатку 1568 г. другім пераліку жаўнераў (г. зв. «другім выкліку»)[117].

Агульная колькасць паспалітага рушэння ВКЛ, што сабралася пад Маладзечнам напрыканцы восені 1567 г., складала прыкладна 28–30 ты-

---

114 Łowmiański H. Zaludnienie państwa litewskiego... S. 47–48.

115 РИБ. Т. 33. С. 732–733.

116 Паводле падлікаў беларускага гісторыка Валерыя Мянжынскага, буйныя землеўладальнікі і цэнтральныя ўраднікі выставілі ў 1528 г. 7 845 коннікаў (40%): Менжинский В. Структура феодального землевладения в Великом Княжестве Литовском (По материалам Переписи войска 1528 г.) // История СССР. 1987. N 3. С. 168.

117 На сойме 1568 г. было пастаўлена пытанне пра ўзнагароджанне тых, хто выставіў дадатковыя почты. Гаспадар адклаў вырашэнне гэтай справы на будучыню: РИБ. Т. 30. С. 471.

сяч конных і пешых жаўнераў (па нашых падліках — 27 597 коннікаў)[118]. У вайсковым лагеры знаходзілася каля 100 гармат living рознага калібру.

Гэта быў найбольшы збор паспалітага рушэння не толькі за часы Інфлянцкай вайны, але і ўвогуле за ўсё XVI ст. Цікава параўнаць гэтыя лічбы з інфармацыяй, пададзенай у рэляцыі папскага нунцыя Ю. Руджэры. Ён пісаў, што максімальны патэнцыял паспалітага рушэння ВКЛ складаў 70 тысяч чалавек, але ў рэчаіснасці можа сабрацца не больш за 40 тысяч чалавек. У Польшчы, па яго словах, гэтыя лічбы складалі адпаведна 100 і 50 тысяч чалавек[119].

Табліца 2.1.3.

*Збор паспалітага рушэння ВКЛ у 1567 г.*
*(расклад па вайскова-тэрытарыяльных адзінках*
*і па перыядах прыбыцця)*

| Вайскова-тэрыт. адзінкі | Перыяды прыбыцця ў войска | | | | | | | | | | Усяго | Усяго ў попісе[1] |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 28.06–15.07 | 16.07–30.07 | 1.08–15.08 | 16.08–31.08 | 1.09–15.09 | 16.09–30.09 | 1.10–15.10 | 16.10–31.10 | 1.11–15.11 | пасля 16.11 | | |
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | | |
| **Віленскае ваяводства** | | | | | | | | | | | | |
| Віленскі павет | 7 | 5 | 1 | 50 | 2 | 156 | 198 | 38 | 33 | - | *490* | *508* |
| Браслаўскі павет | - | - | - | - | - | 65 | 5 | 1 | - | 6 | *77* | *-81* |
| Ашмянскі павет | 13 | 167 | 34 | 99 | 3 | 85 | 196 | 36 | - | 4 | *637* | |
| Вількамірскі павет | - | - | - | - | - | 49 | 65 | 451 | - | 56 | *621* | *653* |
| Лідскі павет | - | - | - | - | - | 94 | 589 | 60 | 37 | 19 | *799* | *-800* |

118 К. Піварскі пасля супастаўлення розных крыніц (ён, аднак, не зрабіў падлікаў па попісе паспалітага рушэння) прыняў лічбу не болей за 30 тысяч чалавек: P i w a r s k i K. Niedoszła wyprawa... R. 5. Z. 14. S. 103. Паводле інфармацыі каралеўскага лажнічага Л. Ленцкага, найвышэйшы гетман ВКЛ зарэгістраваў 30 тысяч чалавек. Пры гэтым пры Жыгімонце Аўгусце павінны былі застацца 12 тысяч чалавек. С. Бодняк няслушна падлічыў колькасць жаўнераў і вывеў з гэтага агульную лічбу ў 42 тысячы чалавек: B o d n i a k S. Z wyprawy radoszkowickiej na Moskwę w roku 1567–1568 // Ateneum Wileńskie. 1930. R. 7. Z. 3–4. S. 800, 803.

119 Relacje nuncjuszów apostolskich... T. 1. S. 199.

| Вайскова-тэрыт. адзінкі | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго | Усяго ў попісе[1] |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Троцкае ваяводства** | | | | | | | | | | | | |
| Троцкі павет | - | - | - | - | 10 | 2 | 518 | 48 | - | 12 | *590* | *614* |
| Гарадзенскі павет | - | - | - | - | 12 | 196 | 356 | 97 | - | 30 | *691* | *714* |
| Ковенскі павет | - | - | - | - | 2 | 19 | 175 | 113 | 385 | - | *694* | *694* |
| Упіцкі павет | - | - | - | - | - | 233 | 89 | 25 | - | - | *347* | *358* |
| Наваградскі павет | - | - | - | 2 | 9 | 117 | 290 | 17 | 1 | 14 | *450* | *465* |
| Слонімскі павет | 5 | - | 14 | - | 2 | 20 | 184 | 10 | 6 | 8 | *249* | *275* |
| Ваўкавыскі павет | 2 | - | - | - | - | 17 | 278 | 31 | 17 | - | *345* | *357* |
| **Берасцейскае ваяводства** | | | | | | | | | | | | |
| Берасцейскі павет | 6 | 3 | 6 | - | - | 216 | 142 | 39 | - | 9 | *421* | *420* |
| Пінскі павет | - | - | - | - | 113 | 21 | 49 | 25 | 6 | 20 | *234* | *234* |
| **Менскае ваяводства** | | | | | | | | | | | | |
| Менскі павет | 57 | 13 | 22 | 16 | - | 43 | 59 | 13 | - | 5 | *228* | *221* |
| Рэчыцкі павет | - | - | 20 | 5 | 9 | 10 | - | - | - | - | *44* | *44* |
| Мазырскі павет | - | - | - | - | - | 4 | - | 1 | 15 | 6 | *26* | *24* |
| **Віцебскае ваяводства** | | | | | | | | | | | | |
| Аршанскі павет | - | - | - | - | - | 3 | - | 4 | - | - | *7*[2] | *7* |
| **Падляшскае ваяводства** | | | | | | | | | | | | |
| Драгічынскі павет | - | - | - | - | - | 33 | - | 3719 | - | - | *3752* | *-3752* |
| Бельскі павет | - | - | - | - | - | 28 | 3494 | 44 | - | 2 | *3568* | *-3568* |
| *Жамойцкае староства* | - | - | - | - | - | - | 2887 | - | - | - | *2887*[3] | *-2887* |
| *Валынская зямля* | - | - | - | - | - | 604 | 51 | - | - | 42 | *697* | *-697* |
| *Почты радных паноў* | 469 | - | - | - | - | 229 | 657 | 2606 | 220 | 709 | *4890* | *4890* |
| *Почты цэнтральныхураднікаў* | 75 | 27 | - | - | 30 | 30 | 253 | 620 | 160 | 6 | *1201* | *880* |

| **Вайскова-тэрыт. адзінкі** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **Усяго** | **Усяго ў попісе[1]** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| *Почты князёў* | - | - | - | 30 | - | 599 | 264 | 187 | 192 | 3 | *1275*[4] | *1162* |
| *Почты паноў* | 33 | - | 8 | - | 49 | 95 | 422 | 379 | 181 | 71 | *1238* | *1243* |
| *Почты дваран* | - | - | - | - | - | 107 | 240 | 106 | - | 2 | *455*[5] | *416* |
| *Дворная харугва* | 10 | 51 | - | 2 | - | 67 | 66 | 1 | 30 | - | *227* | *232* |
| *Почты татар* | - | 236 | 81 | 105 | 16 | 1 | 1 | 9 | - | 8 | *457*[6] | *-495* |
| **АГУЛЬНАЯ СУМА** | **677** | **502** | **186** | **309** | **257** | **3143** | **11528** | **8680** | **1283** | **1032** | **27597** | |

**Заўвагі:**

* Падлічваліся толькі коннікі.

[1] У дужках пазначаныя дадзеныя па «Сумарыюшы», змешчаным у канцы попісу войска: РИБ. Т. 33. С. 1374–1378.

[2] Астатняя аршанская шляхта засталася ў Аршанскім замку.

[3] У спісе жамойцкай шляхты пазначана толькі дата пачатку перапісу.

[4] У лік агульнай сумы почтаў князёў уключаны почты князёў Друцкіх і Лукомскіх.

[5] У лік почтаў дваран уключаны почты, выстаўленыя тымі дваранамі, якія падчас паспалітага рушэння служылі пры двары.

[6] Заканчэнне попісу почтаў татар не захавалася.

*Табліца складзена паводле:* РИБ. Т. 33. С. 537–1378.

Як бачна, мабілізацыйныя і арганізацыйныя высілкі дзяржаўных структур улады ВКЛ у 1567 г. прынеслі свой плён. Нельга казаць, што шляхта не выконвала соймавых пастаноў і гаспадарскіх распараджэнняў, якія датычыліся збору земскага войска. Штрафныя санкцыі, пра якія папярэджвала кіраўніцтва краіны, былі для дробнай і сярэдняй шляхты рэальнай пагрозай. У Радашковічах радныя паны па ўзгадненні з гаспадаром выдалі пастанову, паводле якой на месцах павінны былі распачацца «ўвязанні» ў маёнткі[120]. У снежні 1567 г. гаспадарскія дваране прыступілі да іх канфіскацыі: «*...Господар росказал тым посланъцом, которые в поветы посланы, увязывать ся в ыменя таковых всих, кого дома зостануть*»[121]. Да таго ж не будзем забываць, што менавіта ў 1567 г.

[120] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 216–216 адв.

[121] Тамсама. Арк. 255 адв. — 257, 236 адв. — 237 адв. Гл. таксама гаспадарскія лісты аб распачынанні «ўвязанняў» за нявыплату падаткаў, якія былі разасланы ў заходнія і цэнтральныя паветы ВКЛ у канцы лютага 1568 г.: LM. Kn. 531. P. 71–73.

кіраўніцтва дзяржавы асаблівую ўвагу звярнула на збор дробнай шляхты[122]. Відавочна, менавіта з гэтай прычыны найбольшая колькасць шляхціцаў сабралася з Падляшша і Жамойці, дзе пераважала дробнае землеўладанне[123].

**Дынаміка прыбыцця жаўнераў на месца збору паспалітага рушэння ВКЛ у 1567 г.**




122 Łowmiański H. Zaludnienie państwa litewskiego... S. 50–51.
123 Менжинский В. Структура... С. 174–178.

На жаль, сабранае войска нічым сябе не праявіла ў ваенных дзеяннях. Далей намі будзе абгрунтавана, што прынамсі восенню 1567 г. планы гаспадарскай улады змяніліся і паспалітае рушэнне ў гэты час збіралася не столькі дзеля выканання ваенных задач, колькі для ажыццяўлення пэўных задум унутрыпалітычнага характару. Не трэба забываць і аб версіі, выказанай у хроніцы М. Бельскага, што Жыгімонту Аўгусту гатовае да дзеяння войска было патрэбна для патэнцыяльнай дапамогі апазіцыйным сілам у Маскве, якія рыхтавалі дзяржаўны пераварот[124].

У канцы студзеня 1568 г. гаспадарская ўлада канстатавала, што большая частка шляхты самавольна раз'ехалася па хатах[125]. Перад гэтым яна выпраўляла да гаспадара свайго пасланца І. Есмана з просьбай распусціць рушэнне з прычыны халоднага надвор'я і недахопу правіянту. Шляхта таксама скардзілася, што *«несколько сот особ людей зацъных и можных з немалыми почты у войску пры пану гетману не были и тепер их нет»*[126].

У сваю чаргу, менскі ваявода Гаўрыла Гарнастай даносіў, што шляхта не хоча ісці пад непрыяцельскія замкі, працягваючы самавольна раз'язджацца. Адпраўлены ў Браслаў вайсковы атрад разбегся, не дайшоўшы да месца прызначэння. У выніку маскоўцы без перашкод здзейснілі напад на браслаўскую акругу. Самавольна раз'ехаліся і польскія жаўнеры. Радныя паны прасілі вярнуць хаця б тысячу чалавек з іх. Паводле інфармацыі Г. Гарнастая, усяго ў вайсковым лагеры засталося толькі каля ста чалавек знатнейшай шляхты[127].

Бачачы такое становішча, гаспадар даў дазвол найвышэйшаму гетману распусціць паспалітае рушэнне, папярэдне абмеркаваўшы праблему забеспячэння аховы памежных зямель[128].

Аднак адносна самавольнага ад'езду з вайсковага лагера пазіцыя гаспадара была бескампраміснай. Задавольваючы просьбу шляхты, ён падкрэсліў, што *«без роспущенья от пана гетмана нихто з войны зъехати не мог и не можеть»*[129]. У паветы былі пасланы лісты з прадпісаннем скласці спецыяльныя рэестры тых, хто не выехаў на земскую службу

---

124 Bielski M. Kronika. T. 2. S. 1157–1158. Гл. таксама р. I, § 4.

125 *«...Естъ малость войска про своводьное роз[ъ]еханье»* (НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 255 адв. — 257). Гл. таксама: Тамсама. Арк. 253 адв. — 255, 257–258.

126 Тамсама. Арк. 257–258.

127 Тамсама. Арк. 253 адв. — 255.

128 Тамсама. Арк. 255 адв. — 257.

129 Тамсама. Арк. 257–258.

альбо па ўласнай ініцыятыве пакінуў войска. Адначасова Жыгімонт Аўгуст рэкамендаваў найвышэйшаму гетману скласці рэестр прысутных пры роспуску паспалітага рушэння[130]. Парушальнікаў парадку чакала строгае пакаранне.

Шляхта разумела, што ад'езд з войска можа выклікаць карныя санкцыі. Арыгінальную спробу іх пазбегчы зрабіла шляхта Бельскага павета. Яна паабяцала за дазвол ад'ехаць з вайсковага лагера выплаціць у скарб па адным польскім злотым з «дыму»[131]. Просьба была задаволена. На Гарадзенскім сойме 1568 г. гаспадар вырашыў пайсці па гэтым шляху ў дачыненні да шляхты ўсёй краіны[132].

Роспуск земскага апалчэння не азначаў адмову ад намераў ваяваць з непрыяцелем. Почтам радных паноў было загадана адправіцца пад камандай жамойцкага старасты Я. Хадкевіча здабываць Улу[133]. Разам з ім адправіўся і Р. Сангушка, а неўзабаве павінен быў далучыцца Г. Гарнастай[134]. Пасля нападзення маскоўцаў на землі Браслаўшчыны пэўная колькасць жаўнераў паспалітага рушэння на чале з мсціслаўскім ваяводам і браслаўскім старастам Ю. Осцікам была накіравана пад Браслаў[135]. Ф. Кміта быў пасланы *«з некоторым рыцерством нашым»* (па звестках М. Бельскага і М. Стрыйкоўскага — 4 тысячы чалавек[136]) ваяваць смаленскую акругу. Цікава, што ў гэтым выпадку гаспадар загадваў шляхце пасля правядзення баявых акцый не раз'язджацца па хатах, а заставацца ў Оршы для аховы памежжа[137].

Найважнейшым вынікам збору паспалітага рушэння ў 1567 г. было тое, што гэтая дэманстрацыя ваеннай сілы прымусіла маскоўцаў спыніць падрыхтоўку наступлення на Інфлянты і заняцца абаронай сваіх межаў[138]. Аднак зламаць прыкрую традыцыю пасіўных дзеянняў і здзейсніць шырокамаштабную наступальную аперацыю зноў не ўдалося.

Так сталася, што гэта быў апошні збор шляхецкага апалчэння за ўвесь час Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг. Гэта тлумачыцца некалькімі

[130] Тамсама. Арк. 255 адв. — 257.
[131] LM. Kn. 51. P. 67. Гл. таксама: Ibid. Kn. 531. P. 67.
[132] Ibid. P. 133–134. Больш падрабязна гл. р. III, § 1.
[133] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 253 адв. — 255.
[134] LM. Kn. 531. P. 60–61.
[135] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 255 адв. — 257.
[136] Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 417; Bielski M. Kronika. T. 2. S. 1158.
[137] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 264–264 адв.
[138] Piwarski K. Niedoszła wyprawa... R. 5. Z. 14. S. 99–100.

прычынамі. Па-першае, яго мабілізацыйныя рэсурсы апынуліся на мяжы поўнага вычарпання. Па-другое, праціўнік пачаў праяўляць меншую актыўнасць, таму пільнай неабходнасці збіраць паспалітае рушэнне не было.

На Гарадзенскім сойме 1568 г. было прынята рашэнне, што ў выпадку надзвычайнай патрэбы шляхціцы *«не с почты повинными, але яко хто можеть, на отпор неприятелеви бечи и ку пану гетману ехати мають»*[139]. Гэта фактычна азначала, што ўлады адмовіліся ад збору паспалітага рушэння па традыцыйных правілах. Імкнучыся дабіцца ў першую чаргу хуткай мабілізацыі і ўсведамляючы недахоп сродкаў, кіраўніцтва дзяржавы патрабавала выхаду на ваенную службу толькі саміх шляхціцаў.

Збор земскага войска павінен быў адбыцца толькі ў самых складаных абставінах. Ухваленне новай серабшчыны на сойме 1568 г. паказала, што кіраўніцтва дзяржавы чарговы раз прызнала неэфектыўнасць паспалітага рушэння, больш разлічваючы на сродкі шляхты.

На пачатку лістапада 1568 г. Р. Хадкевіч, асцерагаючыся нападу маскоўцаў на Віцебск, моцна хваляваўся за стан узброеных сіл. Па яго словах, яны фактычна адсутнічалі: *«Людеи пенежныхъ мало, воиска земъского въ готовости не будет»*. Для вырашэння праблемы найвышэйшы гетман прасіў падтрымкі радных паноў, жадаючы ў выпадку небяспекі сабраць паспалітае рушэнне без рассылкі гаспадарскіх лістоў у паветы[140]. Гаспадар, аднак, не быў схільны перабольшваць маштабы пагрозы і адклаў разгляд пытання аб скліканні апалчэння на блізкі з'езд у Вогіню[141].

Такім чынам, паспалітае рушэнне падчас Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг. хоць і пацвердзіла свой статус асноўнай ваеннай сілы ў ВКЛ, аднак так і не здолела забяспечыць перамогу ў ваенных дзеяннях. Шляхецкае апалчэнне з'яўлялася маларухомай структурай, нездатнай аператыўна рэагаваць на сітуацыю на ваенным фронце. Выклікала пытанні баяздольнасць шляхціцаў, якія за доўгі час папросту развучыліся ваяваць. Зборам паспалітага рушэння пастаянна спадарожнічалі такія праблемы як ухіленне ад службы, укрыванне сапраўдных памераў почтаў, гвалт з боку жаўнераў і інш.

[139] РИБ. Т. 30. С. 448–449.

[140] *«Не ждучи другого писанья од его кролевъские м[и]л[ос]ти заразом до мене яко на кгвалт днем и ночью поспешилися»* (BKórn. Rkps. 1536. K. 229–232).

[141] Listy. S. 557–560.

Будзе няслушна сцвярджаць, што меў месца свядомы сабатаж паспалітага рушэння з боку шляхты, якая не жадала ваяваць, а марыла пра польскія свабоды і вольнасці. Часта такое меркаванне можна сустрэць у літаратуры. Наадварот, шараговая шляхта, баючыся пакарання, імкнулася выконваць распараджэнні ўладаў. Іншая справа, што для многіх выхад у войска быў немагчымым з прычыны адсутнасці патрэбных матэрыяльных сродкаў. А вось заможныя магнаты нярэдка паказвалі прыклад нядобрасумленных паводзін падчас вайсковай мабілізацыі.

У зборах паспалітага рушэння ў гады Інфлянцкай вайны можна вылучыць два перыяды. Першы працягваўся да 1563 г., калі яно склікалася без соймавых ухвалаў, на агульных прынцыпах, якія засталіся ад «старыны». Адчувалася, што для дзяржаўных структур улады зварот да паспалітага рушэння з'яўляецца забытай і нязвыклай справай. Таму асноўныя спадзяванні ўскладаліся на добраахвотнае жаданне шляхты абараняць сваю краіну. Ужо на пачатку Інфлянцкай вайны выявіліся крызісныя з'явы ў арганізацыі паспалітага рушэння, стала відавочнай недастатковасць шляхецкіх рэсурсаў для рэгулярнай мабілізацыі ўзброеных сіл.

Якасныя змены ў арганізацыі паспалітага рушэння назіраюцца ў 1563 г., калі на Віленскім сойме была звернута пільная ўвага на вызначэнне канкрэтных правіл выхаду і знаходжання ў войску, а таксама прыняты меры па яго мадэрнізацыі ў новых умовах вайны. Нягледзячы на праведзеную рэгламентацыю,ператварыць паспалітае рушэнне ў эфектыўную ваенную сілу не ўдалося. Для шляхты вайсковыя зборы па-ранейшаму з'яўляліся знясільвальным мерапрыемствам. Часта ўкрывалася інфармацыя аб сапраўдных памерах землеўладанняў, што адмоўна адбівалася на колькасці войска. Гаспадар не спяшаўся ў вайсковы лагер, з прычыны чаго прэстыж паспалітага рушэння яшчэ больш падаў. Яго адсутнасць прыводзіла да масавага ўхілення шляхты ад земскай службы. Толькі ў 1567 г., калі Жыгімонт Аўгуст усё-такі прыбыў у войска, прывілеяваны стан праявіў неабходную актыўнасць. Колькасць жаўнераў у паспалітым рушэнні дасягнула максімальнай лічбы. Аднак замест ваеннага рэваншу гэтая безвыніковая вайсковая мабілізацыя прывяла краіну да паглыблення ўнутранага крызісу і падштурхнула ВКЛ да уніі з Польшчай.

Асуджанасць уладаў на выкарыстанне паспалітага рушэння ў якасці асноўнай ваеннай сілы было галоўнай прычынай агульнага крызісу ваенна-абарончай сістэмы ВКЛ. Дэфіцыт фінансавых сродкаў і сталая ва-

енная пагроза прымушалі кіраўніцтва дзяржавы зноў і зноў звяртацца да гэтай «бясплатнай» крыніцы ўзброеных сіл. Земскае апалчэнне збіралася амаль кожны год. Рабіліся нават спробы яго склікання два разы на год — у 1561 і 1564 гг.

Спарадычныя спробы трансфармацыі рушэння ў аплочваемае войска, прыцягненне ў яго шэрагі прадстаўнікоў непрывілеяваных станаў не завяршыліся пасняхова. Памкненням дзяржаўнай улады замяніць выхад у земскае войска надзвычайнымі падаткамі і за іх кошт наймаць рэгулярныя жаўнерскія роты было наканавана скончыцца няўдачай з прычыны надзвычай нізкай плацежаздольнасці шляхты.

Не трэба забываць і аб сацыяльна-ідэалагічным значэнні паспалітага рушэння. Для шляхты яно служыла знакам прыналежнасці да рыцарскага стану і абгрунтоўвала ўласны прывілеяваны сацыяльны статус. З гэтай прычыны нават думка аб карэннай рэформе ваенна-абарончай сістэмы ВКЛ уяўлялася немагчымай. Гэта набывала яшчэ большае значэнне ў дзяржаве, якая стала на шлях будаўніцтва рэальнай «шляхецкай дэмакратыі».

## § 2. Няспраўджаныя спадзяванні: найманае войска ў структуры ўзброеных сіл ВКЛ

Другім важнейшым складовым элементам узброеных сіл ВКЛ з'яўлялася найманае войска. Галоўнай асаблівасцю яго было нясенне ваеннай службы за адпаведную плату. Для наймітаў гэтая служба, як правіла, з'яўлялася асноўным родам заняткаў. Гэта вызначала прафесійны характар найманага войска, што, безумоўна, пазітыўна адбівалася на яго баявых якасцях. Найманая служба мела рэгулярны характар, што, праўда, не заўсёды вытрымлівалася.

У XVI ст. роля найманага войска ўвесь час пастаянна расла. Гэта было звязана ў першую чаргу са зменамі характару ваенных дзеянняў, сацыяльнай трансфармацыяй рыцарскага стану — шляхты, а таксама з агульнай тэндэнцыяй да прафесіяналізацыі арміі. З цягам часу ў кіроўных колах нарастала разуменне неабходнасці фарміравання рэгулярных узброеных сіл. Асаблівую важнасць найманае войска мела таму, што, у адрозненне ад традыцыйнага паспалітага рушэння, у ім служылі пешыя жаўнеры — драбы.

Паводле структуры найманае войска складалася з асобных падраздзяленняў — рот, якімі кіравалі ротмістры. Рота дзялілася на некалькі адзінак, на чале якіх знаходзіліся паручнікі і таварышы. Як правіла, адна рота налічвала 100–200 жаўнераў. Існавалі роты коннікаў і драбаў. Коннае войска было больш мабільным і выкарыстоўвалася ў наступальных аперацыях. Роты драбаў часцей за ўсё размяшчаліся ва ўмацаваных пунктах і забяспечвалі іх абарону, а таксама ўдзельнічалі ў аблогавых мерапрыемствах.

Служба найманай роты пачыналася з выдання гаспадаром «прыпаведнага ліста». У гэтым дакуменце агаворваліся варункі службы, у прыватнасці, яе тэрмін і стаўкі аплаты («заслужоного»). Часта ў дадатак выдавалася «ўстава» — роспіс фіксаваных цэн на харчовыя прадукты і фураж. У прыпаведным лісце, як правіла, вызначаўся парадак узаемаадносін наймітаў з мясцовымі ўладамі і мірным насельніцтвам у месцах дыслакацыі роты, што было важна пры вырашэнні канфліктных сітуацый. Усе нанесеныя наймітамі шкоды павінны былі запісвацца ў спецыяльны рэестр, які потым дасылаўся гетману і мясцовым уладам[142].

Падчас службы ротмістры і шараговыя жаўнеры павінны былі кіравацца вайсковымі артыкуламі, якія выдаваліся гетманамі. Вядомы тры спісы артыкулаў, якія былі выдадзены падчас Інфлянцкай вайны Рыгорам і Янам Хадкевічамі[143]. Апрача таго, ротмістры прыносілі прысягу на вернасць гаспадару і дзяржаве[144].

Выкарыстанне найманага войска патрабавала значных грашовых сродкаў. Скарб ВКЛ у сярэдзіне XVI ст. адчуваў істотныя цяжкасці з фінансавымі рэсурсамі. Гэта не дазваляла ўладам быць упэўненымі ў стабільным фінансаванні ваенна-абарончых мерапрыемстваў. Таму з самага пачатку вайны фінансаванне наймітаў было адной з найважнейшых і найскладанейшых задач для кіраўніцтва ВКЛ.

Усталяванне літоўскага кантролю над Інфлянтамі паводле Віленскай дамовы 1559 г. было даручана найманаму кантынгенту ВКЛ на чале з «гетманамі» (у дадзеным выпадку — камандуючымі войскам) Ю. Зяновічам і Я. Хадкевічам. Кантынгент налічваў 500 коннікаў і 500 драбаў. У крыніцах сустракаюцца імёны ротмістраў, задзейнічаных

[142] Гл. для прыкладу: LM. Kn. 564. P. 38–39.
[143] Polskie ustawy i artykuły wojskowe od XV do XVIII w. / Wyd. S. Kutrzeba. Kraków, 1937. S. 115–124, 127–138.
[144] Яе змест захаваўся ў: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 559.

у гэтай кампаніі: крэўскага дзяржаўцы Мікалая Осціка (неўзабаве стаў старастам у Розітэне), аршанскага дзяржаўцы Пятра Корсака, Каленіка (Каляніцкага) Тышкевіча[145] і Лукаша Свірскага[146]. Вядома, што Я. Хадкевіч, нягледзячы на прызначэнне камандзірам драбаў, атрымаў «пенезі» на найм коннай роты колькасцю 100 чалавек[147].

Галоўнай задачай для выпраўленага ў Інфлянты войска было заняцце закладзеных паводле Віленскай дамовы 1559 г. замкаў у паўднёва-ўсходняй частцы краіны. Гэта ўдалося зрабіць не без цяжкасцяў, бо інфлянцкім ротам, якія размяшчаліся ў фартэцыях, не заплацілі за службу. Літоўскім наймітам давялося чакаць у Друі, пакуль інфлянцкія гарнізоны не пакінуць замкі. Толькі прыкладна ў канцы снежня 1559 – пачатку студзеня 1560 г. літвіны здолелі там размясціцца[148]. Мяркуем, што не ў апошнюю чаргу з гэтай прычыны літвіны дапусцілі ўзяцце маскоўцамі Марыенбурга ў лютым 1560 г.[149]

У дадзеных «гетманам» інструкцыях асноўнай мэтай дзейнасці найманага войска на тэрыторыі Інфлянтаў вызначалася недапушчэнне непрыяцеля ў межы раёна, аддадзенага ВКЛ у заклад, а таксама інфармаванне кіраўніцтва дзяржавы пра мясцовыя падзеі для аператыўнага рэагавання на іх. Пры намерах непрыяцельскага войска праводзіць аблогу замкаў літоўскія гарнізоны павінны былі зачыніцца і чакаць дапамогі. Калі б малыя атрады праціўніка перайшлі мяжу, каб спусташаць інфлянцкую тэрыторыю, то жаўнерам рэкамендавалася прыняць неабходныя меры па іх выгнанні за межы краіны. У любым выпадку строга забаранялася пераходзіць мяжу з Маскоўскай дзяржавай і ажыццяўляць супраць непрыяцеля актыўныя дзеянні наступальнага характару. Нагадаем, што кіраўніцтва ВКЛ хацела захавання перамір'я з Масковіяй і не збіралася даваць падставы для яго зрыву. Сакрэтным артыкулам інструкцый прадпісвалася заставацца ў замках у тым выпадку, калі магістр

145 РНБ, ф. 293, оп. 1, док. 162; НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 453–453 адв.

146 РНБ, ф. 293, оп. 1, док. 167.

147 *«...Пан стол[ь]ник, и к тому свою роту ездных»* (АЮЗР. Т. 1. С. 148–149). Гл. таксама: АЗР. Т. 3. С. 108–110.

148 РНБ, ф. 293, оп. 1, док. 162.

149 У Вільні палічылі, што гэта адбылося ў немалой ступені з прычыны няспешлівасці і нядбайнасці наймітаў ВКЛ: *«Кгды бы ты, пане Зеновевичу, до мистра за писаньем нашим перво стягнул, могли бысте ратунок вчинити, якобы се таковая шкода через взяте замку Мариенборку не стала»*: Тамсама. Док. 164. Насамрэч, як нам здаецца, больш важную ролю адыграла супярэчлівасць загадаў і прадпісанняў, якія даваліся вайскоўцам цэнтральнымі ўладамі.

Інфлянцкага Ордэна будзе прасіць наймітаў ісці ўглыб Інфлянтаў для вядзення баявых дзеянняў супраць маскоўцаў[150].

Умовы службы ў Інфлянтах для наймітаў былі даволі цяжкімі. Ужо ў сакавіку 1560 г. шмат хто з літоўскіх жаўнераў выказаў жаданне пакінуць службу. Гаспадарская ўлада ў досыць жорсткай форме загадала Ю. Зяновічу затрымаць жаўнераў яшчэ хаця б на чвэрць года, баючыся поўнай страты кантролю над сітуацыяй[151]. Аднак загады гаспадара не адыгралі сваёй ролі. Роты П. Корсака і К. Тышкевіча пакінулі інфлянцкія замкі, а з роты самога камандуючага з'ехала большасць жаўнераў. Віна за гэта была ўскладзена на Ю. Зяновіча, якому Жыгімонт Аўгуст прыгразіў строгім пакараннем[152].

Летам 1560 г. улады ВКЛ планавалі павялічыць найманы кантынгент да 2 тысяч коннікаў, далучыўшы яго да паспалітага рушэння жамойцкіх і завілейскіх зямель[153]. Вядома, што *«справцой»* над наймітамі стаў разам з Я. Хадкевічам Ю. Тышкевіч[154]. Аднак дакладных звестак аб рэальным павелічэнні колькасці наймітаў не захавалася.

Імкненне да кантролю спраў у Інфлянтах прымушала кіраўніцтва ВКЛ наймаць новыя вайсковыя фарміраванні. У сярэдзіне 1561 г. тут знаходзілася ўжо 11 конных і 18 драбскіх рот агульнай колькасцю больш за 1 200 коннікаў і 1 050 драбаў[155] (гл. табл. 2.2.1 і 2.2.2). Яны размясціліся з дазволу інфлянцкіх уладаў у найважнейшых стратэгічных пунктах ад Рэвеля да Дынабурга. Такім чынам, дзякуючы задзейнічанню найманых сіл Жыгімонту Аўгусту ўдалося ўсталяваць кантроль над большай часткай тэрыторыі Інфлянцкай дзяржавы.

---

150 АЮЗР. Т. 1. С. 147–148.

151 РНБ, ф. 293, оп. 1, док. 164.

152 *«Ротмистрове Петр Корсак и Каленицкий* [Тышкевіч] *з ротами своими с тое службы нашое зъехали, а и твои товарыши толко старшие зостали, а иншие также стягнули...»* (Тамсама. Док. 166). Іх імёнаў у якасці ротмістраў падчас Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг. мы больш не сустракаем. У гербоўніку А. Банецкага сустракаецца інфармацыя аб узяцці ў 1560 г. П. Корсака ў маскоўскі палон: Boniecki A. Herbarz polski. T. 11. Warszawa, 1907. S. 171. Гэта не магло адбыцца раней за ліпень 1560 г. Гл.: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 453–453 адв. Вядома таксама, што 4 чэрвеня 1560 г. К. Тышкевіч атрымаў «до живота» Гомельскае староства: Тамсама. Арк. 442.

153 У адной з позніх крыніц згадваецца, што ў 1560 г. у Інфлянтах знаходзіліся ротмістры Аляксандр і Іван Палубенскія, (Станіслаў) Скіндэр, (Пётр) Жыжэмскі, (Размус) Доўгірд, а таксама нямала іншых ротмістраў: BKórn. Rkps. 1538. K. 49.

154 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 453–453 адв.

155 LM. Kn. 564. P. 40–41. Дакумент не мае дакладнай даты, аднак па кантэксце размяшчэння ў кнізе Метрыкі ВКЛ можна меркаваць, што ён быў створаны не пазней за красавік 1561 г.

Табліца 2.2.1.

### *Коннае найманае войска ВКЛ у Інфлянтах у 1561 г.*

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | Месца дыслакацыі | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Сапега Мікалай | 108 | Вендэн | |
| 2. | Скіндэр Станіслаў | 100 | Вольмар | |
| 3. | Жыжэмскі (Пётр) | 100 | Каркус | |
| 4. | Болька | 100 | Каркус | верагодна, Лукаш Свірскі |
| 5. | Левонь Ян | 100 | Шваненбург | з 1567 — стараста ў Дынемундзе |
| 6. | Лопат Ян | не пазначана | Трыкатэн | |
| 7. | Галубіцкі Рыгор | 100 | Гельмет | |
| 8. | Сурвіла Станіслаў | не пазначана | Эрмес | |
| 9. | Палубенскі Аляксандр | 200 | Ронебург | з 1561 — стараста ў Вольмары |
| 10. | Тышкевіч Юры | 200 | не пазначана | |
| 11. | Осцік (Мікалай) | 200 | не пазначана | |

*Табліца складзена паводле:* LM. Kn. 564. P. 40–41.

Табліца 2.2.2.

### *Пешае (драбскае) найманае войска ВКЛ у Інфлянтах у 1561 г.*

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | Месца дыслакацыі | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Бялінскі Клімонт | 200 | Вайсенштайн | |
| 2. | Стравінскі Марцін | 100 | Вайсенштайн | |
| 3. | Валовіч Фрыдрых | 100 | Вендэн | |
| 4. | Міклашоўскі Пётр | 100 | Вольмар | |
| 5. | Главацкі Станіслаў | 200 | Каркус | |
| 6. | Аборскі Адам | ? | Шваненбург | |
| 7. | Стравінскі Балтрамей | ? | Трыкатэн | |
| 8. | Мадрэўскі Ян | 300 | Рэвель | забіты пры аблозе Тарваста ў жніўні 1561 г. |

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | Месца дыслакацыі | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|---|
| 9. | Таліпскі Лаўрын | 100 | Рэвель | |
| 10. | Клюкоўскі Ян | 100 | Эрмес | |
| 11. | Вронскі Андрэй | ? | Марыенгаўзен | |
| 12. | Зміеўскі Борк | 100 | Дынабург | |
| 13. | Карыцкі Ян | ? | Розітэн | |
| 14. | Куніцкі Станіслаў | ? | Кокенгаўзен | |
| 15. | Мора Антоні | 200 | Пернава | уцёк са службы ў траўні 1562 г. (BRacz. Rkps. 78. K. 41) |
| 16. | Аборскі Прэцлаў | 50 | Люцэн | |
| 17. | Шчасны Губа | 100 | Гельмет | |
| 18. | Цэдроўскі Ян | ? | Ронебург | |

*Табліца складзена паводле:* LM. Kn. 564. P. 40–41.

Узімку 1562 г., не вытрымаўшы цяжкіх умоў службы і не бачачы магчымасцей узбагачэння, жаўнеры пачалі ўцякаць з войска. Спачатку ўлады спрабавалі ўзяць катэгарычны тон, пад страхам пакарання прадпісваючы парушальнікам дысцыпліны вярнуцца на месца службы[156]. Аднак ужо ў красавіку 1562 г. змест гаспадарскіх лістоў звёўся да просьбаў заставацца на службе з абяцаннем хуткай выплаты заробку. Без сумневу, гэта было звязана з тым, што адшукаць грашовыя сродкі ў патрэбнай колькасці так і не ўдалося. Шафарам у Інфлянтах было прадпісана выдаваць наймітам харчаванне без аплаты. Цікава, што затрымку грошай для літоўскіх жаўнераў у Вільні тлумачылі *«выданьемъ немалое сумы зъ скарбу нашого на служобъные до воиска польского»*[157].

У такой незайздроснай сітуацыі ўлады былі вымушаны змяншаць вайсковы кантынгент у Інфлянтах. У лістападзе 1562 г. значная колькасць рот была адпраўлена ў ВКЛ на «лежы» альбо для расфарміравання.

156 LM. Kn. 564. P. 91.
157 Ibid. P. 100–101.

Прычынай гэтага з'яўлялася *«трудное выхованье людей служебных про недостаток живности в земли Ифълянтскои»*[158].

Як відаць, прысутнасць літоўскіх вайскоўцаў у Інфлянтах няўхільна памяншалася. Своеасаблівым выключэннем стала прыпаведванне службы 30 красавіка 1563 г. 21 роце[159] (гл. табл. 2.1.3). Гэта было, хутчэй за ўсё, водгукам на полацкія падзеі і бояззю іх паўтарэння ў Інфлянтах. Са зместу лістоў да ротмістраў вынікае, што існавала вялікая пагроза адыходу з войска найманых жаўнераў пасля заканчэння прыпаведнага тэрміну з прычыны нявыплаты ім грошай. Гаспадар прасіў іх пачакаць «малы час» і не з'язджаць з замкаў, запэўніваючы ў хуткай выплаце запазычанасцяў, і прасіў шукаць кампрамісныя рашэнні пры канфліктах з мясцовым насельніцтвам[160].

У наступныя гады сустракаюцца толькі спарадычныя звесткі аб літоўскіх вайсковых падраздзяленнях у Інфлянтах. Абарона інфлянцкіх замкаў была ўскладзена на старастаў з ВКЛ. Як правіла, яны адначасова з'яўляліся ротмістрамі мясцовых рот. Эфектыўнасць падобнага спалучэння функцый даказвалася не адзін раз. У прыватнасці, з найлепшага боку праявілі сябе зельбургскі староста Мікалай Тальвош і вольмарскі староста Аляксандр Палубенскі.

Табліца 2.2.3.

*Найманае войска ў Інфлянтах вясной 1563 г.*

| N | Прозвішча ротмістра | Род роты | Месца дыслакацыі | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Младаўскі (Каспар? Мацей?) | др. | Вольмар | |

158 LM. Kn. 564. P. 128–130.

159 Існуюць два дакументы з пералікам ротмістраў. Першы з іх датаваны 1 красавіка 1563 г., другі — 18–30 красавіка 1563 г.: РИБ. Т. 30. С. 644–645, 647–650. Першы дакумент ўяўляе сабой пералік ротмістраў, якім радныя паны выдалі прыпаведныя лісты (дакумента з яго зместам няма). Гэта адзіны выпадак за час Інфлянцкай вайны, калі набор на найманую службу санкцыянавала Рада, а не гаспадар. Адсутнасць іншых звестак пра дадзенае прыпаведванне, а таксама наяўнасць гаспадарскага ліста ад 30 красавіка 1563 г., дзе спіс ротмістраў дастаткова значна адрозніваецца ад папярэдняга, робіць для нас малаверагоднымі намеры радных паноў прыпаведаць службу аж 28 (!) ротам. Больш верагоднымі для характарыстыкі складу найманага войска ў Інфлянтах мы лічым дадзеныя ад 30 красавіка 1563 г. Дадамо, што толькі ў спісе ад 1 красавіка 1563 г. сустракаюцца роты Яна Цэдроўскага, Яна Карыцкага, Станіслава Русецкага, Хамы Маскевіча, Юрыя Осціка, Яна Паўчыча («Чеха»), Прэцлава Аборскага, Пятра Сядлецкага, Размуса Доўгірда.

160 РИБ. Т. 30. С. 648–650.

| N | Прозвішча ротмістра | Род роты | Месца дыслакацыі | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|---|
| 2. | Міклашоўскі (Пётр) | др. | Вольмар | апошняя згадка ў крыніцах |
| 3. | Шчасны Губа | др. | Кірхгольм | апошняя згадка ў крыніцах |
| 4. | Закрэўскі (Ян) | др. | Вендэн | |
| 5. | Зміеўскі | др. | Зэквалге | апошняя згадка ў крыніцах |
| 6. | Стравінскі (Балтрамей) | др. | Зэквалге | апошняя згадка ў крыніцах |
| 7. | Клюкоўскі Ян | др. | Дынемунд | апошняя згадка ў крыніцах |
| 8. | Вансовіч (Станіслаў?) | др. | Дынемунд | сустракаецца ў 1561 у польскім кантынгенце. Забіты ў 1563 |
| 9. | Вронскі Андрэй | др. | Марыенгаўзен | згадваецца ў спісе ад 1.04.1563; апошняя згадка ў крыніцах |
| 10. | Стэцковіч Богдан | др. | Кокенгаўзен | стараста; згадваецца ў спісе ад 1.04.1563 |
| 11. | Таліпскі (Лаўрын) | др. | Кокенгаўзен | згадваецца ў спісе ад 1.04.1563 |
| 12. | Слуцкі Павел | др. | Люцэн | згадваецца ў спісе ад 1.04.1563 |
| 13. | Главацкі (Станіслаў) | др. | Люцэн | згадваецца ў спісе ад 1.04.1563 |
| 14. | Аборскі Адам | др. | Шваненбург | згадваецца ў спісе ад 1.04.1563 |
| 15. | Куніцкі (Станіслаў) | др. | Шваненбург | згадваецца ў спісе ад 1.04.1563 |
| 16. | Місевіч Адам | не пазначана | Розітэн | згадваецца ў спісе ад 1.04.1563; апошняя згадка ў крыніцах |
| 17. | Гладыш Павел | не пазначана | Вендэн | першая і апошняя згадка ў крыніцах |
| 18. | Палубенскі Іван | не пазначана | не пазначана | згадваецца ў спісе ад 1.04.1563 |
| 19. | Палубенскі Аляксандр | к. | Вольмар | стараста; згадваецца ў спісе ад 1.04.1563 |
| 20. | Тальвош Мікалай | к. | Дынебург | стараста; згадваецца ў спісе ад 1.04.1563 |
| 21. | Осцік Мікалай | к. | не пазначана | апошняя згадка ў крыніцах |

**Заўвагі:**
1. «к.» — конная рота
2. «др.» — драбская рота

*Табліца складзена паводле:* РИБ. Т. 30. С. 647–650.

Якаснае паляпшэнне арганізацыі абароны ў Інфлянтах звязана з імем Я. Хадкевіча. У лістападзе 1565 г. ён па ўласнай ініцыятыве выставіў почт колькасцю 1200 коннікаў. Праз паўгады, не атрымаўшы абяцанай фінансавай падтрымкі з боку дзяржавы, ён быў вымушаны скараціць яго да 700 коннікаў[161].

Прыстойнае фінансавае забеспячэнне пасля прызначэння Я. Хадкевіча на пасаду адміністратара і гетмана Інфлянтаў дазволіла павялічыць найманыя сілы ў лістападзе 1566 г. да 3 266 конных жаўнераў[162]. Гэтых высілкаў, аднак, надоўга не хапіла. Яшчэ ў 1567 г. Я. Хадкевічу ўдавалася трымаць 2 500–2 700 коннікаў[163]. А вось у наступным годзе ўлады вырашылі пакінуць у Інфлянтах толькі 300 жаўнераў[164]. Неўзабаве, праўда, найманы кантынгент быў павялічаны да тысячы коннікаў[165].

У далейшым колькасць жаўнераў у Інфлянтах скарацілася да мінімуму. Вядома, што ў 1574 г. кароль Рэчы Паспалітай Генрых, спасылаючыся на рашэнне Жыгімонта Аўгуста, пастанавіў трымаць у Інфлянтах невялікі почт колькасцю 200 коннікаў і 50 драбаў[166]. Няма сумневу, што гэтае рашэнне з'явілася на свет у канцы кіравання апошняга Гедымінавіча.

Такім чынам, выкарыстанне найманага войска ў Інфлянтах суправаджалася для кіраўніцтва ВКЛ істотнымі праблемамі. Арганізацыя абароны гэтага краю была няпростай задачай, бо патрабавала значных фінансава-матэрыяльных выдаткаў. Адсутнасць сродкаў не дазваляла Княству трымаць тут вялікую колькасць найманых рот. Нават у гады максімальнай увагі да абароны Інфлянтаў велічыня кантынгента наймітаў заставалася нязначнай. З яго дапамогай можна было забяспе-

161 Гэта супярэчыць дадзеным з прыпаведнага ліста, выдадзенага Я. Хадкевічу 2 траўня 1566 г. Паводле яго, служба вызначалася для 600 коннікаў, са стаўкай 4 копы літоўскіх грошаў за чвэрць: АСД. Т. 1. Вильна, 1867. С. 141.

162 У іншай крыніцы падаецца цікавая інфармацыя аб тым, што пры заняцці пасады інфлянцкага гетмана Я. Хадкевіч меў у Інфлянтах 400 стральцоў (стаўка аплаты ў 1567 г. — 3 копы літоўскіх грошаў), 100 нямецкіх (інфлянцкага паходжання?) кнехтаў (стаўка аплаты ў 1567 г. — 7 польскіх злотых) і 500 польскіх коннікаў (стаўка аплаты ў 1567 г. — 5 коп грошаў): НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 119 адв. — 120.

163 Колькасць інфлянцкіх жаўнераў за гэты перыяд не пазначана. Для падлікаў мы выходзілі з дапушчэння захавання папярэдняй колькасці 780 жаўнераў.

164 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 292; LM. Kn. 531. P. 96.

165 LM. Kn. 531. P. 114.

166 АСД. Т. 4. С. 14–15.

чыць толькі пасіўную абарону замкаў. Для ажыццяўлення шырокамаштабных аперацый супраць непрыяцеля, у прыватнасці — дэклараванага вяртання захопленай тэрыторыі, наяўных сіл наймітаў яўна бракавала.

Варта адзначыць, што найманае войска выступала своеасаблівым сродкам ціску ў палітычных стасунках паміж ВКЛ і Інфлянтамі. Відавочна, што літоўскія ўлады выкарыстоўвалі ваенную прысутнасць у Інфлянтах перадусім для больш шчыльнага падпарадкавання гэтага краю. Найманы кантынгент павялічваўся, як толькі з'яўляліся падобныя намеры. Маюцца на ўвазе 1561 і 1566 гг., калі Жыгімонт Аўгуст і яго паплечнікі навязвалі інфлянцкім элітам дамовы інкарпарацыйнага характару. Такім чынам, найманае войска служыла дадатковым аргументам на карысць пазіцыі літоўскага боку.

* * *

Традыцыйна забеспячэнне абароны на ўсходнім памежжы ВКЛ адбывалася пераважна за кошт мясцовага рушэння шляхты і мяшчан, а таксама з дапамогай такіх слаёў насельніцтва як путныя баяры, казакі і інш. Цэнтрамі абароны з'яўляліся замкі, у якіх мясцовыя старасты і дзяржаўцы былі абавязаны ўтрымліваць за кошт субсідый з гаспадарскага скарбу (а таксама фінансава-падатковых ільгот) узброеныя почты конных і пешых жаўнераў[167]. Гэта былі асноўныя рэсурсы абароны на аддаленым ад цэнтра ўсходнім памежжы ВКЛ.

З пачаткам шырокамаштабнай вайны з Маскоўскай дзяржавай рабілася відавочным, што без прыцягнення дадатковых сіл забяспечыць надзейную абарону на неспакойных памежных землях немагчыма. Выкарыстанне ў якасці надзвычайнага рэсурсу паспалітага рушэння не магло быць эфектыўным з прычыны спецыфікі ваенных дзеянняў, якія

[167] У абавязак старастаў і дзяржаўцаў памежных замкаў уваходзіла правядзенне разведчанай дзейнасці. Найбольш гучных вынікаў у гэтай справе дасягнуў аршанскі староста Ф. Кміта. Здабыванне інфармацыі ў Оршы забяспечвалася 8 шпегамі і 4 прадстаўнікамі агентуры ў Маскоўскай дзяржаве. Сетка разведчыкаў дапаўнялася *«мужиками пограничными, от которых уборзде шпекги въ везде досегають»* (Тамсама. С. 246–250). Вядомы і іншыя факты. Для Б. Корсака шпегаўскія функцыі выконвалі яго былыя падданыя-сяляне, якія апынуліся пад маскоўскай акупацыяй, а для Ю. Зяновіча — сельскія «старцы», якія забяспечвалі свайго пана каштоўнай інфармацыяй пра дзеянні і намеры непрыяцеля. Гл.: AS. T. 7. S. 202.

заключаліся ў «татарскай» тактыцы раптоўных і хуткапальных нападаў з мэтамі спусташэння тэрыторыі.

У першай палове 60-х гг. XVI ст. праблему спрабавалі вырашыць з дапамогай польскага найманага войска. Яно было перакінута на тэрыторыю паўночнай Беларусі неўзабаве пасля заканчэння літоўска-маскоўскага перамір'я — у траўні 1562 г. Аднак гэтая спроба аказалася не самай удалай, у немалой ступені з прычыны высокіх патрабаванняў польскіх наймітаў да ўмоў службы і нядобразычлівага стаўлення да іх як з боку мясцовага насельніцтва, так і з боку палітычнай эліты ВКЛ. На тэрыторыі Княства польскае войска знаходзілася з перапынкамі да 1567 г. (гл. р. II, § 3).

Уласна літоўскага кантынгента найманых жаўнераў як цэласнай вайсковай групоўкі на ўсходнім памежжы ВКЛ доўгі час не існавала. Першапачаткова фарміраванне найманых рот адбывалася пераважна шляхам трансфармацыі почтаў мясцовых землеўладальнікаў і ўраднікаў з дадатковым наймам жаўнераў з ліку ахвотнікаў, якія хацелі ўзбагаціцца за кошт «заслужоного» альбо ваеннай здабычы. Для мясцовых эліт патрэба аховы ўласных маёнткаў ад нападаў ворага з'яўлялася немалаважным стымулам для знаходжання на ваеннай службе. Улады імкнуліся ў поўнай меры выкарыстоўваць падобнае супадзенне прыватнага інтарэсу з публічным. У пераліку ротмістраў з пачатку вайны сустракаюцца імёны выхадцаў з заможных полацкіх і віцебскіх родаў: Корсакаў, Зяновічаў, Есманаў, князёў Саколінскіх, Лукомскіх, Жыжэмскіх і інш.

Рэсурсам для папаўнення найманага войска служыў гаспадарскі двор. У жніўні 1564 г. М. Радзівіл Чорны прапанаваў гаспадару адпраўляць на вайсковую службу ў якасці ротмістраў гаспадарскіх дваран з іх дворскімі почтамі. Жыгімонту Аўгусту спадабалася гэтая ідэя[168]. Можна меркаваць, што з гэтага часу ў войска пачынае прыцягвацца ўсё большая колькасць дваран.

На службе ў найманым войску ВКЛ знаходзіліся ротмістры-іншаземцы. Пераважная большасць іх паходзіла з Польшчы. Неабходна заўважыць, што пасля роспуску польскага кантынгента ў 1566 г. многія ротмістры з яго складу засталіся на ваеннай службе ў ВКЛ. Сустракаліся ротмістры і з больш далёкіх краін. У 1564–1569 гг. у найманым войску

168 Listy. S. 465–472, 479–487.

ВКЛ служылі два італьянцы — Амбражэй Гваньіні і яго сын Аляксандр[169]. У 1563–1564 гг. на службе знаходзіўся чэх Ян Паўчыч[170].

Апрача традыцыйных рот коннікаў і драбаў, да складу найманага войска трэба залічыць і казацкія атрады. На праблеме ўдзелу казакаў у забеспячэнні абароны варта спыніцца асобна. Цяжка паверыць, каб тагачасныя «казакі» ў беларускіх гарадах у сваёй большасці паходзілі з украінскага казацтва, якое ў той час у левабярэжнай Украіне пачало вылучацца ў асобны сацыяльны слой[171]. Гэта спрабуе даказаць украінскі даследчык С. Лепяўка. На наш погляд, тут ідзе свядомае спрашчэнне праблемы, імкненне надаць дадзенай з'яве чыста «ўкраінскі» характар.

Даследчыка, відавочна, прывяла ў зман сама назва «казакі». Вядома, што згадкі пра казакаў на Полаччыне прасочваюцца ўжо ў пачатку XVI ст.[172]

На наш погляд, у дадзены перыяд казакі сталі звычайным элементам арганізацыі аховы на ўсіх памежных тэрыторыях ВКЛ, якія знаходзіліся ў бесперапынным прадчуванні альбо стане вайны. Істотнай розніцы паміж беларускім і ўкраінскім памежжам, паміж, скажам, арганізацыяй абароны ў замках Орша і Асцёр, па сутнасці, не існавала. Для ўладаў ВКЛ, якія адчувалі сталы недахоп рэсурсаў, казакі сталі зручным інструментам для ажыццяўлення абаронча-ахоўных функцый.

Гэта ўпершыню праявілася ў гаспадарскім лісце ад 15 лістапада 1561 г., у якім аршанскаму дзяржаўцу А. Адзінцэвічу загадвалася *«заклікати там у Орши* (sic!) *и што будеть там людеи служебъных козаковъ»*[173]. Такім чынам, ужо першы дакумент дзяржаўнай канцылярыі, прысвечаны найму казакаў, паказвае, што шукалі іх не толькі на Украіне.

Іншыя сведчанні не менш паказальныя. У кастрычніку 1563 г. гаспадарская ўлада чарговы раз абвясціла набор добраахвотнікаў на ваенную службу. Памежным ураднікам на ўсёй мяжы з Маскоўскай дзяржавай прадпісвалася, каб *«росказалъ кликати на торгохъ и по селамъ при церквахъ, жебы козаки пешие и люди волостные* (sic!)*, которые бы хотели*

---

169 Амбражэй Гваньіні ўпершыню згадваецца 26 красавіка 1564 г. (AGAD, ASK. Oddz. 2. Sygn. 23. K. 21–21v.). З наступнага года яго рота пачынае згадвацца ў Віцебску: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 45, арк. 129.

170 РИБ. Т. 30. С. 644–645; НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 38, арк. 504 адв.

171 Леп'явко С. Українське козацтво у міжнародних відносинах (1561–1591). Чернігів, 1999. С. 15–33.

172 Довнар-Запольский М. Государственное хозяйство... С. 785.

173 LM. Kn. 564. P. 80–81.

*за п[е]н[е]зи наши у войско ити, до рейстру писати на конехъ и пешо, яко хто усхочеть, и з бронями, каковую хто мети можеть»*[174]. У ліпені 1568 г. віцебскі ваявода С. Пац прасіў польнага гетмана Р. Сангушку, каб казацкі ротмістр Біруля *«здешнего люду проч не зводил, нехай бы собе з ыншых сторон, з Литвы* (С. Лепяўка пры цытаванні падкрэсленыя словы чамусьці прапусціў)*, албо з ыншых поветов набывал»*[175]. Калі дадаць, што паняцце «казак» ужывалася нават у дачыненні да татар, якія служылі ў войску ВКЛ, то больш аргументаў, здаецца, не патрэбна, каб паказаць, што казакі ў гэты перыяд часу — не толькі ўкраінская з'ява[176].

Хто ж такія казакі? На нашу думку, гэта асобы нешляхецкага паходжання, якія мелі досвед ваеннай службы, але ў мірны час займаліся сельскай гаспадаркай альбо рамеснай вытворчасцю. Гэта своеасаблівы пераходны тып паміж мірным селянінам і ваеннаабавязаным служэбнікам, які па першым закліку ўладаў быў гатовы ўзяцца за зброю. М. Доўнар-Запольскі выказаў меркаванне, што казакі з'яўляліся вольным сацыяльным элементам і першыя з іх былі перасяленцамі з Маскоўскага княства[177].

Калі прааналізаваць іх службу, то ад драбаў і коннікаў яны адрозніваліся тым, што мелі горшае ўзбраенне і неслі службу на паўпрафесійнай аснове, г. зн. маглі вяртацца ў вольны час да мірных заняткаў[178]. Казакі маглі прыцягвацца да выканання дадатковых работ, такіх як будаўніцтва ўмацаванняў, ахова грузаў і інш., а таксама, безумоўна, да разведачнай дзейнасці. Таннасць, непатрабавальнасць і ўніверсальнасць казакаў прывяла да арганізацыі асобных казацкіх рот, якія эфектыўна выконвалі пастаўленыя перад імі ваенныя задачы.

Такімі былі крыніцы найманага войска ў ВКЛ. Звернемся цяпер да аналізу яго арганізацыі на ўсходнім памежжы краіны ў гады Інфлянцкай вайны.

Упершыню звесткі аб прыпаведванні службы найманым ротам сустракаюцца ў верасні 1562 г. Сярод тых, хто атрымаў прыпаведныя лісты, былі Павел і Багдан Саколінскія, Мікалай Есман, (Марцін?) Курч,

174 РИБ. Т. 30. С. 748–752.
175 AS. T. 7. S. 274–275.
176 *«Приказуемъ под ласкою нашою, жебы жаденъ, хто кольвекъ ку служъбе годенъ, маршалокъ, хоружии, уланъ, муръза, княз[ь], козакъ и фурманъ, в дому не зосталъ»* (LM. Kn. 564. P. 93).
177 Довнар-Запольский М. Государственное хозяйство... С. 785.
178 У лісце С. Паца ад 25 ліпеня 1568 г. ёсць цікавая згадка, што *«з Суража (...) и з сел* (sic!) *стрел[ь]цы князкие, панские и земянские подымают ся»* (AS. T. 7. S. 274–275).

Якуб Шэмет і Міхаіл Кунцэвіч. Юры Тышкевіч, (Марцін?) Яцыніч і (Пётр?) Міклашоўскі былі проста накіраваны ў Оршу, а Серабрынскі (Серабрыцкі?) — у Сураж. Акрамя таго, Анікей Корсак і нейкі Падбярэзскі атрымалі «листы уставные» з накіраваннем на «лежы» ў Копыль. Гэта азначае, што перад гэтым яны ўжо неслі ваенную службу. Такія ж лісты атрымалі татарскія князі з ліку пяцігорцаў[179]. Варта дадаць, што Б. Корсак са сваёй ротай быў накіраваны ў верасні 1562 г. на Полаччыну, на месца дыслакацыі польскага найманага войска[180].

Гэтыя звесткі сведчаць, што ніякага плану фарміравання найманага кантынгента ў кіраўніцтва ВКЛ не было. Пераломным момантам у гэтай справе стала ўхваленне на Віленскім сойме 1563 г. надзвычайных збораў серабшчыны, якая стала асноўнай крыніцай утрымання наймітаў. У жніўні 1563 г. Жыгімонт Аўгуст паведаміў старастам памежных замкаў, што *«люди служебъные прибылые у здешнем панъстве нашом Великом Князьстве Литовъском великий почот через час немалый ховати есьмо умыслили...»*[181]. З кантэксту гэтага ліста бачна, што фарміраванне найманага войска прадугледжвалася рабіць за кошт іншаземцаў — перш за ўсё палякаў.

Восенню 1563 г. распачалося прыпаведванне службы і літоўскім найманым ротам. Па разліку «заслужоного» для роты Ф. Кміты вядома, што яна пачала служыць з 18 кастрычніка 1563 г. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што ў гэты час прыпаведныя лісты атрымалі і іншыя роты.

20 кастрычніка 1563 г. гаспадарскай уладай было зроблена распараджэнне абвясціць на рынках і ў цэрквах пра найм *«козаков пеших и людей волостных»* на ваенную службу *«на конях и пешо, яко хто усхочеть, и з бронями, каковую хто мети можеть, и с чим умее»*. У залежнасці ад роду службы, якасці каня і ўзбраення для іх вызначалася адпаведная стаўка аплаты. У прыватнасці, пешы воін павінен быў атрымаць 2 польскіх злотых за чвэрць, коннік — 3–6 польскіх злотых за такі ж тэрмін службы[182].

Пра склад найманага войска ў другой палове 1563 — пачатку 1564 г. мы можам меркаваць па ўдзельніках Ульскай бітвы. Сярод ротмістраў

179 LM. Kn. 564. P. 120.
180 МВКЛ. Кн. 44 / Падрыхт. А. Груша. Мн., 2001. С. 69–70.
181 РИБ. Т. 30. С. 715–716.
182 Тамсама. С. 748–752.

храніст М. Стрыйкоўскі згадвае Ю. Зяновіча, Б. Корсака, Рыгора Баку[183], Міколу Сапегу, Ю. Тышкевіча[184] і Яна Валмінскага[185]. Усяго ў гэтай бітве ўдзел прыняло каля тысячы коннікаў-наймітаў. Вядома, што ў траўні 1564 г. Ю. Зяновіч атрымаў ад гаспадара гарантыі хуткай выплаты грошай за службу сваёй роты[186]. А Ф. Кміце было нават паабяцана падвышэнне стаўкі «заслужоного» — з 3,5 да 4 коп грошаў[187].

Літоўскія найміты прымалі ўдзел у безвыніковай аблозе Полацка ў верасні 1564 г. Попіс польскіх рот занатаваў, што акрамя іх пад Полацкам знаходзіліся таксама літоўскія роты, якія складаліся пераважна з палякаў[188].

У другой палове 1564 г. улады былі вымушаны скараціць набор на найманую службу з прычыны адсутнасці грашовых сродкаў. У справаздачы Ф. Кміты паведамляецца, што, нягледзячы на выданне прыпаведных лістоў, яго рота не служыла ажно да 11 лістапада 1565 г. *«для неданья пенезей зъ скарбу»*[189]. Той факт, што ў лістападзе 1564 г. улады паспрабавалі склікаць другі раз за год паспалітае рушэнне, паказвае, што іншай альтэрнатывы яму не было.

Пэўны найманы кантынгент у ВКЛ зімою 1564 – вясною 1565 гг. усё ж такі прысутнічаў[190]. У красавіку 1565 г. гаспадара праінфармавалі, што з памежжа адышлі ўсе (!) польскія і літоўскія вайскоўцы. Гэта, хутчэй за ўсё, было звязана з заканчэннем прыпаведнага тэрміну. Грошай на новы тэрмін службы ў кіраўніцтва дзяржавы не было, што з прыкрасцю канстатаваў Жыгімонт Аўгуст[191].

183 Крыніцы не падаюць імя гэтага ротмістра. Аднак па іншых дакументах Метрыкі ВКЛ вядома, што ім з'яўляўся Рыгор Фёдаравіч Бака. Гл.: LM. Kn. 564. P. 100–101, 106–107, 128–130; РИБ. Т. 30. С. 759. За ваенныя заслугі ў жніўні 1564 г. ён атрымаў ад гаспадара 10 зямельных «службаў» у Мозырскай воласці: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 38, арк. 509–509 адв.

184 Іншыя крыніцы, акрамя хронікі М. Стрыйкоўскага, не згадваюць.

185 Згадваецца ў якасці ротмістра толькі адзін раз. У намінацыйным прывілеі на гаспадарскага маршалка ад 1 сакавіка 1572 г. паведамляецца, што Я. Валмінскі служыў пры гетмане М. Радзівіле Рудым, *«в частых битвах з людьми неприятеля нашого князя великого московского (...) будучи и меваючи с порученья его милости гетманского под справою своею почты немалые воиск наших...»* (LM. Kn. 51. P. 303–304).

186 AGAD, AR. Dz. II. Sygn. 42. K. 1–2.

187 АСД. Т. 4. С. 208–210.

188 BN. Rkps. III.6609. Nr. 11.

189 АСД. Т. 4. С. 235–237.

190 Вядома больш-менш дакладна, што на тэрыторыі ВКЛ у гэты час знаходзіліся польскія найміты: Listy. S. 479–487. Гл. р. II, § 3.

191 Ibid. S. 512–513.

Жадаючы папярэдзіць агаленне граніцы ў выніку роспуску паспалітага рушэння, гаспадар у кастрычніку 1565 г. звярнуўся да радных паноў, якія сабраліся на з'ездзе ў Трабах, з ініцыятывай выставіць наймітаў за кошт магнатаў. Ён прасіў сабраць 4 тысячы жаўнераў у дадатак да тых 4 тысяч, якія ўжо знаходзіліся на ваеннай службе[192]. Гэтая неардынарная просьба чарговы раз засведчыла, што ўлады мелі надзвычай абмежаваныя фінансавыя сродкі.

Па нашых падліках, на заклік гаспадара адгукнулася 16 чалавек. Большасць магнатаў і ўраднікаў набрала традыцыйныя па колькасці роты — ад 100 да 250 чалавек (гл. табл. 2.2.4). Сярод іх трэба вылучыць жамойцкага старасту Я. Хадкевіча, які выставіў ажно 1 200 коннікаў (!)[193]. Агульная колькасць жаўнераў склала каля трох з паловай тысяч чалавек. Давесці яе да пажаданай лічбы ў 4 тысячы коннікаў, як бачым, не ўдалося. Жаўнерам вызначалася высокая стаўка «заслужоного» — 5 коп грошаў на чвэрць года. Пачатак службы гэтай групоўкі адлічваўся ад 11 лістапада 1565 г.

Гаспадар гарантаваў магнатам пакрыццё выдаткаў за кошт падаткаў, якія будуць ухвалены на бліжэйшым сойме ў Вільні. Спецыяльна агаворвалася, што яны маюць права распусціць свае почты ў выпадку, калі на трэцюю чвэрць жаўнеры не атрымаюць грошы наперад.

Перад 1 снежня 1565 г. сойм даў сваю згоду на аплату службы наймітаў. Тое ж самае зрабіў гаспадар, дазваляючы нават *«тых пенезей* (г. зн. «заслужоного») *на именьяхъ нашихъ смотрети»*[194]. Аднак праз паўгода, калі тэрмін службы скончыўся, дзяржава не змагла выканаць дадзеных восенню–зімой 1565 г. абяцанняў. Ротмістрам і жаўнерам не выплацілі са скарбу істотныя сумы грошай на працягу ўсяго 1566 г. (гл. р. III, § 2).

---

[192] АСД. Т. 1. С. 138–140. Цяжка зразумець, якія чатыры тысячы наймітаў, выведзеныя ўжо на службу, згадваліся ў дадзеным выпадку. Гэта была занадта вялікая колькасць жаўнераў для фінансавых магчымасцяў ВКЛ. Магчыма, на ўвазе маецца польскі кантынгент, які сапраўды мог мець такія памеры. Праблему ўскладняе той факт, што размежаванне паміж «старымі» і «новапрынятымі» жаўнерамі сапраўды існавала. У гаспадарскім лісце аб скліканні вальнага сойма ў Берасці, датаваным 22 сакавіка 1566 г., згадваюцца *«служебные новопринятые и старые жолнеры»* (РИБ. Т. 30. С. 838–842).

[193] АСД. Т. 1. С. 138–140. Матывы падобных паводзін Я. Хадкевіча прааналізаваны намі ў асобным артыкуле: Januškevič A. Między królem a Radziwiłłami. Kształtowanie kariery politycznej Jana Chodkiewicza w przededniu unii lubelskiej 1569 // Faworyci i opozycjoniści: Król a elity polityczne w Rzeczypospolitej XV–XVIII wieku. Kraków, 2006. S. 167–179.

[194] Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 155–156 прил.

Табліца 2.2.4.

*Найманыя конныя роты (почты), выстаўленыя на службу паводле ўхвалы Трабскага з'езда 1565 г.*

| N | Прозвішча магната | Колькасць жаўнераў | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|
| 1. | Хадкевіч Ян | 1200 | 201 к. (НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 45, арк. 120–120 адв.) |
| 2. | Хадкевіч Рыгор | ? | |
| 3. | Вішнявецкі Канстанцін | 200 | быў ротмістрам |
| 4. | Дарагастайскі Мікалай | 200 | у крыніцы — «Кухмистровичъ» |
| 5. | Сноўскі (Малхер) | 200 | |
| 6. | Война Рыгор | 150 | быў ротмістрам |
| 7. | Кміта (Філон) | 150 | 100 к. (АСД. Т. 4. С. 212–213). Быў ротмістрам. |
| 8. | Осцік (Юры?) | 150 | |
| 9. | Сапега (Мікалай) | 100 | у крыніцы — «пан Сопега маршалок». Згадка як маршалка толькі ад 3.04.1566 (Urzędnicy. S. 93). |
| 10. | Казінскі (Міхайла) | 100 | |
| 11. | Пац Павел | 100 | |
| 12. | Шымковіч Ян | 100 | |
| 13. | Валовіч Астафій | 200+50 | |
| 14. | Курбскі Андрэй | 200 | быў ротмістрам |
| 15. | Сапега Павел | 100 | быў ротмістрам |
| 16. | Дзевялтоўскі Станіслаў | ? | быў ротмістрам |

*Табліца складзена паводле:* НГАБ, ф КМФ–18, воп. 1, спр. 45, арк. 120–120 адв.; спр. 47, арк. 6 адв., 10, 13, 31 адв. — 32, 36 адв. — 37 адв., 107 адв. — 108; АСД. Т. 1. С. 138–140; Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 155–156 прил.

Баючыся нападу маскоўцаў, Жыгімонт Аўгуст загадаў у сакавіку 1566 г. найвышэйшаму гетману Р. Хадкевічу сабраць наяўныя найманыя сілы[195]. Аднак, здаецца, з гэтай задумы нічога не выйшла. Неаплачанае

[195] РИБ. Т. 30. С. 853–855.

войска чакала заканчэння прыпаведнага тэрміну, не жадаючы рабіць лішніх крокаў.

Прыпаведванне службы ў гэты час насіла хутчэй спарадычны характар. З рот, выстаўленых пасля Трабскага з'езда, на трэцюю чвэрць засталося служыць не больш за палову. Вядома дакладна, што працягвалі службу конныя роты Ф. Кміты[196], Р. Войны[197], К. Вішнявецкага[198], А. Курбскага[199]. Ад почту Я. Хадкевіча засталося 700 коннікаў[200]. Астатнія імёны знікаюць з крыніц.

Разгортванне маскоўцамі будаўніцтва замкаў на акупаванай тэрыторыі прымусіла кіраўніцтва ВКЛ больш уважліва звярнуцца да праблем абароны памежных зямель. У жніўні 1566 г. улады зрабілі спробу рэарганізаваць абарончую сістэму на тэрыторыі Полаччыны. Тут былі вызначаны два апорныя пункты — Дзісна і Лепель. Дзісенскі стараста Б. Корсак павінен быў ажыццяўляць агульнае кіраўніцтва абаронай у заходняй частцы Полацкага краю. Новапрызначаны лепельскі стараста Ю. Зяновіч станавіўся кіраўніком абароны на тэрыторыі паўднёвай Полаччыны, а таксама камандуючым над усім найманым войскам і мясцовым земскім апалчэннем. Валасці, якія знаходзіліся паміж Лепелем і Дзіснай, падлягалі размежаванню *«для прилеганья ку замку»*[201]. Гэтыя меры фактычна засведчылі перавод Полаччыны на надзвычайнае становішча.

Гэтых мер яўна было недастаткова. Для аператыўнага супрацьдзеяння варожым намерам на памежжы неабходна было разгортваць сталыя ўзброеныя сілы. Разуменне гэтага ў рэшце рэшт прынесла якасныя змены ў арганізацыю найманага войска ВКЛ.

Пераломным момантам сталі рашэнні Гарадзенскага сойма 1566/1567 гг. Сойм даў згоду на ўзяцце пазыкі ў 64 тысячы коп грошаў пад гарантыю яе выплаты са збораў серабшчыны, ухваленай на 1567 і 1568 гг. Гэтыя сродкі прызначаліся для найму 10 тысяч жаўнераў на паўгадавую службу[202].

196 АСД. Т. 4. С. 213–214.
197 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 13 адв.
198 Тамсама. Спр. 267, арк. 82. Прыпаведны ліст датаваны кастрычнікам 1566 г.
199 Тамсама. Спр. 47, арк. 36 адв. — 37 адв.
200 LM. Kn. 51. P. 113–119.
201 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 41–42, 45–46.
202 АЛРГ. Т. 2. С. 457. Цікава, што на гэтым сойме палякаў прасілі толькі аб фінансавай дапамозе: Тамсама. С. 460.

Ужо ў пачатку працы сойма прыпаведныя лісты на бліжэйшыя паўгода атрымаў кантынгент у складзе 9 конных рот[203] (гл. табл. 2.2.5). Стаўка «заслужоного» была вызначана ў памеры 4 коп грошаў за чвэрць. Усе без выключэння ротмістры альбо належалі да шляхецкіх родаў з усходніх рэгіёнаў краіны, альбо былі з імі злучаны кроўнымі сувязямі. Агульная колькасць гэтай групоўкі склала 1600 чалавек. Гэта былі невялікія сілы. Аднак сам факт прыпаведвання службы для конных рот на зімовы час паказвае, што ў Вільні вырашылі арганізаваць дзейснае супраціўленне ворагу, які працягваў ахопліваць тэрыторыю Полаччыны ланцугом з замкаў.

Табліца 2.2.5.

*Конныя роты найманага войска ВКЛ у канцы 1566 – пачатку 1567 г.*

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | Месца дыслакацыі | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Зяновіч Юры | 200 | Лепель | стараста |
| 2. | Корсак Баркулаб | 200 | Дзісна | стараста |
| 3. | Саколінскі Павел | 200 | Віцебск | падкаморы; меў землеўладанні каля Крывіны на Полаччыне |
| 4. | Корсак Анікей | 200 | Вараноч | дзяржаўца |
| 5. | Яцыніч Марцін | 200 | не вызначана | бацька М. Яцыніча быў жанаты з Ганнай Лукомскай (Boniecki A. Herbarz polski. T. 7. S. 138); гаспадарскі дваранін |
| 6. | Тышкевіч Юры | 150 | не вызначана | меў землеўладанні ва ўсходняй Беларусі |
| 7. | Шолуха Астафій | 150 | Крычаў | Дзяржаўца |
| 8. | Масальскі Андрэй | 150 | Друя | гаспадарскі дваранін |
| 9. | Курч Марцін | 150 | не вызначана | у 1561 г. ажаніўся з Палоніяй Васільеўнай Корсак (з лініі бабыніцкіх Корсакаў) (Boniecki A. Herbarz polski. T. 11. S. 178) |

*Табліца складзена паводле:* НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 151–152. Лакалізацыя зроблена аўтарам.

[203] У кастрычніку 1566 г. служба на падобных умовах была прыпаведана ротам К. Вішнявецкага і Я. Збаражскага, у кожнай з якой было па 200 коннікаў: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 82.

Першы змястоўны спіс драбскіх рот, якім была прыпаведана служба на чарговы паўгадавы тэрмін, датаваны 20 лютага 1567 г. Дзякуючы яму мы маем магчымасць прааналізаваць стан пешага войска на пачатку 1567 г. Улада запэўніла наймітаў у вяртанні ўсіх запазычанасцяў, вызначаючы канкрэтныя тэрміны канчатковых разлікаў — адразу пасля Вялікадня (30 сакавіка 1567 г.) і ў дзень Св. Марціна (11 лістапада 1567 г.). Гэта азначае, што адзначаныя роты служылі ў найманым войску і раней[204] (гл. табл. 2.2.6).

Табліца 2.2.6.

*Драбскія роты найманага войска ВКЛ у пачатку 1567 г.*

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | Месца дыслакацыі | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Гваньіні Амбражэй | 200 | Віцебск | італьянец; упершыню згадваецца 26.04.1564 (AGAD, ASK. Oddz. 2. Sygn. 23. K. 21–21v.). З наступнага года ў Віцебску: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 45, арк. 129. |
| 2. | Любатоўскі Войцех | 150 | Віцебск | ротмістр з такім прозвішчам сустракаецца ў польскім кантынгенце з 1564 (ASW. Oddz. 86. Sygn. 18, 21) |
| 3. | Вілкоўскі Ян | не пазначана | Віцебск | паляк; каралеўскі дваранін (Ferenc M. Dwór Zygmunta Augusta: Organizacja i ludzie. Kraków, 1998. S. 205) |
| 4. | Прэбыслаўскі Франц | не пазначана | Віцебск | упершыню 26.08.1566 (НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 58–59) |
| 5. | Курніцкі Пётр | 200 | Мсціслаў | сустракаецца з 23.06.1563 (АЛРГ. Т. 2. С. 149–151) |
| 6. | Бабаед Дзмітры | 100 | Мсціслаў | сустракаецца ўпершыню |
| 7. | Закрэўскі Ян | не пазначана | Мсціслаў | згадваецца вясною 1563 у Вендэне (гл. табл. 2.2.3) |
| 8. | Аборскі Адам | 300 | Дзісна | накіраваны ў Дзісну ў 1566 (НГАБ, ф. МФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 6–6 адв.) |

[204] Тамсама. Спр. 529, арк. 157–158.

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | Месца дыслакацыі | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|---|
| 9. | Вярбіцкі Ян | не пазначана | Дзісна | сустракаецца ў польскім кантынгенце з 1564 (BN. Rkps III.6609; AGAD, ASW. Oddz. 86. Sygn. 18); памёр у 1568 (Ferenc M. Dwór Zygmunta Augusta. S. 248) |
| 10. | Беляўскі Мацей | не пазначана | Дзісна | сустракаецца адзін раз; раней у польскім кантынгенце згадваўся Рох Беляўскі (AGAD, ASW. Oddz. 86. Sygn. 18; у 1566 у Віцебску: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 39, арк. 723 адв. — 728) |
| 11. | Гульбіцкі Бернат | не пазначана | Дзісна | сустракаецца адзін раз |
| 12. | Русецкі Станіслаў | 200 | Лепель | без імя сустракаецца ў польскім кантынгенце з 1564 (BN. Rkps III.6609), у ASW сустракаецца Пётр (AGAD, ASW. Oddz. 86. Sygn. 18) |
| 13. | Рачкоўскі Юры | не пазначана | Лепель | верагодна, паляк; сустракаецца ўпершыню |
| 14. | Гінталоць Ян | не пазначана | Лепель | італьянец, пазначаны як «поручник венецыянов»; сустракаецца ўпершыню |
| 15. | Камянецкі (Каменскі?) Валянцін | 100 | Сураж | сустракаецца ўпершыню |
| 16. | Серабрынскі Пётр | не пазначана | Сураж | упершыню сустракаецца 22.09.1562 (LM. Kn. 564. P. 120) |
| 17. | Ленскі (Крыштаф) | не пазначана | Гомель | сустракаецца з 16.03.1557 (НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 213 — 213 адв.) |
| 18. | Прэсмыцкі (Аляксей) | 200 | Гомель | сустракаецца ўпершыню |
| 19. | Збышэўскі Станіслаў | не пазначана | Вараноч | сустракаецца ўпершыню |
| 20. | Курніцкі Ян | не пазначана | Вараноч | упершыню сустракаецца 19.08.1566 (НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 35 адв. — 36) |
| 21. | Сяліцкі Богуш | 100 | Орша | сустракаецца ўпершыню |
| 22. | Каменскі (Камянецкі?) Сымон | 150 | Крычаў | сустракаецца ўпершыню; верагодна, няслушна пададзена імя Валенты. Гл.: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 211 адв. — 212 адв. |

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | Месца дыслакацыі | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|---|
| 23. | Галубіцкі (Станіслаў) | 100 | Чачэрск і Прапойск | сустракаецца ўпершыню |
| 24. | Стужынскі Каспар | не пазначана | Кіеў | сустракаецца ў 1557 (НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37. арк. 315) |

*Табліца складзена паводле:* НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 157–158.

У Віцебску, Мсціславе, Дзісне і Лепелі знаходзілася па тры-чатыры роты. Такім чынам, пералічаным гарадам адводзілася роля асноўных цэнтраў абароны. Сярод ротмістраў, якія апынуліся ў спісе, згадваюцца асобы іншаземцаў, а менавіта два палякі і італьянец. Супастаўляючы розныя дадзеныя, можна прыблізна падлічыць агульную колькасць драбаў. Іх налічвалася не менш за тры тысячы чалавек.

25 сакавіка 1567 г. прыпаведныя лісты атрымалі 10 конных ротмістраў. Прозвішчы паловы з іх нам знаёмы па папярэднім спісе. Астатнія сустракаліся на найманай службе ў больш ранні час. Выключэннем з'яўляюцца прозвішчы Р. Чапліча і Я. Госцкага, якія згадваюцца ў крыніцах толькі адзін раз[205] (гл. табл. 2.2.7).

Табліца 2.2.7.

*Спіс конных рот найманага войска ВКЛ ад 25 сакавіка 1567 г.*

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|
| 1. | Трызна Рыгор | 150 | на ўсходнім памежжы ВКЛ сустракаецца ўпершыню |
| 2. | Бабінскі | 150 | сустракаецца 22.09.1562 у Дуброўне (LM. Kn. 564. P. 120); паходзіў з Валыні (AS. T. 7. S. 125–127) |
| 3. | Чапліч Рыгор | 150 | сустракаецца адзін раз; паходзіў з Валыні (AS. T. 7. S. 125–127) |
| 4. | Стравінскі Марцін | 150 | з 16.09.1566 сустракаецца ў Магілёве (НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 78–78 адв.) |

205 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529. Арк. 160–160 адв.

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|
| 5. | Госцкі Ярафей | 150 | сустракаецца адзін раз, паходзіў з Валыні (AS. T. 7. S. 125–127) |
| 6. | Саколінскі Павел | 200 | сустракаецца ў спісе ад 2.12.1566 (гл. табл. 2.2.5) |
| 7. | Курч Марцін | 150 | сустракаецца ў спісе ад 2.12.1566 (гл. табл. 2.2.5) |
| 8. | Масальскі Андрэй | 150 | сустракаецца ў спісе ад 2.12.1566 (гл. табл. 2.2.5) |
| 9. | Тышкевіч Юры | 150 | сустракаецца ў спісе ад 2.12.1566 (гл. табл. 2.2.5) |
| 10. | Шолуха Астафій | 150 | сустракаецца ў спісе ад 2.12.1566 (гл. табл. 2.2.5) |

*Табліца складзена паводле:* НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 160–160 адв.

Імкнучыся ўзмацніць найманае войска, улады ажыццявілі рэарганізацыю яго камандавання. З надыходам вясны 1567 г. агульнае кіраўніцтва найманым кантынгентам было ўскладзена на брацлаўскага ваяводу Р. Сангушку, які стаў выконваць абавязкі польнага (дворнага) гетмана[206]. Гэта было даволі нечаканае рашэнне. Пасада польнага гетмана заставалася вакантнай з сакавіка 1566 г., калі папярэдні гетман Р. Хадкевіч пайшоў на павышэнне. Меркавалася, што гетманскі ўрад трапіць, згодна з традыцыяй, да вопытнага і заслужанага ў ваенных справах чалавека. Аднак было вырашана аддаць прэстыжныя паўнамоцтвы маладому князю з Украіны, які паспеў засведчыць свае якасці военачальніка ў наладжванні абароны на паўднёваўкраінскіх землях.

Гэтае рашэнне гаспадара выклікала неадназначную рэакцыю мясцовай шляхты. Ю. Зяновіч амаль адкрыта выказаў свой пратэст. Даведаўшыся аб прызначэнні новага польнага гетмана, ён фактычна адмовіўся кіраваць раскватараванымі на Полаччыне найманымі жаўнерамі[207]. Відавочна, у гэтым ён бачыў змяншэнне сваіх паўнамоцтваў. Магчыма, Ю. Зяновіч сам разлічваў на гетманскі ўрад. У Полацкім краі ён быў найбольш тытулаваным шляхціцам і аўтарытэтным

[206] Гл. прывілей: AS. T. 7. S. 112; Urzędnicy / Oprac. H. Lulewicz i A. Rachuba. Kórnik, 1994. S. 45.
[207] AS. T. 7. S. 118.

военачальнікам, таму мог спадзявацца на павышэнне ва ўрадніцкай іерархіі.

Увогуле, трэба звярнуць пільную ўвагу на адну цікавую і немалаважную дэталь. У сярэдзіне 60-х гг. XVI ст. усе ключавыя пасады, звязаныя з ажыццяўленнем вайскова-камандуючых функцый, паступова перайшлі ў рукі сваякоў Р. Хадкевіча. Мяркуем, прызначэнне Р. Сангушкі на пасаду польнага гетмана было выклікана не толькі яго прафесійнымі якасцямі вопытнага воіна, але і тым фактам, што ён быў жанаты на дачцэ найвышэйшага гетмана Софіі. Гэтая намінацыя давяршыла расстаноўку на найважнейшых у ваенна-абарончым плане пасадах людзей, непасрэдна звязаных з Р. Хадкевічам.

Ці дало гэта свой плён? Адказ можа быць толькі станоўчым. Асабістыя сувязі дазвалялі наладзіць канструктыўны кантакт і ўзаемапаразуменне, што пазітыўна адбівалася на ажыццяўленні абарончых мерапрыемстваў. Актывізацыя дзейнасці вайскоўцаў у 1567–1568 гг. не ў апошнюю чаргу была вынікам добрай каардынацыі дзеянняў вайсковага кіраўніцтва.

Р. Сангушка прыехаў на Полаччыну ў першай палове траўня 1567 г. Для новага польнага гетмана з самага пачатку задачай нумар адзін стала спыненне будаўніцтва новых замкаў маскоўцаў на Полаччыне. Гэтая праблема сур'ёзна непакоіла вышэйшае кіраўніцтва ВКЛ. Р. Хадкевіч у красавіку 1567 г. з трывогай адзначаў, што маскоўцы, не спыняючыся на дасягнутым, збіраюцца паставіць крэпасці на рацэ Сорыца і нават у Лукомлі[208].

Сапраўды, улетку 1567 г. маскоўцы перанеслі будаўніцтва замкаў углыб левабярэжнай Полаччыны. Для замацавання было выбрана зручнае месца на возеры Суша. Будаўніцтва тут замка мела б значныя стратэгічныя наступствы не толькі ваенна-палітычнага, але і гандлёва-эканамічнага характару: *«...Для того тое местцо на Суши засел, иж бы ся далей в Литву внес и замки свои подставил, а звлаще водле на[й]бол[ь]шого преможеня своего усилуеть Витебск и вси дороги Витебские одыймует, бо на тые местца ездчивали Видбляне, до Риги и до Двины и пред ся яко тако, хотя ж сухим путем торг собе мели и сол[ь] оттоле провадили, а тепер вжо и тую дорогу неприятел[ь] отнял»*[209].

[208] Ibidem.
[209] Ibid. S. 170.

Гэтыя словы Р. Хадкевіча яскрава паказваюць, што кіраўніцтва ВКЛ добра ўсведамляла значэнне плацдарма на возеры Суша. Пабудаваўшы тут замак, маскоўцы забяспечылі б абарону Полацка ад раптоўных udaраў літвінаў з усходняга і паўднёвага бакоў. Неабходна дадаць, што гэты фарпост быў бы непасрэдна звязаны з Улай і дазваляў кантраляваць увесь раён у трохкутніку Полацк — Суша — Ула. Ён ствараў рэальную пагрозу гарадам паўднёвай Полаччыны — Лепелю, Чашнікам і Лукомлю, якія знаходзіліся на апошняй лініі абароны ВКЛ перад маскоўскай зонай акупацыі.

Для Р. Сангушкі замацаванне маскоўцаў на возеры Суша стала першым сур'ёзным выпрабаваннем на новай пасадзе. У ліпені 1567 г. яму ўдалося разбіць непрыяцельскі атрад, які ішоў да занятага плацдарма. У бітве пад Сушай удзельнічала ўсяго каля 2 000 жаўнераў, з іх 1 350 коннікаў, больш за 400 драбаў і 150 казакаў. Яе вынік выдатна паказаў, што найміты могуць паспяхова спраўляцца з маскоўскім непрыяцелем у адкрытых сутыкненнях. Аднак для адабрання занятых маскоўцамі плацдармаў сіл у літвінаў яўна не хапала. Маскоўцы засталіся на Сушы і неўзабаве працягнулі будаўніцтва замка.

Апрача нанясення нечаканых udaраў, эфектыўным метадам супрацьдзеяння магло быць будаўніцтва ўласных ўмацаваных пунктаў. Вядома, што яшчэ ў 1564 г. распачалося ўзвядзенне і абнаўленне ўмацаванняў у Лепелі, Вараночы, Дзісне і Дрысе. Рабілася гэта, мяркуючы па ўсім, даволі інертна, бо завяршэння будаўніцтва так і не адбылося.

Актывізацыя маскоўцаў прымусіла працягваць гэтую справу. Асаблівая ўвага была звернута на Вараноцкае гарадзішча, якое маскоўцы неаднаразова спрабавалі захапіць. Калі адбілі чарговую атаку, у лістападзе 1566 г. для абароны Вараноча была накіравана рота Ю. Зяновіча. Адсюль ён павінен быў турбаваць непрыяцеля і не даваць яму магчымасці як след умацавацца на Уле.

Аднак найбольш важнай задачай бачылася будаўніцтва тут сур'ёзных замкавых умацаванняў. Сапраўды, цяпер Вараноч набываў надзвычай істотнае значэнне. Знаходзячыся недалёка ад Полацка, гэты фарпост прыкрываў дарогу на Вільню і забяспечваў абарону паўднёва-заходняй Полаччыны. Таму Жыгімонт Аўгуст загадаў кінуць усе наяўныя мясцовыя сілы на работы па ўмацаванні Вараноцкага замка,

асабліва акцэнтуючы ўвагу на прыватным інтарэсе Ю. Зяновіча — недалёка знаходзіліся яго землеўладанні[210].

Вясной-летам 1567 г. літвіны імкнуліся апярэдзіць маскоўцаў і пабудаваць умацаванні на найбольш выгадных са стратэгічнага гледзішча пляцоўках на Полаччыне. Увесь час узнікала ў полі зроку будаўніцтва замка ў Чашніках. Князі Лукомскія прасілі ўзвесці замак у Лукомлі, хвалюючыся за сваю вотчыну[211]. Аднак найбольшую ўвагу вайсковага камандавання прыцягвалі тры плацдармы на Дзвіне — Сорыца, Туроўля і Крывіна.

У красавіку 1567 г. літвіны занялі плацдарм у вусці ракі Сорыца, які знаходзіўся паміж Улай і Віцебскам. Сюды, у прыватнасці, была накіравана рота М. Яцыніча[212]. Да будаўніцтва замка, аднак, справа не дайшла.

Неўзабаве сваю ўвагу ўлады пераключылі на Крывіна — месца паблізу ўпадзення ракі Крывінка ў Дзвіну, у чатырох мілях ад Віцебска. У пачатку ліпеня 1567 г. Р. Хадкевіч параіў Р. Сангушку пакінуць месца на Сорыцы і ўсур'ёз заняцца ўладкаваннем на новым месцы. Вядома, аднак, што літоўскія вайскоўцы знаходзіліся на Сорыцы яшчэ ў верасні 1568 г. Напэўна, цікавасць з боку уладаў ВКЛ да яе знікла толькі пасля захопу Улы[213].

Крывіна павінна было стаць альтэрнатывай не толькі Сорыцы, але і другога вельмі важнага плацдарма. Ім з'яўлялася месца ўпадзення ракі Тураўля ў Дзвіну, якраз пасярэдзіне паміж Полацкам і Улай. Гэты плацдарм асабліва зацікавіў Р. Сангушку. Для польнага гетмана ўмацаванне на Туроўлі стала на пэўны час прыярытэтнай задачай. Ён указваў на пагрозу авалодання маскоўцамі гэтым плацдармам і негатыўныя наступствы адмаўлення ад яго, просячы цэнтральныя ўлады як мага больш аператыўна забяспечыць прысутнасць літвінаў на Туроўлі ўсімі неабходнымі сродкамі — ад будаўнічых матэрыялаў і харчавання да вайсковай аховы[214].

Чым жа Туроўля вызначалася са стратэгічнага пункту гледжання? Размяшчэнне тут узброеных сіл стварала добрыя магчымасці для кантролю сітуацыі ў найбольш «гарачай» зоне ваеннага канфлікту. Літвіны

[210] AS. T. 7. S. 109–110.
[211] Ibid. S. 128–129.
[212] Ibid. S. 125–127.
[213] Гл.: Ibid. S. 267–268.
[214] Ibid. S.146–147.

адразалі б ад Полацка Улу, што цудоўна разумела вайсковае камандаванне ВКЛ: *«Естли бы был забудован* (замак на Туроўлі)*, тогды на великой перешкоде был бы Полоцку, а Ула без всякое трудности была бы наша»*[215].

Намеры польнага гетмана выклікалі насцярожанасць у Р. Хадкевіча. Разумеючы станоўчыя якасці тураўлянскага плацдарма, найвышэйшы гетман скептычна ставіўся да магчымасцяў будаўніцтва замка: *«Спытать бы первей неприятеля о то, естли того допустит, бо бы певне того не терпел, а почавши, а не доконать што ж было, одно горший сором»*[216]. Р. Хадкевіч наракаў на адсутнасць патрэбных сродкаў: не было ні людзей для працы і аховы будоўлі, ні харчовага правіянту, ні зброі. Нават калі б удалося адправіць на месца будоўлі дадатковых наймітаў, то знайсці ў ваколіцах харчаванне для іх было немагчыма. Гэтая праблема, дарэчы, запавольвала многія ініцыятывы вайсковага кіраўніцтва. Р. Хадкевіч скардзіўся таксама на сталую адсутнасць сродкаў у скарбе і *«непоспешность врадников скарбных»*[217].

Найвышэйшы гетман прапанаваў будаваць замак у больш бяспечным і аддаленым месцы, дзе не было б непасрэднай маскоўскай пагрозы. Ён раіў звярнуць увагу на Крывіна: *«Напрод, иж реки Двины з него будеть боронить, а проходу к Витебску не пропустит; другое, тым замком и Сорьцы боронити будеть, а надто за Двину проход будеть вольный»*[218]. Немалаважнай дэталлю было тое, што ў будаўніцтве замка ў Крывіне былі зацікаўлены князі Саколінскія, якія паабяцалі выдзеліць сваіх падданых для правядзення будаўнічых работ. Не існавала і праблем з будаўнічымі матэрыяламі, у першую чаргу з лесам. У дадатак Р. Хадкевіч прыводзіў аргумент, што з прычыны аддаленасці сваіх крэпасцей маскоўцы не здолеюць чыніць тут перашкоды дзеянням літвінаў[219].

Р. Сангушка настойваў на сваім варыянце, і на кароткі час яму ўдалося пераканаць найвышэйшага гетмана ў сваёй рацыі. Але ўсё ў рэшце рэшт вырашыў Жыгімонт Аўгуст. Ён выказаўся за канцэнтрацыю сіл на

215 AS. T. 7. S. 134.
216 Ibid. S. 134.
217 Ibid. S. 146–147.
218 Ibid. S. 149–150.
219 Ibid. S. 148–151.

адным пункце, каб не распыльваць па розных месцах і без таго не багатыя рэсурсы. Такім пунктам быў вызначаны Вараноч. Каб забяспечыць належны тэмп будаўнічых работ, гаспадарская ўлада адмовілася ад узвядзення замка ў Чашніках[220]. Добрым сведчаннем наладжвання ў Вараночы жыццядзейнасці (а без будаўніцтва замкавых умацаванняў гэтага не магло адбыцца) служыць гаспадарскі ліст да сялян і мяшчан краіны з запрашэннем перасяляцца ў новае мястэчка[221].

Відавочна, што ў літвінаў не хапала магчымасцяў для хуткага ўзвядзення новых замкаў. Аднак пакрысе ім удавалася ўмацоўваць свае пазіцыі. Да канца Інфлянцкай вайны былі пабудаваны ўмацаванні ў Вараночы, Чашніках, Лепелі і Лукомлі. Назіраліся спробы ўмацавання на новых выгадных плацдармах[222]. Так, у канцы 1569 г. літвінам удалося на кароткі час уладкавацца на возеры Цетча, з відавочнай мэтай стварыць пагрозу маскоўскаму замку на Сушы[223].

Актывізацыя дзеянняў літвінаў мела свой плён. Маскоўцы, атрымаўшы шэраг балючых udараў, спынілі ўзвядзенне ўмацаваных пунктаў на тэрыторыі левабярэжнай Полаччыны (гл. р. I, § 4).

Сімптаматычным у сувязі з гэтым з’яўляецца адзін факт, данесены да нас крыніцамі. Да Б. Корсака ў сярэдзіне верасня 1567 г. дайшлі чуткі, што пасля будаўніцтва замка на Сушы маскоўскі ваявода Ю. Такмакоў меў намер збудаваць паблізу яшчэ адну фартэцыю. Аднак Іван IV не даў на гэта сваёй згоды[224]. Толькі ў траўні 1568 г. маскоўцы асмеліліся пабудаваць замак Туроўля на месцы, да якога прымяраліся ў свой час літвіны[225].

У другой палове 1567 г. дзякуючы зробленым захадам па наладжванні фінансавага забеспячэння ў ВКЛ быў сфарміраваны значны найманы кантынгент. Ён налічваў, па прыблізных падліках, амаль 4 тысячы коннікаў і складаўся прыкладна з 20 рот. Пра гэта мы ведаем з двух каштоўных спісаў ротмістраў, першы з якіх датаваны 19 лістапада 1567 г., а другі — 1 снежня 1567 г.[226] Гэтыя спісы адлюстроўваюць фактычны

[220] Ibid. S. 177, 182.
[221] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 64–64 адв.
[222] AS. T. 7. S. 250–251, 267–268, 281–283, 302–304.
[223] Ibid. S. 355–358.
[224] Ibid. S. 192.
[225] Ibid. S. 258–259.
[226] LM. Kn. 531. P. 42–46.

склад найманага коннага войска ў другой палове 1567 — пачатку 1568 г.[227] (гл. табл. 3.1.4).

Спісы былі складзены згодна з рашэннем ваеннага з'езда ў Лебедзеве паскорыць выплату другой «раты» серабшчыны. У гаспадарскім лісце ўказвалася, што гэта рабілася дзеля таго, каб *«людеи служебъныхъ для потужнеишое воины задержати»*[228]. Можна меркаваць, што найманыя роты падчас ваенных дзеянняў павінны былі дзейнічаць сумесна з паспалітым рушэннем (падрабязней гл. р. III, § 2).

Нягледзячы на збор у 1567 г. дзвюх «ратаў» серабшчыны, у наступным годзе ўлады павінны былі зноў сур'ёзна задумацца над пошукам рэсурсаў для ўтрымання наймітаў. Запазычанасці раслі надзвычай хутка. Жаўнеры ўжо не верылі абяцанням уладаў вярнуць даўгі, наўпрост заяўляючы, што пакінуць службу, калі ім не выплацяць грошы загадзя на наступны прыпаведны тэрмін[229].

Чарговы прыпаведны тэрмін найманай службы заканчваўся на Вялікдзень — у канцы красавіка 1568 г. Для вырашэння крызіснай сітуацыі Жыгімонт Аўгуст даслаў у сакавіку 1568 г. у Барысаў ліст да радных паноў і шляхты, якія яшчэ знаходзіліся ў паспалітым рушэнні, з прапановай абмеркаваць *«обычай, чимъ бы такимъ небезъпечъностямъ забегаючи границы змоцнити»*[230]. У адказ была ўнесена прапанова сабраць вальны сойм, у чым яўна праглядаецца нежаданне прымаць рашэнні ў абыход парламенцкай працэдуры. Жыгімонт Аўгуст пагадзіўся, не хочучы прыпаведваць наймітам чарговы тэрмін службы без ухвалення соймам новых падаткаў[231].

[227] У спісах не сустракаецца імя Яна Лопата. Вядома, што ён быў старастам у Дрысе і ў пачатку 1569 г. узначальваў почт колькасцю 50 коннікаў (В а р о н і н В. Дрыса ў XVI ст. // Commentarii Polocenses Historici = Полацкія гістарычныя сшыткі. 2004. Т. 1. С. 27–28; AS. T. 7. S. 314–315). Астатнія згаданыя ротмістры валодалі на Полаччыне і Віцебшчыне землеўладаннямі і, без вялікага сумневу, мелі месца сталага знаходжання менавіта ў іх. Дакладна вядома, што маёнткі былі ў М. Курча, Б. Лукомскага: AS. T. 7. S. 241–242), Ю. Тышкевіча (LM. Kn. 531. P. 143). Неабходна заўважыць, што ў аператыўных мэтах вайсковае кіраўніцтва магло перакінуць роты на іншыя месцы. Так, П. Саколінскі ў 1567 г. на некаторы час апынуўся ў Крывіна: AS. T. 7. S. 138.

[228] LM. Kn. 531. P. 40–41.

[229] *«Иж товариши жадным обычаем не только чверти, але и годины одное на голые слова приймовать не хочуть»* (AS. T. 7. S. 226–227). Са службы збіралася нават з'ехаць рота Мікалая Радзівіла — сына М. Радзівіла Рудога: LM. Kn. 531. P. 87–88.

[230] LM. Kn. 531. P. 67–69.

[231] AS. T. 7. S. 247. Як выключэнне, 14 красавіка 1568 г. прыпаведныя лісты былі выдадзены для Р. Сангушкі і К. Вішнявецкага: Ibid. S. 248–250.

Адным з галоўных рашэнняў Гарадзенскага сойма 1568 г. стала ўхваленне збору падвойнай серабшчыны (гл. р. III, § 1). Сабраныя грошы павінны былі ісці на аператыўны найм новых рот, якія б замянілі сабой земскае апалчэнне.

Права распараджацца фінансамі атрымаў найвышэйшы гетман. Ён павінен быў адпраўляць ротмістраў са сваімі квітамі да павятовых паборцаў, якім прадпісвалася выплаціць пазначаныя ў іх сумы. Важным момантам ухвалы было ўказанне выплачваць з серабшчыны 1568 г. «заслужоное» толькі securityнанабраным ротам. Пры гэтым у асобным артыкуле адзначалася, што ваяводы, старасты і дзяржаўцы на памежных землях не могуць разлічваць на аплату сваіх рот з новага падатку[232]. Яны маглі атрымаць свае запазычанасці толькі са штрафаў за нявыхад шляхты ў папярэдняе паспалітае рушэнне.

На чым грунтаваўся падобны падыход? Верагодна, шляхта ўбачыла ў серабшчынных грошах сродак узбагачэння памежныхураднікаў. На яе думку, утрыманне рот у памежных замках уваходзіла ў функцыі ўраднікаў, таму выдзяляць ім дадатковыя сродкі было прызнана немэтазгодным.

Увогуле, соймавыя станы не сароміліся ў сваіх «просьбах» адносна рэарганізацыі найманага войска. Яны прапанавалі гаспадару выбіраць ротмістраў з ліку павятовых шляхціцаў, каб з іх было лягчэй патрабаваць кампенсацыі за ўчыненыя крыўды і шкоды. У задавальненні з гэтай неверагоднай просьбы Жыгімонт Аўгуст катэгарычна адмовіў, заявіўшы, што на выбар ротмістраў будзе ўплываць у першую чаргу іх ваеннае майстэрства[233].

Каб аператыўна выправіць стан абароны на памежжы, у траўні 1568 г., падчас працы Гарадзенскага сойма, было вырашана ўхваліць службу для тысячы *«людей пенежных»* (г. зн. наймітаў). «Отправу» са скарбу атрымала сем рот. Побач са знаёмымі прозвішчамі ротмістраў М. Курча, Ю. Тышкевіча, Б. Лукомскага сустракаюцца і новыя — М. Салагуба, Я. Жыжэмскага і нейкага Розскага. У складзе гэтага кантынгента апынуўся Р. Война, які да гэтага служыў у Інфлянтах. Усе яны мелі роты па 150 коннікаў[234]. Р. Хадкевіч паведамляў, што гэты кантынгент накіраваны ў Лукомль у распараджэнне Р. Сангушкі[235].

---

[232] РИБ. Т. 30. С. 459.
[233] Тамсама. С. 459–460.
[234] AS. T. 7. S. 267–268.
[235] Ibid. S. 261–262.

Нягледзячы на выплату грошай, найміты не спяшаліся на месца прызначэння. Пакуль рота Р. Войны дайшла да Лукомля, тэрмін яе службы ўжо скончыўся. Рота М. Салагуба, прыбыўшы на месца прызначэння ў канцы чэрвеня 1568 г., пачала разыходзіцца, як толькі завяршыўся квартальны тэрмін службы праз некалькі тыдняў. Жаўнеры заяўлялі, што *«без пенезей готовых* (г. зн. авансу) *служити не хотят»*[236]. Паведамляючы пра такое становішча, Р. Сангушка атрымаў запэўніванне ад гаспадара, што хутка да наймітаў дойдзе серабшчына, ухваленая на Гарадзенскім сойме 1568 г.[237]

Нягледзячы на цяжкія ўмовы службы, найманаму войску ўдавалася дасягнуць значных перамог над непрыяцелем. Самай бліскучай з іх стаў захоп Ульскага замка ў жніўні 1568 г. Вядома, што ў гэтай аперацыі ўдзельнічалі конныя роты Р. Сангушкі, М. Салагуба, Р. Войны, Ю. Тышкевіча і Б. Лукомскага, драбскія роты Ю. Рачкоўскага і С. Тарноўскага, а таксама казацкія атрады Бірулі, Мінкі і Аскеркі[238].

Відавочна, да восені 1568 г. улады ўстрымліваліся ад маштабнага прыпаведвання службы. Недатаваныя спісы ротмістраў, змешчаныя ў кнізе публічных спраў N 7 Метрыкі ВКЛ, на наш погляд, трэба адносіць менавіта да гэтага часу.

У доказ гэтага ёсць некалькі аргументаў. Па-першае, менавіта ў гэты час дзяржаўны скарб павінен быў атрымаць грошы з сабранай серабшчыны. Па-другое, авалоданне Улай дыктавала патрэбу ўзмацнення абароны. Па-трэцяе, у сярэдзіне верасня 1568 г. Р. Хадкевіч паведамляў Р. Сангушку пра нейкі збор наймітаў у Менску[239]. І, нарэшце, па-чацвёртае, земскі падскарбі М. Нарушэвіч засведчыў у адным са сваіх лістоў, што ў першай палове кастрычніка 1568 г. ротмістры атрымалі «отправу» са скарбу[240].

Адразу заўважым, што гэтыя спісы ў невялікай ступені адрозніваюцца ад спісаў, датаваных 25–30 верасня 1569 г.[241] Верагодна, за адзін год фармальны стан найманага войска істотна не змяніўся (гл. табл. 2.2.8).

Ухвала Гарадзенскага сойма 1568 г. унесла істотныя карэктывы ў справу ўтрымання найманага войска. Яна забараняла прыпаведванне службы для мясцовых ураднікаў. Нагадаем, што ў ёй таксама вызначала-

236 AS. T. 7. S. 277.

237 Сапраўды, вальны сойм замест склікання паспалітага рушэння ўхваліў збор серабшчыны. Выплата яе першай «раты» была прызначана на 24 жніўня 1568 г., другой — на 1 лістапада 1568 г.: АЛРГ. Т. 2. С. 468.

238 Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 417.

239 AS. T. 7. S. 292–295.

240 Ibid. S. 307–309.

241 LM. Kn. 532. P. 85–87.

ся, што сродкі з серабшчыны 1568 г. пойдуць толькі на найм новых рот, а гэта азначала, што старыя запазычанасці пакрываецца не будуць[242].

Табліца 2.2.8.

*Конныя роты найманага войска ВКЛ у другой палове 1568–1569 гг.*

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|
| 1. | Тышкевіч Юры | 200 | |
| 2. | Хадкевіч Андрэй | 200 | сын Рыгора |
| 3. | Зяновіч Крыштаф | 200 | сын Юрыя |
| 4. | Яцыніч Марцін | 200 | |
| 5. | Забалоцкі Уладзімір | 200 | упершыню сустракаецца 11.07.1567 (AS. T. 7. S. 156–157) |
| 6. | Курч Макар | 150 | брат Марціна |
| 7. | Яраславовіч Мікалай | 150 | сустракаецца ўпершыню |
| 8. | Тур Рыгор | 100 | сустракаецца ўпершыню |
| 9. | Івановіч Ілля | 100 | |
| 10. | Улановіч Гасан | 100 | татарын |
| 11. | царэвіч Пуньскі | 100 | татарын; не сустракаецца ў другім спісе; ідэнтыфікаваць не ўдалося |
| 12. | Свідэрскі Ян | не пазначана | паляк |

*Табліца складзена паводле:*
першы спіс — НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 213; другі спіс — LM. Kn. 532. P. 85.

Таму паказальным з'яўляецца рэзкае абнаўленне прозвішчаў ротмістраў. З 12 чалавек толькі чацвёра раней згадваліся ў гэтай якасці. Гэта Ю. Тышкевіч, У. Забалоцкі, М. Яцыніч і татарскі «царэвіч Пуньскі». Чаму дзеля іх парушылі соймавую ўхвалу, для нас застаецца невядомым. Хутчэй за ўсё, іх як незаменную сілу адстаяў найвышэйшы гетман ВКЛ[243].

Безумоўна, у другой палове 1568–1569 гг. на службе заставаліся і іншыя роты мясцовых землеўладальнікаў і ўраднікаў. Цяпер, аднак, яны гэта рабілі без афіцыйнага прыпаведвання, а значыць, без аплаты са

[242] Гэтае рашэнне стала непрыемнай навіной для найвышэйшага гетмана. Ён даваў яму рэзкую негатыўную ацэнку: «*...Iż z tymi diabelskimi wymysły a z decesami, nie z recesami i z naszymi wolnościami byśmy u diabła, Boże obroń, nie byli*» (AS. T. 7. S. 292–295).

[243] Гл. ліст Жыгімонта Аўгуста да Р. Хадкевіча: LM. Kn. 531. P. 136–137. Да іх ліку трэба далучыць І. Саламярэцкага, які зімой 1568/1569 гг. трымаў атрад колькасцю 200 коннікаў і атрымліваў на іх «заплату» са скарбу: Ibid. Kn. 532. P. 25–26.

скарбу. У крыніцах згадваюцца ўжо не роты, а *«почты слуг»*[244]. У пачатку верасня 1568 г. гетманы прыцягваюць да выканання важных заданняў атрады П. Саколінскага і А. Шолухі[245]. Прынамсі да восені 1568 г. працягваў служыць у Чашніках Б. Лукомскі[246].

Характэрна і з'яўленне ў спісе рот на чале з Крыштафам Зяновічам і Макарам Курчам. Першы быў сынам небезвядомага Ю. Зяновіча, а другі — родным братам Марціна, які знаходзіўся на найманай службе з 1566 г. Відавочна, што камандаванне ротамі было даручана сваякам з мэтай абыходу соймавай ухвалы.

Многія роты дазволілі сабе значна спазніцца на месцы прызначэння, як гэта было ў сярэдзіне 1568 г. Цалкам магчыма, што ў сапраўднасці большасць з іх так і не прыбыла на месца службы. У сярэдзіне кастрычніка 1568 г. Р. Хадкевіч з жалем даведаўся, што адпраўленыя за кошт скарбу роты не дайшлі да Р. Сангушкі[247]. 7 снежня 1568 г. земскі падскарбі М. Нарушэвіч паведамляў, што шмат хто з ротных камандзіраў, узяўшы за 6–8 тыдняў да гэтага грошы са скарбу, альбо не выехаў з Вільні, альбо накіраваўся на Падляшша, нават не збіраючыся адпраўляцца на службу[248].

Падобны стан рэчаў пацвярджаецца ў лісце невядомага адрасата да Р. Сангушкі, створаным у пачатку 1569 г. Аўтар ліста паведамляў, што роты разыходзяцца, не даслужыўшы па 4–6 тыдняў прыпаведнага тэрміну. Некаторыя з іх па-ранейшаму дазвалялі сабе прыехаць на месца службы за 3–4 тыдні да яе заканчэння. І гэта пры тым, што «заслужонае» яны атрымлівалі авансам[249].

У 1568–1569 гг. у параўнанні з пачаткам 1567 г. істотна змянілася сітуацыя і сярод драбскіх рот[250] (гл. табл. 2.2.9).

---

244 Напрыклад, у справаздачы Ф. Кміты ёсць такая фармулёўка: *«Почотъ слугъ своихъ сто коней ездныхъ, которыхъ ховалъ на замку Оршанскомъ для вшелякихъ службъ его королевское милости пограничныхъ»* (АСД. Т. 4. С. 246–250). На кожнага такога слугу выдавалася па 2,5 копы грошаў у чвэрць: Тамсама. С. 235–237.

245 Яны былі накіраваны ахоўваць Крывіна: AS. T. 7. S. 281–283.

246 Апошні раз згадваецца 21 кастрычніка 1568 г. у сваім лісце да Р. Сангушкі, дасланым з Чашнікаў. У ім Б. Лукомскі паведамляе пра тое, што яго слугі амаль паміраюць з голаду. Відавочна, што гаворка ішла пра былых жаўнераў яго роты: Ibid. S. 302–304.

247 Ibid. S. 299–300.

248 *«Иншие ротмистры отправу свою* (г. зн. «заслужоное») *от немалого часу вземши, еще из Вилни, не ведати для чого, не выеждчают, а другие теж ку Подляшъю се удали, а на украину до замков поспешити се занехали»* (Ibid. S. 308–309).

249 Ibid. S. 318–319.

250 LM. Kn. 531. P. 42–44.

Табліца 2.2.9.

*Драбскія роты найманага войска ВКЛ у другой палове 1568–1569 гг.*

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | Месца дыслакацыі | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Гваньіні Амбражэй | 200 | Віцебск | італьянец; гл. табл. 2.2.6. |
| 2. | Гваньіні Аляксандр | 200 | Віцебск | італьянец; раней, хутчэй за ўсё, служыў у роце бацькі — Амбражэя |
| 3. | Збышэўскі (Збыхоўскі) Станіслаў | 200 | Віцебск | гл. табл. 2.2.6. |
| 4. | Курніцкі Пётр | 200 | Мсціслаў | гл. табл. 2.2.6. |
| 5. | Серабрыцкі Ян | 100 | Мсціслаў | гл. табл. 2.2.6. |
| 6. | Бабаед Дзмітры | 100 | Мсціслаў | гл. табл. 2.2.6. |
| 7. | Вярбоўскі Бальцэр (Бальтазар) | 200 | Дзісна | паляк; упершыню сустракаецца ў 1564 (AGAD. ASK. Oddz. 2. Sygn. 23. K. 148–165; ASW. Oddz. 86. Sygn. 18) |
| 8. | Яновіч Пётр | 100 | Дзісна | |
| 9. | Буяноўскі Ян | 150 | Чашнікі | сустракаецца ўпершыню |
| 10. | Саколінскі Сямён | 50 | Чашнікі | накіраваны на службу ў ліпені 1567 (AS. T. 7. S. 162–163) |
| 11. | Любатоўскі Войцех | 150 | Сураж | паляк; гл. табл. 2.2.6. |
| 12. | Каменскі Валянцін | 100 | Сураж | гл. табл. 2.2.6. |
| 13. | Сяліцкі Богуш | 100 | Орша | гл. табл. 2.2.6. |
| 14. | Жыжэмскі Фрыдрых | 100 | Орша | сустракаецца ўпершыню; 27.05.1568 «отправу» на службу атрымаў Ян Жыжэмскі (AS. T. 7. S. 267–268) |
| 15. | Прэсмыцкі Аляксей | 200 | Гомель | гл. табл. 2.2.6. |
| 16. | Грамоўскі Геранім | 100 | Гомель | сустракаецца ўпершыню |
| 17. | Русецкі Станіслаў | 200 | Лепель | сустракаецца ў польскім кантынгенце з 1564 |
| 18. | Навасялецкі Каспар | 50 | Браслаў | сустракаецца ўпершыню |
| 19. | Ракуса Іван | 100 | Дрыса | гараднічы, сустракаецца адзін раз |
| 20. | Радзімінскі Ян | 100 | Вараноч | 20.08.1566 у Браславе сустракаецца Ян Радзімскі (НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 37 адв. — 38) |
| 21. | Камянецкі Сымон | 150 | Крычаў | гл. табл. 2.2.6. |

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | Месца дыслакацыі | Заўвагі і дапаўненні |
|---|---|---|---|---|
| 22. | Галубіцкі Станіслаў | 100 | Прапойск | гл. табл. 2.2.6. |
| 23. | Стаўскі (Славенскі?) Юры | 100 | Чачэрск | сустракаецца ўпершыню |
| 24. | Здравец (Здаравец) Ян | 100 | Барысаў | сустракаецца ўпершыню |

*Табліца складзена паводле:*
першы спіс — НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 211 адв. — 212 адв.;
другі спіс — LM. Kn. 532. P. 85–87.

Гарнізоны памежных замкаў істотна абнавіліся. Толькі восем ротмістраў засталося служыць на старым месцы пры той жа колькасці жаўнераў. С. Збышэўскі (Збыхоўскі) і В. Любатоўскі змянілі адпаведна Вараноч і Сураж на Віцебск, а Я. Серабрыцкі (Серабрынскі?)[251] з Віцебска пераехаў служыць у Мсціслаў. У 1569 г. рота К. Навасялецкага перайшла з Браслава ў Мсціслаў, а рота І. Ракусы пакінула службу. Зніклі са спісаў роты Я. Вілкоўскага, Ф. Прэбыслаўскага (Віцебск), Я. Закрэўскага (Мсціслаў), А. Аборскага, М. Бяляўскага, Б. Гульбіцкага (Дзісна), К. Ленскага (Гомель), П. Серабрыцкага (Сураж)[252]. Прозвішчы дзевяці ротмістраў сустракаюцца ўпершыню. Змянілася і размеркаванне рот паміж замкамі. У такіх крэпасцях як Віцебск, Дзісна, Лепель і Вараноч колькасць рот зменшылася. У той жа час у спісе з'явіліся новыя назвы — Дрыса, Чашнікі, Барысаў[253].

Улады вырашылі ў гэты час звярнуць больш пільную ўвагу на стан памежных замкаў[254]. Вясной 1568 г. былі адноўлены будаўніцтва і рамонт умацаванняў у замках на Полаччыне[255]. У ліпені 1568 г. сюды для будаўнічых работ меркавалася даслаць 1 400 чалавек з неабходным інструментам[256]. Кіраўніцтва ВКЛ непакоіў стан умацаванняў у Дрысе,

251 26 жніўня 1566 г. ён згадваўся ў Віцебску: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 58–59.
252 Магчыма, Ян і Пётр Серабрыцкі — адна асоба.
253 Спіс не ўключае ўсіх рот, якія служылі на ўсходнім памежжы ВКЛ. Вядома, што ўлетку 1568 г. у Віцебску знаходзілася рота С. Вазніцкага (AGAD. Archiwum Publiczne Potockich. Sygn. 9. Teka 1. K. 13–14). У верасні 1568 г. яна была адпраўлена на абарону Крывіна, а ўжо ў кастрычніку 1568 г. апынулася ў нядаўна захопленай у маскоўцаў Уле: AS. T. 7. S. 299–300. Верагодна, рота С. Вазніцкага не мела сталага прымацавання да якогасьці замка і выкарыстоўвалася для аператыўных патрэб.
254 *«...Тамошние вси замки наши, украиные, суть злого опатреня, а стрелбою, живностями, людьми и в будованю лепшого опатреня потребують»* (AS. T. 7. S. 258–259).
255 Ibid. S. 250–251.
256 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 190 адв. — 192.

Дзісне, Вараночы, Лепелі, Чашніках. Актывізацыя дзеянняў літвінаў у немалой ступені была звязана з будаўніцтвам маскоўцамі крэпасці на месцы ўпадзення Туроўлі ў Дзвіну[257].

Пасля адабрання Улы найважнейшай задачай для ўладаў стала забеспячэнне абароназдольнасці гэтага замка. У Вільні не без падстаў асцерагаліся, што маскоўцы паспрабуюць вярнуць сабе гэты важны стратэгічны пункт. Жыгімонт Аўгуст загадаў мабілізаваць усе наяўныя сродкі. Ва Улу тэрмінова былі адпраўлены рабочыя для правядзення будаўнічых работ, харчаванне са «шпіхлераў», жаўнеры з бліжэйшых крэпасцей.

Нават военачальнікі задзейнічалі ўласныя сродкі. Так, Р. Хадкевіч выказаў гатоўнасць прыехаць ва Улу, спачатку даслаўшы туды рабочых і прадукты са сваіх маёнткаў з усходняй Беларусі[258]. Р. Сангушка на абарону Ульскага замка выдаў 720 коп грошаў, якія пайшлі на аплату найма領ных жаўнераў[259].

Аднак у цэлым увага да праблем абароны і найманага войска з боку цэнтральных уладаў працягвала слабець. У сакавіку 1569 г., прыняўшы рашэнне ўдзельнічаць у Люблінскім сойме, Полаччыну пакінуў Р. Сангушка[260]. Яго функцыі на кароткі час перайшлі да Б. Корсака. Аднак той не пажадаў выконваць цяжкую місію камандуючага дэзарганізаваным і незабяспечаным войскам. Сам Р. Сангушка бачыў свайго наступніка ў асобе маладога падстолія Андрэя Хадкевіча. Жыгімонт Аўгуст быў не супраць перадачы таму паўнамоцтваў камандуючага, аднак свой голас супраць падаў найвышэйшы гетман — бацька А. Хадкевіча[261].

Такім чынам, у 1568–1569 гг. разам з надыходам зацішша на ваенным фронце ўвага да найманага войска пачынае прыкметна слабець. Улады займаюцца больш унутрыпалітычнымі справамі, асабліва заключэннем уніі з Польшчай. Немалую ролю адыгрывала і хранічная адсутнасць фінансавых сродкаў у скарбе.

---

257 AS. T. 7. S. 258–259.
258 Ibid. S. 288–289.
259 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 232–233.
260 Імкненне пакінуць Полаччыну Р. Сангушка выказваў яшчэ ў сакавіку 1568 г.: AS. T. 7. S. 245–246.
261 Ibid. S. 338–340. Цікава, што ў чэрвені 1570 г. К. Зяновіч адпраўляўся на найманую службу пад камандаванне А. Хадкевіча: AGAD, AR. Dz. II. Sygn. 66.

Падводзячы вынікі, неабходна заўважыць, што ўтрыманне найманага войска ў ВКЛ ушчыльную залежала ад ухвалення і збору надзвычайных падаткаў. Дэфіцыт наяўных сродкаў у скарбе ствараў сур'ёзныя праблемы з фінансаваннем наймітаў. З прычыны недахопу харчавання і грошай зіма і ранняя вясна станавілася крызісным перыядам для ўтрымання жаўнераў на службе.

У гэткіх цяжкіх умовах найміты часта пераходзілі да адкрытых злоўжыванняў зброяй, у прыватнасці, рабавалі мірнае насельніцтва. Падобныя дзеянні стваралі дзяржаве дадатковыя праблемы (падрабязней гл. р. III, § 2).

Аднак адмовіцца ад выкарыстання найманага войска не было ніякай магчымасці, бо яно больш-менш эфектыўна закрывала тыя прарэхі ў сістэме абароны, якія было не пад сілу закрыць паспалітаму рушэнню і мясцовым узброеным сілам. Найміты з'яўляліся тым незаменным рэсурсам, які дазваляў паставіць забеспячэнне абароны на стабільную прафесійную аснову.

## § 3. Польскі найманы кантынгент: ілюзія дапамогі ці нявыкарыстаныя магчымасці?

Для ўзмацнення ўзброеных сіл ВКЛ Жыгімонт Аўгуст з самага пачатку ўмяшання ў інфлянцкі канфлікт імкнуўся прыцягнуць найманы кантынгент з суседняй Польшчы. Польскія жаўнеры былі вядомы сваёй добрай падрыхтоўкай і выдатнымі баявымі якасцямі. Таму яны маглі значна павялічыць ваенны патэнцыял ВКЛ, уласных рэсурсаў якога было яўна недастаткова для эфектыўнага ўдзелу ў Інфлянцкай вайне.

Польскі найманы кантынгент з'яўляўся асобнай вайсковай адзінкай, якая заняла самастойнае месца ў структуры ўзброеных сіл ВКЛ у 1561–1566 гг. Польскія жаўнеры свядома не жадалі «змешвацца» з літоўскімі фарміраваннямі, патрабуючы для сябе асобнага камандавання, асаблівых умоў службы і нават судовага імунітэту.

У красавіку 1561 г. польскія ротмістры выставілі Жыгімонту Аўгусту «кандыцыі» — спіс умоў, на якіх яны пагаджаліся несці службу ў Літве[262].

[262] Jasnowski J. Materiały do działalności... S. 273–274.

Іх першым патрабаваннем было прызначэнне гетмана (камандуючага) з Польшчы. Яны катэгарычна адмаўляліся падпарадкоўвацца вайсковаму камандаванню ВКЛ[263]. Найміты патрабавалі дакладнага вызначэння ставак «заслужонога», тэрміну службы і кампенсацый за патэнцыяльныя страты. Грошы за службу павінны былі выдавацца ў абавязковым парадку на пачатку прыпаведнай чвэрці. Яшчэ адным патрабаваннем з'яўлялася выданне асобнай «уставы» на харчовыя прадукты.

Варта падкрэсліць, што ў «кандыцыях» адназначна заяўлялася аб *«niechuci od wszech obywateli księstwa Litewskiego przeciwko narodowi polskiemu»*, аб тым, што *«nas* (палякаў) *sobie za nieprzyjacieli poczytają»*[264]. Ротмістры згадвалі нават нежаданне літвінаў ісці на заключэнне уніі з Польшчай як паказчык варожага і нядобразычлівага стаўлення. Гэта яскрава паказвае, што польскія жаўнеры непрыязна ставіліся да жыхароў ВКЛ, а гэта не магло не адбіцца ў далейшым на двухбаковых зносінах. Ротмістры падкрэслівалі, што дапамога саюзніку будзе аказвацца толькі з прычыны просьбы Жыгімонта Аўгуста. Важна адзначыць, што польскі бок бадай што ўпершыню паставіў ваенную дапамогу ў залежнасць ад перспектыў польска-літоўскіх узаемадачыненняў.

Гаспадар пайшоў насустрач патрабаванням наймітаў, прызначыўшы іх гетманам люблінскага кашталяна Фларыяна Зэбжыдоўскага[265]. Польскія ротмістры пасля прыняцця на службу яшчэ раз удакладнілі свае ўмовы. Для нас найбольш цікавым з'яўляецца той факт, што яны зноў падкрэслілі сваё нежаданне падпарадкоўвацца літоўскаму боку. Ротныя камандзіры абгрунтоўвалі гэта тым, што бяруць грошы з каралеўскага скарбу[266]. Больш канкрэтна былі акрэслены пытанні, звязаныя з утрыманнем вайскоўцаў. Так, напрыклад, ротмістраў хвалявала, каб цэны на харчаванне былі больш прымальнымі, чым пры пазвольскай выправе 1557 г.

Першапачаткова «для інфлянцкай патрэбы» ў Польшчы планавалася навербаваць дзве тысячы коннікаў і тысячу драбаў[267]. Паводле да-

263 *«...Ani głosu ich* (г. зн. літвінаў) *w rozkazowaniu żadnym nad sobą słuchać nie chcemy, gdyż narod polski tak w pięknej a wdzięcznej swobodzie zrodzony, (...) nie przywykł na sobie nosić cudzoziemskiego rozkazania, ani zwierzchności żadnej, ani też języka postronnego słuchać, ani żadnej niewoli nie przywyk»* (Ibid. S. 274).

264 Ibid. S. 273.

265 Намінацыйны акт быў выдадзены ў Вільні 18 красавіка 1561 г.: Ibid. S. 275.

266 Ibid. S. 276.

267 Ibid. S. 271.

дзеных першага попісу, які адбыўся на тэрыторыі Кароны 9–12 чэрвеня 1561 г., польскі кантынгент налічваў 2 304 конніка і 1 381 драба[268] (паводле іншых дадзеных — 1 216 драбаў[269]) і складаўся з 15 конных і 8 драбскіх рот.

Польскае войска, аднак, марудна рухалася ў Інфлянты і не паспела прыняць удзел у штурме Тарваста, які здзейснілі літвіны. Увогуле, ацэнка дзейнасці польскага найманага войска ў 1561 г. Жыгімонтам Аўгустам была яўна адмоўнай: «*Służebnych polskich acz szkody wielkie a posługa żadna jeszcze się nie pokazała*»[270].

Многія роты восенню 1561 г. для ўзнаўлення сіл былі накіраваны на «лежы» на тэрыторыю Завілейскай Літвы. Назіраліся першыя адыходы са службы: войска пакінулі конныя роты Адрыяна Лоскага і Станіслава Шафранца.

Першая зімоўка ў Інфлянтах стала сур'ёзным выпрабаваннем для польскіх драбаў. Іх колькасць істотна зменшылася. Характэрным прыкладам можа служыць рота Пятра Брандыса. За зіму яна страціла 50 чалавек: многія разбегліся, шмат жаўнераў памерла ад хвароб. У красавіку 1562 г. ротмістру ўдалося папоўніць сваю роту і зноў давесці лік жаўнераў да 150. Аднак у агульным плане ў гэты час колькасць польскіх драбаў заставалася адносна невысокай — усяго толькі 600 чалавек[271].

У траўні 1562 г. польскі кантынгент быў перадыслакаваны на тэрыторыю паўночна-ўсходняй Беларусі. Гэта было звязана з пераносам ваенных дзеянняў на памежжа з Маскоўскай дзяржавай. Гаспадарская канцылярыя выдала спецыяльныя лісты да шляхты і ўраднікаў Полацкай зямлі, у якіх абгрунтоўвалася патрэба размяшчэння найманых жаўнераў і агаворвалася працэдура вырашэння спрэчных пытанняў з мясцовым насельніцтвам. Польскія вайскоўцы атрымалі спецыяльную «ўставу» на прадукты харчавання. Пасрэднікам паміж наймітамі і палачанамі быў прызначаны Б. Корсак[272].

Бедныя і спустошаныя раёны на памежжы з Масковіяй значна абцяжарвалі ўмовы службы польскіх жаўнераў. Знаходжанне на Полаччыне ў 1562–1564 гг. суправаджалася для іх значнымі праблемамі з харча-

[268] Jasnowski J. Materiały do działalności... S. 297–298.
[269] Semkowicz W. Popis wojska polskiego... S. 5–6.
[270] Listy. S. 357.
[271] Jasnowski J. Materiały do działalności... S. 297–298.
[272] МВКЛ. Кн. 44. С. 41–46.

ваннем і хранічнай затрымкай грошай за службу. Палякі скардзіліся, што *«в том краи живности с потребу на себе и на кони свои достати [и] купити не могуть, а хотя дей што и достануть, ино вельми дорого платити мусять»*[273]. Сітуацыя была настолькі цяжкай, што ў вайсковым лагеры ўзнік сапраўдны голад. Сярод жаўнераў было шмат хворых, многія паміралі. Як вынік, людзі пачалі ўцякаць з войска. Варта адзначыць, што нават памкненні здзейсніць ваенныя выправы на тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы не ў апошнюю чаргу дыктаваліся патрэбай наймітаў пракарміць сябе[274].

Праблемай было і тое, што жаўнеры не маглі як след разгарнуцца на полі бою. Яны павінны былі займацца пошукам непрыяцеля, які зусім не імкнуўся сустрэцца з імі ў адкрытым баі. У жніўні 1562 г. польскім наймітам пашчасціла, і яны натрапілі пад Невелем на вялікую вайсковую групоўку А. Курбскага. Невельская бітва стала найбольш гучнай ваеннай падзеяй з удзелам польскага войска за ўвесь час Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг. Вядома, што ў ёй удзельнічала 9 конных рот[275].

Важна адзначыць, што польскія жаўнеры, праявіўшы ініцыятыву ў пошуку праціўніка, дзейнічалі без узгодненасці з літоўскім камандаваннем. Пра гэта сведчыць ліст Ф. Зэбжыдоўскага, у якім ён распавёў аб намерах перасекчы мяжу ў раёне Невеля, каб даць бой маскоўцам, а заадно і захапіць здабычу ў ворага[276].

Самастойная ініцыятыва палякаў выклікала вялікае незадавальненне найвышэйшага гетмана ВКЛ М. Радзівіла Рудога. Гэтаму ёсць сваё тлумачэнне. Улады ВКЛ наўмысна не давалі палякам як след разгарнуцца на полі бою, бо не былі зацікаўлены ў большай іх актыўнасці ў параўнанні з літоўскім войскам.

---

[273] Тамсама. С. 46.

[274] *«Wszyscy obawatele onej połockiej ziemie niemniej się skarżą, że ich wyżywić nie mogą (...) dla czego sami ci służebni nasi żądają w ziemię nieprzyjacielską ciągnąć gdzieby się mogli żywnością poratować»* (Listy. S. 387–389).

[275] Ю. Ясноўскі пералічвае ўдзельнікаў бітвы паводле дакумента, які захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве: Патоцкі, Замойскі, Збароўскі, З. Зэбжыдоўскі, Сэцыгнёўскі, М. Вансовіч, С. Вансовіч, М. Рэй, Тарноўскі: Jasnowski J. Materiały do działalności... S. 269. Л. Гурніцкі і А. Гваньіні падаюць крыху інакшы спіс ротмістраў: Станіслаў Лесьнявольскі, браты Якуб і Павел Сэцыгнёўскія, Станіслаў Замойскі, Мікалай Сеняўскі, Мікалай Патоцкі, Ян Збароўскі, Мікалай Аляськіцкі, Ян Белдоўскі. Гл.: Górnicki Ł. Dzieje w Koronie... S. 128; Gwagnini A. Kronika. S. 116–117.

[276] Jasnowski J. Materiały do działalności... S. 289–290.

Восенню 1562 г. польскі найманы кантынгент істотна зменшыўся. На службе засталіся толькі 6 конных рот агульнай колькасцю 1 308 жаўнераў. З войска з'ехаў гетман Ф. Зэбжыдоўскі. Часова яго функцыі выконваў Станіслаў Лесьнявольскі.

Падчас трагічнай для ВКЛ зімы 1563 г. польскі кантынгент быў прадстаўлены ў мінімальных памерах. Паводле хронікі М. Стрыйкоўскага, у распараджэнні М. Радзівіла Рудога ў перыяд аблогі Полацка было толькі 1 400 польскіх коннікаў[277]. Вядома таксама, што тры альбо чатыры роты польскіх драбаў знаходзіліся ў абложаным горадзе[278].

Страта Полацка засведчыла патрэбу прыцягнення знешніх рэсурсаў для арганізацыі эфектыўнай абароны. Каронны сойм пайшоў на ўхваленне надзвычайных падаткаў на ўтрыманне найманага кантынгента ў ВКЛ і Інфлянтах. Новыя польскія роты з'явіліся тут, верагодней за ўсё, у сярэдзіне 1563 г. Колькасць вайскоўцаў павялічылася амаль да 9 тысяч чалавек[279]. Аднак збор такога вялізнага войска аказаўся непатрэбным, бо Княства захоўвала перамір'е з Маскоўскай дзяржавай ажно да пачатку 1564 г.

Большасць наймітаў напярэдадні зімы традыцыйна разышлася на «лежы». Польскае войска зменшылася да 1 130 коннікаў і 1 970 драбаў. Больш-менш дакладна вядома, што ў пачатку 1564 г. яно знаходзілася ў раёне Барысава. Зыходзячы з гэтага, можна меркаваць, што асноўнай задачай польскіх жаўнераў з'яўлялася ахова тэрыторыі паміж Полацкам і Вільняй. Нягледзячы на тое, што пасля беспаспяховага заканчэння перамоў у Маскве ваенныя дзеянні разгарэліся з новай сілай, палякі не атрымалі магчымасці ў іх паўдзельнічаць. Пасля перамогі ў Ульскай бітве М. Радзівіл Руды наўмысна затрымаў іх удалечыні ад тэатру ваенных дзенняў.

Летам 1564 г. лічба польскіх вайскоўцаў зноў істотна павялічылася. Вядома, што ў безвыніковай выправе на Полацк, якая адбылася ў верасні

[277] Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 413.

[278] Крыніцы згадваюць прозвішчы Вярхлінскага (Wierzchlejski Olbrycht? Wojciech?), Варшэўскага (Warszawski Jan), Халмецкага (Хэлмскага?) (ідэнтыфікаваць не ўдалося), Ленскага (ідэнтыфікаваць не ўдалося): РИО. Т. 71. С. 368.

[279] Wimmer J. Siły zbrojne Korony... S. 50. Падлікі М. Пляўчыньскага яўна завышаны. Паводле іх, колькасць жаўнераў у конных ротах складала каля 7 700, а ў драбскіх — каля 8 700 чалавек (адпаведна 37 і 32 роты). Гл. Plewczyński M. Materiały do zagadnienia liczebności i organizacji wojska polskiego w latach 1506–1573 // Studia i Materiały do Historii Wojskowości. 1990. T. 33. S. 329.

1564 г., удзельнічала 4 900 конікаў і 3 700 драбаў, адпаведна ў складзе 23 конных і 18 драбскіх рот[280]. Гэта, дарэчы, была адзіная значная акцыя, у якой палякі і літвіны прымалі супольны ўдзел.

Ёсць звесткі, што гэтая вялікая групоўка засталася зімаваць на тэрыторыі ВКЛ і Інфлянтаў[281]. У пачатку 1565 г. яна падзялілася на тры часткі: адна колькасцю 2 тысячы коннікаў на чале з М. Патоцкім рушыла ў Віцебскае ваяводства, другая засталася ў раёне Глыбокага (*«na hłobowskim gościńcu»*), трэцяя дыслакавалася ці то ў Інфлянтах, ці то каля іх межаў у Жамойці[282]. Верагодна, менавіта апошняя групоўка здзейсніла слынны рэйд па Пскоўшчыне ў сакавіку 1565 г. (гл. р. I, § 4).

Паводле дадзеных Скарбова-Вайсковых Актаў, у 1565 г. польскае войска дасягнула сваёй максімальнай лічбы. Колькасць толькі коннікаў склала 7 080–7 200 чалавек[283]. Маштабная мабілізацыя была звязана з намерамі гаспадара нанесці сакрушальны ўдар па непрыяцелю. Найм такой значнай колькасці жаўнераў, як і ў 1563 г., дазволіла зрабіць ухвала кароннага сойма, якая забяспечвала фінансаванне войска.

Аднак гэтыя высілкі ўладаў скончыліся неспадзяванымі наступствамі. Па дарозе на месца службы найміты ўчынілі страшэнныя шкоды мірным жыхарам у заходняй частцы ВКЛ і Інфлянтах[284]. Праход наймaных рот меў такія спусташальныя наступствы для мясцовых землеўладальнікаў і сялян, што прымусіў кіраўніцтва ВКЛ правесці спецыяльнае расследаванне. Яно выявіла, што ва ўмовах і без таго не надта папулярнай вайны дзеянні жаўнераў могуць стаць падставай для зусім непажаданых унутраных канфліктаў.

Вайскоўцы адбіралі ў насельніцтва ВКЛ харчаванне, усяляк імкнуліся ўзбагаціцца за яго кошт. Асабліва часта рэквізавалася збожжа. Так, ротмістр Венцлаўскі ўзяў на Берасцейшчыне па 170 бочак жыта і аўса. Былі сітуацыі, калі ў сялян пад рознымі прэтэкстамі адбіраліся гро-

280 BN. Rkps. III.6609. Nr. 11. Лічбы, якія прыводзяцца М. Пляўчыньскім (8 800 коннікаў і 4 500 драбаў), на наш погляд, значна завышаны і не адлюстроўваюць рэальнага стану рэчаў: Plewczyński M. Materiały… S. 329–330.

281 З войска з'ехала толькі рота Я. Зарэмбы. Ротмістры Я. Латальскі і С. Гурка таксама з'ехалі ў Польшчу, але пакінулі свае роты на месцы службы: Listy. S. 485–487.

282 AGAD, AR. Dz. IV. T. 35. Sygn. 502. K. 39–42; Listy. S. 485–487. Аб наяўнасці вялікага польскага войска сведчыць таксама Метрыка ВКЛ: РИБ. Т. 30. С. 767–769.

283 Wimmer J. Siły zbrojne Korony… S. 50; Plewczyński M. Materiały… S. 330.

284 На гэта ўказвае гаспадарскі ліст да М. Радзівіла Чорнага ад 3 траўня 1565 г., у якім паведамляецца аб шкодах, нанесеных польскімі жаўнерамі ў Інфлянтах: Listy. S. 510–511.

шы[285]. Згодна з вынікамі праведзенай праз гаспадарскіх камісараў праверкі, толькі некалькіх рот польскіх драбаў нанеслі шкоды на 646 злотых — значную па тых часах грашовую суму[286]. Не спыняліся польскія жаўнеры і перад забойствамі[287].

Злачынствы польскіх жаўнераў былі настолькі маштабнымі, што справа дайшла да Віленскага сойма 1565/1566 гг. Паслы ад Валынскай зямлі скардзіліся, што польскія найміты *«немалую шкоду и сказу именьям поделали и як збожъе, так и инъшие живности без заплаты брали»*[288]. Рэха гэтых падзей адлюстравалася нават ва ўхвалах соймаў 1566/1567 і 1568 гг.[289]

Крыніцы з кароннага скарбу засведчылі, што ў 1566 г. польскае войска мела ўнушальныя памеры — прыкладна 6 500 коннікаў і 3 500 драбаў[290]. Аднак цяжка ўявіць, каб так было на самай справе. З восені 1565 г. абарону Інфлянтаў забяспечваў почт Я. Хадкевіча. Летам 1566 г. Жыгімонт Аўгуст непакоіўся за стан абароны Інфлянтаў. Каб вырашыць праблему, Я. Хадкевіч быў прызначаны інфлянцкім гетманам, што фактычна азначала перадачу яму ваенных паўнамоцтваў у гэтым краі. Урэшце, нам нічога невядома пра баявыя акцыі польскіх вайскоўцаў у гэты час. Таму дадзеныя каронных дакументаў з'яўляюцца, хутчэй за ўсё, намерамі, якія засталіся на паперы.

Такім чынам, ужо ў 1566 г. асобны польскі найманы кантынгент фактычна перастаў існаваць. У наступным годзе польскі сойм спыніў фінансаванне на ваенныя патрэбы, убачыўшы упартае нежаданне літвінаў ісці на заключэнне уніі. Польскае войска як асобная структурная адзінка канчаткова перастае згадвацца. З гэтага часу кіраўніцтва

[285] Нейкі Добэк з роты Я. Пісарскага абвінаваціў трох сялян у раненні жаўнера (што аказалася няпраўдай), за што тыя павінны былі выплаціць 8 злотых: AGAD, ASW. Oddz. 86. Sygn. 20. K. 65.

[286] Ibid. K. 154. У іншым дакуменце зафіксавана яшчэ большая лічба — 927 злотых: Ibid. Sygn. 19b.

[287] Гл.: РИБ. Т. 30. С. 808–810.

[288] АЛРГ. Т. 2. С. 181.

[289] Гл.: Максимейко Н. Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 г. Харьков, 1902. С. 176.

[290] Wimmer J. Siły zbrojne Korony... S. 50. Прыведзеныя М. Пляўчыньскім дадзеныя ў 14 700 чалавек не пацвярджаюцца ў крыніцах. Гл.: Plewczyński M. Materiały... S. 330. Ёсць інфармацыя, што ў 1565 г. на службе знаходзілася 29 конных і больш за 9 драбскіх рот: BCzart. Teki Naruszewicza. Sygn. 74. IV. Nr. 169. K. 691–698.

ВКЛ звяртаецца да фарміравання найманага кантынгента пераважна за кошт мясцовых людскіх і матэрыяльных рэсурсаў (гл. р. II, § 2).

Некаторыя польскія роты заставаліся на службе па ўласнай ініцыятыве[291]. Іх утрыманне было ўскладзена на скарб ВКЛ[292]. У канцы 1567 г. чатыры такія роты апынуліся ў спісах на выплату «заслужоного» з серабшчыннага падатку[293]. Сам факт прызначэння выплаты з літоўскіх крыніц сведчыць, што цяпер яны разглядаліся як частка найманага войска ВКЛ.

Апошні раз польскі кантынгент прыняў удзел у ваенных мерапрыемствах на тэрыторыі ВКЛ у другой палове 1567 г. Палякі склалі аснову гаспадарскай гвардыі, якая суправаджала Жыгімонта Аўгуста падчас збору паспалітага рушэння пад Маладзечна. Яе першы попіс быў прызначаны на 25 ліпеня 1567 г. на мяжы ВКЛ і Польшчы[294]. Для наймітаў была вызначана спецыяльная «ўстава», дзе кошты на прадукты былі значна заніжаны[295]. Усяго восенню 1567 г. пры гаспадары знаходзілася 2 400 польскіх вайскоўцаў[296]. Гэтая лічба ўскосна пацвярджаецца просьбай радных паноў напрыканцы студзеня 1568 г. вярнуць у паспалітае рушэнне хаця б тысячу «польскіх людзей». Неўзабаве яны былі накіраваны гаспадаром пад Друю для аховы межаў[297].

Пачынаючы з сярэдзіны 1566 г. кіраўніцтва ВКЛ імкнулася фарміраваць найманае войска пераважна за кошт уласных людскіх рэсурсаў. Выкарыстанне польскіх наймітаў не прынесла чаканага эфекту. Ні эліта, ні звычайнае мірнае насельніцтва не прызналі ў палякях «сваіх» і ставіліся да іх калі не з непрыяззю, то дакладна без добразычлівасці. Для простага насельніцтва польскія найміты асацыяваліся з гвалтам і спусташэннямі, што асабліва моцна праявілася ў 1565 г.

---

291 Прыкладам, Метрыка ВКЛ паведамляе, што пры Я. Хадкевічу ў пачатку 1567 г. знаходзілася 500 польскіх коннікаў: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 119 адв. — 120. Вядома, што ў апошнія гады Інфлянцкай вайны на ўсходнім памежжы ВКЛ знаходзіліся драбскія роты С. Русецкага, Ю. Рачкоўскага, В. Любятоўскага, С. Вазніцкага, Т. Галбіцкага.

292 Прыкладам гэтага можа служыць адзін факт. З 7 красавіка 1568 г. на почт пад камандаваннем П. Збароўскага колькасцю 80 коннікаў на бліжэйшыя паўгода павінны былі ісці *«поборы мнеишые»* з Жамойцкай зямлі: LM. Kn. 531. P. 96.

293 Гэта роты Б. Дымітроўскага, Т. Карліньскага, Т. Галбіцкага і С. Вазніцкага: LM. Kn. 531. P. 44.

294 Listy. S. 529–530.

295 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 165 адв. — 166 адв.

296 P i w a r s k i K. Niedoszła wyprawa… 1928. R. 5. S. 103.

297 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 253 адв. — 255.

Запрашэнне польскіх наймітаў так ці іначай біла па самалюбству палітычнай эліты ВКЛ. Атрымлівалася, што літвіны былі няздатны абараніць самі сябе. Да таго ж польскі бок як мог спекуляваў на падобным меркаванні. Польскія жаўнеры выстаўлялі сябе найбольш актыўнай дзейснай сілай у абароне ВКЛ ад непрыяцеля. Гэта выразна выявілася, напрыклад, у прамове С. Цікоўскага перад гаспадаром у 1565 г., якую мы ведаем у перказе М. Нарушэвіча. У прыватнасці, з усіх літвінаў С. Цікоўскі вылучыў толькі дынебургскага старасту М. Тальвоша, які хадзіў разам з польскім войскам у паход і праявіў сябе з найлепшага боку[298].

Прадстаўнікі кіроўных колаў ВКЛ ацэньвалі дзейнасць польскага кантынгента на тэрыторыі сваёй краіны і Інфлянтаў досыць скептычна і негатыўна. Асабліва характэрнай такая пазіцыя была для Радзівілаў[299]. Не былі задаволены дзеяннямі палякаў і тыя ўраднікі, якія непасрэдна сутыкаліся з імі на практыцы. Напрыклад, Я. Хадкевіч быў моцна ўзрушаны самавольствам польскіх жаўнераў, якія без узгаднення з ім здзейснілі ў 1565 г. рэйд па Пскоўшчыне[300]. Віцебскі ваявода С. Пац улетку 1568 г. скардзіўся на ротмістра С. Вазніцкага, які дазваляў сабе збіваць віцебскіх шляхціцаў[301].

Польскае войска мела тыя ж праблемы, што і літоўскія найміты. Побач з недахопам харчовых запасаў найбольш сур'ёзнай праблемай з'яўлялася хранічная затрымка выплат за службу. Жаўнеры аказваліся ў патавай сітуацыі, не маючы сродкаў утрымліваць сябе і сваіх коней. У гэтых абставінах яны не раз пагражалі пакінуць службу. Гэтая пагроза існавала ўвесь час, і часта толькі просьбы гаспадара і гетманаў прымушалі іх цярпець невыносныя ўмовы службы.

У 1565 г. ротмістр С. Цікоўскі, апраўдваючыся за дзеянні наймітаў, асаблівую ўвагу гаспадара звярнуў на матэрыяльны бок вайсковай службы. Жаўнеры скардзіліся, што ў выніку знаходжання ў Літве і Інфлянтах

298 АСД. Т. 7. С. 32–34. Верагодна, польскія жаўнеры прымалі ўдзел у паспяховых баях са шведамі, якія згадваюць польска-літоўскія храністы: Stryjkowski M. Kronika. T. 2. S. 416; Górnicki Ł. Dzieje w Koronie... S. 129.

299 Аб падобным стаўленні піша ў адным са сваіх лістоў М. Радзівіл Чорны: *«Co się tycze wojny polskiego wojska, mnie się tak głupiemu zda, że to co dziś oni czynią non caret hoc magno misterio, abo chcą palmam mieć przed naszym narodem, której im bardzo życzą zwłaszcza w Piotrkowie, abo barwią grając szeroko z leż do leż że rzekomo nie prożnują»* (AGAD, AR. Dz. IV. T. 35. Sygn. 502. K. 43–49).

300 АСД. Т. 7. С. 29–32.

301 AGAD. Archiwum Publiczne Potockich. Sygn. 9. Teka 1. K. 13–14.

яны не толькі не памножылі свае багацці, але, наадварот, панеслі вялікія страты[302]. «Рыцарскія людзі» былі незадаволены тым, што ваенная служба не стварала магчымасцей для кар'ернага росту і з гэтай прычыны губляла свой прэстыж[303].

Улады разумелі безвыходнасць становішча жаўнераў, таму не спяшаліся прымаць у дачыненні да іх карна-рэпрэсіўныя меры. Да таго ж становішча ўладаў таксама было безвыходным, бо замену наймітам у тагачасных варунках вайны знайсці было немагчыма.

Зыходзячы з гэтага, гаспадар у 1564 г. «чыніў справядлівасць» праз вызваленне наймітаў ад судовай адказнасці[304]. Гэта аказалася не лепшым вырашэннем праблемы, бо ўжо ў наступным годзе ў сваіх злоўжываннях у дачыненні да насельніцтва ВКЛ жаўнеры дайшлі да мяжы. Гаспадар, незацікаўлены ў давядзенні справы да судовага працэсу, вырашыў пакараць наймітаў, адабраўшы палову сумы «заслужоного»[305]. Невядома, аднак, ці рабіліся кампенсацыі цывільнаму насельніцтву за ўчыненыя шкоды.

У справе аплаты найманай службы ўлады яўна не спраўляліся са сваімі абавязкамі. Запазычанасці з кожным годам толькі раслі. Гарантыі хуткай выплаты, якія даваліся ротмістрам, не маглі вырашыць праблему[306]. Добра вядомы гучны факт, калі ў 1569 г. найміты ў рэзкай форме паставілі перад Жыгімонтам Аўгустам пытанне аб вяртанні запазычанасцей за 1564–1566 г. Дзяржаўны скарб быў павінен 26 конным і 28 драбскім ротам 161 648 злотых[307]. Атрымліваецца, што ў сярэднім жаўнерам не быў выплачаны заробак за год — паўтара гады службы.

---

302 *«Wszędzie po inych stronach ludzie rycerscy, posłużywszy mały czas, dobrze znaczne zapomożenia swoie na wszysthkiem odnoszą, domy budują, osiadłości kupią y przybawiaią. A oni przes czas niemały trwaiąc na posłudze J[ego] K[rólewskiej] M[iłości], nie maiąc zapłaty zasłużonego, odarli się i obnażyli, statków i maiętności swych pozbyli»* (АСД. Т. 7. С. 32–34). У прыклад пры гэтым прыводзіліся памерлыя ротмістры С. Лесьнявольскі і Я. Бэлдоўскі.

303 *«Do wszelakich też dignitarstw y urzędow uprzedzaią ich* (ротмістраў і жаўнераў) *zawsze ludzie niezasłużeni, młodzi, żacy nakoniec y prokuratorczykowie, każdy za przyczyną forytarza swego na dworze»* (Тамсама).

304 BN. Rkps. III.6609. Nr. 29. K. 33v–34v.

305 Diariusz sejmu lubelskiego 1566 roku / Oprac. I. K a n i e w s k a . Ossolineum, 1980. S. 73–75.

306 Прыкладам такой гарантыі можа служыць «аблігацыя», дадзеная Жыгімонтам Аўгустам польскім ротмістрам у жніўні 1565 г. У ёй абяцалася, што ўсе запазычанасці будуць выплачаны на Вялікдзень у 1566 г. (14 красавіка): BCzart. Teki Naruszewicza. Sygn. 74.IV. Nr. 168–169. K. 689–698. Гэтае абяцанне не было выканана.

307 P u ł a s k i K. Sprawa o zapłatę zaległego żołdu rotom zaciężnym za Zygmunta Augusta // Szkice i poszukiwania historyczne. Seria 3. Kraków, 1906. S. 216–218.

У такіх умовах нярэдкай з'явай быў адыход рот са службы пасля чарговага заканчэння прыпаведнага тэрміну. Першыя адыходы адбыліся ўжо праз паўгода пасля знаходжання польскага кантынгента ў Інфлянтах[308].

Назіраліся і выпадкі дэзерцірства. Вясной 1562 г. яны прынялі настолькі масавы характар, што гаспадарская ўлада выдала спецыяльны ліст аб затрымцы беглых жаўнераў і іх пакаранні[309]. Без сумневу, уцёкі наймітаў назіраліся і ў далейшым, бо паляпшэння агульнай сітуацыі з харчаваннем і выплатамі заробку не было. А надзеі на ўзбагачэнне за кошт выпраў у непрыяцельскі край аказваліся ў большасці выпадкаў беспадстаўнымі.

Асобную ўвагу трэба звярнуць на пытанне, хто ж аплачваў знаходжанне на тэрыторыі ВКЛ і Інфлянтаў значнага па колькасці найманага войска з Польшчы. З падачы прадстаўнікоў польскай гістарыяграфіі складваецца ўражанне, што цяжар фінансавання польскіх наймітаў цалкам лёг на каронны скарб[310]. З яго на патрэбы войска за перыяд Інфлянцкай вайны было выдаткавана 2 133 653 польскіх злотых[311].

Аднак калі ўспомніць, што яшчэ ў пачатку 70-х гг. XVI ст. дзяржава мела вялікія праблемы з выплатай грошай за службу пяцігадовай даўнасці, то выглядае сумнеўным, каб гэтая неверагодная сума была сапраўды выдаткавана ў папярэдняе дзесяцігоддзе.

Сумневаў дадаюць факты, якія сведчаць аб тым, што польскія жаўнеры аплачваліся не толькі субсідыямі з Кароны, але і ўласна літоўскім бокам. Гэта паказвае фінансавая справаздача земскага падскарбія ВКЛ А. Валовіча за 1561–1566 гг.[312] Даходзіла да таго, што скарбнік І. Зарэцкі па ўласнай ініцыятыве рабіў пазыкі дзеля тэрміновай выплаты наймітам заробку. Так, у 1564 г. ён, пазычыўшы грошы ў роз-

308 «...*Tylko czterzej z rotmistrzów a pan hetman piąty przy żołnierzach ostali*» (Listy. S. 360–361).

309 LM. Kn. 564. P. 91.

310 Kolankowski L. Polska Jagiełłonów. S. 217; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. S. 31–32.

311 AGAD, ASK. Dz. III. Sygn. 1. K. 58–60. Гл. таксама ідэнтычную копію ў: AGAD, ASW. Oddz. 86. Sygn. 22. K. 2–4. Цалкам магчыма, што гэта былі пераважна сродкі каралеўскага, а не дзяржаўнага скарбу Кароны.

312 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 48, арк. 219 адв. — 230. Вядома, што напрыканцы 1561 г. гаспадар прасіў яго знайсці сродкі для аплаты менавіта польскіх жаўнераў: Listy. S. 349–352.

ных людзей, выдаў на аплату службы польскіх жаўнераў 2 446 коп літоўскіх грошаў[313].

Асноўнай крыніцай фінансавання польскага кантынгента ў першыя гады вайны з'яўляўся гаспадарскі скарб. Вядома, што польскія жаўнеры пры аплаце мелі прыярытэт перад літвінамі, аб чым, дарэчы, наўпрост гаварылася ротмістрам з ВКЛ[314]. Пры гэтым, на нашу думку, сродкі на іх утрыманне браліся пераважна з падаткаў, сабраных у ВКЛ, а не ў Польшчы[315].

Нярэдка польскія жаўнеры атрымлівалі грошы з рук літоўскіх магнатаў. 5 студзеня 1562 г. Жыгімонт Аўгуст настойліва прасіў М. Радзівіла Чорнага адшукаць сродкі для аплаты службы наймітаў[316]. Віленскі ваявода ў адказ гарантаваў выплату заробку з уласнай кішэні[317]. У 1567 г. Я. Хадкевіч па распараджэнні гаспадара выплаціў запазычанасць чатыром польскім жаўнерам агульнай сумай 877 коп грошаў[318].

Табліца 2.3.1.

*Конныя роты польскага найманага кантынгента ў ВКЛ і Інфлянтах у 1561–1566 гг.*

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1561 | 1562 | 1563 | 1564 | 1565 | 1566 |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1. | Szafraniec Stanisław | 150 | | | | | |
| 2. | Zborowski Marcin | 174 (161) | | | | | |
| 3. | Struś Stanisław | 150 (195) | | | | | |
| 4. | Swięcicki Mikołaj | 150 | | | | | |
| 5. | Zebrzydowski Florian | 130 | 130 | | | | |

313 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 433–434.

314 LM. Kn. 564. P. 100–101. Дарэчы, за перыяд 1556–1573 гг. ВКЛ выдаткавала толькі на інфлянцкія патрэбы 893 784 коп літоўскіх грошаў (у эквіваленце — 1 340 676 польскіх злотых). Падрабязней гл. р. III, § 1.

315 У жніўні 1561 г. у лісце аб зборы серабшчыны згадвалася, што з гаспадарскага скарбу ўжо былі выдаткаваны немалыя сумы на польскіх наймітаў: LM. Kn. 564. P. 57–61.

316 Listy. S. 356–360.

317 Ibid. S. 360–361.

318 LM. Kn. 51. P. 113–119.

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6. | Potocki Mikołaj | 150 (160) | 160 (164) | | | + | |
| 7. | Zamojski Stanisław | 150 (165) | 200 | | | | |
| 8. | Bełdowski Jan | 150 | 150 (137) | 150 | 200 (212) | +? | + |
| 9. | Secygniowski Jakub | 150 | 150 | 150 (300) | 300 | + | + |
| 10. | Sieniawski Mikołaj | 150 (180) | 172 (486) | 411 (360) | 400 | + | + |
| 11. | Wąsowicz Mikołaj | 150 | 150 (198) | 200 (150) | 150 | + | + |
| 12. | Leśniowolski Stanisław | 150 (230) | 230 | | 300 (260) | +(Jarosz) | + |
| 13. | Cikowski Stanisław | 200 (140) | 140 | | 300 (100) | + | + |
| 14. | Wąsowicz Stanisław | 150 | 150 | | | + | + |
| 15. | Łoski Adrian | 150 | | | 300 | + | +* |
| 16. | Zebrzydowski Zygmunt | | 150 (184) | 182 | 200 | + | + |
| 17. | Tarnowski Krzysztof | | 160 (150) | 150 | 150 | + | + |
| 18. | Rej Mikołaj | | 150 (140) | | | | |
| 19. | Zborowski Jan | | 150 (140) | | | | |
| 20. | Świderski Wacław | | | 110 (155) | 150 | + | + |
| 21. | Bratoszewski Krzysztof | | | | 97 | +? | + |
| 22. | Górski Stanisław | | | | 300 | + | + |
| 23. | Grodziecki Piotr | | | | 50 (48) | + | + |
| 24. | Kazanowski Marcin | | | | 200 | + | + |
| 25. | Kozielski Maciej | | | | 150 | + | + |
| 26. | Wilga Mikołaj | | | | 150 | + | + |
| 27. | Giżycki Jan | | | | 150 (61) | + | + |
| 28. | Gostomski Anzelm | | | | 300 (320) | + | + |
| 29. | Gorajski Jan | | | | 150 | + | + |
| 30. | Pilecki Jan | | | | 200 | + | + |
| 31. | Trzebiński Marcin | | | | 200 | + | + |
| 32. | Zamojski Stanisław | | | | + | + | +* |
| 33. | Latalski Janusz | | | | 300 (282) | | |
| 34. | Myszkowski Jądrzey | | | | 200 (196) | | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 35. | Myszkowski Stanisław | | | | 100 | | |
| 36. | Zaremba Grzegorz | | | | 200 | | |
| 37. | Derszniak Stanisław | | | | | + | + |
| 38. | Oleśnicki Mikołaj | | | | | + | + |
| 39. | Przyjemski Stanisław | | | | | + | + |
| 40. | Rembowski Gabriel | | | | | + | + |
| 41. | Secygniowski Paweł | | | | | + | + |
| 42. | Zborowski Jan | | | | | +? | +* |
| 43. | Zborowski Piotr | | | | | +? | +* |
| 44. | Żołkiewski | | | | | +? | +* |
| 45. | Łaski Albert | | | | | +? | +* |
| 46. | Potocki Jan | | | | | +? | +* |
| 47. | Wierzchliński Olbrycht | | | | | + | +* |

**Заўвагі:**
1. У дужках паказана гадавая дынаміка колькасці жаўнераў у ротах.
2. «+» — згадка ў крыніцы без дадатковай інфармацыі.
3. * — адсутнічае ў: Pułaski K. Sprawa o zapłatę… S. 215–220.

*Табліца складзена паводле:* Jasnowski J. Materiały do działalności… S. 297, 299; BN. Rkps. III.6609; AGAD, ASW. Oddz. 86. Sygn. 18, 19a, 20, 21; AGAD, ASK. Oddz. 2. Sygn. 23; BCzart. Teki Naruszewicza. Sygn. 74. IV. Nr. 169. K. 691–698; Polskie artykuły wojskowe… S. 94; Pułaski K. Sprawa o zapłatę… S. 215–220.

Нарэшце, не трэба забываць пра забеспячэнне польскіх жаўнераў правіянтам. Безумоўна, яно не прывозілася з Польшчы. Для прыкладу, восенню 1564 г. гаспадарскія падданыя спецыяльна для польскага войска павінны былі адсылаць у Мядзел збожжа і буйную рагатую жывёлу ўзамен выплаты дзякла і стацыі. У гаспадарскім лісце наўпрост гаварылася, што *«тяжей бы мусило быть подданымъ нашимъ, кгды бы войско Полское для выживен[ь]я отъ границъ помыкало ся и на именьяхъ нашихъ и вашихъ положены были»*[319].

[319] РИБ. Т. 30. С. 759–769.

Табліца 2.3.2.

*Драбскія роты польскага найманага кантынгента ў ВКЛ і Інфлянтах у 1561–1566 гг.*

| N | Прозвішча ротмістра | Колькасць жаўнераў | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1561 | 1562 | 1563 | 1564 | 1565 | 1566 |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1. | Bielawski Roch | 150 | 150 | | + | | |
| 2. | Brandis Piotr | 150 | 100 | | | | +* |
| 3. | Pisarski Jan | 150 | | | 300 | + | + |
| 4. | Sulkowski Stanisław | 100 | | | | | |
| 5. | Wąsowicz Stanisław | 150 | | | | | |
| 6. | Wąsowicz Wacław | 100 | | | | + | +* |
| 7. | Wierzchlejski Wojciech | 150 | | | | | |
| 8. | Wreszcz Piotr | 150 | 150 | | 300 | + | + |
| 9. | Dymitrowski Benedykt | | | | 200 | + | + |
| 10. | Wierzbowski | | | | 200 | + | + |
| 11. | Górski Piotr | | | | 300 | + | + |
| 12. | Strzyżewski Mikołaj | | | | 50 | + | + |
| 13. | Dobrosołowski Marcin | | | | 200 | + | + |
| 14. | Warszawski Jan | | | | 200 | + | + |
| 15. | Rusiecki Stanisław | | | | 200 | + | + |
| 16. | Ruszkowski Stanisław | | | | 200 | + | + |
| 17. | Radoszycki Jan | | | | 200 | + | + |
| 18. | Marchocki Stanisław | | | | 150 | + | + |
| 19. | Wyżga Stanisław | | | | 200 | | + |
| 20. | Wierzbicki Jan | | | | 200 | + | + |
| 21. | Rembowski Jan | | | | 150 | + | + |
| 22. | Szymakowski Florian | | | | 50 | | + |
| 23. | Kotecki Piotr | | | | 300 | | |
| 24. | Wierzchlejski Olbrycht | | | | 300 | | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 25. | Karliński Marcin | | | | | + | + |
| 26. | Bystrzykowski | | | | | + | + |
| 27. | Rożen Adam | | | | | + | + |
| 28. | Trembecki Jan | | | | | + | + |
| 29. | Woźnicki Stanisław | | | | | + | + |
| 30. | Branicki Marcin | | | | | + | + |
| 31. | Snieżek (Andrzej?) | | | | | + | + |
| 32. | Lubiatowski Wojciech | | | | | + | + |
| 33. | Gołbicki Tomasz | | | | | + | + |
| 34. | Owsiński Jan | | | | | + | + |
| 35. | Wieloglowski Grzegorz | | | | | + | + |
| 36. | Brozyna Stanisław | | | | | + | + |
| 37. | Więcławski | | | | | + | |
| 38. | Lipnicki | | | | | | +* |
| 39. | Puczniewski | | | | | + | +* |
| 40. | Jabłoński | | | | | + | +* |

**Заўвагі:**
1. «+» — згадка ў крыніцы без дадатковай інфармацыі.
2. * — адсутнічае ў: Pułaski K. Sprawa o zapłatę… S. 215–220.

*Табліца складзена паводле:* Jasnowski J. Materiały do działalności… S. 298; BN. Rkps. III.6609; AGAD, ASW. Oddz. 86. Sygn. 18, 19a, 20, 21; AGAD, ASK. Oddz. 2. Sygn. 23; BCzart. Teki Naruszewicza. Sygn. 74. IV. Nr. 169. K. 691–698; Polskie artykuły wojskowe… S. 94; Pułaski K. Sprawa o zapłatę… S. 215–220.

Ці выплачваліся кампенсацыі за ўсё гэта з польскага боку, невядома. Не выключана, што не. Верагодней за ўсё, польскае войска ўтрымлівалася за кошт сродкаў абодвух бакоў (і, безумоўна, гаспадарскага скарбу), і вызначыць долю кожнага з іх у гэтай справе вельмі складана.

Такім чынам, у 1561–1565 гг. за кошт польскіх рот кантынгент найманых жаўнераў у ВКЛ і Інфлянтах быў значна павялічаны. Гэта стала тым неабходным элементам у сістэме абароны краіны, якога не магло

сабе дазволіць само Княства з прычыны слабасці ўнутраных рэсурсаў. Пакуль з Польшчы ішлі фінансавыя субсідыі, прысутнасць польскага войска ў ВКЛ з'яўлялася апраўданай. Аднак як толькі яны спыніліся, рэальныя магчымасці ўтрымання вайскоўцаў зніклі.

Польскае войска адыграла хоць і важную, але далёка не вырашальную ролю ў абароне ВКЛ і Інфлянтаў ад маскоўскага непрыяцеля. Зламіць ход падзей у вайне яно не магло з прычыны пэўных аб'ектыўных абставін. Яго прысутнасць на тэрыторыі ВКЛ нярэдка станавілася фактарам унутранай нестабільнасці. Нягледзячы на незадаволенасць дзеяннямі палякаў, Княства было асуджана ў цяжкіх варунках Інфлянцкай вайны карыстацца знешняй дапамогай дзеля падтрымання абараназдольнасці краіны. Гэтая залежнасць, у сваю чаргу, мела неспрыяльныя палітычныя наступствы, а менавіта ўзмацняла ціск польскага боку ў справе заключэння новай уніі паміж ВКЛ і Польшчай.

# РАЗДЗЕЛ III

# ФІНАНСАВА-МАТЭРЫЯЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЎДЗЕЛУ ВКЛ У ІНФЛЯНЦКАЙ ВАЙНЕ

## § 1. Мабілізацыя сродкаў на вядзенне вайны: традыцыйныя метады і пошукі новых крыніц

Пытанні мабілізацыі сродкаў на вядзенне Інфлянцкай вайны найбольш падрабязна разглядаліся ў класічных працах М. Любаўскага, М. Доўнар-Запольскага і І. Лапо[1]. Аднак гэтыя даследчыкі закраналі іх ускосна, бо яны вывучалі праблематыку, не звязаную непасрэдна з удзелам ВКЛ у вайне. Падобны пабочны аналіз дакументальных матэрыялаў і фрагментарныя высновы, не зведзеныя ў сістэмную цэласнасць, не могуць задавальняць нас сёння. На жаль, з пачатку XX ст. гісторыкі амаль не цікавіліся гэтымі праблемамі, не лічачы агульных канстатацый цяжкага фінансава-эканамічнага становішча ВКЛ падчас Інфлянцкай вайны.

У якой ступені скарбовых рэсурсаў хапала для дасягнення поспеху ў вайне? Якімі метадамі і прыёмамі карысталася кіраўніцтва дзяржавы для больш эфектыўнага пошуку фінансавых сродкаў? З якімі праблемамі і складанасцямі яно сутыкалася пры іх зборы? Адказы на пастаўленыя пы-

---

[1] Любавский М. Литовско-русский сейм; Довнар-Запольский М. Государственное хозяйство...; Лаппо И. Великое Княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569–1586). Т. 1. СПб., 1901. С. 549–554.

танні павінны дапамагчы ўявіць карціну фінансавага становішча дзяржавы і адлюстраваць на канкрэтных прыкладах залежнасць сітуацыі на ваенным фронце ад наяўнасці фінансава-матэрыяльных рэсурсаў.

Падатковая сістэма ВКЛ была пабудавана па схеме, уласцівай для большасці сярэднявечных еўрапейскіх дзяржаў. Шляхта і духавенства як прывілеяваныя станы былі вызвалены ад выплаты сталых падаткаў. Іх цяжар клаўся на непрывілеяваныя станы — мяшчанства і сялянства.

Шляхта была абавязана плаціць надзвычайныя падаткі (іх было два віды — серабшчына і пагалоўшчына) са сваіх маёнткаў, якія ўхваляліся з яе згоды вальным соймам і былі спецыяльна прызначаны для расходаў на ваенна-абарончыя мэты. Менавіта ад паступлення ў дзяржаўны скарб гэтых падаткаў (што было разам з абавязкам служыць у паспалітым рушэнні адной з асноўных земскіх павіннасцяў) залежала выкананне разнастайных задач па забеспячэнні абараназдольнасці краіны, у першую чаргу ўтрымання найманага войска. З папярэдняй згоды гаспадара падаткі маглі выплачвацца не толькі са шляхецкіх, але і з дзяржаўных уладанняў. Да выплаты серабшчыны далучаліся мяшчанскія і духоўныя землеўладанні «на земскім праве».

У дачыненні да дзяржаўных (гаспадарскіх) уладанняў вялікі князь меў больш магчымасцяў задзейнічаць сродкі адміністратыўна-дырэктыўнага характару. Гэта вынікала з непасрэднага патрыманіяльнага характару яго ўзаемаадносін са сваімі падданымі. Гаспадар часта карыстаўся гэтай крыніцай фінансавання, асабліва пры недахопе фінансава-матэрыяльных сродкаў. Гэта яскрава выявілася ў перыяд Інфлянцкай вайны. З іншага боку, гаспадарская ўлада павінна была праяўляць салідарнасць са шляхецкім станам у нясенні цяжару выдаткаў на ваенныя мэты і адказваць за свае знешнепалітычныя ініцыятывы.

Удары маскоўскага войска па Інфлянтах у 1558 г. прымусілі літвінаў задумацца над перспектывамі сваёй інфлянцкай палітыкі. Для неадкладнага рэагавання на падзеі ў суседняй краіне былі патрэбны адпаведныя рэсурсы, якіх скарб не меў. Яго вычарпанню асабліва «паспрыяла» ваенная кампанія 1557 г.[2]

---

[2] *«А ведомые твоеи м[и]л[о] сти* (М. Радзівілу Рудому. — *А. Я.*)*, каковые бремена скарбъ нашъ поносит, якож прошлого року немалая сума выдана на служебных Великого Князства за жеданьем в[ашей] м[илости] рад наших, тепер тэж на украину от татар также зъ скарбу н[а]ш[о]го служебные отправованы»* (Listy. S. 336–337).

Шукаючы рашэнне праблемы, 25–28 лістапада 1558 г. гаспадарская ўлада звярнулася да шляхты з просьбай узнавіць выплату дзвюх апошніх «ратаў» серабшчыны, якая была ўхвалена на Віленскім сойме 1554 г. Яе выдача была прыпынена ў сувязі з заключэннем у 1556 г. шасцігадовага перамір'я з Маскоўскай дзяржавай. Улічваючы неўраджайныя гады, кіраўніцтва напалову зменшыла падатковую стаўку (з 10 грошаў да 5 грошаў з «сахі»). Першая «рата» павінна была быць сабрана да 2 лютага 1559 г., другая — роўна праз год. Сваё рашэнне ўлады тлумачылі патрэбай утрымліваць найманае войска ва ўмовах узмацнення ваеннай небяспекі[3].

Гэтыя захады не далі вялікага эфекту. У звароце Жыгімонта Аўгуста да радных паноў ад 22 красавіка 1559 г. указвалася, што падатку *«за прошлыи рокъ [15]58 мало штось дано»* і спадзяванняў на выпраўленне сітуацыі не было. Гаспадар прапаноўваў Радзе абмеркаваць пытанне, як стымуляваць выплату падаткаў, звяртаючы ўвагу на той факт, што іх не плацілі нават заможныя магнаты. А гэта ўжо было не толькі дрэнным прыкладам для астатніх падаткаплацельшчыкаў, але і сведчаннем сур'ёзнага крызісу падатковай сістэмы ВКЛ. Гаспадар наўпрост заяўляў, што пры існым стане рэчаў скарб не вытрымае выдаткаў у змаганні з такім моцным непрыяцелем як Маскоўская дзяржава[4].

Маючы цяжкасці з мабілізацыяй сродкаў на абарончыя мерапрыемствы, цэнтральная адміністрацыя пераводзіла памежныя замкі на самазабеспячэнне. «Платы» з замкавых валасцей, якія раней ішлі ў скарб, аддаваліся мясцовым старастам, узамен на што яны абяцалі ўтрымліваць у замку гарнізон. У кастрычніку 1559 г. так было зроблена з Мсціславам і Рагачовам[5], у сакавіку 1561 г. — з Крычавам і Свіслаччу[6], у жніўні 1562 г. — з Любечам[7].

На Віленскім сойме 1559 г. шляхта выступіла з ініцыятывай падвысіць удвая стаўку серабшчыны[8]. М. Любаўскі сцвярджае, што

---

3 *«От часу большие небезпечности примножають ся с тое ж стороны и от того суседа паньств наших...»* (LM. Kn. 564. P. 29–31).

4 Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 95–97 прил.

5 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 381 адв. — 383 адв.

6 Тамсама. Арк. 530 адв. — 531 адв.; МВКЛ. Кн. 44. С. 13–14.

7 МВКЛ. Кн. 44. С. 63.

8 РИБ. Т. 30. С. 273–274.

падвышэнне да 10 грошаў мела месца ў дачыненні толькі да другой «раты». Адначасова ўдзельнікі сойма ўхвалілі збор такога ж падатку ў 1561 г. Пры гэтым серабшчына за 1559 г. павінна была быць сабрана ў поўным аб'ёме[9].

На нашу думку, наўрад ці шляхта сама настойвала на ўвядзенні для сябе лішняга падатку. У рэчаіснасці падвышэнне датычылася абедзвюх «ратаў» серабшчыны за 1559–1560 гг. У далейшым крыніцы часта блытаюць фармальны і фактычны тэрмін збораў падатку. У лісце да мяшчан горада Межырэч ад 6 красавіка 1561 г. згадвалася серабшчына *«за рокъ прошлыи шестьдесятыи и тепер идучи шестьдесятъ первыи»*, аднак у прэамбуле спісу рассылкі гаворыцца пра *«серебъщизну за рокъ [15]59, [15]60»*[10]. Зыходзячы з гэтага, мы мяркуем, што ў соймавай ухвале ідзе гаворка не пра новы падатак, а пра новыя тэрміны збораў старога.

Згода шляхты на ўхваленне павялічанага серабшчыннага падатку досыць проста тлумачыцца перспектывай атрымання новых маёнткаў у заможных інфлянцкіх землях. Гаспадар падтрымаў падобныя спадзяванні, аднак на «просьбу» станаў аб наданні землеўладанняў у прыбалтыйскім краі толькі жыхарам Княства заявіў, што прыдбаныя землі могуць быць нададзены *«не инъшым правом, одно заставою»*[11]. Гэта адназначна ўказвае, што яны трактаваліся як гаспадарская ўласнасць.

Цікавым з'яўляецца факт адмаўлення Полацкай і Віцебскай землям у задавальненні іх «просьбы» аб вызваленні ад выплаты серабшчыны. Прадстаўнікі гэтых зямель матывавалі яе памежным становішчам і вялікімі коштамі аховы неспакойнай мяжы з Маскоўскай дзяржавай[12].

Нягледзячы на фармальны ўдзел у зборы надзвычайных падаткаў, падчас Інфлянцкай вайны памежныя землі фактычна знаходзіліся ўбаку ад гэтай справы з прычыны тых вялікіх страт, якія наносілі ім ваенныя дзеянні і пастоі найманых жаўнераў. У Вільні мусілі зміріцца з такім

9 Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 597.
10 LM. Kn. 564. P. 41–42.
11 РИБ. Т. 30. С. 270–271.
12 Тамсама. С. 269–274.

станам рэчаў, даючы, акрамя таго, час ад часу ільготы ў выплаце падаткаў асобным гарадам і воласцям на ўсходнім памежжы[13].

Пасля заключэння Віленскай дамовы з Інфлянцкім ордэнам у 1559 г. у закладзеныя замкі былі накіраваны гаспадарскія сакратары Вацлаў Агрыпа і Фрыдрых Валовіч з мэтай правядзення іх рэвізіі[14]. Яна выявіла кепскі стан забеспячэння замкаў боепрыпасамі і харчовымі запасамі[15]. Каб палепшыць яго, кіраўніцтва дзяржавы накіравала ў Інфлянты зброю (у тым ліку гарматы) і харчаванне. Гэта, безумоўна, каштавала дорага і забірала вялікія сродкі са скарбу (гл. табл. 3.1.1).

Зборы серабшчыны з земскіх уладанняў вызначаліся нізкім узроўнем плацежнай дысцыпліны. Як вынік, марудныя паступленні прыводзілі да значнага недабору сродкаў. У кастрычніку 1561 г. неплацельшчыкам падаткаў з мэтай прымусіць іх выплаціць запазычанасці былі разасланы першыя *«листы увяжъчие»*[16]. Сярод даўжнікоў скарбу значыліся і многія высокапастаўленыя ўраднікі — у спісе, выдадзеным гаспадарскай канцылярыяй, сустракаюцца прозвішчы біскупаў, жамойцкіх цівуноў, старастаў.

У далейшым выдача такіх лістоў не раз паўтаралася. Неабходна адзначыць, што з цягам часу назіралася ўзмацненне жорсткасці санкцый. Для параўнання, у 1559 г. мерай супраць неплацельшчыкаў называлася толькі *«децкованье»* — спагнанне грашовых штрафаў за затрымку выплат.

---

13 У ліпені 1562 г. аршанскія мяшчане былі вызвалены ад платы *«доли з овъсяного збожъя до шпихълеров г[о]с[по]д[а]ръских»* (МВКЛ. Кн. 44. С. 60–61). У сакавіку 1565 г. ільготу ў выплаце серабшчыны і іншых падаткаў атрымалі жыхары Чачэрска і бліжэйшай акругі. Падставай для гэтага стала *«знищенье и убоство»* ў выніку спусташэнняў, выкліканых ваеннымі дзеяннямі. Многія чачэрскія жыхары трапілі ў палон, з прычыны чаго падатковая плацежаздольнасць горада знізілася. Выявілася, што ва ўмовах ваеннай небяспекі чачэрцы ўжо трэці год не апрацоўвалі свае зямельныя надзелы. Адзначым, што гаспадар не адразу задаволіў просьбу Чачэрска, рэкамендаваўшы земскаму падскарбію А. Валовічу спачатку пераправерыць, ці здатныя жыхары горада выплачваць падаткі: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 38, арк. 538–539. З такіх жа прычын вызваленне ад серабшчыны тэрмінам на чатыры гады атрымалі ў жніўні 1565 г. мяшчане суседняга горада — Прапойска: Тамсама. Спр. 45, арк. 63–63 адв. У снежні 1567 г. шклоўскія мяшчане прасілі гаспадара па пратэкцыі Я. Хадкевіча вызваліць іх ад выплаты «старога» і «новага» мыта, тлумачачы, што *«они отъ людеи неприятеля нашого, кн[я]зя великого московского, такъже и отъ жолнеровъ пол[ь]скихъ и литовскихъ, на маетъностяхъ своихъ не по малу знищоны и [в] упадок пришли...»*. Гаспадар даў ім вызваленне ад мытных падаткаў на два гады: LM. Kn. 531. P. 44–45. У пачатку 1567 альбо 1568 г. такой жа льготы дабіліся мсціслаўскія мяшчане: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 192–193 адв.; спр. 266, арк. 243 адв. — 244 адв.

14 Тамсама. Спр. 37, арк. 396 адв. — 397.

15 Тамсама. Арк. 397 адв. — 402.

16 LM. Kn. 564. P. 77–79.

Табліца 3.1.1.

*Узбраенне ў інфлянцкіх замках,*
*перададзеных ВКЛ паводле Віленскай дамовы ад 31 жніўня 1559 г.*

| Від гармат і зброі | Замкі | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Дынабург | | Зельбург | | Люцэн | | Марыен-гаўзен | | Розітэн | | Баўска | |
| | a | b | a | b | a | b | a | b | a | b | a | b |
| Квартыршлангі | – | – | – | – | – | – | 2 | – | – | – | – | – |
| Фэстшлангі | – | – | – | – | – | 1 | – | – | – | 1 | – | – |
| Фальконы | – | – | – | – | – | 1 | – | – | – | – | – | – |
| Фальканеты | 5 | 4 | 6 | 5 | 4 | 5 | 4 | – | 5 | 5 | 4 | – |
| Серпантыны | 5 | 1 | | 2 | 4 | 2 | 7 | – | – | 1 | 7 | – |
| Гакаўніцы | 31 | 20 | 17 | 30 | 20 | 40 | 29 | 11 | 23 | 40 | 29 | – |
| Кулі для квартыршлангаў | – | – | – | – | – | – | 100 | – | – | – | – | – |
| Кулі для фэстшлангаў | – | – | – | – | – | 100 | – | – | – | 100 | – | – |
| Кулі для фальконаў | – | – | – | – | – | 100 | – | – | – | – | – | – |
| Кулі для фальканетаў | – | 200 | – | 1000 | – | 1000 | 105 | – | – | 1000 | – | – |
| Кулі для серпантынаў | – | 800 | – | 400 | 45 | – | 200 | – | – | 200 | – | – |
| Кулі для гакаўніц | – | 4000 | – | 6000 | | 8000 | 150 | 2100 | – | – | – | – |

**Заўвага:**
1. У слупках пад знакам «a» пазначаны вайсковы рыштунак, які застаўся ў замках ад інфлянцаў, а ў слупках пад знакам «b» — вайсковы рыштунак, дасланы з ВКЛ.

*Табліца складзена паводле* справаздачы Фрыдрыха Валовіча (?) ад 2 снежня 1559 г.: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 397 адв. — 402.

Імкнучыся дзейнічаць аператыўна, гаспадарская ўлада ў мэтах актывізацыі сваёй палітыкі ў Інфлянтах абапіралася ў першыя гады вайны перш за ўсё на рэсурсы дамену. Аднак у 1559 г. Жыгімонт Аўгуст не пайшоў на павелічэнне стаўкі серабшчыны для сваіх землеўладанняў. Згодна са

снежаньскім рашэннем 1558 г., яна засталася на ўзроўні 50% у параўнанні з ухвалай 1554 г.[17] Магчыма, серабшчына з гаспадарскіх зямель у 1559 г. была пасьпяхова сабрана, таму ўлады вырашылі не павялічваць стаўку.

Першы раз падчас Інфлянцкай вайны серабшчына з гаспадарскіх маёнткаў была ўхвалена 23 жніўня 1561 г. Тэрмін для яе збору быў вызначаны дастаткова кароткі — да 28 кастрычніка 1561 г. Памер стаўкі склаў 15 грошаў з валокі. Абгрунтаваннем збору серабшчыны служыла неабходнасць утрымання найманага кантынгента. Пры адсутнасці ў падданых грашовых сродкаў падатак дазвалялася выплачваць харчовымі прадуктамі, у першую чаргу збожжам. Мэтай уладаў было стварэнне пэўнага запасу харчавання на непрадбачаныя выдаткі[18].

Асаблівая ўвага надавалася збору падаткаў з Жамойці, якая стала асноўнай базай рэсурсаў для харчовага забеспячэння жаўнераў у Інфлянтах. Гэта, дарэчы, выразна паказвае, што менавіта Жамойць у кантэксце гаспадарчых інтарэсаў дзяржавы найбольш цесна была звязана з Інфлянтамі. Полацкі і віцебскі рэгіёны у гэтым плане, безумоўна, знаходзіліся на другасным месцы з прычыны сваёй перыферыйнасці і маргінальнасці гаспадарчага значэння для віленскай эліты.

У дадатак да гэтых мер быў забаронены вываз за мяжу асноўных харчовых прадуктаў. Гаспадарская ўлада абгрунтоўвала гэта тым, каб *«подданые обътяжоны не были, а тые люди* (г. зн. найманыя жаўнеры) *выживенье мели»*[19].

У ліпені 1562 г. для пакрыцця выдаткаў на абарончыя мэты Жыгімонт Аўгуст зноў быў вымушаны звярнуцца да збору серабшчыны са сваіх уладанняў. Падатковая стаўка цяпер склала 20 грошаў з валокі. Серабшчыну трэба было сабраць да 29 верасня 1562 г.[20] Пра вялікія спадзяванні ўладаў на збор гэтага падатку сведчыць выданне праз пэўны час паўторных лістоў з напамінам аб тым, каб выплаты рабіліся своечасова[21]. Аднак падаткаплацельшчыкі не ўкладаліся ў вызначаны тэрмін. Улады былі вымушаны перанесці дзень выплаты на 11 лістапада 1562 г.[22]

17 LM. Kn. 564. P. 32–33. M. Доўнар-Запольскі памылкова палічыў, што зніжэнне падаткаў гаспадарскіх уладанняў не датычыла: Довнар-Запольский М. Государственное хозяйство... С. 750.

18 Ibid. P. 57–61.

19 Ibid. P. 61–63.

20 Ibid. P. 112–115.

21 Ibid. P. 117–118.

22 Ibid. P. 123–125.

Нагрузка на даменіяльныя рэсурсы ў першыя гады Інфлянцкай вайны была настолькі вялікай, што напрыканцы 1562 г. гаспадар быў вымушаны канстатаваць: *«Wielkie a prawie już nieznośne nałogi i brzemiona na skarb nasz przyśli i przypadły»*[23].

Сур'ёзнае ўскладненне знешнепалітычнага становішча ВКЛ у выніку захопу маскоўцамі Полацка прымусіла кіраўніцтва дзяржавы звярнуцца да надзвычайных мер па мабілізацыі рэсурсаў. Кіроўныя колы разумелі, што для барацьбы са знешняй пагрозай трэба аб'ядноўваць свае намаганні са шляхецкім грамадствам і шукаць дадатковыя крыніцы забеспячэння ўдзелу ў Інфлянцкай вайне. Скліканы ў траўні 1563 г. у Вільні вальны сойм павінен быў знайсці рашэнне гэтай няпростай задачы.

Адным з найбольш важных рашэнняў Віленскага сойма 1563 г. стала ўхваленне серабшчыны з земскіх і гаспадарскіх уладанняў на надзвычайных варунках. Соймавыя станы далі згоду на вялікую па сваіх памерах падатковую стаўку — ажно 30 грошаў з «сахі». Збор падатку абвяшчаўся на тры гады, пры гэтым абавязковай умовай для яго выканання з'яўляўся ўдзел Княства ў ваенных дзеяннях. Першая выплата падатку прызначалася на 8 верасня 1563 г.[24] Гэты тэрмін быў захаваны і ў наступныя гады[25].

Пры ўхваленні серабшчыны ўдзельнікі сойма выказалі гаспадару «просьбаў». Шляхта прасіла аб выбары трох *«людей зацных»* са свайго асяроддзя для кантролю паступленняў у скарб. Таксама яна дамаглася вызвалення ад серабшчыны «ўбогіх» шляхціцаў, якія мелі менш за чатыры «сахі» зямлі.

Наступная просьба выявіла неадназначнае стаўленне шляхты да інфлянцкай палітыкі ВКЛ. Яна патрабавала ад гаспадара не плаціць з атрыманых даходаў запазычанасці наймітам, якія неслі службу ў Інфлянтах. Серабшчынныя грошы павінны былі накіроўвацца выключна *«тым, которие тепер служити будут, боронечи границ Князьства Литовского»*[26].

23 Listy. S. 403–404.

24 РИБ. Т. 30. С. 337–340. З прычыны таго, што на 1 жніўня 1563 г. быў прызначаны збор паспалітага рушэння, харужым прадпісвалася замест сябе выбраць для збору серабшчыны двух шляхціцаў — *«людей добрых, вери годных»*: Тамсама. С. 694–698.

25 У адным недатаваным лісце ўказана, што ў 1565 г. серабшчына павінна была збірацца на дзень Св. Міхаіла (29 верасня): Тамсама. С. 793–797.

26 Тамсама. С. 338.

Прывілеяваны стан, такім чынам, разглядаў умяшанне ў інфлянцкія справы як непатрэбную ініцыятыву, якая вычэрпвала рэсурсы Княства і прывяла да страты Полацка. Здаецца, тут не абышлося без інтрыг Радзівілаў, якія выказвалі падобныя меркаванні. Жыгімонт Аўгуст катэгарычна пярэчыў такой пазіцыі, заявіўшы, што авалоданне Інфлянтамі з'яўляецца важным для стратэгічнай бяспекі ўсяго Княства (гл. р. IV, § 1).

Клапоцячыся пра наяўнасць харчовых прадуктаў для патрэб войска, 12 жніўня 1563 г. гаспадар забараніў экспарт харчавання[27]. Аднак гэтая пастанова выклікала вострую незадаволенасць шляхты, якая ўжо атрымала на Віленскім сойме 1563 г. прывілей на вольны гандаль збожжам. Кіраўніцтва дзяржавы было вымушана зрабіць крок назад — 31 жніўня 1563 г. шляхце было дазволена прадаваць за мяжу збожжа, вырашчанае ва ўласных маёнтках без мытных збораў[28].

Гэтым рашэннем улады адчынілі шлях да маштабных спекуляцый. Шляхта пры пасрэдніцтве купцоў скупляла збожжа і выдавала яго за выробленае на сваіх палях. Падобныя дзеянні наносілі скарбу ўсё большую шкоду. У сакавіку 1568 г. Жыгімонт Аўгуст быў вымушаны выдаць спецыяльны ліст, у якім папярэджваў шляхту аб канфіскацыі тавараў, схаваных ад мытнікаў[29].

Мяркуючы па пазнейшых звестках, збор серабшчыны ў 1563 г. у цэлым задаволіў улады[30]. Аднак без пагрозы «ўвязаннямі» ў шляхецкія маёнткі не абышлося. Улады пагражалі канфіскацыяй маёнткаў да таго часу, пакуль падатак не будзе адданы «*з совитостью*» (г. зн. у падвойным памеры). У прыватнасці, «увяжчыя» лісты былі дасланы 21 верасня 1563 г. у Берасцейскі павет і Жытомірскае староства. У іх адзначалася, што «*велми мало тыхъ, которые дей тепер тотъ податокъ давати почали, а иншие дей вси вымовляють ся, ижъ такъ борздо люди ихъ на тую серебъщину п[е]н[е]зей не могуть набыти*»[31]. Як відаць, адной з прычын спазнення выплат былі праблемы са збытам сельскагаспадарчай прадукцыі.

---

27 РИБ. Т. 30. С. 715–716.
28 Тамсама. С. 724–725.
29 LM. Kn. 531. P. 88–89.
30 РИБ. Т. 30. С. 843–844.
31 Тамсама. С. 735–738.

Са зместу справаздачы («квітацыі») земскага падскарбія А. Валовіча аб даходах і расходах скарбу добра відаць, што серабшчына плацілася са значным спазненнем: серабшчына 1556 г. дабіралася ў 1561 і 1563 гг., серабшчына 1561 г. дайшла да скарбу толькі ў 1563 г. і збіралася таксама ў 1564 г. Такое становішча склалася ў немалой ступені з той прычыны, што падаткаплацельшчыкі не маглі выплаціць адразу ўсе запазычанасці, якія хутка назапашваліся ў выніку частага ўхвалення падатковых збораў[32]. Нават для заможных магнатаў частая выплата падаткаў рабілася значным абцяжарваннем уласных рэсурсаў. Прыкладам, з выплатамі серабшчыны не спраўляўся нават сам канцлер ВКЛ і віленскі ваявода М. Радзівіл Чорны. Ён скардзіўся свайму брату М. Радзівілу Рудому, што ў выніку выдаткаў на дзяржаўныя патрэбы яго багацці істотна паменшыліся[33].

У 1564 і 1565 гг. у выплаце падаткаў надышоў сапраўдны крызіс. Паступленні ў скарб у параўнанні з 1563 г. знізіліся адпаведна на 40 і 25%. У 1565 г. была сабрана рэкордна нізкая серабшчына — 51 851 копа грошаў. Гэтая сума склала 30% ад усяго бюджэту ВКЛ (гл. табл. 3.1.4). Такія малыя зборы можна патлумачыць неўраджаямі і эпідэміяй чумы, якая пранеслася па паўночна-ўсходніх і цэнтральных рэгіёнах ВКЛ у 1565 г.[34] Немалаважную ролю адыграла і прынятае на Віленскім сойме 1565/1566 гг. рашэнне аб зборы серабшчыны за 1564 г. не ў поўным аб'ёме, а з улікам рэальных магчымасцяў шляхецкіх гаспадарак, якія моцна пацярпелі ад праходу і пастою найманых жаўнераў у першай палове 1565 г.[35] (гл. р. II, § 2).

Падобная сітуацыя, без сумневу, назіралася і ў дзяржаўных уладаннях. Пра гэта гаворыць хаця б той факт, што ў 1567 г. з мэтай змяншэння падатковай нагрузкі стаўка серабшчыны гаспадарскім падданым была зніжана з 30 да 20 грошаў[36].

На Віленскім сойме 1565/1566 гг. шляхецкія прадстаўнікі, закранаючы праблему «ўвязанняў», прасілі, каб канфіскацыя не датычылася двароў і гумнаў, а адбывалася толькі ў дачыненні да зямельных надзелаў

[32] Гэта як прычыну нявыплаты падаткаў у вызначаны тэрмін называлі ў 1567 г. мяшчане Кляшчэляў: LM. Kn. 531. P. 79–80.

[33] AGAD, AR. Dz. IV. T. 35. Sygn. 502. K. 45.

[34] Прыкладам, з прычыны кепскіх ураджаяў падляшская шляхта на сойме 1565/1566 гг. прасіла дазволу купляць збожжа на Валыні: РИБ. Т. 30. С. 392.

[35] Тамсама. С. 352–353.

[36] LM. Kn. 531. P. 57–58.

і падданых. Шляхту асабліва непакоіла, каб спагнанне запазычанасцей не абышло бокам ваяводаў і старастаў памежных зямель[37].

Упершыню была адзначана яшчэ адна важная праблема — злоўжыванні мясцовых ураднікаў пры зборы падаткаў. Падляшская шляхта паскардзілася, што выплачаная ёю серабшчына за 1563 г. і штрафы за нявыхад у паспалітае рушэнне былі прысвоены паборцамі і гаспадарскімі дваранамі, прысланымі збіраць падаткі[38].

Шляхта ўнесла прапанову аб накладанні штрафных санкцый у памеры 5 коп грошаў за конніка на тых, хто не выстаўляў почты ў паспалітае рушэнне. Гэтая мера разглядалася як аднаразовае змякчэнне пакарання для парушальнікаў. Нагадаем, што паводле Статуту 1529 г. у шляхты, якая не з'явілася ў войска, павінны былі адбірацца маёнткі[39]. З іншага боку, выдаткі на выпраўленне конніка былі значна большымі. Кошт толькі аднаго каня і ўзбраення конніка паводле ўхвалы сойма 1563 г. павінен быў складаць не менш за 6 коп грошаў.

Можна зразумець матывы ўладаў, якія пайшлі на такі крок. Кіраўніцтва краіны было зацікаўлена ў паступленні дадатковых фінансавых сродкаў, на якія можна было б павялічыць найманы кантынгент. Ён, нагадаем, разглядаўся як больш перспектыўная і эфектыўная вайсковая сіла і служыў, без сумневу, рэальнай альтэрнатывай закасцянеламу паспалітаму рушэнню.

Мяркуючы па кантэксце гаспадарскага адказу, шляхта на вальным сойме паскардзілася на агульнае павелічэнне падатковай нагрузкі. Гэта выклікала досыць рэзкую рэакцыю з боку гаспадара. Ён распавёў пра расход значных сродкаў з дамену на патрэбы абароны і прапанаваў соймавым станам разгледзець пытанне аб вяртанні яго выдаткаў з земскіх падаткаў[40].

Са зместу соймавых матэрыялаў выразна відаць, што шляхта імкнулася прыцягнуць да нясення падатковага цяжару як мага большае кола плацельшчыкаў. Яна не забывалася ні пра мяшчан, ні пра духавенства, ні пра

---

37 РИБ. Т. 30. С. 346–347. Пра тое, што праблема злоўжыванняў памежных ураднікаў не была надуманай, сведчыць ліст Жыгімонта Аўгуста да М. Радзівіла Чорнага, напісаны ў студзені 1565 г.: «*Panowie starostowie i urzędnicy naszy, czasu pokoju, tego na baczności mieć i w tym się czuć i lepiej opatrzyć nie chcieli, a zwłaszcza wszystkie pożytki na siebie biorąc, a do skarbu naszego stąd nic nie rendując*» (Listy. S. 496).

38 РИБ. Т. 30. С. 391.

39 Первый Литовский Статут (1529 г.). С. 154–155.

40 РИБ. Т. 30. С. 349–351.

габрэяў. Да выплат на карысць скарбу ВКЛ імкнуліся прыцягнуць нават інфлянцаў. У гэтым праглядаюцца як жаданне вызваліцца ад непасільнай падатковай нагрузкі, так і старанні павялічыць даходную частку бюджэту.

Шукаючы новыя варыянты збору земскага падатку, на сойме было прынята рашэнне аб зборы пагалоўшчыны. Пры гэтым серабшчына за 1565 г. (г. зв. трэцяя «рата», ухваленая яшчэ на Віленскім сойме 1563 г.) скасоўвалася. Гэты своеасаблівы падушны падатак браўся з усяга насельніцтва краіны, апрача шляхты, духавенства і грудных дзяцей. Ён павінен быў быць выплачаны ў сярэдзіне лютага 1566 г.[41]

Аднак, нягледзячы на вялікія спадзяванні, пагалоўшчына збіралася слаба. Яе не хапала для разліку з наймітамі[42]. 24 сакавіка 1566 г. дзяржаўныя ўлады былі вымушаны зменшыць стаўкі пагалоўшчыны напалову. У канчатковым выніку яе зборы аказаліся ніжэйшымі за ранейшыя зборы серабшчыннага падатку[43]. Ужо ў красавіку 1566 г. у паветы былі разасланы першыя «ўвяжчыя» лісты[44]. А ў канцы гэтага месяца гаспадар распарадзіўся збіраць дадаткова «трэці грош» пагалоўшчыны — у дадатак да асноўнай стаўкі пагалоўнага падатку ў памеры 2 грошаў з чалавека[45]. Канкрэтнага тэрміну выдачы гэтага падатку не прызначалася. Прадпісвалася перадаць грошы ў скарб *«безъ кождого мешканья»*[46].

На Берасцейскім сойме 1566 г. было вырашана прызначыць на 8 верасня 1566 г. апошні тэрмін выплаты запазычанасцей за 1563–1566 гг. (заўважым, папярэднія гады ўжо не згадваліся). 10 верасня 1566 г. улады праінфармавалі князёў, паноў і павятовых ураднікаў аб адпраўленні ў паветы дваран, якія разам з пабарцамі («бірчымі») і харужымі павінны былі знайсці неплацельшчыкаў падаткаў, а таксама тых, хто ігнараваў паспалітыя рушэнні. Іх чакалі традыцыйныя каральныя меры ў выглядзе канфіскацыі маёнткаў, выдачы падатку ў падвойным памеры і штрафу за нявыхад у паспалітае рушэнне ў памеры 5 грошаў з каня[47].

---

41 РИБ. Т. 30. С. 358–363.

42 *«...Тым податком, што тепер дають, жадъным обычаем выплачено быти не можеть»* (Тамсама. С. 838–841). Гл. таксама: Тамсама. С. 858–866.

43 Довнар-Запольский М. Государственное хозяйство... С. 621–622.

44 РИБ. Т. 30. С. 855–857. Лісты былі адпраўлены ў большасць паветаў ВКЛ. З усходніх паветаў згадваецца толькі Аршанскі павет.

45 Тамсама. С. 858–866.

46 Тамсама.

47 Тамсама. С. 872–876. Аднак і гэта не дало паспяховых вынікаў. У рэцэсе Гарадзенскага сойма 1566/1567 гг. асобны артыкул быў прысвечаны дабору пагалоўшчыны: Тамсама. С. 429.

Адначасова 5 верасня 1566 г. гаспадар распарадзіўся раскласці на свае ўладанні чарговую серабшчыну ў памеры 15 грошаў з валокі альбо «сахі», прызначыўшы яе збор на 13 кастрычніка 1566 г. Гэта рабілася дзеля затрымкі наймітаў на службе: *«Ижъ люди служебные, не маючи заплаты заслужоного своего, з границъ прочъ розъежъдчають ся»*[48].

Новы віток шырокамаштабных мабілізацыйных мерапрыемстваў адбыўся ў 1567 г. Гэта было звязана з актывізацыяй дзеянняў маскоўцаў у прыфрантавой зоне і няўдалым завяршэннем перамоў у Маскве. Гаспадар упершыню пасля 1563 г. рашуча звярнуўся да ваенных спраў, збіраючыся дасягнуць доўгачаканага рэваншу.

На Гарадзенскім сойме 1566/1567 гг. соймавыя станы ўхвалілі збор серабшчыны ў два бліжэйшыя гады. Як і чатыры гады таму, яна павінна была збірацца толькі ў выпадку вядзення вайны. Стаўка падатку склала 30 грошаў з валокі ў цэнтральных раёнах ВКЛ і 15 грошаў з «дыму» на тэрыторыі Украіны і ўсходняй Беларусі. Яна засталася на такім жа ўзроўні, як і ў 1563 г. Серабшчына была падзелена на дзве гадавыя «раты». Тэрмін яе збору прызначалі на сярэдзіну сакавіка адпаведна 1567 і 1568 гг. У пачатку красавіка павятовыя паборцы, абраныя самой шляхтай на сойме *«для лепшого порядку выбиранья того податку»*, павінны былі перадаць сабраныя грошы ў скарб галоўным паборцам у Вільні[49].

Забягаючы наперад, адзначым, што ў лістападзе 1567 г. на Лебедзеўскім з'ездзе было вырашана перанесці тэрмін выплаты другой «раты» серабшчыны з земскіх землеўладанняў на 18 снежня 1567 г. Прычынай такога рашэння стала неабходнасць затрымаць найманых жаўнераў на новую чвэрць і хутчэй выплаціць ім запазычанасці «заслужонага».

Серабшчына збіралася і з гаспадарскіх уладанняў. Пра гэта можна даведацца з ліста Жыгімонта Аўгуста да ўраднікаў ад 27 снежня 1567 г.[50] Стаўка першай «раты» серабшчыны гаспадарскім падданым была зніжана на 10 грошаў, г. зн. на 30%. Гэта было звязана з тым, што ў 1567 г. яны ўжо паспелі выплаціць серабшчынны падатак за мінулыя гады. Другая

48 Тамсама. С. 876–878.

49 Тамсама. С. 415–420.

50 LM. Kn. 531. P. 49–50. Такое ж самае распараджэнне было адпраўлена ў гаспадарскія дзяржавы Кнышын, Аўгустаў і Забелле: Ibid. P. 57–58. (У выданні Метрыкі ВКЛ пададзена няслушная дата. Замест 24 снежня 1568 г. трэба чытаць 24 снежня 1567 г. На гэтую дату ўказвае месца стварэння ліста — Койданава. Гаспадар мог там знаходзіцца толькі напрыканцы 1567 г.).

«рата» павінна была збірацца ў такіх жа памерах, як з земскіх землеўладанняў. Паводле змененых тэрмінаў яе трэба было выплаціць да 28 студзеня 1568 г.[51]

Разам са зборам серабшчыны ў 1567 г. на працягу аднаго месяца павінна была быць праведзена інвентарызацыя («ревидованье») земскіх землеўладанняў. Паводле соймавай ухвалы ўтоеныя ад рэвізораў (імі былі прызначаны павятовыя паборцы) землі і падданыя падлягалі безумоўнай канфіскацыі на карысць дзяржавы[52].

Гэта было кардынальнае па сваёй важнасці рашэнне. Збор паспалітага рушэння і серабшчыны праводзіўся, як правіла, паводле дадзеных 40-гадовай даўнасці, якія, безумоўна, не адлюстроўвалі рэальны стан рэчаў. Такім чынам, гаспадар змяніў свае погляды, зразумеўшы, што, абапіраючыся на старыя звесткі пра магнацкія і шляхецкія землеўладанні, нельга правесці рэальную мабілізацыю ні земскага апалчэння, ні падаткаў[53].

Акрамя таго, жадаючы ажыццявіць аператыўны набор на найманую службу, Гарадзенскі сойм пастанавіў узяць на паўгода займ за мяжой у памеры 64 тысячы коп грошаў для расходаў на дзесяцітысячнае войска. Соймавыя станы прасілі гаспадара знайсці гэтыя грашовыя сродкі пад гарантыю яго імя[54]. У прыватнасці, яны прапаноўвалі звярнуцца да палякаў *«о помочъ пенежную»*, на што гаспадар даў сваю згоду[55].

Як відаць, у 1567 г. улады планавалі правесці мабілізацыйныя мерапрыемствы з такім жа размахам, як у 1563 г. Аднак час для збору серабшчыны быў зноў выбраны надзвычай няўдала. Спадзявацца на значныя падатковыя выплаты вясной, калі сялянскія гаспадаркі толькі ачунялі ад зімовай пары, было папросту наіўна. Ні шляхцічы, ні іх падданыя ў гэты час не мелі патрэбных матэрыяльных рэсурсаў, а значыцца — з'яўляліся неплацежаздольнымі.

Таму правал падатковай кампаніі быў заканамерным. Гаспадарская ўлада ў разасланых напрыканцы траўня 1567 г. лістах вінаваціла ў гэтым павятовых паборцаў: «*...Нчого п[е]н[е]зеи податковых, а праве з чола ни*

51 LM. Kn. 531. P. 49–50.
52 РИБ. Т. 30. С. 428.
53 У 1565 г. гаспадар адмовіўся праводзіць праверку земскіх уладанняў, не бачачы для яе спрыяльных варункаў у ваенны час: Тамсама. С. 354–355.
54 Тамсама. С. 422–423.
55 Тамсама. С. 428–429.

*одного гроша есте до них* (галоўных паборцаў у Вільні) *не послали и реестров ревидованья не ознаимили аж до сих часов, зачим великое омешкане в даванью пенезей служебъным стало»*[56].

Сітуацыя з выплатай серабшчыннага падатку палепшылася толькі восенню 1567 г. Ёсць звесткі, што серабшчына 1567 г. была сабрана ўжо ў канцы гэтага года[57]. Зрушэнне справы з мёртвай кропкі можна звязаць у немалой ступені з завяршэннем цыклу сельскагаспадарчых работ, а таксама прыездам у вайсковы лагер гаспадара, што павінна было заахвоціць шляхту выконваць свае земскія абавязкі. Верагодна, сваю ролю адыгралі і карныя санкцыі, хоць наўрад ці летам–восенню 1567 г. іх прымяненне магло дасягнуць істотных маштабаў.

Калі нявыплату падаткаў можна патлумачыць прычынамі, звязанымі з нізкай плацежаздольнасцю насельніцтва, то зрыў інвентарызацыі маёнткаў сведчыць пра памкненні магнацтва і шляхты ўхіліцца ад вызначэння рэальных нормаў земскіх павіннасцяў. Многіх папросту задавальняў стан рэчаў, які існаваў.

Паборцы пры гэтым станавіліся звычайнымі закладнікамі сітуацыі. З аднаго боку, прычынай утойвання звестак пра тых, хто ігнараваў соймавыя распараджэнні, магла быць карпаратыўная салідарнасць шляхты, якая асабліва моцна павінна была выяўляцца на лакальным узроўні. З іншага ж боку, многія шляхціцы папросту карысталіся адсутнасцю ў паборцаў сур'ёзных рычагоў уздзеяння, ухіляючыся ад выдачы рэестраў і іх праверкі з боку ўпаўнаважаных асоб. Вядома, што многія буйныя магнаты пазбеглі працэдуры попісу сваіх почтаў у паспалітым рушэнні 1567 г. Чаму тое ж самае яны не маглі зрабіць у дачыненні да рэвізіі?

У Вільні на падобную практыку не хацелі глядзець скрозь пальцы. Напрыканцы жніўня 1567 г. у маёнткі шляхціцаў, якія не выконвалі земскія абавязкі, пачалі высылаць гаспадарскіх дваран. Цікава адзначыць, што ў гаспадарскіх лістах сярод парушальнікаў парадку згадваліся ваяводы, кашталяны, біскупы, павятовыя ўраднікі[58].

На нашу думку, прыбыццё ў вайсковы лагер значнай масы шляхціцаў на некаторы час прыпыніла рэалізацыю карных санкцый. Больш рашуча ўлады перайшлі да рэвізійна-канфіскацыйных мер у кан-

---

56 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 164 адв. — 165 адв., 176 адв. — 177 адв.
57 Тамсама. Арк. 58 адв. — 60.
58 Тамсама. Арк. 172 адв. — 176 адв., 179 адв. — 181.

цы 1567 – пачатку 1568 г., калі паспалітае рушэнне пачало без загаду «зверху» разыходзіцца. Улады ўпершыню прыгразілі не толькі «ўвязаннямі» ў маёнткі неплацельшчыкаў, але і размяшчэннем у іх найманых жаўнераў[59].

Невядома дакладна, ці ажыццяўляліся падобныя намеры ў рэчаіснасці. Затое ёсць звесткі, што найманыя роты самавольна займалі прыватнаўласніцкія землі для «лежаў». Так, на Гарадзенскім сойме 1568 г. была складзена скарга на жаўнераў, якія размясціліся каля Вільні і задарма забіралі ў шляхецкіх маёнтках харчаванне[60].

У гэты перыяд сапраўды адбываліся канфіскацыі. У 531-й кнізе Метрыкі ВКЛ сустракаюцца лісты, пазначаныя лютым 1568 г., аб вяртанні памылкова адабраных у землеўладальнікаў маёнткаў[61].

27 лютага 1568 г. гаспадар выдаў новае распараджэнне аб праверцы выплат серабшчыны, ухваленай у папярэднім годзе. Яе трэба было правесці да дня Св. Міхаіла (3 чэрвеня 1568 г.). Улады паўтарылі пагрозу «ўвязанняў» у маёнткі і зноў папярэдзілі неплацельшчыкаў аб тым, што іх *«имене людемъ служебънымъ в заплату подаваны быти маеть»*[62]. Так ці інакш, у 1568 г. рэвізія не была завершана. Падчас працы вальнага сойма ў Гародні ўлады былі вымушаны зноў узняць гэтае пытанне, прысвяціўшы яму нават асобны артыкул соймавай ухвалы[63].

Нягледзячы на істотны крызіс плацежаздольнасці насельніцтва, на Гарадзенскім сойме 1568 г. быў ухвалены збор чарговай серабшчыны. Падатковая стаўка была значна павялічана і склала ажно 48 грошаў з валокі альбо «службы» і 24 грошы з «дыму». Гэта было на 60 % болей за папярэдні год. Падатак быў падзелены на дзве «раты» і павінен быў быць сабраны на працягу аднаго паўгоддзя: першы раз — да 22 жніўня 1568 г., другі — да 15 снежня 1568 г.[64]

Чым тлумачыцца згода шляхты на ўхваленне такога надзвычай вялікага па памерах падатку? Справа ў тым, што серабшчына была ўхвалена замест выхаду ў паспалітае рушэнне. Гэты факт яскрава сведчыць,

59 *«...Без литости каран будеть, имене его людем служебъным в заплату подаваны быти маеть»* (LM. Kn. 531. P. 40–41).
60 РИО. Т. 30. С. 476.
61 LM. Kn. 531. P. 58–59, 63–67, 70.
62 Ibid. P. 72–73.
63 РИБ. Т. 30. С. 468–469.
64 Тамсама. С. 441–450.

што для шляхецкага стану лягчэй было выплаціць павялічаную стаўку падатку, чым выстаўляць жаўнерскія почты.

Шляхце ўдалося дабіцца новага змякчэння пакарання за невыкананне земскіх павіннасцей. На сойме было вырашана, што замест «увязання» ў маёнткі шляхта, якая не накіравала ў паспалітае рушэнне почтаў, павінна выплаціць у скарб па 8 коп грошаў за аднаго конніка. Для тых, хто не валодаў падданымі-сялянамі, велічыня штрафу склала 5 коп грошаў, а з «убогай» шляхты, якая не магла выправіць у войска ніводнага конніка, павінна было брацца толькі па 1 копе грошаў з дыму. Адабраныя маёнткі пры гэтым вярталіся іх уладальнікам. Штрафныя санкцыі не датычылі тых, хто раней часу пакінуў войска *«для недостатку и зneдзеня»*. Адзначалася, што саступка ў гэтай справе робіцца апошні раз, а ў далейшым парушальнікі парадку *«вжо без милосердья каранье водлугъ статуту отнесуть»*. Гэтыя штрафныя зборы, як ужо гаварылася, павінны былі пайсці на аплату службы старых рот, *«которие при князю Роману* [Сангушку] *были»*[65].

Дзяржаўная ўлада была вымушана пайсці на саступку і ў яшчэ адным пытанні. Яна прызнала, што канфіскацыя маёмасці павінна адбывацца толькі праз судовае разбіральніцтва, а не па непасрэдным распараджэнні гаспадара[66].

Адначасова падляшская шляхта была вызвалена ад выплаты «залатого военного», на якую яна пагадзілася, жадаючы пакінуць паспалітае рушэнне пад Маладзечнам да яго афіцыйнага роспуску. Гаспадар вырашыў, што згода на збор значнай стаўкі серабшчыны з'яўляецца дастатковай кампенсацыяй за датэрміновы адыход з войска[67].

У 1568 г. улады яшчэ больш дэталёва распісалі працэдуру збору падаткаў, асаблівую ўвагу акцэнтуючы на атрыманні грошай з тых, хто спрабаваў бы ўхіліцца ад іх выплаты. Першаснай мерай пакарання, як і раней, з'ўлялася «ўвязанне» ў маёнткі. Яно павінна было дзейнічаць да таго часу, пакуль у скарб не будзе заплачана падвойная падатковая стаўка (*«в истизне и в совитости»*). У выпадку адмовы і супраціўлення

[65] Тамсама. С. 466.

[66] *«А впередъ то всимъ обывателемъ здешнего панства нашого уфалою сойму теперешнего обваровываемъ, же за [не]служенье войны на заочную справу въ непозваныхъ и правомъ въ томъ непоконаныхъ именья браны быти не мають»* (Тамсама. С. 465–466).

[67] Тамсама. С. 466.

мясцовыя ўраднікі нават атрымалі права склікаць павятовае рушэнне супраць парушальніка права. Да гэтага часу такой меры ў соймавых ухвалах не прапісвалася.

Забраныя падчас «увязання» падданыя павінны былі перадавацца ў «заставу» плацежаздольным шляхціцам за пэўную выплату ў скарб. Калі б такія не знайшліся, то паборцы атрымалі права перадаць сялян ротмістрам *«место готовых грошеи»*, г. зн. у якасці кампенсацыі за нявыплачанае «заслужоное». Убогую шляхту чакалі санкцыі, вызначаныя Статутам за рабаўніцтва. Увогуле, паборцы атрымалі магчымасць у выпадку нявыдачы ім пабаровых квітоў спаганяць падаткі з маёнткаў неплацельшчыкаў любымі спосабамі, у тым ліку аддаваць іх у карыстанне найманым жаўнерам[68].

Такія жорсткія меры былі прадыктаваны адсутнасцю прагрэсу ў зборы падаткаў. Выхад з крызіснага становішча ўлады бачылі перш за ўсё ва ўзмацненні падатковай дысцыпліны. У рэальнасці ж праблема заключалася хутчэй у безупынным падзенні плацежаздольнасці насельніцтва. Аднак нават частыя скаргі падданых на нястачу і збядненне не спынялі ўлады ад ухвалення новых надзвычайных падаткаў. Падаткаплацельшчыкі папярэджваліся, што ніякія скаргі на галечу не будуць прымацца пад увагу. Яны без усялякіх адгаворак павінны ажыццяўляць падатковыя выплаты[69]. М. Любаўскі слушна заўважыў, што падобны падыход можна патлумачыць жаданнем атрымаць грошы хаця б з тых, хто яшчэ валодаў якімі-небудзь сродкамі[70]. М. Доўнар-Запольскі адзначыў, што такія дзеянні мелі адваротны вынік — зборы падаткаў толькі зніжаліся[71].

Рэалізацыя мерапрыемстваў па зборы падаткаў у 1568 г. паставіла на першы план праблему злоўжыванняў павятовых паборцаў. Аказалася, што яны не толькі не выканалі жорсткіх прадпісанняў кіраўніцтва краіны, але і выкарысталі свае паўнамоцтвы ў карыслівых інтарэсах: *«...Маем того ведомость, иж вы вельми малую часть пенезей з оного повету (...) людем служебъным выдали, а инъшие пенези пры собе задержываючы, тым собе пожытъки прывлашчаете; а о тых, которые оного податъку уфаленого не выдали, никоторо ведомости пану гетъману и*

[68] РИБ. Т. 30. С. 455–457; LM. Kn. 531. P. 108–112.
[69] Ibid. P. 99–100.
[70] Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 783–784.
[71] Довнар-Запольский М. Государственное хозяйство... С. 570.

*враду кгродскому не даете и в ыменях их (...) не увязываете, але еще таковым фолкгуючы и их укрываючы»*[72]. Даходзіла да таго, што паборцы падманвалі скарбнікаў, выдаючы фальшывыя квіты: «...*И тепер по сроку в рецесе соймовом описаном от инъшых тые податки земъские для некоторых пожытъков своих прыймуючы, таковые квиты свои, якобы на рок в рецесе зложоный тот податок отъдавали, давати смеете...»*[73]. Для праверкі падобных фактаў і далейшага кантролю над зборам падаткаў у паветы былі адпраўлены гаспадарскія дваране. Аднак гэтая праблема так і не была вырашана яшчэ ў сярэдзіне 1569 г.[74]

Да памятнага Люблінскага сойма Княства прыйшло з цалкам вычарпанымі рэсурсамі. Як вядома, адным з чыннікаў, які штурхаў літвінаў да перамоў з польскім бокам аб уніі, з'яўлялася патрэба знешняй фінансавай і вайсковай падтрымкі. Сойм у Любліне, які скончыўся ўлетку 1569 г., ухваліў цэлы шэраг падаткаў з падданых Рэчы Паспалітай. Яны павінны былі пайсці ў першую чаргу на ваенныя мэты[75].

Аднак крызіснае становішча скарбу мала змянілася і восенню 1569 г., на якую была прызначана выплата падаткаў[76]. У пачатку лютага 1570 г. Жыгімонт Аўгуст канстатаваў чарговы правал падатковай кампаніі: «*З некоторых земль и поветов (...) ни одного гроша того податку не принесено, а з ыныхъ поветовъ хотяж што и принесено, але несполна выбравъши и велми мало, так иж где первеи того чинило коп доколка тисечеи, там того тепер не вынесло и третее части*»[77].

Пасля Варшаўскага сойма 1570 г. гаспадар вырашыў ажыццявіць франтальную рэвізію папярэдніх падатковых збораў. Асноўнай прычынай яе правядзення называліся вялікія недаборы падаткаў, наступствам чаго было тое, што «*люди служебные ездные и пешие, упоминаючися заплаты за службу свою, великое набегане его королевской милости чинять*»[78]. Гаворка ішла пра ультыматыўныя патрабаванні ротмістраў раз-

[72] LM. Kn. 531. P. 117–118. Таксама ў: Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 202–204 прил.
[73] Ibidem.
[74] Гл.: LM. Kn. 532. P. 62–64.
[75] РИБ. Т. 30. С. 531–538; Volumina legum / Wyd. J. Ohryzko. T. 2. Petersburg, 1859. S. 102–106.
[76] LM. Kn. 532. P. 83–84.
[77] BKórn. Rkps. 1536. K. 263–266.
[78] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 295 адв. — 297.

лічыцца з запазычанасцямі за ваенную службу, якія былі вылучаны перад гаспадаром якраз-такі ў гэты час[79].

Падвядзенне вынікаў праверкі выявіла значныя недаборы падаткаў за ўвесь час Інфлянцкай вайны. Варта заўважыць, што камісары, якія праводзілі рэвізію, пры зборы інфармацыі сутыкнуліся з паважнымі цяжкасцямі. У канчатковым выніку пацвердзілася непрыемная карціна злоўжыванняў паборцаў і ўхілення падаткаплацельшчыкаў ад сваіх абавязкаў[80].

Што да сумы збораў земскіх падаткаў, то існуюць дакладныя лічбы збораў з паветаў ВКЛ за 1565–1569 гг., якія ўпершыню ўвёў у навуковы ўжытак М. Доўнар-Запольскі. Прыведзеныя ім дадзеныя былі сабраны ў выніку праверкі, праведзенай гаспадарскімі камісарамі ў 1570–1571 г.[81] Згодна з імі, у 1565 г. было сабрана 51 851 копа, у 1567 г. — 111 162 копы, а ў 1569 г. — 82 510 коп грошаў. Найбольшыя сумы традыцыйна плацілі паветы заходняй часткі ВКЛ, а найменшыя — памежныя рэгіёны на ўсходзе і поўдні краіны. Для прыкладу, Віцебскі павет аддаў у скарб у 1567 г. толькі 25 коп, Мсціслаўскі павет крыху больш — 128 коп, а Брацлаўскі і Веніцкі паветы разам — толькі 171 копу грошаў. Не зусім зразумелым выключэннем стаў Аршанскі павет — у ім было сабрана ў 1565 і 1567 гг. адпаведна 2 947 і 3 045 коп грошаў. Вядома, што гэты павет моцна цярпеў ад нашэсцяў непрыяцельскага войска, у выніку чаго аршанцы нават прасілі вызваліць іх ад выплаты падаткаў, у тым ліку і серабшчыны[82].

Калі параўноўваць гэтыя дадзеныя па зборы земскіх падаткаў з дадзенымі «квітацыі» земскага падскарбія А. Валовіча, атрымліваецца, што доля сабранай у 1565 г. серабшчыны склала прыкладна 30% ад агульнай сумы бюджэту ВКЛ. Згодна з падлікамі Г. Лаўмяньскага, колькасць насельніцтва на прыватнаўласніцкіх землях у два разы перавышала колькасць насельніцтва гаспадарскіх уладанняў — іх доля складала адпаведна 60 і 30%[83]. Гэта дазваляе сцвярджаць, што плацежныя рэсурсы прыватнаўласніцкіх уладанняў былі ў два разы вышэйшыя за гаспадарскія. Такім чынам, доля агульнай серабшчыны ў 1565 г. у бюджэце дзяржавы складала прыкладна 45%.

---

79 Pułaski K. Sprawa o zapłatę... S. 198–207.
80 Довнар-Запольский М. Государственное хозяйство... С. 772–775.
81 Тамсама. С. 684–690.
82 LM. Kn. 531. P. 127–128.
83 Łowmiański H. Zaludnienie państwa litewskiego... S. 205.

Дзякуючы захаванаму рэестру гаспадарскіх уладанняў магчыма больш-менш дакладна акрэсліць прыкладную лічбу серабшчыны, якую даваў дамен. Гаспадарскія землі ў сярэдзіне 60-х гг. XVI ст. складалі не менш за 57 тысяч валок зямлі[84]. Ведаючы стаўкі серабшчыннага падатку і правёўшы нескладаныя падлікі, прыходзім да высновы, што ў 1561 г. сума серабшчыны магла скласці каля 14,5 тысяч, у 1562 г. — больш за 19 тысяч, а ў 1563 г. — амаль 29 тысяч коп грошаў і г. д. Што датычыцца пагалоўшчыны, то, па нашых падліках, яе сума магла скласці максімальна 24 тысячы коп грошаў.

Да фінансавання ваенна-абарончых патрэб краіны, апрача шляхціцаў і іх падданых, прыцягваліся і іншыя станы.

Надзвычайныя падаткі на ваенныя патрэбы са сваіх уладанняў на агульных падставах павінна было выплачваць духавенства. Пры гэтым шляхта мэтанакіравана імкнулася ўскласці на яго як мага большы цяжар фінансавых выдаткаў.

Такія крокі рабіліся, пачынаючы з 1563 г. На Віленскім сойме, які адбыўся ў гэтым годзе, каталіцкае і праваслаўнае духавенства пагадзілася даць *«з людей своих податок серебъщизну»*[85]. Шляхту гэта не задаволіла — яна настойвала, каб на ваенныя патрэбы была перададзена палова *«скарбов костельных»*[86]. Акрамя таго, была вылучана прапанова, каб маёмасць, якая была адабрана ў касцёлах і цэрквах у выніку распаўсюджвання Рэфармацыі, таксама была перададзена на *«потребу Речи Посполитой»*[87]. Гаспадар адклаў разгляд гэтых пытанняў для іх вывучэння.

На Віленскім сойме 1565/1566 гг. паводле прынятых рашэнняў духавенства, як і шляхта, павінна было плаціць ад сваіх падданых «пагалоўшчыну». Нягледзячы на гэта, шляхта зноў патрабавала ад царкоўных структур выдачы *«половицы пожитков»*. Гаспадар, не жадаючы парушаць «старыны» і абвастраць стасункі з царкоўнымі іерархамі, парэкамендаваў ім склікаць сінод і ўхваліць перадачу ў скарб пэўнай сумы грошай[88]. Соймавыя станы прасілі гаспадара павялічыць гэтую суму ўдвая, тлумачачы гэта тым, што духавенства не прымае ўдзелу ў ваенных выправах. Гаспадар у гэтым шляхце адмовіў[89].

84 Довнар-Запольский М. Государственное хозяйство... С. 342–348.
85 РИБ. Т. 30. С. 326–327.
86 Тамсама. С. 334–335.
87 Тамсама. С. 333.
88 Тамсама. С. 355–356.
89 Тамсама. С. 363–364.

У 1567–1568 гг. царкоўныя землеўладанні ўдзельнічалі ў зборы серабшчыны на такіх жа умовах, як і шляхецкія маёнткі. Пра дадатковыя выплаты ў скарб ўжо не згадвалася. Навіной стала толькі рашэнне, прынятае на Гарадзенскім сойме 1566/1567 гг. Яно датычылася выстаўлення жаўнераў з царкоўных землеўладанняў, адабраных у свой час пратэстанцкімі магнатамі і шляхтай, а таксама перадачы ў скарб прысвоеных тымі матэрыяльных каштоўнасцей з касцёлаў і цэркваў[90].

Больш шчыльна і разнастайна да выдаткавання сродкаў на вайну прыцягвалася гарадское насельніцтва. Мяшчане, як і шляхта, павінны былі плаціць серабшчыну са сваіх землеўладанняў і падданых. Праўда, асобна ўдзел мяшчанства ў зборах гэтага надзвычайнага падатку не агаворваўся. На Віленскім сойме 1563 г. было прынята рашэнне аб тым, што жыхары прыватнаўласніцкіх гарадоў будуць несці такія ж павіннасці, як гаспадарскія мяшчане[91]. У 1566 г. гарадское насельніцтва прыцягвалася да выплаты «пагалоўшчыны».

Перыядычна на гарады ўскладаліся спецыяльныя прымусовыя займы («позычки»), што дазваляла скарбу дастаткова аператыўна атрымліваць дадатковыя сродкі. Такія займы рабіліся кожныя два гады, пачынаючы з 1561 г. Як можна зразумець, сума займу вызначалася, зыходзячы з рэальных фінансавых магчымасцяў мяшчанства (гл. табл. 3.1.2).

У траўні 1561 г. у Вільні, імкнучыся атрымаць сродкі на аператыўныя расходы, вырашылі накласці *«шацунок на маетности людеи купецких и на места наши»*. Гэтае распараджэнне датычыла 29 гарадоў ВКЛ. Цікава, што найбольшыя сумы павінны былі плаціць усходнія гарады — Полацк, Віцебск і Магілёў. Са значных гарадоў заходняй часткі ВКЛ у спісе плацельшчыкаў згадваліся толькі Гародня і Навагрудак. Агульная сума гэтага пабору складала 10 520 коп грошаў. Грошы павінны былі быць унесены ў скарб да 29 чэрвеня 1561 г. Цікава, што ў гаспадарскім лісце абяцалася вярнуць «позычку» з восеньскіх падатковых збораў[92].

У ліпені 1563 г. сітуацыя карэнным чынам змянілася — вялікая сума з гарадоў на ўсходзе краіны патрабавалася толькі з Магілёва, які шпарка ператвараўся ў буйны гандлёвы цэнтр. Гарады, закранутыя ваеннымі дзеяннямі, пазыкі зусім не давалі. Гэта ў немалой ступені паўплывала на

[90] РИБ. Т. 30. С. 458, 465.
[91] Максимейко Н. Сеймы Литовско-Русского государства... С. 126–127.
[92] LM. Kn. 564. P. 37. Акрамя таго, 2 верасня 1561 г. гаспадар папрасіў троцкіх мяшчан аб пазыцы 400 коп грошаў: Ibid. P. 66.

тое, што агульная сума пазыкі ў параўнанні з папярэднім зборам зменшылася больш чым на палову. Грошы павінны былі паступіць у скарб ужо праз тыдзень пасля атрымання мяшчанамі гаспадарскіх лістоў. Гаспадар даў гарантыю вяртання пазыкі восенню 1563 г.[93]

У 1565 г. «позычка» з гарадоў склала найменшую суму. Малыя зборы, верагодна, былі абумоўлены агульнагаспадарчым крызісам сярэдзіны 60-х гг. XVI ст. Прыкладам, Гародня, якая ў 1561 г. выплачвала 1 000 коп грошаў, цяпер была абавязана выплаціць толькі 400 коп. Падобнае змяншэнне адбылося ў дачыненні да пераважнай большасці гарадоў[94]. На гэты раз дзяржава не разглядала гэтае мерапрыемства як пазыку і не абяцала вярнуць грошы[95].

У пачатку верасня 1567 г. цэнтральныя ўлады зноў прасілі жыхароў гарадоў з магдэбургскім правам унесці ў скарб пэўную суму грошай *«для пильных и кгвалтовных потреб»*. У адмысловым лісце гаварылася, што, каб не абцяжарваць гарадское насельніцтва, стаўкі займу вызначаны ў мінімальным памеры. Улады давалі гарантыю вяртання пазыкі з *«скарбу, або зъ якихъ доходов нашых»*. Пры гэтым мяшчане папярэджваліся, што пры невыкананні распараджэння аб унясенні грошай у скарб наймітам будзе дазволена самастойна ўзяць сваё «заслужоное» ў гарадах, г. зн. выкарыстаць сілу[96].

Віленскія мяшчане абавязаліся выплаціць у скарб ажно 8 тысяч коп грошаў. Палова гэтай сумы восенню 1567 г. была прызначана для куплі гармат і артылерыйскага рыштунку, якія павінны былі быць адпраўлены ў лагер паспалітага рушэння[97].

Непрывілеяваныя гарады (г. зн. без магдэбургскага права) таксама павінны былі ўнесці ў скарб пэўную суму грошай. Аднак гэты надзвычайны пабор накладваўся на іх замест падводнай павіннасці, згодна з якой мяшчане павінны былі адправіць у вайсковы лагер харчовы правіянт[98].

У 1568 г. на вальным сойме ў Гародні шляхта прапанавала гарадам замест грашовай пазыкі забяспечыць найманае войска гарматамі і дра-

---

93 РИБ. Т. 30. С. 662–666.
94 Тамсама. С. 797–800.
95 Тамсама.
96 *«...Оную суму пенезей людем служебнымъ в заплату заслужоное ихъ с того места совито отправити роскажемо»* (LM. Kn. 531. P. 35–36).
97 Ibid. P. 39.
98 Ibid. P. 36–38.

бамі. Гаспадар адмоўна паставіўся да гэтай прапановы, спаслаўшыся на вялікі дэфіцыт сродкаў у скарбе і неабходнасць яго папаўнення[99].

Табліца 3.1.2.

*Стаўкі прымусовых займаў з гарадоў (у копах літоўскіх грошаў)*

| Горад | Час ухвалення | | | | СУМА |
|---|---|---|---|---|---|
| | 8.05.1561 | 4.07.1563 | 11.05.1565 | 2.09.1567 | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Вільня | – | – | – | 8000 | 8000 |
| Полацк | 700 | – | – | – | 700 |
| Віцебск | 700 | – | – | – | 700 |
| Орша | 500 | – | – | – | 500 |
| Пералом | 50 | – | – | – | 50 |
| Берасце | 300 | 600 | 300 | 200 | 1400 |
| Ваўкавыск | 500 | 300 | 100 | 8 | 908 |
| Поразава | 100 | 100 | 30 | 8 | 238 |
| Браньск | 200 | 200 | 100 | 60 | 560 |
| Сараж | 200 | 200 | 100 | 40 | 540 |
| Бельск | 1000 | 800 | 200 | 108 | 2108 |
| Гародня | 1000 | 800 | 400 | 120 | 2320 |
| Тыкоцін | 200 | 200 | 80 | 60 | 540 |
| Камянец | 200 | 200 | 100 | 60 | 560 |
| Новагародак | 500 | 400 | 200 | 100 | 1200 |
| Слонім | 100 | 200 | 100 | 50 | 450 |
| Кобрын | 200 | 150 | – | 50 | 400 |
| Бабруйск | 100 | 200 | 100 | 80 | 480 |
| Менск | 500 | 500 | 100 | 150 | 1250 |
| Луцк | 200 | 400 | 400 | 110 | 1110 |
| Крэмянец | 200 | 200 | 150 | 50 | 600 |

99 РИБ. Т. 30. С. 464.

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Ляхавічы | 20 | 60 | – | 40 | 120 |
| Пінск | 500 | 400 | – | 150 | 1050 |
| Магілёў | 1000 | 600 | – | 150 | 1750 |
| Ковель | 100 | – | 100 | – | 200 |
| Кіеў | 1000 | – | – | 200 | 1200 |
| Кнышын | 200 | – | 80 | 60 | 340 |
| Мозыр | 100 | – | 100 | 100 | 300 |
| Мсцібагаў | 100 | – | 100 | 30 | 230 |
| Шэрашова | 50 | – | 50 | 30 | 130 |
| Кляшчэлі | – | 30 | 30 | 50 | 110 |
| Нараў | – | 40 | 40 | 30 | 110 |
| Драгічын | – | 200 | 150 | 60 | 410 |
| Уладзімір | – | 200 | 150 | 60 | 410 |
| Мельнік | – | 100 | – | 50 | 150 |
| Коўна | – | – | 300 | 1000 | 1300 |
| Трокі | – | – | 200 | 100 | 300 |
| Гарадок | – | – | 100 | 10 | 110 |
| Мілейчыцы | – | – | 50 | 30 | 80 |
| Аўгустаў | – | – | 50 | 20 | 70 |
| Свіслач | – | – | – | 60 | 60 |
| Лосічы | – | – | – | 50 | 50 |
| Мерач, Шадова, Вербілова | – | – | – | па 40 | 40 |
| Воінь, Крынкі, Высокае, Шаўлі, Панявежа, Юрборк | – | – | – | па 30 | 30 |
| Янішкі, Жагоры, Самілішкі, Кернова, Аліта, Новы Двор пад Гародняй, Анікшты, Даўгялішкі, Барысаў, Вісцінец | – | – | – | па 20 | 20 |
| Кузніца, Жыжморы, Доўгі, Валькінікі, Вількія, Велена, Радашковічы, Васілішкі, Эйшышкі, Радунь, Ліпнішкі, Геранёны, Браслаў, Больнікі, Вількамір, Гандзінь, Целешы, Вішвяны, Плацелі, Жослі | – | – | – | па 15 | 15 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Адэльск | – | – | – | 12 | 12 |
| Дарсунішкі, Біршганы, Бержнікі, Купішкі, Абеле, Моўчадзь, Ломазы, Сялец, Лыскова, Уцена, Ужвінты, Біржаняны, Крэтынга, Паланга, Радзівілішкі, Неманойць, Астрына, Здзітаў | – | – | – | па 10 | 10 |
| Луконіца, Добучын, Ойрагола, Воўпа, Пералая, Сімно, Лаздзея, Цэрын, Крожы, Батокі, Свянцяны | – | – | – | па 8 | 8 |
| Скерстамон | – | – | – | 7 | 7 |
| Межырэч, Лунна, Новы Двор Свецінога, Лынгмяны | – | – | – | па 6 | 6 |
| Концяжын | – | – | – | 5 | 5 |
| Ліда | – | – | – | 3 | 3 |
| **УСЯГО** | **10520** | **7080** | **3960** | **12653** | **34213** |

**Заўвагі:**
1. Курсівам вылучаны «прывілеяваныя гарады» (на магдэбургскім праве).
2. Тыкоцін у 1563 г. згадваецца два разы — 160 і 200 коп грошаў. За аснову ўзята сума 200 коп грошаў, бо яна сустракаецца ў папярэднім спісе (за 1561 г.).
3. У 1563 г. Кобрын згадваецца разам з Гарадком і Дубнічамі.

*Табліца складзена паводле:* LM. Kn. 564. P. 37; РИБ. Т. 30. С. 662–664, 797–799; LM. Kn. 531. P. 35–39.

Важнай крыніцай паступлення даходаў служылі падаткі з гандлёвых аперацый і мытныя пошліны. У агульнай суме яны прыносілі ў скарб штогод прыкладна 23–25 тысяч коп грошаў[100]. Напэўна, гэтая сума магла быць значна вышэй, калі б мытныя пошліны плаціла шляхта, вызваленая ад іх у 1559 г.[101]

Імкнучыся мацней задзейнічаць гарадское насельніцтва ў фінансаванні абарончых мерапрыемстваў, дзяржаўная ўлада накладала на яго новыя падаткі мытна-акцызнага характару. Для папаўнення скарбу 7 снежня 1561 г. гаспадарская канцылярыя выдала пастанову пра зборы

[100] Довнар-Запольский М. Государственное хозяйство... С. 558–566.
[101] РИБ. Т. 30. С. 271–272.

з тых, хто *«немалые пожитки с паньства выносят а выхованье и выживенье мают в том отчизном паньстве нашом перемешкиваючи, а ничим до службы не прикладают ся»*[102]. Гэтыя словы былі звернуты да мясцовых і іншаземных рамеснікаў і гандляроў.

Новы мытны пабор закрануў амаль усе істотныя адзінкі ўнутранага і знешняга гандлю. Тэрмін дзеяння гаспадарскай пастановы быў неабмежаваны і залежаў ад развіцця падзей на ваенным фронце: «...*Кождого году будут выбирати и отдавати тот податок на часы назначоные, поколя воина ся успокоить*»[103]. За ўхіленне ад выплаты гэтага падатку пагражала канфіскацыя маёмасці. Забараняўся вываз за мяжу самых неабходных рэчаў пры вядзенні вайны — коней, узбраення, вырабаў з жалеза. Ніякія падатковыя льготы, што датычылі «старога» мыта, не распаўсюджваліся на новаўхвалены пабор.

Першы ўзнос у скарб павінен быў быць зроблены ў кароткі тэрмін — да 23 лютага 1562 г. Прычына такога спеху заключалася ў неабходнасці як мага хутчэй выплаціць «заслужоное» найманым жаўнерам[104]. Нам невядомы канкрэтныя звесткі пра суму збораў новага мытна-акцызнага падатку, але ў супастаўленні з «новоподвышоным мытом» 1566 г. можна меркаваць, што ён складаў не менш за 10 тысяч коп грошаў у год.

Аналагічны пабор у дадатак да «старога» мыта і мыта 1561 г. быў ухвалены на Берасцейскім сойме 1566 г. Ён прызначаўся спецыяльна для аплаты найманага кантынгента ў Інфлянтах[105]. «Новоподвышоное мыто» адразу было перададзена ў арэнду Я. Хадкевічу і А. Валовічу за 13 тысяч коп грошаў у год[106]. Я. Хадкевіч быў абавязаны сабраныя сродкі *«межи служебъными роздати и со всего личбу чинити в скарбе нашом»*[107].

Тэрмін дзеяння гэтага мыта першапачаткова складаў толькі два гады[108]. Аднак збіраўся ён і пазней. На Гарадзенскім сойме 1568 г. было вырашана працягнуць дзеянне абодвух мытных пабораў яшчэ на адзін

---

[102] LM. Kn. 564. P. 83–89. Гэты пабор быў вынаходніцтвам земскага падскарбія А. Валовіча: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 50, арк. 210 адв.

[103] LM. Kn. 564. P. 85.

[104] Ibid. P. 88.

[105] РИБ. Т. 30. С. 396–400; НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 111–111 адв.; Тамсама. Спр. 266, арк. 96–96 адв.

[106] Тамсама. Спр. 267, арк. 67 адв. — 68.

[107] Тамсама. Арк. 111–111 адв.

[108] Тамсама. С. 396–398.

год — да дня Усіх Святых (10 ліпеня 1569 г.). Сабраныя за гэты год сродкі павінны былі стаць для гаспадарскага скарбу своеасаблівай кампенсацыяй за панесеныя расходы на земскія патрэбы[109].

Аднак на Люблінскім сойме 1569 г. Жыгімонтам Аўгустам было заяўлена, што *«тыхъ поборовъ на жадную властную потребу его королевской милости ничого не обернено, одно потребы земские отправовано»*. Зыходзячы з гэтага (у прыватнасці, асобна згадвалася забеспячэнне памежных замкаў), дзеянне мытных пабораў было захавана[110].

Немалаважнай крыніцай даходаў для скарбу былі спагнанні разнастайных пабораў і падаткаў з габрэйскага насельніцтва, якое традыцыйна разглядалася як адна з найбольш забяспечаных у фінансавым плане сацыяльна-этнічных груп.

На Віленскім сойме 1563 г. на габрэяў быў накладзены спецыяльны падатак[111]. Спачатку ён складаў 12 тысяч коп грошаў і павінен быў быць выплачаны за надзвычай кароткі тэрмін — два тыдні. Аднак неўзабаве — 25 ліпеня 1563 г. — гаспадарская ўлада была вымушана яго зменшыць да чатырох тысяч коп грошаў, тлумачачы, што *«таковую суму дати вам* (г. зн. габрэям) *было з обтяженем вашим и заплатити бы есте ее не могли...»*[112]. Калі б і гэтая сума аказалася занадта вялікай, то з кожнага габрэя прадпісвалася ўзяць па адным польскім злотым, а таксама сабраць пабор у памеры 10% з маёмасці.

Падобная мера была прынята падчас працы Берасцейскага сойма 1566 г. З прычыны нездавальняльных збораў пагалоўшчыны на габрэяў быў накладзены пабор у памеры 6 тысяч коп грошаў. Яго неабходна было выплаціць да дня Нараджэння Багародзіцы (8 верасня 1566 г.)[113].

Як і астатняе насельніцтва краіны, габрэі плацілі падаткі слаба. Такое становішча тлумачылася тым, што яны павінны былі адначасова ўносіць у скарб шмат разнастайных пабораў. Разам гэта складала значную суму. У 1567 г., прыкладам, габрэйскае насельніцтва павінна было аддаваць традыцыйны пабор «залатога чарлёнага» з кожнага чалавека,

---

109 РИБ. Т. 30. С. 461–463.
110 Тамсама. С. 523.
111 Тамсама. С. 332–333.
112 Б е р ш а д с к и й С. Документы и регесты к истории литовских евреев. Т. 1. СПб., 1882. С. 117–118; РИБ. Т. 30. С. 705–708.
113 Тамсама. Т. 1. С. 183–184.

два зборы пагалоўшчыны — адпаведна 15 і 8 грошаў з чалавека, спецыяльныя паборы 1566 і 1567 гг. адпаведна па 6 і 3 тысячы коп грошаў. Прадстаўнікі габрэйскай абшчыны скардзіліся з гэтай прычыны на *«вбозъство и недостаток свой»*[114].

2 верасня 1567 г. габрэі, як і мяшчане, атрымалі ліст аб тэрміновым прымусовым займе («позычцы»). Усяго яны павінны былі перадаць у скарб 4 170 коп грошаў[115]. Найбольшую суму — 1 300 коп грошаў — традыцыйна павінен быў выплаціць берасцейскі «збор».

Аднак ужо 10 верасня 1567 г. габрэйскае насельніцтва атрымала новы гаспадарскі ліст, паводле якога на яго накладаўся адзіны пабор у памеры 3 000 коп грошаў. Кіраўніцтва краіны жадала ўпарадкаваць зборы з габрэяў, якія *«за таковым невставичным и неоднаково постановеным платом немалых трудностей уживають (...) и спешно податков на них установленых выбирати не могуть»*. Пабор павінен быў збірацца кожны раз, калі адбывалася ўхваленне земскіх падаткаў. Гэтая мера была абвешчана на час вайны[116]. Адзначым, што збор «залатога чарлёнага» пры гэтым захоўваўся (гл. табл. 3.1.3).

На Гарадзенскім сойме 1568 г. быў ухвалены новы спецыяльны пабор з габрэяў. Як тлумачылася ў соймавай ухвале, яго з'яўленне было звязана з тым, што габрэі *«николи на войну не ездять и податков на жолнери уфаленых не дають»*. Кожны дарослы чалавек павінен быў унесці ў скарб па 12 грошаў. Выплата пабору была падзелена на дзве «раты», з такімі ж тэрмінамі выплаты, як і серабшчына са шляхецкіх уладанняў[117].

Габрэі, аднак, *«в недъбалость собе то положывъшы»*, не выканалі гэтага ў вызначаны тэрмін[118]. Дзяржаўныя ўраднікі неўзабаве звярнуліся да радыкальных мер. Прыкладам, у 1569 г. за нявыплату падаткаў некаторыя луцкія габрэі былі пасаджаны за краты[119].

---

114 Бершадский С. Документы и регесты... Т. 1. С. 193–194.
115 LM. Kn. 531. P. 36. У іншай крыніцы прапушчаны Пінск з 500 копамі грошаў: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 178 адв. — 179 адв.
116 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 181 адв. — 183; Бершадский С. Документы и регесты... Т. 1. С. 198–200.
117 РИБ. Т. 30. С. 447–448.
118 LM. Kn. 531. P. 144–145.
119 Бершадский С. Документы и регесты... Т. 2. СПб., 1882. С. 212–213.

Табліца 3.1.3.

*Стаўкі прымусовых займаў з габрэйскіх «збораў» (у копах літоўскіх грошаў)*

| Горад | Час ухвалення | | СУМА |
|---|---|---|---|
| | 25.07.1563 | 02.09.1567 | |
| Крэмянец | 140 | 150 | 290 |
| Астрог | 700 | 500 | 1200 |
| Луцк | 550 | 500 | 1050 |
| Уладзімір | 500 | 300 | 800 |
| Клецк | 15 | 250 | 385 |
| Дварэц | 60 | | |
| Наваградак | 30 | | |
| Ляхавічы | 30 | | |
| Пінск | 600 | 500 | 1100 |
| Тыкоцін | 100 | 170 | 270 |
| Гародня | 200 | 200 | 400 |
| Трокі | 376 | 300 | 676 |
| Берасце | 264 | 1300 | 1564 |
| **УСЯГО** | **3565** | **4170** | **7735** |

*Табліца складзена паводле:* РИБ. Т. 30. С. 705–708; LM. Kn. 531. P. 36.

Відавочна, што габрэйскае насельніцтва таксама не спраўлялася з цяжарам пабораў, якія ўвесь час узрасталі. Чаму так склалася? Цяжка ўявіць, каб паслухмяныя габрэі масава ўхіляліся ад падатковых выплат. Развіццё сітуацыі добра паказвае, што найважнейшым фактарам невыканання павіннасцей стала нарастанне пагаршэння матэрыяльнага становішча габрэяў. У канцы 60-х гг. XVI ст. ужо не існавала магчымасці істотна яго палепшыць пасля пабораў 1566–1567 гг.

Варта дадаць, што тэрміны падатковых выплат, вызначаныя для габрэяў, былі надзвычай кароткімі. Напрыклад, у 1567 г. паменшаную суму спецыяльнага пабору габрэі павінны былі перадаць скарбнікам ужо праз тыдзень пасля выдання гаспадарскай пастановы.

Можна канстатаваць, што спагнанні з габрэйскага насельніцтва былі важнай крыніцай даходаў для дзяржаўнага скарбу, асабліва пры пільнай неабходнасці. Гаспадарская ўлада без цырымоній імкнулася эксплуатаваць фінансавыя рэсурсы гэтай сацыяльна-этнічнай групы, прытым з максімальнай эфектыўнасцю, што ў рэшце рэшт дало адваротныя вынікі.

Распаўсюджаным метадам атрымання дадатковых фінансавых сродкаў былі заклады («заставы») дзяржаўных (гаспадарскіх) маёнткаў прыватным асобам на пэўны, звычайна кароткі тэрмін за грашовыя пазыкі ў скарб. Асабліва часта яны рабіліся ў крызісныя моманты і пры пільнай патрэбе ў фінансавых сродках. У рэальнасці закладзеныя маёнткі на доўгі час заставаліся ў руках арандатараў, бо ў гаспадара, як правіла, не было сродкаў іх выкупіць.

Найбольш інтэнсіўна дзяржаўныя землеўладанні «раздаваліся» ў 1560–1561 гг., калі ўсталёўваўся кантроль над Інфлянтамі, і ў 1567 – пачатку 1568 г., падчас найбольш значных мерапрыемстваў па мабілізацыі ўзброеных сіл. Дзякуючы «заставам» з ліпеня 1560 г. па ліпень 1561 г. гаспадарская ўлада, напрыклад, атрымала больш за 67 тысяч коп грошаў, а ў 1567–1568 гг. даходы з «заставаў» склалі каля 70 тысяч коп грошаў.

У 1562–1564 гг. гаспадарскія маёнткі аддаваліся ў «заставу» не гэтак інтэнсіўна. У немалой ступені на гэта паўплывала адсутнасць гаспадара ў ВКЛ, бо ён непасрэдна распараджаўся дзяржаўнымі маёнткамі. Напрыканцы вайны заклад зямельнай маёмасці застаўся адной з апошніх надзейных крыніц даходаў. У сакавіку 1569 г., калі ў скарбе адчуваўся востры дэфіцыт сродкаў, а паступленняў падаткаў не прадбачылася, Жыгімонт Аўгуст дазволіў земскаму падскарбію М. Нарушэвічу закладваць дзяржаўныя маёнткі паводле ўласнага меркавання[120]. Усяго за гады Інфлянцкай вайны «заставы» прынеслі ў скарб больш за 200 тысяч коп літоўскіх грошаў.

У пошуках грашовых сродкаў кіраўніцтва ВКЛ не цуралася метадаў, вельмі падобных да шантажу. У лютым 1568 г. Юрыю Бароўскаму, які меў у сваім дзяржанні Каршоўскае цівунства, было прапанавана «пазычыць» у скарб непазначаную суму грошай пад 10% гадавых. Урадніку наўпрост паведамлялася, што пры адмове жамойцкаму старасце Я. Хадкевічу і зем-

[120] LM. Kn. 532. P. 28–29.

скаму падскарбію М. Нарушэвічу будзе дадзена распараджэнне адабраць у Ю. Бароўскага цівунства і перадаць яго іншай асобе[121].

Падобныя захады рабіліся цэнтральнымі ўладамі ўжо летам 1566 г. Каб прымусіць жамойцкіх цівуноў больш энергічна выплачваць падаткі ў скарб, у Яна Бурбы было адабрана Гандынскае цівунства і аддадзена ў «заставу» Мікалаю Дарагастайскаму — за кошт зробленай ім пазыкі ў 2 000 коп грошаў. Аднак гэты крок кіраўніцтва дзяржавы выклікаў негатыўную рэакцыю астатніх жамойцкіх ураднікаў, якія спасылаліся на свае права трымаць цівунствы «до живота». Гаспадарская ўлада была вымушана адмовіцца ад правядзення такіх мер. Гандынскае цівунства было вернута Я. Бурбу[122].

Цяпер звернемся да характарыстыкі бюджэту ВКЛ у гады Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг. Яго стан выразна адлюстраваны ў справаздачы («квитацыи») земскага падскарбія А. Валовіча аб даходах і расходах скарбу за 1561–1566 гг. (гл. табл. 3.1.4).

Найбольш высокія даходы адзначаліся ў 1562–1563 гг. Гэта было звязана ў першую чаргу са зборамі новага мытна-акцызнага пабору, серабшчыны з гаспадарскіх уладанняў і прымусовых займаў ад гарадоў. Немалаважную ролю адыграла выкарыстанне ўладамі жорсткіх мер па спагнанні нядоімак. У павышэнні даходнасці скарбу немалое значэнне меў таксама прыход на пасаду земскага падскарбія А. Валовіча ў ліпені 1561 г.

У 1564–1566 гг. даходы скарбу значна паменшыліся, што было абумоўлена агульным крызісам эканомікі ВКЛ. Баланс скарбу (пры пераходзе астатку з папярэдняга года) стала меў адмоўнае значэнне, пры гэтым у 1564–1565 гг. назіралася найбольшая розніца паміж даходамі і расходамі. Напрыканцы знаходжання А. Валовіча на пасадзе галоўнага скарбніка краіны дэфіцыт бюджэту складаў больш за 30 тысяч коп грошаў.

Дзякуючы яшчэ адной цікавай крыніцы ёсць магчымасць даведацца пра выдаткі Княства на патрэбы Інфлянтаў у перыяд з 1556 па 1573 гг. Даходы з гэтага краю за гэты час былі мізэрнымі — толькі 1 111 коп 17 грошаў. Выдаткі ж — на парадак вышэй. Так, падчас знаходжання на пасадзе земскага падскарбія І. Гарнастая і А. Валовіча (1556–1566 гг.) расходы скарбу ВКЛ на інфлянцкія патрэбы склалі 509 325 коп 41 грош,

[121] LM. Kn. 531. P. 60–61.
[122] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 50–52, 66–68 адв.

Табліца 3.1.4.

*Бюджэт Вялікага Княства Літоўскага ў 1561–1566 гг.*
*(паводле справаздачы земскага падскарбія А. Валовіча)*

| Гады | Даходная частка | Расходная частка | Просты баланс | Баланс пры пераходзе астатку |
|---|---|---|---|---|
| 1561 (да 19 ліпеня) | 11 799 | | | |
| 1561 (пасля 19 ліпеня) | 111 434 | 72 909 | + 38 525 | + 50 324 |
| 1562 | 228 723 | 295 500 | - 66 777 | - 16 453 |
| 1563 | 230 697 | 231 174 | -477 | - 16 930 |
| 1564 | 138 219 | 154 988 | - 16 769 | - 33 699 |
| 1565 | 173 095 | 163 666 | + 9 429 | - 24 270 |
| 1566 (да 4 красавіка) | 105 636 | 96 562 | + 9 074 | - 15 196 |
| УСЯГО | 987 804<br>(982 006) | 1 014 799<br>(1 113 992) | - 26 995<br>(- 131 986) | |
| ДАДАТКОВЫЯ ДАХОДЫ І РАСХОДЫ | 70 594 | 73 910 | | |
| **Сума** | **1 058 398<br>(1 152 602)** | **1 088 709<br>(1 187 903)** | **- 30 311<br>(- 35 301)** | |

**Заўвагі:**
1. У дужках пададзеныя падлікі, зробленыя ў крыніцы.
2. Для зручнасці падлікаў былі апушчаны грошы і пенезі.

*Табліца складзена паводле:* НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 48, арк. 219 адв. — 230.
Гл. таксама: Тамсама. Спр. 50, арк. 209 адв. — 216.

а падчас кіравання скарбам М. Нарушэвіча (1566–1573 гг.) — 131 101 коп 15 грошаў. Акрамя таго, з квітоў Р. Хадкевіча было выдадзена 135 262 коп 16 грошаў. Асобна ўказваліся выдаткі на забеспячэнне Пернавы — 118 095 коп 10 грошаў. Такім чынам, агульная сума расходаў ВКЛ на патрэбы Інфлянтаў склала 893 784 копы 22 грошы (паводле падлікаў, зробленых у «квітацыі» — 883 784 копы 23 грошы)[123].

Заўважым, што гэтую лічбу можна параўнаць з усім літоўскім бюджэтам за час падскарбства А. Валовіча. Прыведзеныя дадзеныя яшчэ раз даказваюць, якім вялікім быў аб'ём фінансавай дапамогі ВКЛ Інфлянтам.

[123] РНБ, ф. 971, авт. 321/1, ед. хр. 4, л. 7–8.

Такім чынам, улады рабілі розныя захады для папаўнення скарбу фінансавымі сродкамі. Асновай даходаў у ваенны час служылі надзвычайныя падаткі — серабшчына і пагалоўшчына, якія ўхваляліся і збіраліся амаль штогод. Нягледзячы на сталы рост падатковых ставак, рэсурсаў скарбу не хапала для пакрыцця ваенных выдаткаў. У немалой ступені гэта было звязана з нестабільным паступленнем грашовых сродкаў, што, у сваю чаргу, тлумачылася слабой плацежаздольнасцю насельніцтва і неэфектыўнай працай зборшчыкаў падаткаў. Да такога стану рэчаў прычыніліся ўдзел у частых ваенных мерапрыемствах, вялікія і бесперапынныя зборы надзвычайных падаткаў, а таксама адчувальнае для многіх спусташэнне прыватнаўласніцкіх маёнткаў найманымі жаўнерамі.

## § 2. Галаўны боль для ўладаў: праблемы ўтрымання найманых жаўнераў

Найбольш балючай праблемай для дзяржаўнага скарбу ВКЛ падчас Інфлянцкай вайны было ўтрыманне найманых жаўнераў. Найманае войска патрабавала значных фінансава-матэрыяльных выдаткаў, а традыцыйных рэсурсаў для забеспячэння ваенна-абарончых патрэб, як паказана вышэй, яўна бракавала. У гэтай частцы кнігі мы хочам разгледзець, у колькі ж абыходзілася дзяржаве ўтрыманне найманага кантынгента ў ВКЛ і Інфлянтах падчас вайны, якія праблемы ўзнікалі ў выніку нездавальняльнага фінансавання наймітаў і якія меры прымаліся дзяржаўнымі структурамі ўлады для іх вырашэння.

Спачатку неабходна высветліць, якая стаўка «заслужоного» плацілася найманым жаўнерам падчас Інфлянцкай вайны. Яна разлічвалася на традыцыйны тэрмін службы — чвэрць (квартал) года. Звычайна грошы выдаваліся авансам, але вельмі хутка гэтае правіла пачало парушацца з прычыны праблем з наяўнымі сродкамі.

На жаль, мы не маем дакладнай інфармацыі, колькі атрымліваў літоўскі найміт у Інфлянтах у 1560–1563 гг. Найверагодней, стаўка аплаты драба складалася ў межах 2–2,5 коп, конніка — 4 коп літоўскіх грошаў. Гэтыя сумы жаўнераў не задавальнялі. Крыніцы захавалі сведчанні, што ўжо ў пачатку 1560 г. літоўскія жаўнеры патрабавалі вызначыць для іх та-

кую ж стаўку «заслужоного», як і для інфлянцкіх наймітаў. Гаспадар адмовіў, указваючы, што *«досыть немалую заплату взяли, а тежъ не водле немецкого обычаю почты свои оказали...»* (маецца на ўвазе неўкамплектаванасць рот жаўнерамі і ўзбраеннем)[124].

Неабходна адзначыць, што літоўскія жаўнеры атрымлівалі менш за жаўнераў польскага кантынгента. Калі польскім драбам выплачвалася прыблізна такая ж стаўка, як літвінам — 5–6 польскіх злотых (2–2,4 коп літоўскіх грошаў), то польскія коннікі атрымлівалі ажно 15 польскіх злотых (6 коп літоўскіх грошаў)[125]. З 1563 г. іх стаўка была павялічана да 17 злотых[126]. Наўрад ці літоўскія коннікі маглі разлічваць на такую высокую аплату.

Як вядома, фарміраванне найманага кантынгента на ўсходнім памежжы ВКЛ пачалося толькі пасля ўзяцця маскоўцамі Полацка. На Віленскім сойме 1563 г. было вырашана выдаваць коннікам па 3,5 копы грошаў на чвэрць у летні час і па 4 копы — узімку[127]. Аднак, без сумневу, для масавага прыцягнення людзей на службу такіх ставак было недастаткова.

У лістападзе 1565 г. гаспадарская ўлада, заклікаючы магнатаў і ўраднікаў да фарміравання новых найманых атрадаў, вырашыла павялічыць для коннікаў стаўку да 5 коп грошаў за чвэрць. Выплату «заслужоного» абяцалі ажыццявіць у 1566 г. пасля атрымання скарбам новых сродкаў з падатковых збораў. Аднак рэалізацыя гэтых намераў адбывалася, як будзе паказана ніжэй, з вялікімі цяжкасцямі.

Улетку 1566 г. улады адмовіліся ад такой высокай стаўкі жаўнерскага заробку, бо ва ўмовах паглыблення фінансавага крызісу яна не была эканамічна абгрунтаванай. Стаўку зменшылі да 3 коп грошаў за чвэрць[128].

---

124 АЗР. Т. 3. С. 108–110.

125 J a s n o w s k i J. Materiały do działalności... S. 276.

126 W i m m e r J. Siły zbrojne Korony... S. 53.

127 Гэтая інфармацыя змешчана ў лісце да Ф. Кміты: АСД. Т. 4. С. 208–210. Гэты ротмістр прасіў *«прибавенья»* стаўкі, спасылаючыся на значныя страты сваіх жаўнераў у выніку актыўнага ўдзелу ў ваенных дзеяннях, перадусім у Ульскай бітве. У якасці выключэння гаспадар паабяцаў выдаць для яго роты на бліжэйшыя паўгода па 5 коп грошаў за чвэрць. Аднак, як паказвае справаздача Ф. Кміты з 1570 г., гэтыя грошы наймітам не плаціліся. З гэтай прычыны з 16 траўня 1564 г. да 11 лістапада 1565 г. рота аднаго з найбольш ініцыятыўных і ваяўнічых ротмістраў у ВКЛ была распушчана. Гл.: Тамсама. С. 235–237.

128 Такая стаўка была вызначана для роты Ф. Кміты ў перыяд з 23 чэрвеня па 15 верасня 1566 г.: Тамсама. С. 236. Таксама — для Ю. Зяновіча: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 60.

З канца 1566 г. стаўка «заслужоного» зрабілася сталай велічынёй: конныя найміты, адпраўленыя на службу на тэрыторыю ўсходняга памежжа ВКЛ, атрымлівалі па 4 копы грошаў за чвэрць, а драбы — па 2,5 коп[129]. Гэтыя стаўкі, верагодна, захаваліся да канца вайны.

Аднак былі і выключэнні. Напрыклад, роты П. Сапегі ў Любечы і К. Астрожскага ў Кіеве мелі павялічаную стаўку памерам 5 коп грошаў[130]. Гэта было звязана, хутчэй за ўсё, з выкананнем абарончых функцый на мяжы з Крымскім ханствам. На асаблівым становішчы знаходзіліся дворскія почты, з якіх у 1567 г. была сфарміравана гаспадарская гвардыя ў складзе 2 тысяч коннікаў. Яны ў перыяд з 25 ліпеня 1567 г. па 7 красавіка 1568 г. (г. зн. на працягу трох чвэрцяў) атрымлівалі самую вялікую стаўку за час Інфлянцкай вайны — 6 коп грошаў[131].

«Заслужоного» не хапала для пакрыцця нават мінімальных расходаў жаўнераў. Вясной 1567 г. гаспадар быў вымушаны канстатаваць, што жаўнеры ў Інфлянтах *«za tak małe pieniądze na tym głodzie tam żadnym obyczajem służyć y wytrwać nie zmogą»*[132]. Актуальнай задачай з'яўлялася павышэнне жаўнерскага заробку, але ўлады не рашыліся пайсці на такі крок. Гэта магло выклікаць неадназначную рэакцыю з боку наймітаў, якія служылі на тэрыторыі ўсходняй Беларусі. Магчымасцей заплаціць павялічаную стаўку ўсім не было. Жыгімонт Аўгуст прапанаваў Я. Хадкевічу даплаціць жаўнерам у Інфлянтах з уласнай кішэні, каб гэта выглядала як яго прыватная ініцыятыва[133].

Польны гетман Р. Сангушка, які быў непасрэдна знаёмы са складаным становішчам найманага войска на ўсходнім памежжы ВКЛ, у студзені 1568 г. таксама прапаноўваў павысіць агульную стаўку аплаты і давесці яе да 5 коп грошаў для конніка. Гэтая прапанова не знайшла разумення ў Вільні, дзе добра ўсведамлялі рэальныя магчымасці скарбу[134]. Аднак ужо праз месяц — у лютым 1568 г. — Жыгімонт Аўгуст змяніў сваё меркаванне, зразумеўшы, што без павышэння жаўнерскага заробку Р. Сангушка можа застацца зусім без войска[135]. Нягледзячы на выказаную

[129] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 529, арк. 151–152. Гл. таксама: Тамсама. Спр. 47, арк. 6–6 адв.; спр. 267, арк. 114 адв. — 115.
[130] Тамсама. Спр. 47, арк. 94–94 адв., 107 адв. — 108.
[131] LM. Kn. 531. P. 48.
[132] BCzart. Teki Naruszewicza. Sygn. 76.IV. Nr. 24. K. 61–65.
[133] Ibid.
[134] AS. T. 7. S. 229–231.
[135] Ibid. S. 239. Здаецца, аднак, што гэтае рашэнне засталося на паперы.

згоду, наўрад ці стаўкі змяніліся. Прынамсі, вядома, што польны гетман, затрымліваючы на службе ўлетку 1569 г. 30 коннікаў з роты К. Вішнявецкага, мог разлічваць на аплату ў памеры толькі 4 коп грошаў[136].

Такім чынам, відавочна, што стаўкі «заслужоного» хапала толькі на элементарныя патрэбы жаўнераў і яе велічыня іх яўна не задавальняла. Нізкая аплата найманай службы і яе надзвычай цяжкія ўмовы не толькі не стваралі падстаў для хуткага ўзбагачэння (а менавіта на гэта разлічвала большасць тых, хто вербаваўся ў войска), але і значна зніжалі прэстыж вайсковай прафесіі.

Каб зразумець, чаму ж жаўнерам плацілася так мала, варта вызначыць агульныя сумы выдаткаў дзяржаўнага скарбу на найманае войска. Гэта дапаможа адказаць, ці сапраўды скарб быў абмежаваны ў сродках, і прааналізаваць, у чым былі асноўныя праблемы з выплатамі «заслужоного».

Правёўшы падлікі рэальных тэрмінаў службы 18 драбскіх рот у 1561 г., мы прыйшлі да высновы, што драбскае войска абышлося скарбу ў гэтым годзе прыкладна ў 11–14 тысяч коп грошаў (пры стаўцы 2,5 коп грошаў за чвэрць году). Утрыманне конных рот, нягледзячы на іх меншую колькасць, каштавала даражэй — прыкладна 19–20 тысяч коп грошаў (пры стаўцы 4 копы грошаў). Такім чынам, у 1561 г. скарб ВКЛ мусіў выдаткаваць мінімум 30 тысяч коп грошаў на кантынгент найманых жаўнераў з ВКЛ.

Пра ўтрыманне польскага найманага войска сам Жыгімонт Аўгуст пісаў, што яно абыходзіцца не менш чым у 50 тысяч польскіх злотых у чвэрць (у пераліку гэтая сума складае 40 тысяч коп літоўскіх грошаў), не лічачы выдаткаў на артылерыю, боепрыпасы і інш.[137] Як бачым, расходы на польскіх жаўнераў былі значна большымі.

На пачатковай стадыі Інфлянцкай вайны менавіта ў 1561 г. быў зроблены максімальны высілак па забеспячэнні абароны краю. У 1562–1565 гг. колькасць наймітаў у Інфлянтах стала памяншалася, таму можна з упэўненасцю сцвярджаць, што скарачаліся і выдаткі на войска.

Актывізацыя дзейнасці па арганізацыі абароны прыбалтыйскага краю адбывалася ў жніўні 1566 г. пасля прызначэння на пасаду інфлянцкага адміністратара і гетмана Я. Хадкевіча. Захавалася яго падрабязная

136 LM. Kn. 532. P. 60; Ibid. Kn. 531. P. 96.
137 BCzart. Teki Naruszewicza. Sygn. 71.IV. Nr. 143. K. 499–504.

справаздача аб выдатках на абарончыя мерапрыемствы ў канцы 1565–1567 гг.[138]

Возьмем для ўважлівага аналізу 1567 г., калі было найбольш расходаў на найманае войска ў Інфлянтах. Паводле зробленых падлікаў, утрыманне 2 000–2 400 літоўскіх коннікаў пад камандаваннем Я. Хадкевіча каштавала ад 9 да 12 тысяч коп грошаў у чвэрць[139]. Можна агулам прыняць, што расходы на войска ў Інфлянтах у гэтым годзе склалі прыкладна 40 тысяч коп грошаў. Гэта былі максімальныя памеры выдаткаў за ўвесь час Інфлянцкай вайны, бо больш значнага кантынгента ўлады ВКЛ на інфлянцкай тэрыторыі не трымалі (за выключэннем польскага войска ў 1561 і 1565 гг.). Для параўнання, у 1566 г. выдаткі склалі толькі 18 400 коп грошаў пры сярэдняй колькасці наймітаў каля 1 000 коннікаў (гл. табл. 3.2.1). Трэба дадаць яшчэ расходы на драбаў і стральцоў у 1567 г. — не менш за 6 тысяч коп грошаў. Такім чынам, у 1567 г. выдаткі на найманых жаўнераў у Інфлянтах склалі прыкладна 50 тысяч коп грошаў.

Табліца 3.2.1.

*Коннае найманае войска ў Інфлянтах*
*пад камандаваннем Я. Хадкевіча ў 1565–1567 гг.*

| Перыяды службы (чвэрці) | Колькасць усіх коннікаў, аплачаных Я. Хадкевічам | Сума выдаткаў Я. Хадкевіча на ўсіх коннікаў | Колькасць коннікаў з ВКЛ, аплачаных Я. Хадкевічам | Сума выдаткаў Я. Хадкевіча на коннікаў з ВКЛ |
|---|---|---|---|---|
| 11.11.1565 – 1.02.1566 | 1200 | 6000 | 1200 | 6000 |
| 2.02.1566 – 13.05.1566 | 1200 | 6000 | 1200 | 6000 |
| 13.05.1566 – 10.08.1566 | 700 | 3200 | 700 | 3200 |
| 11.08.1566 – 10.11.1566 | 700 | 3200 | 700 | 3200 |
| 11.11.1566 – 1.02.1567 | 3266 | 13784 | 2416 | 10314 |
| 2.02.1567 – 1.05.1567 | 2916 | 13140 | 2416 | 11080 |
| 2.05.1567 – 24.07.1567 | 1930 | 9140 | 1930 | 9140 |
| 25.07.1567 – 19.10.1567 | 2000 | 12000 | 2000 | 12000 |

*Табліца складзена паводле:* LM. Kn. 51. P. 113–119.

138 LM. Kn. 51. P. 113–119.
139 Трэба мець на ўвазе, што ў другой палове 1567 г. 2 тысячам коннікаў з гаспадарскай гвардыі была вызначана стаўка ў памеры 6 коп грошаў (гл. вышэй).

Пасля супастаўлення інфармацыі з розных крыніц можна зрабіць пэўныя высновы аб магчымасцях скарбу аплачваць службу наймітаў на ўсходнім памежжы ВКЛ у 1565–1569 гг. Згодна са зробленымі падлікамі, конныя роты ў гэты перыяд абыходзіліся ў сярэднім у 35 тысяч коп грошаў у год. Колькасць драбаў у памежных замках на ўсходзе ВКЛ падлічыць цяжэй, аднак пасля скрупулёзных падлікаў атрымалася прыкладная лічба ў 3 тысячы чалавек, на якіх выдаткоўвалася прыблізна каля 30 тысяч коп грошаў у год (калі прыняць, што драбу плацілі за службу 10 коп грошаў у год). Такім чынам, у 1565–1569 гг. утрыманне найманага войска абыходзілася ў 100–120 тысяч коп грошаў штогод.

Паступленні сродкаў у скарб былі, як правіла, нестабільнымі. У выніку паўставала новая паважная праблема — затрымкі выплат «заслужоного».

Першыя затрымкі ўзніклі ўжо ў 1561 г. Улады нават былі вымушаны накіроўваць скарбовыя сродкі на аплату толькі польскіх наймітаў, просячы літоўскіх жаўнераў трохі пачакаць[140]. А ў лістападзе 1562 г. дзеля таго, каб утрымаць вайскоўцаў на службе, гаспадар быў вымушаны даць ім абяцанне даплаціць па 2 польскія злотыя ў якасці кампенсацыі за затрымку «заслужоного»[141].

З гэтага часу запазычанасці зрабіліся сталай з'явай ва ўзаемадачыненнях паміж скарбам і найманым войскам. Усведамляючы сур'ёзнасць становішча, гаспадар у канцы 1561 г. загадаў земскаму падскарбію выдаткоўваць грашовыя сродкі ў першую чаргу *«на служебъные* (жаўнераў) *до земли Лифлянтское и на замъки украинные»*[142].

Пра крызісную сітуацыю з выплатамі красамоўна сведчыць наступны прыклад. Нягледзячы на перамогу ў Ульскай бітве 1564 г., найманыя роты, якія адыгралі ў ёй найважнейшую ролю, не атрымалі ад дзяржавы не толькі ўзнагароды, а нават законнага заробку. Мяркуючы па разліку «заслужоного», зробленага 30 снежня 1570 г., рота Ф. Кміты ў 1564 г. грошай так і не ўбачыла[143]. Падобнае становішча было і з ротай Ю. Зяновіча. 24 траўня 1564 г. гаспадар запэўніваў, што ў хуткім часе — праз два тыдні — усе запазычанасці будуць выплачаны[144]. Аднак наўрад ці гэта адбылося ў абяцаныя тэрміны.

140 LM. Kn. 564. P. 100–101.
141 Ibid. P. 128–130.
142 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 45, арк. 12–13.
143 АСД. Т. 4. С. 235–237.
144 AGAD, AR. Dz. II. Sygn. 42. K. 1–2.

Характэрнай з'яўляецца і справа выплаты «заслужоного» ротам, набраным згодна з пастановай Трабскага з'езда ў лістападзе 1565 г. Рота Рыгора Войны ў траўні 1566 г. атрымала за паўгадавую службу ад бірчых Гарадзенскага павета толькі 650 коп грошаў, хоць павінна была атрымаць 1 500 коп[145]. Нягледзячы на вялікую запазычанасць, гаспадарская ўлада зноў прыпаведала гэтай роце службу на новую чвэрць, зменшыўшы стаўку «заслужоного» з 5 да 4 коп грошаў[146]. Аднак абяцанне выплаціць заробак у самы сціслы тэрмін і на гэты раз не было выканана. Толькі праз тры месяцы Жыгімонт Аўгуст загадаў бірчым Гарадзенскага павета выплаціць роце Р. Войны 800 коп грошаў з пагалоўшчыны 1566 г.[147]

Такім жа чынам справа вырашалася і ў жніўні 1566 г. у дачыненні да рот А. Курбскага (Луцкі і Крэмянецкі паветы не заплацілі ёй 2 000 коп грошаў), П. Сапегі (Кіеўскі павет замест 1 000 коп заплаціў толькі 400), Я. Шымковіча (Эйшышкаўская воласць у Жамойцкай зямлі з 1 000 коп аддала толькі 530)[148]. У апошнім выпадку прычынай маруднай выплаты называлася тое, што землеўладальнікі не жадалі плаціць пагалоўшчыну ў скарб.

Становішча з выплатамі звычайным драбскім ротам з'яўлялася яшчэ горшым. Як дакладваў у жніўні 1566 г. браслаўскі ротмістр Ян Радзімскі, яго драбы не атрымалі значную частку заробку ажно за два гады, з прычыны чаго рота апынулася пад пагрозай роспуску. Гаспадар распарадзіўся як мага хутчэй разлічыцца з браслаўскім гарнізонам. Каб паскорыць выплату, Жыгімонт Аўгуст рэкамендаваў земскаму падскарбію М. Нарушэвічу ўпаўнаважыць ураднікаў з Браслава і Упіты выплаціць грошы з падаткаў, якія павінны былі плаціць гаспадарскія маёнткі ў мясцовых валасцях[149].

Для характарыстыкі крызіснага становішча з выплатамі «заслужоного» можна прывесці яшчэ некалькі красамоўных прыкладаў. У 1566 г. у Любечы роце П. Сапегі ў складзе 100 драбаў «заслужоное» ўвогуле не плацілася![150] Такая ж сітуацыя назіралася з ротай Богуша Сяліцкага, якая

145 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 13.
146 Тамсама. Арк. 13 адв.
147 Тамсама. Арк. 30 адв. — 31.
148 Тамсама. Арк. 31–32 адв., 36 адв. — 37 адв., 107 адв. — 108.
149 Тамсама. Арк. 37 адв. — 38. Надрукавана ў: Я н у ш к е в і ч А. Браслаўскі рэгіён у Інфлянцкай вайне // Браслаўскія чытанні'2000. Браслаў, 2001. С. 110.
150 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 142.

размяшчалася ў Оршы[151]. Запазычанасць коннай роце Анікея Корсака ў лютым 1567 г. складала ажно 4 тысячы коп грошаў[152]. Гэта азначае, што скарб не заплаціў жаўнерам не менш чым за 15 месяцаў службы.

Не надта палепшылася сітуацыя і пасля ўхвалення падвойнай серабшчыны ў 1567 г. Здараліся выпадкі, калі грошы да рот так і не даходзілі. Так, рота Паўла Саколінскага ў 1567 г. не атрымала 1 600 коп грошаў за паўгода службы[153]. А рота Р. Войны не атрымала грошай, ухваленых паводле Лебедзеўскага з'езда, яшчэ ў красавіку 1568 г.[154]!

Паводле «квітацыі» земскага падскарбія А. Валовіча, у сярэдзіне 1568 г. дзяржаўны скарб ВКЛ быў вінен найманым ротам значную суму — 21 900 коп грошаў[155].

Своеасаблівым зрэзам аналізаванай праблемы з'яўляюцца звесткі аб вайсковых расходах Ф. Кміты за 1563–1570 гг. на ўзначаленую ім конную роту. За перыяд службы з 1563 г. па другую палову 1567 г. яго рота павінна была атрымаць «заслужоного» на суму 4 642 копы грошаў. Аднак яшчэ ў канцы снежня 1570 г. скарб не выплаціў жаўнерам 845 коп грошаў[156]. З сярэдзіны 1567 г. Ф. Кміта ўтрымліваў аршанскі гарнізон і розныя памежныя службы («вожы», шпегі і інш.) на ўласныя сродкі. Ён выдаткаваў за 1567–1570 гг. ажно 9 042 копы грошаў (з іх 2 тысячы коп пайшлі на надзвычайныя выдаткі, выкліканыя голадам). Літоўскі скарб зноў не здолеў расплаціцца своечасова — на жнівень 1571 г. было выплачана толькі 3 065 коп грошаў[157]. Такім чынам, нават праз некалькі гадоў дзяржава не здолела кампенсаваць Ф. Кміту палову яго выдаткаў на абарону краіны.

Затрымкі выплат стварылі ў асяроддзі жаўнераў неспрыяльную атмасферу. Прэстыж службы падаў. Негатыўныя наступствы такога стану

[151] AS. T. 7. S. 170–172.
[152] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 127 адв. — 128. У 1563–1566 гг. ён выдаў 200 коп грошаў на будаўніцтва Лепельскага замка.
[153] LM. Kn. 531. P. 62–63. Гэта, праўда, адзінкавы выпадак, які сустракаецца ў Метрыцы ВКЛ. Большасць ротмістраў, верагодна, атрымала грошы з выплат першай «раты» серабшчыны 1567 г.
[154] Гаспадар загадаў тэрмінова заплаціць яму 500 коп грошаў з кампенсацыі, якую выдала ў скарб «убогая» шляхта Бельскага павета за заўчасны адыход з паспалітага рушэння (г. зв. «залаты ваенны») і 250 коп грошаў з серабшчыны Берасцейскага павета: Ibid. P. 94–95.
[155] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 48, арк. 219 адв. — 230.
[156] Прыкладам, толькі ў 1565 г. з вінных 1 000 коп грошаў яму было выплачана скарбам усяго 228 коп 30 грошаў: АСД. Т. 4. С. 235–237.
[157] Тамсама. С. 246–250.

рэчаў не прымусілі сябе чакаць. Іх асноўнай пасіўнай праявай сталі разыходжанні і ўцёкі наймітаў са службы.

Ужо вясной 1560 г. літоўскія найміты, нанятыя на паўгадавы тэрмін, збіраліся пайсці са службы. Жыгімонт Аўгуст у досыць жорсткай форме загадаў камандуючаму войскам Ю. Зяновічу затрымаць наймітаў яшчэ хаця б на чвэрць года, баючыся поўнай страты кантролю над сітуацыяй у Інфлянтах[158]. Аднак гэта не дапамагло — роты П. Корсака і К. Тышкевіча пакінулі Інфлянты[159]. У гэтай гісторыі выявілася відавочнае расчараванне варункамі службы. Першыя ж звесткі аб уцёках наймітаў адносяцца да зімы 1562 г.[160]

Асабліва трывожным становішча з утрыманнем найманага войска было ў 1565–1566 гг., калі праваліўся эксперымент са зборам пагалоўшчыны. Гаспадар, звяртаючыся да соймікаў, акцэнтаваў увагу на тым, што з прычыны адсутнасці сродкаў для выплат «заслужонага» *«вси служебные уставичне великое набеганье чинять на его кролевъскую милость, далей на служъбе зостати и вытрвати не могучи»*[161]. У верасні 1566 г. улады канстатавалі, што *«люди служебные, не маючи заплаты заслужоного своего, з границ проч розъежъдчають ся»*[162].

У другой палове 1567 г. дзякуючы пазыкам і прынятым радыкальным мерам па зборы серабшчыны масавы самароспуск рот удалося спыніць. Аднак ужо ў пачатку 1568 г. выявіліся старыя праблемы. Жаўнеры не верылі абяцанням уладаў выплаціць запазычанасці, заяўляючы, што пакінуць службу, калі ім не будуць даваць грошы авансам: *«Иж товариши жадным обычаем не только чверти, але и годины одное на голые слова приймовать не хочуть»*[163]. Істотная ратацыя рот адлюстроўвае рэальнасць гэтых пагроз — многія ротмістры і «таварышы» пакідалі службу, не вытрымаўшы яе цяжкіх умоў. Р. Хадкевіч занатаваў у траўні 1568 г., што *«жолнери про незаплату заслужоного своего, теж и о листы наши приповедные ничого не дбаючи, проч розъежчаються»*[164].

[158] РНБ, ф. 293, оп. 1, док. 164.
[159] Тамсама. Док. 166.
[160] LM. Kn. 564. P. 91.
[161] РИБ. Т. 30. С. 878–882. Улетку 1566 г. найманыя жаўнеры, раскватараваныя на Полаччыне і Віцебшчыне, не хацелі служыць за 3 копы грошаў у чвэрць: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 73 адв. — 74 адв.
[162] РИБ. Т. 30. С. 876–878.
[163] AS. T. 7. S. 226–227.
[164] Ibid. S. 258–259.

Іншымі негатыўнымі наступствамі складанай сітуацыі з фінансава-матэрыяльным забеспячэннем найманых жаўнераў былі вельмі частыя правапарушэнні з іх боку. У пошуках харчавання вайскоўцы «вандравалі» па наваколлі. Яны не спыняліся перад тым, каб праявіць сілу і палепшыць сваё маёмаснае становішча за кошт прымусовых рэквізіцый у мірных жыхароў не толькі харчовых прадуктаў, але і рознага кшталту матэрыяльных каштоўнасцей — ад адзення да ўпрыгожанняў. Такія выпадкі звычайна суправаджаліся здзекамі з мясцовага насельніцтва.

Ёмістую характарыстыку дзеянняў наймітаў у адным са сваіх лістоў да Р. Хадкевіча даў польны гетман Р. Сангушка: *«Некоторые панове жолнеры, которые давно жолнерскую службу служать водле давное звыклости и налогу своего жолнерского, великие кривды и трудности подданым, яко господарским, так шляхетским чинють, у подводы их беруть и стацей собе на них вымышляють и складати кажуть овсы жита, яловицы, бараны, гуси, куры и иные вшелякие живности, чого они на уставе моей у себе не мають, одно поведають, иж перед тым брати им то вольно бывало...»*[165].

Страты, нанесеныя наймітамі мірнаму насельніцтву, былі такімі істотнымі, што параўноўваліся з наступствамі дзеянняў непрыяцельскага войска[166]. Улады разумелі такі стан рэчаў, але нічога не маглі зрабіць. Заставалася толькі папярэджваць насельніцтва аб патэнцыяльнай небяспецы, якую неслі найманыя жаўнеры. У канцы 1564 г. жыхары Васілішкаўскай дзяржавы прасілі ўчыніць ім «фолькгу» ў справе адпраўкі харчавання ў памежныя замкі, скардзячыся на вынішчэнне ад вайскоўцаў. На ўвазе, безумоўна, меліся альбо найміты, альбо жаўнеры з паспалітага рушэння. Земскі падскарбі А. Валовіч рэкамендаваў сялянам адпраўляцца з харчаваннем не паасобку, а вялікімі групамі: *«Яко бы жолнеры въ нихъ по дорозе не отыймовали, видечи ихъ въ таковой способности»*[167].

---

165 Ibid. S. 143.

166 Жонка Багдана Лукомскага, захопленага маскоўцамі ў палон у 1563 г., скардзілася цэнтральным уладам ВКЛ у пачатку 1566 г. на тое, што Лукомль знішчаны непрыяцельскім войскам і... найманымі жаўнерамі: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 38, арк. 570–570 адв.

167 РИБ. Т. 30. С. 784–786.

Выпадкі гвалту мелі месца ўжо ў пачатку Інфлянцкай вайны, калі найманыя роты ўпершыню накіраваліся на абарону прыбалтыйскага краю. У пачатку 1560 г. у Вільні атрымлівалі надзвычай негатыўныя паведамленні пра паводзіны войска па дарозе ў Інфлянты: *«А тое мешканье ваше на одном местцы и в тягненьи в дорозе жалобы з плачом от подданых до нас доносит; (...) маем ведомость, иж вы не яко в панъстве нашом, але яко в неприятельской земли спижовалися»*[168].

У далейшым падобныя дзеянні наймітаў не спыніліся. У красавіку 1563 г. Жыгімонт Аўгуст згадваў у сваім лісце да ротмістраў, што *«доходитъ насъ ведомость, ижъ обователемъ земли тамошнее* (г. зн. Інфлянтаў) *великие кривды, шкоды, мордеръства, обтяжливости и неслыханые сромотные втиски отъ людей нашихъ служебъныхъ деють ся»*[169]. Аднак, нягледзячы на загад гаспадара спыніць злачынныя дзеянні, нічога не змянілася[170]. Здзекі былі такімі невыноснымі, што напрыканцы вайны інфлянцы пачалі пагражаць бунтам, *«chcąc wszystkich naszych służebnych z ziemi przecz wypędzić»*[171].

Найбольш моцны розгалас гвалтоўныя дзеянні наймітаў атрымалі ў 1565 г., калі літоўскія і польскія жаўнеры па дарозе на месца службы нанеслі землям на захадзе ВКЛ спусташэнні пагрозлівых маштабаў. З Пётркаўскага сойма ў Польшчы для высвятлення памеру нанесеных страт у траўні-чэрвені 1565 г. тэрмінова былі накіраваны спецыяльныя рэвізоры[172]. Яны павінны былі фіксаваць наступныя з'явы, якія яскрава паказваюць характар дзеянняў наймітаў: *«...Яко в бранью живностей вшеляких, так людских, яко и конских без заплаты, по тому теж в стацыях, в забранью речей и маетностей домовых, которых кольвек в боех, наездах и кгвалтех домовых и белых голов и в забийствах, и в которых кольве утискох и обтяжъливостях людских»*[173].

Каларытна абмалёўвае паводзіны наймітаў у дачыненні да мясцовага насельніцтва адна справа, якая знаходзіцца ў матэрыялах Метрыкі ВКЛ. 24 ліпеня 1565 г. жаўнеры ротмістра Р. Падлядоўскага (ідэнтыфікаваць не ўдалося; верагодна, паходзіў з Польшчы) «завіталі ў госці» да жы-

[168] АЗР. Т. 3. С. 109.
[169] РИБ. Т. 30. С. 648–650.
[170] Вядома, што ўлетку 1564 г. інфлянцы нават разглядалі магчымасць сабраць «сойм» у Буртніках для абмеркавання ўзаемадачыненняў з жаўнерамі: Listy. S. 463–464.
[171] BCzart. Teki Naruszewicza. Sygn. 76. IV. Nr. 113. K. 497–498.
[172] РИБ. Т. 30. С. 801–807.
[173] Тамсама. С. 808–810.

хара Жамойці М. Андрэевіча. Яны забралі ў яго некалькі бочак аўса і соладу. Апоўдні жаўнеры вярнуліся. Гаспадар, *«видечи их пъяных, ворота перед ними запер, и сам з дочъкою своею Полонеею до свиръна утек. Они дей ворота у двора вырубавъшы и у того свирна, где он з дочъкою своею был, дверы почали рубать»*[174]. На дапамогу М. Андрэевіч паклікакаў суседа Г. Галімонта, які, аднак, нічога зрабіць не змог. Яго разам з М. Андрэевічам пабілі жаўнеры. Пацярпелыя звярнуліся да мясцовага віжа са скаргай, але назаўтра найміты прыехалі трэці раз: *«...Наехали моцъно кгвалтом, хотячы до смерти забити, он дей* (М. Андрэевіч. — *А. Я.*) *пред ними з дому своего ледъве вцек»*[175]. Жаўнеры разрабавалі маёнтак, забраўшы нямала рэчаў, у тым ліку зброю з боепрыпасамі.

Свавольствы жаўнераў нярэдка пераходзілі ўсялякую мяжу. Ротмістр татарскага паходжання Кантымер спыніўся ва ўладаннях С. Нарушэвіча і дазваляў сабе не толькі дармова харчавацца за кошт мясцовых сялян, але яшчэ і прадаваць іх маёмасць. Атрымліваючы са скарбу грошы на 40 коннікаў, ён трымаў пры сабе на самай справе каля 200 чалавек. Толькі зварот С. Нарушэвіча па дапамогу да Р. Хадкевіча спыніў злоўжыванні Кантымера[176].

Часта найміты лічылі свае гвалтоўныя паводзіны апраўданымі. Так, факты прымусовага адабрання правізіі ў 1566 г. драбскі ротмістр Ян Курніцкі і татарскія князі Давыд Цямрук і Кантымер тлумачылі тым, што раней ім гэта дазвалялася рабіць адкрыта з прычыны нявыплаты «заслужоного»[177].

Гаспадар абяцаў пацярпелым жыхарам кампенсаваць страты за кошт жаўнерскага заробку, аднак наўрад ці гэта сапраўды адбывалася. Крыніцы занатавалі некалькі выпадкаў, калі землеўладальнікам выплачваліся адпаведныя кампенсацыі. Прыкладам, у жніўні 1566 г. гаспадарскі ліст аб кампенсацыі нанесеных страт атрымаў троцкі ваявода С. Збаражскі[178].

Зрэдку ўдавалася дабіцца справядлівасці і простым жыхарам ВКЛ. Вядома, што да выплаты кампенсацыі з «заслужоного» быў прымушаны ротмістр Р. Бака, калі ў верасні 1566 г. стала вядома, што ён нанёс вялікія

[174] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 261, арк. 157–157 адв.
[175] Тамсама.
[176] AS. T. 7. S. 269–270.
[177] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 35 адв. — 36.
[178] Тамсама.

шкоды і крыўды насельнікам Любашанскай воласці ў папярэднія два гады, калі яго рота знаходзілася там «на лежах»[179].

Здараліся выпадкі, калі ротмістры і мясцовыя жыхары самі дамаўляліся паміж сабой аб кампенсацыі страт. Улетку 1567 г. памірыліся (*«учынили еднанье»*) магілёўскія мяшчане і ротмістр Марцін Стравінскі. Апошні заплаціў за нанесеныя шкоды 100 коп грошаў[180].

Нярэдка пытанні злачынстваў жаўнераў выносіліся на соймавыя пасяджэнні. Напрыклад, мсціслаўская шляхта на вальным сойме 1563 г. паскардзілася на тое, што *«ротмистри (...) в домех вашых шляхетских на месте и на замку корчмы держать, и великое утисненье и неспокойность чинять и подданых вашых властных до рот межи драбов своих беруть и прыймують, а наболей Петр Курницкий ротмистр тамошний...»*[181]. Такія звароты сустракаліся і на наступных соймах[182].

Асабліва напружанымі выглядалі ўзаемадачыненні наймітаў з мясцовымі ўладамі і насельніцтвам у Віцебску. Ротмістры папросту ігнаравалі ўладу тамтэйшага ваяводы С. Паца[183]. Яны дазвалялі сабе набіраць жаўнераў з ліку мясцовых жыхароў, а таксама плаціць за правіянт не па рынкавых цэнах, а па «ўставе»[184]. Вядомы выпадкі, калі найміты збівалі віцебскіх шляхціцаў[185]. У чэрвені 1568 г. С. Пац паскардзіўся, што з прычыны адсутнасці сродкаў на выплату «заслужоного» казакі і драбы выходзяць з-пад яго кантролю[186].

Дзяржава імкнулася кампенсаваць недастатковасць фінансавання найманага войска праз арганізацыю непасрэднага забеспячэння правіянтам і вызначэнне мінімальных нармаваных коштаў на харчовыя прадукты. З гэтай мэтай улады выдавалі спецыяльныя «ўставы», у якіх акрэсліваліся кошты харчавання для жаўнераў. Няцяжка здагадацца,

---

179 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 74 адв. — 75 адв., арк. 77–77 адв.

180 Тамсама. Спр. 266, арк. 205 адв. — 206 адв.

181 АЛРГ. Т. 2. С. 150.

182 Прыкладам, на Гарадзенскім сойме 1566/1567 гг. менская шляхта скардзілася на дзеянні роты С. Русецкага: Максимейко Н. Сеймы Литовско-Русского государства... С. 180.

183 *«Великие непослушенства противъку пана подъстолего* (г. зн. С. Паца) *яко враду нашого чините»* (АЛРГ. Т. 2. С. 195).

184 Тамсама. С. 194; НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 45, арк. 112–113 адв.

185 Такім учынкам вызначыўся ў ліпені 1568 г. ротмістр Станіслаў Вазніцкі. Спробы ўладаў прывесці яго да паслушэнства скончыліся беспаспяхова: AGAD. Archiwum Publiczne Potockich. Sygn. 9. Teka 1. K. 13–14.

186 AS. T. 7. S. 274–275.

што цэны ў іх былі заніжаны ў параўнанні з рынкавымі[187]. Таму ўступаць у гандлёвыя гешэфты з наймітамі было надзвычай нявыгадна тым, хто спадзяваўся на атрыманне прыстойных прыбыткаў. Аднак «уставы» мелі для жыхароў ВКЛ абавязковы характар.

Адсутнасць двухбаковага інтарэсу так ці інакш прыводзіла да абвастрэння стасункаў паміж мірным насельніцтвам і найманымі жаўнерамі: мясцовыя жыхары не жадалі аддаваць харчовыя прадукты за бясцэнак, а найміты разглядалі падобныя паводзіны як сабатаж і пераходзілі да гвалтоўных рэквізіцый правіянту.

Механізм дзеяння «ўставаў» упершыню быў дэталёва прапісаны ў канцы 1560 г.[188] Мясцовыя жыхары абавязваліся дастаўляць у лагер наймітаў патрэбны правіянт. Жаўнеры, у сваю чаргу, павінны былі купляць харчаванне строга ў адпаведнасці з коштамі, вызначанымі па «ўставе». Для кантролю над парадкам прызначаўся гаспадарскі дваранін, які меў права разбіраць канфліктныя сітуацыі. Калі б найміты не прызналі нанесеныя шкоды, дваранін павінен быў запісаць іх у спецыяльны рэестр і перадаць асобе, якая праводзіла чарговы попіс рот. Калі б і гэта не дапамагло, рэестр перадаваўся у скарб, дзе кампенсацыя за нанесеныя шкоды вылічвалася з «заслужоного» альбо з уласнасці парушальніка. Гэтая кампенсацыя павінна была адбывацца па рынкавых цэнах.

На тэрыторыі ўсходняй Беларусі ў перыяд з 1563 па лета 1566 г. «уставы», найверагодней, дзейнічалі толькі ў тым выпадку, калі харчаванне бралася са «шпіхлераў» (харчовых складоў), якія былі створаны ў Магілёве і Барысаве. Па-першае, пра гэта сведчыць адсутнасць саміх «уставаў» за гэты час. Па-другое, захаваліся сведчанні, што жаўнеры павінны былі купляць харчовыя прадукты ў мясцовага насельніцтва па рынкавых коштах. Так, восенню 1565 г. віцебская шляхта і мяшчане скардзіліся, што *«люд наш служебный живности и быдло по уставе беруть, и волость у приставства розобрали, зачим подданые з места и з сел розышлисе, а иные ся розыходять»*[189]. Гаспадар бачыў два вырашэнні гэтай праблемы: альбо купляць харчаванне па рынкавых цэнах, альбо забяспечваць ім жаўнераў

[187] Прыкладам, у пачатку 1567 г. у сялян авёс скупляўся па рынкавай цане 10 грошаў за бочку, у той час як цана па «ўставе» складала толькі 6 грошаў: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 113–115. А восенню 1567 г. рэальныя цэны перавышалі кошты па «ўставе» ажно ў 7 разоў: за бочку жыта на Полаччыне прасілі 70 грошаў, а па «ўставе» яна павінна была прадавацца жаўнерам за 10–12 грошаў: AS. T. 7. S. 202.

[188] LM. Kn. 564. P. 38–39.

[189] АЛРГ. Т. 2. С. 194.

Табліца 3.2.2.

*Кошты харчовых прадуктаў паводле «ўставаў» (у літоўскіх грошах)*

| Харчовыя прадукты | Час выдання і адрасат «уставаў» | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 17.11.1559 5.12.1560 | 11.03.1561 | (1561–1562) | (1561) | 30.05.1561 | 6.06.1562 19.09.1562 | канец 1564? | 22.08.1566 | 30.08.1566 | 7.02.1567 |
| | для конных рот у Інфлянтах | для наймітаў з ВКЛ у Інфлянтах | для польскіх наймітаў | для польскіх наймітаў | для польскіх наймітаў | для польскіх наймітаў | для наймітаў? | для роты Ю. Зяновіча | для почту Я. Хадкевіча | для наймітаў з ВКЛ (і Польшчы?) |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| Копа жыта | 8 | – | – | 12 | 6 | 5 | – | 8 | 8 | – |
| Копа аўса | – | – | – | 6 і 4 п. | 4 | 3 | – | 5 | 5 | – |
| Копа ячменю | – | – | – | – | – | – | – | 6 і 4 п. | 5 | – |
| Бочка пшаніцы | – | – | 12 | – | – | – | – | – | – | 24 |
| Бочка жыта | 10 | 12 | 12 | 16 | 8 | 5 | 10 | – | – | 10 |
| Бочка аўса | 6 | 10 | 8 | – | 5 | 3 | 6 | – | – | 6 |
| Бочка ячменю | – | 12 | 9 і 6 п. | – | – | – | – | – | – | 10 |
| Бочка пшана | – | – | 60 | – | – | – | – | – | – | – |
| Бочка грэчкі | – | – | 10 | – | – | – | – | – | – | – |
| Бочка гароху | – | 20 | 28 | – | – | – | – | – | – | 24 |
| Бочка соладу з пшаніцы | – | – | 13 | – | – | – | – | 12 | 12 | – |
| Бочка соладу з ячменю | – | – | 12 | – | – | – | – | 6 | 6 | – |
| Салянка пшаніцы | – | – | – | – | – | – | – | 12 і 8 п. | 12 | – |
| Салянка жыта | – | – | – | – | – | – | – | 8 | 8 | – |
| Салянка аўса | – | – | – | – | – | – | – | 5 | 6 | – |
| Салянка ячменю | – | – | – | – | – | – | – | 6 і 4 п. | 6 | – |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Салянка грэчкі | – | – | – | – | – | – | – | 6 | 6 | – |
| Салянка гароху | – | – | – | – | – | – | – | 12 | 12 | – |
| Бочка круп | – | 30 | | – | – | – | – | – | – | – |
| Бочка круп ячных | – | – | 19 і 2 п. | – | – | – | – | – | – | – |
| Бочка круп грэчкавых | – | – | 20 | – | – | – | – | – | – | – |
| Бочка мукі жытняй | – | – | 12 і 8 п. | – | – | – | – | – | – | – |
| Ялавіца | 24 | – | – | 32 | 30 | 16 | 24 | 24 | 24 | 40 |
| Полаць мяса вяпровага | – | – | – | – | – | – | – | 12 і 8 п. | 12* | – |
| Кунпь | – | – | – | – | – | – | – | 3 | 3 | – |
| Вепр кормны | 20 | – | 24 | 20 | 24 | 20 | 20 | 24 | 24 | 40 |
| Вепр някормны | 12 | – | 16 | 12 | 12 | 10 | 15 | 16 | 16 | 20 |
| Баран | 6 | – | 6 і 4 п. | 6 і 4 п. | 6 | 6 | 6 | 6 | 6 | 10 |
| Свіння | 10 | – | – | 8 | 10 | – | 10 | 8 | 12 | – |
| Гусь | 1 | – | – | 1 і 6 п. | 0,8 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 і 5 п. |
| Дзве куры | 1 | – | – | 1 і 6 п. | 0,8 | 1** | 1 | 1 | 1 | 1 і 6 п. |
| Вол арэмы | 80 | – | – | | 80 | 100 | 80 | 80 | 80 | 100 |
| Карова цельная (дойная) | 40 | – | – | 40 | 40 | 30 | 48 | 48 | 48 | 70 |
| Пуд масла | – | – | – | – | – | – | – | 24 | 24 | – |
| Воз сена | 2 | – | – | 4 | 1 | 2 | 2 | 2 і 4 п. | 2 | 3 |

**Заўвагі:**
1. «П.» — «пенези» (1 грош складаўся з 10 пенязей).
2. * — за полаць свінога мяса.
3. ** — за 3 куры.

*Табліца складзена паводле:* АЗР. Т. 3. С. 107; LM. Kn. 564. P. 34–35, 38–39, 51–52; МВКЛ. Кн. 44. С. 41–43, 68–69, 79–80; Jasnowski J. Materiały do działalności… S. 276; НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 526–526 адв.; спр. 45, арк. 45 адв. — 46 адв., 55 адв. — 56; спр. 47, арк. 44–45, 84 адв. — 85 адв.; спр. 529, арк.156–156 адв.

выключна ў магілёўскім і барысаўскім «шпіхлерах»[190]. Гэта дазваляла спыніць кантакты наймітаў і мірнага насельніцтва і зменшыць пагрозу ўзнікнення канфліктных сітуацый паміж імі.

У Інфлянтах вайскоўцы маглі купляць харчаванне толькі па рынкавых цэнах, якія былі надзвычай высокімі. Таму ўлады імкнуліся забяспечыць кожны гарнізон неабходным мінімумам прадуктаў. Што ў яго ўваходзіла, раскрывае адзін цікавы дакумент, створаны ў пачатковы перыяд Інфлянцкай вайны.

Жаўнеры ВКЛ, якія размясціліся ў інфлянцкіх замках, павінны былі быць забяспечаны адной бочкай мукі альбо жыта, паловай бочкі соладу (з разліку на адну асобу), 15 бочкамі ялавічыны альбо бараніны (з разліку на 100 чалавек), адной бочкай круп (з разліку на 6 чалавек)[191]. Гэтыя нормы маглі змяняцца. Вядома, што ў 1562 г. на аднаго драба ў Дынемундзе прызначалася адна бочка жыта і соладу на чвэрць года, а з разліку на чатырох чалавек — па бочцы круп і мяса, а таксама «корац» солі[192].

Па «ўставах» можна падлічыць, што драбу для закупкі гэтых асноўных прадуктаў трэба было патраціць мінімум 25–30 грошаў (палову копы), што складала прыкладна 20% ад заробку (пры стаўцы 2,5 копы за чвэрць года). Калі ўлічыць іншыя катэгорыі правіянту, то гэтая лічба, без сумневу, можа вырасці найменш да 30%.

Своеасаблівымі перавалачнымі пунктамі па дастаўцы прадуктаў для жаўнераў у Інфлянтах з’яўляліся Зельбург і Дынебург. Адсюль правіянт, прывезены з Жамойці, Завілейскага краю і Падзвіння, размяркоўваўся па інфлянцкіх замках, дзе стаялі літоўскія гарнізоны[193]. Для перамяшчэння харчовых грузаў выкарыстоўваўся і марскі шлях. У Рыгу харчаванне дастаўлялася з Гданьска, Мемеля і Караляўца. Вядома, у прыватнасці, што гэтай справай займаўся інфлянцкі мешчанін Ганус Коп, які быў афіцыйным пасрэднікам пры дастаўцы харчовых тавараў для жаўнераў[194]. Яны вызваляліся ад мытных пошлін і іншых пабораў[195].

---

190 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 45, арк. 112–113 адв.

191 Тамсама. Спр. 37, арк. 393–395.

192 МВКЛ. Лн. 44. С. 79–80. У 1565 г. у Віцебску для італьянскіх драбаў былі вызначаны такія нормы: *«На кожъдого драба на полрока жита бочъка, солоду бочка, круп корец, гороху корец або круп два корцы, мяса свиного полоть»* (НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 45, арк. 129).

193 Гл.: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 395–396 адв.

194 Тамсама. Арк. 542–542 адв.

195 АЮЗР. Т. 1. С. 148–150.

У кожным вялікім інфлянцкім замку, занятым літвінамі, існавала пасада «шафара» — урадніка, адказнага за забеспячэнне гарнізона ўзбраеннем і правіянтам[196]. Ён павінен быў назапашваць харчовыя прадукты і прадаваць іх жаўнерам па фіксаваных коштах. У 1560–1561 гг. гэтыя кошты былі на 50% вышэй за прадугледжаныя «ўставамі»[197]. Так рабілася, верагодна, з мэтай не дапусціць спекуляцый. Варта дадаць, што, акрамя такога спосабу забеспячэння, найміты маглі здзейсніць «пицованье», г. зн. выехаць у межы ВКЛ з мэтай закупкі харчовых прадуктаў па меншых коштах.

Нягледзячы на ўсе гэтыя меры, забеспячэнне харчовымі прадуктамі нельга было назваць задавальняльным. У верасні 1560 г. на *«долеглости»* ў харчаванні скардзіліся пушкары інфлянцкіх замкаў[198]. Ротмістр у Розітэне Я. Карыцкі зазначаў, што *«в замку живности мало, (...) нема где куповати»*[199]. У кастрычніку 1561 г. польскія найміты прасілі зменшыць кошты ва «ўставах», бо яны не дазвалялі ўтрымліваць сябе за вызначаную стаўку «заслужоного»[200]. Каб вырашыць праблему, улады замянялі грашовыя падаткі зборамі прадуктаў. Падобны падыход выкарыстоўваўся як на тэрыторыі ВКЛ, так і ў Інфлянтах[201].

Праблема харчовага забеспячэння ўскладнялася не толькі дарагавізнай, але і элементарнай адсутнасцю прадукцыі на продаж. У 1563 г. паўсюдная адсутнасць харчавання разглядалася як неспрыяльны фактар для разгортвання шырокіх ваенных дзеянняў[202]. Красамоўным прыкладам для характарыстыкі становішча ў асяроддзі жаўнераў служаць словы аднаго з ротмістраў, якія перадаваў Р. Хадкевіч: *«...Не вем, яко и хлеба достат[ъ] можеть для збытного хованья первших*

196 Вось як апісаны абавязкі шафараў у спецыяльнай інструкцыі для інфлянцкіх «гетманаў», датаванай 1560 г.: *«Спижованье замку маеть быти в заведаню шафаров от Е[го] К[ролевской] М[илости] посланых на тые замки, которые част[ъ] тых живностей осмотревши потребу на кождом замку, яко бы чверть року люди вси што ку обороне замку належать выживити мог[ли], часу обляженя останок будуть продавати служебным ценою»* (Тамсама). Вядома, што ў 1560 г. у Зельбургу і Марыенгаўзене шафарам быў Ян Клюкоўскі, у Люцэне — Андрэй Дзержка, у Розітэне — Пётр Міклашоўскі, у Дынебургу — Станіслаў Няздзінскі: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, арк. 393–395.

197 У прыватнасці, бочка жыта каштавала 15 грошаў, бочка аўса — 13 грошаў: Тамсама. Арк. 413–413 адв.

198 Тамсама. Арк. 497 адв. — 498.

199 Тамсама. Арк. 526 адв. — 527 адв.

200 *«Żywność aby J[ego] K[rólewska] M[iłość] raczył postanowić tańszą aniż jest nam podano, bo na tej cenie żadną miarą wojsko wytrwać nie może, bo ani żołd ten nie wystarczy»* (Jasnowski J. Materiały do działalności... S. 277).

201 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 37, 486–487.

202 Listy. S. 443–444.

*жолнеров, которые не толко быдло переели, але и на самых скуру не вем, естли целу зоставили»*[203].

Якім жа чынам дзяржаўныя структуры ўлады вырашалі праблему затрымак «заслужоного» і забеспячэння жаўнераў неабходным правіянтам?

Выкарыстоўваліся розныя метады — як традыцыйнае ўзмацненне падатковай нагрузкі, так і арыгінальныя спробы пошуку найбольш рацыянальнага рашэння існых праблем. Найбольш значнай з іх стаў зроблены ў канцы 1567 г. эксперымент па спрашчэнні працэдуры перадачы грошай ад павятовых паборцаў і асобных магнатаў ротмістрам.

Як вядома, у лістападзе 1567 г. на ваенным з'ездзе ў Лебедзеве было вырашана паскорыць выплату другой «раты» серабшчыны праз перанос тэрміну яе збору на тыдзень перад Калядамі (18 снежня 1567 г.). У гаспадарскім лісце ўказвалася, што гэта робіцца дзеля таго, каб *«людеи служебъныхъ для потужнеишое воины задержати»*[204]. Цікава, што пры гэтым гаспадарская ўлада пагражала неплацельшчыкам падаткаў ужо не «ўвязаннем» у маёнткі, а тым, што іх *«имене людемъ служебъным в заплату подаваны быти маеть»*[205].

На падставе гэтага рашэння былі складзены два спісы ротмістраў, якія павінны былі атрымаць грошы з сабранага падатку ад павятовых паборцаў альбо магнатаў. Дзякуючы гэтым крыніцам можна прасачыць, як размяркоўваліся падатковыя сродкі паміж ротмістрамі. Першы са спісаў датаваны 19 лістапада 1567 г., другі — 1 снежня 1567 г.[206] (гл. табл. 3.2.3). На нашу думку, другі спіс, у адрозненне ад першага, быў выдадзены не за подпісам гаспадара, а па ўласнай ініцыятыве найвышэйшага гетмана ВКЛ. З гэтай прычыны ўзніклі праблемы з парадкам выплат[207].

---

203 AS. T. 7. S. 137. Гл. таксама: Listy. S. 492–504.

204 LM. Kn. 531. P. 40–41.

205 Ibidem.

206 Ibid. P. 42–46. У прааналізаваныя спісы трапіла пяць драбскіх ротаў. Іх ротмістрамі былі палякі (Б. Дымітроўскі, Т. Карліньскі, Т. Галбіцкі і С. Вазніцкі) і італьянец (Я. Гінцілоць). Усе яны, апрача С. Вазніцкага, мелі роты колькасцю 200 драбаў. Скарб прызначыў ім выплату па 502 копы на роту. Значыць, жаўнеры павінны былі атрымаць па 2,5 копы на чалавека. Цяжка сказаць, чаму менавіта гэтыя драбскія роты атрымалі квіты на аплату ў павятовых паборцаў (бірчых). Магчыма, сваю ролю адыграла іншаземнае паходжанне ротмістраў.

207 Прыкладам, паводле аднаго ліста слонімскія паборцы павінны былі аддаць грошы Ярашу Жыжэмскаму, а паводле ліста ад найвышэйшага гетмана — Марціну Яцынічу. Плаціць адразу двум ротмістрам паборцы адмаўляліся: Ibid. P. 54–55. Гаспадар прасіў як мага хутчэй выправіць гэтую памылку: BCzart. Teki Naruszewicza. Sygn. 76.IV. Nr. 210. K. 993–998 (у крыніцы няслушна пададзена дата — замест 1568 г. трэба чытаць 1567 г. Менавіта ў канцы гэтага года Жыгімонт Аўгуст быў у Койданаве).

Нягледзячы на тое, што новыя меры дазволілі паскорыць рух фінансавых сродкаў, узніклі новыя праблемы, якія былі выкліканы ў першую чаргу неплацежаздольнасцю насельніцтва і сабатажам выплат на месцах. Здаралася, што вызначаныя нормы былі большымі за максімальныя сумы падатковых збораў, таму выдаваліся толькі часткова.

Прыкладам, драбскай роце Т. Галбіцкага луцкі біскуп Віктарын Вярбіцкі заплаціў з 504 коп 40 грошаў толькі 385 коп, заявіўшы, што гэта — максімальная сума серабшчыны з яго маёнткаў[208].

Табліца 3.2.3.

*Размеркаванне конных найманых рот*
*для атрымання «заслужонога» ў канцы 1567 г.*

| N п/п | Прозвішча ротмістра | Кольkасць жаўнераў | Плацельшчыкі па першым спісе | Сума выплат | Плацельшчыкі па другім спісе | Сума выплат | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1. | Зяновіч Юры | 200 | Ашмянскі павет | 800 | Ашмянскі павет | 800 | сустракаецца толькі ў першым спісе |
| 2. | Сангушка Раман | 200 | кн. Юры Слуцкі | 800 | берасцейскі ваявода (Юры Тышкевіч), падчашы (Мікалай Кішка) | 200 +600 | |
| 3. | Корсак Баркулаб * | 200 | кн. (Юры?) Слуцкі | 800 | кн. Юры Слуцкі, Новагародскі павет | 800 800 | сустракаецца ў другім спісе два разы |
| 4. | Корсак (Анікей) | 200 | віленскія ваяводзічы, падляшскі кашталян (Рыгор Трызна) | 300 + 500 | віленскія ваяводзічы, падляшскі кашталян (Рыгор Трызна) | 300 500 | |
| 5. | Кміта Філон | 200 | падляшскі ваявода (Васіль Тышкевіч) | не пазначана | Аршанскі павет | 800 | |
| 6. | Саколінскі (Павел) | 200 | Аршанскі павет | 800 | Ашмянскі павет, Лідскі павет | 800 1600 | сустракаецца ў другім спісе два разы |

208 Пагаджаючыся са справядлівасцю гэтага аргумента, гаспадар загадаў астатнюю суму сабраць з духоўных землеўладанняў біскупства: LM. Kn. 531. P. 80–81.

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 7. | Масальскі (Андрэй) | 150 | паны Гарнастаі | 600 | Гарадзенскі павет | 600 | |
| 8. | Яцыніч Марцін | 200 | пані Кішка (Ганна Радзівіл), Слонімскі павет | 800<br>800 | Слонімскі павет | 800 | сустракаецца ў першым спісе два разы |
| 9. | Вішнявецкі Канстанцін | 200 | кн. (Богуш?) Карэцкі, віленскі біскуп (Валерыян Пратасевіч) | 500<br>300 | кн. (Богуш?) Карэцкі, віленскі біскуп (Валерыян Пратасевіч) | 500<br>300 | |
| 10. | Забалоцкі Уладзімір | 200 | Наваградскі павет | 800 | Ашмянскі павет | 800 | |
| 11. | кн. Лукомскі | 100 | віленскія ваяводзічы | 237 | віленскі кашталян (Рыгор Хадкевіч) | 400 | ідэнтыфікаваць не ўдалося; у першым спісе — дададатак да асноўнай сумы |
| 12. | Збаражскі Януш | 200 | троцкі ваявода (Стэфан Збаражскі) | 800 | троцкі ваявода (Стэфан Збаражскі), князі Збаражскія | 800 | |
| 13. | Курч Марцін | 200 | троцкі кашталян (Юры Хадкевіч) | 800 | троцкі кашталян (Юры Хадкевіч) | 600 | у другім спісе — 150 коннікаў |
| 14. | Шахмет (Шагун) і Алікечм | 100 | наваградскі ваявода (Павел Сапега) | 400 | наваградскі ваявода (Павел Сапега) | 400 | татары |
| 15. | Сеіт Манцэр | 100 | віленскія ваяводзічы | 400 | віленскія ваяводзічы | 400 | татарын |
| 16. | «царэвіч Пуньскі» | 100 | Ашмянскі павет | 400 | падляшскі ваявода (Васіль Тышкевіч), Ашмянскі павет | 400 | татарын |
| 17. | Цямрук і Кантымер | 40+70 | мсціслаўскі ваявода (Юры Осцік) | 440 | мсціслаўскі ваявода (Юры Осцік), Рыгор Осцік, нявестка Мікалая Осціка | 440 | татары |
| 18. | Курбскі Андрэй** | 100 | | | Андрэй Курбскі | 400 | у асобным лісце ад 5.12.1567 |
| 19. | Глябовіч (Ян) | 200 | | | пані Кішка (Ганна Радзівіл) | 800 | «тот лист задержан»; верагодна, дубровенскі дзяржаўца; сустракаецца толькі ў другім спісе |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 20. | Тышкевіч Юры | 150 | | | падканцлер (Астафій Валовіч), наваградскі кашталян (Рыгор Г. Валовіч), лоўчы (Рыгор Б. Валовіч) | 600 | сустракаецца толькі ў другім спісе |
| 21. | Лукомскі Балтазар*** | 100 | | | Вількамірскі павет | 400 | «наново»; «тот лист задержан»; сустракаецца толькі ў другім спісе |
| 22. | Шолуха Астафій | 150 | | | Менскі павет | 600 | сустракаецца толькі ў другім спісе |
| 23. | Вішнявецкі Аляксандр | 200 | | | віленскі біскуп (Валерыян Пратасевіч) | 800 | сустракаецца толькі адзін раз (верагодна, памылка!) |

**Заўвагі:**
1. * — існуе ліст ад 14 студзеня 1568 г. аб выплаце Б. Корсаку 800 коп грошаў з Ваўкавыскага павета: LM. Kn. 531. P. 56–57.
2. ** — звесткі знаходзяцца па-за спісам, у гаспадарскім лісце ад 5 снежня1567 г. (Ibid. P. 44). У ім падаюцца звесткі, што А. Курбскі распачаў службу ў пачатку 1567 г., пасля ўхвалы Гарадзенскага сойма аб фінансаванні жаўнераў. З першай «раты» серабшчыны 1567 г. ён атрымаў грошы за паўгода службы.
3. *** — існуе ліст ад 4 лютага 1568 г. аб выплаце Балтазару Лукомскаму 400 коп грошаў з маёнткаў віленскага біскупа В. Пратасевіча: Ibid. P. 59–60.

*Табліца складзена паводле:* LM. Kn. 531. P. 42–46.

Быў яшчэ адзін цікавы выпадак. Віленскі біскуп В. Пратасевіч папрасіў у гаспадара асаблівы ліст аб выплаце 400 коп грошаў з падаткаў, накладзеных на яго землеўладанні, для ротмістра Бальтазара Лукомскага[209]. Напэўна, гэтае пацвярджэнне было патрэбна біскупу для вырашэння спрэчнай сітуацыі, калі ад гаспадара і найвышэйшага гетмана прыходзілі лісты рознага зместу. У выніку грошы да ротмістра дайшлі не раней чым праз два месяцы пасля пачатку прыпаведнай чвэрці.

Падаткаплацельшчыкі і паборцы не спяшаліся перадаваць сабраныя сродкі ўпаўнаважаным асобам. У канцы лютага 1568 г. улады

[209] LM. Kn. 531. P. 59–60.

звярнуліся да паборцаў Берасцейскага, Луцкага, Валадзімерскага і Крэмянецкага паветаў з загадам як мага хутчэй перадаць сабраную серабшчыну найвышэйшаму гетману. Гэты загад быў абумоўлены тым, што *«великая пилная потреба пенезей для задержыванья пры границах людей служебъных припала»*[210]. У дадзеным выпадку мы зноў сутыкаемся з затрымкай выдачы грошай больш чым на два месяцы.

Відавочна, вынікі эксперымента з выплатай «заслужоного» праз павятовых паборцаў не задаволілі кіраўніцтва краіны. У лістападзе 1568 г. Р. Хадкевіч пісаў гаспадару, што лепш было б, калі б размяркоўваў сабраныя грошы ён сам[211]. Жыгімонт Аўгуст прызнаў слушнасць гэтага меркавання і ў ліпені 1569 г. загадаў павятовым паборцам перадаваць сабраныя падаткі найвышэйшаму гетману[212].

Каб спыніць працэс распаду рот, які заканамерна распачынаўся ў выніку затрымак «заслужоного», ротмістры былі вымушаны выкарыстоўваць уласныя грашовыя сродкі. Здараліся выпадкі, калі з гэтай прычыны яны аказваліся на мяжы разарэння. Марцін Курч, скардзячыся на нявыплату жаўнерскага заробку са скарбу, пісаў у 1568 г., што ў выніку выдаткавання ўласных грошай на роту *«ку немалому знишченю и шкоде маетъности своей пришол»*[213]. Акрамя таго, сур'ёзна абвастрыліся яго стасункі з жаўнерамі: *«...А од иншых товарышов, которым еще заслужоное не отдал, немалое небезпечъности ужываеть»*[214].

Кіеўскі ваявода і маршалак Валынскай зямлі К. Астрожскі напрыканцы 1567 г. выдаў сабраную са сваіх падданых другую «рату» серабшчыны за 1567 г. на пакрыццё пазыкі, якую ён узяў раней, каб заплаціць за службу ўзначаленай ім у Кіеве роты. Сваю ініцыятыву ваявода абгрунтоўваў тым, што *«заплата з скарбу не доходила»*[215]. Заплаціць жаўнерам сваёй роты з сабранай з уласных маёнткаў серабшчыны было дазволена ў лістападзе 1567 г. М. Дарагастайскаму[216], а напрыканцы 1568 г. — А. Курбскаму[217].

---

210 LM. Kn. 531. P. 79.
211 Ibid. P. 136–137.
212 Ibid. Kn. 532. P. 62–64.
213 Ibid. Kn. 531. P. 104–105.
214 Ibidem.
215 Ibid. P. 51–52.
216 Ibid. P. 50–51.
217 Ibid. P. 139–140.

Здаралася, што магнаты плацілі падаткі не ў скарб, а адразу ротмістрам — сваім сваякам. У пачатку 1568 г. М. Радзівіл Руды перадаў другую «рату» серабшчыны 1567 г. двум сваім сынам, якія ўзначальвалі найманыя роты[218].

Падатковыя органы, такім чынам, абміналіся. Гэта паскарала выплату «заслужоного», аднак дзяржава губляла кантроль над даходамі, што было нявыгадна для яе. Таму падобныя рашэнні былі адзінкавымі і з'яўляліся своеасаблівым прывілеем для асобных ротмістраў у надзвычайных сітуацыях.

Распаўсюджанай формай кампенсацыі за выданне прыватных сродкаў на «заслужоное» былі «заставы» гаспадарскіх маёнткаў гетманам і ротмістрам.

Асабліва вялізныя наданні і падатковыя ільготы атрымаў Я. Хадкевіч. Пачынаючы са жніўня 1566 г., калі ён стаў адміністратарам і гетманам Інфлянтаў, гаспадарскі скарб перадаў у яго распараджэнне значныя сумы.

Як вядома, Берасцейскі сойм 1566 г. пагадзіўся *«придати ку першой уставе поборов великих»* (гаворка ішла пра мытна-акцызны падатак, усталяваны ў 1561 г.) новы мытны пабор. Новаўхвалены падатак адразу быў аддадзены ў арэнду Я. Хадкевічу і А. Валовічу за 13 тысяч коп грошаў[219]. З гэтай сумы 11 тысяч коп грошаў прызначаліся Я. Хадкевічу на інфлянцкія справы, а менавіта на ўтрыманне трох тысяч коннікаў[220].

Яму перадаваліся ўсе падаткі з Жамойцкага староства, уключаючы нават натуральны падатак — «дзякло»[221]. У лютым 1567 г. Я. Хадкевіч і А. Валовіч былі вызвалены ад выплаты гэтага пабору, таму што выдалі на інфлянцкія патрэбы шмат сваіх сродкаў (у прыватнасці, Я. Хадкевіч выдаў 3 200 коп грошаў)[222].

У жніўні 1567 г. Я. Хадкевічу былі аддадзены ўсе «платы» з Жамойці за 1567 г. і палова скарбовых даходаў з арэнды «вялікіх (мытных) пабораў» за 1567 і 1568 гг.[223] А ў студзені 1568 г. Жамойцкае староства было

---

218 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 255 адв. — 257. Відавочна, што гэтыя роты праіснавалі толькі падчас збору паспалітага рушэння 1567 г.

219 РИБ. Т. 30. С. 396–400.

220 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 67–67 адв.

221 Тамсама. Арк. 60 адв. — 61 адв.; Тамсама. Арк. 65 адв. — 66.

222 Тамсама. Спр. 266, арк. 96–96 адв.

223 Тамсама. Спр. 267, арк. 170–171. Сума «платаў» з Жамойці складала 24 841 копу грошаў, а даходы з арэнды — у сукупнасці каля 45–50 тысяч коп грошаў: Довнар-Запольский М. Государственное хозяйство... С. 358, 564–565.

вызвалена ад выплаты *«пенезей куничных»*[224]. У красавіку 1568 г. Я. Хадкевіч атрымаў у сваё распараджэнне Ковенскае староства[225]. Гэта было адно з найбольш даходных староставаў у ВКЛ. 22 ліпеня 1568 г. Жыгімонт Аўгуст спісаў усе запазычанасці перад скарбам, якія засталіся ад бацькі Я. Хадкевіча Гераніма [226]. 25 ліпеня 1568 г. Я. Хадкевічу быў дадзены дазвол аплачваць службу наймітаў, навербаваных ім, з серабшчыны, сабранай з яго жамойцкіх уладанняў[227], а ў канцы гэтага года ён быў вызвалены ад складання фінансавых справаздач аб расходах з іх[228].

За вывучаемы перыяд Я. Хадкевіч выдаткаваў значныя фінансавыя сродкі на патрэбы арганізацыі абароны ВКЛ і Інфлянтаў. У справаздачы за перыяд з лістапада 1565 г. па кастрычнік 1567 г. адлюстравана, што скарб пакрыў яго выдаткі на арганізацыю абароны ў Інфлянтах толькі на 62%. Выдадзеная інфлянцкім адміністратарам і гетманам сума была вельмі значнай і склала 34 083 копы грошаў[229].

Не забыў гаспадар і пра польнага гетмана Р. Сангушку, які таксама не шкадаваў сродкаў на ўтрыманне ўзброеных сіл. Так, падчас збору паспалітага рушэння ў 1567 г. той выдаў 1 000 коп грошаў на аплату наймітаў, а 2 000 коп перадаў у скарб для *«потребъ земъскихъ»*. Гаспадар узнагародзіў гетмана «заставай» замка Рэчыца на адзін год. Калі б скарб не здолеў расплаціцца з князем, ён атрымліваў права трымаць Рэчыцу «до живота»[230]. Так Р. Сангушка стаў рэчыцкім дзяржаўцам. Калі быў узяты Ульскі замак, Р. Сангушка прыняў на сябе першачарговыя расходы па аднаўленні ўмацаванняў і фарміраванні ў крэпасці гарнізону. Пасля праведзеных разлікаў у канцы кастрычніка 1568 г. дзяржаўны скарб застаўся вінен польнаму гетману 720 коп 59 грошаў[231].

Не менш яскравым прыкладам самаахвярнасці з'яўляўся князь Аляксандр Палубенскі, які з 1560 г. прымаў чынны ўдзел у абароне

[224] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 243–243 адв.
[225] Тамсама. Арк. 275 адв. — 276.
[226] LM. Kn. 531. P. 105–106.
[227] Ibid. P. 106–107.
[228] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 48, арк. 244 адв. — 246; Archiwum Państwowe w Krakowie. Archiwum Młynowskie Chodkiewiczów. Sygn. AMCh 11.
[229] LM. Kn. 51. P. 113–119. Я. Хадкевіч не цураўся нават рабіць пазыкі ў іншых магнатаў. Так, у жніўні 1568 г. жамойцкі стараста пазычыў 9 тысяч коп грошаў у Р. Трызны і аддаў яму ў заклад Глуск: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 210–215 адв.
[230] Тамсама. Арк. 165–166 адв.; Спр. 267, арк. 189–190 адв. Варта дадаць, што Рэчыца была адабрана ў Міхайлы Мышкі-Варкоўскага, які атрымаў узамен Гомель з абавязкам трымаць там 30 коннікаў: Тамсама. Арк. 193 адв. — 194 адв.
[231] Тамсама. Арк. 232–233.

Інфлянтаў. За сем гадоў службы ён выдаў на ваенна-абарончыя справы 10 тысяч коп грошаў. Гаспадар абяцаў яму вярнуць гэтую суму да 1 студзеня 1568 г., агаворваючыся, што ў выпадку нявыплаты страты будуць кампенсаваны землеўладаннямі[232]. Так і атрымалася — у ліпені 1568 г. А. Палубенскі стаў распараджацца ўсімі даходамі з сёлаў у Паюрскім цівунстве Жамойцкай зямлі[233]. Затым князь атрымаў яшчэ два войтаўствы ў Жамойці, сума «заставы» якіх склала 2 тысячы коп грошаў[234]. Тым самым гаспадар не толькі аддаў даўгі, але і высока ацаніў ваенную дзейнасць ротмістра.

Не абмінулі ўвагай дзяржаўныя ўлады і простых ротмістраў. За нявыплату «заслужонага» ў верасні 1566 г. ротмістру Р. Баку быў аддадзены ў «заставу» за 1 000 коп грошаў замак Рагачоў з воласцю[235]. Лепельскі староста Ю. Зяновіч за выдачу на жаўнераў сваёй роты такой жа сумы атрымаў у дзяржанне з 6 лістапада 1567 г. Рудыя Белкі ў Мазырскім старостве[236]. За запазычанасць «заслужонага» ў памеры 600 коп грошаў віцебскі ротмістр Я. Вілкоўскі ў верасні 1567 г. атрымаў два сяла ў Віцебскім павеце[237]. Ротмістр М. Стравінскі меў у сваім распараджэнні пад заклад 400 коп грошаў сяло Палуйкавічы ў Магілёўскай воласці. У верасні 1567 г. у кошт грошай, якія яму быў вінен скарб, сума «заставы» была павялічана ажно да 2 851 копы грошаў[238]. На канец 1569 г. улады былі вінныя роце М. Дэмбінскага 6 тысяч польскіх злотых. Каб не вяртаць гэтую суму са скарбу, ротмістру быў аддадзены ў «заставу» замак Руен у Інфлянтах[239].

Некаторыя найманыя жаўнеры самі хадайнічалі перад гаспадаром, каб замест грошай за вайсковую службу ім былі нададзены зямельныя надзелы. Так, Міхал Францковіч прасіў у 1566 г. перадаць яму сяло ў Наваградскім павеце разам з 24 аселымі валокамі замест кампенсацыі 263 коп грошаў «заслужонага»[240].

232 Тамсама. Арк. 174–175. Гэта, праўда, не перашкаджала А. Палубенскаму адначасова крэдытаваць скарб, атрымліваючы ўзамен даходныя «заставы», у прыватнасці, Вількейскую дзяржаву (двор і места): Тамсама. Арк. 178 адв. — 180 адв.

233 Тамсама. Арк. 207 адв. — 209 адв.; LM. Kn. 531. P. 101–102.

234 LM. Kn. 531. P. 102–103.

235 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 68 адв. — 69 адв.

236 Тамсама. Спр. 48, арк. 178 адв. — 179 адв. 28 лістапада 1569 г. сума «заставы» была павялічана да 1 830 коп грошаў: Тамсама. Спр. 267, арк. 293 адв. — 294 адв.

237 Тамсама. Арк. 154–155.

238 Тамсама. Спр. 48, арк. 158 адв. — 159 адв.

239 Тамсама. Спр. 49, арк. 69–69 адв.

240 Тамсама. Спр. 38, арк. 599–600.

Дадамо, што зямельныя наданні раздаваліся гаспадарскай уладай у якасці ўзнагароды за ваенныя заслугі. Шэраг узнагароджанняў адбыўся пасля Ульскай бітвы 1564 г. Жаўнер найманага войска ВКЛ Андрэй Голуб, які захапіў у палон маскоўскага ваяводу Захара Пляшчэева, быў узнагароджаны за свой учынак 15 зямельнымі «службамі» ў Рэчыцкім старостве[241]. Ротмістр Р. Бака, рота якога адной з першых уступіла ў бой, атрымаў у сваё валоданне 10 зямельных службаў у Мазырскай воласці[242]. Пётр Маскевіч, які быў паранены ў бітве і з прычыны ваеннага ліхалецця згубіў усю сваю маёмасць, атрымаў сяльцо Чарніковічы з 5 «дымамі» зямлі ў Наваградскім павеце[243].

Адзначым і іншыя выпадкі. Р. Война за ўдзел у бітве пад Сушай у 1567 г. атрымаў сяло ў Пінскай воласці[244]. У красавіку 1571 г. ульскі ротмістр Юры Рачкоўскі атрымаў ад гаспадара за добрую службу тры сяла ў Полацкай зямлі[245].

Робячы канчатковыя высновы, трэба ўказаць на істотны недахоп сродкаў і магчымасцяў у дзяржаўных структур улады ўтрымліваць належным чынам кантынгент найманых жаўнераў. Нягледзячы на разнастайныя меры, найманае войска стала знаходзілася ў крызісным стане. Найбольш сур'ёзнымі праблемамі з'яўляліся недахоп харчавання і затрымкі заробку. Як вынік, ствараліся падставы для злоўжыванняў і гвалту з боку найманых жаўнераў у дачыненні да мясцовага насельніцтва. За гады Інфлянцкай вайны ўлады так і не здолелі «супакоіць» наймітаў.

Усе спробы вырашыць праблему аплаты найманай службы насілі палавінчаты характар, бо дзяржаўны скарб меў агромністы дэфіцыт. Найманае войска, не маючы неабходных сродкаў для функцыянавання, не бачачы перспектывы ўзбагачэння і кар'ернага росту, амаль увесь час існавала на мяжы самараспаду. Асабліва моцна гэтая тэндэнцыя праявілася ў канцы Інфлянцкай вайны. Крызісныя з'явы, звязаныя з утрыманнем наймітаў, не дазвалялі стварыць з найманага войска надзейную і эфектыўную сілу для барацьбы з непрыяцелем.

241 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 38, арк. 539–540.
242 Тамсама. Арк. 509–509 адв.
243 Тамсама. Арк. 509 адв. — 510.
244 Тамсама. Спр. 48, арк. 238 адв. — 239 адв.
245 Тамсама. Спр. 266, арк. 416–416 адв.

## РАЗДЗЕЛ IV

# УПЛЫЎ ВАЕННАГА СТАНОВІШЧА НА РАЗВІЦЦЁ ЎНУТРЫПАЛІТЫЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ У ВКЛ

## § 1. Стаўленне эліт да Інфлянцкай вайны: канфлікты поглядаў і інтарэсаў

Для Вялікага Княства Літоўскага Інфлянцкая вайна не толькі адкрывала новую старонку ў яго знешняй палітыцы, але і надавала новы змест унутрыпалітычным працэсам. Кіроўная эліта добра ўсведамляла, што вайна з'яўляецца сур'ёзным выклікам для дзяржавы, якая прывыкла прытрымлівацца пасіўна-абарончай знешнепалітычнай дактрыны і не мела дастатковых рэсурсаў для вядзення ваенных дзеянняў. Змаганне за Інфлянты магло скончыцца як поспехам, так і стратамі.

Стаўленне да ідэі ўсталявання кантролю над Інфлянтамі не было адназначным. Літоўскую палітычную эліту больш за ўсё непакоіла патэнцыяльная пагроза развязвання новага ваеннага канфлікту з Маскоўскай дзяржавай. Лідэр гаспадарскай Рады М. Радзівіл Чорны, які ў цэлым падтрымліваў праграму дзеянняў Жыгімонта Аўгуста ў дачыненні да Інфлянтаў, непакоіўся, што актывізацыя дзеянняў можа выклікаць неадэкватную рэакцыю маскоўцаў[1]. Падчас падрыхтоўкі «пазвольскай выправы» ў 1557 г. некаторыя радныя паны ўвогуле заявілі, што сабраную

[1] J a s n o w s k i J. Mikołaj Czarny Radziwiłł. S. 186–187.

серабшчыну яны гатовы аддаць толькі на ваенна-абарончыя мерапрыемствы супраць маскоўскага непрыяцеля, але ні ў якім разе не на ўмяшанне ў інфлянцкія справы[2].

Распачынанне маскоўцамі ў 1558 г. Інфлянцкай вайны прымусіла літоўскі бок актывізаваць дзейнасць па падпарадкаванні Інфлянтаў. Пагроза страты кантролю над развіццём падзей у гэтай краіне не пакідала іншага выбару. Пасля дастаткова доўгіх роздумаў было прынята рашэнне аказаць ваенную дапамогу інфлянцам, вынікам чаго стала заключэнне Віленскай дамовы 1559 г. Варта адзначыць, што Рада на чале з М. Радзівілам Чорным цвёрда адстойвала ідэю апякунства над Інфлянтамі толькі Літвы, але ніяк не Польшчы, чаго так моцна дабіваліся ўвесь час інфлянцкія прадстаўнікі[3].

Разгортванне шырокамаштабнай вайны з Маскоўскай дзяржавай у 1562 г. прывяло да змен у пазіцыі Радзівілаў і іх акружэння. Спачатку найвышэйшы гетман ВКЛ М. Радзівіл Руды заявіў, што ад абароны Інфлянтаў у новых абставінах варта адмовіцца: *«Potrzebniej jest doglądać, myślić i opatrować r[z]eczy wiecznych, to jest ojczyzny naszej, niż doczesnych»*[4]. Жыгімонт Аўгуст запярэчыў, адзначыўшы, што ад становішча ў суседнім краі залежыць бяспека Вільні дый увогуле *«za płotem cudzem lepiej się oganiać, niż za swym»*[5].

У канцы 1562 г. ужо М. Радзівіл Чорны звярнуўся да гаспадара з просьбай вызваліць яго ад інфлянцкіх спраў, ці, як ён вобразна выказаўся, *«od młocenia siana»*[6]. Ён быў расчараваны вынікамі літоўскай палітыкі ў Інфлянтах. Асабліва прыкрай для яго стала адмова рыжан прызнаць уладу ВКЛ. Яны настойвалі на дапамозе не толькі з боку Літвы, але і ад Польшчы, чым недвухсэнсава намякалі, што літвіны не ў стане самастойна забяспечыць бяспеку Інфлянтаў.

На Віленскім сойме 1563 г. соймавыя станы прапанавалі, каб ухваленая серабшчына ішла на патрэбы абароны толькі ўсходняга памежжа ВКЛ, а не Інфлянтаў. Мяркуем, што гэтая соймавая «просьба» была звязана з мэтанакіраваным ціскам Радзівілаў, якія імкнуліся схіліць на свой

---

2 Listy. S. 319–323. Цікава, аднак, адзначыць, што ў той жа час М. Радзівіл Руды і Г. Хадкевіч раілі гаспадару распачаць вайну супраць Інфлянцкага Ордэна.

3 Jasnowski J. Mikołaj Czarny Radziwiłł. S. 250.

4 Listy. S. 385–387.

5 Ibidem.

6 Ibid. S. 415.

бок грамадскую думку. Жыгімонт Аўгуст чарговы раз катэгарычна запярэчыў, заявіўшы, што ад бяспекі прыбалтыйскіх зямель залежыць лёс Княства ў цэлым[7]. Канфрантацыя поглядаў выразна паказала разыходжанне інтарэсаў гаспадара і Радзівілаў, за спіной якіх стаяла большасць магнацкай эліты.

Для Радзівілаў найважнейшыя наступствы ўмяшання ВКЛ у інфлянцкі канфлікт заключаліся ва ўзнаўленні шырокамаштабнай вайны з Маскоўскай дзяржавай. Яны добра ўсведамлялі, што для Княства гэта магло абярнуцца сур'ёзным крызісам улады і эканамічным заняпадам.

Жыгімонт Аўгуст цвёрда стаяў на сваёй пазіцыі. Слабасць рэсурсаў ВКЛ прымушала яго шукаць для абароны Інфлянтаў адпаведныя сродкі за межамі краіны. На нашу думку, ад'езд гаспадара ў Польшчу ў 1562 г. і падтрымка шляхецкай палітычнай праграмы былі ў немалой ступені абумоўлены гэтымі абставінамі.

Заўважым, што пераход гаспадара на бок шляхецкага лагера ў Польшчы, які, дарэчы, адназначна патрабаваў заключэння новай уніі паміж Каронай і Княствам, моцна біў па алігархічнай пазіцыі Радзівілаў і іх паплечнікаў. Удзел у Інфлянцкай вайне станавіўся для іх бомбай запаволенага дзеяння, таму што такое развіццё спраў магло скончыцца не толькі стратай асабістага палітычнага ўплыву, але і ліквідацыяй дзяржаўнага суверэнітэту ВКЛ.

Для сістэмы кіравання ВКЛ, якая трымалася на прысутнасці гаспадара ў краіне як апошняй інстанцыі ў прыняцці рашэнняў, ад'езд Жыгімонта Аўгуста быў балючым ударам. Яна фактычна была дэзарганізавана. Гэта яскрава выявілася ўжо падчас аблогі Полацка ў 1563 г. Гаспадарская Рада не здолела мабілізаваць шляхту для адпору ворага. Найбольшыя надзеі радныя паны ўскладалі на хуткі прыезд гаспадара, бачачы ў гэтым ледзь не апошні сродак выратавання і шанец узяць рэванш[8] (гл. р. I, § 2).

---

[7] РИБ. Т. 30. С. 338–339.

[8] Найвышэйшым пунктам гэтых захадаў стала патрабаванне абавязковай паўгадавой прысутнасці гаспадара на тэрыторыі Княства, выкладзенае ў прысвечаных уніі з Польшчай артыкулах Рады ад 24 сакавіка 1569 г.: BCzart. Teki Naruszewicza. Sygn. 77.IV. K. 273–289.

Жыгімонт Аўгуст разумеў важнасць свайго знаходжання ў Княстве, аднак не збіраўся сюды вяртацца на сталае пражыванне. Пасля Віленскага сойма 1563 г. ён зноў паехаў у Польшчу, дзе працягваў займацца яе ўнутрыпалітычнымі справамі. Гэта канчаткова прывяло да ахалоджвання стасункаў паміж гаспадаром і М. Радзівілам Чорным, які меркаваў, што праблемы ВКЛ, уцягнутага ў невыносную па сваім цяжары вайну, для Жыгімонта Аўгуста адышлі на другі план (гл. р. I, § 4).

На нашу думку, гаспадар не столькі адмаўляўся займацца літоўскімі праблемамі, колькі шукаў у Польшчы дадатковыя рэсурсы, якія маглі пасадзейнічаць паспяховаму завяршэнню вайны з Маскоўскай дзяржавай. Ён прытрымліваўся цвёрдага меркавання, што само Княства не ў стане перамагчы непрыяцеля з прычыны яўнага недахопу сіл і сродкаў.

Страта Полацка ўнесла істотныя карэктывы ва ўнутраную палітыку дзяржавы. Звычайна даследчыкі акцэнтуюць увагу на канчатковым усведамленні кіраўніцтвам ВКЛ неабходнасці эфектыўнай дапамогі з боку Польшчы[9].

Не спрачаючыся з гэтым, засяродзімся на іншай праблеме. Немалаважным наступствам полацкіх падзей стала паглыбленне своеасаблівага расколу палітычнай прасторы ВКЛ. І так далёкія ад цэнтра ўсходнія землі краіны з прычыны гэтай ваеннай няўдачы сталі яшчэ больш адчужанымі. Паўстала надзённая патрэба кансалідацыі грамадства ВКЛ на больш трывалым падмурку, чым раней.

Улады павінны былі забяспечыць цвёрдую падтрымку насельніцтва ўсходніх рэгіёнаў ВКЛ (дзе ў большасці пражывалі праваслаўныя) перад небяспекай новых маскоўскіх удараў. Пры немагчымасці аказаць належную дапамогу памежным землям у Вільні маглі спадзявацца толькі на ўласнае жаданне мясцовага насельніцтва змагацца з непрыяцелем.

У гэтых абставінах выдадзены на Віленскім сойме 1563 г. прывілей аб ураўнаванні ў палітычных правах хрысціян усіх веравызнанняў выглядае перадусім як спроба кансалідацыі шляхецкага грамадства на ста-

9 Historia polityczna Polski. Cz. 2. Warszawa etc., 1923. S. 81–82; Kolankowski L. Polska Jagiellonów. S. 216–217. Гэтая думка выразна прасочваецца і ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі. Гл.: Нарысы гісторыі Беларусі. Т. 1. Мн., 1994. С. 132–136.

навай аснове, без уліку канфесійных адрозненняў. Яго з'яўленне было выклікана ў першую чаргу сур'ёзнымі знешнепалітычнымі ўскладненнямі[10]. Той факт, што гэты прывілей быў выдадзены на сойме, які займаўся амаль што выключна пытаннямі абароны краіны ад ворага, толькі пацвярджае гэтае меркаванне.

Прывілей надаваўся за *«зацные заслуги»* шляхецкага грамадства, за тое, што і каталіцкая, і праваслаўная шляхта *«верность и сталость свою ку службам (...) завжды оказывали»*[11]. Нівеляцыя канфесійных адрозненняў у палітыка-прававой сферы павінна была паспрыяць умацаванню салідарнасці шляхецкага стану, на якім ляжаў абавязак абароны краіны, і трываласці сацыяльных асноў дзяржавы, якая перажывала цяжкія часы.

Гаспадар, імкнучыся наладзіць работу дзяржаўнага механізму без сваёй прысутнасці ў Княстве, звяртаўся да радных паноў з прапановамі самастойна шукаць вырашэнні паўсталых праблем. Аднак пераламіць традыцыйную методыку абавязковага ўзгаднення пазіцый было цяжка. Радныя паны не рашаліся браць на сябе поўную адказнасць, просячы Жыгімонта Аўгуста альбо даць «науку» (інструкцыю), альбо папярэдне ўхваліць прынятыя імі рашэнні. З аднаго боку, гаспадара задавальняў такі стан рэчаў, з іншага — у яго было даволі шмат падстаў для справядлівага абвінавачвання Рады ў марудлівасці і безыніцыятыўнасці[12].

Радныя паны абараняліся ад такіх закідаў, даказваючы, што робяць усё магчымае для выпраўлення крызіснага становішча, не шкадуюць на

---

10 Польскія гісторыкі амаль што адзінадушна звязвалі матывы з'яўлення Віленскага прывілею 1563 г. з мэтанакіраванай палітыкай гаспадарскай улады, накіраванай на стварэнне спрыяльных варункаў для заключэння уніі: Halecki O. Dzieje unii jagiellońskiej. T. 2. S. 222–247; Chodynicki K. Kościół prawosławny a Rzecz Pospolita. Warszawa, 1934. S. 88–89; Pelenski J. Inkorporacja ukraińskich ziem dawnej Rusi do Korony w 1569 roku. Ideologia i korzyści — próba nowego spojrzenia // Przegląd Historyczny. 1974. T. 65. Z. 2. S. 257; Bardach J. Studia z ustroju i prawa... S. 49–52. М. Любаўскі бачыў прычыны прыняцця прывілею ў лабіраванні сваіх інтарэсаў магнатамі-пратэстантамі: Любавский М. К вопросу об ограничении политических прав православных князей, панов и шляхты в Великом Княжестве Литовском до Люблинской унии // Сборник статей, посвященных В. О. Ключевскому. М., 1909. С. 1–17.

11 Гл. тэкст Віленскага прывілею 1563 г.: АЗР. Т. 3. С. 118–121. Паказальнай з'яўляецца фармулёўка гэтага акту ў гаспадарскіх адказах на Віленскім сойме 1565/1566 гг.: *«Привилей около содноченья народу литовского з рускимъ»* (РИО. Т. 30. С. 367).

12 BCzart. Teki Naruszewicza. Sygn. 76. IV. K. 285–288. Гл. таксама: Listy. S. 479–487.

гэта апошніх сіл і сродкаў[13]. Гаспадар, не жадаючы канфлікту, ішоў на кампраміс і пагаджаўся з падобнымі меркаваннямі ўплывовых магнатаў. «Крайняй» пры гэтым рабілася шараговая шляхта, якой ставілася ў віну нядбайнае выкананне земскіх абавязкаў[14].

Сярод вышэйшага кіраўніцтва ВКЛ адсутнічала ўзаемная згода ў прыняцці і выкананні палітычных рашэнняў. Найвышэйшы гетман Р. Хадкевіч у адным з прыватных лістоў з горыччу канстатаваў: «*...Не так дбати и все не до того приложить хочуть, яко всим потреба, але так, яко хто волить и мыслит, и в том спору и с поспешности напротивко неприятелю вынайти не могуть*»[15]. Праблемай, па яго словах, было і тое, што неабходна было адначасова займацца некалькімі справамі: абаронай Інфлянтаў, выездамі на вальныя соймы і вайной з Масковіяй. Гэта распыляла сілы і не дазваляла сканцэнтраваць увагу на адным накірунку дзейнасці[16].

У асяродку магнатаў панавалі бязвольныя настроі. Той жа Р. Хадкевіч наракаў, што цэнтральныя органы ўлады бяздзейнічаюць і не могуць прадпрымаць неабходныя крокі па арганізацыі ваенна-абарончых мерапрыемстваў: «*...Ничого о собе не дбаем, запаметали и славы своее, и сами себе, и потомства своего, толко так живемо, штобы день за день, а потом што з нами будет, на то не паметаем*»[17]. Па яго словах, нягледзячы на ўсё высілкі, гетманская пасада не дала яму нічога, акрамя клопатаў, растрат, людской нянавісці, каралеўскага гневу і доўгу ў некалькі дзесяткаў тысяч коп грошаў.

Адначасова ён крытычна выказваўся пра дзейнасць гаспадара: «*Wiemy jaka prędka u niego w rzeczach wojennych odprawa, jako rychło pisarze jego piszą, jako się panowie jego boją i onego słuchają. A nie tylko panowie na*

---

[13] Асабліва красамоўным з'яўляецца ліст («отпис») М. Радзівіла Рудога: «*Каждый з насъ* (радных паноў) *чинити не только што повиненъ, але и над повинность: для его кролевское милости и потребы Речи Посполитое серебщизны даемъ, войны служимъ, соймы отъправуемъ, на соймы частые ездимъ, и служебъные на именьяхъ нашихъ ховаемъ и иные. Чым вжо праве скажоны есмы на маетъностяхъ нашихъ, а ведже надъ обычай того споминаемъ и выличаемъ*» (НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 45, арк. 62–63).

[14] Гл.: Listy. S. 501.

[15] AS. T. 7. S. 179.

[16] «*Першое: воину ведемъ до Инфлянъть, другое: в[а]ша м[и]л[ос]ть мои м[и]л[ос]тивые панове и вси иншие станы рачите ехат[ь] на съемъ, од его кролевское м[и]л[ос]ти зложоныи с паны поляки, где теж прии в[а]шеи м[и]л[ос]ти мусят быть люди, третие: мл[и]л[ос]тивые п[а]нове, противъ тому неприятелю московъскому воину ведем. Тут в[а]ша м[и]л[ос]т[ь] м[и]л[ос]тивыи п[а]нове для п[а]на б[о]га рачъте уважит, можете в[а]ша м[и]л[ос]т[ь] заразом всему тому досыт вчинити*» (BKórn. Rkps. 1536. K. 229–232).

[17] AS. T. 7. S. 247.

*prośbę ale własne jego urzędnicy, starostowie i dzierżawcy imiem jego nic więcej uczynić nie chcą, owa jakie oremus, takie benedicite»*[18].

Польны гетман ВКЛ Р. Сангушка ўказваў на раздробленасць уладных паўнамоцтваў радных паноў і неэфектыўнасць іх дзеянняў па арганізацыі абароны як на галоўную прычыну няўдалага вядзення вайны. У сваім звароце да гаспадара, пазначаным траўнем 1568 г., ён спасылаўся на ўражанні маскоўскіх вязняў, якія не маглі надзівіцца бяздзейнасці літвінаў: *«Tak mniewając, iż albo ludzi takich nie masz w tych państwach, które są pod panowaniem Waszej Krolewskiej Miłości, abo też mocy tey, iż tego nie bronią»*[19]. Выйсце польны гетман бачыў у цэнтралізацыі ўлады, ва ўзмацненні дырэктыўных функцый гаспадара: *«...Aby nie wielu obrońcom rządy postępek ku obronie puszczon był, jedno aby wszyscy pod rządem y sprawą Waszej Krolewskiej Miłości yedney osoby zachowując...»*[20]. Р. Сангушка выступаў прыхільнікам адзінаасобнай улады гаспадара, бачачы толькі ў гэтым магчымасць выпраўлення крызіснай сітуацыі.

Такія погляды знаходзілі прыхільнікаў і сярод іншых прадстаўнікоў палітычнай эліты. Прыкладам, А. Валовіч наракаў на благое кіраванне справамі: *«Наши братя* (г. зн. радныя паны) *много говорат, а мало чинят. (...) Взяли есмо оборону Речи Посполитое на себе, с пана* (г. зн. гаспадара) *знявши, видим, який пожиток с того есть, (...) прожно кого маемо виновати, але сами по себе плакати, кгды ж албо не вмеем, албо теж не хочем о своей Речи Посполитой радити...»*[21].

Дзяржаўны механізм ВКЛ быў сфарміраваны так, што не мог перабудавацца на іншы лад пры адсутнасці гаспадара. У гэтым заключалася адна з фундаментальных супярэчнасцей дзяржаўна-палітычнай сістэмы Княства, дзе Рада, фактычна абмяжоўваючы ўладу гаспадара, не магла пры яго адсутнасці арганізаваць аўтаномную работу дзяржаўных органаў кіравання.

Навідавоку была яшчэ адна істотная праблема. Загады і распараджэнні без гаспадарскай санкцыі не рабілі на шараговую шляхту (і не толькі) вялікага ўражання. Іх папросту ігнаравалі, і гэта было, мяркуючы па ўсім, масавай з'явай. Радныя паны, разумеючы гэта, цярпліва чакалі лістоў з гаспадарскім подпісам, без якіх рэалізаваць тыя ці іншыя дзе-

[18] Ibid. S. 292–295.
[19] Ibid. S. 262–264.
[20] Ibidem.
[21] Ibid. S. 235–236.

янні было амаль што нерэальна. Такі стан рэчаў, які трымаўся на працяглай традыцыі, з'яўляўся яшчэ адной прычынай глыбокага крызісу ўлады ў ВКЛ.

Такім чынам, на гаспадары як на «галаве» дзяржавы замыкаўся ўвесь палітычны працэс. Гэта так ці інакш адбівалася не толькі на рабоце дзяржаўных органаў улады, але і на фарміраванні грамадскай думкі ў краіне. Абыякавае стаўленне гаспадара да вайны станавілася добрым грунтам для росту індыферэнтных настрояў у шляхецкім асяроддзі. Шляхта, не бачачы зацікаўленасці гаспадара ў ваенным рэваншы і канчатковай перамозе, пераставала разумець сутнасць і мэты ўдзелу ВКЛ у Інфлянцкай вайне. Вайна набывала ў вачах шляхціцаў бяссэнсавы, «чужы» характар. Больш відавочным і зразумелым для шляхты было тое, што ўдзел у ваенна-абарончых мерапрыемствах моцна біў па яе кішэнях. Гэтыя настроі добра адлюстраваў Фёдар Еўлашоўскі ў сваім слынным «Дзённіку»: «*...Аж до уприкреня были ми частые язды на тые войны, а яко юж тераз упатруе, мало потребные, бовем же и Речи Посполитой пожитку не веле тэ войны приносили*»[22].

Такія настроі з цягам часу толькі абвастраліся. Напрыканцы вайны — на Гарадзенскім сойме 1568 г. — шляхта адсоўвала разгляд пытанняў па арганізацыі абароны, больш цікавячыся вырашэннем іншых праблем: «*...Корол[ь] Его Милость паном послом задал, абы найпервей радили о обороне, а они зас хотят, абы им на прозбы их в долеглостях конец первей был, ту теж волности, которые нарушоны, яко в даваню врядов ляхом в Князьстве, так теж и в отнимованю врядов без причины, и иншии потребы их были направены, а потом о обороне радит хочут...*»[23]. Пра негатыўныя наступствы такога стану рэчаў перасцерагаў Р. Хадкевіч: «*Боюся, абы тые вольности наши у горшую неволю нас не привели*»[24].

За першыя гады Інфлянцкай вайны пазіцыя Жыгімонта Аўгуста адносна асноўных праблем знешняй і ўнутранай палітыкі ВКЛ перажыла значныя змены. Як ужо гаварылася, з 1562–1563 гг. ён рашуча звярнуўся да ажыццяўлення шляхецка-дэмакратычных рэформ і заключэння новай уніі паміж ВКЛ і Польшчай. Прычынай такіх перамен стала патрэба

---

22 «Гістарычныя запіскі» Ф. Еўлашоўскага. С. 90–91.
23 AS. T. 7. S. 260.
24 Ibid. S. 253.

атрымання вайсковай і фінансава-матэрыяльнай падтрымкі ад Польскай Кароны для паспяховага ўдзелу ў Інфлянцкай вайне. Для нас з'яўляецца відавочным, што менавіта гэты чыннік паўплываў на змены ў пазіцыі Жыгімонта Аўгуста, а не досыць эфемерны ціск шляхты з патрабаваннямі правядзення рэформ.

У гэтых варунках змянілася і расстаноўка палітычных сіл у ВКЛ. Фаварытамі гаспадара становяцца новыя асобы. М. Радзівіл Чорны досыць хутка заўважыў змену ў сімпатыях Жыгімонта Аўгуста, пра што згадваў у сваіх лістах[25]. Гаспадар упэўніваў, што ігнараваць меркаванне канцлера ён не можа і не будзе. Аднак, безумоўна, усе разумелі, што палітычная сітуацыя кардынальна змянілася — погляды Радзівілаў і гаспадара на развіццё палітычных спраў усё больш разыходзіліся.

Пагаршэнне стасункаў з лідэрамі магнацкай алігархіі прымушала гаспадара шукаць новую апору сярод літоўскай палітычнай эліты. Яна было знойдзена ў асобе Яна Хадкевіча — прадстаўніка аднаго з вядучых магнацкіх родаў ВКЛ. У 60-я гг. XVI ст. ён становіцца безумоўным фаварытам вялікага князя і, паступова падымаючыся па ўрадніцкай лесвіцы, — адным з самых уплывовых палітыкаў.

Што ж зблізіла маладога Хадкевіча з гаспадаром? Чым можна растлумачыць яго хуткі ўзлёт па кар'ернай лесвіцы?

Я. Хадкевіч паходзіў з лініі старажытнага магнацкага роду, моц якой грунтавалася на ўрадах і землеўладаннях у Жамойці[26]. Гэты рэгіён межаваў з Інфлянтамі. Жамойць і Інфлянты звязвалі між сабой цесныя гаспадарчыя інтарэсы. У немалой ступені з гэтай прычыны Хадкевічы паслядоўна падтрымлівалі палітыку па падпарадкаванні прыбалтыйскай дзяржавы, а гаспадар з самага пачатку выкарыстоўваў іх у якасці яе выканаўцаў.

Другім пунктам збліжэння было супадзенне поглядаў на ролю і значэнне шляхецка-дэмакратычных прынцыпаў дзяржаўнага ўладкавання. Я. Хадкевіч проціпастаўляў сябе Радзівілам, якія ўпарта трымаліся за

25 Паказальнай з'яўляецца наступная цытата з ліста Жыгімонта Аўгуста да М. Радзівіла Чорнага ад 11 студзеня 1565 г.: *«Dokładasz W[asza] M[iłość] jakoby to być miało u nas, że doświadczeni niedoświadczonem cedować muszą. Zaprawdę nigdyśmy tego w myśli naszej nie mieli, jako i teraz nie mamy, ani mieć chcemy, żebyśmy kiedy mieli praepostero eiusmodi ordine uważać u siebie zacności i doświadczenia, a zwłaszcza przedniejszych stanów i rad członków naszych»* (Listy. S. 487–490).

26 Яго бацька Геранім Хадкевіч з 1545 г. з'яўляўся жамойцкім старастам: W o l f f J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego (1386–1795). Kraków, 1885. S. 92.

«старыну» і хацелі пазбегнуць навацый у сацыяльна-палітычных адносінах.

Я. Хадкевіч адным з першых зразумеў, які вялікі палітычны патэнцыял знаходзіцца ў шляхецкіх масах. Вядома, што ён карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод жамойцкай шляхты[27]. Жамойцкі досвед дапамагаў усвядоміць, што, абапіраючыся на шляхецкі стан, можна дамагчыся значных поспехаў у палітычнай дзейнасці. Узровень палітычнай свядомасці жамойцкай шляхты быў досыць высокім. У сярэдзіне XVI ст. яна не адзін раз вылучала ўзважаныя палітычныя ініцыятывы[28].

Упершыню адкрыта сваю прыхільнасць да шляхты Я. Хадкевіч выявіў у верасні 1562 г. у вайсковым лагеры пад Віцебскам, дзе былі складзены знакамітыя «віцебскія спісы» (гл. падрабязней р. IV, § 2).

У далейшым ён працягваў займаць цвёрдую пазіцыю прыхільніка «шляхецкай дэмакратыі». Асабліва паказальным стаў зварот да гаспадара ў кастрычніку 1565 г. з просьбай не склікаць адмысловых з'ездаў радных паноў без вальнага сойма. Ініцыятарамі гэтай акцыі былі Я. Хадкевіч, М. Шэмет, К. Астрожскі і іншыя менш уплывовыя асобы. Гаспадар у адказ патлумачыў, што нядаўні з'езд у Трабах быў скліканы для аператыўнага абмеркавання *«о пилных и великоважных потребах»* абароны краіны, што ніякага *«нарушенья и уближенья»* правоў і вольнасцей з гэтай прычыны няма і не будзе[29].

Гэтая акцыя не была б цалкам зразумелай, калі б мы не ведалі, што пасля смерці М. Радзівіла Чорнага ў траўні 1565 г. засталіся вакантнымі найвышэйшыя ўрады ў ВКЛ, а менавіта — урады канцлера, віленскага ваяводы (якія, як правіла, сумяшчаліся) і земскага маршалка.

На нашу думку, просьба аб абавязковым скліканні вальнага сойма знаходзілася ў рэчышчы барацьбы за гэтыя адкрытыя ўрадніцкія вакансіі. Я. Хадкевіч імкнуўся супрацьпаставіць алігархічным метадам кіравання, якіх прытрымліваліся Радзівілы, шляхецка-дэмакратычныя прынцыпы. Калі ўспомніць, што менавіта ў гэты час Жыгімонт Аўгуст актывізаваў дзеянні па уніфікацыі палітыка-прававой сістэмы ВКЛ і Польскай Кароны, то становіцца зразумелым, што падобны ход быў бяспройгрышным.

---

27 Жамойцкая шляхта на Віленскім сойме 1563 г. ужо не першы раз прапаноўвала Я. Хадкевіча на пасаду жамойцкага старасты: АЛРГ. Т. 2. С. 151.

28 РИБ. Т. 30. С. 197–207, 250–261, 278–285.

29 AGAD, AR. Dz. I. Sygn. 7776.

Пасля няўдалай спробы сабраць паспалітае рушэнне ў 1565 г. гаспадар заклікаў радных паноў выставіць на бліжэйшыя паўгода найманыя роты за ўласны кошт, абяцаючы вярнуць грошы ў бліжэйшы час (гл. р. II, § 1–2). Я. Хадкевіч адным з першых адгукнуўся на гэтую просьбу, выставіўшы не проста роту, а цэлы почт з 1 200 коннікаў[30]! На такі крок больш ніхто з магнатаў не адважыўся.

Гэты ўчынак Я. Хадкевіча быў выкліканы не толькі яго жаданнем заваяваць сімпатыі гаспадара, але і разуменнем агульнай крызіснай сітуацыі ў ваенна-абарончай сферы. Погляды Жыгімонта Аўгуста і маладога магната на найманае войска як дзейсны сродак арганізацыі абароны супадалі. Пры гэтым Я. Хадкевіч імкнуўся паказаць, што трэба вербаваць не адзінкавыя роты, а вялікія почты, якія служылі б рэальнай альтэрнатывай закасцянеламу паспалітаму рушэнню. Гэта, дарэчы, сведчыць аб гнуткасці і прагматычнасці пазіцыі Я. Хадкевіча, бо вядома, што менавіта паспалітае рушэнне з'яўлялася адной з фундаментальных асноў «шляхецкай дэмакратыі», за функцыянаванне якой ён так шчыра выступаў.

Актыўныя дзеянні Я. Хадкевіча не засталіся па-за ўвагай гаспадара. У сакавіку 1566 г. былі раздадзены вакантныя ўрады. Жыгімонт Аўгуст распарадзіўся імі наступным чынам: М. Радзівілу Рудому былі аддадзены ўрады канцлера і віленскага ваяводы, а Я. Хадкевіч атрымаў пасаду земскага маршалка[31]. Адначасова Р. Хадкевічу быў перададзены ўрад найвышэйшага гетмана, які раней знаходзіўся ў руках М. Радзівіла Рудога.

Калі наданне жамойцкага староства Я. Хадкевічам у 1564 г. было дастаткова лагічным крокам, то новае прызначэнне азначала рэзкі ўзлёт маладога палітыка на вышэйшыя прыступкі ўлады ў ВКЛ. На нашу думку, такім чынам гаспадар вызначыў галоўнага выканаўцу для ажыццяўлення шляхецка-дэмакратычных пераўтварэнняў і стварыў супрацьвагу роду Радзівілаў. Жыгімонт Аўгуст ацаніў паслядоўную пазіцыю Я. Хадкевіча, даверыўшы яму вядзенне спраў на вальных соймах пасля праведзеных уніфікацыйных рэформ.

Такім чынам, не абразіўшы М. Радзівіла Рудога, да якога перайшлі два найвышэйшыя ўрады, Жыгімонт Аўгуст зрабіў стаўку на Хадкевічаў,

---

30 АСД. Т. 1. С. 138–140.
31 Сборник материалов... С. 49–51.

вызначаючы іх галоўнымі выканаўцамі найбольш актуальных палітычных задач: арганізацыі абароны краіны, ажыццяўлення шляхецка-дэмакратычных рэформ, а неўзабаве — упарадкавання спраў у Інфлянтах. Калі ўлічыць, што кантроль над абаронай на месцах ажыццяўлялі блізкія сваякі Хадкевічаў — польны гетман Р. Сангушка, віцебскі ваявода С. Пац, аршанскі староста Ф. Кміта, кіеўскі кашталян П. Сапега[32], — то становіцца відавочным, што Радзівілы цалкам былі адсунуты ад ваенных спраў.

Першы досвед кіравання пасяджэннямі вальнага сойма ў Берасці ўлетку 1566 г. стаў для Я. Хадкевіча досыць складаным выпрабаваннем. Ён апынуўся паміж дзвюма моцнымі палітычнымі сіламі, якія ўпарта імкнуліся рэалізаваць уласныя мэты. Гаспадар збіраўся правесці праз вальны сойм рашэнне аб скліканні агульнага з палякамі з’езда, дзе канчаткова было б вырашана пытанне аб міждзяржаўнай уніі. М. Радзівіл Руды, які стаяў на чале апазіцыі, жадаў адкласці вырашэнне гэтай праблемы на больш позні час, ухіляючыся ад супольнага саймавання з палякамі.

Я. Хадкевічу была навязана роля пасрэдніка[33]. Ён не мог адмовіць гаспадару ў рэалізацыі яго патрабаванняў, аднак у той жа час не мог дазволіць і вострай канфрантацыі з палітычнай элітай ВКЛ. Малады палітык быў вымушаны лавіраваць паміж дзвюма сіламі, так і не знайшоўшы прымальнага для абодвух бакоў кампрамісу.

Нягледзячы на фармальнае кіраўніцтва пасяджэннямі Берасцейскага сойма, аказалася, што пасады земскага маршалка не хапала для прасоўвання ўласных палітычных ініцыятыў. У рэальным палітычным уплыве Хадкевіч, безумоўна, саступаў Радзівілу. З іншага боку, цалкам верагодна, што ў сапраўднасці Хадкевіч падтрымліваў пазіцыю Радзівіла па ўхіленні ад інкарпарацыйнага праекта уніі, які навязваўся польскім бокам. Не жадаючы страціць прыхільнасць гаспадара, ён папросту не афішыраваў такую сваю пазіцыю.

Пасля Берасцейскага сойма асноўным полем дзейнасці Я. Хадкевіча сталі Інфлянты. У жніўні 1566 г. ён быў прызначаны на но-

32 Гл.: B o n i e c k i A. Herbarz polski. T. 3. Warszawa, 1900. S. 24–26.
33 Гл. інтэнсіўную перапіску Жыгімонта Аўгуста з Я. Хадкевічам і А. Валовічам за лета 1566 г.: BCzart. Teki Naruszewicza. Sygn. 75.IV.

вастворанию пасаду адміністратара і гетмана Інфлянтаў[34]. Дзейнасць Я. Хадкевіча на гэтым месцы вызначалася актыўнасцю і была ў цэлым паспяховай. Яму ўдалося ўтаймаваць інфлянцкую эліту, арганізаваць больш-менш прыстойную абарону і, што самае важнае — змяніць статус Інфлянтаў на больш карысную для ВКЛ унутраную аўтаномію. Надаючы ў 1568 г. Я. Хадкевічу тытул графа, Жыгімонт Аўгуст адзначыў менавіта гэта як яго галоўную заслугу: *«Служыл з нелитованьем самого себе и маетности своее, зоставуючы и заводечы именья свои, якож довътипом и мудрыми поступъками своими землю тамошнюю Лифлянтъскую к панству нашому Великому князству Литовскому у вечное подданьство прывел и прылучыл и вперед там в земли Лифлянтъской на службе нашой и земъской мешкаючы наклад прыймовати мусить...»*[35].

Безумоўна, у 1567–1568 гг. Жыгімонт Аўгуст фаварызаваў Я. Хадкевіча. Земскі маршалак узначаліў гаспадарскую гвардыю падчас паспалітага рушэння 1567 г. — элітны почт у 2 000 коннікаў, які складаўся пераважна з дваран[36]. Падначаленыя яму жаўнеры атрымлівалі заробак з гаспадарскага скарбу першымі. Так, у снежні 1567 г. гаспадар распарадзіўся перадаць на аплату гвардыі 12 500 коп грошаў з серабшчыннага падатку[37], у прыватнасці, усю сабраную серабшчыну з Жамойці[38]. Аднак падатковыя грошы, як заўсёды, не паступалі ў належны тэрмін. Я. Хадкевіч аператыўна аплаціў двухтысячны почт з уласных сродкаў. За гэта ён атрымаў ад гаспадара шчодрую кампенсацыю ў выглядзе «заставаў» Крушцельскай і Плацельскай воласцей у Жамойці[39]. У пачатку лютага 1568 г. Жыгімонт Аўгуст распарадзіўся перадаць у рукі Я. Хадкевіча спецыяльны пабор з жамойцкіх цівунстваў, даючы яму разам з земскім падскарбіем М. Нарушэвічам нават права пазбаўляць цівуноў пасады за нявыплату грошай[40].

---

34 LM. Kn. 530 / Parengė D. B a r o n a s, J. J o v a j š a . Vilnius, 1999. P. 38–44. Намеры адправіць Я. Хадкевіча ў Інфлянты для наладжвання абароны прасочваюцца ўжо ў лісце Жыгімонта Аўгуста да радных паноў ад 27 чэрвеня 1566 г. Варта адзначыць, што дадзеная ідэя з'явілася *«з намовы вашое милости»* (г. зн. па прапанове радных паноў): АЮЗР. Т. 1. С. 157–159.

35 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 94 адв. — 95.

36 Паводле пазнейшай практыкі такія почты пры гаспадары ўзначальваў, як правіла, дворны маршалак. Выказваю падзяку за прадстаўленую інфармацыю А. Радаману.

37 LM. Kn. 531. P. 46–48.

38 Ibid. P. 49–50. У гэтых дакументах пададзена няслушная дата: замест 1568 г. трэба чытаць 1567 г.

39 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 233 адв. — 235.

40 LM. Kn. 531. P. 60–61.

У пачатку 1568 г. Я. Хадкевіч быў прызначаны кіраўніком аблогі Ульскага замка. Фармальных паўнамоцтваў на гэта ў яго не было — ён не з'яўляўся ні найвышэйшым, ні польным гетманам. Раней Я. Хадкевіч не кіраваў ваеннымі аперацыямі на тэрыторыі ўсходняй Беларусі.

Аднак, нягледзячы на гэтыя акалічнасці, Жыгімонт Аўгуст рэкамендаваў сабрацца пад камандаваннем інфлянцкага гетмана ўсім почтам радных паноў, тым самым выразна вылучыўшы яго сярод астатніх прадстаўнікоў магнацкай эліты[41]. Я. Хадкевіч нават стаў аўтарам спецыяльных вайсковых артыкулаў (гл. р. I, § 3).

Рост уплыву Я. Хадкевіча быў вымушаны прызнаць сам М. Радзівіл Руды. Ён настойліва рэкамендаваў восенню 1567 г. свайму сыну Крыштафу накіравацца з почтам у вайсковы лагер пад камандаванне інфлянцкага гетмана[42].

Гаспадар, нягледзячы на няўдалае завяршэнне выправы пад Улу, высока ацаніў дзеянні Я. Хадкевіча[43]. У 1568 г. той атрымаў новыя наданні і ільготы. Кар'ерны рост Я. Хадкевіча дасягнуў свайго найвышэйшага пункту — у ліпені 1568 г. ён атрымаў тытул графа[44].

Польскія гісторыкі часта пішуць пра імкненне Жыгімонта Аўгуста праз наданне тытулаў, новых землеўладанняў і ільгот у выплаце падаткаў «перакупіць» Я. Хадкевіча, схіліць яго на бок прыхільнікаў уніі[45]. Цяжка зразумець, чаму з такой мэтай Жыгімонт Аўгуст дзейнічаў у 1568 г., а не ў 1569 г., як гэта было ў выпадках з А. Валовічам і М. Нарушэвічам[46]. На нашу думку, ніякіх карупцыйных матывацый у дзеяннях гаспадара не было. Наданне Я. Хадкевічу разнастайных пасад і прывілеяў з'яўлялася звычайнай практыкай вылучэння лаяльнага да сябе палітыка і, у рэшце рэшт, узнагароджаннем за відавочныя заслугі.

Адзначым, што земскі маршалак ніколі не імкнуўся паставіць пад сумненне вядучую ролю канцлера і віленскага ваяводы М. Радзівіла Ру-

41 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 267, арк. 255 адв. — 257.

42 РНБ, ф. 971, авт. 234, док. 26.

43 BCzart. Teki Naruszewicza. Rkps. 76. IV. K. 469–470. У той жа час трэба адзначыць, што стаўленне да яго ў грамадстве змянілася ў непрыхільны бок. Гэта занатаваў маскоўскі пасол: «*А Яна Еронимова* [Хадкевіча] *(...) не любят всею землею, что ходил к Уле и многих людей истерял*» (ВС. Т. 4. С. 97).

44 Сборник материалов... С. 78–81.

45 Halecki O. Dzieje unii jagiellońskiej. T. 2. S. 455; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy... S. 28–29.

46 Прыпісаць да падобных намераў гаспадара можна, па вялікім рахунку, толькі вызваленне Я. Хадкевіча ад складання фінансавых справаздач з даходаў ад жамойцкіх маёнткаў, зробленае 2 снежня 1568 г. — незадоўга да Воіньскага з'езда: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 48, арк. 244–246 адв.

дога ў палітыцы ВКЛ. У прыватнасці, ён не пярэчыў яго захадам па адкладанні «унійнага пытання», хоць, безумоўна, не ўхваляў канцэпцыі дзеяння, якой прытрымліваўся Радзівіл.

Галоўным пунктам разыходжанняў паміж імі было рознае разуменне сутнасці «шляхецкай дэмакратыі» ў ВКЛ. Я. Хадкевіч адным з першых усвядоміў, што шляхта становіцца магутнай палітычнай сілай і з гэтым трэба лічыцца. Пры гэтым яго палітычная дзейнасць зусім не прыняла антымагнацкага характару. Ён папросту лічыў, што старыя алігархічныя метады кіравання павінны саступіць месца новым шляхецка-дэмакратычным прынцыпам. Гэта, аднак, не азначала, што магнацкая група павінна была страціць свае ўплывы. Такі падыход востра кантраставаў (але не канфрантаваў!) з кансерватыўнымі поглядамі Радзівілаў, якія не віталі радыкальных змен у дзяржаўна-прававым уладкаванні і сацыяльных стасунках.

Прыхільнасць да «шляхецкай дэмакратыі» прымусіла многіх гісторыкаў меркаваць, што Я. Хадкевіч быў апалагетам уніі паміж ВКЛ і Польшчай. У гэтым пытанні ён сапраўды займаў памяркоўную пазіцыю, не адмаўляючы неабходнасці уніі для атрымання знешняй дапамогі Кароны ў складаных умовах Інфлянцкай вайны. Аднак пры гэтым ён настойліва і паслядоўна адстойваў суверэнітэт ВКЛ, ніколі не пагаджаючыся на інкарпарацыйны праект уніі.

Блізкасць пазіцый у дачыненні да трансфармацыі сацыяльна-палітычных зносін у ВКЛ і яго стасункаў з Польскай Каронай, прагматычнае стаўленне да палітычнай рэчаіснасці, энергічная і самаахвярная дзейнасць на вайсковых і адміністрацыйных пасадах былі асноўнымі чыннікамі, якія абумоўлівалі сімпатыю Жыгімонта Аўгуста да Я. Хадкевіча. Безумоўна, што без яе такі хуткі кар'ерны рост маладога магната быў бы немагчымым.

Пры гэтым, на наш погляд, нельга гаварыць, што Я. Хадкевіч беззаглядна імкнуўся стаць фаварытам гаспадара, падпарадкоўваючы гэтай мэце сваю палітычную дзейнасць. Ён добра разумеў рэальныя праблемы Княства і прапаноўваў эфектыўныя шляхі іх вырашэння. Пры неабходнасці Я. Хадкевіч ішоў на кампраміс, праяўляючы неабходную гнуткасць і саступлівасць. Безумоўна, ён паказаў вялікі палітычны талент, і гэта было па заслугах адзначана Жыгімонтам Аўгустам.

Хацелася б звярнуць увагу яшчэ на адну актуальную праблему. На нашу думку, нельга праводзіць рэзкае размежаванне палітычных гру-

повак па родавых крытэрыях. Палітычная барацьба паміж Радзівіламі і Хадкевічамі ў сярэдзіне XVI ст. стала пэўным гістарыяграфічным стэрэатыпам. Нягледзячы на існаванне выразнага процістаяння інтарэсаў гэтых двух родаў, палітычная рэчаіснасць часта дыктавала неабходнасць супрацоўніцтва магнатаў. І гэтага абодва бакі зусім не цураліся.

У траўні 1562 г. найвышэйшы гетман М. Радзівіл Руды, выходзячы ў паспалітае рушэнне, прасіў Жыгімонта Аўгуста накіраваць у войска польнага гетмана Р. Хадкевіча. Радзівіл звяртаў увагу, што менавіта ён парэкамендаваў у свой час Р. Хадкевіча на гэтую пасаду. Наўрад ці пры вострым канфлікце інтарэсаў найвышэйшы гетман жадаў бы прыезду ў войска свайго палітычнага канкурэнта, які да таго ж займаў другі па значнасці вайсковы ўрад. Радзівіл, дарэчы, баяўся, што падобная просьба выкліча падазрэнні ў яго военачальніцкай некампетэнтнасці[47].

Пра канструктыўнасць стасункаў паміж двума родамі ў канцы 60-х гг. XVI ст. можа сведчыць агульная «просьба» (рэкамендацыя) Я. Хадкевіча і М. Радзівіла Рудога аддаць А. Валовічу ў карыстанне даходы з Кармялоўскай дзяржавы, прадстаўленая гаспадару ў красавіку 1568 г.[48] Тут мы бачым супольнае заступніцтва за інтарэсы трэцяга магната.

З іншага боку, мы не маем істотных фактаў аб існаванні ў 60-х гг. XVI ст. палітычнага саюзу паміж Янам і Рыгорам Хадкевічамі — пляменнікам і дзядзькам. Гэта дазваляе нам сцвярджаць адсутнасць сумесных палітычных ініцыятыў (за выключэннем адпраўлення ганца ў Маскву ў 1565 г.) і слядоў інтэнсіўнага ліставання паміж імі. Цалкам магчыма, што прычынай падобнага адасаблення адзін ад аднаго была розніца веравызнанняў: Р. Хадкевіч быў шчырым прыхільнікам праваслаўя, а Я. Хадкевіч трымаўся пратэстантызму.

Падводзячы вынікі, трэба канстатаваць, што стаўленне эліт ВКЛ да Інфлянцкай вайны было неадназначным і супярэчлівым. У пачатку інфлянцкага канфлікту кіроўныя колы ВКЛ без асаблівых ваганняў выступалі за ўдзел Княства ў барацьбе за падпарадкаванне Інфлянтаў, добра разумеючы, якія вялікія стратэгічныя выгоды гэта дасць ВКЛ. Вялікую занепакоенасць выклікала пагроза вайны з Маскоўскай дзяржавай, якая з цягам часу ўсё больш узрастала. Гэта прывяло ў рэшце рэшт

[47] Listy. S. 370–380.
[48] НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 289–290 адв.

літоўскую палітычную эліту да цяжкага выбару паміж вайной і мірам. Выбар залежаў ад стаўлення да перспектыў інфлянцкай палітыкі ВКЛ.

Жыгімонт Аўгуст цвёрда збіраўся ўтрымаць Інфлянты пад сваім кантролем, расцэньваючы гэта як адзін з найважнейшых элементаў стратэгічнай бяспекі Княства. З самага пачатку пазіцыю гаспадара падтрымалі Геранім і Ян Хадкевічы, якія адстойвалі інтарэсы Жамойцкай зямлі — рэгіёна, цесна звязанага з Інфлянтамі. Я. Хадкевічу ў немалой ступені дзякуючы прыхільнасці да актыўнай інфлянцкай палітыкі ўдалося выбіцца на лідэрскія ролі ў палітычным жыцці ВКЛ.

Прадстаўнікі магутнага роду Радзівілаў занялі супрацьлеглую пазіцыю. Яны былі расчараваны вынікамі дзейнасці ў Інфлянтах, якая, на іх думку, толькі прывяла ВКЛ да шырокамаштабнай вайны з Масковіяй і вычарпала фінансава-гаспадарчыя рэсурсы дзяржавы. Выхад з крызіснага становішча, у якім апынулася Княства, Радзівілы бачылі перадусім у як мага хутчэйшым заканчэнні вайны — ці шляхам нанясення вырашальнага ўдару па Маскоўскай дзяржаве, ці з дапамогай заключэння перамір'я. Гэта дазволіла б аднавіць рэсурсны патэнцыял і пазбавіцца ад ціску з боку Польскай Кароны, якая імкнулася заключыць інкарпарацыйную унію з ВКЛ.

## § 2. Укараненне «шляхецкай дэмакратыі» і працэс заключэння уніі з Польшчай у варунках Інфлянцкай вайны

60-я гады XVI ст. сталі часам чарговага вынясення на першы план у палітычных узаемадачыненнях паміж ВКЛ і Польскай Каронай г. зв. «унійнага пытання». Характарызуючы перадумовы і прычыны заключэння Люблінскай уніі 1569 г., большасць даследчыкаў прытрымлівалася думкі, што шляхта ВКЛ з'яўлялася свядомым праваднікам і групай падтрымкі заключэння новага саюзнага пагаднення з Польшчай. Унія, на яе погляд, гарантавала прывілеяванаму стану ВКЛ атрыманне тых «залатых правоў і вольнасцей», якімі карысталася польская шляхта. Яе заключэнне знаменавала сабой перамогу «шляхецкай дэмакратыі», пры якой менавіта шляхта зрабілася галоўнай дзейнай сілай на палітычнай

арэне. Цяжкасці Інфлянцкай вайны былі фактарам, які прыспешваў канчатковае вырашэнне унійнага пытання.

Аднак ці сапраўды імкненне шляхты да заключэння уніі з Польшчай было галоўнай тэндэнцыяй сацыяльна-палітычных працэсаў у ВКЛ у сярэдзіне XVI ст.? Ці была сярэдняя шляхта асноўным і, галоўнае — свядомым правадніком і зацікаўленай групай у злучэнні Княства з Каронай?

Раней гістарыяграфія адказвала на гэтыя пытанні станоўча. Больш за тое, такія сцвярджэнні сталі своеасаблівым гістарыяграфічным стэрэатыпам, які пераносіцца без крытычнага аналізу з працы ў працу, не падлягаючы абмеркаванню. На гэта ёсць пэўныя і дастаткова відавочныя прычыны.

Даследаванні сацыяльна-палітычнай гісторыі ВКЛ, распачатыя ў Расіі ў канцы XIX – пачатку XX ст., сфарміравалі паноўны погляд на тагачасныя палітычныя працэсы. У гістарыяграфіі замацавалася схема, прапанаваная Мацвеем Любаўскім.

Паводле М. Любаўскага, сацыяльна-палітычнае развіццё ВКЛ вызначалася паступовай палітычнай эмансіпацыяй сярэдняй шляхты, што выяўлялася ў яе імкненні пашырыць свае правы і вольнасці. Запавольвальнай сілай гэтага працэсу была магнатэрыя, якая мела значныя ўладныя паўнамоцтвы праз інстытут гаспадарскай Рады. Рада выконвала дарадчыя функцыі пры вялікім князі, прытым абавязковага характару. У інтарэсах магнатаў было не дапусціць шырокія масы шляхты да роўнага з імі ўдзелу ў рэалізацыі ўладных паўнамоцтваў.

Галоўнай тэндэнцыяй сацыяльна-палітычных зносін у ВКЛ з'яўлялася барацьба гэтых дзвюх прывілеяваных сацыяльных груп за дамінаванне ў палітычным жыцці краіны. Дзякуючы прыняццю Статута 1566 г. і заключэнню Люблінскай уніі ў 1569 г. фармальна гэтую барацьбу выйграла шляхта, атрымаўшы непасрэдны доступ да ўлады праз соймавыя і судовыя структуры.

М. Любаўскі пры абгрунтаванні сваіх меркаванняў аб імкненні шляхты ВКЛ да заключэння уніі з Польшчай спасылаўся ў асноўным на польскія крыніцы ці гістарычныя працы XVII ст., хоць, як вядома, асноўнай дакументальнай базай для яго даследавання паслужылі матэрыялы Метрыкі ВКЛ. Гэтая парадаксальная сітуацыя вызначае адно са слабых месцаў у аргументацыі М. Любаўскага.

У свой час канцэпцыю М. Любаўскага падтрымаў Уладзімір Пічэта, давёўшы яе да поўнай схематызацыі. У яго артыкулах на ўсю моц

выявілася класавая інтэрпрэтацыя падзей унутрыпалітычнага жыцця XVI ст.[49] Так сталася, што У. Пічэта быў ледзь не адзіным гісторыкам, які ў савецкі час закранаў у сваіх даследаваннях палітычную гісторыю сярэднявечнай Беларусі і быў тут бясспрэчным аўтарытэтам.

З іншага боку, у працах Івана Лапо, якія выходзілі ў той жа час, развіваўся альтэрнатыўны погляд на сутнасць унутрыпалітычных працэсаў у ВКЛ напярэдадні знамянальнага 1569 г.[50] На думку гэтага навукоўца, вялікіх разыходжанняў у пазіцыях шляхты і магнацтва ў пытанні далейшых узаемадачыненняў ВКЛ і Польшчы не было. Увага акцэнтавалася на скансалідаваным адстойванні шляхецкім грамадствам ВКЛ агульнадзяржаўных інтарэсаў. І. Лапо адводзіў значнае месца вывучэнню прававых аспектаў развіцця ўнутрыпалітычных працэсаў у ВКЛ. Гэты даследчык адзначаў, што пасля заключэння Люблінскай уніі Княства захавала асноўныя атрыбуты суверэнітэту. У далейшым канцэпцыя І. Лапо знайшла сваё кола прыхільнікаў сярод прадстаўнікоў літоўскай гістарыяграфіі[51].

Беларуская гістарыяграфія ў савецкія часы, зыходзячы з прынцыпу «класавай барацьбы», падкрэслівала класавы характар Люблінскай уніі. Яна была выклікана неабходнасцю аб’яднання сіл польскіх і літоўскіх феадалаў для ўзмацнення эксплуатацыі непрывілеяваных класаў — сялянства і мяшчанства. Пры гэтым класаваму размежаванню надавалася этнічная афарбоўка: польска-літоўскія феадалы стваралі супольную дзяржаву дзеля паланізацыі і акаталічвання беларускай і ўкраінскай народнасцей. Кампрамісны характар уніі пры гэтым тлумачыўся «бояззю польскіх вярхоў народных паўстанняў і асабліва масавага пераходу насельніцтва ў Расію»[52].

Сучасная беларуская гістарыяграфія схіляецца да акцэптацыі поглядаў М. Любаўскага і новай польскай гістарыяграфіі, у першую чаргу вы-

---

49 П и ч е т а В. Литовско-польские унии и отношение к ним литовско-русской шляхты // П и ч е т а В. Белоруссия и Литва в XV–XVI вв. М., 1961. С. 525–550; П и ч е т а В. Польша на путях колонизации Украины и Белоруссии. Люблинская уния и ее политические последствия // П и ч е т а В. Белоруссия и Литва в XV–XVI вв. С. 551–592; П и ч е т а В. Люблинская уния и третий Литовский Статут // Журнал Министерства народного просвещения. 1917. N 5. С. 232–257.

50 Л а п п о И. Великое княжество Литовское...; Л а п п о И. Великое княжество Литовское во второй половине XVI столетия: Литовско-Русский повет и его соймик. Юрьев, 1911; Л а п п о И. Литовский Статут 1588 г. Т. 1: Исследование. Ч. 1. Каунас, 1934.

51 Варта прыгадаць імёны А. Шапокі, М. Ючаса і інш.: Š a p o k a A. Lietuva ir Lenkija po 1569 metų Liublino unijos. Jų valstybinių santykių bruožai. Kaunas, 1938; J u č a s M. Lietuvos ir Lenkijos unija. Vilnius, 2000.

52 Ю х о Я. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992. С. 135.

бітнага знаўцы прадмета Юліюша Бардаха. Асабліва трэба прыгадаць адну з апошніх прац Паўла Лойкі, у якой аўтар не выходзіць за межы падобнай традыцыйнай трактоўкі ўнутрыпалітычных працэсаў у ВКЛ у сярэдзіне XVI ст.[53] У той жа час канцэпцыя І. Лапо і яго паслядоўнікаў, калі меркаваць па працах, што выходзяць у цяперашні час, не знаходзіць пакуль што належнай падтрымкі ў беларускай гістарычнай навуцы.

У польскай гістарыяграфіі дамінантнай стала канцэпцыя, прапанаваная Оскарам Галецкім. Ён прысвяціў гісторыі уніі асобнае фундаментальнае даследаванне, якое сваім структурным зместам нагадвае гегелеўскую схему развіцця гісторыі: Люблінская унія 1569 г. у гэтай працы характарызуецца як неабарачальнае і абсалютна заканамернае заканчэнне гісторыі уніі[54]. Канцэпцыя О. Галецкага вынікае з этычна-ідэалістычнага падыходу да развіцця стасункаў паміж Польшчай і Літвой падчас праўлення дынастыі Гедымінавічаў. Сутнасцю гэтых стасункаў была, на яго погляд, рэалізацыя «ягелонскай ідэі», якая заключалася ў добраахвотным, братэрскім аб'яднанні абодвух народаў[55]. У даследаванні О. Галецкага генеральнай з'яўляецца думка, што палітычная эмансіпацыя шляхты ў ВКЛ адбывалася адначасова з усведамленнем непазбежнасці заключэння уніі з Польшчай для перамогі над магнатэрыяй і пабудовы дзяржаўна-прававой сістэмы па польскім узоры. Тэза аб адзінстве унійнага і эмансіпацыйнага працэсаў трывала замацавалася ў польскай гістарыяграфіі і з'яўляецца яе характэрнай рысай па сённяшні дзень[56].

Аднак і ў польскай гістарыяграфіі за апошнія дзесяцігоддзі сфарміраваліся альтэрнатыўныя погляды на сутнасць уніі і ролю шляхты ВКЛ у яе заключэнні. Гэта яскрава паказваюць працы Генрыка Віснера, Гжэгажа Блашчыка, Генрыка Люлевіча, у якіх яны звяртаюць увагу на

---

53 Л о й к а П. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI — першай трэці XVII ст. Мн., 2002. С. 8–34.

54 H a l e c k i O. Dzieje unii jagiellońskiej…

55 Гэты канцэптуальны падыход старанна раскрытыкаваў у свой час Генрык Лаўмяньскі: Ł o w m i a ń s k i H. Polityka Jagiellonów. Poznań, 1999. S. 54–56.

56 Яе найбольш аўтарытэтным прыхільнікам з'яўляецца, у прыватнасці, Ю. Бардах: B a r d a c h J. Krewo i Lublin. Z problemów unii polsko-litewskiej // Kwartalnik Historyczny. 1969. R. 76. Nr. 3. S. 607–619. Асноўныя тэзы гэтага даследавання паўтораны аўтарам у шэрагу новых публікацый: B a r d a c h J. O Rzeczpospolitą Obojga Narodów. Dzieje związku Polski z Litwą do schyłku XVIII wieku. Warszawa, 1998. S. 19–21; B a r d a c h J. Od aktu w Krewie do Zaręczenia Wzajemnego Obojga Narodów (1385–1791) // Unia lubelska i tradycje integracyjne w Europie Środkowo-Wschodniej. Lublin, 1999. S. 12–44.

негатыўныя наступствы уніі для ВКЛ і супярэчлівую ролю шляхецкага стану ў гэтым працэсе[57].

Адным з найбольш пераканаўчых аргументаў на карысць меркавання аб імкненні шляхты ВКЛ да заключэння уніі з Польшчай, які з лёгкай рукі О. Галецкага замацаваўся ў гістарыяграфіі, сталі падзеі ў вайсковым лагеры пад Віцебскам у верасні 1562 г., дзе ад імя сабранай у паспалітым рушэнні шляхты было адпраўлена пасольства да Жыгімонта Аўгуста з просьбай аб супольным з палякамі вырашэнні некаторых актуальных палітычных пытанняў. На думку О. Галецкага, гэта было першае свядомае выступленне шляхты ВКЛ на карысць уніі, якое паказала Жыгімонту Аўгусту, што шляхецкае грамадства падтрымлівае гэтую ідэю, і засведчыла неабходнасць яе хутчэйшай рэалізацыі. Ініцыятыва шляхты ў немалой ступені была водгукам на прапаганду з польскага боку дабротаў уніі і наступствам усведамлення яе карысці для сябе[58].

Найважнейшыя крыніцы пра падзеі ў вайсковым лагеры пад Віцебскам захаваліся ў бібліятэцы Чартарыйскіх у Кракаве[59]. Іх комплекс складаецца з трох частак. Спачатку ідуць своеасаблівыя ўводзіны ў тэму — напісаны ананімным аўтарам уступ, у якім коратка характарызуецца ўнутрыпалітычная сітуацыя ў ВКЛ у 1562 г., у прыватнасці, характар зносін паміж «панамі» і шляхтай. Тэкст напісаны на польскай мове і яго аўтарам, безумоўна, з'яўляецца паляк. У другой частцы змяшчаюцца «спісы» (spisy, spisky), у якіх у тэзіснай форме падаюцца патрабаванні шляхты, сабранай пад Віцебскам. Далей ідзе ліст ад імя пасольства ў складзе Я. Хадкевіча, Малхера Шэмета і Гаўрылы Бакея да гаспадара, у якім выкладаюцца прапановы шляхты.

У сваіх поглядах аўтар уступу схіляўся да неабходнасці злучэння (іншымі словамі — інкарпарацыі) ВКЛ з Польшчай. Галоўнай перашкодай на шляху да уніі, на яго думку, з'яўляліся «паны», якія не жадалі дапу-

---

57 Wisner H. Unia: Sceny z przeszłości Polski i Litwy. Warszawa, 1988; Wisner H. Najjaśniejsza Rzeczpospolita...; Błaszczyk G. Litwa na przełomie średniowiecza i nowożytności 1492–1569. Poznań, 2002; Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy...

58 Halecki O. Sejm obozowy szlachty litewskiej pod Witebskiem 1562 r. i jego petycja o unię z Polską (Przyczynek do dziejów parlamentaryzmu litewskiego i genezy unii lubelskiej) // Przegląd Historyczny. 1914. T. 18. Z. 3. S. 320–352.

59 BCzart. Rkps. 1604. K. 55–74. Тыя ж самыя матэрыялы знаходзяцца ў: BCzart. Rkps. 2208. K. 269–288. Агляд крыніц па праблеме «віцебскіх спісаў» 1562 г. зроблены ў: Kiaupienė J. Litewskie cechy kultury politycznej szlachty Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI wieku // Kultura Litwy i Polski w dziejach. Tożsamość i współistnienie / Red. J. Wyrozumski. Kraków, 2000. S. 72–73.

скаць шляхту да ўлады і, зыходзячы з гэтага, не былі зацікаўлены ў развіцці ў ВКЛ «шляхецкай дэмакратыі»[60].

Аднак змест крыніц даводзіць, што унія разумелася ў вайсковым лагеры інакш. У якасці галоўнага патрабавання была вылучана прапанова склікаць супольны сойм, на якім у першую чаргу павінны быць вырашаны пытанні элекцыі будучага гаспадара і агульнай абароны. Асобным пунктам стаяла пытанне аб стварэнні адзінага прававога поля ў Кароне і Княстве, з выразнай мэтай рэалізаваць у ВКЛ пастулаты «шляхецкай дэмакратыі». Унія разумелася як супольнае вырашэнне гэтых асноўных задач. Пры гэтым было выразна засведчана, што шляхта не пагаджалася з вылучаным у Польшчы інкарпарацыйным праектам уніі: *«A wiedz że M[iło]ściwy Królu, za zjechaniem naszym z pany Polaky nie juśmy na to wszystko przyzwolić, do czego by oni nas z upadkiem Rzeczypospol[itej] naszej przywodzić chcieły prożbami abo radami swemi...»*[61].

Нягледзячы на рэзкія словы ў адрас магнацкай вярхушкі, стваральнікі петыцыі не адмаўляліся ад супрацоўніцтва з ёй, прапаноўваючы Радзе супольна вырашаць злабадзённыя палітычныя пытанні. Галоўнай праблемай для іх з'яўлялася ігнараванне шляхты як паўнавартаснага ўдзельніка палітычнага працэсу. Прызнаючы вялікую ролю Рады ў палітычным жыцці краіны, шляхта лічыла правамоцным і неабходным патрабаваць свайго паўнапраўнага ўдзелу як «меншага стану» ў абмеркаванні важнейшых дзяржаўных спраў. Яна прапанавала склікаць з'езд (сойм), дзе б мела магчымасць данесці да ведама гаспадара і радных паноў свае «просьбы». Іншымі словамі, «меншы стан» хацеў займець рэальную рэпрэзентацыю на галоўным прадстаўнічым форуме краіны і непасрэдна ўплываць на прыняцце палітычных рашэнняў.

Надаць гэтым падзеям характар супрацьстаяння магнатэрыі і шляхты імкнуліся перш за ўсё польскія экзекуцыяністы, якія інтэрпрэтавалі сацыяльна-палітычныя працэсы ў ВКЛ у адпаведнасці з уласнымі прынцыпамі і ўяўленнямі. Гэта датычыць і ўступу да «віцебскіх спісаў», які, верагодна, быў напісаны польскім шляхціцам. Яго інтэрпрэтацыйную пазіцыю, дарэчы, цалкам падтрымаў О. Галецкі[62]. На наш погляд, гэты ўступ з'яўляецца досыць тэндэнцыйным тэкстам і не адлюстроўвае ў патрэбным вымярэнні і аб'ёме аб'ектыўнай рэальнасці.

60 BCzart. Rkps. 1604. K. 53–55.
61 Ibid. Rkps. 2208. K. 287.
62 Ibid. Rkps. 1604. K. 53–55.

Варта заўважыць, што вылучаныя ў «спісах» патрабаванні пададзены ў ультыматыўнай форме. Пры ігнараванні сваіх патрабаванняў шляхта нават адмаўлялася плаціць падаткі і збірацца ў паспалітае рушэнне. Ініцыятары выступлення асцерагаліся супрацьдзеяння з боку магнатаў і імкнуліся засцерагчыся ад іх ціску, які, згодна з тэкстам «спісаў», мог быць здзейснены праз судова-выканаўчыя структуры, а таксама з дапамогай фізічных метадаў. «Спісы» заклікалі шляхту салідарызавацца для адпору падобных дзеянняў.

Выразна відаць, што шляхта імкнулася выступаць на палітычнай арэне ў якасці самастойнай сілы. Гэта, безумоўна, разыходзілася з поглядамі магнатэрыі адносна месца і ролі шараговай шляхты ў палітычным жыцці краіны[63].

Што з'явілася прычынай актывізацыі шляхты і вылучэння ёю дастаткова радыкальных патрабаванняў? О. Галецкі лічыць, што непасрэднай прычынай паслужылі цяжкасці, выкліканыя ходам Інфлянцкай вайны. Яны актывізавалі палітычную дзейнасць шляхты[64]. Трапна, на наш погляд, ахарактарызаваў гэтыя падзеі І. Лапо. Ён не бачыў у дзеяннях шляхты водгуку на заклікі польскіх экзекуцыяністаў, ацэньваючы іх як «крык змучанай вайной паўгалоднай масы людзей, якія страчвалі надзею на паспяховае вядзенне вайны сіламі толькі сваёй дзяржавы»[65].

Такое тлумачэнне падзей, якія адбываліся пад Віцебскам, можа дапамагчы зразумець некаторыя заблытаныя пытанні. Шляхта была змучана вайной, і яе незадаволенасць толькі трэба было скіраваць у патрэбнае рэчышча. Ці не выкарыстала гэтыя акалічнасці сапраўды дасведчаная і ўплывовая палітычная сіла ва ўласных інтарэсах?

Вядома, што адным з паслоў ад сабранай пад Віцебскам шляхты быў малады і амбітны Я. Хадкевіч. Якім чынам малады прадстаўнік магутнага магнацкага роду апынуўся на чале шляхецкай ініцыятывы? О. Галецкі, разглядаючы падзеі ў кантэксце станавай барацьбы паміж магнатэрыяй і шляхтай, тлумачыць гэта ў першую чаргу прыхільным стаўленнем Я. Хадкевіча да уніі з Польшчай. Мімаходзь О. Галецкі матывуе пазіцыю Я. Хадкевіча таксама жаданнем уключыцца ў барацьбу з Радзівіламі[66]. На

---

63 У пасольскім лісце наўпрост гаворыцца аб разбежнасці пазіцый і інтарэсаў магнатэрыі і шляхты: «*...Rzadko to bywa, aby się członkowie bolszego, średniego i mniejszego stanu w czym spolnie a słusznie zgadzać się mieli*» (Ibid. Rkps. 2208. K. 280–281).

64 Halecki O. Sejm obozowy... S. 327.

65 Лаппо И. Литовский Статут 1588 г. Т. 1. Ч. 1. С. 233.

66 Halecki O. Sejm obozowy... S. 334–335.

гэтым акцэнтуюць сваю ўвагу Юратэ Кяўпене і Томаш Кемпа[67]. Атрымліваецца, што дзеянні Хадкевіча насілі антырадзівілаўскі характар, а значыць, так ці інакш былі накіраваны супраць магнацкай алігархіі. М. Любаўскі і М. Грушэўскі, са свайго боку, адназначна трактуюць віцебскія падзеі як акт барацьбы шляхты з засіллем магнатаў[68].

Гэтае сцвярджэнне можна аспрэчыць. Прааналізаваўшы далейшае развіццё падзей, нельга ўбачыць, каб Я. Хадкевіч зазнаў у магнацкім асяроддзі палітычным астракізм. Ніхто не ўбачыў у падзеях пад Віцебскам антымагнацкага характару! Наадварот, кіраўнікі пасольства — Я. Хадкевіч і М. Шэмет — былі ўключаны ў спіс паслоў на каронны сойм 1563 г. у Варшаве[69], а ідэі, выкладзеныя ў «віцебскіх спісах», былі агучаны на пасяджэннях гэтага сойма[70].

На нашу думку, для маладога Хадкевіча галоўнай прычынай удзелу ў акцыі пад Віцебскам была магчымасць кшталтавання ўплыву ў шляхецкім асяроддзі. Ён адным з першых зразумеў, які вялікі палітычны патэнцыял знаходзіцца ў шляхецкіх масах (гл. р. IV, § 1).

Прапановы, выкладзеныя ў «віцебскіх спісах», мелі памяркоўны характар. Яны былі канкрэтнымі і саспелымі да рэалізацыі. Разам з прызнаннем неабходнасці уніі для дзейснай абароны краіны і пераемнасці ўлады, у іх адначасова адстойваліся асноўныя атрыбуты суверэнітэту ВКЛ[71]. Цяжка ўявіць, каб такі ўзважаны праект мог спантанна з'явіцца сярод шляхціцаў, з ліку якіх мы рэальна не ведаем прозвішча ніводнага палітычнага лідэра.

Ініцыятарам яго стварэння павінен быў быць добра інфармаваны ў палітычных справах ВКЛ і Польшчы чалавек. Я. Хадкевіч найлепш

67 Kiaupienë J. Litewskie ceńhy... S. 73–74; Kempa T. Rywalizacja Radziwiłłów i Chodkiewiczów o pierwsze miejsce w elicie politycznej Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 60. i 70. XVI wieku // History, culture and language of Lithuania / Ed. G. Błaszczyk and M. Hasiuk. Poznań, 2000. S. 197–198.

68 М. Любаўскі пры гэтым выкарыстоўвае тэрмін «канфедэрацыя»: Любавский М. Литовско-русский сойм. С. 635–636; М. Грушэўскі, са свайго боку, піша пра «фармальны бунт шляхты супраць магнатаў»: Грушевський М. Історія України-Руси. Т. 4. Кiїв, 1993. С. 362.

69 У гаспадарскім прывілеі памылкова пададзены Геранім Хадкевіч, які памёр напрыканцы 1561 г.: Źrzódłopisma do dziejów unii Korony Polskiej i W. X. Litewskiego / Wyd. T. Działyński. Cz. 2. Oddz. 1. Poznań, 1856. S. 182–183. Гэтую памылку паўтарыў М. Любаўскі: Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 658.

70 Źrzódłopisma do dziejów unii... S. 367–368.

71 Гэта яскрава паказваюць просьбы аб захаванні ўласнага войска і дзяржаўных урадаў, якія павінны раздавацца толькі ўраджэнцам Княства: BCzart. Rkps. 2208. K. 287–288.

падыходзіць на гэтую ролю. Да таго ж пастулаты, вылучаныя пад Віцебскам у 1562 г., не разыходзяцца з пазіцыяй Хадкевіча па унійным пытанні, якую ён займаў на Люблінскім сойме 1569 г.

Акцыя Я. Хадкевіча з'яўляецца цікавай спробай перахопу палітычнай ініцыятывы ў Радзівілаў, у якой ён салідарызаваўся з новай пазіцыяй гаспадара ў пытаннях узаемадачыненняў паміж Польшчай і ВКЛ. З яго боку гэта быў досыць рызыкоўны крок, бо ў выпадку няўдачы існавала небяспека апынуцца на ўзбоччы вялікай палітыкі. Аднак, як паказаў час, Я. Хадкевіч добра арыентаваўся ў палітычнай сітуацыі і яе перспектывах. Неўзабаве ён пачаў хутка прасоўвацца па ўрадніцкай лесвіцы і стаў у другой палове 60-х гг. XVI ст. фактычна адным з самых уплывовых палітыкаў у ВКЛ[72].

Асабліва трэба адзначыць, што падзеі пад Віцебскам паказалі, што паспалітае рушэнне з інструмента для вядзення ваенных дзеянняў станавілася важным фактарам унутрыпалітычнай барацьбы ў ВКЛ[73].

Гэтае выступленне расцэньвалася многімі даследчыкамі як праява ўзрослай палітычнай свядомасці шляхецкага стану, як сведчанне канчатковага афармлення яго адмысловай палітычный праграмы. Шляхецкія масы здолелі падаць самастойны голас у вялікай палітыцы, які ў варунках вайны не мог быць праігнараваны. Гэта азначала карэнны пералом у палітычнай барацьбе паміж шляхтай і магнатамі, што ўрэшце прывяло да змен у расстаноўцы сіл на палітычнай арэне ВКЛ.

Аднак, на наш погляд, не ўсё так аднавначна. Многія, здавалася б, даўно вырашаныя пытанні патрабуюць сваёй новай пастаноўкі.

Своеасаблівым правілам у гістарыяграфіі з'яўляецца разгляд сацыяльных і палітычных працэсаў, якія адбываліся ў ВКЛ у канцы XV – першай палове XVI ст., як адзінай непадзельнай цэласці. Мяркуем, што для

---

72 М. Радзівіл Чорны наракаў у лісце да М. Радзівіла Рудога ад 22 лютага 1565 г., што Хадкевічы ў апошні час займелі вялікі ўплыў: *«Znać że panowie Chodkiewiczowie na mnie wojne uradzili, bo się ich radzie we wszem dosyć stało coś czynic, jedno musze pati et ferne»* (AGAD, AR. Dz. IV. T. 35. Sygn. 502. K. 39–42). Павелічэнне рэальнага ўплыву Я. Хадкевіча на гаспадарскім двары занатаваў у 1570 г. нават маскоўскі пасол: РИО. Т. 71. С. 804.

73 Рост палітычнага значэння паспалітага рушэння ў другой палове XVI – XVIII ст. падкрэсліваюць у сваіх даследаваннях Л. Кеневіч і А. Закшэўскі: K i e n i e w i c z L. Senat za Stefana Batorego. Warszawa, 2000. S. 289; Z a k r z e w s k i A. Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI–XVIII w. Ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki. Warszawa, 2000. S. 188–189.

лепшага разумення сутнасці гістарычных падзей гэтыя працэсы варта размяўжоўваць.

Ключавым элементам палітычнай рэчаіснасці з'яўляецца барацьба за ўладу. Адсюль выцякае пытанне — ці змагалася шляхта за палітычную гегемонію ў дзяржаве? Ці бачыла ў магнатэрыі (Радзе) свайго палітычнага саперніка і канкурэнта? Урэшце, у чым заключалася яе палітычная суб'ектнасць?

На нашу думку, шляхту як палітычную сілу больш слушна разглядаць у рамках паліталагічнай тэорыі «груп інтарэсаў», чым надаваць ёй рысы спецыфічнай палітычнай партыі. На палітычным полі яна змагалася ў першую чаргу за рэалізацыю сваіх сацыяльна-групавых інтарэсаў, якія заключаліся ва ўзмацненні свайго прывілеяванага становішча і дасягненні рэальнай роўнасці з панамі-магнатамі.

Групу інтарэсаў адрозніваюць дзве істотныя рысы. Па-першае, яна не змагаецца за дасягненне ўлады, а ажыццяўляе ціск на ўладныя структуры дзеля задавальнення сваіх групавых інтарэсаў. Па-другое, з прычыны падобнай спецыфікі сваёй дзейнасці яна можа мець неінстытуцыялізаваны характар, г. зн. цякучую арганізацыйную структуру і непастаянны характар дзеяння. На наш погляд, шляхта як удзельнік палітычнага працэсу трапна падпадае пад дадзеныя характарыстыкі.

Афармленая да канца палітычная арганізацыя заўсёды мае лідэраў — рэпрэзентантаў сваіх ідэй. Крыніцы не даюць нам указанняў на такіх асоб. Як выключэнне, можна згадаць толькі луцкага земскага суддзю Гаўрылу Бакея, які ўваходзіў у склад пасольства віцебскага вайсковага лагера ў 1562 г., удзельнічаў у працы Віленскага сойма 1565/1566 гг. і вызначыўся прыкметнай актыўнасцю падчас працы Люблінскага сойма 1569 г.[74] Аднак палітычнае значэнне гэтага чалавека так і не выйшла за рэгіянальны ўзровень.

Здзіўляе той факт, што да 1564–1565 гг. шляхта не патрабавала ўвядзення ў ВКЛ соймікаў па польскім узоры, якія маглі стаць для яе добрай палітычнай школай і зручным інструментам у барацьбе з магнатэрыяй. Вядома, што ў рэгіёнах існавалі мясцовыя прадстаўнічыя з'езды, якія, мяркуючы па ўсім, задавольвалі патрэбы шляхты. Хутчэй за ўсё, яна не бачыла падстаў мяняць стан рэчаў, бо, нягледзячы на рознасць сацы-

[74] АЛРГ. Т. 2. С. 177. На Люблінскім сойме палякі з прычыны шырокай эрудыцыі Г. Бакея называлі яго «Хронікай» (у сэнсе — «хадзячай энцыклапедыяй»): АСД. Т. 7. С. 44.

яльна-групавых інтарэсаў, рэальнай барацьбы за палітычную ўладу паміж магнатэрыяй і шляхтай не было.

Шляхта не ставіла пад сумнеў вырашальнае значэнне Рады ў палітычных справах. Прыкладам можа быць інструкцыя («канфірмацыя») для пасольства ВКЛ на Варшаўскі сойм, зацверджаная гаспадаром у ліпені 1563 г. Яна засведчыла, што ўдзельнікі пасольства, якія не належалі да першай «лавіцы» Рады, не мелі права самастойна выказвацца падчас соймавых дыскусій[75]. Верагодна, такі падыход акцэптаваўся ўсімі як сам сабой зразумелы. Дзённік Варшаўскага сойма змяшчае толькі выступленні М. Радзівіла Чорнага — кіраўніка пасольства. На заўвагу, чаму ад імя літвінаў выказваецца толькі ён, Радзівіл адказаў, што мае паўнамоцтвы ад усёй шляхты ВКЛ[76].

Структура ўлады ў ВКЛ была пабудавана гэтак, што найбольш здольныя шляхціцы пераходзілі на службу на гаспадарскі (альбо магнацкі) двор і з цягам часу маглі ўліцца ў шэрагі найвышэйшых ураднікаў, што, у сваю чаргу, адкрывала шлях да набыцця магнацкага статусу. У гэтым праяўлялася агульная для еўрапейскіх краін тэндэнцыя канцэнтрацыі рэальнай улады ў невялікім алігархічным коле. «Шляхецкая дэмакратыя» ў рэаліях палітычнага жыцця заўсёды насіла досыць фармальны характар. І пасля рэформ 1563–1566 гг. сярэдняя шляхта знаходзілася пад уплывам магнатаў, толькі цяпер гэта была пераважна непрыхаваная залежнасць кліента ад патрона[77].

Аднак не будзем забываць, што без шляхецкай падтрымкі не мог абысціся ніводзін палітык, бо шляхецкі стан быў сацыяльнай асновай існага дзяржаўна-палітычнага ладу. У той жа час ён, нягледзячы на сваю істотную ролю, заставаўся фактычна аб'ектам уздзеяння з боку гаспадара і радных паноў, якія трымалі ў сваіх руках галоўныя ніці кантролю над палітычным жыццём у ВКЛ[78].

---

75 *«I ci, którzy z inszych stanów są obrani, tym, którzy z ławicy rady pańskiej posłani są, we wszystkich rzeczach jako starszym i przełożonym swoim powinni uczciwość aby czynili i nic okrom ich rady i przyzwolenia w rzeczach ziemskich sprawować nie mają ani będą mogli»* (Źrzódłopisma do dziejów unii... S. 173).

76 *«Więcej mam do tego powinowactwo z strony szlachectwa swego, aniżeli z urzędu»* (Ibid. S. 352).

77 M ą c z a k A. Klientela: Nieformalne systemy władzy w Polsce i Europie XVI–XVIII w. Warszawa, 1994. S. 130–148. Аб прыярытэтнасці кліентарных стасункаў у адносінах паміж шляхтай і магнатэрыяй ВКЛ у сярэдзіне XVI ст. выказвалася Ю. Кяўпене: K i a u p i e n ė J. Litewskie cechy... S. 67–78.

78 Палітычная падпарадкаванасць шляхты магнатам яскрава праяўлялася ў другой палове XVI – XVIII стст. пры выбарах паслоў на агульны сойм Рэчы Паспалітай, прыняцці рашэнняў на павятовых сойміках. Гл.: Z a k r z e w s k i A. Sejmiki... S. 73–101.

На нашу думку, напярэдадні Люблінскай уніі шляхта ў ВКЛ толькі пачала набываць палітычную суб'ектнасць як група інтарэсаў. Хуткаму развіццю гэтага працэсу перашкаджалі традыцыйныя сацыяльныя і палітычныя ўклады, моцная кліентарная залежнасць шляхты ад паноў, нізкі ўзровень яе адукацыі і слабыя магчымасці кантактаў паміж сабой.

Неабходнай перадумовай імклівага росту палітычнага значэння шляхецкага стану стала Інфлянцкая вайна. З аднаго боку, гэтаму спрыяла залежнасць дзяржаўных уладаў ад ухвалення шляхтай надзвычайных падаткаў і паспалітага рушэння. З іншага ж — менавіта вайсковыя зборы (а зусім не соймавыя пасяджэнні!) дапамаглі шляхце адчуць сябе масавай сілай непараўнальнага значэння.

Палітычная барацьба ў перыяд Інфлянцкай вайны ўсё больш набывала характар змагання паміж гаспадаром і Радай (а таксама групоўкамі ў магнацкім асяроддзі) за ўплыў на шляхту. Жыгімонт Аўгуст імкнуўся стварыць з яе дзейсную апору для рэалізацыі ўласных палітычных планаў. Рада на чале з Радзівіламі, у сваю чаргу, імкнулася захаваць за шляхтай пасіўна-пагаджальніцкую ролю ў палітычным жыцці.

Нягледзячы на актывізацыю «меншага стану» на соймавых пасяджэннях, Радзе, дзякуючы назапашанаму за стагоддзі аўтарытэту і існаванню моцнай урадніцка-кліентарнай залежнасці рэгіянальных паслоў, удавалася ўтрымліваць кантроль над працай вальных соймаў. Гэта асабліва відавочна, калі на соймах адсутнічаў гаспадар.

Як вынік, у соймавых ухвалах да 1568 г. пытанне уніі і склікання агульнага з палякамі сойма, па сутнасці, не ставілася (за выключэннем Бельскага сойма 1564 г. і Віленскага сойма 1565/1566 гг.).

На Віленскім сойме 1563 г. соймавыя станы склалі «просьбу» аб пошуку дапамогі ў Польшчы: *«Абы тепер послати до Коруны Польское до панов поляков, рачил, жедаючи их о помоч напротивко тому неприятелю князю Московскому»*[79]. Жыгімонт Аўгуст адклаў гэтую справу да бліжэйшага польскага сойма, на якім і магло быць вырашана гэтае пытанне.

На соймах 1566–1567 гг. ініцыятывай авалодала ўплывовая групоўка радных паноў, якая выступала супраць уніі. Па перапісцы Жыгімонта Аўгуста з Я. Хадкевічам і А. Валовічам, якая вялася летам

[79] РИБ. Т. 30. С. 324–325.

1566 г., выразна відаць, што праунійная партыя ў рэшце рэшт прайграла праціўнікам уніі на чале з М. Радзівілам Рудым[80]. Гаспадарская Рада здолела перашкодзіць заключэнню саюза з Польшчай, спаслаўшыся на ўзнаўленне ваеннай небяспекі з боку Маскоўскай дзяржавы[81].

На Гарадзенскім сойме, які адбываўся ў снежні 1566 – студзені 1567 г., уся ўвага засяроджвалася на ваенных справах. На соймавых пасяджэннях *«вси станы, сойму вальному належачие, добровольне и однако змовивши и згодивши»*, прапанавалі зрабіць надзвычайныя мабілізацыйныя высілкі. Важна адзначыць, што гэтае рашэнне было прынята ў адсутнасць Жыгімонта Аўгуста[82]. Апынуўшыся перад фактам, ён папросту не мог праігнараваць падобную праяву самаахвярнасці. Таму рэцэс сойма змяшчаў толькі артыкул *«о сланье до панов поляков»* з просьбай аб фінансавай дапамозе на будучую выправу супраць маскоўцаў і патрабаваннем не заклікаць гаспадара вярнуцца ў Польшчу да завяршэння ваенных дзеянняў[83].

І толькі на Гарадзенскім сойме 1568 г. было ўхвалена рашэнне аб скліканні супольнага польска-літоўскага сойма і заключэнні уніі[84].

Да гэтага часу Жыгімонт Аўгуст імкнуўся ўплываць на грамадскую думку праз соймавыя лісты і сваіх паслоў на новастворaныя соймікі, а абмеркаванне пільных палітычных пытанняў перавесці на так званыя «ваенныя з’езды»[85].

Упершыню спроба надання паспалітаму рушэнню функцый прадстаўнічага органа была здзейснена ў канцы 1564 г. альбо нават у пачатку 1565 г. Шляхта павінна была сабрацца пад Менскам *«так для службы нашое и земское военное (...), яко и для вступу вашого в суд земский водле Статуту нового, для росписанья поветов и местец на суд и ховане книг и на обранье врадников судовых, судей, подсудков и писаров»*[86]. Нягледзячы на прыняцце пэўных рашэнняў, гэтая спроба аказалася не зусім удалай з прычыны малой фрэквенцыі шляхты.

---

80 BCzart. Teki Naruszewicza. Rkps. 75. IV.
81 LM. Kn. 530. P. 21–22.
82 Дакладна вядома, што такім шляхам было вырашана павялічыць почты з земскіх маёнткаў: РИБ. Т. 30. С. 410–411. Выглядае верагодным, што і рашэнне аб павелічэнні серабшчыны было прынята такім жа чынам.
83 Тамсама. С. 428–429.
84 Тамсама. С. 481.
85 Гэты тэрмін ужываецца ў «ваенным лісце» ад 8 лістапада 1564 г.: РИБ. Т. 30. С. 780.
86 Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Навагрудскага раёна. Мн., 1996. С. 103.

Наступны раз гаспадарская ўлада збіралася падобным шляхам знайсці спосаб вырашэння «земскіх патрэб» у жніўні 1566 г.[87] Аднак з прычыны роспуску паспалітага рушэння ад гэтай ідэі адмовіліся.

Яна была з поспехам рэалізавана пад Лебедзевам у лістападзе 1567 г., аб чым яшчэ будзе весціся гаворка ніжэй. Цікава, што ў лютым 1568 г. гаспадар паспрабаваў зноў намовіць соймавыя станы такім жа чынам вырашыць пільныя ваенна-абарончыя праблемы. На гэты раз, аднак, *«за зданьем рад наших и за прозбою вас, всих станов рыцерства нашого»* Жыгімонт Аўгуст быў вымушаны абвясціць скліканне вальнага сойма[88].

Соймавыя лісты добра паказваюць, як гаспадарская ўлада старалася карыстацца шляхецкай падтрымкай у якасці дадатковага моцнага аргумента для пастаноўкі унійнага пытання. Так, у лістах ад 22 сакавіка 1566 г. спецыяльна адзначаліся *«прозбы покорные от всих станов рыцерства»* заключыць унію з Польшчай[89]. У кастрычніку 1566 г. у інструкцыі для гаспадарскіх паслоў на сойміках, Жыгімонт Аўгуст згадваў, што папярэдні Берасцейскі сойм быў скліканы *«для взновенья и змоцненья унеи (...), што его кролевская милость вделал, чинечи прозбе вашой досыть, которую на почат҄ку перъвшое вальки под Витебском з войска Его Кролевской Милости есте просячи посылали и на соймех у Вильни о то просили»*[90]. Як бачым, вытокі шляхецкіх просьбаў аб уніі бачыліся ў падзеях, якія адбываліся пад Віцебскам у 1562 г. Заўважым таксама, што ў сваім абгрунтаванні неабходнасці заключэння уніі гаспадарская ўлада непасрэдна звязвала яе з ваенна-абарончымі патрэбамі краіны[91].

Няма нічога дзіўнага ў тым, што пераломным момантам у змаганні гаспадара за ўплыў на шляхту стаў Лебедзеўскі з'езд у лістападзе 1567 г., калі яна, сабраная ў вялікай колькасці, падтрымала ідэю уніі. Менавіта тут упершыню аб'ядналіся такія чыннікі як прысутнасць гаспадара і наяўнасць шляхецкай масы (дадамо яшчэ прыезд кароннага пасольст-

[87] *«Иж (...) на сойме Берестейском ничого ся около обороны земъское не постановили, то до стягненья войска было отложоно, хотячи у войску около обороны обмяшливати и обычай поратованья потреб земских вынайдовати»* (Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 173–175 прил.).

[88] LM. Kn. 531. P. 67–69.

[89] *«Особливе донесена прозба до нас о съем валный сполный около унеи с Коруною Полскою»* (РИБ. Т. 30. С. 838–841).

[90] Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 180 прил.

[91] Тамсама. С. 180–182 прил.

ва). Гэта дазволіла зламаць супраціўленне магнацкай групоўкі на чале з М. Радзівілам Рудым, якая выступала за адсоўванне унійнага пытання на далёкую перспектыву.

Безумоўна, шляхта магла атрымаць выгаду ад уніі з Каронай. Аднак у тагачасных палітычных варунках больш пільнай патрэбай яна бачыла прыняцце новага Статута, у які былі б упісаны прывілеі аб наданні шляхецкіх правоў і вольнасцей. Пасля выдання Бельскага прывілея 1564 г., Віленскага прывілея 1565 г. і ўступлення ў сілу Статута ВКЛ 1566 г. шляхта дамаглася рэалізацыі сваіх намаганняў. Атрыманне шляхецкіх вольнасцей цяпер у любым выпадку не магло быць прывабным аргументам на карысць уніі з Польшчай[92].

Другой пільнай задачай для шляхты было завяршэнне вайны, а значыць і спыненне знясільвальных збораў у паспалітае рушэнне і выплат абцяжарвальных падаткаў[93]. Саюз з Польшчай бачыўся выхадам з цяжкага матэрыяльнага становішча. Такое разуменне толькі ўмацоўвалася з цягам Інфлянцкай вайны і выразна праявілася пасля збору войска ў 1567 г.

Мэтанакіраванае і паслядоўнае імкненне да уніі можна ўбачыць толькі ў асяроддзі падляшскай шляхты. Паказальнымі ў сувязі з гэтым з'яўляюцца падзеі на Віленскім сойме 1565/1566 гг. Вядома, што на ім *«некоторие земли и поветы»* паставілі пытанне пра скліканне супольнага з Каронай сойма[94]. Хто быў яго ініцыятарам, даюць зразумець «адказы» Жыгімонта Аўгуста падляшскай шляхце. Менавіта яна вылучыла «просьбу» аб заключэнні уніі[95].

З асяроддзя падляшскай шляхты выйшла яшчэ адна вельмі цікавая прапанова, абыдзеная ўвагай навукоўцаў. Шэраг падляшскіх ураднікаў склаў прамову, якая была выкладзена перад удзельнікамі сойма[96]. У ёй гаварылася, што ў той сітуацыі, калі палітычныя эліты абедзвюх краін (г. зн. сенатары з польскага боку і радныя паны — з боку ВКЛ) не могуць

---

[92] Найбольш аргументавана гэтае меркаванне адстойваў І. Лапо. Гл.: Л а п п о И. Литовский Статут 1588 года. Т. 1. Ч. 1. С. 219–312.

[93] Менавіта такую аргументацыю уніі мы сустракаем у інструкцыі для гаспадарскіх паслоў на соймікі, выдадзенай восенню 1568 г.: *«З меншим накладом вашим быти мог* [адпор непрыяцелю. — *А. Я.*]*, што лацно быти можеть за злученьем в унею з станы Короны Полское»* (Л ю б а в с к и й М. Литовско-русский сейм. С. 211 прил.).

[94] РИБ. Т. 30. С. 373.

[95] Тамсама. С. 383.

[96] BKórn. Rkps. 247. K. 122–122v.

дамовіцца па спрэчных пытаннях (што можа зацягнуць заключэнне уніі да бясконцасці), вырашэнне спрэчак і прыняцце канчатковага рашэння павінна належаць Жыгімонту Аўгусту як *«panu zwierchnemu a przedniejszemu tak Korony Polskiej jako Wielkiego Księstwa Litewskiego»*, пры ўмове захавання правоў і вольнасцей абедзвюх дзяржаў. Пры гэтым падляшскія паслы асабліва падкрэслівалі, што *«żaden inszy zgadzać abo rozeznawać nie może ani będzie obywatelów a narodów tego państwa Wielkiego Księstwa Litewskiego z obywatelmi a z narody Korony Polskiej»*[97]. Такім чынам, прадстаўнікі Падляшскага ваяводства выказваліся за адсоўванне радных паноў ад вырашэння актуальных палітычных праблем.

Палітычныя ініцыятывы падляшан заўсёды выстаўляліся як прыклад памкненняў шляхты да эмансіпацыі і уніі (вядома, без падзелу гэтых працэсаў). Аднак ці абавязкова праунійная пазіцыя падляшскіх паветаў вынікала пераважна з рацыі шляхецка-станавых інтарэсаў? Ці не адыгрывалі тут больш значную ролю рэгіянальныя інтарэсы Падляшша як спецыфічнага памежнага раёна ВКЛ? Суседства з Каронай спрыяла не толькі перайманню традыцый рэальнай «шляхецкай дэмакратыі», але і паглыбленню эканамічных і культурных сувязяў, што стварала дадатковую зацікаўленасць падляшан у уніі.

Іншыя ваяводствы і паветы не вылучалі такіх патрабаванняў. Наўрад ці ім можна лічыць першы артыкул «просьбы» паслоў Віцебскага ваяводства, датаванай 27 жніўня 1566 г. О. Галецкі паспрабаваў прадставіць яго як несумненны доказ падтрымкі уніі шляхтай усходніх зямель ВКЛ[98]. На наш погляд, віцебскія паслы папросту пайшлі дакладна за зместам сакавіцкіх соймавых лістоў, вызначаючы сабе мэту прыезду на вальны сойм. Нагадаем, што ў іх сапраўды гаварылася пра першаступеннае значэнне унійнага пытання.

Для шляхты не былі чужымі агульнадзяржаўныя інтарэсы ВКЛ, якія зусім не разыходзіліся з яе станавымі інтарэсамі. Літвінаў вызначала цвёрдае разуменне ўласнага адрознення ад тых жа палякаў як асобнага

[97] BKórn. Rkps. 247. K. 122v.

[98] Вось як гучыць арыгінальны змест «просьбы» шляхты Віцебскага павета: *«Што ознаймили есте его Кролевской милости, иж на съем великий вальный, у Берестью зложоный, для намовы около унеи послали есте послов своих...»* (АЛРГ. Т. 2. С. 202). Інтэрпрэтацыя О. Галецкага выглядае наступным чынам: *«...Przedstawiając dezyderaty swej ziemi,* [паслы з Віцебскага павета] *na pierwszym miejscu postawili przeprowadzenie Unii z Polską, zaznaczając, że w tym celu zjechali na sejm brzeski»* (H a l e c k i O. Dzieje unii jagiellońskiej. T. 2. S. 218).

«палітычнага народа». Усведамленне асобнасці свайго палітычнага быцця змешвалася з этнічнымі характарыстыкамі, у выніку чаго паўставала арыгінальная «літвінская свядомасць», якая ў далейшым стала крыніцай для фарміравання феномена «літоўскага сепаратызму».

Пра моцнае адчуванне сваёй непадобнасці да «братняга» народа сведчаць многія публіцыстычныя творы таго часу. Польскія публіцысты выстаўлялі літвінаў як няўдзячны барбарскі народ, які павінен быць абавязаны Польшчы за сваё ўваходжанне ў супольнасць хрысціянскіх краін Еўропы. Літвіны, у сваю чаргу, выступалі супраць такога погляду, які лічылі несправядлівым і зняважлівым і як маглі змагаліся з ім. Яскравым прыкладам падобнай палемікі з'яўляюцца творы Станіслава Ажахоўскага і ананімная «Размова Паляка з Літвінам»[99].

«Размова» — цудоўны матэрыял для вывучэння існых у ВКЛ палітычных ідэй. Яна ўяўляе сабою пададзены ад імя ўсяго грамадства ВКЛ пункт гледжання на характар стасункаў паміж Польшчай і Літвой, у якім адстойваецца права ВКЛ на незалежнае існаванне, крытыкуецца характар ўлады і сацыяльна-палітычных зносін у Польшчы[100].

Ініцыятарамі стварэння «Размовы», на нашу думку, былі Радзівілы. Гэты публіцыстычны твор адлюстроўвае магнацкае бачанне палітычных працэсаў у абедзвюх краінах і прасякнуты духам традыцыяналісцкага кансерватызму. Праз увесь тэкст выразна праходзіць думка, што беды ў краіне ўзнікаюць тады, калі *«szlachcicy przestają słuchać panów»*[101]. «Літвін» акцэнтуе ўвагу свайго суразмоўцы на заганах польскага дзяржаўна-палітычнага ладу — яго анархічнасці, недзеяздольнасці ўлады, абыякавасці да патрэб дзяржавы з боку шляхты, для якой увогуле не існуе ніякага аўтарытэту. Аўтар наракае, што з прычыны свайго бязладдзя палякі не прыйшлі на дапамогу ўзятаму ў аблогу маскоўскім войскам Полацку. У справе уніі прадстаўнік Літвы прапануе «Паляку» спачатку разам перамагчы непрыяцеля ў Інфлянцкай вайне, а потым заключаць міждзяржаўны саюз[102]. Пры гэтым Жыгімонт Аўгуст прадстаўляўся як нейтральны суб'ект палітычнага працэсу, які клапоціцца пра агульнае

---

99 Orzechowski S. Wybór pism / Oprac. J. Starnawski. Wrocław etc., 1972. S. 304–629; Rozmowa Polaka z Litwinem…

100 Сокол С. Политическая и правовая мысль Белоруссии во второй половине XVI – начале XVII в. Мн., 1984. С. 104–114; Саверчанка І. Дыскусіі вакол дзяржаўна-палітычнага саюза паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай у аналітычнай публіцыстыцы 60-х гадоў XVI ст. // Наш радавод. Кн. 8. Гродна, 1999. С. 74–79.

101 Rozmowa Polaka z Litwinem. S. 31–34.

102 *«Wy nas do siebie za nogi chwytacie, miasto jedności nie tylko nas rozdwoicie, ale rozszarpacie na sztuki»* (Ibid. S. 43).

дабро абодвух народаў. Усе праблемы ўзнікаюць з прычыны перашкод з польскага боку для годнага завяршэння вайны.

Для аўтара «Размовы» з’яўляецца нармальным існаванне дзвюх дзяржаў з шляхецка-дэмакратычным ладам, у якіх галоўнай цнотай ёсць «вольнасць»[103]. Ён не бачыць неабходнасці злучэння Княства з Каронай для існавання шляхецкіх вольнасцей. «Шляхецкую дэмакратыю» ў ВКЛ цалкам магчыма пабудаваць на ўласным грунце і дзеля гэтага неабавязкова яшчэ больш цесна аб’ядноўвацца з Польшчай.

Як ужо згадвалася, упершыню супольнае абмеркаванне унійнага пытання адбылося на Варшаўскім сойме 1563/1564 гг. Абодва бакі прадставілі свае праекты будучага саюза суседніх дзяржаў. Праект пасольскай ізбы польскага сойма, дзе дамінавалі экзекуцыяністы, заключаўся ў фактычнай інкарпарацыі ВКЛ у склад Польшчы[104]. Польскія сенатары таксама выступалі за інкарпарацыйную унію, але іх пазіцыя была больш схільная да кампрамісаў з літвінамі[105].

Падобны падыход не мог быць успрыняты літоўскім бокам станоўча. Паслы ВКЛ не раз заяўлялі, што імкнуцца заключыць унію на ўмовах захавання «правоў і вольнасцей» Княства[106].

Літоўскі праект уніі кардынальна адрозніваўся ў дачыненні да характару і ролі супольнага сойма Рэчы Паспалітай. Радныя паны ВКЛ настойвалі на прысутнасці ў дзяржаўна-прававой сістэме супольнай дзяржавы асобнага вальнага (альбо «паспалітага») сойма ВКЛ. Гэты сойм, маючы паўнату заканадаўчай улады на тэрыторыі ВКЛ, павінен быў стаць прамежкавай інстанцыяй паміж «Вялікім вальным соймам Рэчы Паспалітай» (такі тэрмін выкарыстоўваецца ў дзённіку Варшаўскага сойма 1563/1564 гг.) і літоўскімі павятовымі соймікамі. Толькі пры вырашэнні агульных для ўсёй дзяржавы пытанняў сойм ВКЛ не павінен

---

103 Rozmowa Polaka z Litwinem. S. 60.

104 Вылучаліся нават прапановы кшталту перайменавання Літвы ў Новую Польшчу: Źrzódłopisma do dziejów unii... S. 271–272.

105 Разыходжанні ў поглядах на унію паміж пасламі і сенатарамі адлюстроўвае ліст Я. Камендоні ад 5 студзеня 1564 г.: *«W senacie codzień traktują o połączeniu Litwy; a jeśliby posłowie ziemscy nie sprzeciwiali się, rzecz była by juz skończona»* (C o m m e n d o n i J. Pamiętniki. T. 1. S. 37).

106 *«Nie chcemy tego naprzód, aby nas kto rozumieć miał, iżebyśmy nie chcieli unii, bo my chcemy i potrzebujemy jej z Ich Mościami; a nie rozumiemy, kto by jej nie chciał a nie potrzebował, jedno djabeł, któremu zgody nie potrzeba i jest zgodzie wiecznym nieprzyjacielem»* (Źrzódłopisma do dziejów unii... S. 362).

быў збірацца. Замест гэтага радныя паны вызначалі, хто з іх едзе на вялікі сойм Рэчы Паспалітай[107].

М. Радзівіл Чорны лічыў патрэбным правядзенне ў ВКЛ рэформ у сферы дзяржаўнага ўладкавання і права і, у прыватнасці, утварэння павятовых соймікаў. Дзякуючы гэтым рэформам у ВКЛ з фармальна-юрыдычнага пункту гледжання канчаткова ўсталяваліся б прынцыпы «шляхецкай дэмакратыі». Аднак пры гэтым магнатэрыя не згубіла б свайго рэальнага ўплыву на развіццё ўнутранай палітыкі дзяржавы. Такі кантроль забяспечвала б у першую чаргу існаванне інстытута вальнага сойма ВКЛ.

У ВКЛ прытрымліваліся канцэпцыі «дзвюх Рэчаў Паспалітых». Для функцыянавання ў краіне «шляхецкай дэмакратыі» было патрэбна ўвядзенне новых урадаў і пасадаў, а таксама наданне прывілеяў «на ўзор польскі». Аднак аб'яднанне з Каронай не з'яўлялася абсалютна неабходным. На такой пазіцыі стаяла Рада. Мяркуючы па інфармацыі крыніц, яна не сустракала пярэчанняў з боку шляхецкага стану. Таму нельга разглядаць рэформы 1564–1566 гг. як пройгрыш магнатаў і выйгрыш шляхты[108]. У свой час Ю. Бардах выказаў думку, што рэформы 1564–1566 гг. уяўлялі сабою саступку з боку магнатэрыі, якая хацела такім чынам адвесці шляхту ад падтрымкі уніі[109].

Для характарыстыкі літоўскага праекта інфармацыі дадае адзіны ў сваім родзе votum віленскага біскупа В. Пратасевіча, выкладзены на Берасцейскім сойме 1566 г. Аргументацыйнай апорай для яго з'яўляўся прывілей Аляксандра 1501 г. В. Пратасевіч лічыў, што любыя унійныя пагадненні павінны абапірацца на гэты дакумент. Яго пазіцыя, безумоўна, з'яўлялася кансерватыўнай: *«Teraz nic my nowego nie potrzebujemy, jedno abyśmy zachowani byli po staremu»*[110]. У галоўным пытанні — структуры вярхоўнага заканадаўчага органа — радныя паны выступалі

---

107 *«Żadną miarą u nas bez sejmu walnego być nie moze. (...) Tamze i sejmiki powiatowe będą postanowione, bo ich u nas nigdy nie było. (...) A z tych to sejmików główniejszych i powiatowych kiedy będzie potrzeba, będziemy pierwiej swej sejm walny mieć, a potem na Koronny główniejszy, wielki walny społeczny sejm jachać. A kiedy też u nas sejmu walnego nie będzie potrzeba, dla własnych samych Rzeczypospolitej potrzeb, tedy posłowie nasi prosto z sejmików przyjadą na Koronny sejm»* (Ibid. S. 351).

108 На гэты момант звярнуў увагу літоўскі даследчык Дарыюс Вілімас: В и л и м а с Д. Михалон Литвин и Федор Евлашевский — два взгляда на реформу судов Великого Княжества Литовского 1564–1566 гг. // Наш радавод. Кн. 7. Гродна, 1998. С. 216–218.

109 B a r d a c h J. Krewo i Lublin. S. 611.

110 Votum Waleriana, biskupa wileńskiego, nad unią Korony z Litwą // Dziennik Warszawski. 1826. R. 5. S. 176.

салідарна за захаванне вальнага сойма ВКЛ. В. Пратасевіч, у прыватнасці, казаў, што калі Княства пазбавіцца ўласных вальных соймаў і Рады, *«już przy tym państwie nic takiego osobliwego ani znatnego ku dostojności jego i wolności naszej nie zostało»*[111]. Важна адзначыць, што, адстойваючы неабходнасць існавання соймаў ВКЛ, віленскі біскуп спасылаўся на прускую мадэль, дзе існаваў асобны ад кароннага сойм.

Цікава, што на Варшаўскім сойме 1563/1564 гг. былі агучаны «віцебскія спісы». Аднак гэта не прынесла чаканага эфекту. Напэўна, так адбылося з той прычыны, што прапановы, выпрацаваныя ў вайсковым лагеры пад Віцебскам у верасні 1562 г., па сутнасці, мала чым адрозніваліся ад пазіцыі пасольства на чале з М. Радзівілам Чорным. На гэта ўказваў віленскі біскуп В. Пратасевіч у сваім votum, ставячы ў адзін шэраг прапановы літвінаў наконт уніі, зробленыя пад Віцебскам і на соймах у Вільні і Варшаве ў 1563 г.[112]

Такім чынам, праграмай-мінімум літвінаў была згода на элекцыю адзінага гаспадара і вядзенне супольнай знешняй палітыкі. Гэты праект, мяркуючы па ўсім, быў абмеркаваны на Віленскім сойме 1563 г. і зацверджаны Жыгімонтам Аўгустам у канфірмацыі, нададзенай пасольству ВКЛ[113].

Гаспадар пагаджаўся з асноўнымі патрабаваннямі літвінаў. На нашу думку, ён меркаваў з дапамогай такой памяркоўнай уніі вырашыць дынастычныя праблемы і атрымаць ад польскага боку вайсковую і фінансавую дапамогу для вядзення Інфлянцкай вайны. Для гаспадарскай улады, паводле логікі яе дзеянняў, гэта з'яўлялася задачай нумар адзін. Падобныя прычыны пастаноўкі унійнага пытання называў у кастрычніку 1563 г. Міхал Дзялыньскі ў сваёй размове з папскім нунцыем Я. Камэндоні[114].

---

111 Votum Waleriana... S. 166.

112 *«...I my też z nimi zarówne mieć chcemy, i ich* (палякаў) *do tego sami dobrowolnie pobudziły i przywiedli, Witebskiem, sejmem Wileńskim, aż potym do Warszawy»* (Ibid. S. 161–162).

113 Źrzódłopisma do dziejów unii... S. 172–178.

114 *«O sejmie powiedział mi, że (...) pierwszym przedmiotem będzie połączenie Litwy, Rusi, Żmudzi z Koroną Polską. (...) Przez tyle wszakże lat połączenie to nie następowało dla usiłowań królewskich, aby te kraje jako dziedzictwo dla potomstwa zachowac. (...) Dziś, kedy moskiewski książe stał się panem znacznej części Inflant i innych pogranicznych z Litwą krajów, a nawet część samej Litwy najechał i ujarzmił, polacy nie chcą iść na obronę tych prowincji, jeżeli król przyobiecywanego połączenia nie przywiedzie do skutku. Król nie zdaje się być trudnym w tej mierze, częścią dla wspomnianego niebezpieczeństwa, a częścią dla tego, że jest bezpotomny i nadzei nawet potomstwa niemający; ztąd wnoszą, iz żadnej w tem nie będzie innej trudnosci, chyba tylko w samych warunkach zjednoczenia»* (Commendoni J. Pamiętniki. T. 1. S. 8).

Аднак, як ужо гаварылася вышэй, справа заключэння уніі разбілася аб рознае стаўленне бакоў у пытанні структуры вышэйшага заканадаўчага органа ўлады. З ходам соймавых дыскусій рос недавер да памкненняў супрацьлеглага боку. Палякі непакоіліся, што захаванне вальнага сойма ВКЛ адкрые ў далейшым шлях да разрыву уніі і выбару ў Літве асобнага вялікага князя. Літвіны, у сваю чаргу, баяліся, што ў палітычным жыцці Княства пачнуць дамінаваць палякі, займаючы мясцовыя ўрады[115].

Літоўскае пасольства імкнулася перанесці заключэнне уніі на наступны сойм, спасылаючыся на адсутнасць дастатковых паўнамоцтваў для падпісання дакументаў, якія па сваім змесце пярэчылі артыкулам канфірмацыі. Літвіны заяўлялі, што новыя спрэчныя пытанні павінны быць абмеркаваны на вальным сойме ВКЛ[116]. Упэўненасці ім дадавала атрыманне паведамлення аб перамозе ў Ульскай бітве 26 студзеня 1564 г. Нягледзячы на гэта, польскі бок, як і раней, ставіў у залежнасць ад вырашэння унійнага пытання аказанне дапамогі Княству ў вядзенні вайны з Маскоўскай дзяржавай[117].

Літвіны з'ехалі з Варшавы ў канцы лютага 1564 г. Апісваючы настроі сярод удзельнікаў сойма, Я. Камэндоні называў некалькі прычын, па якіх унія не была заключана[118]. Варта звярнуць увагу на апошнюю з іх (гл. спасылку). Верагодна, М. Радзівіл Чорны, бачачы немагчымасць заключэння уніі па літоўскім праекце, пачаў зацягваць і адкладаць перамовы з польскім бокам.

На соймах 1564–1566 гг. гэтая палітыка Рады ВКЛ праявілася з асаблівай відавочнасцю. На каронны сойм, скліканы ў Парчове ўлетку 1564 г., з радных паноў ніхто не з'явіўся. Яны даслалі толькі сваіх упаўнаважаных, каб выказацца супраць экзекуцыі. Я. Камэндоні ў сувязі з гэтым

---

115 Ibid. S. 55.

116 Цікава, што польскія паслы прапаноўвалі здзейсніць падобнае абмеркаванне на новаствораных сойміках у ВКЛ, абмінаючы такую структуру, як вальны сойм. Відавочна, такім чынам меркавалася пазбегнуць ціску з боку радных паноў, якія былі найменш зацікаўленымі ў заключэнні уніі (Źrzódłopisma do dziejów unii... S. 341–342).

117 C o m m e n d o n i J. Pamiętniki. T. 1. S. 55.

118 *«Powszechne jest mniemanie, że skuteczności układów cztery rzeczy były na wstręcie: obustronna niepowściągliwość w mowach i odwieczne narodowe zawiści; podejrzenie litwinów, iz posiłkowe wojsko polskie umyślnie tak późno nadciągneło dla złączenia się z nimi i że wielkich krzywd dopuściło się na granicy; zwycięstwo przez samych tylko litwinów odniesione (...); wojewoda wileński, który, będąc głowa poselstwa, nie życzył przyprowadzić go do skutku»* (Ibid. S. 72).

канстатаваў: *«Utrudzają więc układy jak mogą, tak, iż koniecznym jest zaniechać ję na ten raz i odłożyć do drugiego sejmu»*[119]. Аднак і на наступным каронным сойме, які сабраўся ў Пётркаве ў сакавіку 1565 г., сітуацыя паўтарылася. Прычынай непрыезду літвінаў была ваенная небяспека з боку Масковіі[120].

У 1566 г. польскі сойм зноў чакаў пасольства ВКЛ, якое павінна было выкласці пазіцыю літоўскага боку ў дачыненні да далейшых стасункаў паміж Княствам і Каронай. Пасольства не мела паўнамоцтваў для заключэння уніі і толькі паўтарыла тыя ж самыя ўмовы, якія былі вылучаны літвінамі на Варшаўскім сойме 1563/1564 гг.[121]

Такім чынам, гаспадарская Рада імкнулася захаваць аўтаномію вальнага сойма ВКЛ у дзяржаўна-прававой структуры супольнай Рэчы Паспалітай, не маючы нічога супраць заключэння уніі на прынцыпах адзінства гаспадарскай улады і вядзення супольнай знешняй палітыкі. Больш за тое, у радных паноў (у тым ліку і ў Радзівілаў) не выклікала пярэчанняў правядзенне рэформ для зацвярджэння ў ВКЛ шляхецка-дэмакратычных прынцыпаў дзяржаўнага ўладкавання. Яны імкнуліся перавесці ўвагу на праблемы вайны і абароны, заклікаючы гаспадара да вырашэння гэтых надзвычай важных для Княства задач. Пытанне уніі адсоўвалася Радай па сваёй актуальнасці на другі план.

Асобнага аналізу патрабуе пазіцыя Жыгімонта Аўгуста ў дачыненні да уніі. Пачынаючы з 1562 г. гаспадар паслядоўна імкнуўся да яе заключэння. Але што датычыць характару і шляхоў рэалізацыі унійных планаў, то тут дзеянні апошняга Гедымінавіча былі досыць супярэчлівымі. Яго пазіцыя мянялася ў залежнасці ад развіцця палітычных падзей у Польшчы і ВКЛ. Пры характарыстыцы унійнай палітыкі гаспадара нельга абмінаць і ўплывовыя знешнепалітычныя фактары.

Жыгімонт Аўгуст першым зразумеў неабходнасць для поспеху ў Інфлянцкай вайне выкарыстання вайсковага і фінансава-матэрыяльнага патэнцыялу не толькі Літвы, але і Польшчы. Гэтую патрэбу яскрава паказалі складанасці, якія ўзніклі пры падпарадкаванні Інфлянтаў у пачатку 60-х гг. XVI ст. Жыгімонта Аўгуста да заключэння уніі штурхала

---

119 Commendoni J. Pamiętniki. T. 1. S. 173–174.

120 Dyaryusz sejmu Piotrkowskiego 1565 r. / Wyd. W. Chomętowski. Warszawa, 1868. S. 225–226.

121 Diariusz sejmu lubelskiego 1566 roku / Opr. I. Kaniewska. Wrocław etc., 1980. S. 27.

перш за ўсё неабходнасць знайсці сродкі для рэалізацыі сваіх знешнепалітычных планаў (гл. р. I, § 1).

Унійную палітыку гаспадара лаканічна і вельмі дакладна апісаў у сваёй рэляцыі ў Рым добра дасведчаны папскі нунцый Ю. Руджэры: *«Ma Jego Królewska Miłość inny zamiar, który go niemało zajmuje, to jest zjednoczenie Litwy z Koroną w sposób niżej opisany, a to tym końcem aby połączone siły mogły łatwiej opierać się wspólnym nieprzyjaciołom a mianowicie Moskwie, której, jak się okazało z doświadczenia, Litwini nie są w stanie podołać, a Polacy, nie będąc z nimi złączeni, nie chcieli wojować w tamtych stronach bez żołdu»*[122]. Як бачым, папскі дыпламат лічыў, што патрэбы абароны служылі галоўнай прычынай праунійнай палітыкі гаспадара.

Падобныя матывацыі пацвярджае інструкцыя на соймік Бельскага павета ў кастрычніку 1568 г. У гэтым дакуменце, выдадзеным напярэдадні Люблінскага сойма, няма ніводнага ўказання на станавую зацікаўленасць шляхты як перадумову гаспадарскай палітыкі па заключэнні уніі[123].

Ужо ў канцы 1562 г. Жыгімонт Аўгуст заклікаў М. Радзівіла Чорнага да хутчэйшага вырашэння унійнага пытання[124]. Страта Полацка ў лютым 1563 г. яшчэ мацней выявіла неабходнасць атрымання тэрміновай вайсковай дапамогі з Польшчы.

Гаспадар умела выкарыстоўваў супярэчнасці паміж сенатам і пасольскай ізбай у каронным сойме дзеля рэалізацыі уласных палітычных задум. Нельга казаць, што пасля 1562 г. Жыгімонт Аўгуст безагаворачна

---

[122] Relacje nuncjuszów... T. 1. S. 189.

[123] Змест інструкцыі настолькі цікавы, што дазволім сабе працытаваць яе як мага паўней: *«Иж, ач кольвек его кролевская милость бачыти и ласкаве приймовати рачить от вашое милости панов рад и ото всих станов рыцерства своего, же и податками немалыми прыкладаетеся и нелитованьем крови и здоровья своего против тому непрыятелю, великому князю Московскому, и над повинность свою чыните досыть, але, иж оный непрыятель посягненьем панства его кролевской милости и зневоленьем братьи вашое, верных подданых его кролевской милости не помалу змоцняеть, прото, хотячы его кролевская милость способом большым против тому непрыятелю войну вести, якобы с помочю Божью слушный отпор взял и не шырился и не владал властного его милости господарского, рад бы то видел, абы большый посилок и з меньшим накладом вашим быти мог, што лацно быти можеть за злученьем в унею з станы Короны Польское, одностайною а сполною рукою чынечы отпор оному непрыятелю, а то не только против тому непрыятелю, але и против каждому у многих речах немало пожытку Речы Посполитое приняти можеть, кгдыж згода а милость межы каждыми панствы особливого добра прымноженье чынить»* (Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 209–211 прил.).

[124] Listy. S. 409–410.

перайшоў на бок экзекуцыяністаў і паслухмяна выконваў пастулаты іх праграмы[125]. Супярэчлівасць унутранай палітыкі гаспадара ў Кароне заключалася ў лавіраванні паміж сенатам, якому экзекуцыя правоў на зямельныя маёнткі была нявыгадная, і пасольскай ізбай — патрабавальнікам радыкальных экзекуцыйных рэформ.

Схільны да кампрамісных рашэнняў, Жыгімонт Аўгуст бачыў, што ні інкарпарацыя, ні захаванне соймавай аўтаноміі ВКЛ не з'яўляюцца прымальным для абодвух бакоў варыянтам заключэння уніі. Гэта выразна стала відаць пасля дыскусій на Варшаўскім сойме 1563/1564 гг. Гаспадар імкнуўся знайсці прымальнае для ўсіх рашэнне, якое б улічвала інтарэсы кожнага з бакоў[126].

У гэтых пошуках Жыгімонт Аўгуст усё ж такі падтрымаў польскі бок, зыходзячы з ідэі «аднаго цела і галавы Рэчы Паспалітай». Тым самым любое раздзяленне паўнамоцтваў вярхоўных органаў улады адкідвалася як спрэчнае з ідэяй супольнай дзяржавы. Аднак канкрэтныя пытанні, якія датычылі «правоў, вольнасцей, звычаяў», патрабавалі дакладнага юрыдычнага вырашэння. Найважнейшымі з гэтых пытанняў (якія былі згаданы ў рэцэсе Варшаўскага сойма 1563/1564 гг.) з'яўляліся: вызначэнне месца літвінаў у соймавай іерархіі, вызначэнне месца адбыцця соймаў і стварэнне на тэрыторыі ВКЛ соймікаў. Увогуле, надыходзіць разуменне, што адрозненні паміж дзяржаўна-палітычным уладкаваннем Кароны і Княства былі глыбейшымі, чым уяўлялася раней.

Пасля перамогі ў Ульскай бітве здавалася, што надышоў час для вырашальнага ўдару па непрыяцелю. На каронным сойме ў сакавіку 1565 г. Жыгімонт Аўгуст выказаўся за хутчэйшае завяршэнне вайны як за першачарговую задачу для абедзвюх дзяржаў, *«nie trwoniąc czasu, jak w upłynionym roku, swarami około zjednoczenia Litwy z Koroną»*[127]. Гаспадар разам з сенатам прапаноўваў неадкладна ўхваліць падаткі на ваенна-абарончыя мэты. На яго думку, ваеннае становішча перашкаджала

---

125 Pałucki W. Drogi i bezdroża skarbowości polskiej XVI i pierwszej połowy XVII wieku. Wrocław, 1974. S. 84–96; Sucheni-Grabowska A. Badania nad elitą władzy w latach 1551–1562 // Społeczeństwo staropolskie. T. 1. Warszawa, 1976. S. 80–81.

126 Агульнае бачанне уніі гаспадаром добра адлюстравана ў адным з яго лістоў да М. Радзівіла Рудога: *«Zarówno do spólnej zgody i miłości braterskiej jednemu nad drugiego nic nie dając za pomoca Bożą przywodzić chcemy, aby każdy przy swej uczciwości ostał»* (Listy. S. 541–544).

127 Commendoni J. Pamiętniki. T. 2. S. 114–115.

спакойна займацца ўнутрыпалітычнымі справамі, у прыватнасці, правесці супольны сойм, на якім магла быць нарэшце заключана унія[128].

У сваю чаргу, пасольская ізба клапацілася пра першачарговае распачынанне экзэкуцыі. Пасля яе рэалізацыі можна было б прыступіцца і да уніі. Навядзенне парадку ў Кароне, на думку земскіх паслоў, станоўча паўплывала б на стаўленне літвінаў да саюзу з Польшчай[129]. Нягледзячы на падобнае разыходжанне пазіцый, падаткі на ваенныя мэты былі ўхвалены.

У соймікавых інструкцыях, разасланых перад Люблінскім соймам 1566 г., Жыгімонт Аўгуст зноў заклікаў да абмеркавання праблем абароны ад маскоўскага непрыяцеля, заяўляючы, што гэта з'яўляецца супольнай справай і для Княства, і для Кароны. Падчас працы сойма ён супакойваў польскую шляхту тым, што *«jest Litwa chętna do unii»*[130]. Напэўна, тут ён спасылаўся на просьбу *«всих станов рыцерства»*, якая згадвалася ў соймавых лістах ВКЛ ад 22 сакавіка 1566 г.[131]

Ідэю заключэння уніі Жыгімонт Аўгуст не пакідаў увесь гэты час. Аднак планы па яе рэалізацыі мяняліся ў залежнасці ад палітычных абставін. Не трэба забываць, што аб'ектыўная сітуацыя на фронце прымушала звяртаць пільную ўвагу на праблемы абароны.

З сярэдзіны 1566 г. маскоўцы перайшлі да новай палітыкі замацавання на Полаччыне (гл. р. I, § 4). У гэтых абставінах заклікі радных паноў звярнуцца да ваенных праблем станавіліся надзвычай актуальнымі. У сярэдзіне 1566 г. Жыгімонт Аўгуст амаль што згубіў надзею на заключэнне уніі, бачачы нежаданне радных паноў ехаць на польскі сойм. Літоўскія магнаты прыкрываліся патрэбай заставацца ў Княстве, спасылаючыся на нечаканую актывізацыю маскоўцаў на захопленай тэрыторыі Полаччыны і Віцебшчыны[132].

Аднак ідэя уніі не была забыта. У гаспадарскіх інструкцыях для паслоў на павятовыя соймікі, датаваных 20 кастрычніка 1566 г., ясна ўказвалася, што ўзнаўленне перамоў аб уніі з Польшчай патрэбна *«ни для чого оно только для намов и ку постановенью о потужъной вальце не на ма-*

128 Dyaryusz sejmu... S. 232.
129 Ibid. S. 309–311.
130 Diariusz sejmu lubelskiego 1566 roku. S. 13.
131 Л ю б а в с к и й М. Литовско-русский сейм. С. 166 прил.
132 Гэтае меркаванне грунтуецца на інфармацыі О. Галецкага, які спасылаўся на знішчаныя падчас Другой сусветнай вайны дакументы з Бібліятэкі ардынацыі Красінскіх (сігнатура 4001): H a l e c k i O. Dzieje unii jagiellońskiej. T. 2. S. 216.

*лый час»*[133]. Пры гэтым гаспадар дадаваў, што ён, *«вси речи отложивши, ни о чом ином только о войне намовляти и становити на том сойме хочеть»*[134].

Як вядома, шырокамаштабная падрыхтоўка паспалітага рушэння ў 1567 г. не прывяла да значных і актыўных ваенных дзеянняў. Затое ў вайсковым лагеры падчас з'езда ў Лебедзеве шляхта падтрымала ідэю склікання супольнага з Каронай сойма[135].

Звернем пільную ўвагу на тое, што Жыгімонт Аўгуст заклікаў шляхту падтрымаць унію менавіта ў вайсковым лагеры, дзе голас шляхецкай масы меў асаблівую сілу. Карыстаючыся сучаснай тэрміналогіяй, можна сказаць, што ў Лебедзеве адбыўся своеасаблівы «шляхецкі рэферэндум».

Неўзабаве пасля заканчэння Лебедзеўскага з'езда гаспадар пакінуў войска. Чаму гэтак адбылося? Можа, таму, што галоўная для яго задача збору паспалітага рушэння была ўжо вырашана? На наш погляд, на такі сцэнарый указваюць паводзіны гаспадара. Жыгімонт Аўгуст не праяўляў шчырага жадання ўзначаліць войска і прывесці яго да перамогі над непрыяцелем. У вайсковы лагер ён прыбыў толькі ў верасні 1567 г., хоць збор шляхты пачаўся яшчэ ў траўні. Аднак і ўвесь восеньскі час шляхта бяздзейнічала. Паспалітае рушэнне, страціўшы спрыяльны час, было вымушана раз'ехацца па хатах, так і не атрымаўшы загаду гаспадара выступіць супраць непрыяцеля. Сярод пэўных колаў у ВКЛ існавалі падазрэнні, што Жыгімонт Аўгуст задумаў збор войска дзеля вымотвання апошніх сіл і сродкаў ВКЛ і прапаганды унійных ідэй сярод шляхецкіх масаў, а не для вядзення ваенных дзеянняў супраць Маскоўскай дзяржавы[136].

Так ці інакш, з гэтага часу заключэнне уніі было вырашанай справай. Адчайная ініцыятыва Я. Хадкевіча выкарыстаць паспалітае рушэн-

---

133 Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 180–182 прил.

134 Тамсама.

135 *«Якож на он час в Лебедеве вси станы тамошнего панства нашого великого князства Литовского, около того з собою намовивши и сполне и згодливе на то зволивши, нам, господару, донесли и оповедили, же ни с которое иное причины и якого мушенья, одно з доброе воли своее а с таковое ж хути и милости, з якою ся обыватели корунные, братья и суседы ваши, через послов своих ку вам оповедають, ест есте прихильни до принятья и постановенья з ними сполку братьского, то ест унии в таковом взвязку, милости, згоды братское, который бы был однако и заровно во всем пожиточный обеюм тым панствам»* (Любавский М. Литовско-русский сейм. С. 208 прил.; РИБ. Т. 30. С. 481).

136 Piwarski K. Niedoszła wyprawa... R. 5. Z. 14. S. 101.

не ў няўдалай аблозе Улы, здзейсненая ў лютым-сакавіку 1568 г., яшчэ больш падкрэсліла неэфектыўнасць шляхецкага апалчэння. Нават паспяховы штурм Улы, учынены Р. Сангушкам у жніўні 1568 г., не мог прынесці такіх палітычных дывідэндаў, як калісьці пасля перамогі ў Ульскай бітве 1564 г.

Заключэнню уніі, безумоўна, паспрыяла саспакаенне на ваенным фронце і паляпшэнне знешнепалітычнага становішча ВКЛ напрыканцы 60-х гг. XVI ст. З'явіліся магчымасці шчыльна звярнуцца да ўнутрыпалітычных спраў. У параўнанні з 1563 г. сітуацыя кардынальна змянілася: тады патрэбу уніі дыктавала ваенная небяспека, цяпер нават поспехі ў вайне не маглі прымусіць адмовіцца ад разгляду гэтага пытання. За гэты перыяд грамадства ўсвядоміла, што ВКЛ само не спраўляецца з наладжваннем абароны і фінансавымі выдаткамі на вайну. Гэта асабліва выразна стала відавочна пасля безвыніковага збору паспалітага рушэння ў 1567 г.

Пагаджаючыся на скліканне супольнага сойма, радныя паны імкнуліся атрымаць гарантыі захавання суверэнітэту ВКЛ. Такія гарантыі былі дадзены гаспадаром у прывілеі, падпісаным у Воіню ў снежні 1568 г. Жыгімонт Аўгуст абяцаў дбаць аб вышэйшых інтарэсах Княства, ні ў чым не парушаючы яго «правоў і вольнасцей»[137].

Праводзячы ў пачатку Люблінскага сойма 1569 г. перамовы з польскім бокам па сцэнарыі 1563 г., літоўскае пасольства на чале з М. Радзівілам Рудым не ўлічвала зменаў, якія адбыліся за гэтыя гады. А яны былі значнымі. Цяпер ВКЛ было падрыхтавана да заключэння уніі праз правядзенне ўнутраных рэформ. Самастойнае вядзенне Інфлянцкай вайны не прынесла значных зрухаў ваенна-стратэгічнага балансу на карысць Княства.

Змянілася палітычная сітуацыя ў дзяржаве. Уплыў М. Радзівіла Рудога як лідэра радных паноў не быў такім значным, як у яго брата ў пачатку 60-х гг. XVI ст. Да таго ж за гэты час вырас сур'ёзны сапернік у асобе Я. Хадкевіча, сімпатыі да якога з боку гаспадара былі відавочнымі.

Нежаданне цвяроза ацэньваць рэаліі прымусіла М. Радзівіла Рудога здзейсніць фатальную памылку: перарваць без выразных тлумачэнняў перамовы з польскім бокам і, што важней — з гаспадаром. Пэўна, такім шля-

[137] Akta unii Polski z Litwą 1385–1791 / Wyd. S. Kutrzeba i W. Semkowicz. Kraków, 1932. S. 189–192.

хам ён збіраўся атрымаць час для далейшага «ўзгаднення пазіцый». Радзівіл вярнуўся да старой практыкі зацягвання вырашэння унійнага пытання.

Аднак, маючы выразнае ўяўленне аб патрэбах дзяржавы і грамадскіх настроях, Жыгімонт Аўгуст вырашыў пераламаць ход падзей з дапамогай рэзкага і нечаканага ходу — адарвання ад ВКЛ памежных паветаў на захадзе і поўдні краіны. Праяўленая па сутнасці гвалтоўным чынам гаспадарская рашучасць паказала радным панам адсутнасць іншых варыянтаў вырашэння праблемы і прымусіла шукаць кампрамісныя выхады з крызіснай сітуацыі.

Грамадству ВКЛ цяжка было ўявіць магчымасць разрыву цесных зносін з Польшчай. Суіснаванне з Каронай працягвалася доўгі час, і насельніцтва ВКЛ прызвычаілася да свайго партнёра па дынастычнай уніі як да неабходнага элемента існавання дзяржаўнага арганізма. У варунках ваеннага становішча разрыў саюзных стасункаў з Польшчай здаваўся большай бядой за частковую страту суверэнітэту. Успомнім, што ў ВКЛ не было прынцыповых праціўнікаў уніі, бо ўсе разумелі, што без дапамогі Кароны супрацьстаянне з Масковіяй не будзе паспяховым. Змагаліся перадусім супраць таго, каб гэты саюз прыняў форму інкарпарацыйнай уніі. Падобныя прапановы польскіх экзекуцыяністаў не былі ўспрыняты ў ВКЛ як супярэчлівыя агульнадзяржаўным інтарэсам.

Падтрымка уніі з боку шляхты ажно да вясны 1569 г. насіла пасіўны характар, прытым з упэўненасцю можна казаць, што падтрымлівалася толькі ідэя памяркоўнай уніі[138]. Яе прыхільнікі прызнавалі неабходнасць злучэння дзвюх дзяржаў для эфектыўнай абароны агульных межаў, аднак адначасова стаялі за захаванне асобнасці Вялікага Княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай. Значную ролю адыгрывала таксама нежаданне аддаленых ад цэнтра і тэатра ваенных дзеянняў рэгіёнаў удзельнічаць у абароне чужых для іх інтарэсаў на ўсходнім памежжы ВКЛ і ў Інфлянтах[139].

Неабходнасць заключэння уніі з Польшчай была канчаткова ўсвядомлена ў ВКЛ у канцы 60-х гг. XVI ст. Яна дыктавалася ў першую чаргу

---

138 На нашу думку, менавіта падобныя погляды занатаваў назіральнік з Гданьска: Kolankowski L. Jagiellonowie a Unia // Pamiętnik VI powszechnego zjazdu historyków polskich w Wilnie 17–20 września 1935 r. T. 2. Lwów, 1936. S. 288–289.

139 Прыкладам, валынская шляхта на Люблінскім сойме 1569 г. выказвалася, што *«z nami* (г. зн. з ВКЛ) *unii mało potrzebują, bo już mają za swe y owszem za trudnoscz to sobie poczitają wielką — bronić nas od Moskwy»* (АСД. Т. 7. С. 38–39).

вычарпанасцю ўнутраных рэсурсаў ВКЛ і ў сувязі з гэтым — патрэбай знешняй падтрымкі для ўдзелу ў Інфлянцкай вайне.

Палітыка Рады на чале з Радзівіламі па зацягванні часу і сталым адкладанні унійных перамоў не прынесла станоўчых вынікаў і не атрымала грамадскай падтрымкі. У гістарыяграфіі пазіцыя Радзівілаў асацыявалася з пазіцыяй усёй магнацкай групы. Аднак гэта вельмі спрошчаны, а галоўнае — няслушны падыход. Нягледзячы на вядучае становішча Радзівілаў у Радзе і іх значны ўплыў на палітычныя падзеі ў краіне, магнатэрыя ў дачыненні да уніі не заўсёды салідарызавалася з імі. Гэта найбольш яскрава праявілася на Віленскім з'ездзе радных паноў у сакавіку 1569 г.[140]

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на тое, што расстаноўка сіл у барацьбе праунійных і антыунійных тэндэнцый не залежала наўпрост ад сацыяльнай стратыфікацыі і, насуперак сцвярджанням прыхільнікаў канцэпцый М. Любаўскага і О. Галецкага, мела характар чыста палітычнай, а не класавай (станавай) барацьбы. Не выключаючы з-пад увагі самога факта існавання пэўнага напружання палітычных інтарэсаў магнацтва і сярэдняга шляхецтва, трэба адзначыць разуменне з боку ўсяго «палітычнага народа» ВКЛ агульнадзяржаўных інтарэсаў, увасобленых у ідэі захавання суверэнітэту.

У гэтай барацьбе шляхта, абапіраючыся на сваю масавасць, з'яўлялася магутным чыннікам уплыву на палітычныя працэсы. Аднак яе нельга назваць самастойным суб'ектам палітыкі, у адрозненне ад гаспадара і магнацкіх груповак. Адной з найважнейшых задач для іх было змаганне за ўплыў на шляхту, што дазволіла б атрымаць сур'ёзную апору для рэалізацыі ўласных палітычных планаў.

[140] Halecki O. Przyłączenie Podlasia, Wołynia i Kijowszczyzny do Korony w roku 1569. Kraków, 1915. S. 82–122.

## § 3. Насельніцтва памежных тэрыторый ВКЛ у ваенны час: стаўленне да вайны, узаемадзеянне з уладамі, дэмаграфічная сітуацыя

Паўночна-ўсходні рэгіён ВКЛ быў зонай бесперапынных ваенных канфліктаў паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай. Ваенныя дзеянні не абмінулі яго і ў гады Інфлянцкай вайны. Змена палітычных абставін, выкліканая захопам маскоўцамі Полацка і вялікай часткі Полацкай зямлі ў 1563 г., стварыла для мясцовага насельніцтва новыя, надзвычай экстрэмальныя варункі жыццядзейнасці.

Як уплывала ваеннае становішча на жыццё людзей? Як жыхары Полаччыны паставіліся да новай улады? Які характар і формы прынялі ўзаемадачыненні паміж маскоўцамі і палачанамі? Гэтыя важныя пытанні патрабуюць свайго асобнага разгляду.

Адразу пасля захопу Полацка маскоўскі цар Іван IV выдаў новапрызначаным полацкім ваяводам «наказную память», у якой вызначаліся асноўныя прынцыпы і метады кіравання горадам. Гэты дакумент яскрава адлюстроўвае характар стаўлення маскоўскай улады да мясцовых жыхароў.

Маскоўскае кіраўніцтва ў першую чаргу турбавала аднаўленне абарончых умацаванняў, а таксама адбудова пагарэлага горада. Усталёўваўся строгі прапускны рэжым для мясцовага насельніцтва[141]. У «городе» (г. зн. у замку) з ліку мясцовых жыхароў маглі жыць толькі праваслаўныя святары з сем'ямі. Шляхціцам і мяшчанам, якія жылі ў пасадскай частцы горада, катэгарычна забаранялася мець зброю. На царкоўныя святы ўваход палачан у крэпасць дазваляўся толькі пры захаванні надзвычайных мер бяспекі. За мясцовым насельніцтвам усталёўваўся сапраўдны паліцэйскі нагляд[142]. У выпадку выяўлення «шатости» падазроных прадпісвалася адсылаць у Пскоў, Ноўгарад і Вялікія Лукі.

Разам з «палітыкай бізуна» маскоўцы практыкавалі і «палітыку перніка». Кіраванне павінна было ажыццяўляцца, *«роспрося про здешние всякие обиходы, как у них обычаи ведутца, да с их обычея сперва*

[141] *«...А литовских людей в город, приезжих и тутошних, детей боярских, и землян, и черных людей, однолично не пущати»* (Книга полоцкого похода. С. 71).

[142] *«...Береженье им над теми людми держати великое, и велети смотрити и примечати, не будет ли в них какие шатости и ссылок с литовскими людми»* (Тамсама).

*и судити и управы им в городе давати»*[143]. Маскоўская адміністрацыя не змяніла ставак мытных збораў пры знешнегандлёвых аперацыях, таксама як і велічынь падаткаў.

Новыя гаспадары не адчувалі сябе ўпэўнена на акупаванай тэрыторыі. Для забеспячэння ўласнай бяспекі ў горадзе быў пабудаваны Ніжні замак, які адмежаваў маскоўцаў ад выселенага ў Запалоцце мясцовага насельніцтва[144].

Маскоўцы не давяралі палачанам і праводзілі выразную мяжу паміж сабой і мясцовым насельніцтвам пры акрэсленні правоў і абавязкаў перад новай уладай, якая мела ўсе істотныя рысы акупацыйнага рэжыму. Створаны ў савецкія часы міф пра «вызваленчую місію» маскоўскага войска не вытрымлівае ніякай праверкі канкрэтнымі гістарычнымі фактамі[145].

Пра гэта сведчаць і іншыя звесткі з крыніц. У першыя гады свайго знаходжання на Полаччыне маскоўцы праводзілі акцыі па прывядзенні да прысягі на вернасць маскоўскаму цару тутэйшага насельніцтва. З гэтай мэтай у даволі адлеглыя ад Полацка мясцовасці накіроўваліся ўзброеныя атрады.

Акрамя прысягі, новым уладам было важна дакладна акрэсліць для сябе межы Полацкага «павета». Інфармацыі на гэты конт не хапала. Так, пасланыя на разведку межаў Васіль Нізаўцоў і Іван Кікін не здолелі іх высветліць з прычыны непрыхільнасці мясцовага насельніцтва[146].

На дапамогу маскоўцам прыйшлі мясцовыя інфарматары ў асобах пратапопа Феафана і яго зяця Рыгора Шчытава. Звесткі, пададзеныя імі, вызначылі кірункі маскоўскіх «посылок» — у бок Дрысы, Беразвеча і Лукомля. Гэтыя выправы насілі выразны характар карна-застрашальных мерапрыемстваў. Сялянам не заставалася іншага выйсця, як уцякаць ад непажаданых гасцей. Маскоўскія ваяводы дакладвалі цару пра адыход насельніцтва з паселішчаў[147].

Жыхары Полаччыны з непрыязнасцю ставіліся да маскоўскіх вайскоўцаў, у зручных выпадках аказваючы ім супраціўленне. У адной з ма-

---

143 Тамсама. С. 72.
144 Т а р а с а ў С. Полацк IX–XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія. Мн., 1998. С. 50–52.
145 Гл.: Гісторыя Беларускай ССР / Пад рэд. В. П е р ц а в а . Т. 1. Мн., 1955. С. 86; История Белорусской ССР. Мн., 1977. С. 55.
146 ПКМГ. Ч. 1. Отд. 2. С. 435–436.
147 *«...Вспрашивати некого: люди, государь, все розошлись»* (Тамсама. С. 436).

скоўскіх грамат красамоўна адлюстраваны адносіны мясцовага насельніцтва да чужынцаў: *«В которые, государь, места посылали посылку детей боярских человек по десеть и по двадцать, и Литовские люди бегали и сыскати некем, а в которые места посылали детей боярских человека по три, по четыре, и тех детей боярских имали и побивали, а которых Литовских людей из далных мест к нам приводили, и мы тех людей сами выпрашивали, и те люди про рубежи сказывають не одни речи...»*[148]. Са свайго боку ў дачыненні да непаслухмяных палачан маскоўскія ўлады прымянялі жорсткія рэпрэсіўныя меры: *«Которые люди Полотцсково повету воеводам непослушны были и воеводы по их вине их казнили»*[149].

У маскоўцаў адсутнічалі эфектыўныя сродкі для кантролю за аддаленымі ад Полацка тэрыторыямі Полацкага ваяводства. Як толькі маскоўскія жаўнеры адыходзілі, сяляне адмаўляліся падпарадкоўвацца новым уладам[150]. Згодна з інфармацыяй літоўскай разведкі, маскоўцы збіраліся абыходзіцца з непакорлівымі сёламі вельмі жорстка[151].

Разумеючы, што звычайным прывядзеннем да прысягі паселішчы левабярэжнай Полаччыны не ўдасца надзейна ўтрымліваць у сваіх руках, маскоўцы перайшлі да новай палітыкі. Улетку 1566 г., выкарыстоўваючы перамірны час, яны распачалі будаўніцтва невялікіх замкаў уздоўж лініі супрацьстаяння з літвінамі. Яны павінны былі служыць умацаванымі пунктамі апоры для маскоўскай улады ў навакольнай мясцовасці (гл. р. I, § 4). Мяркуючы па ўсім, будаўніцтва замкаў на тэрыторыі Полаччыны магло распачацца і раней, аднак гэтаму перашкодзіла эпідэмія чумы, якая пранеслася па тэрыторыі паўночна-ўсходняй Беларусі ў 1565–1566 гг.

У ваколіцах новаўзведзеных замкаў мясцовае насельніцтва было вымушана падпарадкоўвацца новай уладзе[152]. Іншага выхаду ў яго і не

---

148 ПКМГ. Ч. 1. Отд. 2. С. 437.

149 ПСРЛ. Т. 29. С. 325.

150 Інфарматары аршанскага старасты Ф. Кміты дакладвалі, што *«села, в которыи воеводове Полоцкие скоро по взятю Полоцка везде мели, а тепер дей оттол зрада через шпекги Вашей Милости Гетманской* (маецца на ўвазе Р. Сангушка. — *А. Я.*) *и тамошних старых им се деет...»* (AS. T. 7. S. 155–156).

151 *«Всих там мешкаючих людей вытратит, жоны и дети вырезат, праве то все знисчит, абы племе ни жаден тых се не зостал»* (Ibid. S. 155–156).

152 Гэтак адбылося ў ваколіцах збудаванага маскоўцамі замка Коп'е (Суша): *«А которые люди тутошние жилцы, и те приложилися к городу государю царю и великому князю служити»* (ПСРЛ. Т. 29. С. 355).

было. Сталая прысутнасць вайскоўцаў забяспечвала аператыўны кантроль над акругай. Сяляне — пад прымусам ці не — падпарадкоўваліся той уладзе, якая была побач. Ім было, па вялікім рахунку, усё адно, якую дзяржаву яна рэпрэзентавала, галоўнае, каб яна эфектыўна забяспечвала стабільныя ўмовы жыццядзейнасці. Да таго ж паводзіны жаўнераў з таго ці іншага боку мала адрозніваліся — сяляне цярпелі здзекі і рабункі і ад маскоўцаў, і ад літвінаў.

Адметнай ілюстрацыяй падобных высноў можа паслужыць адзін цікавы ліст ротмістра Марціна Яцыніча да польнага гетмана Р. Сангушкі ад 5 верасня 1567 г., прысвечаны стаўленню сялянства да маскоўскіх і літоўскіх жаўнераў. Па словах ротмістра, жыхары сёлаў Харкевічы, Быстрыя, Парэчча, Сляшчынічы (усе яны знаходзіліся на рацэ Дзвіна) адкрыта спрыялі маскоўцам[153]. Прычынамі гэтага, мяркуючы па тэксце ліста, былі гарантыі бяспекі з маскоўскага боку. У прыватнасці, такой гарантыяй было ўкрыццё ў замку на выпадак небяспекі[154].

Гэтыя звесткі яскрава паказваюць, якой складанай і супярэчлівай была сітуацыя для мясцовага насельніцтва ў зоне баявых дзеянняў. Пры вельмі складанай для сялян ідэнтыфікацыі літоўскай і маскоўскай улады па прынцыпу «свая-чужая» (бо і па моўных, і па этнаканфесійных, і па ментальных прыкметах жыхары абедзвюх дзяржаў мелі шмат агульных рысаў) выбар паміж імі быў розным у кожным асобным выпадку і залежаў ад канкрэтных дзеянняў вайскоўцаў.

На наш погляд, наўрад ці можна знайсці ў матывацыях паводзін сялянства элементы абстрактна-ідэалагічнага патрыятызму. Праявы патрыятызму сярод сялян часцей за ўсё мелі форму захавання вернасці свайму гаспадару-землеўладальніку. Яны часта аказвалі сваім панам разведачныя паслугі. Прыкладам, Б. Корсак атрымліваў звесткі аб руху і планах маскоўскіх жаўнераў з вуснаў сваіх падданых з-пад Сушы[155]. У студзені 1564 г., калі адбылася знакамітая Ульская бітва, інфармацыю пра рух маскоўскага войска таксама далі мясцовыя сяляне. Яны прымалі не-

153 *«...Ведаючи тых, которые ж есще господару своему и нам всим сприят на их домы Москвы навели, хотечи их поймат, ач самых не поимали, але што застали в тых домех, то все побрали...»* (AS. T. 7. S. 190–191).

154 *«...Скоро збоже с поля знявшы, з жонами и з детми там* (у замак) *пойдут, а некоторые уже и жоны там мают»* (Ibid. S. 190–191).

155 Ibid. S. 202.

пасрэдны ўдзел у яго разгроме. Ёсць сведчанні, што галоўнага маскоўскага ваяводу П. Шуйскага забіў сякерай тутэйшы селянін[156].

Верагодней за ўсё, дзяржаўныя ўлады і ВКЛ, і Маскоўскай дзяржавы разглядалі сялянства пераважна як пасіўны аб'ект палітычнага дзеяння і не цікавілася яго стаўленнем да палітычных падзей.

Няма ніякіх звестак, каб маскоўскія ўлады праводзілі ў дачыненні да сялянства нейкія ідэалагічныя акцыі з мэтай схілення яго на свой бок. З вялікай доляй упэўненасці можна сцвярджаць, што яны не бачылі ў гэтым патрэбы, ставячыся да сялян як да інертнай масы, якая не ўплывае на характар і развіццё ваенных падзей і палітычных працэсаў.

Прыпісваць сялянству жаданне «далучыцца да Расіі» тым больш некарэктна. Што магло прыцягнуць позіркі сялян на Усход? Канфесійнае адзінства? Аднак большасць шляхціцаў-землеўладальнікаў Полаччыны і Віцебшчыны з'яўляліся праваслаўнымі. Тое ж самае можна сказаць пра моўную і культурную блізкасць. Таму ад змены дзяржаўнай прыналежнасці, па сутнасці, для іх у гэтым плане нічога не змянялася. А вось змена «пана», а разам з гэтым — парушэнне «старыны», маглі абярнуцца радыкальнымі пераменамі ў жыццёвым укладзе селяніна.

Беручы пад увагу спецыфіку месца сялянства ў структуры грамадства, яго ролю ў тагачасным палітычным жыцці і характар успрымання ім палітычнай рэальнасці, нельга казаць аб нейкіх абстрактна-ідэалагічных асновах яго калектыўнай свядомасці і паводзін. Савецкая гістарыяграфія пры аналізе гэтых з'яў аўтаматычна пераносіла рэаліі XX ст., не ўлічваючы спецыфікі месца сялянства як сацыяльнай структуры ў саслоўным грамадстве і яго адмысловай ролі ў палітычным жыцці сярэднявечнай дзяржавы.

Не менш супярэчлівым і складаным было стаўленне да вайны гарадскога насельніцтва. Блізкасць мяжы і непасрэдная пагроза ваенных удараў з боку маскоўцаў прымушала жыхароў гарадоў шукаць розныя варыянты забеспячэння сваёй бяспекі. Напрыклад, улетку 1563 г. у Мсціславе мясцовая шляхта і мяшчане прасілі гаспадарскую ўладу перасяліць іх дзяцей і жонак далей ад мяжы. Гаспадар вызначыў ім новае месца пражывання ў Свіслачы — мястэчку на рацэ Бярэзіна[157].

---

156 Gwagnini A. Kronika. S. 109.
157 АЛРГ. Т. 2. С. 149–151.

Экстрэмальныя ўмовы жыццядзейнасці асабліва моцна адбіваліся на стаўленні мяшчан да абавязкаў па ахове і абароне сваіх паселішчаў. Надзвычай кантраснымі выглядаюць у гэтым плане паводзіны жыхароў Дзісны, Віцебска і Оршы.

У пачатку 1566 г. Жыгімонт Аўгуст выдаў прывілей аб стварэнні каля Дзісенскага замка «места» і наданні яго жыхарам разнастайных ільгот у сферы гандлю і падаткаабкладання тэрмінам на восем гадоў. За гэта дзісенскія мяшчане павінны былі пабудаваць «острог» вакол горада і несці павіннасці, звязаныя з абаронай Дзісны ад непрыяцеля[158].

Аднак у сувязі з прызначэннем новых мытна-акцызных паборaў гэты прывілей у канцы 1566 г. падлягаў скасаванню[159]. У адказ дзісенскі староста Б. Корсак і мясцовыя ротмістры паведамлялі ў Вільню, што дзісенскія мяшчане праяўляюць высокую актыўнасць, вынікам чаго стала пабудова астрога і іншых абарончых умацаванняў, уважлівы нагляд за іх станам, добраахвотная і старанная ахова замка, надзейнае забеспячэнне жаўнераў правіянтам і інш. Прымаючы гэта пад увагу, Жыгімонт Аўгуст аднавіў дзеянне прывілею[160].

Можна меркаваць, што ўзаемадачыненні паміж мяшчанамі Дзісны і мясцовым вайсковым гарнізонам былі лаяльнымі і талерантнымі. У далейшым дзісенцы добраахвотна выконвалі свае павіннасці, што ў немалой ступені паслужыла падставай для надання гораду ў 1569 г. магдэбургскага права[161]. Спрыянне з боку ўлады, а таксама добрыя стасункі з жаўнерамі стваралі ўмовы для адпаведнага пазітыўнага стаўлення насельніцтва да сваіх абарончых функцый.

Неабходна адзначыць, што падставамі для падобных канструктыўных зносін маглі быць, па-першае, асоба Б. Корсака, які карыстаўся вялікім аўтарытэтам на Полаччыне, і, па-другое, наяўнасць у Дзісне значнай колькасці полацкіх бежанцаў, якія цудоўна разумелі, што ад стану ўмацаванняў горада залежыць іх уласная бяспека[162].

Падобныя крокі дзяржаўныя ўлады рабілі і ў дачыненні да іншых гарадоў, якія знаходзіліся ў зоне баявых дзеянняў. Яны добра ўсведамлялі, што дадатковыя стымулы для мяшчан могуць быць найлепшай га-

158 МВКЛ. Кн. 44. С. 106–107.
159 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 92 адв. — 93.
160 Тамсама. Спр. 266, арк. 120–121адв.; Гл. таксама.: Тамсама. Спр. 267, арк. 123–124 адв.
161 LM. Kn. 51. P. 226–230.
162 H e d e m a n n O. Dzisna i Druja magdeburskie miasta. Wilno, 1934. S. 15–24.

рантыяй забеспячэння гарадской абароны. Напрыклад, у 1566 г. Вараноч, а ў 1568 г. — Лепель былі вызвалены ад выплаты ўсіх падаткаў і пабораў тэрмінам адпаведна на 12 і 15 гадоў. Гэтае рашэнне было выклікана таксама імкненнем заахвоціць жыхароў ВКЛ перасяляцца ў гэтыя гарады, дзе падчас Інфлянцкай вайны былі збудаваны замкавыя ўмацаванні. Землеўладальнікі павінны былі адпускаць на волю тых сялян, якія выкажуць намер пераехаць сюды [163].

У Віцебску справы выглядалі інакш. У жніўні 1566 г. кіраўніцтвам ВКЛ было прынята рашэнне для лепшай абароны горада перанесці частку пасада за раку Віцьба і пабудаваць там астрог. Гэтае рашэнне не было ўспрынята станоўча віцебскімі мяшчанамі. Жыгімонт Аўгуст загадаў мясцоваму ваяводзе С. Пацу прыняць усе належныя меры, у тым ліку і прымусовага характару, для заканчэння будаўніцтва астрога да зімы. У якасці заахвочвання абвяшчалася, што ўсе жадаючыя выконваць гэтую працу будуць вызвалены ад выплаты пагалоўшчыны[164]. Аднак падобныя захады ўладаў не заўсёды дапамагалі, аб чым віцебскі ваявода паведамляў гаспадару[165]. Увогуле ж, дзеяннямі дзяржаўных ураднікаў жыхары Віцебска былі задаволены не заўсёды[166].

Стасункі віцебскіх мяшчан з найманымі жаўнерамі мясцовага гарнізона таксама не былі добрымі і насілі форму працяглага адкрытага канфлікту. Мяшчане не раз скардзіліся на прымусовыя рэквізіцыі харчавання і іншай маёмасці, гвалтоўныя наезды на іх дамы[167].

Няпростымі былі ўзаемадачыненні з наймітамі і ў віцебскага ваяводы. Найманыя жаўнеры не жадалі яму падпарадкоўвацца і рабіць справаздачы пра ўласныя злоўжыванні[168]. Асабістымі ворагамі С. Паца былі ротмістры С. Вазніцкі і Я. Вількоўскі, якія, па словах ваяводы, не толькі не выконвалі яго распараджэнні, але і нават супрацьдзейнічалі яму[169].

---

163 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 266, арк. 64–64 адв., 323–323 адв., 328–328 адв.

164 Тамсама. Спр. 47, арк. 59–59 адв. Гл. таксама: АЛРГ. Т. 2. С. 203.

165 *«О великом непослушенстве шляхты и земян тамошних, иж никоторое дбалости и чуиности в потребах тамошних украинных не маеть...»* (НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 71 адв. — 72).

166 Тамсама. Спр. 38, арк. 424–425 адв.; РИБ. Т. 30. С. 530–531.

167 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 47, арк. 58–59; АЛРГ. Т. 2. С. 194, 204.

168 НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 45, арк. 112–113 адв.; АЛРГ. Т. 2. С. 195.

169 *«...Zamek othworzil dla budowania, zostawiwszy mi na zamku samego, tilko służebnemy mojemy, a pana Alexandra Wlocha* (Гваньіні?) *przi mnie, y grodniczy, y nieco szlachty»* (AGAD. Archiwum Publiczne Potockich. Sygn. 9. T. 1. K. 13–14).

Іх служба ў Віцебску ацэньвалася даволі песімістычна: *«Za taką sprawa ich mogę rzec, Miłosciwie Panie, niecnotliwą, bichmy zamku owego nie otkazili»*[170].

Сучасны беларускі даследчык Максім Макараў звярнуў увагу на спецыфічную мадэль гарадскога права ў Віцебску. Яе асаблівасці вынікалі са сталай ваеннай пагрозы для горада[171]. Паводзіны мяшчан падчас Інфлянцкай вайны пацвярджаюць гэтую гіпотэзу. Вядома пра іх сталы ўдзел у ваеннай службе (г. зв. «конныя мяшчане»)[172]. Без перабольшання, гэты занятак мяшчане лічылі сваім прывілеем, які ўмацоўваў іх сацыяльна-палітычную вагу. З іншага боку, жыхары Віцебска, безумоўна, разумелі, што ўласная бяспека перш за ўсё залежыць ад іх саміх.

А вось у Оршы мясцовае мяшчанства інертна ставілася да абароны ўласнага горада. У чэрвені 1567 г. ротмістр Б. Сяліцкі паведамляў аршанскаму старасце Ф. Кміце пра ненадзейную сітуацыю ў горадзе і вельмі складанае становішча з забеспячэннем абароны. Скардзячыся на недахоп жаўнераў, ён адзначаў, што на аршанскіх мяшчан нельга спадзявацца ў выпадку аблогі замка непрыяцелем[173].

Сярод ураднікаў замкаў на ўсходзе ВКЛ выразна адчуваліся глыбокія песімістычныя настроі, выкліканыя перадусім кепскім забеспячэннем абароны з боку цэнтра. Памежныя тэрыторыі заставаліся сам-насам з непрыяцелем, не маючы надзеі на аператыўную і эфектыўную дапамогу звонку.

Ці ўзнікалі пры такім стане рэчаў у мяшчанскім асяроддзі здрадніцкія настроі? На тое, што пэўныя сімпатыі да маскоўцаў існавалі, указвае факт выкрыцця ў сярэдзіне 1567 г. маскоўскіх шпегаў у Оршы і Дуброўне. Імі аказаліся мясцовыя мяшчане Мікула і Клім. Найвышэйшы гетман ВКЛ Р. Хадкевіч быў асабліва ўстрывожаны сітуацыяй у Дуб-

170 Ibidem.

171 Makarau M. Witebskie prawo miejskie w XVI wieku // Zapiski Historyczne. 2003. T. 68. Z. 1. S. 1–17.

172 Лаппо И. К истории сословного строя Великого княжества Литовского. Конные мещане Витебские в XVI столетии // Сборник статей, посвященных В. О. Ключевскому. М., 1909. С. 254–276.

173 *«...Естли же тръвога якая будеть, а придет ли до осажаня замку, то вем добре, иж мещане тутошние [ани] мене, ани подстаростего вашей милости слухати не будут, волит инъшый в лес, анижли в замок. Не сподевамся от них ратунку и помочы правдивое...»* (AS. T. 7. S. 170–172).

роўне, дзе мясцовыя жыхары адмаўляліся падпарадкоўвацца распараджэнням аршанскага старасты[174].

Цэнтральныя ўлады не рашыліся выкарыстаць у дачыненні да непакорлівых дубровенцаў жорсткія меры рэпрэсіўнага характару, баючыся, напэўна, змянення грамадскіх настрояў у рэгіёне не на сваю карысць[175]. Цікава пры гэтым адзначыць, што ў Дуброўне не было вайсковага гарнізона, які б нёс апорна-абарончыя функцыі, з прычыны чаго, верагодна, дубровенцы мелі магчымасць больш адкрыта выяўляць сваё непрыязнае стаўленне да дзеянняў уладаў ВКЛ.

Было б занадта смела, а галоўнае — бяздоказна казаць пра масавыя прамаскоўскія сімпатыі насельніцтва паўночна-ўсходняй Беларусі. Выпадак з Клімам з Дуброўны з'яўляецца адзінкавым і можа сведчыць пра своеасаблівую «вайну разведак», якая, безумоўна, існавала. З упэўненасцю можна сказаць, што падобныя сімпатыі былі б занатаваны ў актавых матэрыялах Метрыкі ВКЛ і перапісцы паміж найвышэйшымі ўраднікамі ВКЛ. Аднак гэткіх сведчанняў у крыніцах няма. Справы, звязаныя з дзейнасцю шпегаў і дзяржаўнай здрадай, разбіраліся ўладамі ВКЛ вельмі сур'ёзна і дэталёва. Прыкладам такога разбору з'яўляецца абвінавачванне ў здрадзе віцебскага войта Сямёна Лускіны, які ў канчатковым выніку здолеў апраўдацца[176].

Для разумення становішча насельніцтва ў зоне баявых дзеянняў важнай праблемай з'яўляецца характарыстыка дэмаграфічнай сітуацыі на тэрыторыі Полаччыны. Маскоўскія замкі, якія будаваліся тут з 1566 г., акрамя ахоўна-абарончых функцый, выконвалі задачу заслона ад патэнцыяльных нападаў літвінаў. Гэта, у сваю чаргу, стварала неабходныя ўмовы для правядзення гаспадарчай каланізацыі беларускіх зямель.

У перамірных граматах 1570 г. былі больш-менш дакладна акрэслены межы, якія падзялілі маскоўскую зону ўплыву ад тэрыторыі ВКЛ[177]. Дзякуючы перамір'ю маскоўцы атрымалі гарантаваную ўпэўненасць у валоданні захопленай тэрыторыяй Полацкага ваяводства. І хоць гэтая

---

174 AS. T. 7. S. 133–134.

175 Ibid. S. 178.

176 Судовая справа распачалася з прычыны выказвання С. Лускіны, што *«найдем мы собе инъшого пана, хто нас будеть боронить»*. Войт здолеў даказаць, што гэтыя словы адносіліся не да гаспадара, а да ротмістра Яна Паўчыча, які адмаўляўся служыць: НГАБ, ф. КМФ–18, воп. 1, спр. 39, арк. 723 адв. — 728.

177 Книга посольская. Т. 1. С. 290–310; РИО. Т. 71. С. 724–742.

мяжа ўвесь час парушалася рэйдамі літвінаў, тры гады без адкрытых ваенных дзеянняў для іх былі забяспечаны.

Надыход мірнага часу прывёў да гаспадарчай актывізацыі маскоўцаў на Полаччыне. Яшчэ ў канцы 60-х гг. XVI ст. на паўночных абшарах Полацкага краю — бліжэйшых да Пскоўшчыны і найбольш аддаленых ад цэнтральных раёнаў ВКЛ — праводзілася раздача зямельных надзелаў («поместий») службовым людзям. Яна адлюстравана ў маскоўскіх пісцовых кнігах[178]. Найбольш поўныя запісы па Полацкім ваяводстве захаваліся за 1570 г.

Маскоўскія ўлады правялі свой тэрытарыяльны падзел у паўночнай частцы Полаччыны. М. Аглоблін зрабіў спробу прыкладна ўзнавіць межы воласцей, дадзеныя па якіх сустракаліся ў пісцовых кнігах. Дзякуючы зробленай гэтым расійскім даследчыкам працы па лакалізацыі паселішчаў параўнаўчы аналіз гаспадарчай і дэмаграфічнай сітуацыі ў паўночнай Полаччыне можна правесці не толькі па статыстычных параметрах, але і ў прывязцы да геаграфічнага месцазнаходжання воласцей, што з'яўляецца, як будзе паказана далей, немалаважным пры характарыстыцы праблемы.

Сярод указаных у пісцовых кнігах паселішчаў можна вылучыць тры віды паводле класіфікацыі М. Аглобліна: населеныя пункты (пазначана наяўнасць двароў і людзей), «пустыя» пункты (маюцца ўказанні на тое, што нядаўна пакінула насельніцтва, як нам падаецца — на працягу папярэдніх некалькіх гадоў) і *«пустоши»* разам з *«селищами»* (пункты, у якіх знікла не толькі насельніцтва, але і ўсялякія сляды жытла, што сведчыць пра іх працяглую (магчыма 40–50-гадовай даўнасці) занядбанасць)[179]. Праблематычным, на наш погляд, з'яўляецца ўключэнне ў лік нядаўна пакінутых пунктаў такіх азначэнняў як *«деревни без дворов»*, *«починки без дворов»*, пустошаў, *«что были села, деревни и починки»*. Больш слушным з'яўляецца вылучэнне для падобных тэрмінаў чацвёртай класіфікацыйнай графы, прамежкавай паміж апусцелымі паселішчамі і пустошамі, якая б характарызавала колькасць пунктаў, пакінутых на працягу папярэдніх дзесяці гадоў. Гэта дазволіць больш

[178] ПКМГ. Ч. 1. Отд. 2. С. 424–550. Гэты важны дакументальны матэрыял быў выкарыстаны ў свой час Мікалаем Аглоблінын пры стварэнні карты Полацкага павета ў другой палове XVI ст.: Оглоблин Н. Объяснительная записка к карте Полоцкого повета в 2-й половине XVI-го века. // Сборник археологического института. Кн. 3. Отд. 2. СПб., 1880. С. 3–53; Кн. 4. Отд. 2. СПб., 1880. С. 3–75.

[179] Оглоблин Н. Объяснительная записка... Кн. 3. Отд. 2. С. 18–24.

дакладна акрэсліць характар міграцыйных працэсаў на поўначы Полаччыны падчас побыту маскоўцаў (гл. табл. 4.3.1).

Трэба мець на ўвазе, што інфармацыя пісцовых кніг не носіць абсалютнага характару і прыдатная ў якасці дакладнай крыніцы толькі для параўнаўчых супастаўленняў.

Сярод дзевяці рэпрэзентаваных у іх полацкіх воласцей найбольшую плошчу займала Пакроўская валасць, якая знаходзілася на самай поўначы Полаччыны — далей за ўсё ад Полацка. Гэтым можна патлумачыць некаторыя найвялікшыя паказчыкі, якія характарызуюць мясцовую дэмаграфічную сітуацыю і стан асвоенасці ворыўных зямель. Натуральна, што на большай плошчы размяшчалася і большая, чым у астатніх валасцях, колькасць паселішчаў, наданняў памешчыкам і насельніцтва, якое трапіла пад уладу новых землеўладальнікаў.

Табліца 4.3.1.

*Структура паселішчаў паўночнай Полаччыны*
*па ступені заселенасці ў 1570 г.*

| Назва воласці | Колькасць населеных пунктаў | | Колькасць «пустых» пунктаў | | Колькасць пунктаў без слядоў жытла | | Колькасць пустошаў і селішчаў | | Сума | Колькасць людзей у раздадзеных памесцях |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | адз. | % | адз. | % | адз. | % | адз. | % | адз. | чал. |
| Дрысецкая | 12 | 19,7 | 7 | 11,5 | 30 | 49,2 | 12 | 19,7 | 61 | 17 |
| Межаўская | 2 | 3,6 | 4 | 7,3 | 5 | 9,1 | 44 | 80 | 55 | 2 |
| Непаротаўская | 18 | 29,5 | 2 | 3,3 | 1 | 1,6 | 40 | 65,6 | 61 | 10 |
| Нішчанская** | 35 | 53,8 | 7 | 10,8 | 5 | 7,7 | 18 | 27,7 | 65 | 30 |
| Няведарскі Кубак | 21 | 29,6 | 5 | 7 | ? | 0 | 45 | 63,4 | 71 | 28 |
| Няведрынская | 27 | 34,2 | 10 | 12,7 | 2 | 2,5 | 40 | 50,6 | 79 | 31 |
| Няшчэрдаўская* | 31 | 15,9 | 13 | 6,6 | 17 | 8,7 | 134 | 68,7 | 195 | 10 |
| Пакроўская | 103 | 42 | 9 | 3,7 | 16 | 6,5 | 117 | 47,8 | 245 | 146 |
| Турунтаўская* | 33 | 47,8 | 2 | 2,9 | 20 | 29 | 14 | 20,3 | 69 | 30 |
| **Усяго** | **282** | **31,3** | **59** | **6,5** | **96** | **10,7** | **464** | **51,5** | **901** | **304** |

**Заўвагі:**

1. * — уключаны таксама пункты з пісцовай кнігі N 2 (1568 г.).

2. ** — сярод паселішчаў маюцца 4 тыпу «1 двор + 1 пусты двор». Яны ўключаны ў лік населеных пунктаў.

*Табліца складзена паводле:* ПКМГ. Ч. 1. Отд. 2. С. 455–539.

Геаграфічнае становішча спрыяла маскоўскай каланізацыі ў гэтай воласці. Верагоднасць нападаў з літоўскага боку была вельмі нізкай з прычыны аддаленасці ад лініі фронту. Таму гэты раён быў адносна бяспечным для гаспадарчай дзейнасці.

Тут назіраецца найбольшая колькасць «пожалований», хоць палова з іх і былі дробнымі. З 245 паселішчаў 103 было заселена. Дастаткова вялікай была колькасць пустошаў (117 (47,8%)). Гэтую з'яву можна патлумачыць тым, а гэта да маскоўскай акупацыі раён Пакроўскай воласці займаў памежнае становішча, што заўсёды было прычынай нестабільнай жыццядзейнасці[180]. Немалую ролю адыгрывалі, напэўна, і кепскія прыродныя ўмовы для вядзення земляробства (у першую чаргу, неўраджайныя глебы).

Уражвае значная колькасць раздадзеных памешчыкам сялян. Яна сведчыць аб дастаткова шчыльным засяленні, хоць, як і ў астатніх воласцях, колькасць двароў у сёлах Пакроўскай воласці зрэдку перавышала 1–2 адзінкі[181].

Вялікія абсалютныя лічбы па Пакроўскай воласці не павінны ўводзіць у зман (улічваючы яе значную плошчу), аднак трэба прызнаць, што гэты раён (у які, акрамя Пакроўскай, трэба ўключыць Непаротаўскую воласць і воласць Няведарскі Кубак) меў самыя спрыяльныя ўмовы для гаспадарчага асваення з маскоўскага боку. Пра гэта сведчыць і факт аднаўлення пакінутых сёлаў[182]. Нядзіўна, што менавіта тут знаходзіліся памешчыцкія надзелы памерам больш за 100 «чэцяў» (чвэрцяў)[183], якімі валодалі ў асноўным прывілеяваныя чыны мясцовай маскоўскай адміністрацыі[184].

Прыкметны і той факт, што ў вышэйзгаданых воласцях назіралася нізкая колькасць «пустых» паселішчаў, што сведчыць пра невысокі ўзровень міграцыйных працэсаў і адносную стабільнасць дэмаграфічнага становішча.

Зусім іншую сітуацыю можна ўбачыць у другой па велічыні заселенасці Няшчэрдаўскай воласці, якая знаходзілася на поўдні раёна, дзе

180 Памежжа Полаччыны адным з першых перажыло напады маскоўцаў пасля заканчэння перамір'я ў 1562 г. Гл. р. 1, § 2.

181 Оглоблин Н. Объяснительная записка... Кн. 3. Отд. 2. С. 19.

182 Тамсама. С. 20, прим. 27.

183 «Чэць» (чвэрць) складалася прыкладна з 5 600 квадратных метраў.

184 Прыкладам, тут знаходзіліся надзелы казацкага галавы, чатырох казацкіх сотнікаў, двух дзякаў, адзін з якіх меў найвялікшае памесце — 394 «чэці» з 34 людзьмі. Гл.: ПКМГ. С. 1. Отд. 2. С. 462–468, 484–511.

праходзіла маскоўская каланізацыя. З вялікай колькасці пералічаных паселішчаў (іх усяго налічвалася 195) ажно 134 (68,7%) з'яўляліся пустошамі — пунктамі, ад якіх засталася толькі назва.

Паводле дадзеных Полацкай рэвізіі 1552 г., у сярэдзіне XVI ст. раён ля возера Няшчэрда быў адным з самых шчыльна заселеных у правабярэжнай частцы Полаччыны. Па назве Няшчэрда лакалізуецца 83 «дымы», што вельмі шмат. Там былі прадстаўлены ўсе тыпы зямельнай уласнасці: дзяржаўная, шляхецкая, мяшчанская і царкоўная. Падобная з'ява сустракалася досыць рэдка[185].

Тым больш уражваюць тыя змяненні, якія адбыліся ў Няшчэрдаўскай воласці за два дзесяцігоддзі. Сярод населеных пунктаў засталося толькі 31 паселішча (15,9%), у якіх маскоўскім памешчыкам было раздадзена ўсяго толькі 10 чалавек. Пра неспрыяльныя для вядзення гаспадаркі ўмовы сведчыць колькасць апусцелых сёлаў — 13 «пустых» пунктаў і 17 пунктаў без слядоў жытла. Дробнасць наданняў, сярод якіх 15 (88,3%) займалі плошчу менш за 40 «чэцяў», указвае, у сваю чаргу, на непрэстыжнасць няшчэрдаўскіх ваколіц для памешчыкаў.

На гэтую воласць бесперапынна нападалі літвіны[186]. Відаць, становішча было настолькі нестабільным, што ў 1571 г. паводле загаду цара на возеры Няшчэрда пачалося будаўніцтва аднайменнага замка[187]. Гарнізон новай крэпасці быў сфарміраваны з прыбылых з Масковіі 400 казакаў на чале з Макарам Ляпуновым. Прычынай будаўніцтва, як гэта выразна паказана ў крыніцах, былі *«приходы литовских людей»*[188]. Р. Мяніцкі характарызаваў гэтую падзею як стварэнне дадатковай заслоны для бяспечнай і хуткай каланізацыі паўночнай Полаччыны[189].

Не лепшай была дэмаграфічная сітуацыя і ў суседніх з Няшчэрдаўскай воласцях. У Межаўскай воласці згадваецца толькі два населеныя пункты, у якіх было па адным двары. Колькасць пустошаў разам з паселішчамі без слядоў жытла дасягае тут ажно 89%. Раздадзеныя надзелы зямлі з'яўляліся дадаткамі да асноўных памесцяў у іншых воласцях. Тут назіраецца найбольшая колькасць дробных наданняў.

---

185 Полоцкая ревизия 1552 г. / Изд. И. Лаппо. М., 1905. С. 31–179.

186 Так, паводле інфармацыі маскоўскіх рэвізораў, возера Няшчэрда не было аддадзена на аброк, *«потому что люди розбежались для войны литовских людей»* (ПКМГ. Ч. 1. Отд. 2. С. 540). Неспакойна ў няшчэрдаўскай акрузе было і пасля заключэння перамір'я 1570 г. Гл.: ПИВЕ. Т. 3. М.; Варшава, 1998. С. 23–25.

187 Разрядная книга 1550–1636 гг. С. 185.

188 ПКМГ. Ч. 1. Отд. 2. С. 549–550.

189 Mienicki R. Egzulanci Połłoccy. S. 85.

У Дрысецкай воласці была самай вялікай колькасць не так даўно пакінутых паселішчаў (7 (11,5%)) «пустых» пунктаў і 30 (49,2%) — без слядоў жытла. Аднак памесці тут атрымалі ў асноўным чыны маскоўскага войска — адзін сотнік і восем пяцідзесятнікаў. Нягледзячы на досыць значныя плошчы надзелаў, толькі чатыры новаяўленыя памешчыкі атрымалі разам з зямлёй і сялян[190].

Можна заключыць, што дэмаграфічная сітуацыя ў паўночных воласцях (у іх лік уключаны Пакроўская, Няведарскі Кубак, Непаротаўская, Нішчанская і Няведрынская воласці) якасна адрознівалася ад сітуацыі ў паўднёвых, бліжэйшых да тэрыторыі ВКЛ, воласцях (гэта, у сваю чаргу — Няшчэрдаўская, Межаўская і Дрысецкая воласці). У апошніх назіраецца найменшы працэнт населеных пунктаў і нізкая заселенасць людзьмі. Тэрыторыя паўднёвых воласцей была адкрыта для нападаў з літоўскага боку. Характар памесных наданняў сведчыць пра непрывабнасць гэтых зямель для новых гаспадароў.

Асобнае месца займала Турунтаўская воласць, праз якую праходзіла дарога з Невеля да Полацка. Яна была адзінай воласцю, цэнтрам якой без усялякіх сумневаў трэба прызнаць пабудаваны напрыканцы 60-х гг. XVI ст. замак Сітна[191]. Існаванне гэтага фарпоста стварала надзейныя гарантыі для бяспечнай жыццядзейнасці ў прылеглай да яго мясцовасці. Высокі працэнт паселішчаў без слядоў жытла (29%) і самы нізкі паказчык па «пустых» пунктах (якія, нагадаем, апусцелі зусім нядаўна) — 2 (2,9%) сведчаць пра тое, што крызісныя з'явы ў значных маштабах праяўляліся тут да будаўніцтва замка.

З гэтай жа прычыны, нягледзячы на найбольшую адкрытасць гэтага раёна для ўдараў з боку ВКЛ, лічбы, якія характарызуюць дэмаграфічную і гаспадарчую сітуацыю, выглядаюць адносна нядрэнна. Аднак становішча ў межах воласці спакойным не назавеш[192]. Гэта вынікала з яе важнага стратэгічнага значэння.

---

190 ПКМГ. Ч. 1. Отд. 2. С. 468–474.

191 Упершыню замак Сітна згадваецца ў перамірных граматах за 20 ліпеня 1570 г.: Книга посольская... Т. 1. С. 295, 306–307. Аднак, відаць па ўсім, гэты замак існаваў раней і, магчыма, быў збудаваны разам з першымі маскоўскімі замкамі ў паўночнай Полаччыне ў 1567–1568 гг. (гл. р. I, § 4).

192 У скаргах маскоўскага ваяводы Полацка А. Ногцева-Суздальскага на напады літвінаў часта фігуруе дарога з Невеля ў Сітна. Прыкладам, 27 чэрвеня 1571 г. тут адбыўся характэрны выпадак: «*...Государя вашего* (г. зн. караля Рэчы Паспалітай) *люди (...) их* (пасошных людзей) *громили и лошади у них и запасы поимали, и их многих побили*» (ПИВЕ. Т. 3. С. 26).

Табліца 4.3.2.

*Структура памесных надзелаў, раздадзеных маскоўцамі ў паўночнай Полаччыне ў 1570 г.*

| Назва воласці | Размеркаванне памесцяў па велічыні надзелаў ворыўнай зямлі | | | | | | | | | | | Агульная колькасць «чэцяў» (чвэрцяў) ворыўнай зямлі | Сярэдняя колькасць ворыўнай зямлі на адзін надзел |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | да 10 «чэцяў» | | 11–40 «чэцяў» | | 41–100 «чэцяў» | | 101–200 «чэцяў» | | за 200 «чэцяў» | | Сума | | |
| | адз. | % | адз. | % | адз. | % | адз. | % | адз. | % | адз. | | |
| Дрысецкая | – | – | 3 | 30 | 6 | 60 | 1 | 10 | – | – | 10 | 415 | 46,1 |
| Межаўская | 5 | 20,8 | 15 | 62,5 | 4 | 16,7 | – | – | – | – | 24 | 552 | 23 |
| Непаротаўская | – | – | 3 | 60 | 1 | 20 | – | – | 1 | 20 | 5 | 383 | 76,6 |
| Нішчанская | – | – | 11 | 57,9 | 8 | 42,1 | – | – | – | – | 19 | 709 | 37,3 |
| Няведарскі Кубак | – | – | 2 | 50 | – | – | 2 | 50 | – | – | 4 | 325 | 81,3 |
| Няведрынская | – | – | 4 | 44,4 | 2 | 22,2 | 3 | 33,3 | – | – | 9 | 558 | 62 |
| Няшчэрдаўская | 2 | 11,8 | 13 | 76,5 | 2 | 11,8 | – | – | – | – | 17 | 526 | 30,9 |
| Пакроўская | 1 | 3,4 | 14 | 48,3 | 10 | 34,5 | 2 | 6,9 | 2 | 6,9 | 29 | 1972 | 68 |
| Турунтаўская | – | – | 3 | 33,3 | 5 | 55,5 | 1 | 11,1 | – | – | 9 | 552 | 61,3 |
| **Усяго** | **8** | **6,3** | **68** | **54** | **38** | **30,2** | **9** | **7,1** | **3** | **2,4** | **126** | **5992** | **54,1** |

*Табліца складзена паводле:* ПКМГ. Ч. 1. Отд. 2. С. 462–539.

Пра гэта ж сведчыць і параўнанне становішча з больш заселенай і развітай левабярэжнай Полаччынай, дзе ў часы Інфлянцкай вайны таксама назіраўся значны адток насельніцтва. Прыкладам, ва ўладаннях полацкай архіепіскапіі колькасць жыхароў за 1552–1601 гг. зменшылася ў сярэднім на 37%, пры гэтым у 1580 г., адразу пасля заканчэння маскоўскай акупацыі, насельніцтва там увогуле адсутнічала: крыніцы паведамляюць, што ў вёсках *«вси проч розышлисе»* альбо *«все в пусте»*[193] (гл. табл. 4.3.3).

[193] Янушкевіч А. Размяшчэнне і шчыльнасць насельніцтва Полацкай зямлі ў другой палове XVI ст. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. Полацк, 1998. С. 337–340.

Табліца 4.3.3.

*Дынаміка колькасці насельніцтва ў населеных пунктах Полаччыны, якія належалі полацкай архіепіскапіі (у «дымах»)*

| N | Назва паселішча | 1552 г. | 1580 г. | 1588 г. | 1601 г. | Прырост насельніцтва ў 1552–1601 гг. (у %) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Струнья | 23 | «все в пусте» | 9 | 12 | -48 |
| 2. | Цетча | 27 | «все в пусте» | 19 | 20 | -26 |
| 3. | Усьвіца | 16 | «все в пусте» | 10 | 11 | -31 |
| 4. | Завечэлле | 26 | «все в пусте» | 13 | 10 | -62 |
| 5. | Весніцк | 40 | «все в пусте» | няма звестак | | |
| 6. | Дольцы | 63 | «все в пусте» | няма звестак | 43 | -32 |
| 7. | Дзяготкі | 8 | «все в пусте» | няма звестак | 12 | 50 |
| 8. | Крынкі | 5 | «все в пусте» | няма звестак | 2 | -60 |
| 9. | Харобраў Камень | 5 | «все в пусте» | няма звестак | 5 | 0 |
| 10. | Белае (Белолі) | 5 | «все в пусте» | няма звестак | 7 | 40 |
| 11. | На Улічох (Наўлічча) | 34 | «все в пусте» | няма звестак | 17 | -50 |

**Заўвага:**
1. Дадзеныя за 1552 г. па сялу Весніцк прыведзены разам з сялом Пуцілкаўскае.

*Табліца складзена паводле:* Полоцкая ревизия 1552 г. С. 165–167; Описание полоцких владычных, монастырских и церковных земель ревизорами в 1580 г. // Чтения в обществе истории и древностей Российских. 1907. N 3; АСД. Т. 1. С. 167–174, 221–225.

Гэтыя змены ў дэмаграфічнай структуры, на нашу думку, былі непасрэднымі наступствамі ваеннага становішча і панавання маскоўцаў у Полацкім краі. Ужо гаварылася пра тое, што ўцёкі насельніцтва назіраліся адразу пасля іх прыходу. Змяншэнне колькасці жахароў і паселішчаў сведчыць пра павышаную смяротнасць і значны міграцыйны рух насельніцтва, з усімі наступствамі, такімі як гвалт, рабункі, голад, эпідэміі і г. д.

Усталяванне маскоўскай улады на Полаччыне прымусіла мясцовае насельніцтва змяніць звыклы лад жыцця і прыстасоўвацца да новых варункаў існавання. У дачыненні да маскоўцаў пераважвала насцярож-

лівасць, калі не сказаць — нядобразычлівасць. Гэта яскрава праявілася пры першых сустрэчах маскоўскіх вайскоўцаў з полацкімі сялянамі.

Новая ўлада мела ўсе асноўныя рысы акупацыйнага рэжыму. Дэпартацыі і рэпрэсіі ўжо ў самым пачатку маскоўскага панавання ў Полацкай зямлі засведчылі, што новыя ўладары не мелі намераў абапірацца на мясцовае праваслаўнае насельніцтва. Безабаронныя сяляне былі вымушаны падпарадкоўвацца ваеннай сіле. Як паказваюць крыніцы, прызнанне маскоўскай улады таксама магло быць абумоўлена гарантыямі бяспекі з яе боку. Аднак пры ўсёй складанасці і супярэчлівасці сітуацыі ў паўночна-ўсходнім рэгіёне ВКЛ нельга гаварыць пра масавыя прамаскоўскія настроі сярод мясцовага насельніцтва.

У сваім стаўленні да варожых бакоў сяляне прытрымліваліся, як правіла, нормаў «старыны». Таму праявы патрыятызму сярод іх часцей за ўсё мелі форму захавання вернасці свайму былому гаспадару-феадалу. Нярэдка сяляне аказвалі разведачныя паслугі ваеннаму камандаванню ВКЛ.

Нягледзячы на імкненне жыхароў памежных гарадоў ВКЛ заставацца ўбаку ад ваенных падзей, яны працягвалі выконваць абавязкі па ахове і абароне сваіх паселішчаў. Крыніцы занатавалі розныя формы паводзін мяшчан у ваенных абставінах — ад ініцыятыўных дзеянняў па арганізацыі абароны да індыферэнтных настрояў.

Дрэнная падтрымка абароназдольнасці памежных тэрыторый з боку цэнтра і гвалтоўныя акцыі найманых жаўнераў, якія часта заставаліся беспакаранымі і наносілі страшэнныя шкоды, значна паслаблялі аўтарытэт дзяржаўных структур улады ў вачах мясцовага насельніцтва. Дзяржава замест таго, каб абараняць уласных грамадзян, паказвала сваё няўменне справіцца з праблемамі і цяжкасцямі ваеннага часу.

Ваеннае становішча выклікала ў Полацкай зямлі сур'ёзны дэмаграфічны крызіс. Без сумневу, ён меў месца і на іншых тэрыторыях, закранутых ваеннымі дзеяннямі. Яго праявамі былі перадусім рэзкае змяншэнне насельніцтва і сталае павелічэнне колькасці апусцелых населеных пунктаў у выніку міграцый і дэпартацый.

Сталае «прадчуванне вайны», выклікане напружаным станам узаемадачыненняў паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, выпрацавала на памежжы своеасаблівы тып жыццядзейнасці, дзе галоўнай мэтай простага насельніцтва было захаваць уласныя жыццё і маёмасць пры любых абставінах, не звяртаючы ўвагі на ідэалагічныя абгрунтаванні вайны з боку дзяржаўных структур улады. Інфлянцкая вайна выразна паказала, што падобныя матывацыі паводзін былі дамінантнымі для звычайнага чалавека.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Умяшанне Вялікага Княства Літоўскага ў інфлянцкі канфлікт азначала карэнны паварот у яго знешняй палітыцы. Пасля доўгіх гадоў пасіўнасці Княства вырашыла ўзяцца за рэалізацыю амбіцыйнага знешнепалітычнага праекта, які заключаўся ў пашырэнні свайго ўплыву ў суседняй Інфлянцкай дзяржаве, ажно да правядзення ў перспектыве яе інкарпарацыі па прускім узоры. Саслабелыя Інфлянты ўяўлялі сабой ласы кавалак перш за ўсё з прычыны выгаднага геапалітычнага становішча. Гэта абумоўлівала пільны інтарэс да іх з боку ўсіх дзяржаў рэгіёна — Літвы, Масковіі, Польшчы, Швецыі, Даніі, Прусіі і Святой Рымскай імперыі германскай нацыі.

Пачатак Інфлянцкай вайны прынёс ВКЛ досыць адчувальныя дывідэнды. Княству ўдалося выканаць план і авалодаць кантролем над большай часткай усходняй Прыбалтыкі. Гэта адбылося ў немалой ступені дзякуючы імкненню інфлянцкага кіраўніцтва знайсці ў ВКЛ і Польскай Кароне заслону ад маскоўскай ваеннай пагрозы. Такі поспех, аднак, меў свае негатыўныя наступствы: Інфлянты ператварыліся ў зону бесперапынных міжнародных канфліктаў, неўзабаве пачалася новая шырокамаштабная вайна ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай, падзеі якой развіваліся не на карысць літвінаў. Тэрытарыяльныя страты ў выніку захопу Полацка і Азярышчаў сталі найбуйнейшымі няўдачамі ВКЛ у Інфлянцкай вайне. Баланс сіл у пэўнай меры ўдалося выраўняць пасля перамогі ў Ульскай бітве 1564 г. Аднак паспяхова праведзеная маскоўцамі кампанія па замацаванні на акупаваных тэрыторыях Полаччыны і Віцебшчыны (маецца на ўвазе будаўніцтва невялікіх замкаў) засведчыла слабасць літоўскага рэваншу. У рэшце рэшт стомленасць ад безвыніковага ваен-

нага супрацьстаяння прывяла абодва бакі ў 1570 г. да пераміρнага кампрамісу.

Княства за гады вайны так і не здолела перайсці ад абаронча-пасіўнай тактыкі да наступальных ваенных дзеянняў і вярнуць страчаныя тэрыторыі. Пасіўныя і беспаспяховыя паводзіны былі абумоўлены перадусім сур'ёзнымі правaламі ў арганізацыі абароны. Маруднае пры зборах і маларухомае паспалітае рушэнне, якое заставалася галоўным элементам узброеных сіл ВКЛ, паказала сваю недзеяздольнасць ва ўмовах, калі дзеянні праціўніка мелі раптоўны і маланкавы характар.

Інфлянцкая вайна была для ВКЛ тым пераломным момантам, уласцівым для большасці еўрапейскіх краін, калі сутыкнуліся два падыходы да арганізацыі ваеннай справы. Сярэднявечная традыцыя трымалася на выкарыстанні ўсеагульнага шляхецкага апалчэння («паспалітага рушэння») у якасці асноўнай сілы для вядзення ваенных дзеянняў. На змену ёй прыходзіла традыцыя Рэнесансу з пераважным задзейнічаннем прафесійных найманых жаўнераў. Выразна відаць, што падзеі Інфлянцкай вайны дыктавалі патрэбу прафесіяналізацыі арміі. Аднак стаўка на наймітаў не магла быць зроблена з прычыны адсутнасці ў дзяржаўных структур сродкаў для іх належнага і прыстойнага ўтрымання. Найманае войска служыла фактычна толькі дзеля забеспячэння абароны памежных замкаў. Спробы польнага гетмана Р. Сангушкі зрабіць з яго ўдарную сілу мелі лакальны поспех і не змянілі ходу вайны.

Выкарыстанне польскага найманага кантынгента ў якасці дадатковай крыніцы забеспячэння абароны не прынесла чаканых вынікаў. Яго знаходжанне на тэрыторыі ВКЛ хоць і было моцнай падтрымкай, але часта прыводзіла да вынішчэння прыватнаўласніцкіх маёнткаў і сялянскіх надзелаў. Парадаксальна, але кіраўніцтва ВКЛ у асобе гаспадарскай Рады не было зацікаўлена ў актыўных дзеяннях польскіх жаўнераў, каб не даць падстаў для меркаванняў аб слабасці ваенна-абарончай сістэмы Княства.

Ужо ў пачатковы перыяд вайны стала відавочна, што ВКЛ не спраўляецца з выдаткамі на ваенныя мэты. Вайна выцягвала з бюджэту ўсе сродкі. Спробы дзяржаўнай улады павялічыць падатковыя зборы не вырашылі праблему, прывёўшы толькі да рэзкага зніжэння плацежаздольнасці насельніцтва краіны. Зборы паспалітага рушэння, якія адбываліся амаль штогод, былі для шляхціцаў настолькі знясільвальнымі мерапрыемствамі, што прыводзілі іх да банкруцтва.

Дэфіцыт сродкаў не дазваляў пабудаваць арганізацыю абароны па-новаму. Дзяржаўныя структуры ўлады былі вымушаны зноў і зноў склікаць неэфектыўнае паспалітае рушэнне, бо яно заставалася найбольш танным спосабам фарміравання ўзброеных сіл. Нявыплаты грошай найманым жаўнерам прыводзілі да іх гвалтоўных паводзін у дачыненні да мірнага насельніцтва, якія заключаліся перш за ўсё ў рэквізіцыях харчавання і пастоях на прыватнаўласніцкіх землях. Прысутнасць жаўнераў станавілася перадумовай для ўзнікнення сацыяльных канфліктаў, найміты былі для мірнага жыхара такімі ж непажаданымі «гасцямі», як непрыяцельскае войска.

Пры гэтым нельга сказаць, што Княства не валодала патэнцыяльнымі магчымасцямі для вядзення паспяховай вайны з Масковіяй. Аказалася, аднак, што ўлады не змаглі як след распарадзіцца імі і наладзіць эфектыўную арганізацыю ўзброеных сіл і ваенна-абарончых мерапрыемстваў. Надзвычай нізкая выканаўчая дысцыпліна, адсутнасць волі і рашучасці пры прыняцці рашэнняў сталі яскравымі паказчыкамі крызісу ўлады. Няздольнасць адказаць на выклікі, якія ўзніклі ў выніку ваеннага становішча, прывяла ў рэшце рэшт да пастаноўкі пытання аб захаванні суверэнітэту ВКЛ.

Стаўленне кіраўнічых колаў Княства да вайны было досыць супярэчлівым. З аднаго боку, яны цудоўна разумелі, што абыякавасць да інфлянцкіх спраў можа прывесці да катастрафічных наступстваў. Размяшчэнне маскоўцаў у Інфлянтах стварыла б дадатковую пагрозу бяспецы ВКЛ. З іншага боку, уступленне ў ваенны канфлікт было непажаданым з прычыны дэфіцыту сродкаў і парушэння стабільнасці. Варыянт, пры якім удалося б авалодаць кантролем над Інфлянтамі і адначасова пазбегнуць вайны з Масковіяй, не прайшоў. У варунках распачынання шырокамаштабнай вайны з усходнім суседам (і асабліва пасля страты Полацка) сярод палітычнай эліты адбыўся своеасаблівы раскол. Радзівілы катэгарычна выказаліся за адмову ад абароны інфлянцкай тэрыторыі і прапаноўвалі засяродзіцца альбо на аднаўленні міру з Маскоўскай дзяржавай, альбо на рашучым удары па непрыяцелі. Насуперак гэтай пазіцыі вялікі князь літоўскі Жыгімонт Аўгуст адстойваў меркаванне аб неабходнасці абавязковага ўтрымання Інфлянтаў.

На жаль, пасля 1561 г. Жыгімонт Аўгуст занядбаў літоўскія справы, амаль увесь час знаходзячыся ў Польшчы. Гэта стварыла ў вачах паноўнай эліты і шырокіх грамадскіх колаў негатыўны вобраз яго абыяка-

вага стаўлення да праблем абароны ВКЛ. Вайна ўсё больш прымала ў грамадскай думцы незразумелы, калі не сказаць бяссэнсавы характар: яна вялася за невядома чые інтарэсы і толькі выцягвала апошнія сродкі з кішэняў шляхты. Энтузіязм шляхты, выкліканы спачатку магчымасцю ўзбагачэння за кошт Інфлянтаў, а потым — патрэбай рэваншу за страту Полацка, разбіўся аб абыякавасць гаспадара, які не прыязджаў у Княства, і бяздзейнасць радных паноў, якія без гаспадара не маглі нічога зрабіць. Вайна яшчэ больш страчвала папулярнасць у шэрагах шляхты пры ўсведамленні безвыніковасці прынятых мер і затрачаных на ваенныя мэты сродкаў.

Стаўленне да вайны было цесна звязана са стаўленнем да заключэння новай уніі з Польшчай. Жыгімонт Аўгуст пасля першага этапу далучэння Інфлянтаў да ВКЛ зразумеў, што без дапамогі звонку не абысціся. З 1562 г. ён пачаў падтрымліваць ідэю уніі. Усведамленне неабходнасці прыцягнення дадатковых сіл і сродкаў адбывалася і ў магнацка-шляхецкім асяроддзі. Аднак ні магнаты, ні шараговая шляхта не падтрымалі ідэю інкарпарацыйнай уніі, цвёрда адстойваючы суверэнітэт краіны. Унія разглядалася перадусім як раўнапраўны саюз дзвюх дзяржаў, неабходны для забеспячэння іх бяспекі і правядзення ўзгодненай знешняй палітыкі.

З іншага боку, частка эліты на чале з Радзівіламі зацягвала час, каб адкласці заключэнне уніі на будучыню. Напрыканцы Інфлянцкай вайны гэтая бесперспектыўная ва ўмовах ваеннага становішча пазіцыя не атрымала падтрымкі ні ў эліты, ні ў простай шляхты. Відавочнымі былі поўнае вычарпанне рэсурсаў і неабходнасць знешняй дапамогі, якую магла даць у тагачасных умовах толькі унія з Польшчай.

У памежнай зоне, якую непасрэдна закранулі ваенныя дзеянні, стаўленне да вайны і варожых бакоў вар'іравалася ад добраахвотнага і актыўнага ўдзелу ў абарончых мерапрыемствах да індыферэнтных настрояў. Апошнія былі выкліканы расчараваннем насельніцтва ў магчымасцях цэнтра аказаць дапамогу ў арганізацыі мясцовай абароны. Памежныя землі мелі шмат падстаў адчуць сябе бездапаможнымі перад ворагам. Гэта, у прыватнасці, выразна паказала аблога Полацка і Азярышчаў.

Што датычыцца стаўлення мясцовага беларускага насельніцтва да новай маскоўскай улады пасля яе прыходу на Полаччыну, то крыніцы не пакінулі нам сведчанняў ні пра «братэрскае яднанне» з праваслаўнымі

адзінаверцамі, ні пра прысутнасць вызваленчых матывацый (рыторыкі) у дзеяннях маскоўцаў. Маскоўскія ўлады не бачылі ў полацкім праваслаўным людзе свайго натуральнага саюзніка, а наадварот, як гэта ўласціва акупантам, ставіліся да яго з недаверам і падазронасцю. Імкнучыся падпарадкаваць Полацкую зямлю, яны абапіраліся на сілу зброі. Сяляне, разумеючы гэта, ставіліся да чужынцаў адэкватна, пры спрыяльных абставінах нават аказваючы супраціўленне.

Выпадкі падтрымкі маскоўскіх уладаў назіраліся толькі ў ваколіцах новазбудаваных імі замкаў, якія дазвалялі кантраляваць сітуацыю ў бліжэйшай акрузе. Менавіта гарантыі бяспекі рабіліся тым чыннікам, які схіляў сялян да таго ці іншага боку. Увогуле ж, пры магчымасці людзі дыстанцыяваліся ад абодвух бакоў, якія ўдзельнічалі ў вайне. Для звычайнага чалавека галоўнай задачай ва ўмовах ваеннага ліхалецця было выжыць.

Ваеннае становішча значна пагоршыла дэмаграфічную сітуацыю ў Полацкай зямлі. Дэмаграфічны крызіс быў выкліканы як натуральнымі наступствамі вайны — забойствамі, голадам, эпідэміяй чумы, так і дэпартацыямі полацкага насельніцтва ўглыб Маскоўскай дзяржавы.

Інфлянцкая вайна была для ВКЛ своеасаблівым гістарычным выклікам, праверкай дзяржавы на трываласць і моц. Ваеннае становішча выявіла шматлікія і разнастайныя крызісныя з'явы, адлюстравала заганы сістэмы дзяржаўнага кіравання і катастрафічны недахоп рэсурсаў для вядзення актыўнай і паспяховай вайны. Перад ВКЛ паўстала задача трансфармацыі ў мэтах захавання сваёй ідэнтычнасці. Працяглае і блізкае суіснаванне з Польшчай у варунках нарастання крызісу не пакідала іншага выбару, як ісці на больш цеснае аб'яднанне з Каронай. Гэта ўвасобілася ў заключэнні Люблінскай уніі 1569 г., да чаго Інфлянцкая вайна прычынілася самым непасрэдным чынам.

Стварэнне Рэчы Паспалітай, аднак, не вырашыла адразу ўсіх праблем. Пасля 1570 г., калі было заключана трохгадовае перамір'е з Маскоўскай дзяржавай, унутрыпалітычныя абставіны складваліся гэтак, што, здавалася, Полацку было наканавана стаць другім Смаленскам. Толькі энергічная дзейнасць Стэфана Баторыя здолела накіраваць падчас Інфлянцкай вайны 1576–1582 гг. людскія і матэрыяльныя рэсурсы дзяржавы і грамадства на барацьбу за страчаныя тэрыторыі і дамагчыся ў ёй паспяховых вынікаў.

# СКАРАЧЭННІ

| | |
|---|---|
| АВАК | Акты, издаваемые Археографическою коммиссиею, высочайше учрежденною в Вильне |
| АЗР | Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею |
| АЛРГ | Акты Литовско-Русского государства |
| АСД | Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной России, издаваемый при управлении Виленского учебного округа |
| АЮЗР | Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею |
| ВС | Витебская старина |
| МВКЛ | Метрыка Вялікага Княства Літоўскага |
| НГАБ | Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі |
| ПИВЕ | Памятники истории Восточной Европы |
| ПКМГ | Писцовые книги Московского государства |
| ПЛ | Псковские летописи |
| ПСРЛ | Полное собрание русских летописей |
| РИБ | Русская историческая библиотека |
| РИО | Сборник императорского Русского исторического общества |
| РНБ | Российская Национальная библиотека |
| AGAD | Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie |
| AR | Archiwum Radziwiłłów w AGAD |
| AS | Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie |
| ASK | Akty Skarbu Koronnego |
| ASW | Akty Skarbowe-Wojskowe |
| BCzart. | Biblioteka Czartoryskich w Krakowie |
| BKórn. | Biblioteka Polskiej Akademii Nauk w Kórniku |
| BN | Biblioteka Narodowa w Warszawie |
| BRacz. | Miejska Biblioteka Publiczna im. E. Raczyńskiego w Poznaniu |
| Listy | Listy króla Zygmunta Augusta do Radziwiłłów |
| LM | Lietuvos Metrika |
| Urzędnicy | Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII–XVIII wieku: Spisy, pod red. A. Gąsiorowskiego. T. 11: Urzędnicy centralni i dostojnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy. |

# КРЫНІЦЫ І ЛІТАРАТУРА

## Архіўныя крыніцы

**Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (г. Мінск)**
фонд КМФ–18 (Метрыка ВКЛ), воп. 1, спр. 37–41, 45–50, 254, 259, 261, 264–267, 529
фонд 1655, воп. 1, спр. 3, 4, 6

**Российская национальная библиотека (г. Санкт-Петербург)**
фонд 293, оп. 1, док. 162, 164, 165, 166, 167, 208, 212, 230
фонд 971, авт. 62, 124, 152, 234, 321/1

**Archiwum Główne Aktów Dawnych w Warszawie**
Akty Skarbowe-Wojskowe, oddz. 86, sygn. 18, 19a, 19b, 20, 21
Archiwum Skarbu Koronnego, oddz. 2, sygn. 23
Archiwum Radziwiłłów,
dz. I, sygn. 7776
dz. II, sygn. 21, 42, 51, 53, 55, 56, 57, 59, 66, 66a
dz. IV, t. 34, sygn. 495; t. 35, sygn. 502
dz. V, sygn. 2044, 10263, 13980
Archiwum Publiczne Potockich, sygn. 9

**Biblioteka Narodowa w Warszawie**
rkps. III.6609

**Biblioteka Polskiej Akademii Nauk w Kórniku**
rkps. 247, 1536, 1538

**Biblioteka Muzeum Narodowego im. Czartoryskich w Krakowie**
Teki Naruszewicza, sygn. 71. IV, 72. IV, 73. IV, 74. IV, 75. IV, 76. IV, 77. IV
rkps. 302, 1057, 1604, 2208

**Miejska Biblioteka Publiczna im. E. Raczyńskiego w Poznaniu**
rkps. 78

**Archiwum Państwowe w Krakowie, oddział na Wawelu**
Archiwum Młynowskie Chodkiewiczów, sygn. AMCh 11

## Надрукаваныя крыніцы

Акты Литовско-Русского государства / Изд. М. Довнар-Запольский. — Т. 2. — М., 1897.

Акты, издаваемые Археографическою коммиссиею, высочайше учрежденною в Вильне. — Т. 2: Акты Брестского земского суда. — Вильна, 1867.

Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею / Ред. И. И. Григорович. — Т. 3. — СПб., 1848.

Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией / Ред. Н. И. Костомаров. — Т. 1. — СПб., 1863.

Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной России, издаваемый при управлении Виленского учебного округа. — Т. 1, 4, 7. — Вильна, 1867–1870.

Бершадский С. А. Документы и регесты к истории литовских евреев. — Т. 2. — СПб., 1882.

Буганов В. И. «Взятие полоцкое Литовское земли» — описание похода 1563 г. в разрядной книге Музейного собрания // Записки отдела рукописей Государственной библиотеки им. В. И. Ленина. — 1969. — Вып. 31. — С. 213–224.

Витебская старина / Сост. и изд. А. Сапунов. — Т. 4. — Витебск, 1885.

«Гістарычныя запіскі» Ф. Еўлашоўскага / Уклад. У. Свяжынскі. — Мн., 1990.

Дневник ливонского посольства к царю Ивану Васильевичу, веденный Томасом Хернером // Чтения в обществе истории и древностей Российских при Московском университете. — 1886. — Кн. 4. — Отд. 4. — С. 5–17.

Дневник Люблинского сейма 1569 года: Соединение Великого Княжества Литовского с Королевством Польским / Изд. М. Коялович. — СПб., 1869.

Книга полоцкого похода 1563 г. (Исследование и текст) / Подгот. текста К. В. Петрова. — СПб., 2004.

Книга посольская Метрики Великого княжества Литовского / Ред. М. А. Оболенский, И. Н. Данилович. — Т. 1. — М., 1843.

Копия с письма, присланного литовским гетманом в Варшаву на имя пана Радивила // Чтения в обществе истории и древностей Российских при Московском университете. — 1847. — Кн. 3. — Отд. 3. — С. 1–18.

Метрыка Вялікага княства Літоўскага. — Кніга запісаў 44 (1559–1566) / Падрыхт. А. І. Груша. — Мн., 2001.

Памятники истории Восточной Европы: Источники XV–XVII вв. — Т. 2–3. — Москва; Варшава, 1997–1998.

Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 года. / Падрыхт. А. Груша, М. Спірыдонаў, М. Вайтовіч. — Мн., 2003.

Первый Литовский Статут (1529 г.) / Под ред. С. Лазутки, И. Валиконите и Э. Гудавичюса. — Вильнюс, 2004.

Переписка Ивана Грозного с Андреем Курбским / Подгот. текста Я. С. Лурье и Ю. Д. Рыков. — М., 1993.

Писцовая книга Полоцка и Полоцкого повета // Писцовые книги Московского государства / Под ред. Н. В. Калачова. — Ч. 1. — Отд. 2. — СПб., 1877. — С. 421–566.

Полное собрание русских летописей. — Т. 13, 29, 32, 34. — М., 1965–1978.

Полоцкая ревизия 1552 г. / Изд. И. И. Лаппо. — М., 1905.

Послания Ивана Грозного / Под ред. В. П. Адриановой-Перетц. — М.; Л., 1951.

Посольство И. Гофмана в Ливонию и Русское государство в 1559–1560 гг. // Исторический архив. — 1957. — N 6. — С. 131–142.

Псковские летописи / Под ред. А. Н. Насонова. — Вып. 2. — М., 1955.

Разрядная книга 1475–1598 гг. / Подгот. В. И. Буганов. — М., 1966.

Разрядная книга 1475–1605 гг. — Т. 2. — Ч. 1 / Сост. Н. Г. Савич. — М., 1981.

Разрядная книга 1550–1636 гг. — Вып. 1 / Сост. Л. Ф. Кузьмина. — М., 1975.

Разрядная книга 1559–1605 гг. / Сост. Л. Ф. Кузьмина; Под ред. В. И. Буганова. — М., 1974.

Русская историческая библиотека. — Т. 30, 33: Литовская Метрика. Книги публичных дел. Переписи Литовского войска. — Юрьев; Петроград, 1914–1915.

Сборник императорского Русского исторического общества. — Т. 59, 71: Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским. 1533–1571 гг. — СПб., 1887–1892.

Сборник материалов, относящихся к истории панов-рады Великого Княжества Литовского / Изд. И. Малиновский. — Томск, 1901.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. — Мн., 2003.

Шлихтинг А. Новое известие о времени Ивана Грозного. — Л., 1934.

Штаден Г. Записки немца-опричника. — М., 2002.

Akta unii Polski z Litwą 1385–1791 / Wyd. S. Kutrzeba i W. Semkowicz. — Kraków, 1932.

Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie / Wyd. B. Gorczak i Z. Luba-Radzimiński. — T. 7. — Lwów, 1910.

Bielski M. Kronika Polska / Wyd. K. J. Turowski. — T. 2. — Sanok, 1856.

Commendoni J. F. Pamiętniki o dawnej Polsce z czasów Zygmunta Augusta / Wyd. J. Albertrandi, M. Malinowski. — T. 1. — Wilno, 1847.

Diariusz sejmu lubelskiego 1566 roku / Oprac. I. Kaniewska. — Ossolineum, 1980.

Dyaryusz sejmu Piotrkowskiego 1565 r. / Wyd. W. Chomętowski. — Warszawa, 1868.

Dogiel M. Codex diplomaticus regni Poloniae et magni ducatus Lithuaniae. — T. 5. — Vilnae, 1765.

Górnicki Ł. Dzieje w Koronie Polskiej w r. 1538 do r. 1572 / Wyd. K. J. Turowski. — Sanok, 1855.

Gwagnini A. Kronika Sarmacyey Europeyskiey // Zbior dzieiepisow polskich. — T. 4. — Warszawa, 1768.

Historiae Ruthenicae Scriptores extere XVI saculi. — Vol. 1. — Berolini; Petropoli, 1841.

Jasnowski J. Materiały do działalności wojskowej F. Zebrzydowskiego // Przegląd Historyczno-Wojskowy. — 1937. — T. 9. — S. 267–304.

Kojałowicz Wijuk A. Historiae Litvanae Pars prior. — T. 2. — Dantisci (Gdansk), 1669.

Lietuvos Metrika. — Kn. 51: (1566–1574) / Parengė A. Baliulis, R. Ragauskienė, A. Ragauskas. — Vilnius, 2000.

Lietuvos Metrika. — Kn. 530: (1566–1572) / Parengė D. Baronas, J. Jovajša. — Vilnius, 1999.

Lietuvos Metrika. — Kn. 531: (1567–1569) / Parengė L. Anužytė, A. Baliulis. — Vilnius, 2001.

Lietuvos Metrika. — Kn. 532: (1569–1571) / Parengė L. Anužytė, A. Baliulis. — Vilnius, 2001.

Lietuvos Metrika. — Kn. 564: (1553–1567) / Parengė A. Baliulis. — Vilnius, 1996.

Listy króla Zygmunta Augusta do Radziwiłłów / Oprac., wstęp i koment. I. Kaniewska. — Kraków, 1999.

Orzechowski S. Wybór pism / Oprac. J. Starnawski. — Wrocław etc., 1972.

Paprocki B. Herby rycerstwa polskiego / Wyd. K. J. Turowski. — Kraków, 1858.

Polskie ustawy i artykuły wojskowe od XV do XVIII w. / Wyd. S. Kutrzeba. — Kraków, 1937.

Relacje nuncjuszów apostolskich i innych osób o Polsce od r. 1548 do 1690. — T. 1. — Berlin; Poznań, 1864.

Rozmowa Polaka z Litwinem / Wyd. J. Korzeniowski. — Kraków, 1890.

Stryjkowski M. Kronika Polska, Litewska, Żmódzka i wszystkiej Rusi. — T. 2. — Warszawa, 1846.

Uchansciana, czyli zbiór dokumentów, wyjaśniających życie i działalność Jakuba Uchańskiego, arcybiskupa gnieznieńskiego / Wyd. T. Wierzbowski. — T. 3. — Warszawa, 1890.

Volumina Legum / Wyd. J. Ohryzko. — T. 2. — Petersburg, 1859.

Votum Waleriana, biskupa wileńskiego nad unią Korony z Litwą // Dziennik Warszawski. — 1826. — R. 5. — S. 160–169.

Źródłopiśma do dziejów unii / Wyd. T. Działyński. — T. 2. — Poznań, 1856.

## Літаратура

Александров Д. Н., Володихин Д. М. Борьба за Полоцк между Литвой и Русью в XII–XVI вв. — М., 1994.

Арбузов Л. А. Очерк истории Лифляндии, Эстляндии и Курляндии. — СПб., 1912.

Бобышаў В. І. Некаторыя аспекты арганізацыі дыпламатычных перамоў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай у другой палове XVI ст. // Беларусь і свет. — Мн., 1999. — Т. 1. — С. 46–53.

Бобышев В. И. Из истории тайной дипломатии Великого Княжества Литовского и Московского государства накануне и во время Ливонской войны (1558–1583 гг.) // Беларусь і свет. — Мн., 2000. — Т. 2. — С. 22–33.

Бобышев В. И. Международное положение и внешняя политика Великого Княжества Литовского накануне и в начале Ливонской войны // Старонкі гісторыі і культуры Беларусі. — Мн., 1997. — С. 44–56.

Бохан Ю. М. Наёмнае войска ў Вялікім княстве Літоўскім у XV–XVI стст. — Мн., 2004.

Варонін В. Дрыса ў XVI ст. // Commentarii Polocenses Historici = Полацкія гістарычныя сшыткі. — 2004. — Т. 1. — С. 20–31.

Варонін В. Палітычны лад Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст. // Беларускі гістарычны агляд. — 1998. — Т. 5. — Сш. 1 (8). — С. 27–66.

Вилимас Д. Михалон Литвин и Федор Евлашевский — два взгляда на реформу судов Великого Княжества Литовского 1564–1566 гг. // Наш радавод. — Кн. 7. — Гродна, 1998. — С. 214–218.

Волков В. Войны и войска Московского государства. — М., 2004.

Граля И. Иван Михайлов Висковатый: Карьера государственного деятеля в России XVI в. — М., 1994.

Грушевський М. С. Історія України-Руси. — Т. 4. — Кіїв, 1993.

Грыцкевіч А. Бітва каля Улы // Беларускі гістарычны часопіс. — 1994. — N 3. — С. 91–92.

Дербов Л. А. Борьба Русского государства за Прибалтику и Белоруссию в 60-х годах XVI в. // Ученые записки Саратовского гос. ун-та. — 1956. — Т. 47. — С. 149–181.

Дербов Л. А. К истории падения Ливонского ордена // Ученые записки Саратовского гос. ун-та. — 1947. — Т. 17. — С. 157–174.

Дзярновіч А. «...in nostra Livonia»: Дакументальныя крыніцы па гісторыі палітычных адносінаў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Лівоніяй у канцы XV – першай палове XVI стст.: сістэматызацыя і актавы аналіз. — Т. 1. — Мн., 2003.

Довнар-Запольский М. В. Государственное хозяйство Великого Княжества Литовского при Ягеллонах. — Т. 1. — Киев, 1901.

Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі. — Мн., 1994.

Зимин А. А. Опричнина Ивана Грозного. — М., 1964.

Зимин А. А. Реформы Ивана Грозного: Очерки социально-экономической и политической истории России с середины XVI в. — М., 1960.

История внешней политики России. Конец XV–XVII век (От свержения ордынского ига до Северной войны). — М., 1999.

История Латвийской ССР / Под ред. К. Я. Страздиня. — Т. 1: С древнейших времен до 1860 г. — Рига, 1952.

Карамзин Н. М. История государства Российского: Репринт. воспроизв. — Кн. 2–3 (Т. 5–12). — М., 1989.

Королюк В. Д. Ливонская война: Из истории внешней политики Русского централизованного государства во второй половине XVI в. — М., 1954.

Коротков И. А. Иван Грозный: Военная деятельность. — М., 1952.

Костомаров Н. И. Ливонская война // Костомаров Н. И. Исторические монографии и исследования. — Т. 3. — СПб., 1867. — С. 45–172.

Лаппо И. И. Великое Княжество Литовское во второй половине XVI столетия: Литовско-русский повет и его сеймик. — Юрьев, 1911.

Лаппо И. И. Великое Княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569–1586). — Т. 1. — СПб., 1901.

Лаппо И. И. К истории сословного строя великого княжества Литовского. Конные мещане Витебские в XVI столетии // Сборник статей, посвященных В. О. Ключевскому. — М., 1909. — С. 254–276.

Лаппо И. И. Литовский Статут 1588 г. — Т. 1: Исследование. — Ч. 1. — Каунас, 1934.

Леп'явко С. Українське козацтво у міжнародних відносинах (1561–1591). — Чернігів, 1999.

Лойка П. А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. — Мн., 2002.

Лурье Я. С. Вопросы внешней и внутренней политики в посланиях Ивана IV // Послания Ивана Грозного / Под ред. В. П. Адриановой-Перетц. — М.; Л., 1951. — С. 468–519.

Любавский М. К вопросу об ограничении политических прав православных князей, панов и шляхты в Великом Княжестве Литовском до Люблинской унии // Сборник статей, посвященных В. О. Ключевскому. — М., 1909. — С. 1–17.

Любавский М. Литовско-русский сейм: Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства. — М., 1900.

Любавский М. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. — 3-е изд. — СПб., 2004.

Максимейко Н. А. Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 г. — Харьков, 1902.

Менжинский В. С. Структура феодального землевладения в Великом Княжестве Литовском (По материалам Переписи войска 1528 г.) // История СССР. — 1987. — N 3. — С. 164–178.

Оглоблин Н. Н. Объяснительная записка к карте Полоцкого повета в 2-й половине XVI-го века // Сборник Археологического Института. — СПб., 1880. — Кн. 3–4. — Отд. 2. — С. 3–53, 3–75.

Османская империя и страны Центральной, Восточной и Юго-Восточной Европы в XV–XVI вв.: Главные тенденции политических взаимоотношений. — М., 1984.

Павулан А. Хозяйственное и политическое значение даугавского торгового пути в XIII–XVII вв. // Экономические связи Прибалтики с Россией. — Рига, 1968. — С. 75–94.

Пичета В. И. Белоруссия и Литва (Исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития). — М., 1961.

Пичета В. И. Люблинская уния и третий Литовский Статут // Журнал Министерства народного просвещения — 1917. — N 5. — С. 232–257.

Саверчанка І. Дыскусіі вакол дзяржаўна-палітычнага саюза паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай у аналітычнай публіцыстыцы 60-х гадоў XVI ст. // Наш радавод. — Кн. 8. — Гродна, 1999. — С. 74–79.

Сагановіч Г. М. Войска Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVII стст. — Мн., 1994.

Сагановіч Г. М. Дзве гісторыі Полацка // Беларускі гістарычны агляд. — 1997. — Т. 4. — Сш. 1–2 (6–7). — С. 205–216.

Сагановіч Г. М. «Жаласны плач горада Полацка» // Беларускі гістарычны агляд. — 2001. — Т. 8. — Сш. 1–2 (14–15). — С. 136–144.

Сагановіч Г. М. Захоп Полацка Іванам IV паводле нямецкіх «лятучых лісткоў» 1563 г. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. — Полацк, 1998. — С. 263–270.

Сагановіч Г. М. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. — Мн., 2001.

Сагановіч Г. М. Полацкая вайна: 1563–1579 гг. // Адраджэнне: Гістарычны альманах. — Вып. 1. — Мн., 1995. — С. 61–82.

Семянчук А. Мацей Стрыйкоўскі ў Інфлянцкай вайне // Castrum, urbis et bellum. — Баранавічы, 2002.

Скрынников Р. Г. Начало опричнины. — Л., 1966.

Скрынников Р. Г. Царство террора. — СПб., 1992.

Сокол С. Ф. Политическая и правовая мысль Белоруссии во второй половине XVI – начале XVII в. — Мн., 1984.

Соловьев С. М. Сочинения. — Кн. 3: История России с древнейших времен: Т. 5–6. — М., 1989.

Тарасаў С. В. Полацк IX–XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія. — Мн., 1998.

Филюшкин А. И. Дискурсы Ливонской войны // Ab Imperio: Теория и история национальностей и национализма в постсоветском пространстве. — 2001. — N 4. — С. 43–80.

Филюшкин А. И. История одной мистификации: Иван Грозный и «Избранная рада». — М., 1998.

Филюшкин А. И. Причины «Полоцкого взятия» 1563 г. глазами современников и потомков // Вестник Санкт-Петербургского университета. — Серия 2: История. — 2005. — Вып. 3. — С. 20–31.

Флоря Б. Н. Иван Грозный. — М., 2002.

Флоря Б. Н. Проект антитурецкой коалиции в середине XVI в. // Россия, Польша и Причерноморье в XV–XVIII вв. — М., 1979. — С. 71–85.

Форстен Г. В. Балтийский вопрос в XVI и XVII столетиях. — Т. 1: Борьба из-за Ливонии. — СПб., 1893.

Хорошкевич А. Л. Россия в системе международных отношений середины XVI века. — М., 2002.

Чернов А. В. Вооруженные силы Русского государства в XV–XVII вв. — М., 1954.

Шаскольский И. П. Русско-ливонские переговоры 1554 г. и вопрос о ливонской дани // Международные связи России до XVII в. — М., 1961. — С. 376–399.

Шмидт С. О. А. Ф. Адашев и Ливонская война // Спорные вопросы отечественной истории XI–XVIII веков. — Ч. 2. — М., 1990. — С. 303–306.

Юхо Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. — Мн., 1992.

Яноўскі А. А. «Вайна нерваў», ці характар дыпламатычнай перапіскі паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай у XVI ст. // Беларусь і свет. — Мн., 1999. — Т. 1. — С. 4–11.

Янушкевіч А. М. Вайна і грамадства: адносіны насельніцтва паўночна-ўсходняга памежжа ВКЛ да палітыкі дзяржаўнай улады ў перыяд Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг. // Castrum, urbis et bellum. — Баранавічы, 2002. — С. 415–421.

Янушкевіч А. М. Вульская бітва 1564 г. // Commentarii Polocenses Historici = Полацкія гістарычныя запіскі. — 2004. — Т. 1. — С. 32–42.

Янушкевіч А. М. Дэмаграфічная сітуацыя на Полаччыне ў 60–70-я гады XVI стагоддзя // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманіт. навук. — 2002. — N 3. — С. 53–56.

Янушкевіч А. М. Захоп Полацка маскоўскім войскам у 1563 г. // Commentarii Polocenses Historici = Полацкія гістарычныя запіскі. — 2005. — Т. 2. — С. 5–12.

Янушкевіч А. М. Інфлянцкая вайна 1558–1582 г. у савецкай гістарыяграфіі // Беларускі гістарычны агляд. — 1999. — Т. 6. — Сш. 1–2 (10–11). — С. 222–243.

Янушкевіч А. М. Інфлянцкі напрамак знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў сярэдзіне XVI ст. // Внешняя политика Беларуси в исторической ретроспективе. — Мн., 2002. — С. 126–134.

Янушкевіч А. М. Размяшчэнне і шчыльнасць насельніцтва Полацкай зямлі ў другой палове XVI ст. // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі. — Полацк, 1998. — С. 337–340.

Янушкевіч А. М. Сутнасць інфлянцкай палітыкі Маскоўскай дзяржавы на пачатковым этапе Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг. // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця. — Ч. 1. — Гродна, 2003. — С. 250–256.

Янушкевіч А. М. Унія з Каронай ва ўнутранай палітыцы Вялікага Княства Літоўскага перад Люблінскім соймам 1569 г. // Беларускі гістарычны агляд. — 2004. — Т. 10. — Сш. 1–2 (18–19). — С. 29–58.

Янушкевіч А. М. Уплыў Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг. на кшталтаванне ўнутранай палітыкі Вялікага Княства Літоўскага // Biaioruskie Zeszyty Historyczne. — 2002. — N 17. — S. 220–229.

Alexandrowicz S. Plan oblężenia zamku Uły z 1568 roku (Przyczynek do początków staropolskiej kartografii wojskowej) // Polski Przegląd Kartograficzny. — 1986. — T. 18. — N 4. — S. 165–175.

Alexandrowicz S. Rozwój kartografii Wielkiego Księstwa Litewskiego od XV do połowy XVIII wieku. — 2-e wyd. — Poznań, 1989.

Angermann N. Studien zur Livlandpolitik Ivan Groznyjs. — Marburg; Lahn, 1972.

Auerbach I. Ivan Groznyj, Spione und Verräter im Moskauer Rußland und das Großfürstentum Litauen // Russian History. — 1987. — Vol. 14, N 1–4. — P. 5–35.

Bardach J. Krewo i Lublin. Z problemów unii polsko-litewskiej // Kwartalnik Historyczny. — 1969. — R. 76. — Nr. 3. — S. 607–619.

Bardach J. Od aktu w Krewie do Zaręczenia Wzajemnego Obojga Narodów (1385–1791) // Unia lubelska i tradycje integracyjne w Europie Środkowo-Wschodniej. — Lublin, 1999. — S. 12–44.

Bardach J. O Rzeczpospolitą Obojga Narodów. Dzieje związku Polski z Litwą do schyłku XVIII wieku. — Warszawa, 1998.

Bardach J. Studia z ustroju i prawa Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVII w. — Warszawa, 1970.

Błaszczyk G. Litwa na przełomie średniowiecza i nowożytności 1492–1569. — Poznań, 2002.

Błaszczyk G. Ustawy i artykuły wojskowe Polski i Litwy do 1569 roku // Studia i Materiały do Historii Wojskowości. — 1998. — T. 39. — S. 29–75.

Bodniak S. Polska a Bałtyk za ostatniego Jagiełłona. — Kórnik, 1946.

Bodniak S. Z wyprawy radoszkowickiej na Moskwę w roku 1567–1568 // Ateneum Wileńskie. — 1930. — R. 7. — Z. 3–4. — S. 799–808.

Bogatyrev S. Battle for divine wisdom. The rhetoric of Ivan IV's campaign against Polotsk // The Military and Society in Russia, 1450–1917. — Leiden; Boston; Köln, 2002. — P. 325–363.

Boniecki A. Herbarz polski. — T. 1–16. — Warszawa, 1899–1913.

Borawski P. Tatarskie chorągwie plemienne w armii Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI i 1 połowie XVII w. // Acta Baltico-Slavica. — 1979. — T. 12. — S. 133–167.

Chodynicki K. Kościół prawosławny a Rzecz Pospolita. — Warszawa, 1934.

Czapliński W. Stanowisko państw skandynawskich wobec sprawy inflanckiej w latach 1558–1561 // Zapiski Historyczne. — 1963. — T. 28. — Z. 3. — S. 379–405.

Czermak W. Sprawa równouprawnienia schizmatyków i katolików na Litwie (1432–1563) // Rozprawy Wydziału Historyczno-Filozoficznego Akademii Umiejętności. — 1903. — T. 44. — S. 348–405.

Donnert E. Der livländische Ordensritterstaat und Russland. — Berlin, 1963.

Dubas-Urwanowicz E. Stosunek Korony do unii z Litwą w latach 1562–1574 // Studia Podlaskie. — 1995. — Nr. 5. — S. 5–39.

Dundulis B. Lietuvos użsenio politika XVI a. — Vilnius, 1971.

Ferenc M. Dwór Zygmunta Augusta: Organizacja i ludzie. — Kraków, 1998.

Frost R. The Northern Wars 1558–1721: War, State and Society in North-Eastern Europe. — London, 2000.

Górski K. Historia jazdy polskiej. — Kraków, 1895.

Górski K. Historia piechoty polskiej. — Kraków, 1893.

Górski K. Wojny Litwy z Wielkim Księstwem Moskiewskim za Zygmuntów // Niwa. — 1891. — R. 20. — S. 237–240, 255–258, 273–276.

Grala H. Rutheni vs. Moschii: Elita ruska Wielkiego Księstwa Litewskiego wobec wojen moskiewskich w XVI w. // Наш радавод. — Кн. 8: Беларусы і палякі: дыялог народаў і культур. X–XX стст. — Гродна, 1999. — С. 34–51.

Grala H. Źródła do dziejów stosunków polsko-moskiewskich w XVI wieku (Nowe znaleziska w Archiwum warszawskim Radziwiłłów) // Miscellanea Historico-Archivistica. — 1997. — T. 7. — S. 135–153.

Halecki O. Dzieje unii jagiellońskiej. — T. 1–2. — Kraków, 1919–1920.

Halecki O. Przyłączenie Podlasia, Wołynia i Kijowszczyzny do Korony w roku 1569. — Kraków, 1915.

Halecki O. Sejm obozowy szlachty litewskiej pod Witebskiem 1562 r. i jego petycja o unię z Polską (Przyczynek do dziejów parlamentaryzmu litewskiego i genezy unii lubelskiej) // Przegląd Historyczny. — 1916. — T. 17. — Z. 3. — S. 320–352.

Hedemann O. Dzisna i Druja — Magdeburskie miasta. — Wilno, 1934.

Historia polityczna Polski. — Cz. 2: Od r. 1506 do r. 1795. — Warszawa etc., 1923.

Jasnowski J. Mikołaj Czarny Radziwiłł (1515–1565): kanclerz i marszałek ziemski Wielkiego Księstwa Litewskiego, wojewoda wileński. — Warszawa, 1939.

Jučas M. Lietuvos ir Lenkijos unija. — Vilnius, 2000.

Jučas M. Unia polsko-litewska. — Toruń, 2004.

Kamieniecki W. Chorążowie w parlamentaryzmie litewskim przed unią lubelską // Antemurale. — 1965. — T. 9. — S. 193–199.

Kamieniecki W. Ograniczenia wyznaniowe w prawodawstwie litewskim w XV–XVI w. // Przegląd Historyczny. — 1911. — T. 13. — Z. 3. — S. 268–282.

Kappeler A. Ivan Groznyj im Spiegel des auslandischen Druckschriften seiner Zeit. — Frankfurt/M., 1972.

Karwowski S. Wcielenie Inflant do Litwy i Polski 1558–1561. — Poznań, 1873.

Kempa T. Mikołaj Krzysztof Radziwiłł Sierotka (1549–1616), wojewoda wileński. — Warszawa, 2000.

Kempa T. Rywalizacja Radziwiłłów i Chodkiewiczów o pierwsze miejsce w elicie politycznej Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 60. i 70. XVI wieku // History, culture and language of Lithuania. — Poznań, 2000. — S. 195–219.

Kiaupienė J. Litewskie ceńhy kultury politycznej szlachty Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI wieku // Kultura Litwy i Polski w dziejach. Tożsamość i współistnienie / Red. J. Wyrozumski. — Kraków, 2000. — S. 67–78.

Kirby D. Northern Europe in the Early-modern Period: The Baltic World 1492–1772. — London; New York, 1993.

Kirchner W. The Rise of the Baltic Question. — Newark, 1954.

Kłodziński A. Stosunki Polski i Litwy z Inflantami przed zatargiem z r. 1556–1557 // Kwartalnik Historyczny. — 1908. — T. 22. — Z. 1. — S. 344–391.

Kolankowski L. Jagiellonowie a unia // Pamiętnik szóstego powszechnego zjazdu historyków polskich w Wilnie 17–20 września 1936 r. — Cz. 2. — Lwów, 1936. — S. 265–292.

Kolankowski L. Polska Jagiellonów: Dzieje polityczne. — 3-e wyd. — Olsztyn, 1991.

Kolankowski L. Problem Krymu w dziejach jagiellońskich // Kwartalnik Historyczny. — 1935. — R. 49. — Z. 3. — S. 279–300.

Konopczyński W. Kwestia bałtycka do XX wieku. — Gdańsk, 1946.

Korzon T. Dzieje wojen i wojskowości w Polsce: epoka przedrozbiorowa. — T. 1. — Lwów etc, 1923.

Korzon T. Organizacja wojskowa Litwy w okresie Jagiellońskim // Rocznik Towarzystwa przyjaciół nauk w Wilnie. — 1908. — T. 2. — S. 312–358.

Küttler W. Das Verhaltnis der Stadt Riga zu Polen-Litauen in der Zeit des Livländischen Krieges (1558–1583) // Jahrbücher für Geschichte der UdSSR. — 1967. — Bd. 10. — S. 273–295.

Lenz W. Riga zwischen dem Römischen Reich und Polen-Litauen in den Jahren 1558–1582. — Marburg; Lahn, 1968.

Lepszy K. Dzieje floty polskiej. — Gdańsk, 1947.

Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy: Stosunki polsko-litewskie w latach 1569–1586. — Warszawa, 2002.

Łowmiański H. Polityka Jagiellonów. — Poznań, 1999.

Łowmiański H. Zaludnienie państwa litewskiego w wieku XVI: Zaludnienie w roku 1528. — Poznań, 1998.

Mączak A. Klientela: Nieformalne systemy władzy w Polsce i Europie XVI–XVIII w. — Warszawa, 1994.

Makarau M. Witebskie prawo miejskie w XVI wieku // Zapiski Historyczne. — 2003. — T. 68. — Z. 1. — S. 1–17.

Manteuffel G. Upadek państwa inflanckiego. — Lwów, 1894.

Mienicki R. Egzulanci Połłoccy (1563–1580) // Ateneum Wileńskie. — 1933–1934. — R. 9. — S. 31–128.

Mienicki R. Stanisław Dowojno, wojewoda połocki // Ateneum Wileńskie. — 1937. — R. 12. — S. 404–481.

Narbutt T. Dzieje starożytne narodu litewskiego. — T. 9: Panowania Zygmuntów. — Wilno, 1841.

Natanson-Leski J. Dzieje granicy wschodniej Rzeczypospolitej. — Cz. 1: Granica moskiewska w epoce Jagiellońskiej. — Lwów; Warszawa, 1922.

Niesiecki K. Herbarz polski. — T. 1–10. — Lipsk, 1839–1845.

Olewnik J. Polsko-pruski plan inkorporacji Inflant do monarchii jagiellońskiej z lat 1552–1555 i jego pierwsze stadium realizacji // Kommunikaty Mazursko–Warmińskie. — 1979. — N 4. — S. 393–408.

Pałucki W. Drogi i bezdroża skarbowości polskiej XVI i pierwszej połowy XVII wieku. — Wrocław, 1974.

Pelenski J. Inkorporacja ukraińskich ziem dawnej Rusi do Korony w 1569 roku. Ideologia i korzyści — próba nowego spojrzenia // Przegląd Historyczny. — 1974. — T. 65. — Z. 2. — S. 243–262.

Pirożyński J. Z dziejów obiegu informacji w Europie XVI wieku: Nowiny z Polski w kolekcji Jana Jakuba Wicka w Zurychu z lat 1560–1587. — Kraków, 1995.

Piwarski K. Niedoszła wyprawa t. zw. Radoszkowicka Zygmunta Augusta na Moskwę (rok 1567–1568) // Ateneum Wileńskie. — 1927. — R. 4. — Z. 13. — S. 252–286; 1928. — R. 5. — Z. 14. — S. 85–119.

Plewczyński M. Liczebność wojska polskiego za ostatnich Jagiellonów (1506–1572) // Studia i Materiały do Historii Wojskowości. — 1989. — T. 31. — S. 27–60.

Plewczyński M. Materiały do zagadnienia liczebności i organizacji wojska polskiego w latach 1506–1573 // Studia i Materiały do Historii Wojskowości. — 1990. — T. 33. — S. 323–348.

Plewczyński M. Szlachta podlaska w wojsku polskim za ostatnich Jagiellonów // Drobna szlachta podlaska w XVI–XVIII wieku. — Białystok, 1991. — S. 13–28.

Plewczyński M. W służbie polskiego króla: Z zagadnień struktury narodowościowej armii koronnej w latach 1500–1574. — Siedlce, 1995.

Plewczyński M. Wkład Radziwiłłów w rozwój staropolskiej sztuki wojennej XVI wieku // Miscellanea Historico-Archivistica. — 1997. — T. 7. — S. 27–36.

Plewczyński M. Żołnierz jazdy obrony potocznej za czasów Zygmunta Augusta: Studia nad zawodem wojskowym w XVI wieku. — Warszawa, 1985.

Prochaska A. Roman Sanguszko // Przewodnik Naukowo-Literacki. — 1889. — R. 17. — S. 681–694, 784–800, 877–888, 972–985, 1116–1135.

Pułaski K. Sprawa o zapłatę zaległego żołdu rotom zaciężnym za Zygmunta Augusta // Szkice i poszukiwania historyczne. — Kraków, 1906. — Seria 3. — S. 197–228.

Rachuba A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parlamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569–1763. — Warszawa, 2002.

Ragauskienė R. 1564 m. Ulos Kautynės: įvykio tikimybės // Istorijos akiračiai: straipsnių rinkinys. — Vilnius, 2004. — P. 155–176.

Rasmussen K. Die livländische Krise 1554–1561. — Kobenhavn, 1973.

Romanowski J. N. Wojna Zygmunta Augusta z Zakonem Inflanckim roku 1557 // Roczniki Towarzystwa Przyjaciół Nauk Poznańskiego. — T. 1. — Poznań, 1860. — S. 329–400.

Šapoka A. Lietuva ir Lenkija po 1569 metų Liublino unijos. Jų valstybinių santykių bruožai. — Kaunas, 1938.

Schiemann T. Russland, Polen und Livland bis in 17. Jahrhundertes. — Bd.1–2. — Berlin, 1887.

Semkowicz W. Popis wojska polskiego z lat 1561–1564 i wyobrażone na nim piętna końskie // Wiadomości Numizmatyczno-Archeologiczne. — 1930. — T. 12. — S. 104–113.

Seraphim E. Geschichte Liv-, Est- und Kurlands. — Bd. 1–2. — Reval, 1904–1905.

Staemmler K. D. Preußen und Livland in ihrem Verhältnis zur Krone Polen 1561–1586. — Marburg; Lahn, 1953.

Stancelis V. The annexation of Livonia to the Grand Duchy of Lithuania: Historiographical controversies // Lithuanian Historical Studies. — 2000. — N 5. — P. 21–44.

Stancelis V. 1557 m. Pasvalio sutartys — permainų Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės santykiuose su Hohencolernų dinastija rezultatas // Lietuvos valstybė XII–XVIII a. — Vilnius, 1997. — P. 285–298.

Sucheni-Grabowska A. Badania nad elitą władzy w latach 1551–1562 // Społeczeństwo staropolskie. — T. 1. — Warszawa, 1976.

Sucheni-Grabowska A. Starania Iwana Groźnego o rękę Katarzyny Jagiellonki a konflikt z Rosją o Inflanty (1560–1561) // Homines et societas. Czasy Piastów i Jagiellonów. — Poznań, 1997. — S. 213–223.

Sucheni-Grabowska A. Zygmunt August, król polski i wielki książę litewski, 1520–1562. — Warszawa, 1996.

Sužiedėlis S. Lietuvos ir Livonijos konfliktas 1556–1557 m. — Kaunas, 1938.

Sužiedėlis S. Mykolo Radvilo pastangos prijungti Lietuvai Rygą. — Kaunas, 1934.

Szelągowski A. Walka o Bałtyk. — Lwów-Poznań, 1921.

Tarvel E. Stosunek prawnopaństwowy Inflant do Rzeczypospolitej oraz ich ustroj administracyjny w l. 1561–1621 // Zapiski Historyczne. — 1969. — T. 34, z. 1. — S. 49–77.

Tiberg E. Die Politik Moskaus gegenüber Alt-Livland 1550–1558 // Zeitschrift für Ostforschung. — 1976. — Bd. 25, h. 4. — S. 577–617.

Tiberg E. Kritische Bemerkungen zu einigen Quellen über den Anfang des Livländischen Krieges 1558 // Zeitschrift für Ostforschung. — 1976. — Bd. 25, h. 3. — S. 462–475.

Tiberg E. Zur Vorgeschichte des Livländischen Krieges. Die Beziehungen zwischen Moskau und Litauen 1549–1562. — Uppsala, 1984.

Unia lubelska i tradycje integracyjne w Europie Środkowo-Wschodniej. — Lublin, 1999.

Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII–XVIII wieku: Spisy / Pod red. A. Gąsiorowskiego. — T. 11: Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV–XVIII wieku. Spisy / Oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba. — Kórnik, 1994.

Varakauskas R. Lietuvos ir Livonijos santykiai XIII–XVI a. — Vilnius, 1982.

Wijaczka J. Asverus von Brandt 1509–1559: życie i działalność dyplomatyczna w służbie księcia Albrechta pruskiego. — Kielce, 1996.

Wijaczka J. Prusy Książęce a Polska, Litwa i Inflanty w połowie XVI wieku: działalność dypłomatyczna Asverusa von Brandta w latach 1544–1558. — Kielce, 1992.

Wimmer J. Siły zbrojne Korony za Zygmunta Augusta // Zeszyty Naukowe Wojskowej Akademii Politycznej. Seria historyczna. — 1967. — N 15/48. — S. 47–55.

Wisner H. Najjaśniejsza Rzeczpospolita. Szkice z dziejów Polski szlacheckiej XVI–XVIII wieku. / 2-e wyd. — Warszawa, 2002.

Wisner H. Rzeczpospolita Obojga Narodów — federacja zwyciężonych czy zwycięzców? Unia Litwy i Polski z roku 1569 w aspekcie militarnym // Przegląd Historyczny. — 1972. — T. 63. — Z. 4. — S. 605–613.

Wisner H. Unia: Sceny z przeszłości Polski i Litwy. — Warszawa, 1988.

Wisner H. Wielkie Księstwo Litewskie — Korona Polska — Rzeczpospolita // Przegląd Historyczny. — 1976. — T. 67. — Z. 4. — S. 575–591.

Wolff J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego (1386–1795). — Kraków, 1885.

Zakrzewski A. B. Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI–XVIII w. Ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki. — Warszawa, 2000.

Zakrzewski A. B. Służba wojskowa tatarów w Wielkim księstwie Litewskim (XVI–XVIII w.). Chorągwie ziemskie // Istorijos akiračiai: straipsnių rinkinys. — Vilnius, 2004. — P. 127–140.

# SUMMARY


## "Grand Duchy of Lithuania and the Livonian War 1558–1570"

Current book is based on results of comprehensive research of participation of the Grand Duchy of Lithuania (GDL) in the Livonian War 1558–1570 and influence of the martial law on the development of internal processes in the country.

The *Introduction* presents brief overview of the state of scholarship and source studies on the research issues. Author indicates that despite the consistent interest to the problem of the Livonian War in the scholarship, his predecessors did not pay decent attention to the issue of the War's influence on domestic developments in the GDL.

The *First chapter* is devoted to the analysis of military actions and diplomatic affairs between the Grand Duchy of Lithuania and Muscovy. Special attention is given to analysis of the nature and essence of the Livonian policy of the GDL at the beginning of the Livonian War as well as major military events — the takeover of Polack by Muscovian army in 1563 and the Ula battle of 1564.

The *Second chapter* reflects on organization of the GDL military forces during the Livonian War, namely on the issues of mobilization of irregular army ('*paspalitaye rušennie*') and mercenaries. The role and nature of the Polish mercenaries are of the principal concern of the author.

The *Third chapter* provides analysis of the financial and material military resources of the GDL, including characteristics of the state military taxation policy and reasons for the crisis of the GDL budget. Special emphasis is given to the problem of payments to the mercenaries.

The *Fourth chapter* is devoted to the study of the influence of the martial law on the developments in the GDL internal policy, and particularly to the process of concluding the union with Polish Kingdom. Special attention is given to the issue of formation of the public opinion towards the Livonian War; the position of the GDL political elites is especially analyzed. The issues of everyday life and political orientation of the borderland population during the wartime in case of moving frontier are touched upon in the chapter. Additionally, the demographic situation in the Voivodship of Polack, occupied by the Muscovian troops, is characterized.

Major results of the research are summed up in the *Conclusion*.

*Translated by Siarhei Salei*

Навуковае выданне

**Янушкевіч** Андрэй Мікалаевіч

# Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 гг.

Манаграфія

Адказны за выпуск В. А. Сілянок
Рэдактар М. Н. Гальпяровіч
Карэктар Л. Ф. Кавалёў
Камп’ютэрны дызайн, вёрстка Ю. А. Андрэева
Дызайн вокладкі Р. А. Лебедзеў

Падпісана да друку 26.03.07. Фармат 60х84 1/16.
Папера афсетная. Гарнітура GaramondBook.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 20,6. Улік.-выд. арк. 20,3.
Наклад 300. Замова N 83.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медисонт»
ЛИ № 02330/0133391 ад 19.07.04 г.
ЛП № 02330/0056748 ад 22.01.04 г.
220004, г. Мінск, вул. Ціміразева, 9.